Борис Пастернак

3

АКАДЭМІЯ НАВУК БССР

ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ
ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ
імя ЯНКІ КУПАЛЫ

# Пiлiп Пестрак

## ЗБОР ТВОРАЎ У ПЯЦІ ТАМАХ

Рэдакцыйная калегія:
БАРЫСЕНКА В. В., КАВАЛЕНКА В. А., МУШЫНСКІ М. І., НАВУМЕНКА І. Я., ПЕСТРАК А. С., ХРОМЧАНКА К. Р., ШАМЯКІН І. П.

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1985

# Піліп Пестрак

ТОМ
3

## СУСТРЭНЕМСЯ НА БАРЫКАДАХ

Раман

КНІГА ДРУГАЯ

Рэдактар тома
В. А. КАВАЛЕНКА

Падрыхтоўка тэксту і каментарыі
А. Л. ВЕРАБ'Я

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1985

Бел 2
П 28

П $\frac{4702120200-094}{М302(05)-85}$ падпіснос

© Афармленне. Каментарыі. Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1985.

# ЧАСТКА ЧАЦВЁРТАЯ

## Раздзел першы

### ПОПЕЛ

Як добра адчуваць, што ты з'яўляешся пэўнай вартасцю для людзей, якія цябе акружаюць, а значыць, урэшце, і для ўсяго народа. Усведамленне гэтага прыйшло да Андрэя выразна яшчэ тады ў вагоне, калі ён сядзеў на лаўцы, скаваны за рукі разам з Дзям'янам Гараглядам. Навокал сядзелі сялянскія хлопцы, таксама скаваныя парамі, з рознымі выразамі на тварах. Але ўсіх яднала адна рыса. Гэта — пільнасць. Усіх яднала адна думка, што з панамі пачалася суровая бітва і што яна не спыніцца аж да перамогі. Інакш ужо і не можа быць. Калі і сціснецца ў каго сэрца на момант, што вось пакінуў сваю хату, бацькоў або яшчэ і любую дзяўчыну, то гэты боль трывае нядоўга... Што значыць там усякія сямейныя справы, калі тут дзеецца такое вялікае і прыгожае,— народ прабівае сабе дарогу да вызвалення, і мы ідзём у першых радах гэтай пачэснай бітвы...

А поезд усё імчаў і імчаў на захад, у цёмную, невядомую ноч, у снежную завіруху.

Андрэй глядзеў на хлопцаў і цешыўся, што вось ужо ва ўсёй краіне няма таго куточка, дзе б не папавалі ідэі вызвалення. Глядзеў і на двух паліцыянтаў, якія сядзелі насупраць, з краю, і, пакінуўшы службовую строгасць, развязалі свае языкі, уступалі ў гутарку. На іх тварах відаць было здзіўленне і нават прызнанне — пасаванне перад гераізмам вось гэтых сярмяжных хлопцаў, якія

насмелі выступіць так адважна, падставілі грудзі пад стрэлы. Знявага да «хлопаў», якая так настойліва ўбівалася ім у галовы іхнімі кіраўнікамі, пачала ўжо траціць сваю вастрыню. Выходзіць, і сярод хлопаў ёсць «мудрыя галовы», якія ўмеюць «весці палітыку». А гэта, пане, ужо нешта ёсць паважнае... Хлопы ўжо не быдла.

Трагічны канец дэманстрацыі парушыў ранейшыя ўяўленні глушэцкай паліцыі,— яна ніяк не магла супакоіцца ад страху і здзіўлення. Андрэй ды ўсе хлопцы даведаліся ад паліцыянтаў, што забітых шэсць, а параненых невядома колькі. Паліцыянт з сялянскім наіўным тварам махаў пальцам, нават прыўстаў і задзёрыста гаварыў:

— Маеце шчасце, што кулямёт заціяўся, а то было б вам яшчэ больш...

Поезд грукатаў. Час ад часу, як шротам, удараў снег у шыбіну цёмнага акна, быццам хто кідаў яго жменяй. Хлопцы думалі адну думу...

І ў гэтай думе Андрэй чуў магутны поступ крокаў «вялікай арміі працы»... Ідуць і ідуць з усіх канцоў зямлі на рашучы, на апошні бой. Цяжкая будзе яшчэ дарога, але ясная.

А неба над зямлёю ў хмарах, палыхае зарніцамі. І Андрэю здаецца, што не снег падае на поезд, віхрыцца ў ветры, а сыплецца попел, ападае, як пасля пажараў, што абнялі навакольныя далі.

Попел сыплецца на душу, сыплецца павольна з хмарных вышынь, прарэзаных сполахамі зарніц. І мы ідзём пад гэтым небам, з'яднаныя адзінай сілай, адзінай воляй, у адзіным магутным рытме. У душу ўсяляецца радасць і гордасць.

Андрэй ніяк не можа пазбыцца гэтага адчування. Ён быў недзе ў вялікім руху людской масы, бачыў і адчуваў яе шквальную моц... А цяпер яго вязуць у поездзе. Як гэта сталася? Пачуццё гордасці за сябе, за блізкіх сваіх людзей уступае месца клопатам, адчуванню недастатковасці чагосьці, што трэба прадумаць, у чым неабходна разабрацца. Трэба сустрэць заўтрашні дзень у поўні сваіх сіл. Кайданны шлях — гэта шлях пільнасці і гарту.

А попел усё сыплецца і сыплецца...

Нервы, якія былі напружыліся да накалу, цяпер адыходзяць паволі, але ніяк яшчэ не могуць прыйсці да нормы,— не могуць супакоіцца.

У дадатак да ўсяго давялося сустрэць па дарозе новую гордую радасць, якую нельга забыць, якую панясеш праз

усё жыццё,— яна застанецца назаўсёды ў душы сярод іншых з'яў — радасных і сумных.

...Марозны ранак праліваў праз вокны вагона сваю шэрую муць на стомленыя твары хлопцаў. Андрэй больш адчуў, чым зразумеў, што поезд стаіць. Прыўзняў галаву, якая ляжала на плячы Дзям'яна Гарагляда, і ўбачыў, што вокны белыя і што няма на дварэ завірухі. За акном злева вырысоўваўся вялікі шэры будынак. «Няйначай, вакзал нейкага вялікага горада»,— падумаў Андрэй і глянуў на паліцыянтаў.

— Дзе стаім? — спытаўся ён.

— Едзем ужо цераз Валынь,— адказаў паліцыянт і назваў горад, дзе спыніўся поезд.

Неўзабаве прайшоў афіцэр паліцыі, начальнік канвоя, і, не затрымліваючыся, кінуў:

— Адзін за мной.

Паліцыянт, які сядзеў з самага краю, падняўся і далучыўся да такіх жа канвойных, якія хвастом цягнуліся за афіцэрам у канец вагона.

Праз некалькі хвілін паліцыянт вярнуўся ўстрывожаны і падцягнуты. Грукнуўшы вінтоўкай аб падлогу, акінуў позіркам усіх і сказаў халодным, варожым голасам:

— Падрыхтавацца да выхаду. Толькі парадак, спакой... папярэджваю...

Хлопцы заварушыліся, пачалі завязваць свае торбачкі з хлебам. Зрабіў гэта і Дзям'ян Гарагляд. Ён усю дарогу не прымаў удзелу ў гутарцы, сядзеў насуплены, не мог глядзець на паліцыянтаў. Відаць, адна іх прысутнасць перашкаджала яму вымавіць слова. Толькі калі хлопцы пачыналі спяваць, ён ажываў і радасна моргаў вачыма. Паліцыянты не вельмі перашкаджалі спевам, тым больш што ў песнях не было нічога канкрэтнага супроць Польшчы. А паводле іхняга разумення гэтага было даволі. Аднак, на ўсякі выпадак, стрымлівалі, асабліва калі хлопцы гукнулі прыпеў вядомай песні:

Лейся вдаль, наш напев,
Мчись кругом!
Над миром знамя наше реет...

Яны, напэўна, чулі недзе гэты матыў, можа, ад польскіх рабочых, і таму ўстрывожана замахалі рукамі:

— Досыць, досыць!

Хлопцы ўрэшце сціхлі, а паліцыянты працягвалі:

— Вы, пся крэў, яшчэ тут у поездзе зробіце рэвалюцыю!..

І вось цяпер трэба выходзіць з поезда і ісці невядома куды. Пара за парай выходзілі і станавіліся па пероне па чатыры чалавекі ў рад.

Доўгі перон перад вялікім вакзалам быў перапоўнены арыштаванымі і паліцыяй, якая акружыла рады скаваных.

Афіцэр, малады, шыракатвары, надзеючы скураныя чорныя пальчаткі, абыходзіў канвой, аглядаў, ці ўсё ў парадку, затым, вярнуўшыся да пярэдніх радоў, падаў каманду:

— Бачнасць! Багнэт па бронь! [1]

Кожны паліцыянт выняў з чахла бліскучы нож-штык і надзеў на вінтоўку. І зноў усё застыла ў чаканні. Афіцэр ішоў павольнай хадою паўз шарэнгі і папярэджваў:

— Будзем праходзіць праз горад па другі вакзал. Прашу захоўваць спакой, парадак, ніякіх выкрыкаў, ніякіх бучаў. Інакш будзе ўжыта зброя. Зразумела? Кірунак — проста! А-а-рш!..

Рады суконных шэрых куртак, кажухоў, чорных паліто ўскалыхнуліся і рушылі пад канвоем бліскучых штыкоў.

Шэрае, вільготнае неба павісла над незнаёмым горадам. Пад нагамі хрупасцеў сняжок. Ішлі паўз вішнёвыя, яблыневыя садкі, зацярушаныя снегам. У іх хаваліся белыя домікі, крытыя то гонтамі, то карычневай бляхай. Пры вуліцы ўзвышаліся радамі аголеныя, без лісцяў, пірамідальныя таполі. Удалечыні, абвітыя дымкай, маячылі высокія белыя вежы цэркваў і вострыя шпілі касцёлаў. Людзі выходзілі на ганкі сваіх домікаў, найбольш жанчыны, і пільна праводзілі вачыма шэрую калону. А рады ўсё ішлі і ішлі, што здавалася, і канца ім няма... У адным завулку звярнулі ўлева, каб абысці цэнтр горада. Тут ужо пачаў трапляцца насустрач рабочы люд — у замазучаных кепках, куртках, з пачарнелымі суровымі тварамі. Яны групкамі спыняліся, каб паглядзець на такі ўжо знаёмы для іх паход і панесці ў душы пратэст і ненавісць да панскай улады. Паліцыя іх тут жа разганяла. Нічога, пакуль размінуцца з гэтай калонай, усё роўна даведаюцца, хто пайшоў пад канвоем і адкуль.

Калі звярнулі направа, каб ісці зноў у ранейшым напрамку, хлопцы пачулі аддалены спеў. Ён далятаў, як

---

[1] Смірна! Штык на зброю!

плаўпая мелодыя, якая то заціхала, то ўзвышалася і рабілася ўсё больш чутпай. Спачатку можна было падумаць, што гэта ідзе звычайпая хаўтурпая працэсія. Але не. Нешта трывожнае ўрываецца ў душу, будзіць, кліча... І Андрэй адгадаў песню,— баявую ўкраінскую рэвалюцыйную песню. Няўжо? Адкуль яна льецца тут магутна і прыгожа?

З-за павароту бліснулі насустрач такія ж самыя штыкі, такія ж шыпялі, какарды, а за імі шарэнгі скаваных. Толькі яны ішлі не па чатыры чалавекі ў рад, а па восем. Якая пякемлівасць з боку паліцыі — каб яна ведала, што можа здарыцца такая сустрэча, вядома, павяла б скаваных рознымі дарогамі. Набліжалася і песня. Яна лілася свабодна, неяк ціха, без надрыву, поўная музыкі-гармоніі. Адразу можна было пазнаць па галасах, што гэта спяваюць украінцы. Песня шырокая, як поле, як стэп, і мяккая, задушэўная:

Шалійтэ, шалійтэ, скажэні каты́,
Годуйтэ шпіонів, будуйтэ тюрьмы́,—
Сто тысяч до бою робітпыків станэ,
Пірвэм, пірвэм, пірвэм всі кайданы!

Калі было ўжо блізка да сустрэчы дзвюх калоп, гучалі апошпія словы:

Гроза аж з-за Допу — гэть-гэть грыкотыть,
За Дніпр і за Віслу пэхай полэтыть,
І сопцэ свободы з-за хмары выгляпэ —
На смэрть, па смэрть, па смэрть вам, тыраны!

Сустрэўшыся, амаль інстынктыўна калоны арыштаваных спыніліся.

— Адкуль, таварышы? — пачулася з боку спевакоў.

— З Беларусі! Ліквідацыя Грамады! — крыкнуў Андрэй, які ішоў у чацвёртым радзе.

— А ў нас ліквідацыя Сельробу! Вядуць з турмы на суд! Чатырыста чалавек!..

Не паспеў украінец скончыць, як лес рук узняўся ў адно імгненне,— рук, сціснутых у кулакі, як знак братэрскага прывітання. І па ўсёй вуліцы пачуліся вокрыкі: «Рот фронт! Рот фронт! Нэхай жыве Радянська Білорусь! Няхай жыве Савецкая Украіна!» Затым воклічы змяшаліся: «Няхай жыве... Няхай жыве... Радяпські... Савецкі Саюз!»

І «ўра» пракацілася пястрымна, магутна. Не памаглі крыкі паліцыі: «Спóкуй!.. Спóкуй!..» Некаторыя паліцыянты замахваліся прыкладамі вінтовак, каб ударыць,

але біць баяліся. «Маршыраваць!» — крычаў, раздзіраючы горла, начальнік канвоя на ўкраінцаў. Паліцыянты пачалі штурхаць людзей, каб ішлі. І ўрэшце калона ўкраінцаў рушыла. Вуліца не была такой шырокай, каб можна было свабодна разміпуцца, і таму беларусы прасоўваліся ля самых платоў, каб даць прайсці ўкраінцам. Час ад часу воклічы ўспыхвалі з новай сілай: «Далоў фашысцкі ўрад Пілсудскага — урад акупацыі і тэрору!»

Усе паліцыянты агляданіся, як падстрэленыя, стараліся прыкмеціць, хто кідае лозунгі, і пагрозліва махалі рукамі.

Украінцы ішлі павольна, уперавалку, знарок не спяшаліся, зусім як быццам і не чулі пагроз паліцыі і вокрыкаў: «Прэндзэй! Прэндзэй!»

Наперадзе ішлі людзі сярэдніх год — у кепках, у капелюшах, некаторыя ў акулярах, у пенснэ. Шырокія, моцныя твары глядзелі з упартай зацятасцю, вочы гарэлі. Больш пажылыя былі з жорсткімі вусамі, у такіх нават тарчалі люлькі ў зубах. А далей — світкі, кажухі, паліто перамяшаліся ў рознакаляровую масу — усё больш моладзь і моладзь. З-пад расхрыстаных каўняроў куртак, кажухоў віднеліся вышываныя ўкраінскія кашулі з жычкамі, завязанымі вузялком. Усе праводзілі беларусаў прывітальнымі ўзмахамі рук. Гэта ішла Украіна, якая паўстала супроць паноў і вітала паўстаўшую Беларусь, каб ісці далей разам да рашучага бою, да перамогі над ворагам. І апошнія словы кідалі амаль адначасова з абедзвюх калон:

— Сустрэнемся на барыкадах! Зустрінэмось на барикадах!

Ноч прайшла ў этапным астрозе. У неспакойным сне на голых нарах. Ранкам паліцыя пачала ўсіх перапісваць, пасля чаго палавіна арыштаваных была зараз жа забрана і адведзена на поезд. А дзе дзелася другая палавіна, Андрэй з хлопцамі так і не даведаліся. Такі падзел быў зроблены паліцыяй таму, што яна баялася новых дэманстрацый у дарозе. Поезд ішоў як быццам не на захад, а наадварот,— на ўсход. І ўжо ў наступную цёмную вільготную ноч арыштаваныя ў акружэнні спалоханай паліцыі пасоўваліся, як змрочныя цені, па вузкай вуліцы беларускага горада. Значыць, вярнуліся назад. Ну, а тыя, відаць, паехалі далей — на Украіну.

Нідзе не свяцілася ні аднаго агеньчыку,— ні ў дамах, ні на вуліцы; ногі траплялі ў ямы-выбоіны, напоўненыя вадой. Паліцыянты шчыльна, проста прытуліўшыся з бакоў да арыштаваных, саплі над галовамі, праглядалі шарэнгі.

Нешта чорнае, злавеснае паўстала перад вачыма, калі адзін з паліцыянтаў скамандаваў: «Стой!» Затым пачуліся таямнічыя стукі, бразгат ключоў, вісклівае рыпенне жалезных дзвярэй. Замільгалі ліхтарыкі. Увайшлі за турэмную браму. Сонны турэмны «пшодовнік» запісваў, правяраў, прымаў грошы ад арыштаваных і выдаваў квіткі, запісваў людзей, кожнага аглядаў з галавы да ног і за ўвесь час два разы сказаў:

— Шябры, пся крэў!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Вось ужо трэці дзень, як Андрэй у турме. Ён часта паглядае праз акно з кратамі на турэмны падворак, на працілеглы будынак адзіночак, дзе час ад часу ў вокнах з'яўляліся, як яму здавалася, счарнелыя твары. Ціха там, там свой свет думак і перажыванняў, там сядзяць па адным. Твары таямніча з'яўляліся ў зусім невялічкіх вокнах, як з цемры, і знікалі. Хоць у камеры шумна, у Андрэя на душы цішыня. Яму хочацца ўвесь час глядзець на тыя невялічкія вокны. Яны цягнуць яго да сябе і абуджаюць не то жудасць, не то пратэст. Сэрца баліць бадай фізічным болем, які аддаецца пры дыханні. Сэрца набрала ў сябе рознай гаркаты, пружынілася пад навалай і тады не чула болю, а толькі ўздым і ўздым. А цяпер намагаецца біцца роўна. Яно нібы імкнецца расці і расці. Не, не хопіць грудзей... Як рукі чалавека пасля цяжкай працы адыходзяць з болем, так цяпер адыходзіць сэрца Андрэя.

І таму попел яшчэ ўсё сыплецца і сыплецца на галаву, на душу.

## ВЁСКІ Ў ЖАЛОБЕ

Вёскі здаюцца апусцелымі. У снежнай белізне рассцілаюцца навокал памярцвелыя палі і яшчэ больш дадаюць людзям задумы, смутку. Жалоба, сапраўдная жалоба агарнула народ. Усе ведаюць аб яе прычыне, нават дзеці, бо не гуляюць на вуліцы, дапытліва пазіраюць на дарослых, на сваіх бацькоў. Зачынены і апячатаны клуб у

вёсцы Западяпка. Большасці людзей няма ў вёсцы, як няма і ў навакольных вёсках. Па няпісанаму загаду ўсе пайшлі на гасцінец, каб сустрэць і правесці ў апошнюю дарогу Ілью Рамановіча і Антона Ткачука. Пасля медыцынскага агляду іх будуць везці ў трунах. Ужо выкапаны дол для абодвух на могілках пры гасцінцы, дзе пад шумлівымі соснамі спяць дзяды, прадзеды. Там завіхаецца Пятрусь Хадыка — ён ужо намаляваў табнічку са словамі: «Спіце, дарагія таварышы. Вечная памяць вам».

З-за гары паказалася падвода. Конь ішоў павольным крокам. За першай ехала другая. А за падводамі — паход. З палявых дарог ішлі і ішлі людзі з вянкамі і ўліваліся ў кіпучую плынь на гасцінцы. А плыні і няма канца...

Мора рознакаляровых хустак. Ідуць хлопцы, дзяўчаты, мужчыны, жанчыны. Апіраючыся на кій, ідзе і стары Нічыпар Байдак у чорнай аўчыннай шапцы, з даўгімі заінявелымі вусамі. Ціхая сляза застыла ў яго на шчацэ. Ідзе і Анупрэй Чарняк — сур'ёзны, задуманы, ідзе Сцяпан Касцевіч з жонкай, падтрымліваючы пад руку Маланню, жонку Дзям'яна Гарагляда, якая захлінаецца ад слёз. Люба ідзе наперадзе з вянком, разружавелая ад марозу, красуня, згаранная, засмучоная. Быў ёй суджаны той, хто, прашыты панскімі кулямі, цяпер ляжыць у труне, што быў высокі і стройны, як серабрыстая таполя. Не збылося, Люба! Распачалася з панамі вялікая бітва, і яшчэ не адзін упадзе на шляху.

Вянкі ўсё плывуць і плывуць. Іх нясуць дзяўчаты, разружавелыя, адважныя, рашучыя. А перад падводамі Дзям'янаў Міця з такімі ж школьнікамі, як сам, усцілае дарогу яловымі лапкамі. На пярэдняй падводзе маці і сёстры аплакваюць ахвяры. На другой падводзе едуць бацькі і радня.

Паход жыве — нястрымны, бясконцы,— віруе, калышацца, хвалюецца... Сухі марозны снег рассыпаецца, рыпіць пад нагамі, і шум ад рыпення плыве па шляху. Творыцца нешта такое, чаго ніколі не бачылі памярцвелыя ў снежнай белізне палі. Гэтага паходу ўжо не стрымаць, хоць чорнаю хмарай навальваецца паліцыя — пешая і конная. Паход змятае яе з дарогі, але яна, спатыкаючыся, спяшаецца, каб не адстаць. Яе праклінаюць жонкі, маці, але яна, не чуючы на праклёны, бліскае вінтоўкамі абапал дарогі. Стараецца, каб сваімі наводзінамі не вы-

клікаць боікі,— такі загад старосты. Маноўры, панскія манеўры. У натоўпе, вядома, ёсць і шпікі.

У доўгім кажусе і шапцы-вушанцы, з кіем у руцэ, крочыць недзе ў сярэдзіне паходу Іван Паддубны. Максіма Рунду, як той ні рваўся ісці, пакінуў у Глушцы. Усё для таго, каб захаваць яго надалей ад вока паліцыі, бо як арыштуюць, то трэба будзе ўсё ствараць нанава. Рады камуністаў радзеюць з кожным днём. Ёсць яшчэ Аляксей Верас, але невядома, як ён доўга пратрымаецца. Ён цяпер ідзе таксама ў паходзе, недзе наперадзе, на чале групы, якая павінна раскідаць лістоўкі. Там ідзе і Якаў, сын Міхала, і яго браты, ідуць і сыны краўца Абрама, ідзе нямала з Глушца шаўцоў, краўцоў, цесляроў — усе, каму да сэрца дайшоў боль за пралітую кроў працоўных. Не адстае ад Аляксея Вераса і Арцём Світка. Не адмовіўся ўзяць з рук Аляксея лістоўкі, нават сказаў: «Што ты мне так мала даеш? Давай больш...» Не хацеў у свой час «бавіцца з паперкамі», а цяпер адчуў іх сілу, хоць яшчэ не да канца. Цяпер ідзе ззаду за Паддубным, не адстае ад яго ні на крок. Так загадаў яму Аляксей.

Паддубны тады, адразу ж пасля разгону дэманстрацыі, абышоў пляц, спыніўся там, дзе нешта цёмна-чырвонае расплылося на снезе,— паглядзеў на лужыну крыві, якая, здавалася, яшчэ дымілася. Падабраў нават некалькі гільз патронаў і паклаў у кішэню. Усё гэта зрабіў ён, Паддубны, адзеты ў доўгі кажух і шапку-вушанку, у чым і цяпер ідзе ў паходзе з кіем у руцэ. Хто ж мог западозрыць яго тады, крыху ссутуленага мужычка, які нават пытаўся ў прахожых: «Ці не бачылі — не прабягаў тут конь? I дзе ён падзеўся?» Разводзіў рукамі Паддубны і ішоў далей і пытаўся не толькі ў рабочых людзей, але і ў паноў — у розных там чыноўнікаў, а можа, і ў шпікаў. Тады ж увечары сеў у сані разам з Ганнаю Каравай і паехаў у свае Навасады. Сказаў Рунду, што вернецца заўтра, што трэба трымаць камуністаў напагатове, што добра было б, каб усіх шэсць забітых пахаваць у адным месцы, хоць бы пры шляху.

Пахаваць усіх у адным месцы, як ні прасілі бацькі забітых, староста не дазволіў — трох павезлі ў другі куток павета, куды Паддубны паслаў Захара Зубца. Праз дзень ён атрымае ад яго справаздачу і ўсё разам павязе ў Варшаву, у ЦК.

...Людзі паступова сцішылі хаду. Натоўп падзяліўся на два ручаі і акружыў дол. На пясчаным насыпе над тру-

намі сталі два пасівелыя дзядзькі ў амаль аднолькавых шэрых саматканых куртках. Адзін дзядзька ўзняў руку да натоўпу і, пачакаўшы, пачаў гаварыць. Гэта быў бацька Антона Ткачука. «Дзякуем вам, людцы добрыя, што прыйшлі правесці нашых сыноў на вечны спачынак...» І задыхаўся дзядзька, спыніўся. Пракаўтнуў горкую слязу і пачаў зноў: «Так... Загінулі яны за нашу агульную народную справу... Вунь яны... сядзяць на конях... груганы... Хай мяне яшчэ жывога кладуць у магілу разам з імі... Вось тут...» І дзядзька тыцнуў пальцам у дол. «А я скажу, што думаем мы ўсе,— не сціхне наша нянавісць да паноў, пакуль мы будзем жыць... Хай жа пухам будзе сынам нашым зямля наша,— ім, маладым, якім трэба было б толькі жыць ды квітнець...»

Скончыў дзядзька, і абурэнне, якое дагэтуль стрымлівалася, як хваля, пакацілася па натоўпу, зліўшыся з праклёнамі і плачам жанчын. Гулам разлеглася пад шатамі соснаў і паплыло над магіламі. Паддубны стаяў, апёршыся на кій. Апусціў галаву, як у глыбокай задуме, і слухаў. Цяжкую ж ношку яму прыйдзецца везці ў Варшаву, у ЦК...

* * *

Агата, жонка Апанаса Хмеля, засопшыся, убегла ў хату і, не скідаючы цёплай хусткі з галавы, тут жа апусцілася на лаву. Глянула спадылба на печ. Адтуль звесіліся пасмамі чорныя валасы Апанаса. Падклаўшы далонь пад шчаку, ён ляжаў і то западаў у дрымоту, то расплюшчваў вочы і глядзеў у сцяну, атынкаваную глінай, пабеленую вапнай, якая ўжо пацямнела ад даўнасці. Пачуўшы, што нехта ўвайшоў у хату, заварушыўся, але галавы не падняў. З часу сустрэчы з Андрэем і Вольгай у вёсцы Дубы, калі ён пацярпеў нечаканае для яго паражэнне, узяў сабе Апанас да галавы адно: «Калі так, няхай працуюць без мяне. Пабачым, што яны зробяць». Але ж нейкі выхад трэба знайсці рана ці позна. Апанас гэта ведаў і выхад знайшоў. Праўда, гэты «выхад» быў у яго прыхаваны даўно. Нарабіць тут, як ён думаў, геройскіх учынкаў, а потым, калі будзе пагражаць небяспека, «рвануць» за мяжу, у Савецкі Саюз. Гэтую вось думку ён і вылежваў на печы.

Але Апанас чагосьці марудзіў. Нечага яму не хапала — ці адвагі, ці доказаў для апраўдання сябе там, за мяжой. Бо як жа? Прайшлі масавыя арышты па ўсёй ваколіцы, а Апанаса Хмеля ніхто не крануў. Тое самае

і з Міронам Вадалеем. У яго вёсцы таксама шмат арыштавана, а ў Вадалея паліцыя зрабіла толькі вобыск. Тут, вядома, загвоздка. І Апанас думае, думае... Нават мала есць. Злезе з печы, сербане пару лыжак капусты, бразне лыжкай аб стол і ўстане.

Жонка паглядзіць на яго і скажа:

— Што ты — захварэў, ці што? Чаму не ясі?

— Не хочацца... Адчапіся...— буркне Апанас і выйдзе на двор. Вярнуўшыся, зноў палезе на печ.

І вось надышоў незвычайны дзень для ўсяго павета — дзень, у які адбылася дэманстрацыя ў Глушцы. Па сутнасці, аб падрыхтоўцы да яе Апанас нічога не ведаў, але чуткі даходзілі. «Напэўна, балбатня гэта ўсё,— думаў ён сам сабе,— што яны зробяць, гэтыя агітпропы? Яны ж увесь час сабатавалі масавыя выступленні...»

Але гэты дзень усё ж такі надышоў. Вёска апусцела. Жонка настойвала паехаць у Глушэц на рынак, прадаць пару пудоў збожжа і купіць што-нішто, неабходнае для гаспадаркі. Але Апанас рашуча адмовіўся.

Мінуў ранак, поўдзень... Агата, закалыхаўшы дзіця, некуды пайшла. Апанас можа ляжаць на печы спакойна. Але штосьці доўга няма Агаты. Відаць праз вокны, як па вуліцы па снезе прабягаюць, праходзяць людзі. Змрокі непрыкметна ўжо асядаюць па кутках. Значыць, пачынае хіліцца к вечару. Апанас ляжыць на печы, думае, дрэмле...

Але вось увайшла Агата і села на лаву. Шчокі ў яе чагосьці мокрыя, як быццам ад слёз.

— Ляжыш і не ведаеш, што робіцца на свеце... Нічога ўжо табе не трэба...— сказала яна панура.

Апанас прыўзняў галаву і глянуў на Агату.

— А што робіцца?

Потым, прыгледзеўшыся, спытаўся:

— А чаго ты плачаш? Абрыдла ты мне са сваім плачам.

— Плачу... Пытаешся, чаго плачу? Не я адна плачу сягоння. Вунь у Глушцы з панамі бой быў. Ёсць, кажуць, забітыя і параненыя...

— Хто — паны забітыя?

— Дзе там паны! Не так лёгка іх забіць. Нашы забітыя. Толькі не ведаю, колькі...

Апанас прыціх, на момант задумаўся і засоп носам. Доўга маўчаў. Потым не злез, як звычайна, а саскочыў з печы. Атросся, паправіў валасы і, прыгнуўшыся, глянуў у вокны — на вуліцу, на падворак.

— Аляксей, не ведаеш, прыехаў?

— Прыехаў,— адказала Агата,— я толькі ад іх. Ад яго ж я гэта ўсё і пачула.

Апанас апрануўся і падаўся да Аляксея. Ад яго даведаўся, што Андрэй Касцевіч арыштаваны, што Аляксандр Сучок не ўдзельнічаў у дэманстрацыі, пайшоў у раён Дзядоў арганізоўваць валасны камітэт Грамады.

— А Паддубны? — спытаўся Апанас.

Аляксей наўмысна адказаў, што нічога не ведае аб Паддубным.

Апанас задумаўся. Яго бралі дрыжыкі. Стрымліваўся, як мог, каб не заляскаць зубамі. Яму здавалася, што грунт зусім выпаўзае ў яго з-пад ног, што ён, Апанас, тоне, што яго ўжо няма. Аляксей непрыкметна сачыў за ім і ўнутрана ўсміхаўся.

— Што ж будзем цяпер рабіць? — пасля доўгага маўчання спытаўся Апанас.

Аляксей паціснуў плячыма:

— Што ж будзеш рабіць? Якое будзе ўказанне ад акругкома, тое будзем рабіць.

— Гм... указанне... можна памерці, пакуль дачакаешся таго ўказання.

— Указанне патрэбна, бо становішча, брат, цяжкое.

— Вось іменна, калі цяжкое, то трэба не чакаць указанняў, а дзейнічаць,— не сказаў, а пырснуў Апанас.

— Ну... я на сябе адказнасці ўзяць не магу. Ёсць жа дысцыпліна,— развёў рукамі Аляксей.

— Ну, з табою кашы не зварыш,— адказаў Апанас і ўстаў, каб ісці.

Аляксей зразумеў, што Апанас намерыўся нешта рабіць, і таму палічыў патрэбным папярэдзіць:

— Што ты задумаў? Не зрабі чаго-небудзь непуцёвага.

Такая заўвага канчаткова вывела Апанаса з раўнавагі.

— Вучы вучонага... Бывай здароў...— буркнуў ён і выйшаў з хаты.

Аляксей праз акно правёў яго вачыма.

* * *

Апанас сядзеў у канцы стала, на покуце, і вячэраў,— неяк, быццам знарок, хутка глытаў сопкую гарачую бульбу і ўсё нешта думаў. Жонка сядзела тут жа, за сталом, трымаючы дзіця на каленях, студзіла яму бульбу, заахвочвала да ежы. Ведаючы натуру Апанаса, баялася пачаць гутарку. І так сядзелі муж з жонкай, вячэралі і быццам не заўважалі адно аднаго.

Аднак жонцы надакучыла доўгае маўчанне, і яна, каб што-небудзь сказаць, прамовіла:

— Нешта сёння табе да смаку бульба. Ясі ў ахвоту.

— А табе што — шкада? — кінуў Апанас і засоп носам.

— Чаго шкада? Еш на здароўе. Цябе і зачапіць няможна, як тую скулу.

— Ты сама скула. Знай сваё месца...

Агата ўздыхнула і пашкадавала, што пачала размову.

— Заўтра павязеш у млын сама, бо мяне не будзе.

— А куды ж ты дзенешся?

— Гэта мая справа.

— Усё твая справа, усё твая справа, а калі ж будзе мая? Добра, няхай твая... Хоць печ на пару дзён будзе не занятая.

Гэтага толькі і трэба было Апанасу. Ён стукнуў з размаху па стале кулаком, што аж міска з бульбай падскочыла.

— Цыц! — крыкнуў і, тыцнуўшы пальцам у напрамку печы, дадаў: — Грызі яе... Вось яна...

— Звар'яцеў... Ой, божа, божа...— і Агата паківала галавою. Затым устала з дзіцем на руках, выцерла яму губы і ласкава сказала:

— Хадзем, сынок, спаць...— і пайшла да калыскі. Тут жа ўслед за Агатай устаў і Апанас, падышоў да вядра і напіўся вады. Затым доўга глядзеў у акно. Ноч была цёмная. Дзе-ні-дзе па адной прасвечвалі зоркі на туманным небе.

«Што ж, можна ісці»,— падумаў Апанас і, адышоўшы ад акна, пачаў апранацца.

— Калі ж вернешся? — запыталася жонка.

— Калі трэба будзе,— адказаў Апанас і выйшаў з хаты.

Ішоў знаёмаю дарогай у вёску Дубы, ішоў і думаў: «Я яшчэ сваё пакажу. Яны думаюць, што толькі яны героі. Сапхнуць каго і самім... Не...»

У вёсцы Дубы Апанас зайшоў да Арцёма Світкі. Здолеў гэтага гарачага хлопца перакапаць, што заўтра, іменна заўтра, трэба арганізаваць дэманстрацыю тут, у Дубах, і паходам ісці да воласці.

— Трэба адказаць ударам на ўдар. Разумееш? — цвярдзіў Апанас,— такая, толькі такая тактыка рэвалюцыі.

— Значыць, ты вяртаешся зноў да працы? — запытаўся Арцём.

— Вось дзіўны. А хіба... а хіба ж я яе пакідаў? Што ты? Што ты? — заікаючыся, гаварыў Апанас.

— Ды не... нічога... Я толькі рад гэтаму...

— Ну, дык вось, брат, ідзі мне пакліч толькі трох чалавек,— і Апанас назваў каго.

Пасля нарады, на якой быў распрацаваны план, Апанас сказаў:

— Ну, усё. Зразумела? Дзейнічайце... А цяпер пасядзіце тут паўгадзіны, абавязкова паўгадзіны...— і Апанас памахаў пальцам.— А я зараз пайду. Куды пайду, гэтага ніхто не павінен ведаць. Канспірацыя. Заўтра, можа, мяне ўбачыце, а можа, і зусім не ўбачыце. Ну, я пайшоў.

Так, ахутаўшы сябе таямнічасцю, Апанас знік за дзвярыма. Накіраваўся на сваю былую «штаб-кватэру», дзе жыла адна маладзіца-ўдава. Тая сустрэла Апанаса са здзіўленнем:

— Ой, так нечакана. Дзе ж ты прападаў, Апанас?

— Раскажу пасля. А зараз патушы агонь і нікога не пускай у хату.

Маладзіца ўсё выканала...

Назаўтра пасля снедання людзі пачалі збірацца ў канец вёскі пад крыж. Збіраліся хутка — ішлі і беглі. Усіх абляцела чутка, што Апанас Хмель «аб'явіўся», што ён павядзе людзей. Збіраліся, чакалі.

Але дзе ж той Апанас? Павінен быў бы ўжо быць, а яго няма. Затое паходжвае наперадзе Арцём Світка з тоўстым кіем у руцэ і з ім тры хлопцы. Народу сабралася шмат, па дарозе далучацца іншыя вёскі, і будзе вялікі паход — на славу! Трэба было б ужо ісці. Але Арцём Світка чакае сігналу. Адкуль павінен быць той сігнал, Арцём і сам не ведае. Вельмі ж ужо стаў канспіратыўны Апанас! Толькі сказаў учора: «Пачуеце сігнал — свіст — і тады ў паход...» Ну, можа, яно так і лепш. Толькі адно непакоіць хлопцаў, што паход будзе без сцяга. Калі ўчора сказалі Апанасу, што патрэбен сцяг, бо як жа без яго, Апанас на момант быў як быццам збіты з тропу. «Так, вядома, сцяг патрэбен, без сцяга які ж паход...» — сказаў ён, а потым махнуў рукою і адным гэтым махам вырашыў справу. «Яго ж за ноч не зробіш,— сказаў ён,— няма матэрыялу, ды і лозунгі трэба пісаць. Не, абыдземся без сцяга...» І вось народ сабраўся, каб выказаць сваю волю, а яна нідзе і не напісана.

Хлопцы чакалі сігналу, і настрой у іх як-ніяк не быў на вышыні.

У натоўпе стаяла русавалосая маладзіца, гаспадыня хаты, дзе начаваў Ананас. Жанчыны тоўпіліся навокал, гутарылі з ёю. Нават дзе каторая з жанчын пыталася:

— Ананас начаваў у цябе?

— Ды не... Я яго і ў вочы не бачыла.

— Дык, можа, ужо зараз надыдзе...

Жанчыны паводзілі вачыма навокал, шукаючы Ананаса. Але дзе ты знойдзеш, калі яго тут няма. Ля русавалосай маладзіцы стаяла чарнавалосая жанчына з карымі, крыху пукатымі вачыма, з крыху дзюбатым носам, такая смуглявая, і ні з кім не гутарыла. Цікавая жанчына! На галаве ў яе белая вязаная хустка. Жанчына апранута ў кароткую карычневую куртачку сваёй работы, з таліяй і крыльцамі на бёдрах. Андарак у гэтай маладзіцы новы, у розныя каляровыя палоскі: чырвоныя, жоўтыя, сінія. Наперадзе бялей снегу прыняты фартух з квяцістай вышыўкай. На нагах — боты. Жанчына штурхнула сваю суседку і сказала: «Пара!» Суседка свіснула і не стрымалася — зарагатала.

— Мусіць, табе здалося, што ты ў лесе статак пасеш? Але ж і свіснула... аглушыла...— сказала адна з жанчын.

А тым часам наперадзе людзі ўскалыхнуліся. Нехта падняў руку і махаў, паказваючы напрамак — наперад. Натоўп рушыў. Хлопцы зацягнулі: «Смело, товарищи, в ногу...» Але як людзі ні ўглядаліся наперад, каб убачыць Ананаса, яго нідзе не было.

Прыйшлі ў вёску, якую ўпоперак перасякала шаша, што вяла ў воласць. Не даходзячы да шашы, людзі пачулі свіст. Натоўп пачаў прыцішаць ход. На прызбу хаты ўскочыла смуглявая жанчына, узняла руку і пачала гаварыць. Голас быў як быццам жаночы і як быццам — не. Словы вылятал адрывіста, яна гаварыла аб дэманстрацыі ў Глушцы, аб ахвярах, аб помсце панам і што рэвалюцыя недалёка.

Хлопцы ды і жанчыны з вёскі Дубы нечакана для сябе пазналі ў гэтай маладзіцы Ананаса Хмеля. Глядзелі і не верылі сваім вачам — ён ці не ён.

— Ё-ё-н! — працягнуў Арцём Світка.— Ну і выкінуў штуку. Ха-ха-ха... Хоць бы валасы, чорт, направіў, а то чуб вылазіць з-пад хусткі... Ну, дае пылу...

Людзі маўчалі, слухалі. Тыя, хто пазнаў Ананаса, перашэптваліся. Жанчыны пераглядаліся з усмешкамі.

Урэшце гэты незвычайны прамоўца скончыў і саскочыў з прызбы. Натоўп крыкнуў «ура» і рушыў далей.

Калона ішла па шашы з песняй, а насустрач ёй ужо імчалася конная паліцыя. Даляцеўшы, пачала разганяць. Людзі — хто павярнуў назад, а хто звярнуў убок.

...Увечары таго ж дня, можна сказаць, што ўначы, у вёсцы Дубы паліцыя арыштавала шмат удзельнікаў дэманстрацыі, у тым ліку і Апанаса Хмеля. Калі ён пад канвоем прыбыў у пастарунак у Глушэц, там ужо былі Аляксей Верас, Аляксандр Сучок і Іван Капанец.

## НА МЯЖЫ НЕБЯСПЕЧНАГА

Адпачыўшы пару дзён пасля ўсіх трывог і турбот у хаце Ганны Каравай, Паддубны сабраўся ехаць у Варшаву. Ганна адпрасавала яго запасную пару бялізны, шэрую кашулю ў дробныя белыя палоскі з адкладным каўняром, каб можна было завязаць гальштук, падрыхтавала новы цёмна-карычневы касцюм з камізэлькай. Ведала Ганна, што Паддубны едзе некуды далёка ў горад і што, як заўсёды, не хутка вернецца. Прыбірала яму гэта ўсё старанна, з любоўю, і з сумам перажывала гэтыя трывожныя хвіліны расставання. Цярпліва маўчала. Са шчырай турботай, як быццам выпраўляючы чалавека за свет, пыталася ў Паддубнага, можа, яшчэ пакласці ў чамадан тое-сёе з ежы, з адзежы. Стаяла хвіліну над ім, чакала адказу. А Паддубны, седзячы на лаве, усё нешта запісваў у свой нязменны блакнот, які трымаў на калене, блакнот — гэты неадлучны спадарожнік падпольшчыка. Там усё пісалася па-свойму. Пад словам «вясна» разумелася партыя, пад словам «дуб» — ЦК і гэтак далей. Калі прачытаць спачатку да канца, то атрымаецца ўражанне, што гэта запіска гаспадара, які накідаў план сваіх гаспадарчых работ.

І таму толькі адзін Паддубны разумеў свае запісы. На запытанне Ганны ўзнімаў галаву і, не ведаючы, у чым справа, казаў неўпапад:

— Га? Што?.. Ага... Ну, пакладзі, пакладзі...

Адказваў так, каб абы адказаць, але ўсё ж такі на хвіліну праводзіў вачыма Ганну. А яна мяккай жаночай хадой праходзіла, як быццам плыла па хаце,— рослая, моцная маладзіца з бялявымі, амаль далікатнымі, шчокамі. І прамы прыгожы нос, і свежыя чырвоныя вусны, і

бровы, тонкія, густыя, і цёмныя, глыбокія вочы з вішнёвым адлівам — усё гаварыла аб нязгаслай жаночай красе. З-пад белай хусткі выбіваліся хвалямі непаслухмяныя пасмы валасоў, і таму, па звычцы, Ганна часта папраўляла хустку.

Ганна ўся душою адданая Паддубнаму, хоць у гэтым сама сабе не прызнаецца. Гэта прыйшло з гадамі, але Ганна ніколі не памкнулася паказаць сваіх пачуццяў і заўсёды ставілася да Паддубнага, як да падпольшчыка,— хавала дзе-што нават тады, калі Паддубны забываўся сам схаваць. Мые яму бялізну, купляе кашулі, перадае вясковыя навіны, гаворыць аб паводзінах і настроях аднавяскоўцаў. У зімовыя дні сядзіць за кудзеляй, як кветка, і вядзе нітку за ніткай. Работа гарыць у яе руках. Хата прыбрана чыста — стол, лавы, падлога памыты, паскоблены, на невялікіх вокнах вісяць фіранкі і стаяць кветкі. На пярэдняй сцяне паміж вокнамі вісіць вялікі партрэт у рамцы — гэта партрэт яе мужа Ларывона Каравая. Ён стаіць ва ўвесь рост, малодшы унтэр-афіцэр, стаіць «смірна», з вінтоўкай ля нагі. Востры, гранёны штык вінтоўкі нароўні з ім. Прыгожыя вусы салдата падкручаны. Ён глядзіць адкрытымі шэрымі вачыма проста на дзверы і нібы крыху ўсміхаецца. Хто заходзіць у хату, перш вітаецца з Ларывонам. А за ім, за спіною — сад, сад... Ганна прывезла гэты партрэт з бежанцаў і захоўвае, як рэліквію. Ларывон, узводны камандзір у грамадзянскую вайну, загінуў на вачах Паддубнага, калі рабілі вылазку на калчакоўцаў. На дзесяць год быў старэйшы за Ганну Ларывон, ажаніўся з ёю яшчэ перад ваеннай службай і пакінуў яе з хлопчыкам. Ганна ў сваім адзіноцтве часам спыніцца перад партрэтам Ларывона і заплача. Выйшла б замуж, вядома, каб не дзіця. І, па-другое, у Ганны беднасць — мала зямлі, так што і ў прымакі ніхто не захоча ісці. А цяпер у Ганны такое пачуццё, што ёй і гэтага не трэба. Іван Паддубны, стары халасцяк, пасяліўся ў яе некалі часова, бо не было ў яго ніякай мэты, каб асесці ў вёсцы і займацца гаспадаркай. Усё сваё жыццё Паддубны аддаў іншаму — аддаў справе рэвалюцыйнай барацьбы. Так і ідзе Паддубны праз жыццё адзін і лічыць жаніцьбу небяспечнай для сябе. Калі ж у сваіх вечных падарожжах, як кажуць, «залятае» на пару дзён да Ганны, адпачывае душою ў гэтай утульнай, чыста прыбранай хаце. Прыемна яму глянуць увечары ў печ, як палаюць, трашчаць дровы, наесці капусты з мяккім, духмяным хле-

бам, спечаным па дубовым лісці або на аеры, пайсці над павецць насячы дроў. Ганна адгаварвала, каб ён не браўся за работу, казала, што яна зробіць усё сама, але Паддубны, вядома, не слухаўся. Ганна шанавала Івана, як шануюць у вёсцы адукаванага чалавека, шанавала і за тую старую дружбу Паддубнага з яе мужам Ларывонам. Нямала каштавала Паддубнаму перакапаць Ганну, каб яна трымалася з ім проста, звычайна, як роўная з роўным. Мог бы пасяліцца і ў брата, але ў таго маленькая хатка, а дзяцей шасцёра. Няма дзе там і павярнуцца. Таму Паддубны не дамагаўся свайго надзелу зямлі — нешта каля дзвюх дзесяцін — і брат абрабляў усю зямлю. А за гэта абрабляў і паўтары дзесяціны Ганніных: не толькі араў, але і касіў, вазіў ёй дровы і наогул дапамагаў ва ўсім.

Ад'язджаючы, Паддубны пакідаў ёй часам некалькі злотых са свайго сціплага бюджэту, што атрымліваў у ЦК на дарогу.

— Гадуй сына, Ганна, гадуй, каб рэвалюцыянерам быў...— жартаваў калі-нікалі Паддубны.

— Ой, цяжкая гэтая доля,— уздыхала Ганна,— вось і ты ўвесь час знаходзішся як між небам і зямлёю, усё ў дарозе і ў дарозе, і ўсё бойся кожнага антыхрыста.

Паддубны ціхенька смяяўся і гаварыў:

— Каб мы так баяліся, як ты кажаш, то паны нас ні крошелькі не баяліся б. А паны нас баяцца, значыць, мы не трусы, Ганна, мы моцныя. Вядома, гэта нялёгка. Але прыгнёт, у якім жыве народ, кліча да змагання. Трэба, каб усе людзі на свеце, Ганна, былі шчаслівыя. Ёсць за мяжою Савецкі Саюз — вось наша апора, наша сіла. Там людзі ўжо здабылі агульнае шчасце. Будзе гэта і тут. Кожны дзень нашай работы, нашай барацьбы набліжае гэты час...

Паддубны лічыў сваім законам, што ўсюды, дзе толькі можна, трэба кідаць зярняты свабоды,— хоць што-небудзь ды застанецца ў душы слухача.

Людзі ў вёсцы доўга думалі, што Іван Паддубны ад'язджае некуды на заробкі або шукае работы. Гэтую думку распаўсюджвала і падтрымлівала Ганна, і таму, калі Паддубны прыязджаў, усе лічылі яго прыезд натуральнай з'явай. Ну што ж, зарабіў чалавек крыху грошай і прывёз на падтрыманне гаспадаркі, тым больш што ўсе гаварылі аб Паддубным і Ганне, як пра мужа і жонку, і нарэшце прывыклі да гэтага.

Але... ад некаторага часу ў людзей пачало з'яўляцца

падазрэнне, што нешта не так. Праўда, у часы партызанскай барацьбы людзі ведалі, што Паддубны звязаны з партызанамі, але ніхто ніколі не бачыў яго са зброяй. А тады ўвесь народ падтрымліваў партызанаў, так што нічога дзіўнага не было ў такіх паводзінах Паддубнага. Знайшоўся быў адзін вырадак, што працаваў лесніком у ляснііцтве Залатой гары. Ён амаль кожны вечар прыязджаў дахаты начам і кожны ранак ад'язджаў. Камендант пастарунка Качура, па загаду павятовай камендатуры, сустрэўся з ляснічым Пшыбыльскім і даручыў яму, каб той сярод лесікоў знайшоў даносчыка. Такі вырадак знайшоўся, і праз яго загінула сястра Ганны — Таццяна. Народная пільнасць высачыла злачынцу, і ў адну цёмную ветраную ноч прыйшоў да яго ў хату Сава Супрун з чатырма партызанамі. Злачынцу павялі ў лес. Дапытваў яго сам Паддубны са Сцяпанам Кавалём.

Але гэта ўсё было тады... А цяпер жа партызанаў няма, а Паддубны ўсё ездзіць некуды і ездзіць.

І адзін раз заявілася была да Ганны паліцыя. Вобыску не рабілі, а толькі спыталі, чым займаецца Паддубны. Ганна адказала, што паехаў шукаць работы, а куды — і сама не ведае. Паліцыянты не маглі адарваць вачэй ад Ганны — іх некалькі раззбройвала яе краса. Пасядзелі, пакурылі і пайшлі.

А потым пан Чарапіцкі, па загаду Качуры, праседзеў у гародчыку ля Ганнінай хаты амаль усю ноч, бачыў праз акно Паддубнага, стараўся запомніць рысы яго твару. Затым пайшоў на вакзал і пачаў чакаць. Дачакаўся. Паддубны сеў на поезд, а ўслед за ім Чарапіцкі. Так правёў ён Паддубнага аж да Вільні і там згубіў з вачэй. Кожны вечар прыходзіў за паўгадзіны да прыходу поезда, пакуль зноў не ўбачыў Паддубнага пры праверцы дакументаў у дзвярах вакзала. Але тут яго заўважыў Паддубны, і ўся «аперацыя» Чарапіцкага ў дарозе правалілася.

З таго часу Паддубны быў больш асцярожны, калі прыязджаў у Навасады. Акружаў сябе дазорам Ганны і мясцовых камуністаў. І паліцыі ўжо цяжка было напасці на след Паддубнага. Але Чарапіцкага перавялі ў глушэцкую дэфензіву для шпікоўскай службы, і ён зноў намацаў нейкія ніці, якія вялі да слядоў Паддубнага. Ідучы па гэтых ніцях, Чарапіцкі арыштаваў у свой час Вольгу. Як ні таптаўся потым Чарапіцкі па вёсках, ніці блыталіся, і ён вяртаўся ні з чым. Не дапамагло і тое, што паведаў

вёску Апанаса Хмеля — Забалоцце і вёску Дубы, што па-бываў у хаце Міропа Вадалея. Нідзе не ўдавалася знайсці смуглявага чалавека ў карычневай кепцы і ў плашчы зеленаватага колеру. Засталіся толькі станцыі, паязды — там трэба пільнаваць.

Паддубны ж знайшоў цяпер толькі адзін прыпынак у глушэцкім раёне — гэта ў Максіма Рунды, так сказаць, пад самым носам паліцыі. Рунда, гэты пястомны, рухавы хлопец, заўсёды першы ведаў усе навіны ў Глушцы. Калі поїдзе нават толькі ў адно месца — у карчму Шчыгельчыка, то даведаецца аб усім, аж да такіх дробязей, што ў старосты здох гончы сабака, як ні ратавалі яго лекары, што хутка будзе новы камендант пастарунка, што ў самага беднага яўрэя, шаўца Майсея Вольха, нарадзілася восьмае дзіця, што дачка гаспадара невялічкай чайной, прыгожая дзяўчына Фэйга, не хоча выходзіць замуж за аптэкара, бундаўца Бурштэйна. Не дапамагаюць угаворы і сваркі не толькі яе старых бацькоў, але нават і рабіна. Увесь Глушэц гаворыць аб гэтай незвычайнай з'яве, а цырульнік Ёшка ашчэрваецца, як кот, і ківае галавою на хату краўца Абрама, бо нібы вінаваты ў гэтым яго сын камуніст Грыша. Шмат чаго расказвае Рунда, і Паддубны ад'язджае ад яго, ведаючы бадай усё, што адбываецца ў Глушцы.

Калі ж на глушэцкім бруку з'явіўся пан Чарапіцкі з блішчастай кулясай у руцэ, то і гэта не абмінула карчмы Шчыгельчыка. Некаторыя ведалі ўжо, як новы шпік завецца. Паддубны, пачуўшы ад Рунды пра Чарапіцкага, спытаўся:

— Ці не пераведзены ён з Залатой гары?

— Ага... так, так, з Залатой гары,— адказаў Рунда,— я чуў гэта, але забыўся назву... Так, так, з Залатой гары...

— Гм...— мармытнуў Паддубны.— Ён ведае некаторых нашых хлопцаў. Варта было б наставіць яму якую-небудзь пастку.

Як ні сачыў, як ні прыглядаўся Чарапіцкі, замяшаўшыся ў калону і ідучы за трунамі забітых, нідзе не мог убачыць Паддубнага. Так Паддубны і вярнуўся аж у Навасады, і цяпер, поўны думак і засцярогі, збіраўся ў вялікую дарогу. Яго даклад у ЦК, на ўсім відаць, павінен мець вялікае значэнне. Палітычная свядомасць мас узрасла высока, далейшую тактыку барацьбы трэба будаваць ужо на новай, вышэйшай аснове. Трэба, каб польскі пралетарыят у сваёй палітычнай барацьбе больш ярка пад-

крэсліваў права беларускага і ўкраінскага народаў на нацыянальнае самавызначэнне. Трэба ўзяць курс на завяванне інтэлігенцыі, і не толькі беларускай, але і польскай, для выкарыстання яе ў барацьбе за дэмакратыю. У першую чаргу трэба звярнуць увагу на настаўніцтва, на літаратараў, на адвакатуру, на ўрачоў.

Шмат чаго памеціў у сваім блакноце Паддубны, седзячы на лаве ў хаце Ганны Каравай. Рыхтаваўся да даклада, можа, нават і да вялікай спрэчкі. Ды тут вось... Ганна. Каторы ўжо раз трэба пакідаць яе, устрывожаную, засмучаную і цярплівую. І заўсёды ў душы застаецца спачуванне да яе — да яе такога незайздроснага лёсу. А Ганна жыла, жыла адна, адбівалася ад жартаў хлопцаў, нават была як быццам замкнутай у сабе і толькі на кожны шорах ля акна ўначы, на кожны стук падымала галаву. Можа, гэта ідзе ён, Іван. А Івану і ў галаву не прыходзіла, што маладзіца мае права на асабістае жыццё, што магла б неяк давесці сябе да ладу — знайсці чалавека і жыць на сваёй невялічкай гаспадарцы. Ганна ж уся служыла яму, яго справе,— была не толькі вартаўніцай, але часам і дарадцай, што Паддубны лічыў зусім натуральным. Яму патрэбна была канспіратыўная кватэра, верная гаспадыня, якая б магла трымаць у таямніцы ўсё, што рабілася Паддубным для вялікай справы. І Ганна ганарылася сваім становішчам. Паддубнага цешылі адносіны Ганны да яго работы, але і гэта ён лічыў у парадку рэчаў. Бо як жа можа быць інакш? У галаве не месціцца, каб Ганна была супроць, каб думала па-іншаму. А жыццё плыло, ішлі гады... Прыезды і ад'езды Паддубнага час ад часу пакідалі след у душы Ганны, навявалі задуму, ёю авалодвала нясмелае жаночае хваляванне. Калі сядзела за кроснамі вясною, распусціўшы шаўковую красу сваіх цёмных, хвалістых, з ледзь жаўтаватым адценнем валасоў, увесь час бачыла пясчаную дарогу за вёскай, якая вілася па зялёнай мураве на ўзгорак да ляска. Ёй здавалася, як у сне, што гэта яе палотны сцелюцца і сцелюцца аж некуды да бору, па шляхі — у шырокі свет. Прад вачыма праплывалі палі, сенажаці, і бор шумеў над дарогай. Па дарозе ідзе яна, Ганна, рослая, прыгожая, як вішня,— плыве сваёй лёгкаю хадою, а сосны ціхім шумам навяваюць ёй песню аб шчасці, вядуць да нязнаных краін, дзе сонца купаецца ў сініх азёрах. Нехта з-пад неба набліжаецца да яе і махае рукою...

Салодкая, тужлівая стома абдымала Ганну, як быццам

хтосьці блізкі, дарагі туліў яе да сябе. І тады сама сабою прарывалася песня:

Не шуміце, зялёныя лугі,
Не задавайце мне, маладзенькай, тугі...

Старая песня, як той крыж за вёскай, матчына песня, якая запала ў душу яшчэ ў малепстве і ўсплывае на памяць у цяжкія, самотныя хвіліны.

Як жа рада была Ганна тады, у дзень дэманстрацыі ў Глушцы, калі ўвечары прыцемкам падышоў да саней Паддубны. Яна думала, што ён, можа, забіты або паранены ці арыштаваны. Хоць сама пабывала ў пастарунку і пасля вызвалення адтуль трэба было б хутчэй пакінуць Глушэц, Ганна чакала яго з санямі па падворку аднаго мешчаніна. Непакоілася, нават плакала, траціла надзею, але чакала. Па завулку пранасілася конная паліцыя, заглядала па падворкі, а Ганна ўсё чакала. І вось цяжкаю хадою наблізіўся са змроку ён, у доўгім кажусе і з кіем у руцэ.

— Ганна, ты?

— А гэта ты? — адказала яна.— Ой, божа мой, што я перадумала... Ой, Іван...

Ганна ўсміхнулася. Нахілілася пад санямі і хутка выцерла слёзы, каб ён іх не бачыў. Але Паддубны хоць не бачыў, але адчуў іх, і ў адным яе воклічы — «Ой, Іван...» ён нечакана адзначыў, як нешта злёгку кальнула яго ў сэрца. Міжволі зморшчыўся. Ганна, нахіліўшыся, папраўляла салому ў санях. Паддубны дакрануўся да яе галавы і ціха спытаўся:

— Ты што — плакала?

Ганна маўчала, засцілала дзяругай сядзенне. Выпрасталася, выцерла твар хусткай і сказала:

— Кажаш, плакала... А што, ты мне чужы? — закончыла з ноткай пратэсту. Цёплае пачуццё агарнула Паддубнага. Гэтае пачуццё можна было б назваць прымірэннем да такіх патрабаванняў жыцця, ад якіх Паддубны быў далёка, быццам за глухою сцяною лесу. Усю дарогу быў ласкавы да Ганны, задорыста, нібы для забавы пацягваў лейцы, і буланы конік брата жвава бег па праезджанай санцай дарозе. Пасля дэманстрацыі шум яшчэ не сціхаў у галаве, і страты таварышаў час ад часу ўзварушвалі сэрца. Хоць у барацьбе без ахвяр нельга абысціся, але ўсё ж такі страта ёсць страта. «Пралетарыят мае паражэнняў цэлую гару, а перамогу будзе мець толькі ад-

пу...» — успомпіў Паддубпы Маркса. Але па гэтым адзіпым, слаўпым шляху сэрца абрастае церпямі. Колюцца церні, колюцца... І аднекуль з глыбіні свядомасці выплывае думка і хутка зпікае: «Добра, што Ганна сядзіць побач,— аддапы, шчыры чалавек, які сягоння печакапа для сябе закрапуў за жывое... Патрэбен, відаць, друг у жыцці...»

Паддубны цмокпуў па каня і крыкпуў: «Но!», каб не думаць далей пра гэтую, пезвычайпую для яго, справу.

Ганна нахілілася да яго і спытала, ці пе змерзлі ногі, паправіла дзяругу, пацягала больш саломы.

— Нічога, Ганна, добра. Глядзі сябе.

«Вось якая яна. Паехала за ім на дэманстрацыю, каб прывезці назад жывым або памершым...» І цяпер едуць назад, больш маўчаць, чым гавораць. Сосны і елкі выцягваюць пад імі свае аснежаныя галіны, як дзівосныя рукі. Ноч белізной, здаецца, разлеглася ў пpасторах, а з далёкіх лясных глыбінь чуецца топкі, працяглы гул. Калі ўслухацца ў яго, задумаўшыся, ён можа закалыхаць. А дарога далёкая, снежная, больш лясная, зацішпая. І ў тугія думкі ўрываецца яна — Ганна. Дзіўна ўсё гэта.

Паддубны адганяе такія думкі, гаворыць сам сабе: «Усё гэта трэба ўспрымаць прасцей. О, прастата! Прастата — вялікая рэч. Гэта — сіла. Гэта — злучэнне розуму і пачуцця ў адну гармонію, у адно цэлае. Перавага халоднага розуму над імкненнямі пачуцця прыводзіць да аднабаковасці, вядзе чалавека міма жывой плыні жыцця з яго радасцямі і смуткамі. І, наадварот, перавага пачуццяў абяззбройвае розум, знясільвае яго, асляпляе...»

Пасля такіх вывадаў Паддубны адчуў, што сэрца пачало супакойвацца. Стала ясней у галаве. Ганна перастала быць страхам, да якога трэба падыходзіць з асцярогай або і зусім абысці. І ўжо са спакойнай душой, тонам прыхільнасці Паддубны звярнуўся да Ганны:

— Што задумалася, Ганна? Усё маўчыш.

— О, так. Рада, што едзем дахаты, бо магло б быць горш...

— У нашым жыцці, Ганна, трэба заўсёды мець на ўвазе, што можа быць горш.

— Адначнеш у хаце, каб па горшае больш сілы прыбыло,— сказала Ганна нават вясёлым голасам, у якім чулася ўсмешка.

Паддубны паглядзеў на яе дзіўным позіркам, як быццам азадачаны ці здзіўлены. Усміхнуўся.

— Гаворыш у толк...— сказаў ён і крыкнуў на каня.

...Цяпер жа, пасля пахавання ахвяр, Паддубны зноў у хаце Ганны. Маўклівы, задуменны. Усё піша і піша. А на душы ляжыць нешта недагаворанае, не сказанае да канца. Каму? Ды ёй, вось гэтай Ганне, што мяккаю хадою праплывае па хаце. Прынесла з каморы вязаныя чорныя шкарпэткі і паказала Паддубнаму. Гэта даўнія шкарпэткі, звязаны некалі для мужа Ларывона. Ляжалі ў скрыні без патрэбы. Ганна кладзе іх у чамадан Паддубнага. Цяжка на сэрцы. Іван толькі пераначуе, і заўтра хата апусцее зноў. Усё роўна няма нікога бліжэйшага за яго. Ён свой не толькі цяпер, але быў свой і ўчора і даўно. Ён — моцны, непераможны, ён усё ведае... І ў сваёй прастаце сардэчнай Ганна спыняецца ў рабоце і доўга глядзіць у акно на мутнае снежнае неба, пад якім прыціхлі шэрыя хаты. Кожная з іх мае свае турботы, інтарэсы, і што ім да Ганны, да яе жывой яшчэ маладосці?

Пасля вячэры Ганна, паслаўшы пасцель Паддубнаму, выйшла да суседзяў. Сказала, што хутка вернецца, але Паддубны ўсё роўна замкнуў за ёю дзверы. Вярнуўшыся, пагасіў лямпу, закурыў і пачаў хадзіць па хаце ўпоцемку. Раз-два, раз-два,— чуліся павольныя крокі. Звесіў галаву Паддубны, глядзеў сабе пад ногі, не бачыў ні белых вокнаў, ні агнёў за імі. Усё ён падрыхтаваў для дарогі? Здаецца, нічога не прапусціў, каб не запісаць у свой блакнот. Можна было б легчы і адпачываць.Але пачуццё віны перад кімсьці прымушае яго хадзіць па хаце. «Можа, атрахнуцца ад усяго, забыць? Але гэта значыць — ніколі не заглянуць у хату Ганны, не бачыць яе. Гэта значыць — шукаць сабе другую кватэру. Што скажа Ганна? Назаве не чалавекам, а здраднікам, пракляне. І сумленне ўсё роўна не будзе спакойным. Ганна не толькі прыгожая, яна харошая, чалавечная. Хіба можна пагарджаць чалавечнасцю?»

Раз-два, раз-два... «Не для няшчот я, не...— падумаў Паддубны.— Нельга мне быць пяшчотным». Хоць і не раз душой авалодвалі іншыя буры, ды толькі ў зацішшы прыходзіла часам яна — патрэба ў чалавечай цеплыні. Праўда, на думкі прыходзіла яна, Ганна, са сваім ветлым позіркам і з той жаночай цярплівасцю, якая ўсё прабачае. «Эх, Ганна, Ганна, для нас усё цяжка... Але мы моцныя тым, што сумленныя перад народам...»

У сенцах грукнула. Паддубны выйшаў адчыніць. Увайшла Ганна.

— Ты яшчэ не клаўся? — спыталася яна.

— Не. Чакаў цябе.

Ганна змоўкла, вешала куртку.

— Нашто было чакаць? Я забавілася крыху.

— А ты ж мяне чакала ў Глушцы ля саней. Чаму ж я цябе не магу пачакаць?

— Ха-ха-ха...— засмяялася Ганна,— вось пра што здумаў.

Паддубны сеў на сваю пасцель і, крыху пачакаўшы, сказаў:

— Ганна?

— Што?

— Хадзі сюды. Сядзь ля мяне побач, моцна з табою пагаворым.

Рослая постаць Ганны адзін раз на хаду засланіла сабою белае акно, а затым апавілася змрокам.

* * *

Не дапамаглі Паддубнаму ні цёмна-карычневы касцюм з вішнёвым у белыя кроплі гальштукам, ні паліто, таксама цёмна-карычневае, ні шэрая новая кепка. Ніколі не браў з сабою Паддубны палку, на гэты раз узяў. Наогул, у такім уборы ён выглядаў не то як чыноўнік якога прадпрыемства, не то адвакат. Лагодная, з затоеным бляскам у вачах Ганна, праводзячы Паддубнага, казала:

— Выглядаеш так, як тады, калі вярнуўся з-за мора.

І Паддубны пайшоў у ціхі снежны вечар, у шызую імглу, што асела над снягамі і мякка застыла ў лясных гушчарах. Каторы раз ужо даводзіцца так ісці, але сённяшні паход, відаць, павінен быць незвычайным, пераломным. Хоць, можа, хто і сустрэне з тых «знаёмых», кінцюрыстых, не павінен пазнаць у новым адзенні. Найбольш частай вопраткай былі плашч зеленаватага колеру і цёмна-карычневая кепка. А цяпер — перамена.

Паддубны ўвайшоў у станцыю. Здзівіла цішыня. Няўжо няма нікога? Пры цьмяным святле ліхтара куткі танулі ў змроку. Паддубны прыжмурыўся, разглядаючыся, і пачуў сцішаную гутарку ў адным, амаль цёмным, кутку. Твары ўбачыць было цяжка. Прамень ліхтара асвятляў толькі сукаватую, блішчастую кулясу, якую адзін з субяседнікаў трымаў між кален. Да прыходу поезда заставалася дзесяць мінут. Паддубны купіў білет і хацеў выйсці на перон. Адвярнуўся ад касы і ўбачыў, што чалавек з

кулясаю ўжо стаіць і гаворыць так, быццам канчае гутарку са сваім субяседнікам.

Цёмна. Нельга прыгледзецца да твару. Але, безумоўна, тут нешта ёсць. Налева, ля самага выхаду на перон,— дзверы з надпісам «Posterunek P. P.». Туды хуткай хадою і пайшоў чалавек з сукаватай кулясаю. Паддубны вышмыгнуў за дзверы на перон. У аддаленні прагудзеў гудок. Набліжаўся поезд. Паддубны, сышоўшы з перона, падаўся ўздоўж палатна чыгункі і спыніўся ў цемры, куды не дасягала святло ліхтара. Чакаў.

Поезд прагрукатаў міма яго і стаў. Паддубны скочыў у вагон.

Прайшло тры мінуты, пяць, дзесяць... Поезд не адыходзіў. Паддубны хацеў ужо выйсці, але на парозе купэ яго затрымалі чалавек з сукаватай кулясаю і паліцыянт.

— Папросім у пана дакументы,— звярнуўся да Паддубнага чалавек з сукаватай кулясаю.

Паддубны прыгледзеўся да гэтага чалавека і пазнаў яго, хоць ён быў у шэрай кепцы. «Так, гэта ён, той самы Чарапіцкі».

Чарапіцкі, разглядаючы пашпарт, гаварыў:

— Мы з панам, мне здаецца, ужо дзесьці бачыліся...— І з асалодай таямніча ўсміхаўся.— Прашу пана паказаць свой білет.

Паддубны знарок доўга шукаў білет — у кашальку, у кішэнях і ўрэшце сказаў, што білета няма, што, напэўна, згубіўся.

— А куды ж пан хацеў ехаць?

— Да Брэста...

— Ну, пан пойдзе з намі. Там пашукаем білет. Зброі пан не мае?

Чарапіцкі памацаў Паддубнага па кішэнях.

— Прашу наперад...— паказаў ён на дзверы.

Скамечаны білет быў заціснуты ў кулаку. Калі Паддубны ўжо стаў нагою на прыступку, каб выйсці з вагона, і ўзяўся рукою з білетам за парэнчу, ён трошачкі разняў далонь, і білет паляцеў уніз, як у цёмную бездань. Паддубны адчуў палёгку. Шпікі будуць мець новы вузел, які ім не так лёгка ўдасца разблытаць.

Чарапіцкі з самазадаволенай мінай разглядаў Паддубнага ў пастарунку, варушыў губамі, як быццам прыцмокваў, і, курачы папяросу, шпарка, з прысвістам выпускаў уверх струмені дыму. З жывёльнай задаволенасцю, разлітай на крыху набраклым твары, гаварыў:

— Памучыў мяне пан некалькі год, а цяпер — квіта. Хацеў пан ехаць да Брэста, а цяпер паедзем у адваротным напрамку,— паедзем да Масквы. Хоча пан да Масквы?

— Дарма пан выхваляецца,— адказаў Паддубны,— пан не ў сілах гэта зрабіць.

Чарапіцкі на момант разгубіўся, нават спыніў позірк на Паддубным.

— Спрытны, пся крэў! — звярнуўся ён да паліцыянта.— Нічога, у нас пазбавішся гэтага спрыту.

Пачакаўшы хвіліну, узяў тэлефонную трубку.

— Пастарунак Залатой гуры? Так? То ты, Стэфан? Маю пташка... Цо? Я гавару, што пташак ужо ў клетцы. Ха-ха-ха...

Паддубны спакойна, пахмурыўшы бровы, круціў цыгарку.

Тры паліцыянты і Чарапіцкі павезлі Паддубнага ў Глушэц. Там допыт вёў камендант ваяводскай паліцэйскай школы, які прыехаў з атрадам, каб замяніць глушэцкую паліцыю пасля дэманстрацыі. У камендатуры ўсё дыхала яшчэ не астыўшым спалохам, разгубленасцю.

Паддубнага ўвялі ў вялікі пакой і загадалі стаць ля сцяны. Навокал за сталамі сядзелі афіцэры і ніжнія чыны паліцыі розных рангаў, нібы за працай, а на самай справе толькі курылі і ўспаміналі асобныя выпадкі з дэманстрацыі. Недзе зарыпелі дзверы. Пачалі, як на парадзе, уваходзіць шпікі. Кожны спадылба азіраў Паддубнага і праходзіў у наступны пакой. Праз некаторы час прывялі туды і Паддубнага. Камендант школы, недаспаны, у мундзіры з расшпіленым каўняром, яшчэ малады, абыякава глянуў на Паддубнага. На стале стаяла пустая цёмная бутэлька ад віна. Малады пісар-паліцыянт, асавелы, ледзь вадзіў пяром па паперы. Камендант пры допыце быў падкрэслена тактоўны, стараўся давесці, што ён хоча даведацца толькі праўду. Паддубны адказваў на пытанні коратка і думаў: «Як жа ашарашыла іх дэманстрацыя. Яшчэ не могуць апамятацца».

У суправаджэнні Чарапіцкага прыйшоў камендант павятовай паліцыі, з падпухлымі вачыма, з жоўтымі задзёртымі вусамі. Усе ўсталі. Камендант лёгкім узмахам рукі даў знак, каб працягвалі работу. Агледзеў Паддубнага з галавы да ног.

— Куды ж гэта пан сабраўся з чамаданчыкам? У госці, на вяселле, ці што? — хацеў ён пакпіць.

— Так, на вяселле,— адказаў Паддубны і адвярнуўся ад камендапта.

— Паблыталася пану дарога, відаць?

Паддубны не адказаў. Падскочыў Чарапіцкі:

— Да Брэста хацеў ехаць, пане камендант.

— Ага...— працягнуў камендант і выйшаў.

Праз гадзіну прыехаў староста, таксама паглядзеў на Паддубнага і задаў пару абыякавых пытанняў. Доўгія русыя вусы старосты пад тапклявым носам выглядалі, як растапыраныя вілы. Пазіраў на Паддубнага яўна з затоеным здзіўленнем, нават з таямнічым страхам. Кінуў камендапту школы:

— Ну, працягвайце...— І, слізгануўшы позіркам на Паддубным, кпліва сказаў: — Ну, што ж... Выглядаеш, пан, як Рабесп'ер...— І знік за дзвярыма.

«Недзе нешта ёсць. З'язджаюцца глядзець, як на дзіва»,— пранеслася ў галаве Паддубнага.

Допыт скончыўся. Камендапту школы ніяк не ўдалося даведацца «праўды». Чарапіцкі нецярпліва ёрзаў на крэсле, ноздры яго раздзімаліся. Ён быў незадаволены допытам. Уставіўшыся на Паддубнага, як ганчак, спытаўся:

— То пан кажа, што нікога не ведае ні ў Глушцы, ні ў ваколіцы?

— Не, не ведаю.

— А чуў пан пра такога — Мірона Вадалея?

Чарапіцкі не зводзіў вачэй з Паддубнага.

— Магдалея? — перапытаў Паддубны.— Не, не чуў.

— Вадалея, пся крэў! — крыкнуў Чарапіцкі.

— Чаго пан хвалюецца? — адказаў Паддубны.— Я не ведаю вашага Вадалея.

— Не ведаеш... Ну, добра...

— Адвесці,— кінуў камендант. І два паліцыянты павялі Паддубнага ў халодную бакоўку з аблупленымі сырымі сценамі і з маленькім уверсе акном у краты.

Апошні паварот ключа ў замку, і крокі паліцыянтаў пачалі аддаляцца. Паддубны слухаў іх, пакуль крокі не заціхлі зусім. Кашлянуў. Халоднае рэха коратка паўтарыла кашаль і тут жа змоўкла, як быццам прыліпла да мокрых сцен. Паддубны паставіў чамаданчык і палку ў куток і, заклаўшы рукі назад, пачаў хадзіць па бакоўцы. Нават здзіўляўся сам сабе, што ў душы такі ўпэўнены спакой, як быццам гэтыя ўсе сатрапы і сатрапікі не маюць ніякай улады над ім. Ходзячы, часам забываўся, што за сценамі бакоўкі знаходзіцца ўсё варожае, драпежнае і

скрыгоча — скрыгоча пёрамі, зубамі. Могуць прыйсці ў кожны момант і ўчыніць над ім сваю крывавую расправу. Няхай ідуць. Ён усё зрабіў для партыі, для народа, што было ў яго сілах. Ён адкрыты душою перад народам, і ў гэтым яго сіла — сіла неадольная.

Крокі глуха танулі ў сырых сценах, а Паддубны хадзіў так свабодна і незалежна, нібы сам сюды зайшоў, каб надумаць на адзіноце. Што яму да тых гукаў, якія далятаюць часам з-за сцен,— гукаў шамятлівых, дзікіх? Паддубны працягвае сваю работу далей — далей ідзе па сваім шляху, як ішоў дагэтуль. І думка думку нагапяе. «Гм... Вадалей...— думае Паддубны.— Падазрэнні, здаецца, апраўдваюцца...» Міжвольная ўсмешка прабегла па вуснах Паддубнага. «Якая неасцярожнасць шпіка. Назваць прозвішча Вадалея... у такі момант. А можа, прывядуць яго сюды? Тым лепш. На гэтым і скончыцца яго кар'ера. Вось толькі Карэльчука — Буралома яшчэ не дастаў рукою. Але... дастанем... Два псеўданімы мае, нягоднік. Для каго ж другі псеўданім? Тут ёсць нейкая больш глыбокая завязка. Развяжам, быць не можа...»

Лёгкі ўздых вырваўся з грудзей Паддубнага. «Пайшлі хлопцы ў турму... Пайшлі... Ну, што ж... турма — густое рэшата... прасее... Але па волі будзе аслабленне ў рабоце... нават спусташэнне на нейкі час. Зрабілі паны штучку, выконваюць свой план. Кіпцюрыстая рука фашызму павісла над народам. Нічога, вернуцца з турмы хлопцы загартаваныя. Бачыш, як манеўруюць паны. Хітра, хітра ходзяць цяпер ля нашых людзей. Зразумела... Баяцца абвастрэння. Найбольш нагнаць у турмы, стэрарызаваць. Множыць правакатараў. Вось іх надзея».

Паддубны прыходзіць да вываду... Аж спыніўся ў гэтай сырой бакоўцы. «Трэба глушыць правакатараў у самым пачатку... на вачах у народа... Інакш...»

Ужо сцямнела, а Паддубны ўсё ходзіць і ходзіць. За акном праносяцца калматыя хмары, прасякнутыя барвовым святлом месяца, якога не відаць. На спіне, між лапатак, усё больш і больш асядае холад. Паддубны глянуў у куток, дзе стаяў чамаданчык, падумаў, ці не дастаць адтуль світэр, што паклала Ганна, але махнуў рукою. Абыдзецца. Цапнуў сябе за бакавыя кішэні касцюма, праверыў. Усё на месцы. Толькі няма блакнота. Забралі пры вобыску. Прыйдзецца ў турме ўсё рабіць нанава.

Паддубны закурыў. Мацнуў рукою сцяну. На пальцах засталася слізь. Тады паставіў чамаданчык на сярэдзіну

бакоўкі і ссў. З-пад падлогі цягнула холадам. Паддубны курыў і думаў: «Заплача, небарака, як дазнаецца...» Гэта — пра Ганну. Цёпла і асцярожна ўсміхнуўся некуды. Туды, у далёкі, цёплы хатні змрок, дзе спакойная белізна вокнаў глядзела на яго шчырасць перад Ганнай...

Пачуліся хуткія крокі за дзвярыма, грукнуў замок. Скрыпнулі дзверы. Нехта шукаў чагосьці на сцяне за дзвярыма, цапаў рукою, нават прамовіў: «Дзе тут яно, пся крэў...» Урэшце пстрыкнуў выключальнік, і цьмянае святло запыленай лямпачкі з-пад самай столі асвяціла мокрыя, аблупленыя сцены бакоўкі. На парозе стаяў адзін Чарапіцкі.

— Што, холадна? — неяк прымірэнча спытаўся ён.

— Ага... Дрэнная ў вас гаспадыня, не напаліла...— адазваўся Паддубны, не ўстаючы з чамаданчыка.

— Для такіх, як вы, паліва не палажана,— адказаў Чарапіцкі грубавата і, задраўшы галаву, пачаў абыякава разглядаць сцены.

Падышоў паліцыянт і сказаў: «Ну, хутчэй...»

Чарапіцкі вытрымаў паўзу, а потым, стоячы ўжо задам да Паддубнага, не сказаў, а прашыпеў гарлавым голасам цераз плячо:

— Забірай рэчы і выходзь.

Паддубнага зноў увялі ў той самы вялікі пакой. Там ля дзвярэй стаялі апранутыя ў шынялі паліцыянты, апёршыся на вінтоўкі. Адзін выняў з кішэні наручнікі і звярнуўся да Паддубнага:

— Ну, камісар, давай надзенем табе бранслеты...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Невялічкая закрытая машына імчала Паддубнага на станцыю. «Што за ліха? Нават да следчага не вадзілі,— думаў ён, седзячы ў цёмнай машыне.— Відаць, не да гэтага панам. Рэха нашых udaraў яшчэ гучыць у прасторах».

Апынуўшыся ў правінцыяльнай турме, Паддубны застаў там шмат моладзі, нядаўна арыштаванай за Грамаду. Арыштаваныя сядзелі без газет, без кніг, мелі прагулкі толькі пятнаццаць мінут, баяліся турэмнай адміністрацыі, выконвалі ўсе яе загады — хадзілі на кухню абіраць бульбу, насіць цэбры з вадою. Адным словам, тут палітычныя былі пастаўлены на ўзровень з крымінальнымі. У той камеры, куды кінулі Паддубнага, было больш дваццаці чалавек — стэрарызаваных вясковых хлопцаў. Паддубны пра-

весь з імі гутарку аб традыцыях рускага рэвалюцыйнага руху, аб заваёвах у турмах правоў пакаленнямі палітзняволеных — рускіх рэвалюцыянераў, аб тым, што трэба працягваць гэтыя традыцыі, змагацца за іх, інакш вораг запяволіць маральна, дэзарганізуе. Трэба дамагацца ад адміністрацыі, каб дазволіла выпісваць газеты, мець кнігі і іншае. Тады будзе магчымасць вучыцца, расці. Ніякай фізічнай работы для адміністрацыі!

Паддубны кожны ранак, на паверцы, пачаў гаварыць «пшодовніку» аб усіх гэтых справах. «Пшодовнік» абяцаў, што даложыць начальніку. Але ніякага адказу доўга не было. Нягледзячы на дамаганні, не прыходзіў і сам начальнік турмы. Тады Паддубны прапанаваў хлопцам аб'явіць хоць бы аднадзённую галадоўку, але сустрэўся з маўчаннем і здзіўленнем. «Як гэта — галадаць? Навошта? І што з гэтага будзе? Хіба паны нас пашкадуюць, як мы загаладаем?» — пасыпаліся пытанні. Паддубны чухаў патыліцу і думаў: «Эх ты, цаліна, яшчэ доўга прыйдзецца цябе разварочваць». Вырашыў неадкладна пачаць галадоўку адзін. Далучылася пяць хлопцаў.

Зараз жа, пасля снедання, прыйшоў начальнік у суправаджэнні наглядчыкаў. Між ім і Паддубным адбылася вострая гутарка, у выніку якой Паддубны быў ізаляваны ў асобную камеру. Начальнік думаў, што такой рэпрэсіяй у зародку задушыць «зарыва бунту». Недаацаніў пілсудчык сілы нават аднаго чалавека. Хоць пяць хлопцаў, што былі ўключыліся ў галадоўку, і кінулі галадаць у той жа дзень, Паддубны працягваў. Лежачы ў камеры, думаў — ці правільна ён робіць, што галадуе адзін? Ці не адарве гэта яго ад масы? Ці не ставіць такі ўчынак на мяжу небяспечнага? І кожны раз прыходзіў да вываду, што робіць правільна. Уласным прыкладам трэба прабіваць свядомасць людзей. Гэта акупіцца.

Хлопцы праз крымінальнікаў-падмяталаў перадавалі Паддубнаму запіскі, у якіх прасілі, каб ён кінуў галадаць. Паддубны чытаў, усміхаўся дабрадушна і казаў сам сабе: «Дзівакі... наіўныя... ім шкада мяне... Ну, і добра, заўтра будзе яшчэ больш шкада...» І працягваў галадаць. На пяты дзень прыйшоў начальнік і прасіў спыніць галадоўку. Ужо не пагражаў, а... прасіў.

— Спыню тады, калі будзе дазвол на газеты, кнігі, сшыткі.

— Гэта пан усё атрымае, але толькі ў пана бога,— адказаў уедліва смуглявы, з сухаватым тварам начальнік.

Паддубны працягваў галадаць і на шосты дзень.

Усё яшчэ справа на мяжы небяспечнага, як на вастрыні нажа. Або — або...

Але ўвечары, на шосты дзень, пры паверцы Паддубны пачуў гоман у суседняй камеры. Падняўся з нар і, трымаючыся за сцяну, падышоў да дзвярэй. Прыпаў вухам да халоднай бляхі. Выразна пачуў, як нехта называў яго празвішча. Хлопцы дамагаліся, каб яго, Паддубнага, перавялі да іх. «Даходзіць,— падумаў ён.— Не можа быць, каб не дайшло».

Назаўтра, перад снеданнем, «пшодовнік» заявіў Паддубнаму, што начальнік задаволіць яго патрабаванні, і прасіў браць ежу.

— Возьмем,— сказаў Паддубны.— Прашу перавесці мяне ў агульную камеру.

... Тры тыдні пабыў Паддубны з хлопцамі. Шапацелі газеты ў руках. Карысталіся не толькі падручнікамі арыфметыкі і граматыкі, але і кнігамі па палітычнай эканоміі. Кожны дзень праводзіліся заняткі. Хлопцы не маглі нацешыцца з Паддубнага і тым становішчам, якое ён адваяваў для ўсіх. Кожны думаў і казаў: «Дык вось што значыць галадоўка. А мы? Не, ужо будзем ведаць, што рабіць...»

На чацвёрты тыдзень павезлі Паддубнага пад канвоем у цэнтральную турму. І пакінуў ён хлопцаў, хоць засмучоных, але з правамі палітычных зняволеных.

У цэнтральнай турме, калі ён выйшаў на агульны прагулачны пляц, яго першым сустрэў Андрэй, а потым і ўся глушэцкія. А Паддубны, пахудалы, крыху ссутулены, паціскаў рукі хлопцам, усміхаўся шчаслівай усмешкай і прыгаворваў:

— Рот фронт, хлопцы! Рот фронт...

Апошнім падышоў прывітацца Апанас Хмель.

## «У КАТЛЕ»

Прагулачны пляц празвалі «катлом». З трох бакоў яго акружаюць турэмныя трохпавярховыя будынкі з вокнамі ў кратах, а з чацвёртага боку (заходняга) — высокая замшэлая сцяна, якая прытулілася да касцёла. Турма зраслася з касцёлам у адно цэлае. Так было некалі, так было ўчора, так пакуль што было і сягоння. На самых шпілях

крыжоў, што паблісквваюць на касцельных вежах, пад подыхамі ветру гойдаюцца два бляшаныя, размаляваныя анёлы з растапыранымі крыламі. У кожнага ў рудэ тая біблейская труба ля вуснаў, якою, паводле казак прарокаў, анёлы абвясцілі некалі свету нараджэнне Хрыста. Турэмныя будынкі — гэта колішні манастыр манахаў-бернардынаў.

Вяльможная царыца Кацярына II перарабіла манастыр у турму — перарабіла па ўцеху панам-магнатам, шляхце і на страх бунтоўным прыгоннікам-рабам. Шмат вады сплыло з таго часу, а разам з ёю і крыві чалавечай. На свеце, на згубу царам і царыцам, панам-магнатам, шляхце і буржуям, пачалі перамагаць рабы. Яны перамаглі на неабсяжных прасторах Расіі, і над Крамлём у Маскве, высока ў блакіце, развяваецца, ірдзее сімвал перамогі — Чырвоны сцяг. Яго бачаць пралетарыі ўсіх краін, і кожны дзень узрастае іх адданасць вялікім ідэям камунізма.

Там, над СССР,— усеўладны Чырвоны сцяг. Ну, а тут... над галовамі яшчэ трубяць анёлы, пільнуюць турму, напоўненую паўстаўшымі.

Часам яны, гэтыя анёлы, глядзяць з вышыні на кацёл. Яны, напэўна, бачаць адтуль кіпучы мурашнік, непрыемна ім глядзець на яго, бо неўзабаве адварочваюцца і глядзяць на горад.

А ў катле кіпіць. На счарнелых выгінастых дошчачках, пакладзеных у рад на шырыню тратуара, крочаць парамі людзі, якія ганарацца сваім «тытулам» — палітычны зняволены.

Яны крочаць шумна, бадзёра — хто з кнігаю ў руцэ, хто з сшыткам, а хто і так. Гоман ад гутаркі несціханы. Розныя тут ёсць людзі — ёсць такія, якіх называюць «старымі рэвалюцыянерамі». Такіх нямнога. Да іх належыць і Паддубны. Ідуць у акулярах інтэлігенты. Многія з іх хацелі б вырашыць усе праблемы — малыя і вялікія. Але пры такім размаху намераў спрачаюцца часам цэлымі днямі за адну якую-небудзь дробязь і трацяць з поля зроку галоўнае. Паддубны паціскае плячыма ў задуме і кажа: «Інтэлігентшчына... Хваравітасць... няма хрыбта...» Стыхійна стварыліся гурткі па вывучэнню гісторыі, эсперанта, нават фізікі.

Шуміць кацёл. На лаўках, што стаяць пасярэдзіне пляца, навокал кветкавай клумбы, групкамі сядзяць людзі таксама з кнігамі, кураць, расхрыстаўшы кашулі на

грудзях, каб хоць крыху сагрэцца сонцам, якое глядзіць з даху касцёла. На адной лаўцы ляжыць стос кніжак. Іх вынес свой бібліятэкар са сваёй, палітзняволеных, бібліятэкі.

Кожны можа падысці і выбраць сабе кніжку, якую бібліятэкар тут жа запісвае ў сшытак. Свая бібліятэка ў палітзняволеных багатая — ёсць творы Леніна, Сталіна, хоць не ўсе, ёсць некаторыя творы Пляханава, ёсць амаль уся руская класіка, ёсць творы тэарэтыкаў-народнікаў — Міхайлоўскага, Лаўрова і іншых. Ёсць сёе-тое і з савецкай мастацкай літаратуры. Хлопцы захапляюцца кнігай Серафімовіча «Жалезны паток», фурманаўскім «Чапаевым», раманам Шолахава «Ціхі Дон». Маякоўскі пераходзіць з рук у рукі — цікавяцца чытачы, цешацца — гэта новае, яшчэ небывалае.

...Багатая бібліятэка палітзняволеных. Сярод гэтага багацця хапіла месца і літаратуры ўкраінскай, беларускай. Чэрпайце, хлопцы, поўнымі жменямі, спяшайцеся, пакуль можна, бо раптам могуць затрубіць апёлы з касцельных вежаў, і тады хмара зусім заслоніць сонца. Кніжка па кніжцы збіралася бібліятэка на ўздыме рэвалюцыйнай хвалі — турэмная адміністрацыя прапускала кнігі з-за варот, не рабіла перашкод. І бібліятэка сабралася, калі за сцяною на прасторах прыгнечанай зямлі шумела Грамада. Сцены камеры, дзе размясцілася бібліятэка, накрыты паліцамі знізу аж да манастырскай, да купалападобнай столі. Два акны гэтай камеры глядзяць з трэцяга паверха на кацёл. У гэтай камеры хлопцы адчуваюць сябе, як у храме навукі. Тут сядзіць бібліятэкар, сакратар турэмнага камітэта палітзняволеных, генеральны канцэр. Сюды пасадзілі і Паддубнага.

Паддубны стаіць цяпер у кругу таварышаў ля закуранай сцяны і гаворыць, гаворыць, не перастаючы махаць кулаком. Што ж там за людзі і пра што гутарка? Гэта адбываецца канферэнцыя ці свайго роду пленум турэмнага камітэта. Пасля справаздачы сакратара ідуць спрэчкі. Вырашана: выбраць агульным галасаваннем старасту, які б хадзіў да начальніка турмы з усімі пытаннямі ў мэтах палягшэння жыцця вось гэтых людзей, што шумяць у катле. Прапанавалі Паддубнага. Ён адмовіўся, сказаўшы:

— З мяне дрэнны дыпламат...

Урэшце выбралі старога сівога ткача Зайчыка. Ён у палатаным асеннім паліто, у зашмальцаванай кепцы, у пенснэ на невялічкім, крыху дзюбатым, носе. Апёршыся

на палку, Зайчык стаіць у групе, як патрыярх. Гаворыць ён аўтарытэтным тонам, думкі заўсёды выказвае асцярожна, але дакладна. Яму і выконваць абавязкі старасты.

Паддубнаму нельга быць старастам яшчэ і таму, што ён нядаўна выбраны сакратаром парткома. Спалучаць гэтыя функцыі невыгодна. Прынята рашэнне яшчэ па адным вельмі важным пытанні — давесці да канца «калектывізацыю» палітзняволеных. Калектывы існуюць толькі па камерах і то яшчэ не ва ўсіх. Трэба справу паставіць так, каб дзяліць прадукты, што атрымліваюць з волі палітзняволеныя, раўнамерна па ўсяму калектыву. Кожную пятніцу да турэмных варот пад'язджаюць вазы, нагружаныя прадуктамі,— на кожнага палітзняволенага палавіна доўгага сітнага хлеба, порцыя масла, пачак махоркі і карабок запалак. Тры хлопцы ў суправаджэнні наглядчыка носяць гэтае багацце ў мяшках на прагулачны пляц, у канцёл. Тут з важнай мінай сядзіць генеральны канцёр і выдае дзель за дзеллю камерным канцёрам.

Але... не заўсёды так будзе. Грамада была легальным грунтам для размаху работы МОПРа. Гэты разбег яшчэ дзейнічае. Даб'юць Грамаду, і знікне такая магчымасць. Трэба спяшацца з калектывізацыяй, бо потым будзе цяжэй...

А ў самым цянявым кутку, крыху на ўзвышшы, стаіць наглядчык і пазірае за людскім вірам. Аглушаны гоманам, дзівіцца з такога зборышча «палітыкаў». Ён яшчэ не ведае, што Пілсудскі робіць з Грамадою тое самае, што некалі ў змове з царом Мікалаем І зрабіў магнат граф Велепольскі, учыніўшы так званую «бранку» па ўсёй Польшчы. Ён назначыў адну ноч для арыштаў усіх, хто быў здольны насіць зброю, каб знішчыць усякія карэнні паўстання. І тады зазвінелі кайданным звонам шляхі... аж у далёкую Сібір.

Так... Пілсудскі вывучыў гісторыю для сябе. Ён у змове з магнатамі капіталу прадаў сваю айчыну нямецкім крупам, юнкерам, амерыканскім ракфелерам...

Не ведае гэтага маўклівы наглядчык... Ён толькі пазірае на гадзіннік, каб не даць лішняй хвіліны пабыць на паветры гэтым «палітыкам».

Ён апошні раз падносіць гадзіннік да вачэй і крычыць:

— Канец! Заходзіць!

Усе адзін за адным падымаюцца па трох прыступках і павольна знікаюць у цёмным прастакутніку дзвярэй. Далей ужо змрочныя калідоры, шорганне ног па асфальта-

вай падлозе. Скрып і стук дзвярэй. Нарэшце — цішыня з аддаленым, прыглушаным, невыразным гулам.

Жыццё пераходзіць у камеры.

Розныя ёсць камеры ў турме. Але тая камера, дзе сядзіць Андрэй, найбольшая. Яна пагадвае вакзал. У ёй змяшчаецца семдзесят пяць чалавек. Апрача Андрэя, тут жывуць Аляксей Верас, Аляксандр Сучок, Апанас Хмель. Замяшаўся ў натоўпе і той маленькі Казючок, якога ўсе вінавацяць за арышты ў вёсцы Дубы і яе ваколіцы. Казючок — хлопец з шэрымі вадзяністымі вачыма, з тварам, усыпаным рабаціннем, выглядае, як загнанае, запалохапае шчаня. Усё трымаецца воддаль ад усіх, усё туліцца па кутках. Амаль кожны дзень яго тэрарызуюць Аляксандр Сучок і Апанас Хмель.

А Казючок адказвае ўсё адно і тое ж:

— Мяне пасылаў Міров Вадалей...

— Ты брэшаш, морда! — пырскае на яго сліпай Апанас. А Сучок сціскае кулакі і бурчыць, як раз'юшаны кот:

— Ммух, ты! Здраднік! Бачыш, колькі людзей ты пасадзіў, пягоднік!

Казючок пачынае плакаць. Ад гэтага твар Сучка крывіцца ў зняважлівую грымасу. Ён пачынае гаварыць уедліва, працягла.

— Яшчэ плачаш... Хто тут паверыць тваім слязам?!

Галасы ўхвалення чуюцца там-сям з бакоў. Гэта падбадзёрвае Апанаса. Ён падскаквае да Казючка і гаворыць, як страляе:

— Ідзі, згінь! Разумееш? Прэч з вачэй! Я на цябе глядзець не магу... Прэч, табе кажу!

І ноздры Апанаса, як заўсёды ў такіх выпадках, раздзімаюцца. Вочы, як свярдзёлкі, упіваюцца ў Казючка. І Казючок ідзе, звесіўшы галаву. Выціраючы слёзы, даходзіць да сцяны ў самым далёкім кутку, апіраецца локцямі на падаконнік і глядзіць праз краты ў акно.

У гэты вечар Казючок не ўзяў яды.

Андрэй сачыў за гэтым «тэрорам» Сучка і Апанаса, але не ўмешваўся. Не знімаючы віны з Казючка, думаў, што завязка ўсёй гэтай справы недзе схавана глыбей... Нездарма так стараюцца Хмель і Сучок.

Нацешыўшыся наскокамі на Казючка, Апанас Хмель і Сучок адыходзяць да акна і там ціхенька вядуць гаворку.

— Праваліў ты ўсю справу,— гаворыць Сучок,— я табе казаў тады не згаджацца на гэтую штуку і парваць сувязі з Вадалеем. Ты не паслухаўся.

— Ат... дурасці гаворыш,— адказвае Хмель.— Усё ішло добра. Нам жа важна было прысыпіць паліцыю на час нашых ваенных падрыхтаванняў. Было дамоўлена з Вадалеем, што ён яе прысыпіць. Ну і зрабіў сваё. А гэты сапляк усё выдаў.

— Не, брат, насіць нелегальную літаратуру на пастарунак — гэта не сродак для прысыпання паліцыі. Ты мяне тады ўгаварыў, што гэта непадоўга. Я паслухаўся і маўчаў. Калі гэты Казючок раскажа ўсё Паддубнаму, не здабраваць нам.

— Не раскажа... Паддубны не захоча з ім гаварыць. А сам гэты смаркач не адважыцца пачаць.

Змоўшчыкі сціхаюць на хвіліну, і кожны думае сваю думу, баючыся прызнацца самому сабе ў чымсьці. Мірон Вадалей, як яго ні ратуй, яўна набываў воблік умелага двурушніка-правакатара. Хіба можна ў гэтым прызнацца Хмелю і Сучку? Не. Яны робяць такую міну, што ўсёй афёры Вадалея як быццам і не было. Не прызнаецца ж Апанас, як ён схапіўся за «ідэю» Вадалея. Бліснула яму наперадзе лёгкасць перспектывы стварэння ўзброеных атрадаў і благаславіў Вадалея словам: «Дзейнічай!»

І вось канец усяго аказаўся не толькі непрыемны, але і небяспечны. Сучок раз-пораз паўтарае:

— А калі раптам арыштуюць Вадалея і Казючок будзе гаварыць на яго? І калі партком прыцісне Мірона да сцяны?

— Ай...— адмахваецца Апанас,— Вадалея не арыштуюць.

— Чаму? Ты ж яго камандзірам атрада назначыў.

— Ён выкруціцца. Трэба ўсё зваліць на Казючка, тады будзе ціха.

І Хмель з Сучком навыперадкі тэрарызавалі Казючка.

Цемра паволі пачала запаўняць камеру. Але спаць ніхто і не думаў. Адны стаялі групкамі ля вокнаў, дыхалі цёплым вясенпім паветрам, глядзелі на зоры, якія з вокнаў здаваліся незвычайна далёкімі і разам з тым пільнымі. Другія так сабе ляжалі на сенніках і гутарылі.

Усе нібы забыліся пра Казючка.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Назаўтра, калі вярнуліся з перадабедзеннай прагулкі і наглядчык адчыніў дзверы камеры, першыя, хто ступіў на парог, спыніліся як укапаныя.

На самай сярэдзіне камеры на зачэпленым за жалезны крук поясе вісеў Казючок...

* * *

Паддубны шпаркім крокам, ледзь не збіваючы людзей з ног, ішоў праз пляц з разгорнутай газетай у руках. Твар быў сур'ёзны, нават напружаны. Паддубны падышоў да Андрэя, які стаяў ля лаўкі бібліятэкара, і пацягнуў яго за рукаў. Андрэй якраз трымаў том Пісарава і так захапіўся артыкулам пра Генрыха Гейнэ, што спачатку і не звярнуў на гэта ўвагі, думаў, можа, хто, праходзячы, пажартаваў. Калі ж Паддубны пацягнуў за рукаў мацней, Андрэй азірнуўся. Паддубны павёў яго ўбок, ківаючы галавой:

— Хадзі сюды...

Адышлі пад сцяну і селі. Свежая газета «Варшаўянка» — падгалосак пілсудчыны — дрыжала ў руках Паддубнага.

— Толькі што перад выхадам на прагулку атрымалі газеты... Я захапіў адну з сабою... Хлопцы, напэўна, яшчэ не ведаюць гэтай сенсацыі...

— Якой сенсацыі?

Паддубны таямніча ўсміхнуўся з-пад казырка кепкі. Працягнуў газету Андрэю.

— На, чытай... перадавую...

Андрэй пачаў чытаць. Калі дачытаўся да гэтай, як казаў Паддубны, сенсацыі, узняў вочы ў здзіўленні.

— Чытай, чытай да канца...

Андрэй дачытаў і, чухаючы патыліцу, сказаў:

— Дык вось яно як... Хіба гэта можа быць, праўда?

— Бачыш... Кінулі костку,— прамовіў Паддубны.— Аказваецца, газета дадумалася да цікавай рэчы, рэчы нечаканай — яна дамагалася ад урада Пілсудскага... легалізацыі Камуністычнай партыі Польшчы.

— Гэта сапраўды сенсацыя,— сказаў Андрэй і засмяяўся.

Паддубны прамаўчаў, нешта думаючы. А затым у яго з вуснаў вырвалася тое самае, што вырвалася некалі ў вагоне, калі вяртаўся з Расіі дахаты:

— Што, яны хочуць страціць уладу? Няхай легалізуюць... А неўзабаве трэба будзе і з партфелямі расстацца... Не, штосьці тут не так... Відаць, мацаюць грунт... Хочуць кагосьці пацягнуць за язык. Правакацыя, брат, не інакш...

— І я думаю, што так,— адказаў Андрэй,— пасля разгрому Грамады, Сельроба і НПХ легалізацыя Кампартыі? Не... Гэта нейкія манеўры...

— Хітрая гульня ў лібералізм... правільна... Замыліць

вочы, астудзіць рэвалюцыйную хвалю...— адказаў Паддубны, а затым паклаў Андрэю руку на плячо і прамовіў:

— Пойдзем, будзем збіраць партком... Ты рыхтуй свой агітпроп... Трэба будзе растлумачыць... Развеяць ілюзіі, якія, безумоўна, будуць...

На нарадзе пашыранага парткома сівы «патрыярх» Зайчык, прачытаўшы перадавую, так зарагатаў, што ледзь пенснэ не зляцела з носа.

— Сукіны дзеці, вось што выдумалі...

Нарагатаўшыся, паправіў пенснэ, выцер нос хустачкай і пачаў гаварыць сур'ёзна:

— Гэта ігра на адсталасці мас... Ашуканства... Манеўры фашызму, больш нічога...

Апанас Хмель, як сакратар камернай ячэйкі, прабаваў пярэчыць:

— Не... па-мойму, вы залёгка гэта расцэньваеце... Магчыма, пад напорам мас яны вымушаны будуць легалізаваць Кампартыю...

— Што?! — крыкнуў, зжахнуўшыся, Зайчык.— Ты, таварыш, таксама, відаць, належыш да адсталых мас. Некалі цар у 1905 годзе цэлы маніфест выпусціў пра ўсялякія свабоды. А потым што было?

— Ну, гэта было тады, а цяпер...

— А цяпер яшчэ горш. Фашызм — гэта крызіс буржуазіі... Яна вымушана выкручвацца... Зразумей гэта сабе...

Апанас заціх. Але відаць было, што ён рыхтаваўся яшчэ кінуць нейкую рэпліку, бо часта пацягваў цыгарку з кулака і соп носам. Як жа так можа быць, каб на яго ды не звярнулі ўвагі?

— Прашу слова,— буркнуў ён.

Але выступленні іншых членаў парткома не давалі яму магчымасці «прарваць фронт».

— Прашу слова...— у другі раз буркнуў Апанас.

Андрэй, які выступаў у гэты час, якраз разносіў Апанаса.

— Выказванні Хмеля небяспечныя. Яны дэмабілізуюць. Трэба правесці растлумачальную работу... Давайце тэзісы, таварышы...

І Андрэй выняў блакноцік з кішэні.

— Прашу слова...— дамагаўся Апанас. Ён станавіўся на пальчыкі, каб глянуць у сярэдзіну групы, якая шчыльна абступала Паддубнага, Зайчыка. Нарэшце Апанас неяк праціснуўся адным плячом, высунуў нос наперад, як цераз плот, і крыкнуў Андрэю з абурэннем:

— Я не дэмабілізатар! Разумееш?

— Ціха, ціха, пагаворым пасля,— адказаў Андрэй і працягваў запісваць тэзісы, якія дыктавалі яму Паддубны, Зайчык і іншыя.

Ніхто не звяртаў увагі на хваляванне Апанаса, а ён яшчэ раз выкрыкнуў у адрас Андрэя:

— Зарубі сабе на носе! Разумееш?

Русая пасма валасоў звесілася на лоб Андрэя, на вока, а ён, не заўважаючы, не адкідаў яе — усё пісаў і пісаў. Усе глядзелі на яго блакнот, сачылі за рукою, за маленькім алоўкам. Паддубны неяк па-бацькоўску глянуў на гэтую пасму. А Андрэй усё пісаў і пісаў і не чуў Апанасавых рэплік, не бачыў, што той ужо выйшаў з круга і нервова хадзіў непадалёку ўзад і ўперад, як у клетцы, і чмыхаў носам.

Андрэй скончыў, адкінуў сваю русую пасму рукою і ўзняў галаву, прасветлены, спакойны.

— Усё? — спытаўся.

— Усё! — адказалі яму Паддубны, Зайчык і іншыя. І Андрэй пайшоў збіраць сакратароў камерных троек агітпропа.

Пілсудчына і на гэты раз будзе выкрыта.

* * *

На пасляабедзеннай прагулцы газета «Варшавянка» пералятала ад групы да групы, як тая сарока з хаты на хату. Каму яна трапляла ў рукі, да таго лезлі напралом. І ўсе застывалі, выцягнуўшы шыі. Кінулі нават прыпадку — цацкайцеся з ёю. А ўсё разлік на тое, што ў многіх наіўных «адляжа на сэрцы», палягчэе, аслабне спружына пільнасці — навошта цяпер асцерагацца, баяцца шпікаў, калі партыя наша стане легальнай? І, скажам, шкельцы ў рагавых акулярах маладога інтэлігентнага Дзенісевіча, які зараз узвышаецца русай галавою над групай, безумоўна, засвецяць па-ружоваму. Ён горача чытае перадавую, устрасаючы галавою так, што дужкі акуляраў, якія ляжаць на вушах, як аглоблі, з'язджаюць з вушэй і ссоўваюць на пераноссі ўніз гэтыя бліскучыя шкельцы ў цёмных абадках. Дзенісевіч нават не хоча паправіць іх, асадзіць на месца, што любіць рабіць часта без патрэбы. Няма часу, такая ж навіна! Тут не да акуляраў.

Дзенісевіч прачытаў перадавую і зараз жа пахнуў пяцярнёю свае шкляныя колы ўверх. Пацягнуў паветра

носам, праводзячы позіркам навокал, і ўсміхнуўся на ўвесь свой чыста вымыты, добра дагледжаны, ружаваты твар з характэрным сялянскім носам, які, як тычка, вылучаўся між шчок і раптам асядаў пад губою.

— Здорава... Вось гэта здорава... Гм... Гм...

І рука зноў палезла да акуляраў.

— Новыя павевы... А што думаеце,— можа, гэта і праўда? Паны перакапаліся на Грамадзе, наколькі моцныя рэвалюцыйныя настроі, і ім ад іх няма куды дзецца... Так што вымушаны партыю легалізаваць... Гм... Гм...

І рука зноў запрацавала ля акуляраў, беручы іх у абдымкі. Нешта мутнае пераліваласяу ў шкельцах, за якімі паблісквалі цёмныя вочы. Яны многа пачыталіся — гэтыя цёмныя вочы. Але... але чаму ж муць пераліваецца ў гэтых, здаецца, тлустых шкельцах, акаймаваных абадкамі? Аркадзь Дзенісевіч лётае па «катле» са спацелым ілбом, а ў руках тамы і тамы — слоўнікі, гісторыя розных народаў, часоў, розных аўтараў. Тут вам і Ключэўскі ў карычневай вокладцы, і Салаўёў — у чорнай, прасякнутай архіўным пылам, і Карэеў, Остэрлёф і Шустэр і іншыя, і іншыя — ба! нават такая індыйская мудрасць, як «Тэорыя пазнання па вучэнню пазнейшых будыстаў». І ўсё калаўротам круціцца і круціцца і застывае імглою пад акулярамі. Многа ж цікавага створана на свеце!

Але пасля нядаўняй гутаркі з Андрэем Дзенісевіч пачаў чытаць Пляханава — «Асноўныя пытанні марксізма».

Усё хоча «праглынуць» Дзенісевіч і кажа Андрэю:

— Разумееш... Гм... гм... Пляханава я чытаў, разумееш... Але мяне некалькі не задавальняе... Няўжо ўсё так проста?

Андрэй усміхнуўся.

— Гэта пахне шуканнем філасофскага каменя, друг мілы... Калі так пойдзеш і далей — ператворышся ў сівавалосага схаласта... Я таксама перажыў гэта, не думай. І толькі марксізм прынёс мне яснату і прастату. Не, не думай, не пра наіўную прастату ідзе размова. Прастата марксісцкая — гэта самая глыбокая прастата... Калі я ў свой час чытаў Канта, то ўжо тады Кант мяне не задавальняў сваёй «рэччу ў сабе», якую ён абвясціў непазнавальнай. Туманныя, блытаныя фармулёўкі тояць у сабе супярэчнасці і алагізмы. Філосафам-ідэалістам трэба захаваць святога духа ў сістэме светабудовы, вось яны і намагаюцца апраўдаць гэты дух туманнай мішурой слоў... Гэтае пытанне, зразумела, немалое з пункту гледжання

ачысткі свядомасці чалавека... Чалавецтва, у першую чаргу пралетарыят, гапарыцца тым, што мае такую магутную зброю, якою расчышчае нетры, завалы па шляху да сапраўднай свабоды. Гэтай зброяй і з'яўляецца марксізм-ленінізм...

— Не... Не... я не супроць марксізма... Як і кожны светапогляд, ён мае права на жыццё, і ён у Расіі здабыў сабе грунт...

Андрэй неяк балюча скрывіўся і нервова перасмыкнуў плячыма. «Вось мудрагель!» — падумаў ён.

— Скажу табе проста і нават груба — усе іншыя светапогляды, апрача марксізма-ленінізма, аджываюць свой век разам з класамі, якія іх спарадзілі. Хіба гэта нельга зразумець? Ты шукаеш агульначалавечых вартасцей. Іх па-сапраўднаму знайшоў толькі марксізм. Там іх шукай і, вядома, знойдзеш...

Задумаўся Дзенісевіч. Прайшлі па кругу раз, прайшлі два, а ён усё маўчаў. Выглядаў нібы пакрыўджаным, азадачаным. Потым узняў галаву, як быццам са сну, і сказаў прымірэнчым тонам:

— З вамі цікава гаварыць...

Андрэй хацеў ісці да рэдактара часопіса палітзняволеных «Астрожныя думкі», каб разам прагледзець падрыхтаваны нумар. Рэдактар — чорнавалосы, таксама акулярысты, сядзеў на лавачцы і чакаў Андрэя. Але дайсці да рэдактара так хутка не ўдалося. Насустрач Андрэю крочыў і здалёк усміхаўся Дзям'ян Гарагляд. Ён ішоў паволына, адзін, па самай сярэдзіне круга, без шапкі, у цёмнай падношанай кашулі, падпяразанай паяском-раменьчыкам, са скрыжаванымі па-сялянску рукамі на грудзях. Па звычцы галаву нёс прыўзнята, як быццам азіраў усіх зверху, і неяк сімпатычна, са здзіўленнем жмурыў вочы. Крыху палыселая галава блішчала на сонцы.

— Ах... Дзядзька Дзям'ян, ну, як жывецца? — спытаўся спяшаючыся Андрэй.

— А што? Жывецца... Абы не галодны... Але ж і людцоў пагналі... Мусіць, з усяго свету...

— Як у вас у камеры?

— Ды нішто сабе... Вучацца хлопцы, хто як можа... І я аднаго абармота адукоўваю...— гулліва ўсміхнуўся Дзям'ян.

— Якога абармота?

— Ёсць у нас такі лапцюжнік, як я... Кожны ранак у кутку богу моліцца... Найраней за ўсіх устае...

— Ну і што? — пасцярожыўся Андрэй.— І вы яго, мусіць, крыўдзіце?

— Ды не... чаго? Знайшлося было пару маладых,— хіхікалі ў кулак, але іншыя заступіліся. А ніхто не ведае, што і як з ім рабіць... Узяўся я за яго... Кожны дзень праседжваем з ім гадзіны, і я ж яго ўжо адукоўваю, як толькі магу... Кінь ты, кажу, гэтае старое, напоўскае, яно нам дабра не дасць...

— Ну і што — дапамагло?

— Яшчэ не зусім,— усміхнуўся Дзям'ян,— малітваў ужо не гаворыць, а толькі перад снеданнем адзін раз перахрысціцца.— Дзям'ян дапытліва пазіраў на Андрэя, як быццам чакаў пахвалы. А Андрэй задумаўся, нават сур'ёзна, так што Дзям'ян, пачакаўшы, перапытаў: — Што — варта?

— Варта то яно варта... Трэба ўцягваць гэтага дзядзьку ў круг нашых інтарэсаў... А то дзядзька вернецца зноў да малітваў.

— Уцягваем яго, уцягваем... Я яго цягну, як за вушы... Не надта паддаецца, але паддаецца... У нас ужо калектыў у камеры хутка будзе... Гаварыў гэты... што быў сакратаром камітэта ў Глушцы... Капанец...

— Як ён?

— Ходырам ходзіць... Усё нейкія анцілігентныя песні спявае... Вучыцца мала...

Закурылі. Андрэй думкаю спяшаўся да свайго рэдактара і ўсё пазіраў у той бок, дзе ён сядзеў. Дзям'ян заўважыў гэта і сказаў:

— Табе, бачу, і тут работы па вушы... Ха-ха-ха...— і закруціў галавою.— Ну, ужо ідзі... бацьку напісаў?

— Напісаў...

— І я сваёй Маланні...— сказаў дзядзька Гарагляд і пайшоў шукаць свайго вучня — забітага рэлігійнага селяніна, што трапіў у турму за свабоду.

Андрэй у два скокі дабег да рэдактара і сеў побач на лаўцы.

Рэдактарам Райскім партком не быў здаволены. Райскі шмат месца адводзіў грымучым беззмястоўным творам, вельмі мала ўдзяляў увагі публіцыстыцы і крытыцы пачынаючых паэтаў і празаікаў. Многа лжывага пафасу. «Гэта эсэраўская грымучка,— сказаў па парадзе Паддубны,— бі, ірві, палі,— без толку, без сэнсу...» Толькі аддзел гумару і сатыры быў здавальняючы. Партком звярнуў увагу Андрэя, як члена парткома і загадчыка агітпропа,

каб той запяўся часопісам. І вось Андрэй разглядае яго. Ведае, што большасць зняволеных агарнула паэтычная стыхія — кожны дзесяты чалавек піша вершы, а, напэўна, палавіна піша дзённікі. Дзённікі былі розныя. Андрэй выпадкова праглядаў некалькі дзённікаў і бачыў, што часам гэта — «дзелавая» хроніка, накшталт таго: «25 атрымаў з дому ліст. Хадзіў да фельчара, нешта балела галава. Уначы сцілася жонка». Але, безумоўна, і ў гэтым было нейкае імкненне прабіцца да свядомага асэнсавання падзей, імкненне ўпарадкаваць свае думкі і пачуцці.

Нават Круцік тонам узорнага гімназіста заявіў, што ён кожны дзень «трошкі чытае Маркса і трошкі піша дзённік».

Лепш абстаяла справа з вершамі. Тут вылучаліся таленты. Вершаў давалі ў рэдакцыю многа — лірычных, сатырычных, гумарыстычных,— на рускай і беларускай мовах.

Андрэй перагортваў часопіс, надрукаваны каліграфістамі з усёй прыгажосцю, уласцівай гэтаму мастацтву, і ўвогуле быў задаволены. Вось раздзел гумару. Намаляваны слуп. На ім дошчачка з надпісам — «фізіка». У слуп упёрся лобам казёл, відаць, хоча яго вывернуць. Гэта шарж на аднаго таварыша па фаміліі Казёл, які страшэнна захапіўся фізікай. Ён усім гаварыў нястомна, аж да прытарнасці, што фізіка самая важная навука з усіх навук.

Андрэй прагледзеў амаль увесь часопіс, калі да Райскага падышоў, усміхаючыся, высокі мужчына з пышнымі цёмна-карычневымі вусамі, старанна расчасанымі. У руцэ ён трымаў кашолачку з махоркай.

— Мне сказалі надзяліць вас махорачкай. Калі ласка,— прамовіў вусач з лёгкім наклонам.

— Гэта каго — нас? — спытаўся Райскі.

— Вось хаджу па катлу і ўсё раздаю. Галава-канцёр сказаў...

— Праўду гаворыш, Станчык?

— Што, ашукваць буду?

— Ну, глядзі...

— Ён у адной справе з намі...— растлумачыў Райскі, калі Станчык адышоў.

— Ага,— кіўнуў Андрэй і разглядаў часопіс далей. Перад вачыма ўсё яшчэ стаяла шальмоўская ўсмешка Станчыка. І вось ён, Станчык, на адной са старонак часопіса намаляваны ва ўвесь рост з кашолкаю ў руках. З кашолкі падаюць пачкі махоркі, але ляцяць яны чамусь-

ці не на зямлю, а ў кішэню Станчыка, адкуль насустрач ім цягнецца кручок.

Андрэй ударыў далоняй па рысунку і засмяяўся:

— Здорава! Мы, па-мойму, таксама трапілі на кручок. Пад'ехаў да нас гэты вусач... Глядзі...

— Гэты нумар не я рабіў. Я быў на судзе — не паспеў праглядзець раздзел сатыры і гумару,— сказаў Райскі і, глянуўшы на малюнак, ускрыкнуў: — Ах, чэрці! Падчапілі вусача.

Пад рысункам страфа:

Ой, полна, полна коробочка —
Станчик вынес табачок.
Почему же та махорочка
Попадает на крючок?

Значыць, скончылася кар'ера шальмаватага вусача Станчыка, кар'ера табачнага канцёра...

Часопіс «Астрожныя думкі», пераходзячы з камеры ў камеру, чытаецца з асцярогай і захоўваецца, каб пры вобыску не трапіў у рукі турэмнай адміністрацыі. Часопіс у той ці іншай меры адбівае настроі і наогул унутранае становішча палітзняволеных, і адміністрацыя скрупна канфіскуе яго, калі знаходзіць пры вобыску. Адміністрацыя робіць свае вывады, як умеюць камуністы выкарыстоўваць часопіс у сваіх мэтах, ці няма сярод зняволеных хістанняў. Так што часопіс «Астрожныя думкі» не можа быць легальным у катле. Турэмны камітэт палітзняволеных дае строгі наказ усім камерным тройкам старанна захоўваць часопіс. Начальнік турмы Каняўскі — адукаваны чалавек, з гнуткай тактыкай гульні ў законнасць, пад якою прыхавана лжывасць. Ведаюць камуністы, што ён яшчэ пакажа свае кіпцюры, знайшоўшы прычыну абвінаваціць палітзняволеных у непашане да тых «правоў», якія ім «дадзены» ўрадам. Становішча даволі хісткае, і таму трэба быць гнуткім у кіраванні калектывам, пільным, каб у гэтым катле «перахітрыць» адміністрацыю, замацаваць свае пазіцыі. Каняўскі нездарма мае сваім намеснікам невялічкага смуглага чалавека ў дымчатым пенснэ, што сціскае яго дзюбаты нос, як абцугамі. Прозвішча гэтага намесніка Кручоны. Нешта задымленае, закапцелае ў гэтым твары, і ідзе Кручоны па турэмным падворку, нібы прасоўваецца праз імглу, неяк няўпэўнена, вобмацкам. Ніколі не бывае злосным, адна зброя — усмешка і позірк з-пад пенснэ, але гэты позірк нейкі зеленаваты. Хлопцы акрэслілі — змяіны. Сакрэт яго намесніцтва ў тым, што Кручоны

прабыў чатыры гады япчэ ў царскай турме за прыналежнасць да ППС і цяпер на свой лад цешыцца адроджанай Польшчай. Ён прызначаны для працы ў сектары палітычных — ён жа «ведае» псіхалогію зняволеных, ведае, з якога боку падысці да іх, каб пасеяць ілюзіі, асадзіць, закілзаць камуністычныя «інстынкты». Кручоны часта прыходзіць у кацёл і доўга стаіць збоку, пазірае праз сваё дымчатае пенснэ, і, здаецца, нічога нельга прачытаць па гэтым смуглым, невялічкім, дзюбатым твары. У цёмнакарычневым мундзіры, з зялёнымі нашыўкамі па каўняры, акаймаванымі залацістымі палоскамі, Кручоны стаіць, заклаўшы рукі назад, і часам падрыгвае нагамі ў каленях.

Ён нездарма прыходзіць у кацёл — гэта разведка. Ведаюць аб гэтым палітзняволеныя і стараюцца адгадаць тактычныя ходы адміністрацыі, каб не быць захопленымі знянацку. Набліжаецца Першамай...

Красавіцкае сонца не толькі грэе, але ўжо нават і прыпякае. Ранняя сяголета вясна. І прыгожым будзе Першамай. Нумар часопіса «Астрожныя думкі» прысвячаецца яму.

— Кручоны...— даляцела да вушэй Андрэя. Андрэй і Райскі агляпуліся: па сходках у кацёл спускаўся Кручоны — ішоў павольна, заклаўшы рукі назад. Спусціўшыся са сходкаў, спыніўся і асцярожна павёў вачыма навокал. Кацёл шумеў сваім шматгалосым шумам, нібы не звяртаючы ўвагі на з'яўленне стража парадку. Але кожнага так ці інакш наведала пачуццё пільнасці. І рэдактары схавалі часопіс. Пачалі сачыць за Кручоным. А ён, пастаяўшы хвіліпу, накіраваўся на сярэдзіну пляца. Паглядзеў пару кніжак на лаўцы і тут жа (Андрэй і Райскі і не агледзеліся, як гэта хутка адбылося) зрабіў некалькі шпаркіх крокаў і стаў за спінамі рэдактараў. Крыху пераглнуўся цераз спінку лаўкі і спытаўся:

— Што вы чыталі, панове?

— Ды вось кнігу.

— Гм... ага... бачу... А гэта што ў вас за пазухай? — спытаўся Кручоны ў Андрэя.

Андрэй дастаў скручаны ў трубку часопіс.

— Гэта... спытак аднаго таварыша...

— Прашу паказаць.

Момант быў крытычны. Што рабіць? Аддаць ці не? Вядома, не. Але як не аддаць?

— Чужога спытка я паказваць не маю права,— сказаў Андрэй.

— Вы не бойцеся... Я за гэта адказваю. Нічога сшытку не зробіцца. Я яго вам вярну...

Відаць, Кручоны заўважыў недзе з акна, няйначай, ткацкай майстэрні, што рэдактары чыталі імення часопіс. Бо чым жа вытлумачыць такую настойлівасць? Рэдактары сядзелі, а ззаду стаяў Кручоны, навіс сваім дзюбатым носам над душамі, як каршун.

Андрэй скоса глянуў на Райскага, падмаргнуў, ціха сказаў: «Перадавай далей» і сунуў скрутак яму ў руку. Райскі тут жа кінуў яго ў групу, якая стаяла недалёка, і крыкнуў: «Лавіце, перадавайце далей!» Так і пайшоў гуляць часопіс «Астрожныя думкі» з рук у рукі. Кручоны разгублена апусціў галаву, памкнуўся быў да групы, куды трапіў часопіс, але ён паляцеў ужо ў другія рукі, як мяч, і ўрэшце недзе загубіўся. На дапамогу Кручонаму бег наглядчык, але скрутак ужо знік. Кручоны пастаяў з мінуту, нешта мармытнуў сабе, адкашляўся, і ўсмешка чалавека, які прайграў ігру, прамільгнула на яго твары.

Сказаў рэдактарам:

— Спрытна, спрытна,— і накіраваўся да выхада.

Ужо сотні вачэй сачылі за ім, як ён аддаляўся з нязменна закладзенымі назад рукамі. Як толькі Кручоны занёс нагу на сходку, услед яму бухнула хваля воплескаў, нехта нават свіснуў... Няўдалы разведчык, як апечаны, не азіраючыся, падаўся да цёмнай праймы дзвярэй.

Трэба чакаць вынікаў — Кручоны так не прапусціць свайго паражэння. Мінут праз пятнаццаць быў аб'яўлены канец прагулкі. Хлопцы адзін за адным памкнуліся да ганачка, але тут насустрач выйшла цэлая чарада наглядчыкаў на чале з самім Кручоным. Пачаўся вобыск. Кожны быў абмацаны з галавы да ног. Кручоны стаяў збоку, крыху збялелы, але на твары ўжо свяцілася ўсмешка пераможцы. «Тут вы нідзе не схаваецеся»,— гаварыла гэтая ўсмешка. Але часопіса так і не знайшлі. Наглядчыкі лазілі па пустым пляцы, корпаліся ў траве ля самай сцяны, хадзілі прыгнуўшыся, але нічога не знайшлі. Кручоны глянуў на сцяну, высокую, замшэлую, што прытулілася да касцёла, і сказаў: «Магчыма, што перакінулі туды». Дарэмныя натугі! Часопіс быў выратаваны. У час раздачы абеду скрутак непрыкметна быў пакінуты ў камеры бібліятэцы крыміналістам. Увечары пры праверцы Андрэю і Райскаму была абвешчана кара — трое сутак ізаляцыі ў адзіночцы. Не сумуйце, хлопцы, Кручоны толькі мацае грунт, ды і то мацае асцярожна...

* * *

...У камеры жыццё гудзела тым размераным гулам, у якім можна пагрузіцца ў ціхую задуму і нічога не чуць, апрача сваіх думак. Андрэй пасля адзіночкі быў пераведзены з «вакзала» ў другі будынак, у невялікую камеру, звернутую вокнамі на турэмны двор. У камеры сядзела толькі семнаццаць чалавек. Адміністрацыя палічыла, што Андрэя нельга трымаць у такой масавай камеры, як «вакзал». Там добры грунт для «крамольнай» дзейнасці. Кручоны ж «ведае» псіхалогію зняволеных.

Дзень быў пагодлівы. На турэмным двары, на старым разгалістым клёне, у яго густым свежым лісці шумела птаства. На ўсім ляжалі адзнакі звычайнага турэмнага жыцця — на вартавых вежах стаялі наглядчыкі з вінтоўкамі за спінамі і мёртвымі вачыма глядзелі на двор, на будынкі; па двары ішлі крыміналісты з мётламі, некаторыя з іх падмяталі ўжо, наглядчык з паперай у руцэ правёў групу зняволеных у шпіталь да ўрача, прайшоў намеснік начальніка турмы. Здаецца, усё спакойна. Хутка павінен зацурчаць свісток на абед. А пакуль што хлопцы займаюцца кожны сваімі справамі. Адзін сядзіць з цыркулем перад разгорнутай геаметрыяй і крэсліць кругі — рашае нейкую задачу, другі тлумачыць суседу супраціўленне металаў, трэці ў сшытку малюе застаўку — каменную сцяну, праз якую да сонца прабіваецца зялёнае дрэўца; двое схіліліся над геаграфіяй, двое заўзята рашаюць задачы з задачніка Малініна і Бурэніна... Вусаты дзядзька, старанна паголены, з салдацкай выпраўкай, не расстаецца з кнігай Бюхнера «Сіла і матэрыя». Вельмі яму падабаюцца доказы, што на свеце няма бога. Увечары, пасля паверкі, гэты «бравы салдат» любіць спяваць — «Окрасился месяц багрянцем, и волны шумели у скал». А пакуль што, каб зручней было чытаць, ён абапёр кніжку на бляшанку ад «Монпансье», дзе трымае табаку, і кніжка стаіць перад ім разгорнутая, проста сама глядзіць яму ў вочы. Андрэй схіліўся над кнігай Леніна «Што рабіць?». Гэта адзіны экземпляр на ўвесь калектыў і то заканспіраваны. Калі адгорнеш вокладку, дык прачытаеш — «Вселенная и ее тайны».

Нічога не робіць адзін Барыс Капанец. Яго нядаўна перакінулі сюды з суседняй камеры. Ён залез на кучу сеннікоў, накрытых у кутку коўдрамі, лёг на бруха і, апёршыся падбародкам на рукі, глядзіць у акно. Ён чакае

толькі таго, каб хутчэй капцёр абвясціў закурку. Андрэй часта іранізуе над Кананцом, іранізуе з асалодай, не пераносіць гэтага чыноўніка, не можа яму дараваць яго паводзін у Глушцы. А Кананец лашчыцца да Андрэя, проста падхалімнічае, на што Андрэй адказвае халоднасцю, пагардай. Праводзячы калектывізацыю ў камеры, Кананец па-чыноўніцку перагнуў палку і выклікаў абурэнне з боку селяніна — вучня Гарагляда, што доўга маліўся ранкамі. Замест перакананаўчых, таварыскіх слоў Кананец, як сакратар камернай тройкі, стоячы ў канцы стала з «грознай мінай», не пераконваў, а проста загадваў: «З заўтрашняга дня будзем дзяліць прадукты пароўну ўсім не толькі тыя, што атрымліваем па лініі МОПРа, але і тыя, якія атрымліваем з дому... І не можа быць тут ніякіх супраціваў. Хто не падпарадкуецца гэтаму, той можа быць выключаны з калектыву...»

Набожны дзядзька сядзеў у кутку і слухаў, звесіўшы сваю цёмна-русую галаву, падстрыжаную «пад гаршчок». Пасля апошніх «начальніцкіх» слоў Кананца ён узняў галаву, і сумныя шэрыя вочы загарэліся агеньчыкам. Устаў, ступіў крок да стала і тут жа, як проста з моста, заявіў Кананцу:

— А ты мне паараў, пасеяў, што будзеш дзяліць маю пасылку? Га?

— Ты, дзядзька, адсталы элемент! — раўкнуў Кананец.

— Паглядзім, які ты не адсталы... Адсталы, адсталы... Начальнік мне знайшоўся... Паглядзім, што ты атрымаеш з дому...

— Ты, дзядзька, замаўчы...

Некаторыя хлопцы шматзначна пераглянуліся. Адзін сказаў:

— Можа б, так не трэба было востра...— І звярнуўся да дзядзькі: — Ты, дзядзька, не бойся... Сам пераканаешся, што ў калектыве лепш. Нам трэба падтрымліваць адзін аднаго, а то паны нас задушаць...

— Ды я што? — адказаў дзядзька.— Хіба я за паноў?

Кананец у сваёй казённай дзёрзкасці адчуў сябе пакрыўджаным. Ён то бялеў, то чырванеў і ўрэшце, выняўшы руку з кішэні штаноў, як дрэнны артыст на сцэне, тыцнуў у дзядзьку пальцам.

— Зараз жа пакладзеш свае прадукты на стол!..

Гэта перапоўніла меру.

— Ага, пакладу, дачакаеш...— сказаў дзядзька і, устаў-

шы, выцягнуў з-за печкі свой мяшок з рознымі рэчамі, высыпаў пасярод камеры.

— На, бяры, усё бяры, калі ты такі непаедны...

На падлогу вываліліся, абдаўшы хлопцаў пылам, стары кажушок, такія ж старыя шэрыя валёнкі, абшытыя скурай, зрэбная сарочка з такімі ж штанамі, анучы, нейкі лахман, многа кавалачкаў — шэрых, суконных, чорных і нават старыя аборы ад лапцяў...

— Вось на, бяры, калі табе мала...— яшчэ раз сказаў дзядзька.

Хлопцы сумеліся і не ведалі, што рабіць,— не то смяяцца, не то сварыцца на дзядзьку. Не ведаў, што рабіць, і Кананец — хмурыў бровы, чырванеў. Не чакаў такога адказу ад дзядзькі. Ён выняў з кішэні хустачку і выцер твар. Хацеў ужо нешта сказаць, але на выручку ўстаў Дзям'ян Гарагляд.

— Хіба ты, Юрка, здурнеў, ці што? — звярнуўся ён да свайго вучня.— Ну, як табе не брыдка? Хіба ж ты адзін арэш, сееш? І я ж араў, сеяў, а вось, бачыш, іду разам з маладымі. І таксама жонку з дзецьмі дома пакінуў, як і ты. І вось напісаў пісьмо, каб прыслала сухароў, сала. Хутчэй збяры назад у мяшок гэтае рыззё...

Дзям'ян падняў мяшок і працягнуў свайму вучню. «Вучань» пачухаў патыліцу і моўчкі, з дапамогай Дзям'яна, пачаў складваць сваю маёмасць. Схаваўшыся ад усіх у кутку, старанна завязаў мяшок шнурком і засунуў яго назад за печ.

Вочы яго не глядзелі ні на кога, калі ён ішоў на сваё месца, каб сесці. Нешта карцела яму сказаць. Кідаў з-пад шэрых броваў азадачаныя позіркі і, урэшце, адважыўшыся, сказаў:

— Я ўсё ж такі пайду да таварыша Паддубнага са скаргай... Хіба ж можна так?

Хлопцы гукнулі: «Добра, пойдзеш...»

Праз дзень, па пастанове турэмнага камітэта, Кананец быў зняты з пасады сакратара камернай тройкі з суровай вымовай за няўменне кіраваць камерай. На камерным сходзе выбралі за сакратара яго намесніка, чалавека сярэдніх год, добрага сялянскага жартаўніка. Замест Кананца, як трэці член тройкі, быў выбраны Дзям'ян Гарагляд.

Хутка, па дзіва ўсім, адміністрацыя перавяла Кананца ў суседнюю камеру. Няўжо наглядчык падслухаў з калідора гэтае здарэнне з дзядзькам? Як бы яно ні было,

а Кананец, вызвалены ад абавязкаў, цяпер ляжыць на кучы сеннікоў і глядзіць у акно. Любімым яго заняткам яшчэ было назіраць, як капцёр дзеліць ежу на стале (хлеб, сала ці цукар). Кананец садзіцца ля стала і глытае сліну. Сядзіць, як прышыты да лаўкі, і час ад часу тыцкае пальцам у порцыі:

— Вось тут трошкі далажы... Вось тут замнога...

Але так дапамагаючы капцёру, ён наперад аблюбоўвае сабе порцыю, якую лічыць найбольшай, і таму заўсёды, як капцёр скажа: бярыце, бярэ першы. Не падабаецца гэта хлопцам, але яны тактоўна змоўчваюць. Ніхто не дружыць з Кананцом, і ў гутарках развальваецца яго ўяўная эрудыцыя. Ну, як гэта можна, каб адвакацкі сакратар ды нічога не ведаў? Хіба ж ён не ведае, напрыклад, хто такі Капернік? Ведае. На пытанне хлопцаў — хто ж такі Капернік? — Кананец паважна моршчыць лоб, нават стукае пальцамі над пераноссем, напружана думаючы.

— Капернік? Гмм... Стой, стой... Гэта, мне здаецца, адзін з генералаў Напалеона...

Хлопцы рагочуць, аж за жываты бяруцца, а Кананец стаіць пачырванелы, хмурачы бровы. Урэшце хлопцы тлумачаць яму, хто такі Капернік. Тады Кананец пядбала махае рукою і кажа:

— А на чорта ён мне патрэбны.

Андрэй дадае да ўсяго:

— Так, так, пане пісар, твае веды далей валаснога праўлення не ідуць...

І вось у гэты размераны гул камеры адпескуль прарваўся крык:

— Мурашка!

Турма зашумела, заклекатала, гукнула, як быццам полк салдат рынуўся з засады на ворага. «Кат! Кат!» — было адзіным словам, якое ў адзін голас крычалі ў вокны сотні галасоў. Пры першым крыку ўсе, хто быў у камеры, кінуліся да акна. Кананец ад нечаканасці зваліўся з сеннікоў і збялелы спытаўся: «Што, можа, пажар?» Хлопцы карабкаліся адзін па другога, каб глянуць у акно, і крычалі: «Кат! Кат! Забойца!» Андрэй убачыў, як па турэмным падворку ішоў нізкаваты чорнавалосы чалавек, ішоў адзін, без суправаджэння паглядчыкаў, хоць лічыўся вязнем. І ад кожнага такога грознага крыку ён хістаўся ўбок, як ад ветру. Ён часам узнімаў галаву, каб глянуць на вокны, але тут жа апускаў вочы. Усе ведалі, што Мурашка — гэта забойца Багінскага і Вечаркевіча —

польскіх афіцэраў-герояў, якія хацелі ўзарваць цытадэль у Варшаве. Гэты чорнавалосы чалавечак, што цяпер вось, як запалоханы звер, сунецца па падворку, застрэліў іх быццам бы пры спробе ўцячы. І турма бурліць грозным гневам, і ўся адміністрацыя выбегла са сваіх канцылярскіх нораў, устрывожаная не на жарты.

Кручопы, са смуглага зрабіўшыся белым, задраў галаву перад вокнамі і супакойваў: «Спокуй, панове, спокуй!» За ім тое самае рабілі і іншыя намеснікі, «пшодоўнікі», наглядчыкі. А крык усё не сціхаў, пакуль забойца не знік за паваротам. Нельга схавацца ад народнай пільнасці, хоць адміністрацыя хавае гэтага забойцу ў асобнай камеры...

Гнуткасць начальніка-«лібераля» Каняўскага праявілася і тут. Усе чакалі кары за крыкі, а начальнік толькі выклікаў да сябе ў кабінет старасту калектыву палітзняволеных Зайчыка і папярэдзіў, каб больш такіх «эксцэсаў» не паўтаралася. Але ўсё ж такі загадаў зрабіць перетасоўку зняволеных, і ў камеру, дзе сядзеў Андрэй, адміністрацыя ўкінула Апанаса Хмеля.

* * *

Дні ішлі за днямі. Справы змяняліся справамі. Паступова наладжвалася жыццё ў калектыве, хоць не без скрыгату. Але, апрача спраў сур'ёзных, арганізацыйных, асветных, былі і «вясёлыя падзеі». Прасачылася новая рамантычная авантура Апанаса Хмеля. Аказваецца, яшчэ перад дэманстрацыяй пратэсту супроць забойцы Мурашкі ён, Апанас Хмель, заняўся ў «вакзале» арганізацыяй уцёкаў з турмы. Ён думаў, што павінна ўцячы толькі выбраная ім група.

А ці раіўся аб гэтым Апанас з парткомам? Дзе там! Ён вышэй за ўсе парткомы. Ён і Аляксандр Сучок начамі шапталіся адны — і дашапталіся, што трэба «канспірацыйна», нікому нічога не кажучы, здзівіць свет. Апанас звязаўся з крыміналістамі, і адзін з іх (цырульнік) у белы дзень, калі прыйшоў у камеру галіць зняволеных, даў Апанасу нешта, загорнутае ў анучу. Гэта была вяроўка з жалезным крукам. За замшэлую сцяну, што ля касцёла, можна з акна закінуць вяроўку. У катле на начах наглядчыкі не стаяць. Застаецца толькі выразаць краты. Апанас дастаў нават і адпаведную пілку. Колькі ні ўгаварваў

змоўшчыкаў Аляксей Верас кінуць гэтую работу, якая асуджана на верную няўдачу, дзе там! — змоўшчыкі і слухаць не захацелі.

— Што з табою гаварыць,— буркнуў Апанас,— ты апартуніст.

І трэба было бачыць, як гарэлі вочы ў Апанаса, як раздзімаліся ноздры, як ён цепем хадзіў уначы ля вокнаў і заглядаў у кацёл! Што тут доўга варажыць — раз-два і можна быць за сцяною. А там свабода, назначана месца сустрэчы з іншымі ўцекачамі. Ды дзе? На другім беразе Нёмана, у лесе. Тры свісты — сігнал для збору. Што за прыгажосць, ды яшчэ, можа, у месячную ноч за Нёманам! Гуляй, душа, дыхай прасторай, свабодай!

Аднойчы ўначы, калі ўсе, здаецца, ужо заснулі, апрача Аляксандра Сучка, які стаяў ля дзвярэй і прыслухоўваўся да крокаў наглядчыка на калідоры, Апанас пачаў пілаваць краты. Яму так хацелася перапілаваць жалезны прэнт адным махам, што ён забыўся лінуць вадкасці на рэз, і краты зазвінелі. Тут жа на калідоры пачуліся крокі, пстрыкнуў выключальнік і асвятліўся «вакзал», дзе покатам у чатыры рады, ад сцяны да сцяны, на нарах ляжалі людзі. Сучок паспеў адскочыць і схавацца за печку. Апанас, як ламавы конь, кінуўся за нары і лёг на падлогу. Доўга глядзеў наглядчык праз «ваўчок», гасіў святло, а праз хвіліну зноў запальваў. Значыць, нешта прыйшло яму на думку падазронае. Так і не здзейсніліся гэтыя ўцёкі ні ў тую ноч, ні пазней.

Доўга не маглі заснуць сябры-змоўшчыкі. У Апанаса ляскалі зубы ад узбуджэння. Час ад часу ён пытаўся ў Сучка:

— Ці добра ўсё схаваў?

Той, сапучы ў нос, павольна адказваў:

— Не бядуй, добра.

І потым дадаваў:

— А заўтра, напэўна, будзе вобыск.

— Няўжо? Ты думаеш?

— Наглядчык, відаць, нешта западозрыў... Трэба ўсю гэтую нашу рэмузію ранкам вынесці і кінуць у прыбіральню. Інакш можам папасціся... Тады будзе бяда...

— А можа, у печку схаваць?

— Знойдуць,— прагнусавіў Сучок.

...Назаўтра ў «вакзале» адбыўся такі вобыск, якога ні разу дагэтуль не было. Абмацалі ўсе сеннікі, не толькі куткі. А ўвечары пры праверцы адбылося нечаканае. Апра-

ча галоўнага наглядчыка, які лічыў людзей, увайшлі яшчэ два наглядчыкі з малаточкамі і пачалі стукаць па кратах. А на другі дзень пачаўся перавод некаторых людзей з «вакзала» ў іншыя камеры. Так і трапіў Апанас Хмель у камеру Андрэя.

Усіх здзівіла, вядома, чаму наглядчыкі пачалі прастукваць краты малаткамі. Нешта недзе адбылося.

Тады Аляксей Верас далажыў аб усім Івану Паддубнаму.

— Дык гэтага дабіўся Хмель? — працягнуў Паддубны.— Ну што ж, высветлім, як гэта здарылася.

Справа Хмеля была перададзена на партком. Вылучылі асобную камісію для расследавання. Нарэшце Андрэй вырашыў, што надышоў час вывесці Апанаса Хмеля на чыстую ваду. Праўда, і раней Касцевіч не мог згадзіцца з тым, што Апанаса Хмеля не выключылі з партыі яшчэ тады, калі ён хацеў кінуць гранату ў поезд, ці тады, калі страляў у яго, Андрэя, у вёсцы Дубы. Думаў, што ёсць, відаць, у гэтым нейкі свой сэнс. Гэты сэнс у гутарцы вылушчыў яму, як зерне з шкарлупіны, той жа самы Іван Паддубны, які глядзеў на Андрэя з павагай, з якою глядзяць на юнака, што падае надзеі на рост, але для якога шмат яшчэ ёсць незразумелага. Недаверлівым часам здаецца Паддубны, непрыступным, як сцяна. Недзе як быццам па паўдарозе зачыняе ён дзверы перад самым носам Андрэя, не пускае ў свой апошні запаветны пакой. І гэта ў той час, калі Андрэй з імпэтам ірвецца ва ўсе дзверы, думаючы, што яны ўсе павінны быць для яго адчынены. І тады нібы пачуццё спалоху апаноўвае Андрэя, і робіцца трохі крыўдна, як быццам хтосьці незаслужана штурхнуў яго ў грудзі.

— Мне здаецца, Іван Пятровіч, што ты памыліўся тады, калі адклаў выключэнне Хмеля з партыі,— сказаў Андрэй, ідучы побач з Паддубным па «тратуарчыку» катла.

Паддубны нібы з дакорам ускінуў вачыма з-пад казырка кепкі і тут жа адказаў:

— Няправільна гаворыш...

І, крыху пасуплены, змоўк.

А Андрэй думаў: «Чаму няправільна? Здаецца ж, усё ясна. Можа, я не так паставіў пытанне?» Паддубны, відаць, адчуў няўпэўненасць Андрэя, бо зараз жа сказаў:

— Хадзем прысядзем...

Нельга ж далей нацягваць струну ў душы Андрэя.

Яна можа лопнуць, і тады дружба можа перайсці калі не ў крыўду, то ў бяздушную фармальнасць.

Сябры прыселі.

— Бачыш...— пачаў Паддубны, і лоб яго зморшчыўся над кірпатым носам. Паддубны шукаў слоў, выразаў.— Не так-та лёгка ўсё. Жыццё больш складанае, чым ты думаеш...

І зноў змоўк. Цяжка, відаць, было яму дакладна выказаць, перадаць нешта самае важнае, што жыве ў душы.

— Апанас Хмель быў для мяне такім чалавекам, якога самі падзеі няўмольна выкрыюць,— дадаў ён.

Андрэй насцярожыўся і чакаў. Ён меў ужо доказ, каб не згадзіцца з Паддубным, але чакаў...

— Калі б мы Хмеля выключылі тады, як ён намерваўся кінуць гранату ў поезд, Хмель нарабіў бы нам шкоды. Бо ён тады мог спекуляваць. Той-сёй мог паддацца яго дэмагогіі. Яго трэба было паступова выкрываць, у той жа час абясшкоджваючы. І мы гэта па меры магчымасцей рабілі.

Падрыхтаваныя пярэчанні пачалі гаснуць у душы Андрэя. Пачало падыходзіць прасвятленне. Але яшчэ нямала прасілася пытанняў, каб урэшце ўсё зрабілася зусім ясным. «Значыць, мае турботы аб інтарэсах партыі, пароджа стаялі ніжэй турбот яго, Паддубнага»,— сцвердзіў сам сабе Андрэй. І яму стала радасна за Паддубнага. І тут, можа, упершыню з такой сілай адчуў Андрэй, як гэта дорага не страціць веры ў тое, у што пядаўна верыў і што любіў. Зірнуў у твар Паддубнага, які хоць і быў заклапочаны, але асветлены прыхаванай усмешкай і выглядаў таямніча-хітравата. Паддубны, відаць, зразумеў палёгку, якую адчуваў у душы Андрэй. Яна была разам з тым і яго палёгкай, і ён пачаў гаварыць больш свабодна, наступальна.

— ...А потым была ж надзея і на тое, што ён, урэшце, зразумее свае хібы і стане на правільную дарогу... Гэтай надзеі, Андрэй, ніколі не трэба траціць у адносінах да людзей.

— Цярплівасці ж колькі...— вырвалася ў Андрэя.

— Вось, вось, імення цярплівасці, вытрымкі. Нічога не зробіш... У гэтым уся сутнасць справы. Мы не маем права быць паспешлівымі.

Андрэй слухаў, згаджаўся, але ўсё роўна праз нейкі час хвалі трывогі падплывалі да сэрца, і ён горача сказаў:

— Уся работа Хмеля мне здаецца нейкай злавеспай ігрою. Не веру я ў яго партыйнасць!..

— З чаго ты выходзіш у даным выпадку? — лагодна запытаўся Паддубны.

— Я выходжу з яго псіхалогіі... Мяняць псіхалогію... Гм...— і Андрэй закруціў галавою.— Цяжкая справа мяняць псіхалогію... Ды яшчэ ў тым выпадку, калі чалавек і ахвоты не мае па гэта.

Паддубны змоўк, на хвіліну задумаўся, не ведаў, што зараз адказаць. З іншых пазіцый глядзеў ён на справы — з пазіцый суадносін масавых зрухаў у класавай барацьбе, і псіхалогія для яго была справай, вядома, не вырашальнай.

Андрэй жа, наадварот, моцна чапляўся за псіхалогію і думаў, што не памыляецца ў сваіх вывадах.

«Літаратурны ўхіл,— прамільгнула ў галаве Паддубнага.— Аднак... тут нешта ёсць такое, чаго я, можа, і сапраўды недаацэньваю. Няўжо старым раблюся?» Паддубны стомленым рухам рукі скінуў кепку і паклаў побач на травяністыя камені бруку, на якім сябры сядзелі ля сцяны. Пасля прыжмурыўся на сонца, якое спынілася пад дахам касцёла і сваім агністым, распрамененым вокам глядзела на кацёл, льючы на галовы гаманлівых людзей сваю ласкавую цеплыню.

Паддубны прыгладзіў валасы рукою і пасля паўзы вярнуўся да ранейшай гутаркі:

— На адной псіхалогіі далёка не паедзеш. Можна ўпасці ў аднабаковасць. Вось мне так здаецца. Нашы заклікі, адным словам, уся наша праца, улічваючы і псіхалогію людзей, накіравана на рэвалюцыянізаванне мас...

— А што рабіць з тымі людзьмі, якія перашкаджаюць гэтаму працэсу, усаджваюць кол у спіцы?..

Паддубны нахмурыў бровы.

— Ты ўсё пра тое ж... Пра Хмеля?

— Так, пра Хмеля,— нават з некаторым раздражненнем адказаў Андрэй.— У нас сабралася шмат фактаў. Узяць хоць бы гісторыю з Казючком. Нездарма ж Хмель яго тэрарызаваў і давёў да самагубства. Тут недзе сабака закапаны...

— Так, імення. Недзе сабака закапаны,— машынальна паўтарыў Паддубны.— Значыць, трэба знайсці гэтае месца і выкапаць «сабаку». Я пісаў на волю. Паглядзім. Наогул, Андрэй, бываюць умовы, калі трэба вычакаць.

І, паклаўшы руку на плячо Андрэя, ласкава дадаў:

— Не журыся, юпача, Хмелю прыйдзе канец. І думаю, што хутка. А цяпер я цябе пакіну. Мне трэба сказаць некалькі слоў Зайчыку. Учора зноў не прынялі перадач. Значыць, нешта новае пачынаецца ў нашым жыцці.

Андрэй, застаўшыся адзін, падумаў з прыкрасцю: «Стары зноў з бразгатам зачыніў дзверы перад маім посам. Ну і ўпарты».

А Паддубны павольна крочыў па пляцы да Зайчыка і з горыччу думаў аб тым, калі ўрэшце ў Варшаве зразумеюць, што гэта злачынства — пяньчыцца з такімі прахвостамі, як Хмель. Хто яму там варожыць, у тым ЦК? «Але нічога, пройдзе яшчэ нейкі час, і мы пазбавімся ад гэтага авантурыста». І рука Паддубнага міжволі сціснулася ў кулак.

* * *

Камісія дакладвала на парткоме справу аб арганізацыі Апанасам Хмелем уцёкаў з турмы. Усе слухалі з цікавасцю, седзячы ў кутку катла. «Патрыярх» Зайчык сядзеў, прытуліўшыся да сцяны, і задумліва час ад часу пагрызваў сваю кульбачку, якая заканчвалася металічным, бліскучым абадком. Так пагрызвае, скажам, вучань канец алоўка. Здавалася, што ён думаў аб чымсьці іншым. Але, калі дакладчык дайшоў да таго, як зазвінелі краты пад пілкай Хмеля, Зайчык дабрадушна засмяяўся, задраўшы галаву так, што пенснэ заскакала на носе, і кіпуў у бок Апанаса:

— Нячыстая, брат, работка... Пасняшыў — і людзей насмяшыў...

Як выявілася потым, гэтая заўвага Зайчыка надала топ выступленням усіх членаў парткома.

Апанас слухаў даклад нервова — то чырванеў, то астываў, то кідаў рэплікі: «Хлусня! Давай, давай больш! Я пратэстую!..»

Тады Паддубны павольна ўзнімаў галаву, спыняў позірк на Апанасе і часам выкрыкваў: «Апанас, ці ты?..» Апанас апускаў нос, сціхаў, круціў цыгарку, курыў, прагна зацягваўся.

Пасля даклада пачаліся выступленні. Усе намагаліся сурова асудзіць недысцыплінаваны ўчынак Хмеля. Паддубны прыпомніў Апанасу тое-сёе з мінулага і памахаў пальцам:

— Табе трэба прадумаць увесь свой шлях. Партыя чакае ад цябе гэтага.

Калі ж, нарэшце, далі слова Апанасу, ён пачаў заікацца:

— Я... Я... прызнаю, што... зрабіў недысцыплінаваны ўчынак. Але, з другога боку, я стаўлю пытанне аб інтрыганстве Вераса і Касцевіча ў адносінах да мяне. Толькі прычыны канспіратыўнага характару прымусілі мяне арганізаваць уцёкі на сваю адказнасць.

— А выпады супроць парткома, насмешкі, ігнараванне — гэта чым вытлумачыш? — спытаўся Паддубны.

— Гэта — хлусня! Шкада, што ты, стары партыец, паддаешся хлусні...

Блакітна-шэрыя, навыкат вочы старога Зайчыка мітусліва заморгалі пад пенснэ і пасля сур'ёзна глянулі на Апанаса.

— У цябе, відаць, малады чалавек, мазгі штосьці не ў парадку,— сказаў ён,— можа, тут ёсць свая лінія, не ведаю... Адно пакуль мне зразумела, што ты ўсюды бачыш інтрыганства...

— Якая лінія? Якая лінія? — замітусіўся Апанас.

— Лінія ў нас можа быць толькі палітычная...— адказаў Зайчык і потым закончыў спакойным голасам: — Прапаную спыніць спрэчкі... Пытанне можна лічыць высветленым.

Прапанова Зайчыка была прынята аднагалосна. Апанасу прапанавалі адысці, пакуль не паклічуць. Партком павінен прыняць рашэнне аб усёй справе.

Толькі адзін чалавек — Андрэй — выказваўся за выключэнне Хмеля з партыі на тры месяцы. На гэта Зайчык сказаў:

— Можна было б падтрымаць гэтую прапанову, але аднаго факта мала для такой кары. Падтрымаем прапанову Паддубнага: зняць Хмеля з пасады сакратара ячэйкі і пазбавіць права рашаючага голасу на тры месяцы. Паставіць Хмелю ў абавязак, на выпадак пераезду ў іншую турму, заявіць аб сваёй кары мясцоваму парткому.

На гэтым і спыніліся. Паклікалі Хмеля і абвясцілі яму рашэнне. Шчокі Апанаса ўспалымнелі, і ён, заікаючыся і мітусліва махаючы рукою, адказаў:

— Кожны чалавек мае права на свабоду. І вы не ў сілах пазбавіць чалавека гэтага права. Калі хто ўцякае з турмы, гэта справа натуральная. Ваша рашэнне лічу контррэвалюцыйным, папросту — рэакцыйным...

Выпаліўшы ўсё, Апанас павярнуўся і адышоў.

Члены парткома пераглянуліся паміж сабою, крыху азадачаныя і абураныя. Загаварыў Зайчык:

— Гэты чалавек дрэнна скончыць... Варта было б заняцца ім больш сур'ёзна...

Пачалі разыходзіцца. Застаўся пры Зайчыку адзін Паддубны.

* * *

Апанас не прымаў удзелу ў жыцці камеры, аднак часам употай сачыў за Андрэем, калі той што-небудзь пісаў.

Аднойчы ўранку Андрэй устаў за гадзіну да пабудкі і, узяўшы сшытак, пачаў пісаць на падаконніку даклад аб плане вучобы для ўсяго калектыву. Трэба было ліквідаваць самацёк, анархію ў вучобе, усё падпарадкаваць адзінаму выпрацаванаму плану.

Андрэй звесіў галаву над падаконнікам і пісаў. Навокал панавала цішыня. Нават не даносілася гукаў з горада. Шэры, ціхі, цёплы ранак. Пастаці наглядчыкаў замерлі на вартавых вежах — відаць, іх агортвала ранішняя дрымота. Нават птаства яшчэ не наведвала густалістай кроны старога клёна. Толькі адны галубы, лопаючы крыламі, узляталі з дахаў і апускаліся ля вокнаў. Шызыя, прыгожыя галубы! Вось адзін шарахнуўся аб краты і адважыўся сесці тут жа, ля галавы Андрэя. Андрэй саскочыў з казялка, на якім стаяў, і, адламаўшы пад сталом у скрынцы кавалак хлеба-мякішу, пакрышыў на падаконніку па другі бок кратаў, а затым зноў узяўся за работу. Галубы зараз жа паляцелі на падаконнік, што аж цесна ім было. Андрэй пісаў, з прыемнасцю слухаючы шамятлівае шуршанне. Глянуў на іх асцярожна, каб не спалохаць, і ўсміхнуўся, як усміхаюцца людзі расцвіўшай кветцы. Пара світання — вашая пара, галубкі! На світанні не кінецца на вас ніякі драпежнік. Ешце, ешце, галубкі, я вам падсыплю яшчэ. І Андрэй зноў крышыў хлеб галубкам, а яны ўжо і не ўцякалі, проста з рук хапалі крошкі.

Даволі, прыгожыя птушкі, мне трэба скончыць даклад. Прылятайце заўтра. Андрэй нахіліўся над сшыткам і працягваў: «...Вульгарызатарскія адносіны да навукі некаторых з нашай інтэлігенцыі ўносяць разлад у свядомасць таварышаў, прагных да ведаў, і прыводзяць да зазнайства... Навуку трэба выкладаць па-навуковаму — кропля па кроплі, зразумела, дакладна. Пачынаць трэба з палітэка-

поміі. Турма для палітзняволеных павінна стаць школай рэвалюцыянераў. Узбагачацца ведамі трэба не для таго, каб забаўляцца імі, а для таго, каб умець перамагаць ворагаў працоўных. Турма — гэта школа гарту...»

Нехта заварушыўся на нарах. Андрэй ціха азірнуўся і заўважыў, як з-пад локця глядзела чорнае, бліскучае вока Апанаса.

— Што ты пішаш? — спытаўся ён.

— Тое, што трэба...

— Можаш мне паказаць?

— Не... Яшчэ не скончана.

Апанас змоўк. Андрэй пісаў далей. Ён задумаўся і не ўбачыў, як чыясьці рука нырнула яму пад паху і пацягнула за сшытак. Андрэй інстынктыўна оціснуў рукою, затрымаўшы сшытак, і агледзеўся. Збянтэжаны Апанас палез на нары і толькі прамовіў:

— Не ўдалося.

— І не ўдасца,— адказаў Андрэй. Сказаўшы так, заняўся работай далей.

* * *

Жытні пусты каласок прыліп да пасмы валасоў і разам з ёю звісае з кучы сеннікоў, шчыльна накрытых сукоинымі шэрымі коўдрамі. Каласок прыліп толькі вяршком, а вострым хвосцікам-саломкай імкнецца долу. Вось-вось, здаецца, упадзе, але ўсё роўна трымаецца.

Чорная пасма — гэта валасы Апанаса Хмеля, які кожны дзень бестурботна спіць на сенніках. І каласок прыліп да валасоў, як шышачок дзядоўніку прыліпае да штаноў падарожнага. Ціха і адзінока звісае каласок, толькі часам уздрыгнецца ад моцнага храпу Апанаса. Усе звярнулі ўвагу на такую з'яву, і чыясьці рука хацела яго сарваць, але хлопцы ўпаўголаса крыкнулі: «Не чапай! Няхай вісіць!» Пусценькі белсенькі каласок звісае, як выраз душэўнай запушчанасці.

Спіць Апанас Хмель і не чуе, што ўсе таварышы сядзяць за сталом і слухаюць, як Андрэй гаворыць пра Радзішчава. Праводзяцца першыя заняткі па гісторыі рускага рэвалюцыйнага руху. Па ўсіх камерах арганізавана навучанне, пачынаючы ад палітэканоміі і канчаючы геаграфіяй і граматыкай. У парадку вольных гутарак, па вечарах, пасля паверкі, вывучаецца гісторыя культуры.

Шуміць кацёл... А ў ім справы і справы... Іх так многа ўсякіх — значных і нязначных, вялікіх, малых і дробных.

Паддубны гаворыць, што пара ўжо разбіраць справы «сыпакоў» — тых, што не вытрымалі допытаў у дэфензіве і ўсё расказалі. Гэтыя людзі атрымалі ўжо акты абвінавачвання, з якіх відаць ступень віны кожнага перад партыяй. У актах — іх пакаранні.

Збіваюць з ног Андрэя хлопцы рознымі пытаннямі, бо яны цяпер вучацца. Турма раптам ператварылася ў народны універсітэт. Падыходзяць, напрыклад, два камсамольцы з бойкімі вачыма, якія, здаецца, цвітуць, і пытаюцца:

— Скажы, таварыш Касцевіч, а воз з канём таксама будуць сродкі вытворчасці?

— Так, яны...

— А плуг, барана?

— Таксама.

— Ну, што? — звярнуўся адзін да другога.— Мая праўда?

— Ффу... Якія гэта ў чорта сродкі вытворчасці,— нахмурыўся другі.

— Якія б яны ні былі, усё роўна сродкі вытворчасці,— тлумачыць Андрэй, і хлопцы адышлі ад яго, расчырванелыя, намагнічаныя пафасам «вучоных» спрэчак.

Дагналі ззаду аж чатыры хлопцы. У аднаго ў руцэ руская граматыка. Наперабой пытаюцца, што такое «дар Валдая»? Той, хто трымаў кніжку, настаўнік па граматыцы, у камеры праводзіць дыктоўкі, больш пісьменны за сваіх вучняў. Але і ён не ведае, што такое «дар Валдая». Чытае Андрэю сказ: «И колокольчик, дар Валдая, звенит уныло под дугой».

— Не ведаеце, што такое «дар Валдая»? Гмм,— усміхаецца Андрэй і расказвае ім аб Валдайскіх гарах, дзе шмат медзі, з якой робяць званочкі, а некалі рабілі і вялікія званы.

— А-а-а!..— пачуліся галасы здзіўлення.— Дык вось яно што-о-о... А мы...

— З якой камеры? — пытаецца Андрэй.

— З дваццаць трэцяй.

Там сядзяць усе малапісьменныя, і паўстае пытанне, як перакінуць туды аднаго больш пісьменнага. Неяк трэба будзе ашукваць турэмную адміністрацыю. А потым трэба распрацаваць цыклы пытанняў і адказаў па паліт-

эканоміі ў папулярнай форме. Трэба, каб рэдактар Райскі мабілізаваў сваіх друкароў-каліграфістаў для перапісвання. Трэба тое, трэба другое...

Андрэй стаіць збоку і збіраецца з думкамі, з чаго пачаць заўтрашні дзень. Прайшоў міма з кімсьці ў пары Дзенісевіч Аркадзь, нейкі паёжаны, схуднелы. Ужо не лятае ён па катле, як у першыя дні, калі трапіў у турму. Распаўся яго гурток па вывучэнню эсперанта. Гурток па вывучэнню гісторыі яшчэ трымаецца, але, мусіць, і яго сустрэне такі самы лёс. Пакрыўдзіўся Дзенісевіч, што не ён выкладае палітэканомію ў камеры. Не даверыў яму партком гэтай працы, нягледзячы на яго вучонасць. Дзенісевіч выкладае беларускую граматыку, а таксама гісторыю культуры. Трэба прывесці да нормы гэтага філосафа, які часам працуе да поту, але працуе, як тая малпа з калодкай. Ніколі не было таго, каб Дзенісевіч прагульваўся з Хмелем, а ўчора і пазаўчора яны прахадзілі разам цэлую гадзіну. «Гэта нездарма,— думае Андрэй,— як жа хутка ўсялякае нездаволенне знаходзіць сабе сваё рэчышча...»

Андрэй стаіць збоку, нібы чаго чакае, нібы сам хоча куды ісці. У душы такое дзіўнае напружанне, калі чалавек прадчувае нешта, чаго яшчэ не можа ўсвядоміць. А кацёл шуміць...

«Эх, каб лопнулі запоры турмы... Можа, і ананасы хмелі знайшлі б сабе супакаенне, уключыліся б у агульную плынь народнай працы?..»

Усе ўзяліся за навуку. Нават Дзям'ян Гарагляд да поту старанна выводзіць каракулі ў сшытку і палітэканомію разумее яшчэ лепш, чым граматыку. Вось яны, імкненні сапраўды народныя. Яны — аснова. А чаго хочуць ананасы хмелі? Андрэй, можа, ад гэтага і скрануўся з месца, пайшоў па тратуарчыку адзін з кнігай у руцэ — «Quo vadis» Сянкевіча (нядаўна пачаў чытаць польскую літаратуру).

Гэта ішоў зграбнай постаці юнак, ішоў спружыністай хадою, каб астудзіць расхрыстаныя грудзі. Можа, не трэба было б, каб на чулую душу падалі атрутныя кроплі? Ці вытрымае душа іх яд? Штосьці неспакойна на душы. Толькі, можа, цяпер пачынае адчувацца цяжар турмы, першыя атакі душэўнага крызісу, калі хочацца невядома куды — у прасторы, у неабсяжныя прасторы, залітыя сонцам...

Пачуццё душэўнага непакою расплылося, як імгла, непрыкметна для самога Андрэя.

Устаў, каб знайсці Паддубнага, але наглядчык з далёкага ценевага кутка крыкнуў: «Заходзіць!» Прагулка скончана.

Калі зачыніліся дзверы камеры і кожны сеў, дзе палічыў для сябе найбольш выгадным, Дзям'ян Гарагляд сунуў у руку Андрэю грыпс [1], зашыты ў беленькую анучку і перавязаны накрыж ільняною ніткай. Хімічным алоўкам было напісана адно слова — «Макс» (так падпісваўся Андрэй у грыпсах).

Ад каго ж бы гэта магло быць? Уся пошта ідзе на сакратара турэмнага камітэта, маладога брэсцкага шаўца Бортніка. З туркома пошта перадаецца рассыльным па адрасах. А тут Дзям'ян кажа, што «ў цёмным калідоры даў яму на хаду гэты беленькі круглячок нейкі крымінальны і казаў перадаць Андрэю...». Хоць кожны грыпс наогул цікавіць, інтрыгуе, гэты беленькі круглячок заінтрыгаваў Андрэя асабліва. Схаваўшыся за печку, ён распячатаў яго. Там была невялічкая запісачка ад сакратара парткома з жаночай камеры — Шыпшыны. У ёй пісалася: «Дарагі Макс! Прачытай гэтыя лісточкі, пазнаеш, ад каго яны... Яны здалёк і прайшлі вялікую дарогу. Да нас прыйшла ўчора з волі (і далей шыфрам) — Соня Качаноўская. У горадзе арышты. Падрабязнасці пасля. З камрывітаннем — Шыпшына».

А тыя лісточкі былі тоненькія, спісаныя дробна хімічным алоўкам. Андрэй пачаў чытаць:

«Даражэнькі мой друг Анатоль!

Пішу табе здалёк, з-пад самай нямецкай граніцы. Не дзівуйся. Нягледзячы на турэмныя сцены і краты, для нас, як бачыш, не іспуюць перашкоды. Дэфензіўскія сінякі і падцёкі ўжо зажылі на мне. А білі, мярзотнікі, ох, білі. Білі ў Баранавічах, а асабліва ў Гродна. Была анямела мая левая рука ад пабояў, а па сутнасці ад аднаго ёмкага ўдару шпіка ручкай рэвальвера па локці. Цягнулі, ірвалі мае валасы... Але ўсё мінула. Не палохайся, я ўжо здаровая і вясёлая, як заўсёды. Вучуся і вучу другіх. Нас у камеры шэсць — дзве беларускі, дзве полькі, дзве яўрэйкі. Настрой харошы. Я даведалася з газеты аб вашай дэманстрацыі, аб арыштах — цябе і іншых. Я так была ўстрывожана і гордая за вас, дарагія мае, мілыя таварышы.

[1] Грыпс — назва турэмных запісак.

Перадай мой шчыры, нізкі паклон, як ад дачкі, дарагому, любімаму дзядзьку Дзям'яну. Скажы яму, што мы яшчэ сустрэнемся. Мы ўжо атрымалі акты абвінавачвання. З актаў відаць, што ў нашай групе ёсць правакатар — нейкі Карэльчук. Здаецца, я яго ведаю. Ці не будзе гэта Буралом? Калі разам з табою Стары, раскажы яму аб Бусім. Той — атаман Апанас Хмель — павінен ведаць Буралома. Цікава, як ён сябе паводзіць у турме, гэты Гуляй-поч. Судзіць нас павязуць у Вільню. Можа, убачу таварыша Васіля — ён сядзіць там. Як мне хочацца пабачыць Вільню, прайсціся па вуліцах, хоць і пад канвоем. Столькі там пакінута дарагога, незабыўнага. Калі табе, можа, удасца выйсці на волю, зараз жа напішы мне ў турму. Калі мяне і не будзе тут, турэмная адміністрацыя накіруе ліст туды, дзе я буду. У лісце звяртайся да мяне, як да сястры. Канчаю. Ужо вечарэе. Барвовы захад сонца бляскам адбіваецца ў нашым акне, з якога відаць рэчка, за ёю луг, а далей — палі. Як жа хочацца на волю! Але — пакрочым далей, мой друг, нашым баявым шляхам. Паўтару тваё, што ты сказаў мне некалі — помніш? «Сустрэнемся на барыкадах!»

Цісну тваю руку і цалую цябе і ўсіх вас, дарагія вы мае таварышы. Не забывай!

Твая Надзя Харашэвіч, якую ты называў «В-а».

Ліст скончыўся. Ускалыхнулася застоеная душа Андрэя і ўпершыню з тугою, даверліва, адкрыта прамовіла: «Дарагая, любімая...»

## Раздзел другі

# ЗНАЁМЫЯ ДАРОГІ

— Вжэ відходыш, Макарочку. Підэш да свої Білорусі... А що ж? Щоб вона була жыва, то ще б так воно...

І старая цётка Адара залілася гарачымі слязьмі. Закрыла твар фартухом і трэслася ад плачу, прысеўшы на лаве. Калі адымала фартух, маршчыністы, тужлівы твар, з добрымі, здаецца, усяму спрыяючымі вачыма, звяртаўся да Макара, які даядаў тушоную бульбу з малаком.

— Я ще підыллю, Макарочку...— спахапілася старая.

— Не, не трэба, мама... Хопіць,— адказаў Макар.

— Не спішайся... Всэ їдно тобі далэка дорога...— ска-

зала цётка Адара, а потым падышла да печы, прыпяла засланку і выняла адтуль шэсць ужо спечаных яек.

Клунак Макараў, ужо амаль падрыхтаваны, ляжаў на лаўцы ля печы. Старая разгарнула яго.

— Ось, покладу тобі в торбынку разом з салом...

А на дварэ палала сонца, залівала жытнія даспяваючыя палі з сасновымі пералескамі, з пясчанымі дарожкамі і ўзгоркамі. Мяккі валынскі ветрык варушыў жыта, якое ўжо налівалася, а дзе-нідзе пшаніцу. Макар Краўчук падняўся з лавы, глянуў у акно, павольна павёў вачыма па маляўнічым наваколлі, і яму стала шкада пакідаць гэты хутарок, белую-беленькую хатку, абвітую вянком вішань і чарэшань, уквечаную мальвамі і сланечнікамі. Вось ужо тры гады пражыў Макар у гэтай хатцы з таго часу, як скончылі партызаніць. Развітаўшыся з камандзірам Сцяпанам Кавалём, ён пайшоў з сябрам па атраду Антонам Данілюком на Валынь. Угаварыў Данілюк:

— Пойдзем у мой край... Хто там у нас будзе пытацца, дзе мы што рабілі... Мы ж працавалі на лесапільні...

І Макар пайшоў. Тым больш што сам быў бяздомны. У роднай палескай вёсцы засталася толькі адна сястра з прымаком на той пясчана-балотнай гаспадарцы, дзе ў некаторых месцах бульбу трэба садзіць на градах, як капусту, бо вада ўвесь час не сходзіць з разораў. «Ну куды я там пайду, да тае хаты,— думаў Макар,— хіба за чубы брацца з прымаком? Няхай жыве сястра спакойна, а я пашукаю сабе долі...» Так і прывёў Данілюк Макара на сваю Валынь. А хутар у Данілюкоў — халодная падзолістая зямля — тры дзесяціны, і хата хлявамі ўпіраецца ў лазовыя забалочаныя хмызнякі. Стары бацька ляжыць на печы хворы — грудзі баляць, а маці і нявестка цэлымі днямі смокчуць ільняныя кудзелі.

У старэйшага брата пяцёра дзяцей. Цесна ў хаце. Пражыў Макар у Данілюка два дні, а на трэці дзень прыйшла цётка Адара і забрала яго да сябе. Так і стаў жыць Макар у цёткі Адары. Хатка на палявым узвышшы пры дарожцы, хатка чыстая, утульная, а ў ёй толькі дзве душы — цётка Адара і яе дачка, яшчэ падлетак Ганя. Калі прыйшоў Макар да іх, Гані было пятнаццаць год. І так пачаў Макар гаспадарыць на дзвюх дзесяцінах. Увішны і спрытны, таварыскі і вясёлы, ён хутка здабыў прызнанне і любоў старой Адары. Яна не магла нацешыцца з яго і не раз казала: «Бог нам паслаў гэтага хлопца. От і капячку ўжо маем, і хляўца направіў. Старанны

хлопец, рана ўстае, работа кіпіць у яго руках». Уключыўся Макар з Данілюком і ў падпольную работу. А тут і Сельроб надышоў, і шумела тады Валынь, як і ўся Заходняя Украіна, песнямі і смехам моладзі, вечарынкамі і падпольнымі сходкамі. Вунь, праз акно, відаць вёска недалёка на ўзгорку. Белыя хаты ў два рады, як адна ў адну, туляцца ў вербах, таполях і чырвоных мальвах. Там быў гурток. А не раз і на гэтым хутарку Адары начамі праводзіліся нарады, прыязджалі нейкія вельмі важныя таварышы, начавалі. Усіх аберагала Адара, усіх карміла і клала спаць. Не магла яна забыць свайго вучонага сынка Хведара, які яшчэ ў 1924 годзе парываўся быў уцячы ад пакутлівага жыцця ў Савецкі Саюз. Злавілі яго паліцэйскія стражнікі на граніцы і так збілі прыкладамі, што ледзь даехаў дахаты пад канвоем. Паны адміністрацыйна засудзілі яго на месяц арышту, але Хведар быў знясілены, хворы і кары адбываць не мог. Тады паны замянілі кару грашовым штрафам, і апошнюю кароўку павялі секвестратары з хлява. Хведар, хоць і паправіўся на крыху, але стаў сумным, захварэў на сухоты і хутка памёр. «Вось ужо чатыры гадочкі, як ляжыць мой сынок у магіле,— гаварыла Адара, выціраючы слёзы.— Калі ж прыйдзе скон на гэтых паноў?» А Ганя расла, квітнела, як тая мальва ў гародчыку, харашэла з кожным днём. І бровы ў яе, як сярпы, быццам знарок намаляваныя — тонкія, цёмна-шаўкавістыя, вочы блакітныя і ружовыя шчокі з ямачкамі, а за плячыма павілася багатая, залаціста-русая каса. Ганя ўжо рабіла ў хаце больш за маці: кожную суботу падбельвала печ, падмазвала глінай падлогу, мыла, скрэбла лавы, стол, засаджвала за іконы палявыя кветкі. І часта можна было чуць, як яна залівалася песняй, там пад вішнямі, калі развешвала сушыць бялізну. Жала з мамаю ў полі, вазіла з Макарам снапы і нават апошні год хадзіла з ім у панскі лес на заработкі. Такое суджыццё Макара з гэтай беднай невялічкай сям'ёю паволі, з дня ў дзень клала свой след на душу. Вобраз Гані ўсё больш і больш займаў месца ў яго думках. А калі Ганя стала падпольнай камсамолкай, дык тады жыццё Макара з ёю стала неразлучным. Разам вярталіся з вечарынак, калі шумеў Сельроб, разам абмяркоўвалі тайныя справы, хадзілі ў разведку з рознымі даручэннямі партыйнага характару, чыталі кніжкі і цікавую газету пад назваю «Сіла», якая трапна высмейвала, бічавала паноў.

Ох жа і рагаталі абое. І старая Адара слухала і далу-

чалася да іх маладога смеху і думала, што вось ужо дні папоў злічаны.

У апошнюю зіму Ганя зусім не адставала ад Макара. Калі ён сячэ дровы, яна складае іх пад павеццю, а потым разам нясуць у хату. Калі Макар ідзе ў гумно, каб патрэсці трасянкі карове, Ганя крочыць услед за ім, дапамагае, носяць разам ваду, пояць сваю жывёлу... Старая Адара здалёк гляне з хаты ў акно, прыгнуўшыся, праводзіць вачыма гэтую маладую пару, усміхнецца сама сабе і наківае галавою. Мяркуе нешта Адара — усё ідзе па добры лад... Ну, што ж, няхай... няхай...

І ўрэшце вырашылі Макар з Ганнай адкрыць мацеры сваю тайну, выбралі для гэтага дзень Новага года, сказалі, што яны хочуць пажаніцца і што вяселле трэба зрабіць на сёмуху. Адара памаўчала, больш для віду пусціла слязінку, а потым сказала: «Ну, што ж, дітки, ваше діло... Тільки щоб добре жилы...» Гэта было за навагоднім вячэрай. Старая падышла да маладых, абоіх пацалавала, прыгаворваючы: «Жаніцеся, я буду рада... Мне ўжо нямнога засталося жыць... А ты, Макарочку, жывеш у нас, і я забываю, што ты не свой... Мне здаецца, што ты заўсёды быў у нас... Жаніцеся, хай бог дасць вам шчасця і долі...»

Так і плылі Макар з Ганяю да свайго шчасця.

Але вось у адну зімовую ноч прыйшла бяда для народа, навісла яна, як хмара над палеткамі. Цэлыя атрады паліцыі запоўнілі вёскі і хутары. Пачаліся арышты, аблавы. І хутарок Адары не раз быў акружаны паліцыяй ноччу, таму даводзілася Макару і Гані ўцякаць з хаты ў недалёкі сасновы лясок, лазіць па снезе, слухаць брэх сабак на вёсцы і хутарах і паліцэйскія стрэлы. Адара адна заставалася ў хаце і цярпела ўсялякія здзекі.

Так адбылася ліквідацыя Сельроба ў Заходняй Украіне, як і Грамады ў Заходняй Беларусі. Пачаліся бурныя народныя дэманстрацыі супроць арыштаў, паліцэйскага тэрору. Людзі збіраліся на шлях з навакольных вёсак і хутароў, каб ісці паходам у павятовы горад. А насустрач прыехала на машынах узброеная паліцыя і спыніла паход, над якім развявалася некалькі чырвоных сцягоў. Пачалася сапраўдная бітва. На першыя стрэлы, накіраваныя ў сцягі, дэманстранты адказалі крыкам пратэсту: «Прэч, каты!» і рушылі напралом па дарозе. І тут пачалося... Паліцыя кінулася збіваць прыкладамі людзей без разбору. Калона размыкалася, але зноў змыкалася.

На другую атаку паліцыі дэманстранты адказалі тым, што пачалі ламаць калы ў прыдарожным ляску і рынуліся ў контратаку. Паліцыянты адскочылі, і тады афіцэр даў каманду страляць. Прагучалі стрэлы, недзе ў натоўпе пачуліся крыкі, недзе ўпалі ахвяры... Але паход не рассыпаўся, рушыў наперад. Па дарозе хлопцы нажамі парэзалі шыны на машынах. Паліцыя вымушана была ісці пехатою, але не дагнаць ёй было імклівага паходу, і яна пайшла ў горад напрасткі, каб апярэдзіць дэманстрантаў. На шляху засталіся пяць параненых і шостая — забітая дзяўчына. Гэтай дзяўчынай была яснавокая Ганя. Макар падняў яе на рукі і ў суправаджэнні Данілюка і іншых хлопцаў і дзяўчат прынёс дахаты...

Гора ж было, гора вялікае...

Пахавалі Ганю тут жа ля хаты пры дарожцы і ўпрыгожылі магілу чырвоным сцяжком.

...Ціха цяпер у наваколлі. Няма Сельроба, над вечарынкамі ўстаноўлен шпікоўскі нагляд. А магіла ў кветках, упрыгожаная сцяжком, увесь час напамінае аб мінулых днях пачэснай працы і барацьбы, напамінае аб шчасці Макара. Не бачыць бы гэтага ўсяго, уцячы ў свет — так нястрымна цяжка.

Прарабіўшы вясну ў цёткі Адары, Макар вырашыў паехаць. Куды? Ну, вядома, на Беларусь, а там будзе відаць, што і як рабіць далей. І вось ужо Макар сабраўся. Сумны, задуменны стаў сярод хаты, зірнуў па кутках. Усё знаёма, з усім зжыўся Макар, ды і вырас ён тут ужо ў сталага мужчыну. Стаў вышэйшым, пашырэў у плячах, папольшаў круглы твар з ледзь прыкметным сям-там рабацiннем. І карэчыя вочы са схаванай усмешкай пасур'ёзнелі. Сталасці надавалі яшчэ густыя валасы карычняватага колеру, якія чамусьці клаліся самі ў развал, як іх ні прычэсваў Макар загладухай. Стаіць Макар сярод хаты ў сіняватым пінжачку, у саматканых чорных штанах і ў ботах з высокімі халявамі,— стаіць і не можа скрануцца з месца. Нехта мільгануў за вокнамі з клункам за плячыма. У хату ўвайшоў Антон Данілюк.

— Ну што, ужо сабраўся? Дык поедзем,— сказаў ён.

Гэта вывела Макара з задумы. Ён надзеў кепку, кінуў куртку на рукі і ўзяўся за клунак.

— Бывай, мама, не тужы...— засохлым голасам прамовіў Макар. А цётка Адара абхапіла шыю Макара рукамі і ўпала тварам на плячо ў нястрымным плачы.

— Дзіткы мої, діткы хорошы, нащо ж такэ нэщастя?

Усе трое выйшлі з хаты.

— Развітайся з гаспадаркаю, Макарочку, да ўсяго тут ты ручкі свае далажыў... Вось і гуменца пабудаваў, а цяпер не будзе каму ў ім гаспадарыць.

Усе трое прайшлі ўздоўж хлявоў, павярнулі налева да гумна, а потым да вішань, пад якімі, як сняжынкі, слаліся апаўшыя нядаўна пялёсткі. Пад адной найбольш разложыстай вішняй стаіць лавачка. Яе зрабіў Макар. Вось тут, пад гэтай вішняй, на гэтай лавачцы, Макар першы раз пацалаваў Ганю, калі месячная ноч млела над прасторамі — над заснуўшымі жытамі, над белай вёскай з вербамі і таполямі і месячныя бляскі купаліся ў росах. З недалёкага ляска даляталі пералівы салаўя. Пастаяў крыху Макар ля гэтай лавачкі, але самае цяжкае наперадзе. Вось за плотам развяваецца над магілай чырвоны сцяжок і дрыжыць трапяткая бярозка. Бярозку пасадзіў Макар, хоць Адара казала пасадзіць каліну. «Няхай гэта будзе памяць мая,— гаварыў Макар,— я вырас пад бярозай і люблю гэтае дрэва...»

Адара з ходу ўпала на магілу і змоўкла. Прыўзняла заплаканы твар і крыкнула:

— Ганечко, устань, твій Макар відходыть!

Макар асцярожна ўзяў Адару за плечы, падняў і паставіў на ногі.

— Мама, даволі, не трэба так...— прамовіў ён,— яе ўжо не падымеш...

А сам скінуў шапку, стаў на калена, збялелы, сам гатовы заплакаць. І з грудзей вырваўся дрыжачы голас:

— Ганя, бывай, дарагая. Паны разбілі наша шчасце. Мы ім за гэта не даруем...

Данілюк панура стаяў побач без шапкі.

Схіліў галаву Макар, прытуліўся на момант тварам да магілы і ўстаў. Абняў за плечы цётку Адару і сказаў:

— Бывай, мама, не тужы... Пляменнікі табе памогуць... Жыць я тут, мама, не змагу... Не вытрымаю... Я буду пісаць табе, мама...

— Пішы, пішы, Макарочку, не забувай... Нэхай вам щастыть дорога.

Сябры надзелі шапкі, яшчэ раз пакланіліся цётцы Адары і пайшлі палявою дарожкай у жыты і ў жыты...

Адара паплялася, як п'яная, на падворак, ішла і нічога не бачыла перад сабою. Выцягвала наперад рукі, спатыкалася. Ішла навослеп. Хацела апусціцца на зямлю, але схапілася абедвух за тую вішню, пад якою стаяла апусце-

лая, цяпер ужо нікому не патрэбная, лавачка. Схапілася і прыпала шчакою да ствала ў роспачным плачы... Няма ўжо галубка з галубкаю, якія тут варкавалі.

А сябры адышліся ўжо далёка. Вось мільгаюць іх постаці ўдалечыні сярод жыта: адна вышэйшая — Данілюка, а другая ніжэйшая — Макара. Зараз, зараз яны схаваюцца зусім. Выйдзе Адара глянуць услед, але ўжо не ўбачыць нікога. Толькі адна палявая цішыня навее яшчэ больш смутку і адзіноцтва. Сябры ўзышлі на ўзгорачак, агляпуліся і сталі. Белы хутарок у вянку вішань выглядаў маленькім, як на карціне, толькі журавель студні чорнай тычкай вылучаўся на фоне неба, вышэйшы за хатку, і ў вачах мігцеў, пераліваўся на сонцы чырвоны сцяжок над дарагою магілай. Доўга сябры не зводзілі вачэй з таго чырвонага мігцення, і вочы іх заплывалі смуткам. Развітваліся яны са сваімі справамі тут, калі шумела народная сіла, калі тупат з-пад ног плыў па зямлі... А цяпер... палявая цішыня звініць у вушах. Усё пайшло ў падполле, каб рыхтаваць народныя сілы да новых бітваў.

— Ну, што ж, пойдзем, Макар,— парушыў цішыню Данілюк і ўздыхнуў. І сябры пайшлі далей. Спусціліся з узгорка ў даліну, і белы хутарок знік з вачэй, здаецца, навекі.

— Каб хутчэй вырвацца з гэтых палёў,— сказаў Данілюк,— бо цяжка, брат.— І ён падтрос клунак на плячах і прыбавіў кроку.

Антон Данілюк быў год на восем старэйшы за Макара, меў ужо каля трыццаці пяці і не мог ды і не хацеў жаніцца.

— Гэтая жанячка мяне ў магілу паложыць. Баюся, брат, жанячкі... Для ўсіх я цяпер добры, а ажаніся, трэба будзе ад брата адбіраць сваю дзель тае няшчаснае зямлі... Не, брат, будзем казакамі,— дзе лёг, там і выспаўся,— гаварыў не раз Данілюк.

Ён меў прадаўгаваты шэры твар з невялікім шыракаватым носам. Гэты нос вызначаўся яшчэ тым, што быў крыху схілены на правы бок, чым, аднак, не псаваў твару. Але галоўнае ў Данілюка — вочы. Яны былі шэрыя, з вялікімі бялкамі, якія бялелі нават уначы. У вострых кутках вачэй бліскалі яны, гэтыя бялкі, і здавалася, што вочы кагосьці сцерагуць, высочваюць, што яны бачаць у цемры. За такі нос і такія вочы нехта яшчэ ў атрадзе назваў Данілюка гэцьман. Так і прыліпла гэтая мянушка

да Антона, што потым ніхто, нават сам Сцяпан Каваль, не называў яго па прозвішчу, а толькі — гэцьман. Падружыўся Данілюк з Макарам за тое, што Макар быў спрытны, увішны, што ўскокваў на каня з размаху, як качулка, што ўдала іграў па губным гармоніку, умеў хадзіць на руках. І чаго ні вырабляў Макар як у бараку на заводзе, так і ў атрадзе.

— Ну, брат, ужо я ад цябе не адстану,— гаварыў у захапленні Данілюк,— давай, дружа, закурым. От дзе ў мяне людзіна, а вы што? — смяяўся ён з прысутных.

Макар палюбіў Данілюка за яго песні — разліўныя, шырокія песні, то лірычныя, тужлівыя, то смешныя, вясёлыя. Разам ваявалі, жылі, разам спявалі. І добра было абодвум.

А цяпер вось трэба Макару пакідаць Валынь... Паны і тут разбілі шчасце. І Данілюк пайшоў з ім.

— Журботна мне будзе тут заставацца,— сказаў ён,— на Беларусі лесапілак многа. Можа, дзе зараблю на кавалак хлеба, а можа, якая іншая доля трапіцца... Адно, Макар,— мы павінны быць разам. А Валынь мая ад мяне не ўцячэ, абы жывы былі... Зорачкі чырвонай нам трэба, Макар, а тады будзе ўсё... Адно мне зразумела, што заб'юць мяне тут паны, застрэляць, як ужо страляюць другіх, не толькі ўначы, але ў белы дзень... Пакуль што падышла іх пара... Трэба сысці з вачэй.

— Хадзем, Антон, хадзем...— схапіўся як за збаўленне Макар.— Я лепшага нічога і жадаць не хачу. Што-небудзь знойдзем там, на Беларусі, знойдзем працу і знаёмых. Няўжо ўсе загінулі? Я думаю, што яшчэ знойдзем і Андрэя Касцевіча... Помніш яго?

— Як не помніць — помню... Такія людзі не забываюцца...

Так і пайшлі сябры праз валынскія жыты з клункамі за плячыма, пайшлі ўсё на ўсход і на ўсход, да яшчэ нязведанай ім самім долі...

Калі мінулі невялічкі сасновы лясок на ўзгорку і выйшлі на ўскраіну, Макар сказаў, усміхнуўшыся першы раз, як пакінулі белы хутарок:

— Адпачнём крыху, Антон, пакурым вось тут над гэтай сасонкай... Не журыся, гэцьман... Мы яшчэ з табою сваё дакажам.

Макар вярнуўся да сваёй нормы. Зноў яго карэчыя вочы бліснулі, як раней, тым таварыскім гумарком, які

вось зараз нешта выкіне такое, чаго ніхто не спадзяваўся.

Сябры ляжалі, аблакаціўшыся на свае клункі, дымілі цыгаркамі.

— А знаеш,— адазваўся Макар,— камень крыху адлёг ад сэрца...

— Не кажы, брат, і мне было цяжка не менш, чым табе... Журыся не журыся, а знаў адно — бі паноў, каб з іх аж вантробы ляцелі... Заслужылі яны ў нас, ох, заслужылі... Дачакаюцца яшчэ,— не бойся. Помніш, як тады на дэманстрацыі адзін крыкнуў: «Матка боска, шыны парэзалі на аўтах!» Будуць ім яшчэ не такія шыны...

— Ну, а дзе ж мы начаваць будзем, Антон?

— Го! Начаваць? Цяпер дзе лёг, там і выспаўся. А ўсё ж такі трэба нам на станцыю, трэба трошкі пад'ехаць, бо дарога далёкая. Пад'едзем бліжэй да Брэста, выйдзем, абмінём Брэст пехатою, бо Брэст — гэта іх вузлавая пажарная станцыя, каб яна ім у гэтую ночку згарэла. Не адзін з нашых змагароў там загавеў душою. У Брэсце шпікі ставяць пасткі на нашых людзей...

Сябры падняліся і вырашылі накіравацца на станцыю. Ды і дзень пачаў ужо хіліцца к вечару. Ішлі жвава, цяпер больш гутарылі, чым маўчалі. А калі выйшлі на чыстае поле, дзе толькі вёскі відпеліся ўдалечыні, акаймаваныя цёмнай паласою лесу на небасхіле, Данілюк пачаў цягнуць у нос мелодыю нейкай песні, настройваючы сябе на песенны лад:

— Мацней, Антон, і я падцягну,— заахвоціў Макар.

І Данілюк зацягнуў на ўвесь голас песню, знаёмую ва ўсёй Валыні:

Ой, у полі, полі
Пшэнічанька яра,—

Макар падхапіў:

Там вражы катюга
Ранив комунара.

Пачыналі ўжо абодва разам:

Ой, він його ранив,
Комунар схилився,
А його товариш
Над нім зажурився.

Плакала маці над паміраючым камунарам, плакала дзяўчына, слухала яго апошнія словы:

Вазьмі ж ту хустынку,
Што ты вышывала,
Щоб ты не забула
Свого комунара.

Слухалі песню жытнія палі, перамешаныя з пшанічнымі. Плыла яна нястрымна па іх хвалях і, напэўна, была чуваць у навакольных вёсках. А сябры ўсё ішлі, дзе-нідзе абыходзячы вёскі пабочнымі дарогамі,— набліжаліся да станцыі.

Сябрам шчасліва ўдалося абысці Брэст. А калі пакінулі яго за сабою, то так прыбавілі кроку, што пот паліўся з твараў цурком. Спяшаліся, каб хутчэй дайсці да лесу і зрабіць прывал.

Назаўтра падаліся нейкай дарогай, што крыжавалася з шашою. Дарога прывяла да станцыі. Пачапіліся на таварны поезд і даехалі да знаёмай ім станцыі — «Залатая гара».

Той самы завод з высокім чорным комінам глянуў на іх знаёмымі абрысамі. Тыя самыя дамы, тыя самыя баракі. Толькі звярнулі ўвагу два новыя будынкі, на адным было напісана: Posterunek policji Państwowej [1], а на другім — Nadleśnictwo Złotogórskie [2].

Ну, зразумела,— пастарунак размяшчаўся тады ў таварным вагоне. Як жа можна аж дагэтуль арудаваць у такім непрыдатным (ды яшчэ для паліцыі) памяшканні? Ну, а лясніцтва вырасла ў Галоўнае лясніцтва і таксама адбудавалася з шыкам. Як жа яму не вырасці, не адбудавацца сярод такога бяскрайняга лесу, які навокал завода ўжо далёка высечаны.

Макар з Антонам зазірнулі на завод і ўбачылі, што ўсюды — ля станка, ля цыркулярак, ля габляркі, якой, дарэчы, раней не было, нават на закрутках і падкатцы працуюць казакі-балахоўцы. Тут сябры доўга і не стаялі — адышлі. Прайшліся па рампе, дайшлі аж да вузкакалейкі, дзе некалі біліся з балахоўцамі-штрэйкбрэхерамі, і, сеўшы на шпалы, пачалі раіцца, што рабіць,— ісці ў барак ці не? На душы зрабілася так нявесела, як быццам яны апынуліся недзе ў незнаёмай чужой краіне, дзе няма да каго загаварыць, прыгарнуцца.

Макар курыў і па звычцы пстрыкаў сліпаю, пстрыкаў часта, нешта думаў. А Данілюк пакрэхтваў, гледзячы на наваколле, і прыгаворваў нібы сам сабе:

[1] Участак дзяржаўнай паліцыі.
[2] Галоўнае лясніцтва Златагорскае.

— А лыхо ж його матэры... І світ немілый... От, балохоўня засіла...

І круціў галавою ад злосці.

Макар пстрыкнуў слінаю яшчэ раз, кінуў недакурак пад ногі, старанна растаптаў яго ботам, як быццам ад гэтага нешта залежала, і жвава звярнуўся да Данілюка.

— Знаеш, Антон, дзень яшчэ наперадзе... Пойдзем мы, знаеш, куды?

— Куды? — панура паўтарыў Данілюк.

— Пойдзем у Дзяды... Яны тут недалёка — пяць кіламетраў. Гэта ж нам знаёмая вёсачка. Паглядзім, як жыве Мар'яна і ці жыве яна. Адведаем магілу Данілы... Нашы ж там сляды з табою, пашукаем іх...

Макар паклаў руку на плячо Антона і чакаў адказу.

Данілюк адказаў не адразу. Памаўчаў, як быццам не хацеў згаджацца, а потым прамовіў:

— Так і быць, Макар... Пойдзем. А там, як што, можам вярнуцца назад. Можа, дзе ўчэпімся тут на нагрузку...

Сябры, доўга не думаючы, ускінулі клункі на плечы і накіраваліся ў лес. Пратаптаная дарожка-сцежка павяла іх праз лясныя цені пад разложыстымі соснамі і елкамі.

Сцежка гэтая ім знаёмая. Не раз праходзілі яны ёю і ўлетку, і ўзімку, і таму нашы вандроўнікі — былыя партызаны — ішлі па ёй знарок павольна, прыкмячаючы знаёмыя дрэвы і павароты. А вось і яна — паляна, памятная перастрэлкамі і засадамі. Роўная, ціхая паляна, з накатым схілам на поўдзень. Яна цяпер шуміць маладымі аўсамі, уквечанымі жоўтай свірэпкай. Пры дарозе, дзе ніжэй, блакітным мроівам квітнеюць загончыкі льну, сям-там пракідаюцца цёмна-зялёныя, лапушыстыя палоскі бульбы. Ціха на паляне, залітай сонцам. Чахканне станка на заводзе далятае сюды, як далёкае, глухое дыханне дапатопнай ляснойжывёліны.

Макар з Антонам ішлі і маўчалі. Аднекуль глуха і неяк незвычайна адзінока даляцеў да слыху падарожнікаў чалавечы голас, як быццам нехта падганяў каня. Сябры сталі, прыклалі казыркамі далоні над вачыма і пачалі ўглядацца ў наваколле. Голас пачуўся яшчэ раз, і, урэшце, яны заўважылі, як з левага кутка паляны, ад самага лесу, пасоўваецца ў напрамку дарожкі гняды конь, а за ім мільгае белая хустка. Значыць, працуе жанчына. Сябры яшчэ не прыкмецілі здалёк, барануе яна ці арэ. Але

хутчэй за ўсё, што барапуе, бо тут няма звычаю, каб жанчына арала. Конь, а за ім белая хустка набліжаліся да дарожкі, набліжаліся да іх і Макар з Антонам.

— Арэ, брат,— ускрыкнуў Данілюк.

— Ага, арэ... цікава,— паўтарыў Макар.

Абодва прыбавілі кроку і падышлі да палоскі тады, калі конь з аратым хацелі перагарадзіць ім дарогу.

— Добры дзень! — сказалі сябры адпачасова.

Жанчына адказала на прывітанне больш кіўком галавы, чым голасам, павярнула каня на другі бок палоскі, усадзіла лямех у зямлю для наступнай баразны і спынілася.

І тады глянула на хлопцаў. Выцерла рукавом пот з твару, паправіла хустку. Апусціла перад спадніцы, які быў заткнуты за пояс, абтрэсла яго ад зямлі і прамовіла:

— Горача... Замарылася... І конь мой нешта сягоння не так ходзіць, як трэба.— А потым спыніла позірк на хлопцах і спыталася:

— Адкуль, людзі, ідзяце і куды? Мусіць, з лесапільні?

Макар пільна глядзеў на жанчыну, аж рот разявіў. Відаць, яму не хапала паветра, каб сказаць слова. Цікаваў позіркам і Данілюк, бо час ад часу пазіраў на Макара з затоенай усмешкай, як быццам хацеў аб чымсьці спытацца.

— Чаго ж вы маўчыцё? — працягвала жанчына.— Дзіўна вам, што баба арэ? Такая ўжо доля гэтай бабы...— Потым жанчына глянула на лес і сама сабе сказала: — Дзе ж падзелася тое дзіця? Павалаклося ў лес і — няма...— І, прыклаўшы трубкаю да вуснаў далоні, гукнула: — Сцяпанка! — З лесу неўзабаве, як маладое рэха, пачуўся дзіцячы голас.— Ідзі сюды! Паедзем дахаты! — З лесу даляцела: Іду-у-у!..

«Так, яна...» — ужо ўпэўніўся Макар і падышоў бліжэй да жанчыны.

— Здарова, Мар'яна! Гэта ж ты? — сказаў Макар і працягнуў руку. Жанчына нясмела прывіталася з Макарам, дапытліва пазіраючы яму ў вочы. Сонечныя іскаркі бліскалі, пераліваліся ў яе вялікіх цёмных вачах, якія перад гэтым былі зацягнуты тугою. Лёгкім румянцам пакрыліся ад хвалявання злёгку загарэлыя шчокі.

— А божа ж мой! Адкуль жа гэта? Хто гэта?

— Не пазнаеш, Мар'яна, забылася... Прыпомні Макара Краўчука, які не раз спаў у цябе на печы зімою...

— Ой, божа ж мой, дык гэта ты, Макарка, а я думаю сама сабе — нейкі знаёмы твар... Але ж даўно гэта было, саколік...

І Мар'яна паклала рукі на плечы Макара і доўга ўглядалася ў яго твар іківала галавою.

— От як... Кажуць, гара з гарою...

— Ну, а гэтага пазнаеш? — паказаў Макар на Данілюка.

— Пазнаю, цяпер пазнаю... Гэта, мусіць, Антон. Любіў пасіць майго Сцяпанку па хаце...

І Мар'яна падышла да Антона. А гэты Антон так мітусліва забліскаў сваімі бялкамі, што здавалася, вось-вось гэты жорсткі на выгляд хлопец заплача. Ласкава пакланіўся Антон Мар'яне, паціскаючы яе руку з мазалямі, нават кепку скінуў.

— Гэта я, Мар'яначка, гэта я...— глуха сказаў Данілюк.— От дзе давялося сустрэцца...

Мар'яна ўжо спакойна глядзела на Данілюка, гаворачы:

— І валасы тыя самыя...— А потым раптам усміхнулася, як быццам што прыпомніўшы, і дадала: — Ой, любіў жа ты выстойваць перад люстэркам, прычэсваць іх.

Данілюк узмахнуў кепкай, ударыў ёю сабе па назе і сарамліва ўсміхнуўся.

— От, прыпомніла...— сказаў і правёў пяцярнёю па сваіх цёмна-русых з жытнім адлівам валасах, а потым неяк ярасна насунуў кепку на галаву.

— Як жа вы выраслі, хлопчыкі,— гаварыла Мар'яна, сціскаючы рукі,— асабліва Макар... От, быў сабе хлопец рухавы, а цяпер — мужчына... Ой, ой... Хіба я спадзявалася, што вас убачу?.. Скіньце клункі, адпачніце... Я вось даару свой загончык, ужо мала засталося... А тады пойдзем у маю хату, пагледзіцё, як я жыву...

І Мар'яна накіравалася да плуга.

— Не, Мар'яна, ужо ты араць не будзеш,— сказаў Данілюк. Ён кінуў клунак у аўсяную разору і ўзяўся за ручкі плуга.

— Ой, нашто, Антон, я ўжо сама,— запярэчыла Мар'яна.

— Не гавары больш нават ані слоўка,— адрэзаў Данілюк і тут жа нацягнуў за лейчыну і крыкнуў на каня. Конь рушыў, і скіба жаўтаватай зямлі пачала адвальвацца над лемяхом, хаваючы чырвонае шчаўе, якім была густа зарасла палоска. Мар'яна з Макарам паглядзелі

услед Данілюку. Конь ішоў жвава, куды жвавей, чым у Мар'яны.

Мар'яна паківала галавой і сказала:

— Ох, такі ж мужчына мужчынам,— усё спраўней, і конь хутчэй пайшоў, а мяне, халера, не слухаецца... Грэчку хачу тут пасеяць.

— Пазнавата ўжо, Мар'яна...— заўважыў Макар.

— Ой, Макарка, не гавары... У мяне ўсё пазнавата.

Яны прыселі на мураве дарожкі плячыма да сонца.

І Мар'яна пачала расказваць Макару пра сваё жыццё:

— Пытаешся, Макарка, як жывецца... Ліхі сабака лепш жыве, чым я... Была Грамада,— памагалі хлопцы, падбягуць — жыцечка змалоцяць, дроў падвязуць і яшчэ пытаюцца: «Што табе зрабіць, Мар'яна?» Моладзь на вечарынкі збіралася ў маёй хаце... І жылося так-сяк. Хоць таксама ніколі сэрца спакойным не было. Паліцыя, калі прыходзіць у сяло, ніколі маёй хаты не мінае. «Ну, партызанка, як жывеш?» — пытаюцца. «Ашукалі вас камісары...» І плятуць абы-што, каб прымела, то качаргою пачаставала б кожны раз... Але што ты зробіш — не наша сіла... А цяпер, Макарка, няма хлопцаў, усіх пагналі ў турму. І мяне былі арыштавалі разам з імі... Усё абвінавачвалі, што я збіраю сходы над магілаю Данілы. Збіраюць іх без мяне і будуць збіраць. Заўсёды на Першы май хлопцы і дзяўчаты, бывала, нясуць вянкі... Ну, і я з дзецьмі іду з імі... Паплачу там...

Прынесла мне Мальвінка есці ў пастарунак. Якраз сам староста быў і сказаў, каб мяне выпусцілі... А цяпер людзі напалоханыя, няможна нікога ўпрасіць і за плату, каб дапамог хто... Сын Хведара Дудзько,— помніш таго Хведара, якога вы лавілі, што выдаў Данілу легіянерам, дык вось яго сын лесніком служыць і ўсё даносіць паліцыі — хто да мяне ходзіць, хто ў чым дапамагае. Двух чалавек ужо выклікалі ў пастарунак...

Так вось усю вясну і лажу з канём па полі сама... І агарод трэба дагледзець, і ў хаце, і кросны саснаваць... Ой, Макарка, у мяне ўсё пазнавата... Адзін гной вывезці — колькі сілы каштавала... Хоць ты разарвіся... Мальвінка наймалася на пяць хат статак пасвіць. Заб'ецца дзяўчо. Як прыйдзе ўвечары, абы павячэрала і тут жа спіць... Ну, што ты ад яе будзеш патрабаваць?

— А хто табе сеяў?

— Сама, Макарка, сама... Бяда ўсяму навучыць. Усё сама...

— Ой, Мар'яна, цяжка табе...— ад душы спачувальна сказаў Макар.

— Цяжка, саколік, ды яшчэ як... Што яны, гэтыя злыдні, думаюць са мной зрабіць, хто іх ведае...

Потым Мар'яна махнула рукою, як быццам што адганяючы ад сябе, і дадала:

— А, няхай робяць, што хочуць... Нічога я ўжо, Макарка, не баюся.

Мар'яна сціхла, маўчаў і Макар. Данілюку засталося прайсці яшчэ якія дзве баразны. Ён шпарка заварочваў каня, з размаху ўсаджваў лямех у зямлю і, не спыняючыся, крочыў і крочыў за плугам, крыху прыгнуўшыся. Мар'яна, здаецца, між іншым, сачыла за яго паваротамі.

Хоць значна пастарэла Мар'яна, схуднела, але гэтыя самыя цёмныя шаўкавістыя валасы, прычэсаныя ў просты радок пад белай хусткай, цёмныя аксамітныя вочы з выразам тугі цяпер нагадвалі маладую Мар'яну, якая не страціла мяккай ветлівай усмешкі, сціпласці ў рухах, жаночай рупнасці. Хоць на лбе прарэзаліся дзве папярочныя маршчынкі, але на твары ледзь прыкметна прабівалася тая тонкая бялявасць, якая некалі так харашыла Мар'яну з яе цёмнымі бровамі, шыракаватым носам. Смяяліся вусны, бліскалі белыя моцныя зубы з той характэрнай шчарбінкай, што ажыўляла ўсмешку. А цяпер хоць шмат страціла з сваёй былой красы Мар'яна, аднак яна не зракласся жыцця, трымаецца за яго як можа, і на змучаным твары часам заззяе ўсмешка, як бывала,— бліснe, нібы сонца паміж хмараў.

— А над магілаю Данілы не здзекуюцца? — асцярожна спытаўся Макар.

— Увесь час не чапалі, але вось нядаўна знік з магілы сцяг. Няйначай, забралі ўначы... Невядома, што будзе далей...

З аўса на дарогу нечакана выбег хлопчык — валасаценькі, чырванашчокі, з пучком кветак у руцэ. Падбег да Мар'яны засопшыся:

— Мама, а я бачыў гадзюку. Вось такую...

І хлопчык растапырыў рукі, паказваючы, якой даўжыні была гадзюка.

Мар'яна спалохана глянула на яго босыя загарэлыя ногі і пляснула рукамі:

— А божа ж мой... Казала ж табе — не хадзі... Добра, што не ўкусіла, а то была б мне яшчэ адна работа.

— Паглядзі, мама, якія кветкі... Я занясу тату на магілу...

Мар'яна спыніла позірк на хлопчыку, і ледзь прыкметная слязінка скацілася з вока. Яна хутка змахнула яе кончыкам хусткі і прыцягнула хлопчыка да сябе:

— Ох, ох, сынку... запэцкаўся ты, як парасё якое. Давай вытру.

І выцерла сына крысом свайго нейкага цёмнага каптана.

— Глядзі, Макар, які вырас... Ужо сёмы гадок. Яшчэ ў калысцы качаўся, а бацька ўжо называў грамадзянінам... Ну, а цяпер тройчы называў бы так... Усё носіць кветкі на магілу. Ужо і крычу на яго, сваруся... Не, крадком нарве і занясе.

Данілюк скончыў араць. Выцер кепкаю пот з твару і падышоў да малога.

— Го! Здароў, маладзец! — выгукнуў ён, працягваючы руку.

Хлопчык нясмела яе націснуў, бліскаючы чорнымі вачанятамі. Данілюк падняў хлопчыка на ўзровень сваёй галавы, паглядзеў у твар і паставіў на зямлю.

— Добры сынок расце, Мар'яна... Наша не прападзе, Мар'яна...

— Ой, хлопчыкі, як я рада, што вас убачыла, я проста аджыла. Ну, будзем збірацца дахаты...

Данілюк ачысціў лямех ад зямлі, узваліў плуг на саначкі, прывязаў, і ўся сямейка ўжо гатова была ісці. Але Макар сказаў, што лепш было б не ісці разам з Мар'янай у хату, а з'явіцца асобна, быццам незнаёмыя. Мар'яна спачатку ўпіралася, а потым сказала: «Як хочаце».

Дайшлі да лесу. Мар'яна паказала дарожку на шлях і ўзяла лейцы з рук Данілюка.

— Толькі не баўцеся! — крыкнула яна ім услед.

Сябры хутка выйшлі на шлях. Глянулі направа. Праз лес стромкіх соснаў прасвечвалася белая царква з чырвоным дахам. Сябры падышлі да яе і спыніліся. Пабляклі на ёй сінія літары і лічба: «Anno — 1772». Два драўляныя крыжы стаялі гэтак жа, як і тады, толькі яшчэ больш абраслі мохам. Хлопцы паглядзелі на той злавесны крыж, дзе Данілу пасцігла смерць, і хутка падаліся да пясчанага ўзгорачка ў кветках і вянках, да мясціны, абгароджанай штакецінамі. Там знялі шапкі і ў маўчанні сталі над магілай. З фатаграфіі на слупку глядзелі на іх з усмеш-

каю вочы Данілы, пазіраў той знаёмы твар, які заўсёды быў удумліва-насцярожаны.

Хлопцы абышлі магілу навокал, надзелі шапкі і накіраваліся ў вёску.

Мар'яна ўжо паспела падмесці хату, заслаць стол белым абрусам, падрыхтаваць сёе-тое з ежы, каб прыняць такіх жаданых гасцей. Ды і сама крыху прыбралася: памыла рукі, твар, прыгладзіла свае цёмныя шаўкавістыя валасы, завязала другую хустку, таксама белую, надзела новую кофту, спадніцу і ў дадатак, чаго ўжо даўно не рабіла, глянула на сябе ў люстэрка. Адтуль зірнуў на яе памаладзелы твар з цёмнымі бровамі і вялікімі чорнымі вачыма. Аж сама сабе здзівілася Мар'яна, ледзь прыкметна ўсміхнулася і адышла ад люстэрка,— не адышла, а проста ўцякла. «Трэба было б чарачку на спатканне, але няма...— падумала Мар'яна,— няхай выбачаюць, свае ж хлопцы... Ой, гора ж маё, гора...»

Нехта пастукаў аб веснічкі, а потым пачуўся голас. Мар'яна выбегла з хаты.

— Можна да вас зайсці адпачыць? — спытаўся Макар.

— А чаму не? Можна... Заходзьце, адпачніце...

Хлопцы ўвайшлі ў сенцы, дзе скінулі свае клункі. Мар'яна запрасіла іх у кухню, каб памыліся, паліла ім на рукі, падала чысты ручнік, толькі што выняты са скрыні. Данілюк, выцершыся, з шальмоўскай усмешкай спытаўся ў Мар'яны:

— Ну, а люстэрка ёсць?

— Ёсць...

— Тое самае?

— Тое самае... Ідзі прывітайся з ім...

І Данілюк, як некалі, стаў перад тым самым люстэркам у чырвонай аправе і старанна прычасаў сваю цёмнарусую чупрыну.

Толькі што хацелі сесці за стол, як нехта пастукаў у дзверы і зараз жа крыкнуў: «Мар'яна, выйдзі на хвілінку!»

— Гэта памочнік солтыса,— шапнула Мар'яна,— каб яго халера, як ён хутка...— І пайшла да дзвярэй.

— Ты, Мар'яна, мусіць, мёдам сябе мажаш, што да цябе ўсё людзі заходзяць,— уваходзячы, сказаў намеснік, нібы жартам, але ў ім адчуваўся нейкі свой намёк.

— От, сядай, то і ты госцем будзеш,— згладзіла намёк Мар'яна.

А намеснік тым часам звярнуўся да хлопцаў:

— Адкуль будзеце?

— Ідзём з лесапільні, там працуем, хочам хлеба купіць,— адказаў Макар.

— Цяпер ёсць такі наказ — правяраць дакументы... Так што выбачайце, я да вас нічога не маю, але служба ёсць служба...

Калі намеснік солтыса пасля праверкі дакументаў выйшаў, Мар'яна праз акно правяла яго вачыма аж на вуліцу і, уздыхнуўшы, сказала:

— Пайшоў... Ой, божа, божа, ні хвіліначкі няма спакойнай...

— Добры ён чалавек ці дрэнь? — спытаўся Данілюк.

— Не сказаць, што дрэнь, але наравісты... Трэба хадзіць ля яго, як ля таго каня...

Мар'яна махнула рукою так, як быццам хацела падкрэсліць, што няма тут аб чым гаварыць, і сказала:

— Чорт з ім... Сядайце за стол... Толькі, хлопчыкі, няма ў мяне чаркі, а трэба было б...— развяла рукамі Мар'яна.

— А можна дзе тут дастаць? — спытаўся Данілюк.

— Можна... абы грошы... вось у суседа...

— Дык я пабягу...

— Не, давай лепш я сама... Бо табе можа і не даць... Гарэлку прадаваць абы-каму ўжо забаронена... Манаполь нейкі, вінаполь ці як яго там...

Хлопцы патрэслі кішэні, злажыліся на паўбутэлькі. Мар'яна пайшла і хутка вярнулася. Выняла з-пад фартуха паўбутэлькі чыстай, празрыстай гарэлкі і паставіла на стол. «Значыць, пачастуемся з Мар'янай, адпачнём душою»,— падумалі хлопцы і жвава селі за стол. А ў вокны глядзелі тыя самыя вішні, хоць пастарэлыя ўжо, не такія бадзёрыя, як некалі. Першую чарку падняла Мар'яна.

— За нашу сустрэчу, хлопчыкі,— сказала яна, глянуўшы на хлопцаў, і голас яе задрыжаў,— усяго было ў нашым жыцці... Вып'ем, даражэнькія, каб хутка збылося тое, аб чым мы думалі і думаем кожны дзень...— І зноў Мар'яна, узрушаная, глянула на хлопцаў гарачымі вачыма, і раптам гэты мілавідны спакутаваны твар азарыўся ўсмешкай. «Як я рада, родненькія, што вы прыйшлі... Ну, будзьце здаровы!» І выпіла Мар'яна да дна і кропляй апошняй пырснула ў столь, як рабілі дзяды і бацькі на шчасце, на ўдачу.

Хлопцы слухалі і глядзелі на Мар'яну. Цёпла рабіла-

ся ў іх на душы, стала чагосьці шкада,— шкада, відаць, таго, чаго няма, а што быць павінна, шкада Мар'яны, гэтай сапраўднай пакутніцы... Варушылася ў душы многае-многае, чаго і не выкажаш.

— За цябе, Мар'яна! — ускрыкваў Данілюк.— За цябе такую, якая ты ёсць, наша жынка, харошая жынка...

— За цябе, Мар'яна! — гаварыў Макар.

А Мар'яна ўсё запрашала:

— Ешце, хлопчыкі, ешце,— і падсоўвала сала, сыр і чэрствы хлеб-жытнік.

Макар з Антонам пражылі ў Мар'яны двое сутак, нямала дапамаглі ёй у гаспадарцы: залаталі дзірку ў страсе хаты, направілі перагародкі ў хлеўшку, пасеклі ўсе дровы, якія былі, падрамантавалі плот у агародзе... Усё трэба ў гэтай няшчаснай гаспадарцы, усё патрабуе рук... Хацелі нават апалоць грады за хатай, але ўжо Мар'яна не дапусціла. Данілюк хацеў весці каня на пачлег — таксама не дазволіла.

— Злыдняў многа...— сказала яна,— данясуць...

На трэці дзень Макар сказаў Данілюку:

— Пара ўжо, Антон, нам падумаць, што рабіць далей...

Пасля доўгага роздуму дадаў:

— Чапляюцца, чэрці... Хіба так зрабіць, каб ты да яе нібы наняўся за парабка...

— Хіба што так... Учора і Мар'яна гаварыла, што трэба шукаць нейкага ратунку...— падхапіў Данілюк.

— Ну і добра,— з палёгкай сказаў Макар,— трэба будзе паклікаць вам гэтага падсолтыса, пару сведак і напісаць умову найму... Тады ніхто не павінен чапляцца...

На гэтым і спыніліся.

Так і застаўся Данілюк у Мар'яны за «парабка», а Макар пайшоў на шлях, каб па ім дабрацца да Глушца.

На адыходзе ціха спытаўся ў Мар'яны ў сенцах, ці не чуваць чаго пра Сцяпана Каваля. Мар'яна глянула на Макара нібы недаўменным позіркам, азірнулася навокал і таксама ціха адказала:

— Было толькі адно пісьмо... калі? — Мар'яна на момант задумалася, прыпамінаючы.— Калі ж гэта?.. Ой, галава мая забітая... Ды ўжо больш, як год таму...

— Адкуль? — пытаўся далей Макар.

— І невядома адкуль... Не піша і горада, дзе жыве, дзе што робіць. Адно піша, што яму добра жывецца і што, можа, хутка пабачымся...— Мар'яна змоўкла і потым да-

дала яшчэ цішэй, дапамагаючы сабе ўзмахам рукі: — Няйначай адтуль... з Саветаў...

— Дык ты яму не адпісвала?

— Ды не... Адраса не было...

Макар развітаўся з Мар'янай, поўны яшчэ неўсвядомленых, радасных надзей.

## НА ГРУШЫ ШПАКІ...

Яшчэ ціха было ў вёсцы Запаляпка. Сіне-ружовае світанне паволі рассцілалася па зямлі, плывучы непрыкметна з далёкіх небасхілаў.

Яснейшай рабілася дымка над лясамі і бялейшымі туманы над сенажацямі. Нідзе ні гуку. Толькі росы буйныя павіслі на лісцях дрэў і часам цупне на зямлю дзекаторая расінка, не ўтрымаўшыся на лісточку. І зноў ціха. Хаты глядзяць цёмнымі ціхімі вокнамі, і кожная хата вылучаецца сваім складам, сваімі абрысамі,— хаты, як няшчасныя прывіды з казкі, прыціхлыя пасля буры.

Калі сустрэнецца чалавек у такі час, ён выглядае стомленым, схуднелым, хочацца яму легчы або сесці хоць пры дарозе і... заснуць. Бо ногі слабнуць і ўсім целам авалодвае стома. Хутчэй, хутчэй пад страху, на пасцель ці на сена ў гумне, выцягнуцца, распрастаць стомленыя ногі, рукі і спаць... спаць...

Таму Сцяпан Касцевіч, можа, першы прачнуўся ў вёсцы. Калі выйшаў на вуліцу, убачыў, што нехта ціха ідзе, мінае хаты, набліжаецца. Сцяпан працёр вочы, думаў, можа, здалося, але не — ішоў чалавек, нават у кажушку, з клункам за плячыма. Цікава... А гэты чалавек ішоў і здаваўся нейкім празрыстым, як быццам нядаўна выйшаў са змроку, і цені яшчэ ляжалі на яго твары.

Сцяпан Касцевіч толькі тады здагадаўся, хто гэта, калі чалавек спыніўся супроць яго хаты і, пазіраючы на Сцяпана, моўчкі ўсміхнуўся.

Чалавек сказаў:

— Не пазнаеш?

Пасля гэтага голасу Сцяпан у адзін момант пераскочыў вуліцу.

— Гэта ты, Дзям'ян? А я думаю, ну, хто так рана ідзе?..

Яны прывіталіся.

— А я ішоў і думаў нават, што ты мяне сустрэнеш першы.

— Ах, ах, Дзям'ян, Дзям'ян... Выпусцілі, значыць?..

— Пад нагляд паліцыі... Не думай... Можаш спаць на печы, а яна ўсё роўна будзе за табою наглядаць... Дай закурыць, калі маеш.

— Як мой Андрэй там?

— Го! Андрэй... Яму і там няма калі носа ўцерці... Работы па вушы...

— Але ж і худы ты, Дзям'ян, худы... Турма, яна ёсць турма.

Сябры зайшлі на падворак і селі на прызбу, задымілі цыгаркамі. Было так ціха, што і дым з цыгарак не хацеў разыходзіцца, а застываў шызым воблачкам у паветры. Дзям'ян гаварыў ціхім, стомленым голасам:

— Кажаш, худы... Галадоўка была... Невядома чым яна там скончыцца... Мяне выпусцілі на чацвёрты дзень рана... Вось і худы...

— І ты нічога не еў тры дні?

— Ні кропелькі... Трыста чалавек загаладала, не думай... Акцыя, значыць... супроць фашызму, разумееш?

Сцяпан апусціў вочы. Не зусім зразумелымі былі для яго гэтыя справы, але адчуваў, што тут ёсць нешта важнае, не на жарты.

— Ну, што ты голадам даб'ешся? Толькі сілы патраціш...

— Ого, не... Паны заскакалі здорава... Прасілі, каб бралі ежу... Кожны дзень прыносілі — і снеданне, і абед, і вячэру... Хіба ім гэта на руку, калі людзі леглі паміраць?.. Народу баяцца... Ужо на трэці дзень рабочыя збіраліся ля брамы турмы... Вось куды яно гне.

Сцяпан Касцевіч узняў дагэтуль апушчаную галаву і з праясненым тварам глянуў на Дзям'яна.

— Зразумеў, у чым справа? — спытаўся Дзям'ян.

— Вось яно як... Ах, ах, мудры і хітры цяпер свет,— гаварыў Сцяпан і ківаў галавою.

— Але і ты пастарэў, Сцяпан,— запудзіўся, мусіць, па сыну. Арол у цябе сын, там таксама ўсіх вучыць, радуйся...

Сябры гутарылі нядоўга. Пасля таго, як Сцяпан у некалькіх словах расказаў аб жыцці сям'і Дзям'яна, аб сваёй дапамозе ёй, яны разышліся.

— Адпачывай, Дзям'ян, добра адпачывай, ты заслужыў гэтага... Сёння трэба абворваць тваю бульбу. Не тур-

буйся, зараз пайду па копей і ўсё зраблю... Выспішся добра, тады пагаворым больш...

На грушы тарчала шпакоўня. Там прачнуліся ўжо і шальпаталі маладыя шпачкі. Яны па адным высоўвалі свае галоўкі праз круглае акенца, паглядалі навокал і разяўлялі дзюбкі. З гэтага заўсёды і пачыналася жыццё ў вёсцы.

А насустрач Дзям'яну ўжо выбегла Люба, сонная, з распушчанымі валасамі.

— Тата, гэта ты?

— А хто ж, дачка? Я... Я...

* * *

Чорны аблавухі сабака ляжаў на падлозе, блізка ад стала, і глядзеў на свайго гаспадара. У сабакі жоўтыя, нібы апаленыя бровы, пад якімі час ад часу моргалі бліщчастыя вочы. Яны рабіліся то сумнымі — і тады сабака клаў сваю вострую морду на выцягнутыя белыя лапы і быццам застываў у дрымоце, то раптам загараліся бляскам, тады галава адрывалася ад лап і пасцярожваліся вушы. Вочы ва ўпор глядзелі на гаспадара.

А гаспадар — Мікіта Лазун — сядзеў у канцы стала адзін і займаўся сваёй любімай работай,— абскрэбваў нажом «згáралкі», гэта значыць падгарэлую бульбу. Нявестка ведала гэтую слабасць свёкра і заўсёды, збіраючыся гатаваць снеданне ці вячэру, накладала гаршчок чышчанай бульбы з верхам і ставіла ў печ, пад полымя. Бульбіны падгаралі да палавіны, і гэта быў ласунак Мікіты. Так ён і сядзеў цяпер, адзін у хаце, і паскрэбваў бульбіну за бульбінай. На шоргат нажа сабака кожны раз падымаў галаву і прасіў есці сваімі бліщчастымі вачыма, часам нават тупаў лапамі аб падлогу, павільваючы хвастом, і папіскваў. Калі ж гаспадар браў бульбіну ў рот і пачынаў жаваць, хрумстаючы, сабака сціхаў, клаў морду на лапы і сумна заплюшчваў вочы, страціўшы надзею на паначастунак. А Мікіта жаваў бульбу, і здавалася, што разам з ёю жуюцца і валасы вусоў і барады. Ён часта выціраў губы, разгладжваў вусы. Бачыць Мікіта, што ляжыць сабака, хоць і не глядзіць на яго. Толькі калі гэтая верная жывёліна заварушыцца, Мікіта крыкне, як дзе з-за сцяны:

— Гэ... воўчае мяса!..

Сабака пасля кожнага такога крыку трошкі адсоўвалася ад гаспадара і глядзела на яго ўжо баязлівымі вачыма, а потым на шоргат нажа аб бульбіну зноў прысоўвалася бліжэй да стала.

— Гэ... ты, воўчае мяса!.. Не пакорміш цябе ніяк.

Праз густыя стромкія ліпы, што стаяць чарадою на процілеглым баку вуліцы, праз невялікія вішні ў гародчыку скупа прабіваюцца ў хату чырвоныя праменні заходзячага сонца. Шапатлівыя цені ад лісцяў трапечуць на шыбінах вокнаў, і таму праменні, як зайчыкі, мільгаюць, скачуць на сценах, асабліва па белай сцяне печы. Вось-вось зараз сонца схаваецца зусім. Мікіта сядзеў, кідаў у рот бульбіну за бульбінай і думаў, разважаў. Правае бяльматае вока моргала не часта, як гэта бывала ў гутарцы з кім-небудзь, а асабліва ў спрэчцы. Тады яно дрыжала, скакала, здаецца, выпучвалася наверх і зноў хавалася. Твар у Мікіты спакойны, маршчыны на лбе схаваны пад пасмамі цёмных пасівелых валасоў. Але ўсё роўна маршчына над пераноссем сціскаецца, варушацца навіслыя, таксама пасівелыя, бровы. Нешта доўга няма сыноў з касьбы, нявестка выйшла на падворак уладкаваць свіней, і адтуль далятае ў хату праз адчыненыя дзверы яе голас. Вячэра ўжо гатова, а вячэраць няма каму. Сядзіць толькі ён, Мікіта, і раскашуецца згáралкамі. Няхай сабе сабака коўтае сліну — згáралкі належаць толькі Мікіту. Учора адбылася ў хаце «невялікая» сварка. Невялікай яе лічаць у сям'і таму, што яна працягвалася нядоўга, хоць мела вынікі даволі жорсткія. А ўсё пачалося праз гэтыя згáралкі. Мікіта прыйшоў ад солтыса Барсука, дзе абмяркоўваліся падатковыя агульнавясковыя пытанні. Снеданне было ўжо гатова, але Мікіта не заўважыў на прыпеку падгарэлых бульбін. Нявестка заўсёды збірала іх у міску і адстаўляла ўбок «для таты», а на гэты раз, праўда, міска стаяла, але бульбін не было. На дне міскі прыліплі толькі бульбяныя крошкі. Мікіта расправуўся і сеў на лаву, злавесна пазіраючы на прыпек, на ўсе кухонныя прылады, што стаялі перад печчу: тут было і драўлянае вядро з вадою, на якім вісеў масіўны медны кубак, два свіныя цэбры, ад якіх тхнула пракіслай паранай бульбай, некалькі чыгуноў і гліняных гаршкоў на лавах з ужо зваранай ежай і пустых. У місцы з вадой моклі драўляныя лыжкі. У печы яшчэ гарэлі дровы і стаялі два гаршкі — адзін з буракамі на дзень, а другі з гарохам. З печы пахла развараным здорам. Трэба

было б закурыць, але Мікіта ўжо ад некаторага часу «нашча сэрца» не курыць — у грудзях нядобра робіцца. Праўда, хоць чарку выпіў у солтыса Барсука, але ад ежы адмовіўся, сказаў: «Пераб'ю сабе снеданне».

Убегла нявестка, глянула ў печ і зжахнулася:

— Ой, зусім у печы гасне...— і падкінула пару паленцаў. Мікітава вока заморгала часта.

— Згáралкі ёсць? — спытаўся загадкава.

Нявестка па звычцы глянула налева на прыпек і, убачыўшы пустую міску, пляснула далонямі:

— Ой, божа, дзе ж яны дзеліся? Я ж іх тут вось у місцы паставіла... Як заўсёды... Нікога ж у хаце не было... Няйначай Мурза...

Увайшоў малодшы сын Кузьма, у лапцях, мокры па калені,— паставіў коні на канюшынішчы. У руцэ трымаў дзве бручкі з зялёным лапушыстым нацiннем, якія ён і паклаў на лаве.

— Вось татавы згáралкі нехта з'еў...— паскардзілася нявестка...

— Згáралкі?.. Я нядаўна заходзіў у хату, дык застаў Мурзу. Узлез лапамі на прыпек і еў з міскі. Адскочыў, як я ўвайшоў. Але ў місцы засталіся толькі дзве бульбіны. Дык я яму іх і аддаў. А што?..— глянуў Кузьма на бацьку і нявестку з пытаннем у позірку.

Мікіта заёрзаў на месцы. З вуснаў палілося штосьці падобнае да квакання:

— Які аддатчык мне знайшоўся... Куды ж ты хадзіў зараз?

— На агарод... Трэба сёння апалоць грады... Вось вырваў дзве бручкі...

— Мурзу аддаў...— цягнуў сваё Мікіта.— Занёс бы лепш шпакам Касцевіча. Ты ж адтуль і не вылазіў бы.

— Ну, што тут гаварыць аб гэтай бульбе? Сёння ўвечары зноў Ульяна наварыць... І не папракайце мяне гэтымі шпакамі... Усё шпакі ды шпакі. На той год я ў сябе зраблю шпакоўню...

— Няма больш чаго рабіць... Шпакоўні...

— От, сціхніце, тата, няма тут аб чым гаварыць...

— Як няма аб чым гаварыць? Ты мяне будзеш вучыць? Што ты з ботамі зрабіў у нядзелю? Такія, мой пане, боцікі былі...

— Зноў боты... Я ж казаў... Пераходзілі цераз канаву, як ішлі пад царкву,— ну, і ўваліўся...

— Маўчы, прахвост! Вам іншай дарогі не было? Хіба

там дарога? Вы спяшаліся, каб дагнаць гэтых смаркачоў, што неслі вянкі на магілу свістуноў, якіх паліцыя забіла ў Глушцы...

Гэта быў намёк на магілу Ільі Рамановіча і Ткачука.

Кузьма нахмурыў бровы. Ульяна, нагнуўшыся, заглядала ў печ, папраўляла качаргою дровы, і вочы яе бліскалі непакоем. Не адварочваючыся ад печы, сказала:

— От, сціхніце... Зараз будзем снедаць...

— І ты за яго? — устаў з лавы Мікіта.— Снедаць?.. Вы зарабілі ўжо на снеданне?

І тут — адкуль што ўзялося? — Ульяна якраз адхілілася ад печы — Мікіта схапіў вядро з вадою і бухнуў у печ... Там запшыкала, зашумела, белымі клубкамі павáліла пара. З прыпека разам з попелам пацякла брудная вада...

— Я вам дам снеданне!..— крыкнуў Мікіта і, схапіўшы кій у качарэжніку, хацеў ударыць Кузьму. Але Мікіта і не згледзеў, як Кузьма вырваў у яго гэты кій і зламаў аб калена...

Ульяна выйшла з хаты, выйшаў і Кузьма. Стары Мікіта лыпаў вачыма, тупаў ля печы, чагосьці нібы шукаючы, а потым схапіў з акна два яйкі, пляснуў аб падлогу, расцёр нагамі і плюнуў. Затым выняў з кішэні выгінастую люльку з капшуком і пачаў набіваць яе табакай. Шчокі яго гарэлі, валасы стаялі дыбам. Сеў у канцы стала і стаў пыхкаць з люлькі, з ярасцю плюючы на падлогу. Пляўкі клаліся ад стала на рознай адлегласці, некаторыя залятаді аж пад парог. Соп у нос Мікіта, без сэнсу пазіраючы ў акно, дзе галінка вішні неяк баязліва краналася шыбінкі. Ад некаторага часу не падабаецца Мікіту яго сын Кузьма. Асабліва, калі ў Сцяпана Касцевіча на грушы з'явілася шпакоўня, а ў ёй пасяліліся шпакі. Кузьма быў не толькі сціплага, але нават, як людзі казалі, жаночага характару. Бялявы, даўгаваты твар з блакітнымі вачыма яшчэ больш падкрэсліваў яго жаноцкасць. Паколькі маці памерла даўно, Кузьма рабіў усю жаночую работу. У хаце засталася за гаспадыню жонка старэйшага брата, Ульяна. Яна часта наракала на сваю долю, што ёй адной цяжка ўправіцца з усім у гаспадарцы. І Кузьма пачаў дапамагаць ва ўсім: падмятаў хату, мыў падлогу, насіў ваду, дровы, мыў з Ульянаю бялізну. Здатнасць Кузьмы да жаночай работы дайшла да таго, што ён навучыўся нават прасці кудзелю, памагаў снаваць кросны Ульяне і добра разбіраўся ў гэтай хатняй жаночай тэх-

ніцы. Маўклівым быў, ціхім, Кузьма выглядаў заўсёды як быццам прыгнечаны, задуманы. Хлопцы ў вёсцы смяяліся з яго жаночых заняткаў. Балюча перажываў гэта Кузьма, стараўся не глядзець у вочы людзям, баючыся сустрэць насмешку. Таму Кузьма прывык хадзіць з наніклай галавой, апусціўшы вочы ў зямлю. Усё рабіў Кузьма — Ульяна не мела клопату з градамі, усё аполваў Кузьма, хадзіў жаць траву цялятам, свінням, павесіўшы вялікую торбу на шыю. Вазіў гной на поле і сам тут жа разбіваў. Улетку не раставаўся з сярпом. Усё рабіў Кузьма, і здавалася, што праца была яго адзінай уцехай. Слухаўся бацьку,— заўсёды ішоў туды, куды яго пасылалі. Але ніколі Кузьма не пачуў ад бацькі пахвальнага слова — усё загады і крыкі, усё папрокі ў няхлюйстве, усё нейкія несправядлівыя абвінавачанні.

Калі ж аднаго разу нявестка Ульяна сказала, што, можа б, трэба было Кузьме зрабіць боты, што ён ужо дзяцюк, што і яму хочацца да людзей выйсці і што «хіба ж у нас не хапае, няма за што...», Мікіта пыхнуў з люлькі, потым плюнуў на падлогу і сказаў:

— Няма чаго разбэшчваць... Я за сваё жыццё толькі адны боты зпасіў, якія пашыў на вяселле... Ого-о!.. Было не так, як цяпер. Мне было чатырнаццаць год, як я ўжо з бацькам усю работу рабіў. Бацька ўстае зімою рана, досвіткам, і я ўстаю. Бацька бярэцца плесці лапці, і я бяруся... Бацька на досвітку ідзе ў гумно малаціць цэпам, і я іду... І я не прасіў ботаў... Вось яно як! А што б яно прыдбалася ў хату, каб было інакш...

Слухаў Кузьма такую гутарку і адзін раз, сам не ведае, як гэта сарвалася ў яго, сказаў:

— Ат... дурныя людзі былі... Самі сабе шкадавалі...

— Дзе ты такога розуму набраўся?! — усхапіўся Мікіта.— Каб я гэтага больш не чуў... Яйцо курыцу будзе вучыць!

І Кузьма нядзелямі праседжваў дома, абуты ў лазовыя лапці, у той час як на вуліцы шумела моладзь, чуваць былі гукі гармонікі і бубна.

Нешта праз два дні пасля такой гутаркі Мікіта палез на гару і адтуль, з-пад страхі, сцягнуў з жэрдкі закасцянелую, каравую конскую скуру, выробленую калісьці нейкім сваім хатнім спосабам.

Калі тры гады назад здох стары конь Каштан, якому было ўжо трыццаць год, Мікіта паклікаў жабрака Рыгора Малахая, каб той здзёр скуру. Вось гэтую скуру і ўва-

лок у хату Мікіта і кінуў на падлогу. Скура была жоўтая, зморшчаная, сям-там заплямленая зялёнай цвіллю.

— Вось... вашы галовы ні аб чым не думаюць... Ёсць што ў хаце ці няма... Трэба што ў хату ці не трэба... Ботаў табе хочацца,— ну, вось, будуць боты.

Усе трое — Мікіта, нявестка і Кузьма — сталі над скурай у задуменні. Вось гэта скура! Цар скура! Сагнутая надвое, так як вісела на жэрдцы. Паспрабуй яе разагнуць. Кузьма паспрабаваў, але гэта не ўдалося. Як толькі ён выпусціў яе з рук, канцы скуры, як па спружыне, ляснулі адзін аб адзін, і скура легла на падлозе згорнутая, як была. Непрыступная скура!

— Не з тваімі рукамі за яе брацца,— зыркнуў Мікіта,— бяры за адзін канец, а я за другі...

Так і ўзяліся. Скура трашчала, рыпела, нібы хацела пераламацца.

Прыйшла дапамагчы Ульяна, стала на сярэдзіну скуры і націскала нагамі то на адзін бок, то на другі.

Урэшце скура падалася. Яна надламалася да палавіны сваёй таўшчыні. Мікіта апусціўся каленямі на скуру і пачаў мацаць яе пальцамі, глыбакадумна насупіўшы твар.

— Гэта нічога... што крыху трэснула... нічога. Але ж скура... Хіба гэта не скура? Во... Во... Што гэта табе, не тавар? Во...

— Яна ж лубяная,— сказаў Кузьма,— што з яе зробіш? Хіба толькі бубен...

Мікіта прыўзняў галаву і спыніў суровы позірк на Кузьме.

— Сам ты лубяны... Лубяная... Конь не сабака, каб з яго скуры рабіць бубен... Бубна захацеў...

Памаўчаўшы крыху, дадаў:

— Увечары занясеш да шаўца, да Міхася... Няхай паглядзіць... Боты выйдуць такія, што дваццаць год будуць насіцца...

— Я не панясу,— заенчыў Кузьма,— хіба на смех...

— То здыхай без ботаў! — крыкнуў Мікіта.

— У такіх ботах толькі ногі можна пакалечыць... Падэшву з гэтай скуры, дык яшчэ... А перады?.. Ну, якія ж з яе перады, яе ж і на калодку не сагнеш... Ды яшчэ да Міхася, як быццам лепшага шаўца няма...

— Для цябе і гэты добры...

Скуру да шаўца занёс сам Мікіта. Міхась быў старасвецкім, свойскім шаўцом і шыў боты толькі для старых

мужчын, і шыў ён іх не сказаць што на калодку, а быццам на цагліну. Ну, каб былі прасторныя, каб можна было накруціць на ногі шмат ануч. І галоўнае, не так многа браў за работу, як шаўцы ў мястэчку.

Але і Міхась пакруціў носам, разглядаючы скуру, і сказаў:

— Боты з яе, вядома, можна зрабіць... Але ці гэта боты для маладога хлопца? Уважайся, Мікіта... Табе магу зрабіць, а Кузьме не... Не хачу сароміць хлопца...

— Як бачу, то вы, мусіць, змовіліся...

Нясмачна было Мікіту ад слоў шаўца. Пакруціўся сюды-туды і сказаў:

— Тады зробіш мне...

Так Кузьма зноў застаўся без ботаў. Было ў яго яшчэ з леташняга года заробленых у графа Ельскага штосьці больш сарака злотых за вывазку лесу. Кузьма вырашыў зрабіць за гэтыя грошы боты.

Адразу, як атрымаў заробак, то не пайшоў дахаты, а падаўся ў мястэчка і заказаў сабе хромавыя боты.

Калі ж потым ён прынёс іх дахаты,— блішчастыя, прыгожыя, бацька толькі адзін раз скоса глянуў на іх са здзіўленнем і потым трымаў сябе так, як быццам у хаце нічога не адбылося. Але зараз жа пайшоў у свіран, праверыў засекі са збожжам. Там пароблены ім таямнічыя знакі,— ці не парушаны яны, ці не набраў Кузьма збожжа? Бо адкуль жа ў яго з'явіліся грошы на боты?

І цяпер вось Мікіта зноў упікае. Мала таго — узяў заліў дровы ў печы.

І зноў гэтая гутарка пра шпакі Касцевіча. Не хоча ўцяміць стары, заскарузлы Мікіта, што, апрача працы ў полі, другою ўцехай Кузьмы былі птушкі. Можа, ніхто не ўмеў так вышукваць птушыных гнёздаў па кустах, як Кузьма. Ёсць у яго зробленая ім клетка, у якой ён трымае зімою сінічак. А ў калядную ноч, на шчодру, ён заўсёды ходзіць у гумно і ловіць сонных вераб'ёў. І трэба ж гэта Сцяпану Касцевічу, адзінаму ў вёсцы, зрабіць шпакоўню! Яна стала прадметам увагі ўсёй вёскі. Дзеці, напэўна, спілі аб ёй па начах. Заглядалі на шпакоўню, ідучы па вуліцы, і старыя — мужчыны і жанчыны. Моладзь тоўпілася спачатку не толькі на падворку, але і на вуліцы, зазірала, усміхалася, калі прылятаў шпак і садзіўся на прыступачак перад акенцам. Ды і сама шпакоўня была прыгожая — зроблена ў форме доміка, пафарбавана ў жоўты колер, а вуглы і страшка адцэнены чырвонай фар-

бай. Чырвоным абадком абведзена і акенца. Маляўнічая шпакоўня! І ў ёй самі пасяліліся птушкі. Дзядзька Касцевіч кажа, што яны будуць ачышчаць садок ад чарвякоў. Кузьма, ідучы куды-небудзь, абы толькі ўбачыў Сцяпана Касцевіча на падворку, заўсёды зоїдзе нібы так сабе, для гутаркі, а па сутнасці, каб бліжэй паглядзець на шпакоўню. Не дае яму спакою гэтая шпакоўня! Але калі адзін раз Кузьма, прыйшоўшы дахаты, сказаў, што «ў Касцевіча ўжо выведіся шпачкі», бацька вылаяў яго і забараніў хадзіць туды.

— Глядзі, каб ён на гэтай шпакоўні чырвоны сцяг не вывесіў...— Пастукаў люлькай аб рог стала, выбіваючы попел, і загадаў: — Бяры касу і ідзі касіць пад рэчку... Ілья сёння не прыйдзе, заняты ў пана.

Гэта пра старэйшага сына, які ў графа Ельскага ўжо год як служыў лесніком.

...Сядзіць Кузьма ў капусныхградах — уцёк з хаты — і есць бручку, нарэзваючы ножыкам. Ён адчувае, як крыўда пачынае варушыцца ў яго душы ўсё мацней і мацней, як яна вырастае ў пратэст супроць бацькі, у пратэст яшчэ нясмелы, баязлівы, хісткі.

А гэты бацька сядзеў за сталом пасля ўчарашняй калатні, якую ўчыніў сам, лушчыў запаветныя зга́ралкі і думаў зусім аб іншым. Ужо год як за іконай ляжыць у скрутку летапіс, прысланы з дзяржаўнага архіва з Гродна. Гэта пазямельны летапіс аб падзеле зямлёю сялян вёскі Запалянкі пасля вызвалення ад паншчыны. Моцны дакумент! Усё там напісана — колькі было сем'яў у вёсцы ў той час, калі надзялялі зямлёю, і па колькі дзесяцін на сям'ю. Памногу тады давалі зямлі, хоць стары Нічыпар Байдак кажа, што людзі адмаўляліся шмат браць гэтай жаданай зямелькі, бо не было чым плаціць выкупаў, падаткаў і не было чым яе абрабляць. Усё роўна камісія адмервала на кожную сям'ю васемнаццаць дзесяцін самай горшай зямлі,— камяністай, пясчанай на гарах і халоднай, падзолістай у далінах. Бездапаможнасць і бядоту людзей скарыстаў свої вясковы багацей — гэта бацька Нічыпара Байдака, што адкупіўся ад пана яшчэ пры паншчыне. І вось ён абсяваў усю «лішнюю» зямлю,— тую, якую не змаглі абрабіць сяляне. Буйным багацеем быў бацька Нічыпара Байдака — абозамі адпраўляў пшаніцу ў горад, да ракі Шчара, адкуль яна і плыла або па Нёману ў Літву, або ў глыбокае Палессе па Агін-

скаму каналу. Усё гэта апісана ў летапісе збоку, у «примечании».

Мікіту падабаецца гэты летапіс, і ён сяды-тады, надумаўшыся, загадвае Кузьму ў нядзелю, каб пачытаў яго, бо сам Мікіта непісьменны, нягледзячы на тое, што пры цары шэсць год быў валасным старшынёй.

Паслухаўшы гэты незвычайны для яго летапіс, ён чмыхне ў нос і скажа:

— Вось як жылі людзі... А цяпер... на шнурках душацца...

Прыходзіў часам Нічыпар Байдак, і тады яны ўдвух успаміналі старое і складалі планы, як дабіцца таго, каб вёску Запалянку падзяліць на хутары, хоць пашчадак багатага роду, Байдак, у многім чым не згаджаўся з Мікітам. Байдак быў прыхільнікам Грамады, яе членам, у што Мікіта не верыў. Грамаду паны разбілі, але Нічыпар усё роўна чытае газеты і любіць палітычныя гутаркі, гаворыць аб беларускай дзяржаве.

— Нам трэба свая, беларуская дзяржава. Інакш нічога не будзе...

Што ўяўляў сабе Байдак пад «беларускай дзяржавай», так і заставалася нявысветленым. Адною фразай выкрываў ён разуменне сваёй дзяржавы, фразай, якая ніколі не пакідала яго: «Паны рана ці позна, а павінны ўцячы за Буг». А што павінна быць пасля ўцёкаў паноў — невядома.

— Якая табе дзяржава? Якая табе дзяржава?..— наступаў на Байдака спалоханы Мікіта.— Нашто табе веру ламаць? Што богам паложана, так яно і быць павінна... Як жылі дзяды, прадзеды...

— Якая тут табе вера? — гарачыўся Нічыпар.— Пры чым тут вера? Вер сабе ў каго хочаш. Што гэта мае да дзяржавы?

А Мікіту, хоць страляй, усё роўна свайго не дакажаш.

— Не, не, Нічыпар, не трэба веры ламаць, хай яно будзе так, як ёсць...

Байдак чухаў за вухам і смяяўся з Мікіты, як смяецца чалавек, адчуваючы сваю перавагу над субяседнікам. Але ўсё ж вабіў яго гэты архіўны летапіс, дзе ў «примечании» пісалася аб такіх людзях, якім быў яго бацька. Ад гэтага і пачыналіся бясконцыя гутаркі.

— Як звольнілі ад паншчыны, мне было адзінаццаць год,— гаварыў Нічыпар,— сям'я ў нас тады была дваццаць шэсць чалавек. Дзве дзяжы хлеба пяклі на тыдзень...

Хоць бацька і адпраўляў пшаніцу абозамі на Шчару, усё роўна хлеб пяклі з мякінай... Ха-ха-ха!..— залягаўся смехам Нічыпар,— бывала, як усадзіш зубы ў гэты хлеб, дык столькі асцюкоў паб'ецца, што ўсё роўна... што ўсё роўна... ну, як ты шчотку з'еў...

Мікіта пыхкаў люлькай, слухаў і чамусьці лічыў патрэбным прачытаць настаўленне Кузьме, які сядзеў воддаль на лаве і разглядаў нейкую кніжку.

— Вось слухай, як людзі жылі... А вам цяпер хлеб без мякіны нядобры... Пажэрліся...

А Нічыпар працягваў:

— У майго бацькі было трыццаць пар валоў, восем пар коней...— Нічыпар аж прыўстаў і памахаў пальцам,— восем малаценнікаў было настаянных, якія толькі тое і рабілі, што малацілі збожжа цапамі...

— А чым жа? Толькі цапамі,— дапамагаў у гутарцы Мікіта.

— Ого-о-о! Мой бацька...— цягнуў Нічыпар,— не паслухаць яго — смерць... Скуру здзярэ... Ад аднаго крыку майго бацькі свіння падала!..

Мікіта і тут паварочваў нос у бок Кузьмы і, нібы ўпікаючы ў чым, гаварыў:

— Вось якія людзі былі... Не вам раўня... Вам абы слова сказаў, дык вы ўжо губы крывіце... Усё вам нядобра...

Шырокі маршчыністы лоб Нічыпара аж пацеў ад асалоды. Выціраў лоб рукавом, разгладжваў доўгія сівыя вусы, над якімі звісаў востры кончык тонкага носа, і, усміхаючыся, гаварыў далей:

— Мой бацька... Ха-ха-ха... Мой бацька быў непісьменны, не ведаў, колькі ў яго грошай... Усё клаў і клаў у скарбонку і хаваў ад нас... Уся ж вёска працавала на майго бацьку... Ён жа ўсю лішнюю зямлю абрабляў, і людзі ішлі на тое, каб зямля не пуставала, не дзірванела, бо яшчэ не ў сіле былі абрабляць самі... Вось як.

— Ну, вядома, а як жа? Само ж не зробіцца... Мусіць жа нехта рукі дакладаць,— устаўляў Мікіта.

— Плаціў людзям, як хацеў,— каму больш, каму менш, а каму казаў — пачакай... Але, калі якая баба прыйдзе са слязьмі ў якой патрэбе, не адмовіць,— хоць жменю збожжа, а дасць.

Нічыпар змоўкне на момант, усміхнецца ў вусы сам сабе, апусціўшы павекі на вочы, як быццам угледзецца

ў мінулае. Потым рухава разгладзіць вусы шорсткай далоняй і, узняўшы галаву, пачне зноў:

— Мой бацька... Ха-ха! Фокуснік быў...

— Фокуснік? — здзіўляецца Мікіта.— Гм...

— Ага... Праіўдзе, бывала, па вуліцы без шапкі, у адной зрэбнай сарочцы, толькі лапці паскрыпваюць... знай, што нешта ўжо надумаў... Убачыць — сядзіць на парозе хаты жанчына і абірае бульбу... Заходзіць, вітаецца і адразу: «Чаму, Таццяна, сына не жэніш? Пара ўжо...» А тая збедніцца і кажа: «Ой, дзядзечка, няма за што жаніць...» Тады бацька вымае з кішэні пяцьдзесят рублёў і кажа: «На, жані...» Тая кідае работу і падае да ног бацькі, дзякуе...

Мікіта заёрзае на месцы, неспакойна заморгае яго вока, і буркне:

— Гм... Ну, гэта, Нічыпар, я лічу лішняе — раскідацца задарма такімі грашыма... Пяцьдзесят рублёў у той час — о-го-го... Паспрабуй, зарабі іх...

— Ну, што ты зробіш — фокус... І, вядома, спраўляюць вяселле... Першага клічуць на вяселле бацьку... Ён прыходзіць, гаспадары запрашаюць яго на покуць, пад іконы... Не, бацька не хоча ісці на покуць... Ён на запросіны заходзіць толькі ў камору, дзе падрыхтавана выпіўка і закуска для вяселля... Вып'е там...— Нічыпар аж памахае пальцам на ўзроўні галавы,— вып'е толькі адну чарачку, закусіць кавалачкам мяса, пажадае шчасця-долі маладым і бацькам і поўдзе... Вось і ўвесь фокус...

Мікіта аж не ведае, што адказаць на гэта. Шкада яму тых, так дарма кінутых бацькам Нічыпара, пяцьдзесят рублёў, але ўсё ж такі і гонар... І ўрэшце Мікіта супакойваецца на той думцы, што не дурны ж быў бацька Нічыпара, калі так рабіў... Яму гэтыя пяцьдзесят рублёў вярнуліся ўдвая... Бо як жа можа быць інакш? Задарма? Гм... не... Задарма ніхто нікога нават не пацалуе...

Так і сядзелі старыя, перагортвалі архіўны летапіс, мацалі яго пальцамі,— адзін крыху пісьменны, а другі цёмны, як ноч, для граматы, але больш адукаваны за Нічыпара, каб умець бараніць сваё багацце і багацець далей рознымі і ўсялякімі спосабамі. Мікіта смокча люльку, маўчыць, хоць мог бы расказаць, як ён, будучы валасным старшынёю пры цары, аднаго разу вёз казну ў павятовы горад і, праязджаючы праз лес, раніў сам сябе з пісталета ў нагу і вярнуўся. Сказаў людзям і земскаму начальніку, што яго абрабавалі зладзеі. Але праз год Мікіта купіў

пятнаццаць дзесяцін зямлі недалёка ад вёскі ў аднаго збяднелага шляхціца-фальваршчыка. Можна было б перасяліцца на купленую зямлю, але тут, у вёсцы, застанецца поле, раскіданае ў палосках... Усё ж такі дзесяць дзесяцін... Не выпадае... Маўчыць аб усім гэтым Мікіта, маўчыць усё жыццё. Маўчыць і Нічыпар пра тое, як ён знайшоў бацькаву скарбонку пасля яго смерці, знайшоў пад печчу, прысыпаную зямлёй. Бацька, паміраючы, не паспеў, а хутчэй за ўсё не хацеў сказаць, дзе схавана яго скарбонка,— ён з ахвотай узяў бы яе ў магілу, але ведаў, што ўсё роўна забяруць. Дык няхай шукаюць самі...

Сыны падзялілі паміж сабой грошы, зямлю, і сям'я, якую бацька трымаў, як у абцугах, распалася. Сяляне пачалі займаць свае надзелы і абрабляць іх самі. А Нічыпар, даўшы сабе волю пасля прыгнёту бацькі, загуляў... Так і прагуляў бацькаву скарбонку. Усю разнёс па корчмах. Ды прычынай напоек, відаць, было яшчэ і тое, што гаспадарка апусцела, што не змог павесці яе Нічыпар панавому. Усё штосьці не ладзілася. Паміралі дзеці. Урэшце памерла жонка, пакінуўшы аднаго сына. Так і жыве ўдаўцом Нічыпар здаўна з жанатым сынам ужо ў збядненні. Прыйшоў на старасці да думкі, што патрэбна беларуская дзяржава, што як быццам у ёй увесь ратунак. І некалі ў гутарцы з Андрэем казаў:

— Чаму ж нам не мець сваёй дзяржавы?

Калі ж Андрэй тлумачыў, што за мяжою ёсць беларуская дзяржава, Нічыпар адказваў:

— Я ведаю, што там ёсць, ды тут няма!.. Трэба ўсю Беларусь у адно... А то зрабілі ліха ведае што — адны там, другія тут...

Мікіта тарочыў сваё: «Нам трэба хутары, кожны сам сабе...» Калі ж умяшаўся ў гутарку Кузьма, сказаўшы, што «вунь Сцяпан Касцевіч вычытаў у газеце, што ў Расіі ўжо няма палосак, што там ужо калектывы парабілі, уся зямля ў адно, усе супольна яе абрабляюць і жывуць», Мікіта аж падскочыў і не крыкнуў на Кузьму, як звычайна, а гаўкнуў:

— А ты там быў? Бачыў? Слухай балбатню... Вунь пан граф казаў мне, што там і жонкі супольныя. Начытае табе Касцевіч... А пра шпакоўні ён нічога не вычытаў?

— Зноў шпакоўні...— мармытнуў абураны Кузьма.

— Чаго ты на яго крычыш? — заступаўся за Кузьму Нічыпар.— Я і сам чытаў пра гэтыя калектывы...

— Гэта не для нас з табою, няхай галадранцы робяць

сабе калектыў, я на іх працаваць не пайду... Вось тут у дакуменце ўсё напісана, што каму паложана... Закон — святое дзела...

І Мікіта тыцкаў пальцам у архіўны летапіс.

Каб разагнаць непрыемны настрой, які выклікаў Кузьма сваёй заўвагай пра калектывы, Мікіта выйшаў у каморку і хутка прынёс адтуль бутэльку гарэлкі і кавалак кумпяка. Гарэлка ў Мікіты амаль заўсёды была напагатове — розпае ж начальства прыязджае і, можна сказаць, не мінае Мікіты. Трэба ж частаваць — гэта не прападзе, пойдзе на карысць. Вось нядаўна прыязджаў зямельны начальнік — «земскі комісаж», як кажуць паны, абмяркоўваць справы хутароў і быў вельмі здаволены пачастункам, вельмі дзякаваў і казаў, што ў вёсцы няма лепшага, прыстойнага гаспадара за Мікіту. Калі ў адносінах да сваёй сям'і Мікіта трымаў сябе, як воўк, дык да «комісажа» і наогул да начальства быў такім ліслівым, увесь час згінаў сваю шырокую спіну ў паклоне, што, здавалася, яна ў яго патрэсквала.

У асобе Нічыпара Байдака Мікіта адчуваў хісткага чалавека якога можна на тое-сёе выкарыстаць у вясковых справах. Ведаў Мікіта, як і ўсе ў вёсцы, што Нічыпар любіць весці з сялянамі палітычныя гутаркі. Няхай вып'е чарку Нічыпар, лепш будзе ўвіхацца, бо тут, здаецца, з гэтымі хутарамі не так лёгка будзе, як думаецца. Вось вярнуўся з турмы гаварун Дзям'ян Гарагляд...

Так і канчалі часам старыя гутарку чаркай, ад якой Нічыпар як на свет нараджаўся. А Мікіта выпіваў адну чарку, ад сілы дзве, прагна сачыў вачыма, як лілася гарэлка ў чарку — баяўся, каб не пераліць, а калі выпіваў, дык з яго горла вырываўся такі гук, быццам дзе за сцяною рохкала свіння. Кузьма ў такіх выпадках знікаў з хаты. І цяпер толькі падняўся, каб выйсці, як у шыбіне паказаўся дзіцячы твар з апаленымі сонцам валасамі. Хлопчык крыкнуў: «Кузьма! А ў Касцевічаў ужо маладыя шпакі лётаюць!» Мікіта, пачырванеўшы раптам, не ведаў, што рабіць. Заёрзаў на месцы, а затым крыкнуў у акно: «Пайшоў вон, смаркач!» Агляпуўся — Кузьмы ўжо ў хаце не было.

— Каб яны яму павыздыхалі, гэтыя шпакі!.. От, прыпада...

— Шпакі... гэта — пустое... Ну што ж, пагляДзяць і пойдуць...— гаварыў Нічыпар.

— Не, гэта не пустое,— адказваў Мікіта,— гэтыя шпакі яшчэ наробяць...

А па падворку Сцяпана Касцевіча ў гэты нядзельны час сабралася шмат моладзі і пажылых людзей — мужчын і жанчын. На прызбе сядзеў сам Сцяпан, а побач Дзям'ян Гарагляд. Усе слухалі расказ Дзям'яна пра турму, пра барацьбу, пра ашуканства паноў і пра тое, што, «можна сказаць, хутка будуць перамены». На садку ж ляталі, увіхаліся над шпакоўняй маладыя шпачкі. Хлопцы, слухаючы Дзям'яна, не раз паварочваліся да садка, каб усміхнуцца ім.

* * *

Сонца хілілася ўжо к заходу над узгорыстымі жытнімі палямі, калі малады хлопец з клункам за плячыма, апіраючыся на кій, шпарка звярнуў са шляху на глухую палявую дарогу. Дарога ішла ў сасновы лясок і потым неўзабаве выбягала на палявыя прасторы. Вось і гара ўжо недалёка, а на ёй — сосны. Яны ўвесь час былі арыенцірам для хлопца. Прахожыя так і казалі яму, калі сустракаліся: «Трымай вока вунь на тыя сосны — там і ёсць вёска Запалянка». Так і ішоў хлопец, не спускаючы з вачэй далёкіх соснаў, якія верхавінамі, здаецца, танулі ў сінява. Урэшце яны ўжо блізка. Воддаль ад дарогі, налева — хутар. Пацямнелая ад часу хата хаваецца ў садку. Пры дарозе стаіць Анупрэй Чарняк, папыхвае люлькай і задуменным позіркам паводзіць па маляўнічых палях.

— Добры дзень, дзядзька! — прывітаўся хлопец.

— Добры дзень, хлопча,— тонам прыхільнасці адказаў Анупрэй Чарняк.

— Ці не скажаце мне, як знайсці хату Касцевіча?

Анупрэй выняў з рота цыбук і мокрым канцом яго разгладзіў вусы. З момант глядзеў на хлопца. Нешта жывое бліснула ў вачах.

— Касцевіча? — перапытаў Анупрэй.— Яго хата пасярэдзіне сяла... Як будзеш ісці, прыкмячай,— на грушы шпакі... Тарчыць шпакоўня... Больш ні ў кога няма шпакоў у сяле, толькі ў Касцевіча... Туды і заходзь... А адкуль будзеш?

— Здалёк... Дзякую, дзядзька,— сказаў хлопец адыходзячы.

Гэта быў Макар Краўчук.

Анупрэй глянуў яму ўслед і ўжо крыкнуў:

— Шукай шпакоўні... Бо толькі ў яго аднаго ў сяле шпакі... на грушы шпакі...

## ВАЖНАЕ ДАРУЧЭННЕ

Вось і гумно, адна з мясцін на роднай сялібе, якая заўсёды ўспамінаецца з прыемнасцю. Гумно старэнькае, асеўшае падрубамі ў зямлю, ужо крыху пахілае. Бацька надпёр шулы надпорамі. Пад бокам мяккае сена. Яго пах, змешаны з пахам жытняй саломы, напаўняе бадзёрасцю, нават радасцю, што хочацца хутчэй устаць і ісці ў бясконцыя, ззяючыя ў сонцы палі і лугі, хапіцца за плуг або за касу і там, пад павіслы ў нябесцай сіняве несціханы туркат жаваранкаў і шчэбет іншых птушак, на поўныя грудзі адчуць, што свет прыгожы, што варта ў ім жыць, штосьці любіць, шкадаваць і штосьці ненавідзець.

Андрэй ляжыць на сене, падклаўшы рукі пад галаву, і пасля сну аглядае саламянае скляпенне гумна. Якраз насупраць, на лаце, угары сядзяць у гняздзечку чатыры маладыя ластаўкі. Белагрудачкі сядзяць, прытуліўшыся адна да другой, так ціха, паважна, быццам яны ўпэўнены ў тым, што нішто не парушыць іх мілага спакою, іх птушынага маленства. Сядзяць яны, як тыя дзяўчаты-прыгажуні дзе-небудзь на плоце ў святочны дзень. А вакол іх шнуруе ластаўка-маці, пашчабеча і ляціць на двор, хутка вяртаецца і садзіцца з кдапатлівым шчэбетам на гняздзечка да сваіх малянят. Пачастуе іх са сваёй дзюбкі і зноў ляціць. А птушаняты зноў сядзяць ціха, скупіўшыся радочкам, свецяць белымі грудкамі, чакаюць новага прылёту сваёй маці. Усё гэта выглядае, як святая ідылія. А тут яшчэ бацька зрабіў новую ўцеху — шпакоўню. Сонечныя праменні відаць у залатым пылку. На дварэ ранак, відаць, багаты сонцам і росамі. Чуюцца галасы дзяцей. Напэўна, прыйшлі глядзець на шпакоў. У Западлянцы ніколі, колькі яна існуе, ніхто не меў шпакоўні. Бацька прынёс гэтую задуму з далёкіх расійскіх дарог, дзе бачыў іншае жыццё, іншы дастатак, чым дома. Пастарэў бацька за гэты час, пасівеў, цяжкі позірк застыў у стомленых вачах, не голіцца тыднямі, і шчаціною абрастаюць шчокі. Тая самая адзежына, што на будні, тое і ў святы. Поўзае каленямі па гэтай дзедаўскай зямлі, напінаецца за плугам, спатыкаецца за бараною. Вядома, ста-

расцца на сякі-такі кавалак хлеба, але весялосці ўсё няма і няма... Нешта звязана, нешта зблытана, і ніяк не звядзеш канцы з канцамі. Прадаў парсюка, каб аплаціць падаткі, ды яго не хапіла — трэба было прадаваць цялё, два пуды жыта з апошніх чатырох. З двума пудамі трэба будзе пражыць лета, да новага хлеба. А зборшчыкі падаткаў — секвестратары — усё ідуць і ідуць, амаль кожны дзень. Цяпер іх пара — усіх маладых людзей перасаджалі ў турмы, і няма каму падняць народ на адпор, як гэта было не так даўно. А тут яшчэ і месяца няма, як памерла дачка, якой ужо было пятнаццаць год,— памерла на тыя раптоўныя сухоты, якія завуцца гарлавымі. Паспела яшчэ даткаць Андрэю пояс, ужо хварэючы. І ломіць рукі Кацярына, усё яшчэ не можа выплакаць жалю: «І дзе ж яна іх набралася. Увесь час была здаровая... Гэта ж нейкая напасць...» А вось і вярнуўся сын з турмы, пад нагляд паліцыі... Ногі яшчэ як след не адышлі ад пухляціны пасля турэмнай галадоўкі. Кажуць Андрэю: «Вылежвайся». А ён і не думае. Ды як тут вылежвацца? Не разумеюць бацькі таго гаручага згустка ў душы, які ніколі не патухае, які не дае сядзець, маўчаць, а наадварот — падмывае.

Вось і цяпер прачнуўся ў гумне і ўздыхнуў з палёгкай, убачыўшы, што яго акружае не тая рэчаіснасць, якая мучыла ў сне. А ў сне ён бачыў па падлозе, па сеніках рады згаладалых людзей з завостранымі рысамі твару. І гэты свіст вады... фантаны вады праз краты... Па камерах барыкады... І гнеўная складка застыла на светлым чале Маркса, калі ён глядзеў са сцяны з партрэта на хвалі вады на падлозе, якая пачала ўжо выліванца за парог... А фантаны ўсё ліліся і ліліся... І Андрэю ў сне здалося, што вада ўжо не выліваецца за парог, а ўсё падымаецца і падымаецца... Вось даходзіць да шыі, душыць... Толькі гнеўная маршчына Маркса перад вачыма, як подых яшчэ далёкай, магутнай буры...

Андрэй лыпнуў вачыма і нейкі час не мог здагадацца, дзе ён і што з ім. Памацаў сена навокал, выцер пот з ілба і толькі, калі ўбачыў чатыры ластаўкі-белагрудачкі, прыйшоў да прытомнасці.

І ніць успамінаў пра нядаўняе пацягнулася сама сабою.

...У катле крочаць парамі зняволеныя з чырвонымі сцяжкамі на грудзях. Крочаць у нагу. Урачыстае маўчанне... Цішыня наважная, напружаная... Грук-грук, грук-

грук,— выразна адбіваюць крокі. Усе чакаюць знаку для мітынгу. Знак павінен даць Паддубны з акна сваёй камеры, бо адміністрацыя падзяліла палітзняволеных на дзве прагулкі, і першая група ўжо адмітынгавала. Урэшце з вуглавога акна, што ля самага касцёла, далятае рэзкае, загаднае: «У круг!» І адтуль, з вышыні, узмах сціснутага кулака, высунутага праз краты,— кулака Паддубнага. Словы пачалі падаць, як камені...

Пасля прамовы — лозунгі і спяванне «Інтэрнацыянала». І тады начальнік Капяўскі, за ім Кручоны і цэлая чарада малодшых і наглядчыкаў вывалілася з дзвярэй на пляц. Бліснулі какарды, гузікі, шаблі. Начальнік — высокі, плячысты, з чырвоным каркам, паводзіць сябе так, як быццам пазіруе перад кім. Па звычцы трымаецца правай рукою за борт мундзіра на грудзях. «Прашу стаць!.. Прашу стаць!» — гаворыць ён, але двойкі ідуць і ідуць, не сцішаючы кроку. «Прашу стаць!» — трэці раз крыкнуў Капяўскі, і тады наглядчык лёгенька спыніў рукою першую пару. Пары пачалі звівацца, як гармонік, і спыніліся. «Калі сказаў — «стаць», то павінны стаць,— пачаў Капяўскі,— павінны мець настолькі павагі, каб стаць... Тое, што вы спявалі, вы ўжо гэтым парушылі турэмны рэгламент... Паколькі Першы май ёсць свята гістарычнае, за яго святкаванне караць не буду... Караць не буду ў тым выпадку, калі не будзеце больш спяваць... Да пабачэння... Можаце хадзіць...» І начальнік Капяўскі спрытна адсалютаваў, павярнуўся на адной назе і пайшоў у дзверы, а за ім і ўся яго чарада. Ну, што хочаце,— рыцар, дый годзе, гэты начальнік. Прыйшоў, бліснуў зброяй, словамі і пайшоў, пакінуўшы ўражанне памяркоўнасці, лібералізму, падсвежанага каштоўнай парфумай. Хлопцы пакрочылі далей. Не паспелі прайсці па кругу, як прагулачны наглядчык загадаў заходзіць у камеры. Пры ўваходзе ў дзверы — невялікі цёмны калідор, прайшоўшы які трэба падымацца па сходках, каб выйсці на калідор светлы. Хлопцы ідуць праз гэтае сутарэнне парамі, нічога не бачаць ні перад сабою, ні навокал. І тут пачалося нечаканае. Хлопцы адчулі ўдары кулакоў. Усё змяшалася ў цемры. Кулакі ад сцен падалі ўжо дзе папала — па галовах, па спінах, пушчаны ў ход ногі, і цяжкія боты штурхалі з размаху. Нехта крыкнуў: «Б'юць!» Нехта намацаў пры сцяне наглядчыка і схапіў яго за горла. Наглядчык маўчаў як вады ў рот набраўшы, не падаў ніводнага слова. Гарачае сапенне напоўніла цёмны калідор. Урэшце

хлопцы прарваліся, прайшлі праз гэтую засаду. Андрэй выйшаў на святло і заўважыў, што ў яго з носа цячэ кроў. Кашуля на грудзях апырскана ёю. Гэта быў адзін такі ўдар, ад якога Андрэй выцяўся тварам аб сцяну. Ну што ж — Першы май, зарабіць такое не грэх... Але... вось вам, хлопцы, ліберальныя штучкі начальніка Каняўскага. Пазнавайце вантробу лібералізму, які расчышчае дарогу фашызму! Нехта крыкнуў, калі выйшлі на светлы калідор: «Вось вам гістарычнае свята!»

Кашуля Андрэя была перададзена патрыярху Зайчыку, старасту палітзняволеных. Ён назаўтра запісаўся да начальніка на прыём, каб паказаць яе. Каняўскі ў прыёме адмовіў. Усе зразумелі, што пачынаецца наступленне. Адбываўся судовы працэс групы Райскага (рэдактара часопіса «Астрожныя думкі»), і групу не павялі на суд пехатой, як гэта рабілася дагэтуль, а на турэмны двор заехала чорная калымага — штосьці падобнае на вагончык з адным акенцам у кратах у задняй сцяне. Пад'ехала і стала перад вокнамі камер палітзняволеных. Палітзняволеныя сустрэлі гэтую «карэту» крыкамі пратэсту. Тры дні не спыняліся крыкі, і тры дні наглядчыкі не змаглі ўзяць хлопцаў і пасадзіць у калымагу. Урэшце прыйшла на дапамогу паліцыя з горада, і тады дакапалі... Хлопцаў, падрапаных, у падраных кашулях выцягнулі з турмы і запхалі ў злавесны вагончык, які сваёй чорнай афарбоўкай нагадваў катафалк. Не даспадобы, вядома, было панам, калі камуністы хадзілі на суд пехатой,— скаваныя, пад канвоем, ішлі знарок павольна, каб даўжэй пабыць на вуліцы, а за імі збіраліся натоўпы і праводзілі аж да будынка суда. Насустрач адчыняліся вокны ў дамах, і адтуль высоўваліся твары і таксама прагна праводзілі вачыма. Вяртаючыся з суда, хлопцы спявалі «Інтэрнацыянал» і кідалі лозунгі... Не даспадобы гэта было панам. І вось выдумалі калымагу. За крыкі супроць калымагі «ліберал» Каняўскі забараніў газеты, адабраў кнігі на невядомы тэрмін. Бібліятэчныя паліцы ў камеры апусцелі. Не прыняў і старасту. Не прыйшоў і пракурор, нягледзячы на патрабаванні. Прагулка і далей адбывалася ўжо дзвюма групамі. Не выходзілі некалькі разоў на прагулку, некалькі разоў не бралі вячэры, усё патрабуючы пракурора. Нешта задумалі паны,— пэйпачай, каб адзначыць гадавіну майскага перавароту Пілсудскага. Урэшце была скарочана прагулка на адну гадзіну, і тады прыйшоў пракурор. Ён заявіў, што кнігі і газеты будуць вернуты праз

месяц, што прагулка застанецца толькі адну гадзіну, бо «вы, камуністы, мітынгуеце, канферуеце,— тут ёсць турма, а не Саўдэпія». Прадстаўніцтва палітзняволеных у асобе старасты было скасавана. Назаўтра пачалася галадоўка.

На чацвёрты дзень галадоўкі зноў прыйшоў пракурор і пацвердзіў ранейшае, што ніякіх уступак не будзе. Палітзняволеныя пачалі барыкадзіраваць дзверы, скарыстаўшы для гэтага нары і лавы. Вось тады і прыехала пажарная каманда з кішкамі і помпамі.

...Не разумеюць бацькі гэтага агню ў грудзях. Нічога, бацькі, яшчэ зразумееце, што не можа быць інакш. Бацька ў глыбіні душы адчувае па-свойму, перажывае ўсё, што робіцца навокал яго. Але як жа яму ісці разам з сынам? У бацькі ўсе клопаты накіраваны на тое, каб сяк-так утрымаць гаспадарку, на якой ён так здаўна думаў пажыць спакойна, па-людску. А тут якраз спакою і няма. Амаль кожны дзень новыя клопаты. Ці пройдзе паліцыянт па вуліцы, ці секвестратар, ці прыедзе сам войт,— чакай такога, чаго ты павінен баяцца. Усё бойся і бойся,— няхай яно згарыць,— калі ж гэта чалавек будзе жыць без боязі, каб навокал былі людзі, якім ты верыш, што яны не ворагі, а свае? І бацька стаў больш задуменны і ціхі. Нешта збіраецца ў яго душы. Ці вытрымае ён гэты цяжар? Аднак, нягледзячы ні на што, руплівасць не пакідае яго. У гумне, на таку, стаяць прыпёртыя да сцяны новыя рамкі, а побач — невялічкі пчаліны домік, амаль гатовы. Бацька марыць завесці пасечку — зрабіў першы вулей. Здзівіўся Андрэй, калі на другі дзень пасля прыходу з турмы, перабіраючы кніжкі, убачыў, што кніжка Якуба Коласа «Вершы і паэмы» ў многіх месцах перакладзена пасачкамі паперы і высахлымі кветкамі.

— Не чапай, не чапай,— няхай так ляжыць. Гэта я часам чытаю...— сказаў бацька.

А гэтыя закладкі найбольш прыпадаюць на паэму «Новая зямля».

— Вось гэта штука ўдалая... А!..— крэкнуў бацька. Андрэй глянуў на першую старонку «Новай зямлі» і прачытаў услых падкрэсленыя алоўкам радкі:

Вясна, вясна, не для мяне ты,
Не я, табою абагрэты,
Прыход твой радасны спаткаю,—
Цябе навек, вясна, хаваю...

— Як быццам з душы ён выняў гэтыя словы, гэты Якуб Колас,— кажа бацька, паслухаўшы.— Адкуль ён? Ці жыве цяпер?

— Жывы, а як жа... Жыве ў Мінску...

— Ах, вось чалавек, вось розум... Дай яму, божа, здароўя... Не кладзі туды ў кучу... Дай сюды... Я пакладу яе асобна, а то яшчэ дзе заваліцца, і потым шукай...

Бацька бярэ кніжку, пукатую ад закладак, глядзіць з момант на партрэт Коласа на вокладцы — у капелюшы, з вусікамі пад доўгім сялянскім носам,— адчыняе скрыню і кладзе паверх, на адзежу.

«Знайшоў сябе бацька ў паэме,— думае Андрэй,— і гэтыя ластаўкі таксама яго, і шпакі... і жаваранкі ў полі...»

Андрэй паварушыў нагамі, адчуў, што яны яшчэ пабольваюць. Толькі два дні пабыў пасля звароту з турмы, не даў нават паглядзець па сябе бацькам і наогул аднавяскоўцам і паехаў... Куды? Паехаў аж у Беласток шукаць Санкоўскага. Як жа добра было б зрабіць гэта па дарозе з турмы. Ды так яно і думалася, але дзе там? Чалавек думае па-свойму, а паны маюць клопат перашкодзіць намерам. Андрэя канваіравала паліцыя з самай турмы, перадавала з этапу на этап — аж да свайго глушэцкага пастарунка. Усміхнуўся Андрэй, успамінаючы, як ішоў з паліцыянтам са станцыі ў Глушэц. Праходзячы па дарозе цераз вёску, зайшлі, па просьбе Андрэя, у адну з крайніх хат папрасіць паесці. Як жа клапацілася маладая гаспадыня, ды і сам гаспадар не адставаў, каб як найлепш дагадзіць Андрэю. У гаспадыні набеглі слёзы на вочы, і кінулася яна да печы: «Можа, капусты наліць — будзеце есці?» Была і капуста, а потым малако з тварагом. На паліцыянта старалася не глядзець, праслізне па ім вачыма, а потым зробіць такі выгляд, быццам гэтага паліцыянта і ў хаце няма. Утаропіць у Андрэя ўвесь свой позірк, поўны ўнутранай тугі і пашаны. Паліцыянт думаў, што гаспадыня за кампанію, так сказаць, пачастуе і яго. Не дачакаўся. Ужо і прыдобрывацца пачаў, каб гаспадыня змяніла гнеў на літасць,— усё роўна нічога не дабіўся.

— За вас жа цярпеў чалавек, добра яго пачастуйце,— нават на такія словы кінуўся паліцыянт, хочучы давесці, што і ён спачувае народу.

Нічога не дапамагло, гаспадыня як быццам і не чула яго слоў. Толькі прыспешвала Андрэя: «Ешце, ешце, я яшчэ падалью... Вядома, у турме не соладка...»

Аж нялоўка рабілася Андрэю за паліцыянта, які круціўся на лаве, курыў, паглядаў у акно, не ведаў, куды сябе дзець. Мусіць, пах капусты моцна казытаў паліцыянту ў носе, бо ён урэшце не вытрымаў — дастаў са сваёй торбы бутэльку малака, кавалачак хлеба, прысунуўся да стала і пачаў есці. Гаспадыня толькі скоса зірнула на яго і сціснула губы. Андрэй кінуў словы, якіх, здаецца, чакалі гаспадары:

— Што — Грамады ўжо няма ці яшчэ, можа, дзе засталіся гурткі?

Гаспадыня з балючай грымасай на твары махнула рукою і адказала:

— Дзе там, саколік, засталіся?.. Ні адненькага няма... набралі...

І змоўкла. Спыніла паток слоў, якія прасіліся з вуснаў.

— Няма-а-а...— працягнуў гаспадар, які сядзеў на лаве воддаль з апушчанай галавою. І гэтае «няма» прагучала, як набалелы стогн. Маладыя гаспадары шмат чаго расказалі б Андрэю, ды вось сядзіць у гузіках панскі слуга, сядзіць, як тая скула, п'е з бутэлькі сваё малако (гаспадыня і кубка не дала) і вінтоўку трымае між кален. І ў хаце стала ціха і цяжка.

«Так, ціха і цяжка стала па ўсёй зямлі»,— думае Андрэй. Нават у пралетарскім Беластоку пасля масавых арыштаў, пры разгроме Грамады, не мог не заўважыць ён трывогі на тварах рабочых. Некаторыя гаварылі аб люксембургізме, які меў яшчэ ўплыў сярод рабочых у Беластоку, аб тым, што нельга недаацэньваць нацыянальна-вызваленчага руху. Успаміналі аб традыцыях СДКПЛ [1]. Усё гэта было адказам на нацыянал-шавіністычную балбатню ППС, уплывы якой у прафсаюзах немалыя. Крытыкавалі, хвацка высмейвалі рабочыя нейкіх путкаў, пужакаў, бавэлкаў — важакоў з ППС.

— У чым жа справа? — пытаўся Андрэй.— Чаму ж іх не выкрываць?

Рабочыя шматзначна ўсміхаліся, пераглядваліся і казалі:

— Выкрываем, наколькі можам... Але за іх плячыма стаіць дэфензіва... Вось што!.. Нам трэба ўзмацняць сваю чырвоную апазіцыю ў прафсаюзах, а гэта не так лёгка... Нас меншасць у прафсаюзах...

Андрэй паехаў у Беласток выконваць даручэнне ту-

---

[1] СДКПЛ — Сацыял-дэмакратычная партыя Польшчы і Літвы.

рэмнага парткома — перадаць Беластоцкаму АК, каб прасачылі за дзейнасцю нейкага Карэльчука — сакратара АК камсамола, які падазраваецца як правакатар. Парвалася сувязь вязняў з воляй з прычыны правалаў — масавых арыштаў. Магчыма, што шпікі сядзяць на канспіратыўных кватэрах. Весткі аб Карэльчуку перадала парткому Соня Качаноўская, тая Соня, якую некалі сустрэў таварыш Васіль, ідучы пад канвоем. Партком стаў перад задачай, як жа перадаць такую вестку ў Беластоцкі АК? Тады Андрэй успомніў пра Санкоўскага. Ведаў, што ён працуе там недзе на лесапільні. Паколькі вызвалілі Дзям'яна Гарагляда, Кананца і іншых хлопцаў з другіх паветаў, Паддубны сказаў Андрэю:

— Магчыма, вызваляць і цябе... Паны, відаць, па горла сыты судовымі працэсамі... Думаюць зрабіць разрадку, хочуць часова спыніць фабрыкацыю спраў... Бо яны, напэўна, не маюць дастаткова матэрыялаў, каб судзіць арганізатараў нашай дэманстрацыі. Гэта было відаць тады па іх разгубленасці, паніцы... Так што можна чакаць, што цябе вызваляць. Май гэта на ўвазе. І калі мы не знойдзем кім перадаць аб Карэльчуку, ты пашукаеш гэтага нашага даўняга знаёмага Санкоўскага...

Трэба было пажыць два дні дома і ехаць у Беласток. Бацьку сказаў, што ў этапным астрозе, іменна ў Беластоку, забыўся плашч, падарунак таварыша ў турме. Бацька паглядзеў у вочы Андрэю і пакруціў галавою, кажучы:

— Ці варта па яго ехаць? Дзе ты яго знойдзеш?

— А можа, знайду? Добры плашч...

Бацька вытрас з кашалька пяць злотых на дарогу, і Андрэй паехаў. Каб зберагчы грошы, дзесяткі кіламетраў дарогі адмераў сваімі нагамі. Дома ж будуць пытацца людзі, а можа, і паліцыя,— куды паехаў і па што, і таму Андрэй, для адводу вачэй, прыехаўшы ў Беласток, зайшоў у каравульнае памяшканне этапнага астрога і запытаўся аб плашчы, якога яму ў турме ніхто не даваў. Дзяжурны паліцыянт адказаў, што не было ніякага плашча, што, відаць, «пан пакінуў у другім месцы». Ну што ж, больш нічога не трэба — працэдура зроблена, можна больш спакойна ехаць за горад.

Доўга Андрэй прыглядаўся ля вакзала да людзей, у каго б запытацца, як далёка за горадам лесапільня. А людзей тоўпіцца, праходзіць шмат, і ўсё найбольш у капелюшах, у новых кепках, плашчах. Нідзе не відаць рабочага чалавека. Вось ідзе ўперавалку стары чыгуначнік з ліхта-

ром у руцэ, напэўна, стомлены, бо ледзь пераствўляе ногі. Андрэй звярнуўся да яго. Той і растлумачыў, колькі лесапільняў ёсць у Беластоку, што яны недалёка за горадам, і сказаў нумар аўтобуса.

...Няўклюдны, пукаты, шэры касцёл, быццам абліты тлушчам і абчэсаны сякерай, потым другі касцёл з чырвонай цэглы, размаляваныя вітрыны, шыльды магазінаў, бакавыя, брудныя, вузенькія і заўсёды цёмныя вулачкі, а там — запляснелыя хібаркі, налепленыя адна на адну,— гнёзды гарадской беднаты; прыплюснутыя купалы сінагог...— усё гэта прамільгнула за вокнамі аўтобуса. А над усім гэтым бязладдзем бляскаў і змрокаў пануюць, узвышаюцца фабрычныя коміны. Іх цэлы лес. І чорныя, як сажа, дымы доўгімі палосамі плывуць і плывуць у паднябессі. Пышны палац колішняга магната графа Браніцкага, з паркам навокал, не прыцягваў сюды феадальнай знаці, бо панамі горада былі ўжо буржуа. У палацы Браніцкага знаходзіцца цяпер Urząd wojewódzki[1]. Браніцкіх, якія некалі жылі з пышнасцю двара французскіх Людовікаў, ужо няма — сышлі з арэны навечна. Затое іх пераймаюць у формах і нянавісці да смердаў цяперашнія заправілы — ваяводы, старосты і іншыя — стаўленікі езуіта-самадура, палітычнага разбойніка Пілсудскага. Але Беласток — горад не толькі прамыслоўцаў і купцоў; Беласток — горад пралетарыяту, слаўнага сваімі рэвалюцыйнымі традыцыямі, барыкаднымі баямі. І панам не сагнуць пралетарыят, як гэта рабілі іх папярэднікі з хлопамі. Ведаюць гэта паны, і таму ППС, Бунд — іх адзіны ратунак. Сярод іх пітомнікі правакатараў, шпікоў, даносчыкаў — падкупленых кар'ерыстаў-дэмагогаў і, што самае небяспечнае,— прыкрытых рэвалюцыйным сцягам. Дэфензіва тут мае нялёгкую работу, каб правесці ў жыццё вядомую формулу: «Мякка слаць, каб было жорстка спаць».

...Неяк раптам знікла з вуліц люднасць — перасталі мільгаць праз акно аўтобуса капелюшы, плашчы, перасталі калыхацца рознакаляровыя парасоны над галовамі паняў. І шум, сярод якога востра цокаюць капыты коней рамізнікаў, застаўся недзе быццам у нізіне. Пачаліся асабнячкі ў садках, у бярозах. Вузкія тратуары, крапіва ля платоў. Ускраіна... Але след бязладдзя, неўпарадкаванасці відаць і тут. Урэшце знік і брук. Паказаліся домікі і хібаркі, мурава на вуліцах,— пачаўся пасёлак рабочых, не-

[1] Ваяводскае ўпраўленне.

раважна беластоцкіх ткачоў, старажылаў горада. У цэнтры жыве буржуазія — прамыслоўцы, гандляры розных рангаў. Праз некалькі кварталаў адгэтуль жывуць паўперы, анучная бедната, скінутая на сацыяльнае дно. Яна будуе сабе шалашыкі з дошак, заржавелай бляхі не толькі ў сутарэннях, аслізлых ад памыяў падворках, але нават і на дахах пізкіх гаспадарчых прыбудовак. Ткачы — аснова беластоцкага пралетарыяту, багатага вытворчымі традыцыямі, вопытам працы і барацьбы.

«Тут барацьба не сціхае ні на хвіліну»,— падумаў Андрэй, калі выйшаў з аўтобуса на апошнім прыпынку і глянуў на лес комінаў удалечыні. Андрэй пайшоў звычайнай палявой дарогай. Хутка бліснула рэчка ў нізіне, а над ёю працягнулася шэрая драўляная навала баракаў, хатак-шалашоў, ярусаў, бярвенняў, дошак. Сярод гэтага як быццам выпадковага паселішча ўзвышаўся чорны комін, які падтрымліваўся дратамі, падобнымі на павучыныя ніці. Звычайная, знаёмая карціна лесапільні. За лесапільняй узгорак, за якім і схавалася рэчка на павароце. Андрэй перайшоў вузкакалейку, якая цягнулася ў напрамку горада, і ўвайшоў у гэтую драўляную неразбярыху. Насустрач з-за ярусаў вынырнула цёмна-русая, маладая, невысокая жанчына з бярэмцам трэсак на левай руцэ. Убачыўшы чалавека, спынілася. Ідзе ж нехта незнаёмы. Яна не зводзіла вачэй і глядзела на яго і тады, калі ён стаў перад ёю. Цёмна-шэрыя вочы яе як быццам прапізвалі Андрэя. Яна і паказала яму кватэру Санкоўскага.

— Ідзіце за мною...— сказала жанчына.

Ідучы, гаварыла, што Санкоўскі на рабоце, што хутка прыйдзе на абед і што дома ёсць яго жонка, «яна вам усё раскажа».

«Жонка? — здзівіўся сам сабе Андрэй.— Вось нечаканае дасягненне... Цікава...»

Хутка падышлі да невялікай халупкі, пабудаванай з аполкаў. У халупцы было двое ўваходных дзвярэй. Ля адных маладзіца спынілася і паказала на суседнія дзверы.

— Вось іх кватэра... Мы жывём разам, пад адной страхой... Гэта нашы мужы пабудавалі такі палац... Заходзьце ў тыя дзверы,— тлумачыла па-беларуску маладзіца.

Андрэй падзякаваў і штурхнуў рукою негабляваныя дзверы. У невялічкіх сенцах на лаўцы стаялі дзве каструлі, вядро з вадою, а на сцяне ў паўзмроку віселі нейкія торбы — не то са збожжам, не то з чым іншым. У самым

кутку стаяла піла. Андрэй пастукаў у наступныя дзверцы, ababітыя рагожай.

— Прошэ,— адказаў жаночы голас. Андрэй увайшоў. На яго глянуў крыху змяты, але малады і зычлівы твар з чыстымі, як шкло, шэрымі, амаль блакітнымі, вачыма. Русаватыя вейкі апусціліся над імі. Твар жанчыны з зычлівага раптам ператварыўся ў востра-насцярожаны — яна пяйначай спадзявалася сустрэць знаёмага чалавека, а тут — нечакана...

— Добры дзень,— прывітаўся Андрэй і адным позіркам акінуў памяшканне — невялічкае, абмазанае глінай, пабеленае, з печкай-плітой з левага боку, з засланым самаробным ложкам ля сцяны. Насупраць, пры адзіным акенцы, стаяў столік, засланы нейкай белай тканінай.

— Дзень добры,— жвава адказала жанчына, адначасова хуценька папраўляючы валасы на галаве. Яна выглядала яўна заклапочанай, усхваляванай. Лёгкая чырвань, якая выступіла на шчоках, прыхарошыла, здаецца, не толькі твар, але і ўсю яе тонклявую постаць у цёмным паднашаным адзенні.

— Я, здаецца, трапіў да Вацлава Санкоўскага? — сказаў Андрэй.

— Так, ён жыве тут,— адказала гаспадыня неяк халаднавата, з яўна польскім акцэнтам.

«Пільнасць, пільнасць, усюды пільнасць...» — прамільгнула ў галаве Андрэя.

— Цо пан собе жычы? Прошэ сядаць,— схамянулася маладзіца і паставіла табурэтку ля стала.

— Вы яго жонка?

Яна зноў неспакойна заморгала вачыма і тут жа ўсміхнулася.

— Так... пажаніліся мы нядаўна...

Андрэй, як мог, найкарацей расказаў пра сваё знаёмства з Санкоўскім. А гаспадыня ўсё раз-пораз паўтарала дыпламатычна: «Ах, вось як... Вось яно што...» Андрэй зразумеў, што яна яму да канца не паверыла. «Пільнасць, пільнасць, усюды пільнасць...» — гучала ў галаве.

— Ён зараз прыйдзе... На абед... Працуе пры машыне, качагарам...

Андрэй папрасіў дазволу закурыць.

— Прошэ, бардзо прошэ...— адказала жанчына і ў момант зняла з палічкі шкляную попельнічку і паставіла на стол.

— Хто вам паказаў нашу кватэру?

— Вось... ваша суседка...

— А-а-а... Марыля...

— Вы трохі пасядзіце, а я збегаю на завод... Прашу прабачыць...

Яна накінула шэрую хустку ў чорных гарошынках і выйшла, сказаўшы: «Не сумуйце».

Але, выйшаўшы, тут жа вярнулася, а дакладней, высунула галаву з сенцаў і дадала:

— Я вас замкну, каб ніхто сюды не зайшоў... Добра? — Андрэй усміхнуўся.

— Добра, замыкайце, не баюся... Я прывык ужо сядзець замкнутым...

Гаспадыня коратка змерала Андрэя дапытлівым позіркам і знікла.

«Ну вось, знайшоў Санкоўскага,— з задавальненнем падумаў Андрэй.— Ажаніўся ўсё ж такі, вечны беспрытульнік... Можа, гэта і нядобры знак?»

Больш уважліва агледзеў пакойчык. На палічцы ляжала некалькі кніжак. Андрэй устаў і ўзяў верхнюю. «Агульная гісторыя сацыялізма і грамадскай барацьбы» — выдавецтва «Веда», Варшава.

Пранізлівы гудок абвясціў паўдзённы перапынак. Андрэй як-ніяк крыху хваляваўся ад блізкай сустрэчы з Санкоўскім. Даўно ж не бачыліся. «І ён не памкнуўся пашукаць мяне за гэты час... Таксама крыху дзіўна...» Андрэй устаў, прайшоўся па пакойчыку, а потым, прыгнуўшыся, глянуў у акно. Кавалачак рэчкі свяціўся паміж ярусаў, туды пралегла пратаптаная сцежка. Па ёй ішла наперадзе жонка Санкоўскага, а за ёю плёўся няйначай ён сам, Санкоўскі, бо за спіною жонкі не пазнаць было, хто ідзе. Андрэй чакаў, калі ж ён параўняецца з жонкай, каб паглядзець на яго здалёк. Вось ён, урэшце, выплыў, паказаўся, крыху ніжэйшы за сваю жонку, у шэрай пакамечанай кепцы, месцамі замазучанай, такімі ж выглядалі і штаны на каленях. Твар, спацелы, у чорных ад сажы плямах, здаваўся Андрэю нейкім стомленым. Не заўважыў Андрэй той жвавай усмешкі, якая заўсёды свяцілася на твары Санкоўскага. Ну, і вусы таксама пабольшалі, пастарэлі, не мелі ўжо той маладжавасці, як бывала. Ішоў ён з крыху апушчанай галавой, як быццам задуманы, у зеленаватага колеру запляміленай кашулі. На плячы нёс кантан.

Глуха грукнуў замок ля дзвярэй, потым далятаў тоненькі скрып і тупат цяжкіх ботаў.

Увайшоў Санкоўскі, глянуў цьмянымі вачыма на Ан-

дрэя і абыякава сказаў: «Добры дзень». Намерыўся павесіць каптан на цвік. Андрэй яму адказаў:

— Добры дзень, таварыш Вацлаў... Даўно не бачыліся...

Працягнутая да сцяны рука застыла ў паветры. Санкоўскі спыніў позірк на Андрэю, прыглядзеўся і ўскрыкнуў: «А!..» Каптан выпаў з рук.

— Ці то можа быць? Анджэю!.. Кохany Анджэю!..— трос руку Андрэя Санкоўскі, а потым нарабіў сапраўднага крыку:

— Ганорка, ідзі сюды! Хутчэй!..

Тая азвалася з сенцаў: «Зараз!» і тут жа ўвайшла.

— Ты знаеш, хто гэта? Гэта ж мой даўні прыяцель... Вітай яго, вітай...— І твар яго ажывіўся, здаецца, па-даўняму.— Ото прыгода... Напэўна, з турмы, Анджэю? Чыталі мы пра вашу дэманстрацыю, пра вашы арышты...

«Усё ў парадку»,— падумаў Андрэй і нецярпліва спытаўся:

— Ну, а ты ўвесь час жыў тут?

— Тут-то тут, але не ўвесь час... Пакаштаваў і я турэмнага хлеба... Два гады прабыў у турме... Разам са Стасем... Паўгода тут, у Беластоку, а паўтара ў Седльцах... Ну...— тут Санкоўскі завіхнуўся, скінуў кепку са спацелай галавы,— памыемся... Ты скінь куртку... Ганорка, распалі плітку, падагрэй там чаго...

І ён выйшаў у сенцы...

— А я вас так спалохалася... Думала, зноў шпікі,— гаварыла Ганорка, распальваючы плітку.

— А што, сюды прыходзяць?

— Уй... а як жа. Паліцыя — мундуровая то часта бывае. Хацела раз прысутнічаць на сходзе рабочых, але ўсе запратэставалі. Нават пэпээсякі далучыліся.

— Што?.. Дык, значыць, прафсаюз у вас ёсць?

— Ёсць, ёсць... Тут за горкай яшчэ дзве лесапільні... Ну, то ўсе разам... Ой, колькі тут было ўсяго... пакуль стварылі гэты прафсаюз. Вацлаў і нацярпеў за гэта...

У Андрэя рабілася радасна на душы... Чуў, як гэты Вацлаў плюхаў вадою за дзвярыма, і бачыў яго жвавым, такім самым, як некалі... І Ганорка здавалася не такой, як пры першай сустрэчы,— была рухавай, даверлівай, таварыскай. Санкоўскі ўвайшоў выцерты, пасвяжэлы, наскора прычэсваў парадзелыя валасы, сівыя на скронях.

Падышоўшы да перагародкі, ён тры разы стукнуў кулаком. Адтуль пачуўся адказ двума стукамі.

— Няхай прыйдзе Стась...

Хутка ўвайшоў Станіслаў Барвіна, такі самы высокі, крыху ацяжэлы. Але ён менш змяніўся, чым Санкоўскі.

— Чаго хочаш? — спытаўся ён.

— Вось, бачыш... пазнай, хто ў нас...

Барвіна глядзеў, глядзеў, а потым усміхнуўся.

— Ну, як не пазнаць? Пазнаю... Таварыш Андрэй?

— Так...

— Якім чынам?

— Чыгуначным...

І не ведае, што далей казаць, усхваляваны Барвіна. Неяк ацягваецца, шукае слоў. Андрэй хоча дапамагчы яму ў гутарцы:

— Таварыш Стась мала змяніўся...

— О!.. Ён многа змяніўся,— перахапіў Санкоўскі,— ён цяпер прафесар у нас. Шмат чытае, зараз за біблію возьмецца, бо больш яму чытаць няма чаго...

— Хутчэй ты машыністам станеш пры рухавіку, чым я пачну чытаць біблію.

— Ну... машыністам-то я ніколі не буду... А пэпээсякі што будуць рабіць? От, пся крэў, ён машыніст, а я качагар. Вось табе і дыктатура пралетарыяту... Ох, як мне цяжка з ім працаваць. Стаіць над тваім каркам, як жандар. Усё думае, што камуністы шкоднікі...

— Гэта такі машыніст у вас? — спытаўся Андрэй.

— Так, халера б яго ўзяла...— Санкоўскі махнуў рукамі, падышоў бліжэй да Андрэя, кладучы расчоску ў кішэньку кашулі і крыху прыгнуўшыся, пачаў сыпаць словамі неяк таямніча і сатырычна:

— Разумееш... брат яго служыць у паліцыі, тут, у Беластоку. Другі брат працуе конюхам у маёнтку... Чуў, што за сям'я?..

— Як тыя лебедзь, шчупак і рак,— падхапіў Андрэй.

— Во, во!.. І ў прафсаюз не хоча ўступаць... Ну, але чорт з ім... Ён спраў у нас не вырашае... Усё залежыць ад таго, як нашы справы пойдуць далей... Так што, браце Анджэю, і мы са Стасем панюхалі турэмных сцен...— І Санкоўскі пляснуў Барвіну па плячы.

— За што? — спытаўся Андрэй.

— Го!.. Тут было крыху калатні... А ўсё праз гэты прафсаюз. Паліцыя ўмяшалася ў справы... Я гавару, што паліцыі тут няма што рабіць. Яны хацелі правесці сваіх людзей у кіраўніцтва. Але не ўдалося... Ну, потым адпомсцілі нам...

Санкоўскі кіўнуў на Барвіну і ўсміхнуўся:

— Вось няхай Стась скажа, куды яму падкінулі лістоўкі... Мне-то там, у качагарцы, у кішэню паклалі. Куртка вісела на сцяне, ну, і нейкі драб ускочыў і... Ну, а ты, Стась, скажы, куды табе падкінулі?

Стась махнуў рукою і крыху пачырванеў.

— Хіба варта аб гэтым гаварыць? — прамовіў ён сарамліва. Нешта, відаць, было тут смешнае, бо Санкоўскі ўсё падштурхваў Стася:

— Раскажы, раскажы...

Урэшце Стась адважыўся.

— У гаршкі напхалі, халера б іх пабрала...

Усе трое — і Стась, і Санкоўскі, і Ганорка — зарагаталі. Смяяўся і Андрэй.

Ганорка ўдакладняла:

— У нас у сенцах стаіць пасуда... Ну, і здагадаўся нехта... Паліцыя прыйшла з вобыскам зараз жа...

Андрэй у сваю чаргу расказаў пра сябе. Ганорка паспела за гэты час паставіць на стол патэльню са смажаным салам. Стась выбег з кватэры, прывёў сваю Марылю і паставіў на стол бутэльку гарэлкі. Марыля выглядала маладзейшай за Ганорку, і яе цёмна-шэрыя вочы глядзелі цяпер не так востра, як тады, калі яна сустрэлася з Андрэем, несучы бярэмца трэсак на руцэ. Наадварот, вочы цяпер свяціліся ясна. У іх быў відаць палёт наіўнасці вясковай дзяўчыны. Апошняе асабліва падкрэслівалася ледзь прыкметным румянцам на шчоках.

«Сам непасрэдны, просты. Ну і выбраў сабе даспадобы,— падумаў Андрэй.— Правільна выбраў...» Ганорка ж была больш сталай, парывістай у рухах, у гутарцы. Ва ўсіх яе паводзінах праяўлялася тое, што завецца ўжо набытым жыццёвым вопытам.

Так і сядзелі ўсе за столікам, і гутаркай кіравала найбольш Ганорка. Можа, яе такая ўпэўненасць у сабе вызначалася яшчэ і тым, што яна была дачкою беластоцкага ткача, у той час як Марыля прыйшла на завод з вёскі. Яна сядзела побач са Стасем, ніжэйшая за яго на галаву, і гаварыла мала. А Стась часта нахіляў сваю чупрыну да яе твару і запрашаў, каб ела, усяк стараўся ёй дагадзіць.

— А ты б пагаліўся, стары,— сказала з жартаўлівым папрокам Ганорка, звяртаючыся да Санкоўскага,— а то зарастаеш барадою, як стары дзед...

І тут жа тузанула Санкоўскага за вус.

— Пакахаеш мяне такім, як ёсць, маясь ты Ганорка,— адказаў Санкоўскі і паляпаў сваю жонку шырокай далоняй па спіне.

— Ну... за ваш ажэнак, за вашы вяселлі, за ваша шчасце,— падняў чарку Андрэй.

— О!.. Наш ажэнак цікавы...— сказаў Санкоўскі.— Дамовіліся мы са Стасем, як выйшлі з турмы. Ажэнімся,— ну і нажаніліся... Можа, гэтая паліцэйская хеўра не будзе так чапляцца...

Потым кіўнуў на абедзвюх жанчын і працягваў:

— Яны нас на сабе ажанілі... Прысылалі нам насылачкі ў турму... Лісты...

А потым нахіліўся вусам да Ганоркі і, зрабіўшы гульліва-залётныя вочы, дадаў:

— Ну, і пацалункі, зразумела...

Жанчыны запратэставалі са смехам.

— От, яшчэ чаго?.. Гэта табе прыснілася ў турме...— гаварыла Ганорка.

— Ну, не будзем, жоначка, спрачацца. Вяселлі нашыя, Андрэй, рэвалюцыйныя... Жывём, як таварышы, не хадзілі ні да якіх ксяндзоў. Сабралі сваё таварыства на вячэру і баста... Два вяселлі ў адзін вечар. Ну, вядома, нашы вяселлі так і празвалі — камуністычныя... Ну, і дзякуй богу... А ты, Андрэй, можа, таксама?

— Мм... не,— закруціў галавою Андрэй,— я, аказваецца, большы вандроўнік, чым вы... Не да жаніцьбы.

— Ведаю, ведаю, што так... Ну, няхай табе шчасціць дарога... Малады, і галаву маеш добрую на карку... Хай гэта будзе на ўцеху людзям.

Пасля пачастунку Андрэй з Санкоўскім выйшлі ў сенцы.

Санкоўскі прагна слухаў, што шаптаў яму Андрэй, павольна пакручваў вус, падстаўляў вуха, каб усё пачуць дакладна, і ківаў носам, як быццам вымаўляў: так, так...

Андрэй скончыў. Санкоўскі азірнуўся на сенцах, нават прыадчыніў дзверы і выглянуў на двор. Тады пачаў гаварыць:

— Так... Карэльчук працуе тут... Зарэкамендаваў сябе як энергічны работнік... Стварыў шмат камсамольскіх ячэек. Працуе без праваляў. Ужо гэта выклікала падазрэнне — як усё гладка ў яго ідзе... Але ёсць адна ўліка, хоць гэта яшчэ няпэўна... Адзін з таварышаў бачыў адзін раз, як ён уначы выходзіў з дэфензівы... Але, паўтараю, гэта яшчэ няпэўна. А сам я думаю, што ён нячысты... Я гэта

падазраваў япічэ вуць калі... Як працаваў пад Бугам... Я табе гаварыў пра гэта... Помніш? Там над Віслай...

— У мяне ёсць пісулька,— сказаў Андрэй.

— Давай сюды.

— Зашыта ў рубцы кашулі...

Санкоўскі падумаў.

— Не паспею на работу. Зараз гудок. Але ж ты пераначуеш. Увечары прыйдуць з горада... бацька Ганоркі і яшчэ... Пагаворыш... О, бацька Ганоркі стары завадыяка, спявак... Пабачыш...

— Хацелася б хутчэй дахаты, Санкоўскі...

— Паспееш, паспееш... У нас тут пакуль што ціха... Бачыш, каб не прафсаюз, дык нас бы і на работу назад не прынялі. Але тут лайдакоў ёсць некалькі. Падкопваюцца.

На тым і вырашылі. Не сказаў Санкоўскі, што ён сакратар адной ячэйкі, а Барвіна — другой, што яны маюць сувязь і з раённым і гарадскім камітэтамі партыі. Не сказаў пакуль што і таго, што пан Чарапіцкі служыць у Беластоцкай дэфензіве.

Гаварыў ён аб гэтым ужо ўвечары, калі прыйшоў з работы, і дадаў, што перавод Чарапіцкага ў Беласток можа быць звязаны з Карэльчуком. Андрэй слухаў, і яму ўсё ясней рабіліся шпікоўскія ніці, якія снавала дэфензіва па ўсёй краіне. Сам адчуваў і верыў, што гэты Карэльчук правакатар. Трэба, каб Санкоўскі зрабіў усё для высвятлення справы.

Доўга давялося чакаць.

У шэрым нізкім пакойчыку пачынала цямнець. Сонца хавалася за ярусы бярвенняў. Зараз прыйдзе Санкоўскі. Гудок жа прагуў ужо — рабочы дзень скончыўся, а яго штосьці няма. Замест Санкоўскага ў пакойчык прасунуўся праз дзверы высокі плячысты мужчына з загарэлым тварам. Казырок кепкі звісаў над моцным носам, над якім размясціліся паважныя вусы. Падношаны касцюм колеру цёмнай рабочай блузы быў крыху пакамечаны.

— Добры вечар, дачка! — гукнуў ён неяк развязна.

Ганорка, якая сядзела каля ложка і цыравала кашулю Вацлава, усміхнулася ўвайшоўшаму і адказала:

— Добры вечар, ойчэ,— і прыняла з яго рук невялічкі кошык, закрыты белым абрусікам, і дарожны кій.— Сядай, ойчэ, сядай,— стаміўся, пакуль прыехаў...— А гэты «ойчэ» не сеў, а зараз жа распрануўся, застаўшыся ў такой жа чорнай камізэльцы на белай кашулі. Ганорка на

ляту прымала ад яго адзежу, бо «ойцец» распрапаўся так хутка, што здавалася, вось парвецца па швах касцюм, а кепка паляціць некуды ў куток. Распрануўшыся, пачаў закасваць рукавы кашулі, агаляючы валасатыя жылістыя рукі. Ганорка нават трывожна глянула на яго.

— Што, памыцца хочаш? Дома не мыўся?

— Не...— буркнуў ён і глянуў на дачку такім позіркам, што лепш было б, каб яна маўчала.— Пасварыўся з тваёй маткай... разумееш?

— Ну, гэта не бяда,— як быццам развадкаючы, сказала Ганорка,— гэта ж было не раз, ойчэ...

— Знаю без цябе, што гэта не бяда...— і затым выпаліў, як з пісталета: — Але ж баба заўсёды баба... Няхай бы прамаўчала... Не...— Крыху знізіўшы голас, сказаў востра, як адсек: — Пасварыўся сягоння з майстрам цэха... вось што галоўнае! — І ўжо зусім амаль ціха дадаў: — Будзе дамагацца ў дырэкцыі, каб звольніць мяне з работы... Плюгавая вош... Ну, хадзі, пальеш мне на рукі...

Ён накіраваўся да дзвярэй, а за ім пайшла Ганорка, у якой вочы зрабіліся вялікімі і круглымі.

Выціраўся ручніком «ойчэ» гэтак жа, як і распрапаўся, парывіста, заўзята цёр галаву, шыю, аддыхваўся, як пасля купання. Прычасаўшыся, працягнуў руку Андрэю, які ўвесь час мелькам з цікавасцю пазіраў за гэтым размашыстым дзядзькам.

— Пазнаёмімся,— стары ткач Ян Куркоўскі...

Андрэй адказаў, паціскаючы мясістую далонь ткача:

— А я — прыяцель Вацлава Санкоўскага — Андрэй...

Прозвішча свайго Андрэй не сказаў наўмысна.

— Ага... ага... Ну, добра. Ганорка мне расказала пра вас. Задумалі наведаць. Гэта — добра. Таварыства — перш за ўсё... Гэта — па-мойму...

Увайшоў Санкоўскі.

— Забавіўся ў дырэкцыі... Чапляецца машыніст, што нядобра працую качагарам... Яго не слухаю. Атмасферы ў рухавіку належнай не трымаю. Цьфу!

— Твая бяда сягоння, як і мая, Вацлаве... Мне майстар цэха не запісаў маіх лішніх гадзін працы. Сягоння была выплата... Ну, і патузаўся я з ім. Не ведаю, што будзе. Лаяліся, як псы...

— На чорта з ім было задзірацца? Да дырэктара пайшоў бы...— сказала Ганорка.

— Адна хэўра. Адна халера. Ды што? Ён мяне — гэ-

ты шыбздзік — звольніць з працы? Мяне, хто працуе на фабрыцы з 1903 года? Не! Гэтага яшчэ не бывала...

І зараз жа звярнуўся да Ганоркі:

— Дачка, там у кошыку вазьмі... Маці паклала... Мы хочам вячэраць.

...І зноў сабраліся навокал століка. Прыйшоў Стась з Марыляй і яе брат, малады ткач, з сям'і тых спрадвечных вясковых ткачоў, якія ў сябе ў хаце зараблялі на хлеб ткацтвам. Так павялося ўжо ў гэтай акрузе здаўна, што жанчыны тут хоць і прадуць, але не ткуць. Аддаюць пражу спецыяльным ткачам, якія гняздзяцца па вёсках. Але брат Марылі працуе ўжо на фабрыцы. Часта наведвае сястру. Ад іх, мусіць, ад такіх ткачоў, і пачалася некалі ткацкая прамысловасць у горадзе. Брат Марылі, старэйшы за яе, здаецца нейкім ціхім і сціплым, усё правую руку трымае пад пахай левай, а левай прыкрывае бараду. Няйначай, прывычка перанята ад сваіх бацькоў. Русыя валасы, на канцах у залацістых завітушках, леглі гладка прычасаныя «пад польку». Правільныя рысы прадаўгаватага твару, мяккі ўдумлівы позірк вачэй. Так і стаяў ён воддаль, калі садзіліся за стол, у белай вышытай кашулі, падпяразанай саматканым поясам, у ботах з абвіслымі над халявамі чорнымі штанамі. Стаяў, прыкрыўшы бараду рукой, як зняты дзе з якой гравюры.

«Няхай сядаюць старэйшыя, а я пасля»,— гаварыла яго постаць. Першы азірнуўся стары Ян, які сеў ля сцяны, у канцы стала, і паспеў ужо разгладзіць вусы.

— Ты чаго стаіш, Паўле? Вось табе раз. Усе садзяцца, а ён... Хіба табе не сорамна? Адставаць нельга, браце каханы. Ты нядаўна стаў ткачом на фабрыцы, яшчэ пабачыш, як не трэба будзе адставаць. Го, го, мы знаем...

Азірнулася Марыля, схапіла свайго брата за руку і пасадзіла побач, паміж Янам і сабою.

— Сядай добра, а не як на іголках... Нібы тая дзяўчына на выданні,— жартаўліва дакараў стары Ян.

А гэты сціплы Павел усміхнуўся вусатаму Яну і сказаў:

— Дык ужо ж сяджу... Што там многа гаварыць.

Хутка запалілі лямпу і завесілі акно.

Рэй за вячэрай вёў стары Ян.

— Ну, малады рэвалюцыянер, давай чокнемся з табою,— звярнуўся ён у ходзе гутаркі да Андрэя.— Гаворыш ты многа правільнага... але ўсё гэта больш з кніжак. Кніжкі патрэбны — гэта так. Без іх нельга... Але трэба

ведаць, мої каханы, пра нашу пільнасць рабочую, пра наш пот і пра нашу ўхватку... Рабочы чалавек чуе, у кім правільная сіла, і за тым ідзе, бо ён не мае магчымасці вучыцца. Вось Ленін... Рабочыя ўсяго свету адчулі, што гэта правільная сіла, наша сіла... І ты ідзеш ад такої сілы. Але — практыкі, практыкі больш... Ну, яшчэ малады, усяго пабачыш... За здароўе маладых рэвалюцыянераў! За іх!

І стары Ян чокнуўся з Андрэем.

Андрэй адчуў сябе яшчэ вельмі маладым перад гэтым вусатым Янам, які, здаецца, бачыў яго наскрозь.

— А вы са свайго асяроддзя выхоўваеце маладых? — спытаўся Андрэй.

— Ёсць такія. Турма беластоцкая імі напхана. Але ўсіх ім не перабраць. Нараджаюцца, як грыбы... Усё ж такі нешта не тое, што было калісьці,— паківаў галавою Ян.— Я помню Мархлеўскага, помню Дзяржынскага... Вось такіх бы цяпер. А то крылаў не дадуць расправіць, нячыстая сіла, усё — хлоп і хлоп, усё за браму і за браму на ключ... Цяжэй цяпер, шмат цяжэй стала рабочаму класу.

— А можа, і лягчэй,— сказаў Андрэй.— У вашыя маладыя часы быў царызм, а цяпер маем сацыялістычную дзяржаву — СССР — дзяржаву рабочых і сялян, надзею і апору працоўных усяго свету.

Стары Ян праз дым папяросы паглядзеў пільна на Андрэя нібы азадачаны. І, пакінуўшы тон балагурства, пачаў гаварыць сур'ёзна:

— Савецкі Саюз за мяжою, а не тут. Вось у чым задача. Дарога да яго цярністая...

Апошнія словы стары Ян сказаў павольна і нават сумна. Андрэй таксама курыў папяросу і не зводзіў вачэй з гэтага старога ткача, якога сягоння пры выплаце паранілі ў душу. І ён, поўны гневу і бунту, прыйшоў да дачкі, да маладзейшых сяброў, астудзіць свой боль. Дваццаць пяць год працы на фабрыцы, і ўсё раны і раны... Ніхто з прысутных не перашкаджаў яго гутарцы з Андрэем, бо ведалі, што стары Ян гэтага не любіць.

— Каго выбіраем у сейм? — раптам, пасля задумы, вырвалася ў Яна.— Каго? Прахвостаў, дармаедаў з тоўстымі брухамі. Вылежыцца, пся крэў, на пляжы, а потым прыязджае брахаць... Польшча, Польшча, наша айчызна. Польшча то для вас, лотраў, а для нас хвіга з макам.

І стукнуў стары Ян кулаком па стале, што аж усё на ім падскочыла.

— Не! Яшчэ будуць бітвы, яшчэ будуць!

— Ойчэ, што ты робіш? — з просьбай у голасе сказала Ганорка.— Пасуду паб'еш і яшчэ якіх д'яблаў сюды паклічаш. За акном пачуюць...

Усе ўсміхнуліся, пераглянуўшыся.

Санкоўскі, ведаючы слабую струнку старога, прапанаваў заспяваць пра нейкага Бавэлка, пэпээсаўскага прафсаюзнага дзеяча. Відаць, што Бавэлак — мянушка, бо стары Ян усміхнуўся і насупіў бровы.

— Шчанюк, пся крэў, шчанюк. Але ладне яго назвалі... Ну і што ты з ім зробіш? Мы ў яго руках. Эхх!..

І тут жа пачаў спяваць на матыў полькі «Ой-ра», а за ім усе:

Пан Бавэлак кшычы споро
З Высокінскім — ой-ра, ой-ра —
Дзісяй бэндзе вам надвыжка,
А на ютро пуста кішка...
Пшыяцеле пошлі в тапы —
Бэндон паном марцыпаны.
ППС — цо за дзевуха —
Аж до коляп посі бжуха...

Мужчыны спявалі, а жанчыны толькі прыпявалі — «ой-ра, ой-ра...», і ў выніку атрымлівалася, як быццам хто падыгрываў на гармоніку.

— Ты не ведаеш, Андрэй, хто такі Высакінскі? — звярнуўся да Андрэя Санкоўскі.

— Гэта — наш ангел-захавальнік, галоўны фараон...— адказаў за Санкоўскага стары Ян.

— Што, можа, кіраўнік дэфензівы? — здагадаўся Андрэй, пакольні пачуў слова «фараон».

— Так, ён самы,— кіўнуў галавой Санкоўскі, а стары Ян пацвердзіў словам: «Аман».

— Бачыў я яго, як іншоў на аўтобус сягоння,— працягваў Ян,— ехаў на машыне са сваім намеснікам...

— Чарапіцкім,— амаль шэптам кінуў Андрэю Санкоўскі.

— А табе, Стась, не здаралася тут сустракацца з Чарапіцкім? — спытаўся Андрэй у Барвіны.

— Як не здаралася? Мы, як вярнуліся з турмы, хадзілі ў дэфу адзначыцца... Выклікалі. Прыйшоў паглядзець на нас. І адразу: «Ну, хто каго апярэдзіў: вы мяне ці я вас?» Мы яму адказалі — добра ідзеш угору, толькі замала яшчэ натаўсцеў, дрэнна кормяць цябе твае паны.

Пачырвапсў, раптам, як тады ў бараку, бахпуў дзвярыма і зпік. Го, ён цяпер вялікі пап, морда чырвопая, цэглы просіць... Але я яго маю на прыцэле...

— Ой, што ты яму зробіш? — сказала Марыля.

— А ты ўжо так раптам за мяпе баішся? Я яму зраблю так, што ўжо піхто пазад пе адробіць.

— У пас па фабрыцы адпаму зрабілі,— умяшаўся Павел,— так зрабілі, што доўга пе загляпе па фабрыку...

— А што? — запыталіся амаль усе. І стары Яп павярпуў галаву да Паўла.

— Падпільпавалі ў адным месцы, апучу ў рот, мяшок на галаву і так далі, колькі хацелі... І пакіпулі пад плотам, у завязапым мяшку.

— Ну і што?

— Халера... мусіць, ножык меў у кішэпі... Апамятаўся, прарэзаў мяшок і ўцёк.

— Ха-ха-ха!..— гукнулі ўсе хорам.

— Бо пачаў вышукваць людзей па адпым,— працягваў Павел,— адвядзе ўбок і кажа: «Вышуквай тут камупістаў, дапось мпе, атрымаеш большую плату за работу. Я табе гараптую». І мяпе адпаго разу прыціспуў да плота і ўсё шэптам, і ўсё шэптам... Я кажу — адчапіся, пазола. І ўцёк.

Павел гаварыў мяшанымі словамі — з польскіх пераходзіў па беларускія і паадварот, але ўсе яго добра разумелі.

— От, дрэпьства завялося,— буркпуў стары Яп.— Мы пекалі такіх высвіствалі.

— Рабочаму класу пры капіталізме трэба чакаць горшага, бо капіталізм ідзе да заняпаду,— пачаў Андрэй.— Разбэшчапая буржуазія імкпецца разбэшчваць рабочы клас палітычна і маральпа. Капіталістычныя дзяржавы стаяць папярэдадпі крызісу. Ужо ён пачыпаецца... Першай ахвярай крызісу будзе Польшча і іпшыя такія слабыя краіпы, як япа... Рабочаму класу трэба рыхтавацца да чарговых баёў...

Слухаў стары Яп Апдрэя, слухалі ўсе, пават у пейкай крыху задуме. А за акпом, за белай фірапкай, месячпая цёплая поч звісала зорамі педзе пад лесам комінаў, якія, як грозпыя здапі, маячылі пад горадам, у якім барацьба за жыццё тысячаў прыгпечаных пе сціхае пі па адпу хвіліпу. Недзе вось гэтак жа збіраецца групамі па вячэрнія бяседы рабочы люд і ў таварыскіх гутарках абмяркоўвае сваё стаповішча. Гадзіннік часу пе дрэмле, і ўсе прыслу-

хоўваюцца да яго хады, сочаць за стрэлкай. Праб'е патрэбная гадзіна, і ўсе ўстануць да бою. Выйдуць з задымленых фабрык, сутарэнняў, халуп — мужчыны і жанчыны — тысячы пралетарыяў у самкнутай масе... Скалanецца зямля пад нагамі, і задрыжыць буржуазія...

Аб гэтым марыць Стась Барвіна,— гэты асілак з дзіцячым сэрцам, які туліць да сябе сваю жоначку, як птушку. А Вацлаў Санкоўскі ўжо не хоча дачытваць да канца тыя кніжкі, што ляжаць у яго на паліцы. Кажа: «Няхай іх халера возьме... і якой толькі атруты не выдумляюць для нас...» А Стась смяецца, ён ужо многа ведае. Кажа Санкоўскаму: «Я ж табе наўмысна даў прачытаць, каб пасля з табою пагутарыць...»

— Не буду чытаць і — баста! — адрэзаў Санкоўскі.— Ты мне давай правільныя кніжкі...

Старому Япу ўжо не да кніжак,— ён чытае толькі газеты, брашуркі і сяды-тады камуністычныя лістоўкі, якія нехта часам раскідвае па падворку фабрыкі.

— Нам трэба звязацца... з гэтым беларускім кааператывам. Як ён завецца?.. Ага!.. «Жніво»! Яны маюць сувязь з сялянствам...— сказаў Санкоўскі. Такая прапанова вынікла ў гутарцы з Андрэем, які сказаў, што трэба мець на ўвазе сувязь з сялянствам, шукаць да яго ўсякіх дарог. Няхай будзе гэта кааператыў «Жніво».

— Я да іх заходжу,— азваўся Павел.— Там ёсць добрыя хлопцы... Паліцыя нядаўна там вобыск рабіла...

— Ну, вось ты і будзеш у нас сувязным,— сказаў Санкоўскі.

Стары Ян, хоць быў некалькі старасвецкім у поглядах на нацыянальнае пытанне, лічыў яго «не такім важным», але, слухаючы такую гутарку, прамовіў:

— Крыўдзяць гэтых беларусінаў, як толькі хочуць... Так, як палякаў пры царызме... Так... вядома... гэта не можа не адгукнуцца ў сэрцы рабочага...

— Рабочыя павінны бараніць і весці за сабою ўсіх прыгнечаных,— сказаў Андрэй.

— То-та ж... То-та ж... А наш Бавэлак кажа, што Беларусь — гэта адвечныя польскія землі. І народ беларускі цягнецца да польскасці... Ну, тут не так. Свабоду народам дай — усім! Толькі так!..

— Ну, ойчэ, твой крупнічак ужо гатовы,— сказала Гапорка, стоячы над плітою.

— А-а... гатовы? Зараз, зараз...

Стары Ян толькі хацеў устаць, каб, па свайму звы-

чаю, распарадзіцца крупнікам, гэтым польскім моцным пітвом, прыгатаваным неяк адмыслова, як дзверы з грукатам адчыніліся і ў пакой увайшлі тры паліцыянты.

— Чым можам служыць? — устаў ім насустрач стары Ян.

Паліцыянты азірнулі пакой і зараз жа павярнулі да выхаду.

— Перапрашаем, не туды трапілі. Перапрашаем... Да пабачэння.

— Да пабачэння! Вольна дарога...— адказаў Ян.

Калі паліцыянты выйшлі, усе на момант змоўклі. Ян як стаяў, так і не садзіўся.

— Што за прычына? Чэрці з хвастамі... Што ім трэба тут? — прамовіў ён.

Жанчыны заціўкалі з трывогай, «каб чаго не было»... Стась Барвіна выйшаў з пакоя, сказаўшы: «Я зараз даведаюся». Пачакаўшы, выйшаў і Санкоўскі.

— Тут такое часта бывае...— гаварыў Ян Андрэю. Жанчыны селі на ложак устрывожаныя, аж стары прыкрыкнуў на іх:

— Чаго дзюбы паспускалі? Дарога да рэвалюцыі цярністая... Не трэба гэтага забываць...

Андрэй адчуваў сябе крыху ніякавата. Розныя думкі напльвалі — каб чаго дрэннага не падумалі пра яго гэтыя добрыя людзі. Усяк жа бывае ў свеце, дзе ёсць двурушнікі і правакатары.

Вярнуліся Барвіна і Санкоўскі з вясёлымі тварамі. Усе лёгка ўздыхнулі. Значыць, ніякая небяспека не пагражае. Так і сказаў Барвіна:

— Нічога небяспечнага... Бурды ў машыніста...

А Санкоўскі дадаў:

— У машыніста цэлая зграя іх. Нават нейкі «пшодовнік» прыйшоў... Мы глядзелі ў акно... «Пшодовнік» якраз вымахваў шабляй — прыёмы фехтавання, відаць, паказваў... Гэта брат машыніста — паліцыянт — прывалок усіх... П'юць. Ну, а гэтыя, відаць, спазніліся на папойку і не туды трапілі. Вось і ўсё... Прошэ сядаць... Ойчэ, астыў твой крупнічак...

— Каб іх халера ўзяла. Ах!..— буркнуў стары.— Напсавалі гумар... Ну, але нічога — папраўім. Ганорка, давай!

Ян з урачыстай павагай разліваў чарпаком крупнік па шклянках... Пратэставў мужчын, «каб не многа», нават і не чуў. Просьбы жанчын уважыў.

— За хуткую рэвалюцыю ў Польшчы і... ва ўсім свеце, дзе яшчэ рабочы клас у папяверцы! — сказаў Ян і даў каманду, каб «да дна».

— У вас тут, як відаць, два светы...— пачаў Андрэй, а Ян перахапіў:

— Так, два светы, мої каханы... Адны шабелькамі вымахваюць. Дурні! Ой, якія ж дурні! І ўсё гэта па нашу галаву...

— Ну, а мы тут,— усміхнуўся Барвіна,— рэвалюцыю рыхтуем...

— Так... А як ты думаў? Хто зробіць рэвалюцыю? Толькі мы,— сказаў стары Ян і стукнуў сабе ў грудзі кулаком. Уцёр вусы і пачаў сваю любімую песню — «Чырвоны сцяг». Узмахваў рукою над сталом, як дырыжор.

...Далей венц, далей венц, взнесьмы спев.
Наш штандар плыне по-над тропы.

Іскрыліся вочы.

Нèсе он
Люду гнев
Зэмсты зэв...

Яшчэ вышэй узняліся галасы:

А колер èго ест чэрвоны,
Бо на нім работніча крэв...

## Раздзел трэці

## СУСЕДЗІ, СЯБРЫ...

Спазніўся крыху з касьбою Сцяпан Касцевіч. Ды як жа не спазніцца, калі трэба было рабіць і сабе і Дзям'яну Гарагляду, пакуль той быў у турме.

Але затое цяпер дамовіліся, як кажуць, не толькі па-суседску, але проста-такі па-брацку. Рад Сцяпан Касцевіч звароту з турмы і сына свайго і суседа-прыяцеля Дзям'яна, сям'я якога мела ад Сцяпана такую дапамогу, як ад роднага. Радуецца Дзям'ян свабодзе. Надышлі такія дні, якія хочацца назваць дзянёчкамі,— не разлучаюцца сябры ні ў якой рабоце — усё разам і разам. А тут

яшчэ да ўсяго такія прыемныя весткі з-за мяжы, з Савецкай Беларусі, з усяго Савецкага Саюза. Там праведзена калектывізацыя сялянскіх гаспадарак, голас Сталіна аб вялікай чалавечай дружбе народаў даходзіць да падняволеных вёсак Заходняй Беларусі. І ўсіх агортвае нейкая сонечная надзея на лепшае, надзея, хоць яшчэ не ўсвядомленая да канца, але сонечная. Людзі такога складу думак хіляцца адзін да аднаго, бачаць прад сабою бязмежныя прасторы Расіі з яе знаёмым, сваім народам. Эх, каб не гэтая мяжа! І таму Сцяпан Касцевіч і Дзям'ян Гарагляд разумеюць адзін аднаго не толькі тады, як вядуць гутарку паміж сабою, але і калі маўчаць. Добрыя яны суседзі, добрыя людзі,— бачаць гэта ўсе, і большасць душою хіліцца да іх.

Толькі бушуе, бурчыць Мікіта Лазун. Зводзіць ён старога Нічыпара Байдака на свае думкі і не заўважае ці не хоча заўважаць той, здаецца, невялікай розніцы ў поглядах, якая існуе між ім і Байдаком. Калі прыгледзецца бліжэй, дык той летапіс з дзяржаўнага архіва пра першы надзел зямлі больш вабіць старога Нічыпара не вартасцю для сучаснасці, а напевам мінулага, так яму знаёмага, звязанага з яго маленствам. Але душэўныя сімпатыі ў Нічыпара Байдака зусім іншыя, чым у Мікіты. Мікіта для яго чалавек як-ніяк багаты, які мае знаёмства з панам графам, карыстаецца яго ўвагай, а Нічыпар бедны.

Нельга прайсці мімаходзь, каб не спыніцца на тым уплыве, які мае Мікіта. Куды ні кінь — не дружбак ён для Нічыпара. Ёсць у Нічыпара чалавек, з якім многа чаго звязана ў яго жыцці. Чалавекам гэтым з'яўляецца Ануфрэй Чарняк, якога Мікіта якраз не лічыць за чалавека. Ну, бо ж які з яго чалавек, калі ён «пусціў у трубу» столькі са сваёй гаспадаркі, калі ён толькі на смешкі здатны. Абмінае, не хоча Мікіта ўспомніць хоць бы таго. . а хто зрабіў яму размаляваны вазок, хто вылечыў каня, хто зрабіў аснову для бараны, колы для воза? Усё зрабіў Ануфрэй, здольны майстар на ўсе рукі. Слухаюцца яго сякера, піла, гэблік, долата. Гэта ўсё не важна для Мікіты, бо Ануфрэй любіць ды і ўмее не толькі насняваць, але і ў скокі часам пусціцца, хоць чалавек ён ужо і ў гадах.

А для Нічыпара Ануфрэй дружбак. Разам праходзілі іх карчомныя і іншыя прыгоды маладосці, іх кірмашовыя змовы, калі ўмела набівалі цану ці то на каня Нічыпара, ці Ануфрэя, ці другога свайго прыяцеля, калі на судах удала сведчылі на карысць каго-небудзь са знаёмых.

Хоць дзядзька Нічыпар і адстае ўжо некалькі ад Апупрэя ў розных справах, прыгодах, але ўсё роўна лічыць яго дружбаком.

Калі вярнуўся Андрэй з турмы, дык у бліжэйшую нядзелю прыйшлі да Сцяпана Касцевіча Апупрэй з Нічыпарам прывітаць Андрэя, парадавацца разам з сям'ёю яго звароту. А потым завіталі Дзям'ян Гарагляд з Маланняй і з дачкою Любай, прыйшоў і Пятрусь Хадыка з Макарам Краўчуком, які пасяліўся ў Петруся жыць. Кожны прынёс з сабою і гарэлку і закуску. Прыйшоў Пеця Ціханчук са сваёй маці Тацянай. Прыбыў і яшчэ адзін госць, з якім Андрэй пазнаёміўся нядаўна, пасля звароту з турмы. Гэта — гімназіст Віктар Кухта, вучань 6-га класа беларускай гімназіі ў Вільні, хлопец з недалёкай суседняй вёскі. Бяседа пачалася жвавая, вясёлая. На яе гоман завярнуў з вуліцы солтыс Барсук. Запрасілі і яго ў кампанію. На самым покуце, у канцы стала, сядзелі — сам гаспадар Сцяпан Касцевіч, прыкрываючы спіною партрэт Радзішчава, па правы бок — Дзям'ян Гарагляд, а па левы — Апупрэй і Нічыпар.

Гутарка зайшла на тэму калектывізацыі ў Савецкім Саюзе, аб тым, што там аруць трактары, сеюць сеялкі, жнуць нейкія новыя машыны, якіх дагэтуль і на свеце не было — яны не толькі жнуць, але разам з тым і малоцяць тут жа на полі... А ў нас, бачыце, паны хочуць разбіваць зямлю на хутары. У каго многа зямлі, таму хочацца мець яшчэ больш і лепшай. А што з хутароў будзе мець бедны чалавек? Адно — перанось будынкі, а закрапі іх, то і не збярэш. На пазыку якую спадзявацца нельга. Дый кажуць, што і сервітут з панам Ельскім будзе скасаваны. Дзе будзем пасвіць статак? Хоць у галаве шумела ад гарэлкі, аднак на момант задумаліся сяляне. Хутары-то хутары, але ці не загубяць яны нас? Стары Нічыпар з шырокім расчырванелым ілбом звярнуўся да Андрэя:

— Растлумач нам да канца, Андрэй, як яно лепш?

І Андрэй тлумачыў, нашто патрэбны панам хутары — гэта, каб узмацніць кулака, як сваю апору ў вёсцы, рассеяць беднату па полі, каб біць яе было зручней, каб чалавек на хутары больш дзічаў, цураўся людзей. Грамада — вялікая справа,— гэта, як той венік... Пры хутарах жа лёгка будзе панам да канца скасаваць беларускую асвету, апалячваць дзяцей, не дапускаць беларускай кніжкі, газеты, наймаць для сябе сваіх даносчыкаў — адным словам, разбіваць наша адзінства, аддаліць нас ад усяго таго,

што робіцца ў Савецкім Саюзе. Яны баяцца, каб тут народ не пачаў дабівацца савецкай улады, а потым і калектывізацыі. Бо калектывізацыя магчыма толькі пры савецкай уладзе...

— Толькі пры савецкай уладзе? А так — не? — перапытаў Нічыпар.

— Не, бо фабрыкі, заводы, якія вырабляюць машыны і ўсе тавары, знаходзяцца ў руках капіталістаў, а трэба, каб яны былі ў руках народа. Толькі тады... Капіталісту не ў галаве думаць пра народ,— ён думае толькі пра нажыву для сябе...

— А я ж думаў...— сказаў Нічыпар.— Куды ні кінь, усюды клін... Трэба панам выбірацца за Буг... Нічога не будзе, пакуль яны будуць тут.

— Думаў, думаў...— падхапіў Дзям'ян,— не ўсе аднолькава думаюць. Вось паглядзі... Мікіта як стараецца за хутары. Яму ўсё мала. Гэта нездарма... Не аб табе з намі ён стараецца...

Солтыс Барсук стукнуў кулаком па стале і выказаў сваё:

— Каб тут у нас можна было сарганізаваць камуну, я першы пайшоў бы. Хоць зараз!..

Ці хмель яму ўдарыў у галаву, ці што, бо ніколі не чулі ад яго такіх выказванняў. Усе нават крыху сумеліся. Нічыпар пакруціў галавою ў знак недавер'я. А Барсук звярнуўся ўжо непасрэдна да Андрэя:

— Клянуся, Андрэй, што — так...

— Не, пры панах нічога не будзе... Трэба змагацца, каб паны пайшлі адгэтуль, трэба не згаджацца на хутары, бо з гэтага нам будуць вялікія цяжкасці...

Гаварылі субяседнікі, думалі, і хто б там як ні меркаваў, урэшце ўсе цешыліся з таго, што Андрэй вярнуўся з турмы, што Дзям'ян Гарагляд сядзіць за сталом і то накідваецца на каго са словамі, то рагоча, то пасылае шпількі па адрасу Мікіты, якога называе воўчым педаедкам. (У людзей засталося ў памяці, як некалі — даўно — на Мікіту напалі ваўкі). Эх, каб чуў гэта Мікіта, запеніўся б ён. Ды, напэўна, так ці інакш пачуе. Сядзіць жа тут солтыс Барсук, хоць чалавек ён, здаецца, нядрэнны, але хісткі і пакрыху ўсё больш навучаецца слухацца паліцыі, войта і наогул паноў. Андрэй у гутарцы ўсё больш насядае на яго, што трэба спрыяць сваім людзям, што трэба сказаць, калі каму пагражае якая небяспека, што панамі слаўны не будзеш. Барсук ківае галавою, згаджаецца, а што ён са-

праўды думае, ліха яго ведае. Але ўсё ж такі, можа, што і застанецца ў душы Барсука ад гэтай гутаркі. Дзядзька Нічыпар пачухвае лысіну і расказвае Анупрэю і Сцяпану аб тым летапісе з дзяржаўнага архіва. Анупрэй — сам даўні хутаранін. Бацька Анупрэя атрымаў вялікі хутар пры першым надзеле зямлёю пасля вызвалення ад паншчыны за тое, што пераїшоў назад з каталіцтва ў праваслаўе. Але, як вядома, гэтаму хутару не пашанцавала ў руках Анупрэя. І таму Анупрэй больш маўчыць, не хоча ўмешвацца ў спрэчкі. Толькі, як зайшла гутарка пра скасаванне сервітуту, ён сказаў:

— Няхай лепш застаецца так, як ёсць. Бо хутарам, які б ён ні быў, пашы для скаціны не заменіш. Я ўжо гэта ведаю па сабе.

Сцяпан Касцевіч быў у такім настроі, што ні туды і ні сюды... Але вось недалёка за сталом сядзіць русавалосы сын, гаворыць то з тым, то з тым, аглядае ўсіх праніклівымі, удумлівымі вачыма. І ўрэшце Сцяпан выказаўся:

— Калі нічога добрага не будзе з гэтых хутароў, то на чорта яны,— сказаў Сцяпан,— а так хоць будзем усе ў грамадзе, разам... Наколькі можна, будзем дапамагаць адзін другому.

Андрэй даўно чакаў ад бацькі якога-небудзь слова і, пачуўшы такі сказ, з удзячнасцю глянуў на свайго старога... «Не здрадзіць мне мой бацька... не, не здрадзіць...»

Жанчыны сядзелі ў другім канцы стала, мала ўмешваліся ў размовы мужчын, усё нешта разважалі паміж сабою. Толькі адна Таццяна Ціханчук часам актыўна ўрывалася з якой-небудзь заўвагай і то найбольш злоснай, як, напрыклад:

— Хутчэй у Мікіты Лазуна бяльматае вока стане відушчым, чым ён дачакае хутароў. Мала яму, яшчэ больш на нашую шыю...

І брала з талеркі кавалак мяса, хлеба і, што называецца, закладала на поўны рот.

Пятрусь Хадыка быў супроць хутароў, слухаць не хацеў пра іх і таму зыркаў адзіным вокам, патрасаў кулакамі на Мікіту.

— Уеўся ён мне ў косці...

Гэта дагаджала Барсуку, бо цяпер ён абрабляў зямлю Петруся. Барсук рагатне каротка па-баранняму і не выцерпіць, каб не сказаць:

— Што? Умее заграбаць добра?

Пеця Ціханчук вядзе доўгую гутарку з гімназістам

Кухтам, які яму расказвае пра жыццё ў Віленскай гімназіі, дзе таксама ёсць камсамол. Але там дырэктарам Радаслаў Астроўскі, які ўмее караць за камсамольскія, як ён кажа, выбрыкі. Ужо некалькі разоў выклікаў у кабінет Кухту і папярэджваў. Невядома, што будзе далей... А Пеця ўзмужнеў. Слухае паважна, нават складачка час ад часу застые паміж бровамі. Пад невялічкім зграбным носікам, крыху задраным угару, іскрыцца маладжавы пушок. І валасы выраслі ў чупрыну. Ён мог бы расказаць Віктару Кухту, колькі ён вывесіў сцягоў на бярозах пры гасцінцы, колькі параскідаў лістовак за гэтыя гады, як працаваў з Любаю па зборы дапамогі, каб адаслаць яе ў турму палітзняволеным, колькі разоў хадзіў у разведку ў сувязі з рознымі справамі, каб выведаць захады паліцыі і шкоднікаў са сваіх. Усё гэта для Пеці стала звычайнай, штодзённай работай. Пасля разгрому Грамады парваліся сувязі, аднак Пеця знайшоў Захара Зубца, Максіма Рунду і па іх указанню працягваў сваю справу. Але аб усім гэтым не хоча гаварыць Пеця Віктару — ён ведае, што трэба быць канспіратыўным. Гаворыць аб вечарынках, аб уцёках ад паліцыі. Узрадаваўся быў Пеця, калі ў вёску завітаў Макар Краўчук. Стары Касцевіч паклікаў тады Пецю, і ён зараз жа павёў Макара да Петруся Хадыкі. Там можна жыць, колькі хочаш, і можна гаварыць, што хочаш. Свая сям'я, свая радзіма. І Макар, папрацаваўшы некалькі дзён у Мікіты Лазуна, наняўся потым у маёнтак да графа Ельскага.

Ельскі атрымаў крэдыт ад дзяржавы і адбудоўваецца пасля бітвы з партызанамі. Пакуль што адбудаваў толькі палац, ды і то не ўвесь, а абора і стайня часова зроблены з дошак. Вось Макар і ходзіць з сякерай цяслярыць. Той самы Макар, які ўдзельнічаў тады ў атаках на карны атрад Ельскага, калі полымя шугала над палацам у цёмнае неба, цяпер ходзіць аднаўляць панскі маёнтак. Сумна і прыкра было Макару, калі ён ішоў першы раз да Ельскага. Што зробіш, паноў адразу не пераможаш, але ўсё ж такі пашчапалі ім рэбры добра. Яшчэ прыйдзе на іх ліха. Графскі аканом акінуў тады Макара з галавы да ног — што ж, хлопец, здаецца, ёмкі і быстры.

— Толькі кватэры няма,— сурова сказаў ён,— як сабе хочаш...

Макар адказаў, што ён мае кватэру. На гэтым і пагадзіліся. Але аканом яшчэ дадаў: «Толькі мне тут не займацца рознымі фігамі-мігамі. Не раскідаць пракламa-

цыяў... Ведаем мы гэтую Запаляпку... Але — пабачым. Ідзі абчэсвай вупь тыя бярвенні».

Так Макар і ходзіць кожны дзень у маёнтак і пакуль што здаволены сваім лёсам. Галоўнае, сіл прыбывае зноў. Вярнуўся Андрэй. А тут яшчэ далучыўся і Віктар Кухта, хлопец свой і адукаваны. Не цураецца вечарынак. І танцор жа ўдалы — няма такога ў акрузе. Навучыў моладзь танцаваць «Лявоніху» так, як яны танцуюць у Вільні. І сам заўсёды ідзе ў першай пары. Палюбіў Андрэя і Петруся Хадыку.

Макар Краўчук за бяседным сталом у Сцяпана Касцевіча не асмельваецца прымаць удзелу ў гутарках пра хутары, бо ён не з тутэйшай вёскі: не трэба, каб хто папракнуў яго ў гэтым. Таму Макар часта нахіляецца да Любы, якая ўзмужнела, расцвіла больш сталаю, жаночаю красою. Той самы стрыманы, удумлівы позірк і нячастая ціхая ўсмешка праясняюць яе твар, калі быстры на словы Макар скажа ёй нешта залётнае. Не можа не заўважыць Андрэй, што Макар горнецца да Любы. Але тут жа, як быццам нехта Макара папярэдзіць, штурхне, ён спыніць гутарку і сядзіць ціха, нават крыху задумаўшыся. Яшчэ ў валынскай зямлі. Яшчэ, мусіць, кранае яго тая, яснавокая, што спіць вечным сном, усё не адыходзіць ад Макара, ідзе за ім услед, як цень. І Макар балюча адчувае яшчэ незагоеную рану.

Шмат аб чым гутараць субяседнікі — тут і хутары, і граф Ельскі, які пасля паралічу прыкульгвае на нагу,— усё праз сына, што тады так ганебна зваліўся з каня пад ударам шаблі Сцяпана Каваля, не апраўдаў надзеяў ні памешчыкаў, ні ксяндзоў. У сына ж перасечаны карак і галава не паварочваецца. Цяпер ён недзе ў Варшаве, у кадэцкім корпусе. Усё ведаюць сяляне, нічога не схаваецца ад народнага вока. Ведаюць і тое, што глушэцкі ксёндз Абнорскі меў сустрэчу з папом Іванам Шпаком іменна ў пана Ельскага.

Макар казаў, што доўга гутарылі ў садзе, у альтанцы, толькі невядома аб чым. Якія могуць быць агульныя інтарэсы ў папа з ксяндзом? Дзям'ян Гаргляд махнуў рукою і адрэзаў:

— Адно балота... Адных жабаў разводзяць. Толькі што яны закумкаюць? Пабачым.

— А закумкаюць пяйначай тое, што трэба будзе людзям пацярпець ад гэтага кумкання... Вось табе — нібы ворагі, а бачыш?.. Ашуканства, адно ашуканства! — крык-

нуў Сцяпан Касцевіч так, што аж Андрэй здзівіўся. Узяло бацьку за жывое.

Гаварылі і пра Мікіту Лазуна, што часта ходзіць да графа, што сына-лесніка хоча аддзяліць і што сам хоча ажаніцца, што душыць, не дае дыхнуць меншаму сыну Кузьме, якому ўсе спачуваюць, паважаюць яго, як харошага хлопца. Гаварылі, што не так даўно Мікіта выгнаў Кузьму з хаты, бо ў вуснах святой Барбары на іконе невядома адкуль з'явілася намаляваная алоўкам люлька, з якой, як з самавара, валіў чорны дым. Гэта — нядаўна купленая ікона, яе часова прыбіў Мікіта проста да сцяны, не ўзяўшы ў рамку, пад шкло. І вось вам узяла святая Барбара і задыміла з люлькі. Мусіць, пагледзелася на гаспадара. Адным словам, доўга не заўважалі гэтай люлькі, бо Барбара вісела крыху ў цяньку, аж пакуль нявестка Ульяна не задумала перад нядзеляю выцерці іконы ад пылу і ўпрыгожыць іх новым ручніком. Як глянула на Барбару, так і пляснула ў далоні: «А божа ж мой, што ж гэта зрабілася з Барбарай?» Тады і пачалася бура, ды такая, што аж падлога патрэсквала пад нагамі Мікіты, калі ён кідаўся з аднаго кутка ў другі, каб што схапіць у рукі і сагнаць злосць на сям'і. Якраз і Макар сядзеў на лаве. Адчуўшы небяспеку, вышмыгнуў з хаты. Подбегам імчаў да Хадыкі і ад смеху не мог перавесці духу. Тым часам бярозавы кій пачаў гуляць па спіне Кузьмы. А святая Барбара, як нічога не было, спакойна дыміла і дыміла з люлькі...

Назаўтра Мікіта сказаў Макару:

— Ну, хлопча, работа ў мяне скончана. Можаш ісці, куды табе хочацца.

Калі цяпер успомнілі пра гэтае здарэнне, смяяліся да ўпаду і дзе хто, асабліва Дзям'ян, ціха кідалі вясёлыя позіркі на Макара, які, заняты гутаркай з Любай, трымаў сябе так, як быццам і не чуў, з чаго смяяліся. Нічыпар пакручваў галавою, смеючыся аж да слёз.

— Вось гэта Барбара... Закурыць захацелася. Ну і Барбара...

Так ці інакш, усе гэтыя гутаркі і смехі нічога прыемнага не дадавалі Мікіту не толькі на сённяшні дзень, але і на заўтрашні.

Кацярына Сямёнаўна яшчэ ўсё запрашае гасцей частавацца, ды і сам Сцяпан Паўлавіч не адстае, але дзядзька Анупрэй набівае люльку, акідвае ўсіх вясёлым, адкры-

тым позіркам, дзякуе гаспадыні і прапануе свайму сябру, быламу тэхніку Касцевічу, заспяваць. А Касцевіч кажа:

— Ты ж майстар на гэта...

Пад вусам яго прабегла шальмоўская ўсмешка. Зараз яшчэ нешта дадасць павесялелы гаспадар. І ён дадаў:

— Антоля нядаўна жалілася, што ты ёй галаву адурыў песнямі.

Гэтага досыць было, каб усе зарагаталі і каб стары майстар прыгод Нічыпар паляпаў па плячы Апупрэя.

— Стары вол баразны... не псуе,— сказала пекалькі чалавек у адзін голас.

А гэты «стары вол» пыхнуў дымам з люлькі, і дым закрыў яго твар, яго крыху сарамлівую ўсмешку. Мог бы і ён нешта сказаць сябру Касцевічу з даўняга-бывалага, але... даўняе мінула, ці варта яго ўспамінаць? І зацягнуў песню са свайго карчомнага рэпертуару:

Усе гаварацць, што я ветрана хаджу,
Усе гаварацць, што я многіх люблю,—

І тут падхапілі іншыя:

Сорак любіла, ўсіх пазабыла,—
Ой, адпаго ж я забыць пе магу!

Дыхнула разгулам перажытым, але не забытым. Тут і далёкія чыгункі прыйшлі на памяць, таварыскія гулянкі рабочых і розныя корчмы, дзе пах аўчынных кажухоў, змешаны з пахам гарэлкі, вісеў у паветры, і вясковыя захудалыя зімы з чаднымі хатамі, з босымі дзецьмі на печах... Эх, прападзі яно пропадам!.. Мацней жа звіні, песня, пакуль спяваецца, бо заўтра... Заўтра можа нехта насыпаць на душу атруты, гаркаты...

Пачало ўжо цямнець, як разышліся госці. Доўга яшчэ чулася песня Апупрэя, усё аддаляючыся і аддаляючыся, пакуль не замерла недзе за вёскай у палях...

* * *

Назаўтра на світанні прыйшлі з косамі на луг, на ціхую звілістую рэчку, якая яшчэ спала, усланая туманам, Сцяпан Касцевіч, Дзям'ян Гарагляд, Апупрэй Чарняк, а потым з'явіўся і Нічыпар Байдак, хоць Сцяпан з Дзям'янам яго і не прасілі ўчора.

Касцы ўжо ішлі па другому пракосу, як падышоў Нічыпар з касою.

— Ну, і я да вас... — сказаў ён крыху нясмела.

— Што ж, просім, Нічыпар,— гукнулі ўсе.

— Устаў рана, і так неяк стала сумна аднаму, што не вытрымаў... — апраўдваўся Нічыпар.

— Я думаў, можа, ты не згодзішся, не пасмеў прасіць цябе ўчора,— гаварыў Сцяпан,— станавіся, за кім хочаш.

Нічыпар усміхнуўся. Наперадзе ішоў Анупрэй, і ў Нічыпара зайграла сэрца — памерацца сіламі, як даўней, са сваім дружбаком.

— Што будзе, то будзе,— пусціце наперад.

Анупрэй, затаіўшы ўсмешку, уступіў месца Нічыпару. Косы свіснулі па мяккай расістай траве — касцы пайшлі...

Не вытрымаў яшчэ адзін чалавек, не ўседзеў дома. Гэтым чалавекам быў Андрэй. Клікалі яго сонца, буйныя росы, птушыны гомап. Хацелася зліцца з гэтай урачыстасцю прыроды, удыхнуць водару ў сваю заўсёды напружаную, зацвярдзелую і ў самых глыбінях набалелую душу.

Андрэю, недавучанаму аграному, далі месца з касою апошняму. Толькі Анупрэй, аглянуўшыся праз некаторы час і ўбачыўшы, што Андрэй не адстае, гукнуў:

— Пасля абеду, Андрэй, пойдзеш за мною!

Купка бярозак кустом маячыць на сенажаці. Яна якраз прыпадае на мяжы надзелаў Касцевіча і Гарагляда. Навокал, ва ўсе бакі, сенажатная гладзь — аж да альховага лесу на захад, нідзе няма не толькі кусточка, але нават якога дубчыка. І неба над сенажаццю высокае, яснае. Празрыстыя белыя хмаркі ледзь прыкметна плывуць, астойваюцца і, здаецца, зусім спыняюцца над гэтай купкай бяроз, якія, як сястрычкі, стаяць у кружок, стуліўшыся верхавінамі. Ні ў кога не падымаецца рука з сякерай на гэтыя бярозкі. Наадварот, усе ашчаджаюць, ахоўваюць іх. Там празрыстым кружком, у цяню, свеціць студзёная крыніца. Вось што ахоўваюць бярозкі! Дбалая рука апляла крыніцу зрубікам з лазовага вецця, навокал якога, па ўзнятым пульхным куп'і, растуць некрапутыя кветкі, сваімі белымі, чырвонымі пялёсткамі схіляюцца цераз пляцепнік над вадой. Крыніца не мёртвая, яна жывая — з яе струменіць чыстая, як сляза, ручаіна і ўліваецца ў недалёкую рэчку. Адгэтуль маці бяруць ваду, каб у ёй выкупаць сваіх дзяцей, прыходзяць да крыніцы дзяўчаты, маладзіцы памыць свае твары — пахарашэць. З рознымі немачамі прыходзяць сюды людзі, і кожны ўдзячны крыніцы, кожны нап'ецца з яе, палюбуецца і быццам адпачне душою.

Нездарма ў святую старыну іконы матак боскіх і іншых святых з'яўляліся найбольш над крыніцамі. Ведалі святыя айцы душу народную, ведалі... і ўмела выкарыстоўвалі яе жаданні...

Тут, ля крыніцы, раскінулі свой табар касцы.

Вось ужо сонца ўзнялося высока, ужо і раса апала даўно, а касцы ўсё свішчуць і свішчуць косамі. Як пярэдні стане памянціць касу, спыняюцца і ўсе — менцяць, а потым, як па камандзе, пайшлі зноў шырокімі размахамі кос у наступленне на сенажаць.

Змакрэла белая сарочка на шырокай спіне Нічыпаравага ад патыліцы аж да паясніцы. Пот плыве з-пад шапкі, сцягнутай на лоб на манер кепкі, сцякае па вострым носе, па доўгіх вусах, блішчыць на шчоках. Але не паддаецца Нічыпар і крэкнуць баіцца, хоць адчувае, што духу ўсё менш і менш застаецца ў грудзях. Наступае яму па пяты Анупрэй. «Ах, чорны чорт... усё ж такі...» — думае Нічыпар і з усёй сілы налягае на касу. Хоць бы спяшаўся гэты Анупрэй. Не, ідзе сабе паволына, роўна, і каса плыве, як намыленая. Толькі прыкметна, што ногі яго расстаўлены шырэй, чым у іншых, хоць Анупрэй ідзе выпрастаны, але махае касою як быццам навокал сябе.

Усё часцей і часцей спыняецца Нічыпар вастрыць касу. Змахне рукавом пот з ілба і крочыць далей. Анупрэй жа нават мала і ўпацеў. Сцяпан Касцевіч час ад часу пазірае — раз на купку бяроз, а другі раз на альховы лясок: ці не пакажуцца адтуль яго Кацярына з Дзям'янавай Любай са збанкамі ў руках, з торбамі цераз плячо. Яны павінны прынесці халоднага квасу, які пахне хлебнай рошчынай дзяжы, расцёртай цыбуляй, збанкі з малаком, а ў торбах — хлеб-жытнічак, сала, сыр і нават солі жменьку, завязаную ў палатняны вузялочак... Добры пачастунак будзе касцам — заслужылі яны.

— Нешта нашых доўга няма... — не вытрымаўшы, прамовіў Дзям'ян.

— Павінны быць хутка,— адказаў Сцяпан,— давайце сцішым хаду, а то...

Але вось мільганулі белыя хусткі на ўскраіне лесу, і дзве жаданыя постаці, адна вышэйшая — Кацярына, а другая ніжэйшая — Люба, пачалі набліжацца да касцоў.

Сцяпан падаў каманду — на табар. Усе выцерлі косы жмутамі травы, ускінулі іх на плечы і чарадою — адзін за другім — накіраваліся да прывабнай купкі бяроз.

Наперадзе, як і трэба было, ішоў Нічыпар. Хутчэй,

хутчэй да крынічкі,— там будзе ўсё: і вадзічка, і асвяжэнне, цень і халадок, зелень трапяткіх бяроз і пах кветак.

Жанчыны- гаспадыні рассцелюць у цяньку белы абрус, на якім раскладуць усё смачнае, духмянае. І не можа быць, каб не было яе... чаркі. Будзе, павінна быць, бо як жа — не пасуе без яе.

Касцы павешалі косы на галіны бяроз. І раптам кожнаму здалося, што ён не стомлены, што ён бадзёры, што ён прыйшоў да такой прыстані, дзе можна пазбыцца не толькі клопатаў, але і згрызот, усяго сябе аддаць пагоднаму адпачынку. Але гэта якраз і сведчыла, што касцы стаміліся. Нічыпар зняў шапку, і шырокая лысіна і разгладжаныя маршчыны на лбе бліснулі пад сонцам. Адступілі на некалькі крокаў касцы ад крыніцы, сталі на калені і, нагнуўшыся над ручаінай, поўнымі жменямі палівалі сабе на твары, на галовы, на шыі гэтую серабрыста-гаючую ваду, якая заўсёды была халоднай і зімою ніколі не замярзала. Пыхкалі, як бабры, кракталі ад задаволення мужчыны, а над імі стаялі Кацярына і Люба з ручнікамі ў руках.

— Сядайце,— запрашалі жанчыны за той пунадны абрус, на якім ужо ўсё было гатова для абеду. Хто сеў, хто лёг. Стаіць міска з квасам, нарэзана сала, сыр, ляжаць нават яечкі, перад кожным лыжка. Ну што ж, можна пачынаць. Апошнім мастакуецца на сваім месцы Сцяпан Касцевіч. Усе чакаюць яго каманды. Але штосьці марудзяць Нічыпар з Ануфрэем, не хапаюцца за ежу, нават раз глянулі адзін аднаму ў вочы і сціха пацiснулі плячыма. Што гэта? Няўжо? Не можа быць...

Стары Касцевіч яшчэ адкасвае рукавы, зашпільвае іх, і нічога нельга разгадаць на яго твары. А гэтыя жанчыны, як знарок, усё адно і тое ж: «Чаму не пачынаеце, чаму не ясце?» Хоць бы ўжо сціхлі. Вось стары Касцевіч ужо гатовы, ужо кажа: «Ну, што ж, пачынаем...» — і працягнуў руку па хлеб.

Збянтэжаныя, пасумнелыя працягнулі рукі да ежы і Нічыпар з Ануфрэем. «Вось табе і Касцевіч, вось табе і сябра»,— гаварылі іх твары. Але... нават і Дзям'ян Гараглядзглянуў у бок Сцяпана, трымаючы скібку хлеба ў руцэ. А Сцяпан... Ох ты, Сцяпан, любіш пагграць на цярплівасці сяброў, але гэта табе не будаванне чыгункі, калі часам не хацеў адпускаць рабочых дахаты, пакуль не скончаць вызначанай на дзень работы. Сцяпан пляснуў сябе па калене, крыкнуўшы: «Ах, я дурны, што я нарабіў!»

І зараз жа ўсхапіўся і пайшоў на другі бок крынічкі, да ручаіны. Там, з купінкі травы на самым беражку выняў з вады вялікую цёмную бутэльку з гарэлкай, настоенай на перцы — моцную, халодную. Даўно хаваў яе ў каморы для касьбы. Захацелася яму зрабіць сябрам песпадзяванку, засакрэціць яе, а потым... адкрыць. Ну, і засакрэціў так, што ледзь пра яе не забыўся. Але калі адкрыў гэты сакрэт, гоманам, смехам радасці сустрэлі яго сябры. Вядома, штукар Касцевіч. Не, яшчэ ні разу не было таго, каб ён падвёў сваіх прыяцеляў. Не толькі бутэльку, нават і чарку схаваў у крыніцу, каб была чыстая, халодная. І яна пайшла ўкругавую з благаславеннем, жартамі, прыказкамі, і расло, квітнела пачуццё дружбы ў сэрцы кожнага. Рогатам заліваўся сам стары дружбак Касцевіч. Не пазнаць яго.

Зноў на арэну выплыў Мікіта Лазун. Загаварыла аб ім Капярына Сямёнаўна. Вестка была даволі-такі «важная». У графа Ельскага здох сабака — стары ганчак. Засмуціўся граф па ім. Сын Мікіты, графскі лясиік, прыйшоў і перадаў волю графа, каб сам Мікіта прыбыў да яго.

— Што, можа, труну рабіць? — адазваўся Апупрэй з іроніяй.

— Можа, купаць? — сказаў Дзям'ян.

— Можа, аплакваць? — прамовіў стары Касцевіч.

— Можа, спавіваць? — буркнуў Нічыпар.

— А можа, пад хвост... — гаркнуў з рогатам яшчэ раз Дзям'ян.

Так і не даведаліся, навошта граф паклікаў Мікіту. Апупрэй тым часам пачаў расказваць старую падняволыную быль. Уступ да расказу прарываўся рогатам.

— Некалі расказвала мая маці, як у пані Палубінскай здохла сучка... Ха-ха-ха!.. Для пані, каб яна лопнула, нічога не было даражэй за гэтую сучку... Ну, гм... Паклікала яна тваю бабку, Сцяпан Паўлавіч... тваю бабку па бацьку, з Буславіч, каб яе, гэтую падлу, аплакваць. Бабка твая тады была яшчэ маладою і хораша спявала... Яна прыходзіла ў панскі двор з дзяўчатамі вадзіць карагоды, весяліць пана і паню... Ну, што ж...

Апупрэй праглынуў хлеб з салам, запіў малаком, выцер ручніком губы і гаварыў далей:

— Ну што ж... Гэта было пры паншчыне. Паспрабуй не паслухацца пані, цябе так высекуць, што і ты пойдзеш у магілу за гэтай дохлай сучкай... А калі твая бабка, Сцяпан Паўлавіч, была спявачка, дык пані рассудзіла так, што і

аплакваць яна будзе хораша... Не хацела маладзіца ісці, плакала, але маці, каб не было бяды, накрычала на яе... Ну, нічога не зробіш, выцерла яна слёзы і пайшла. Прыходзіць. Бачыць, сучка ляжыць на канапе, на разасланым дыване, а перад ёю сядзіць, падпёршы шчаку кулаком, заплаканая пані.

— Ну, як жа, такі нябожчык...— уставіў Дзям'ян.

— Ах, ах... — крэкнуў Сцяпан і паківаў галавой.

— Вось чортавае ліха,— дадаў Нічыпар.

— Хутчэй бы тая пані здохла разам з сукай, чым я пайшла б... — уставіла Кацярына.

— Пачакайце, пачакайце,— спыняў іх Ануирэй, адмахваючыся рукою.— Што ж было далей? Пані і гаворыць маладзіцы: «Бачыш, Аксеня, якое ў мяне гора... Плач, Аксеня, плач... Мне лягчэй будзе... такая была мілая сучачка». Так і сказала. А потым да гэтай сучачкі: «Чуеш, Лялюся, як мы цябе шкадуем?» І паківала галавой: «Нічога яна ўжо не чуе... Плач, Аксеня...»

— Вось старая сука,— забурчаў Дзям'ян.

— Каб той пані на тым свеце сукай стаць... — не вытрымала Кацярына.

Андрэй і Люба сядзелі воддаль пад бярозаю і рагаталі.

— Заплакала Аксеня,— расказваў далей Ануирэй.— Ну, як заплакала? Закрыла для віду твар рукамі і пачала хадзіць па пакоі з кутка ў куток і прыгаворваць...

Ануирэй прыклаў правую далонь да шчакі, заківаў галавою то ў адзін, то ў другі бок, як гэта робяць бабы, сумуючы, і пачаў паказваць, як прыгонніца Аксеня аплаквала панскую сучку:

— А мая ты сучачка-а-а... — цягнуў Ануирэй тонкім голасам,— а чаму ты не бегаеш?.. А ты была такая жывенькая-я-я-я... А ты скакала-а-а-а... А ты брахала-а-а-а...

Ануирэй перастаў «плакаць» і загаварыў зноў:

— А пані слухае галошанне Аксені і ўсё ўздыхае і падтаквае: «Так было... так было...»

І зноў забурчалі слухачы. Кацярына з прыкрасці нават плюнула.

— А Аксеня ўсё плача,— гаварыў Ануирэй, ледзь стрымліваючыся ад смеху.— Плача і прыгаворвае: «Ах, мая ты сучачка-а-а-а... А чаму ты хвосцікам не віляеш? А я, бывала, іду-у-у-у... а ты хвосцікам віль-віль...» Тут пані зноў заківала сваёю мазгаўнёю і гаворыць: «Ах, так было... так было... Ну, што ж, трэба хаваць...»

— А як жа... такую ды важную персону... — зазначыў Дзям'ян.

— ...Дала пані шаўковую галандскую коўдру... Абкруціла Аксеня тую сучку ў гэтую коўдру і разам з батраком панеслі яе да магілы... Прыйшлі туды... Сталі... Агледзеліся — нікога няма... Адразу ж коўдру разрэзалі папалам. Аксеня схавала сваю частку пад спадніцу, а батрак запхнуў за пазуху. А сучку кінулі з размаху ў яму і засыпалі... Вось і ўсё...

— Усё ж такі задарма не плакала,— сказала Кацярына.

— Потым... Потым... — Анупрэй, аказваецца, яшчэ не скончыў усёй гісторыі.

Праз год пашыла сабе Аксеня каптан з гэтай коўдры... Каптан быў жоўта-чырвоны, блішчаў. Апранала яна яго толькі ў святы, і дзеці талакою беглі за Аксеняй, каб толькі паглядзець на яе каптан... Бо ні ў кога не было такога дарагога і харошага...

— Каб ты прапаў, патаміў ты ўсіх сваёй сучачкай,— па-старыкоўску грудным голасам рагатаў Нічыпар і паляпваў Анупрэя па спіне.

— Ды сціхніце вы, лепш наліце яшчэ па чарцы,— запрасіла Кацярына.

Стары Касцевіч наліў чарку і сказаў:

— Віп'ем за тое хіба, каб здыхалі панскія сабакі...

— Во, во,— падхапіў Дзям'ян,— каб мы іх не хавалі. А калі хаваць, дык разам з панамі.

Калі чарка дайшла да Анупрэя, ён кіўнуў да суседа Нічыпара:

— Ну, будзь здароў... Як? Пойдзеш зноў наперадзе з касою?

Падабрэўшы ад чаркі, Нічыпар адказаў:

— Хай ты згары... Замарыў ты мяне касою... Не, брат, здаюся. Ідзі ты. Пабачым... Косіш — ну, проста рукі праўцом становяцца. А ён сабе як пагульвае... Ні на здароўе.

— Бачыў, бачыў, як ты са скуры вылазіў... — смяяўся Анупрэй,— але яшчэ сілу маеш, не бядуй...

Пасля абеду Анупрэй раскрываў сакрэт сваёй касьбы. Паклікаў Андрэя, каб той агледзеў усё дакладна.

— Вы ж косіце не на ўсю касу,— павучаў Анупрэй,— а зразаеце траву больш вяршком. Трэба браць траву на ўсю касу... І тут хутка не размахнешся, а ідзеш павольна, бо ёсць што пацягнуць, але затое ў пракос кладзецца за адным махам у два разы больш.

І Анупрэй, каб паказаць на прыкладзе, некалькі разоў махнуў касою па траве.

Усе пільна глядзелі, як пад вастрыё касы набіраецца шырокая паласа травы.

— Толькі не трэба спяшацца, а то саб'ешся на нос... — навучаў Анупрэй.

Кожны па парадку паўтараў прыём Анупрэя, а ён ішоў ззаду і выпраўляў недахопы. Асабліва сачыў за Андрэем.

— Спакайней... Спакайней... Вось так! Вось так... Каб каса хадзіла так, як у цябе пяро па паперы... Папацееш раз, затое потым рукі пойдуць лёгка... Усё трэба ўмець. Не трэба сячы траву, а трэба яе зразаць, каб вастрыё ішло наўскасяк травы... У круг касою... У круг. Тады і сілы трэба менш.

Андрэй пайшоў услед за Анупрэем, хоць скура на жываце так балела, як быццам яна парвалася.

«Такт, разлік, пачуццё меры... усюды яны патрэбны... — падумаў Андрэй.— Розум чалавечы прабівае сабе дарогу да гэтага, а значыць — да мудрасці... Добра з народам».

І рукі Андрэя ўсё больш набіраюць упэўненасці, адразу адчуваецца кожны няправільны рух — на яго рэагуе ўжо ўся істота. Крок за крокам, крок за крокам праз выпраўленне памылак — наперад і наперад...

Дакасіць да канца дня Андрэю не давялося. Касцы ўбачылі, як да іх напрасткі бег солтыс Барсук. Ён перадаў Андрэю паперку з староства — з'явіцца заўтра ў дзесяць гадзін раніцы ў кабінет самога пана старосты. Барсук пайшоў, а ўсе стаялі навокал Андрэя і глядзелі на гэтую таямнічую паперку са штампам і пячаткай, з віхрыстым подпісам начальніка канцылярыі. Думалі, гадалі,— што б гэта такое магло быць? Стары Касцевіч нават папрасіў:

— Прачытай яшчэ раз.

Андрэй прачытаў уголас. Не, нічога не здагадаешся. Усё тое самае — не прыбавілася ні слова лішняга. Трывога і недаўменне ахапілі ўсіх. Анупрэй пачухаў за вухам і выказаў сваю здагадку:

— А можа, якую пасаду хочуць даць?

— Дзе там? — запярэчыў бацька Андрэя.— У іх сваіх хапае... Ого, пасаду. Захацеў.

Барсук яшчэ сказаў, што прыехаў зямельны начальнік з войтам і, калі ўсе людзі прыйдуць з работы, будзе сход. А потым дадаў загадкава: «Няйначай, пра хутары будуць гаварыць...» Усе пераглянуліся паміж сабою і сціхлі.

Касілі моўчкі, задуманыя,— дакошвалі.

Прыбег Пеця Ціханчук засопшыся і адразу гукнуў:

— Андрэй, прыйшоў ганец ад Захара Зубца...

Андрэй ускінуў касу на плячо і пайшоў дахаты. Хараство сенажаці і працы на ёй скончылася. Трэба ісці ў вёску, якая адгэтуль здаецца не сваёю, нават забытай. Чаму ж так не хочацца ісці туды? Забраная яна — гэтая вёска... Прыехалі са сваімі парадкамі ворагі. Яны нікому тут не патрэбны. Яны гэта ведаюць і таму наймаюць сабе дапаможнікаў... Пеклам здаецца вёска...

* * *

У хаце солтыса Барсука за шчыльным натоўпам людзей не відаць з парога, хто сядзіць на покуце. Лямпа гарыць на стале, і здаецца, што яна быццам апушчана некуды ў яму. Андрэй стаў на парог і ўбачыў пасівелага войта з чырвоным мясістым тварам. Валасы ў войта такія, быццам хто іх месцамі павыскубаў. Напаўапушчаныя вусы тарчалі ў бакі, як стрэлкі. Вялікі жывот упіраўся ў стол, амаль узлазіў на яго. На грудзях, ля левага барта шэрага касцюма, віселі ваенныя ўзнагароды: крыж «Virtuti militari» і два «Крыжы харобрых». Гэта сядзеў асаднік Буякоўскі, былы афіцэр легіёнаў Пілсудскага, які атрымаў у Глушэцкім павеце шэсцьдзесят гектараў зямлі. Ля яго схіліўся над паперамі сярэдніх год прылізаны зямельны начальнік, а побач углядаўся ў людзей чорнымі вачыма смуглявы гогамасць — зборшчык падаткаў — секвестратар. У канцы стала моргаў бяльматым вокам Мікіта, паклаўшы рукі на калені. З-пад яго крыху расхрыстанай сарочкі, з густымі зборкамі навокал каўняра, непрыкметна высунуўся нагрудны пажоўклы крыжык на чырвонай суконнай стужачцы. Мікіта гэта не заўважае, і крыжык тарчыць, павярнуўшыся рубам, як быццам ён вылез знарок напаказ. Солтыс Барсук сядзіць на лаве ў пачэсным аддаленні ад войта — так з паўметра, скрыжаваўшы рукі на грудзях. Яго вочы глыбока ўваліліся ў арбіты і застылі спалоханым бляскам. Два паліцыянты аперліся на вінтоўкі — стаяць, як на варце, з атупелымі тварамі. Без дазволу войта яны не сядуць.

Паны ўсё нешта пішуць, а людзі стаяць і маўчаць. Толькі чуе Андрэй, стоячы на парозе, як за яго плячыма, на кухні, нехта ўпаўголаса гаворыць: «Але ж і сала ў гэтага войта... Паглянь, настаяшчы вяпрук...» І людзі лезуць на парог, каб наглядзецца на пілсудчыкаўскае дзіва, заплыўшае тлушчам. «А вочы... Ну, чыста, як у парсю-

ка... як дзіркі...» Пра секвестратара кажуць, што нехта яму нос звярнуў набок, што аж горбік уздуўся на пераноссі. Нехта ўжо даведаўся, што ён белагвардзеец, служыў у Дзянікіна, а потым у Балаховіча. Прызналі гледачы, што чорныя вусы ў яго, як у чорціка, што нехта як быццам памазаў іх дзёгцем. Не праміпулі і муштука, з якога курыў секвестратар,— муштук выглядаў, як маленькая люлечка. Адзін кажа: «Мусіць, нейкім палкоўнікам быў, бачыш, як шчокі выгалены...» А другі адказвае: «Халера яму быць палкоўнікам... Можа, хіба боты палкоўніцкія аблізваў, гаршкі выносіў... От, валацуга нейкі... Ці ж такія палкоўнікі бываюць?» А трэці дадае: «Добры чалавек за секвестратара служыць не пойдзе...» Толькі, бадай, нічога не кажуць пра зямельнага начальніка, бо гэты прыстойны, нават прыгожы... Але ўсё роўна адзін дзядзька параўнаў яго з лакеем з рэстарана.

Спіна Дзям'яна Гарагляда абціраецца аб грудзі Андрэя. Недалёка стаіць Анупрэй Чарняк і смокча люльку, выпускаючы дым паверх галоў людзей. Нічыпар стаіць крыху наперадзе, глядзіць на лямпу, як у царкве на свечку. Стары Касцевіч прыпёрся плячом да сцяны насупраць стала і спадылба паглядае на панскія персоны. Нешта гнеўнае застыла пад яго бровамі ў апушчаных вачах. Здаецца, ён нема пытаецца: «Ну, чаго гэтыя людзі хочуць ад нас? Яны ж нам зусім чужыя...»

— Не курыць,— сказаў войт,— а то душна...

Праўда, дымок ад люлькі Анупрэя плыў у адчыненыя вокны, але ўсё роўна войту не спадабалася, і ён загадаў не курыць. Яго загад зараз жа паўтарылі паліцыянты.

— Хто там курыць? Не курыць...

Анупрэй прыглушыў люльку вялікім пальцам і сунуў у кішэню. Урэшце войт калыхнуўся ў адзін бок, у другі і ўстаў. Аж зарыпелі крагі. Пачаў адразу:

— Мы прыехалі да вас пагаварыць пра хутары. Мы ведаем, што ваша вёска бедная, і таму хочам, каб яна была багацейшая... Адзіны сродак для гэтага — хутары... Трэба зараз усім падпісаць вось гэты пратакол...

І войт прачытаў пратакол. Потым дадаў:

— Пасля падпісання пратакола і зацвярджэння яго старостай увосень прыедуць каморнікі і разам з камісіяй пачнуць абмяраць участкі зямлі, хто колькі мае. Сёння ж трэба будзе выбраць камісію з вашых мясцовых гаспадароў. Яна будзе кіраваць усёй работай з дапамогай — вось — пана комісажа.

Войт скончыў, выцер хустачкаю лоб і, паклаўшы пратакол на стол, пачаў запрашаць людзей падпісваць.

Ніхто не скрануўся з месца. Усе па-ранейшаму маўчалі. Войт сеў, ці, дакладней кажучы, рухнуў на лаву з грукатам. Абвёў усіх вачыма.

— Што ж... смялей, смялей! Падыходзьце, падпісвайце... Гэта ж для вашага дабра,— запрашаў войт.

Але ніхто не падыходзіў. Тады войт спыніўся позіркам на Мікіту Лазуну.

— Пане Мікіта, што ж вы?

Мікіта заварушыўся і ўстаў. Правае вока заморгала так хутка, як быццам на яго пачало нешта капаць.

— Старыкі...— вымавіў ён сухім голасам,— даўно мы чакаем хутароў, а вось, калі пан войт прыехаў, каб зрабіць нам гэтую ласку, ніхто не хоча падпісваць пратакола...— А вока — морг, морг. Мікіта павысіў голас: — Як жа гэта? Мы людзі ці не людзі? Га?..

— А чаму ты не падпісваешся?! — гаркнуў Дзям'ян Гарагляд.

— Хіба, можа, ты адзін хацеў хутароў?! — выкрыкнула ўслед Тацяна Ціханчук.

Сход заварушыўся, зашумеў...

— А каму якая будзе зямля?

— Бо ёсць лепшая, ёсць горшая!..

— Нас не ашукаеш!

— Мы не хочам хутароў! — крыкнуў Пеця Ціханчук у агульным шуме.

Войт з кожным выкрыкам кідаў позіркі то ў адзін бок, то ў другі і стукаў алоўкам па стале. Яго галоўка, якая сядзела проста на плячах (бо той шыі і не відаць, ёсць яна ці няма), круцілася, як якая юла на шпяні. Урэшце ён крыкнуў па-начальніцку:

— Цыц!

Ад такога раптоўнага крыку сход сціх. Войт падсунуў пратакол Мікіту, паказваючы пальцам, дзе трэба падпісаць.

Мікіта прыўзняўся і сказаў:

— Я, пане войце, непісьменны. Няхай за мяне падпішацца мой сын.

Сын, графскі ляснік, выскачыў аднекуль збоку, падышоў да стала і падпісаў пратакол.

Мікітаківаў Нічыпару, але бачачы, што Нічыпар не крапаецца з месца, загаварыў:

— Нічыпар, чаго ж ты? Ідзі, падпісвайся...

Нічыпар чмыхнуў у нос і адказаў, паціснуўшы плячыма:

— Я не багацей, каб першаму падпісвацца.

Стары Касцевіч усміхнуўся пад вусам, а ў Мікіты раптам перастала моргаць бяльматае вока.

— Не чакаў ад цябе гэтага, Нічыпар,— адказаў ён злосна,— гультаям патураеш.

— Што зробіш? Некаторыя і мяне гультаём называюць. Язык без касцеі...— не застаўся ў даўгу Нічыпар.

— Добра гаворыць,— сказаў, звярнуўшыся да Андрэя, Дзям'ян.

— А ты, Мікіта, робіш на людзей ці людзі на цябе? — не вытрымала Тацяна Ціханчук.

— Заткні свой язык, ведаеш куды? — адазваўся Мікіта.

— Ты мне языка не даў і не загадвай. Толькі табе можна гаварыць, а мне то — не...

— Ты мне травы не выжынай на сенажаці, паскудніца! — гыркнуў Мікіта.

— Каб цябе рэзала па тваіх вантробах, калі я тваю траву ў вочы бачыла.

Па людзях, як шолах лісцяў, прабег ціхі смяшок.

— Даволі сварыцца,— загадаў войт,— трэба падпісваць пратакол!

— Пане войце, а як будзе з сервітутам, калі будуць хутары? — спытаўся стары Касцевіч.— У нас з графам Ельскім сервітут.

— Сервітут? — перапытаў войт.— Сервітут будзе скасаваны. Кожнаму — сваё...

Такі адказ стаўся іскрай — жанчыны выбухнулі як адна:

— А дзе ж мы будзем пасвіць кароў? Спрадвеку было так, а цяпер? Што ж гэта за права?

— Тады па чорта гэтыя хутары!

— Гэта толькі на руку пану!

— Ён і так багаты, а тут яму яшчэ!

І пайшло, і пайшло...

Адны перабівалі другіх. Крыкі зліліся ў гоман, у гул, што здавалася, сцены хаты Барсука не вытрымаюць, разыдуцца і гоман выльецца з задухі на прасторы.

Войт зноў падняўся. Бровы над запухлымі вочкамі нахмурыліся.

— Відаць, што добра папрацавалі тут камуністы! — ужо завярашчаў войт.— Мы ведаем Запалянку! Мы пры-

кладзём усе старанні, каб вытруціць бальшавіцкую заразу! Была ў вас Грамада — яна вам нічога не дала. Тое самае дадуць вам камуністы і цяпер...

— Бо вы ж Грамаду разбілі! — гукнуў Дзям'ян Гарагляд.

— Хто там так гаворыць?! — спыніўся войт і вочкамі свідраваў натоўп, які застыў у напружаным маўчанні.— Глядзіце, каб з вамі не было дрэнна,— прыгразіў войт і працягваў сваё: — Вам тут не Савецкі Саюз, дзе можна хуліганіць, на бога пляваць... Тут — Польшча і будзе Польшча!

Жанчыны на сваёй прастаце гукнулі, не далі войту дагаварыць:

— Пусціце нас у Савецкі Саюз хоць зараз... Мы не баімося! Што вы нас страшыце Саветамі? Горшага пекла, як тут, мусіць, няма нідзе на свеце... Зрабілі гэтую халерскую граніцу, і душыся тут, як у пекле. Каму яна патрэбна, гэтая граніца?!

Апошнія словы выкрыкнула тая ж Тацяна Ціханчук.

Жанчыны крычалі, а мужчыны, хоць не ўсе, дадавалі: «Правільна! Правільна!»

Войт ужо рабіўся то чырвоны, то белы. Ім авалодвала бяссільная злосць.

— Калі яшчэ раз пачую падобнае, зараз жа на месяцы арыштую, пся крэў! Будзеце падпісваць пратакол ці не?! Ну, ты першы падпісвай!..— звярнуўся войт да пярэдняга селяніна.

— Чаму-то я першы? — азваўся той.

— Цо?! Арыштаваць яго! — кіўнуў войт паліцыянтам. Тыя схапілі селяніна пад рукі, а войт паўтарыў:

— Будзеш падпісваць ці не?

Спалоханы селянін кіўнуў носам у знак згоды.

— Пусціце яго! — загадаў войт.

Паліцыянты пусцілі. Селянін падышоў да стала і пры агульным зласесным маўчанні дрыжачаю рукою падпісаўся на пратаколе. Адвярнуўся ад стала бледны, сагнуты, з апушчанымі вачыма.

— Ну, наступны! — загадваў войт.

Падышоў і наступны, падпісаўся.

Вынырнуў невядома адкуль жабрак Рыгор Малахай і, кланяючыся, загаварыў ліслівa:

— Паночку, я бедны, але я хачу падпісацца... Няўжо-такі панкі нас пакрыўдзяць? Колькі ў мяне той зямелькі, няхай будзе ў адным кавалачку...

І, сагнуўшы спіну ў падраным каптане, доўга выводзіў каракулямі сваё прозвішча. Скончыў, зноў пакланіўся войту і зайграў галаском:

— Няхай будзе ўсім на памацунак... Ах, божа, божа, матка найсвентша...— выводзіў, адыходзячы, Малахай,— пусціце, людцы, прапусціце... Ах, збавіцель высокі...

— Вось бедны... а падпісаўся... Ён зразумеў карысць хутароў... А вам Саветы сніцца, у калгасы хочацца, дзе ніхто сваёй зямлі не мае. Дурні! — даводзіў войт.

Так і пачалі падпісвацца патрохі адзін за другім. На кухні клялі Малахая. Нехта з хлопцаў у сенцах падставіў яму нагу, і Малахай грымнуўся, як калода.

— Ой, што ж гэта? Ой, адкуль гэта? Ой, свету божага не бачу,— стагнаў, устаўшы, Малахай.

— Гэта ты, дзядзька, спатыкнуўся,— сказаў нехта.

— А можа, а можа... Хай мяне бог сцеражэ ў другі раз ад такой напасці.

Трывога авалодвала Андрэем. Падпісваюцца. Вядома, пад прымусам, але падпісваюцца. Як павярнуць назад гэтую хвалю? Дзям'ян Гарагляд кажа, што трэба ісці дахаты, пакідаць сход, клікаць другіх за сабою.

— Не, не выйдзе цяпер... Позна. Дый паліцыя заўважыць...

Прабіраўся да Андрэя і Пеця Ціханчук з нямым пытаннем — што рабіць? Сказаў — можа, падысці, нібы падпісацца, і парваць пратакол?

— Арыштуюць, Пеця, не трэба. Можа, хіба...— і Андрэй шапнуў нешта Пецю на вуха.

Пеця кіўнуў сваім носікам і адышоўся.

Вось памкнуўся ўжо ісці падпісвацца і Нічыпар Байдак, але ззаду пацягнуў яго за каптан Анупрэй. Нічыпар агляднуўся, убачыў мігі на нахмураным твары Анупрэя і спыніўся.

Ціхенечка, як крадучыся, прабіраўся наперад да стала Пятрусь Хадыка. Паліцыянты ведалі яго і правялі з некаторым здзіўленнем. Пошапкі пайшлі і па людзях. Няўжо і ён, як Рыгор Малахай? Войт глянуў на адпавокага чалавека, агледзеў з галавы да ног і з поткай нават зычлівасці спытаўся:

— Што — на вайне быў?

— Так, на вайне,— адказаў Хадыка.

— Вось нават інваліды падпісваюцца... Што значыць...— з задаваленнем пераможцы гаварыў войт.

Зямельны «комісаж» падаў Петрусю ручку з пяром. Як жа не падаць? Можа, чалавек і недабачыць? Вока ў яго адно, а не два, як у іншых.

Пятрусь узяў ручку ў левую руку.

— Вазьмі ў правую, у правую,— падказалі разам і войт і «комісаж». Апошні падсунуў бліжэй чарніліцу.

Пятрусь пераклаў ручку з левай рукі ў правую і намачыў пяро. Пачаў пісаць. Нешта, мусіць, мала чарніла ў гэтай панскай чарніліцы, бо Пятрусь пацягнуў руку зноў да яе. І як гэта здарылася, ніхто не заўважыў, ды ніхто і не думаў, што так можа здарыцца. Ці паспеў вынясць Пятрусь пяро з чарніліцы, ці не, толькі тая чарніліца неяк нават крыху падсунулася наперад і раптам легла на бок. Ой, што ж гэта? Людзі аж войкнулі ў адзін голас, а потым ледзь стрыманы смех пракаціўся з кутка ў куток. Ну, як жа не смяяцца? Пратакол з белага ўвесь зрабіўся чорным, нават бліскучым. І чарніла кропелькамі пацякло са стала на падлогу. Пятрусь стаяў як разгублены, з растапыранымі рукамі і ўсё паўтараў:

— Ой, што ж я нарабіў! Ой, што ж я нарабіў!

Войт пачырванеў, зыркнуў злоснымі вачыма на Петруся. Потым вырваў у яго з рукі ручку і кінуў на стол.

— Няздара! — прашыпеў ён з прысвістам.— Няздара! Быдла!

Зямельны начальнік утуліў галаву ў плечы і, спалоханы, збянтэжаны, не ведаў, дзе сябе дзець.

— Уся работа пайшла намарна! — сыкнуў на яго войт.— Вы адкажаце перад старостам... Людзі не падрыхтаваны...— А потым накінуўся на Барсука:

— Солтыс! У цябе няма парадку! З'явіцеся да мяне заўтра ў гміну... Прэч да д'ябла з гэтым пратаколам! Забраць!

Барсук хуценька, сагнуўшыся ў крук, услужліва схапіў двума пальцамі за ражок счарнелы пратакол і панёс яго на кухню, распіхаючы людзей. А людзі ціснуліся ўбок, асабліва жанчыны, і перасцерагалі: «Ой, не абпэцкай. Няхай яго...» Солтыс нёс няшчасны пратакол і разам з ім нёс пад сваім вялікім носам схаваную ў вуснах усмешку. Баяўся глянуць каму-небудзь у вочы, каб не сустрэць такога самага прыхаванага смеху.

А войт тым часам надзеў кепку, апрануў плашч і, узяўшы пад паху партфель, выйшаў з-за стала.

Жоўтыя бліскучыя крагі рыпнулі на тонкіх нагах, над якімі напханым мяшком звісаў жывот. Ён падпіраў

пад грудзі, і крыжы не віселі на грудзях, а неяк папаўляжалі.

Войт акінуў вачыма ўсіх і на развітанне сказаў:

— Пагаворым яшчэ з вамі іншай мовай! З вамі дабром нельга!..— Кіўнуўшы паліцыянтам, каб ішлі за ім, пачаў праціскацца да выхаду. Людзі з нейкім жахам глядзелі на жывот і на карак войта і кідаліся ўбок, як ад пачвары, каб даць яму праход. Следам за паліцыянтамі па абавязку, так сказаць, службы ішоў і солтыс Барсук.

Андрэй стаяў на парозе і, калі ўбачыў, што набліжаецца войт, саступіў з дарогі. Але войт паспеў зачапіць локцем Андрэя, і позіркі іх на момант сустрэліся. Андрэю нават здалося, што войт хацеў загаварыць, але, відаць, яму цяпер было не да гэтага.

Пасля таго як войт пайшоў, людзям стала вальготней. Пачаліся нават ціхія гутаркі. Толькі Мікіта сядзеў, нібы сам не свой, і бяльматае вока застыла, як мёртвае. Ён пайшоў бы ўжо дахаты, ды нельга, бо яшчэ сядзіць начальства.

Вярнуўся з вуліцы Барсук, і сярод людзей пранеслася: «Паехаў ужо...» Гэта пра войта. Але сядзіць яшчэ адна скула — падатковая. Што яна скажа? А гэтая скула ўжо шамаціць сваімі паперамі, збіраецца пачаць спавядаць. Ох жа ж, і абрыдлі яны!.. Голас сцегача падаткаў загуў як з трубы. Сцягач гаварыў:

— За вашай вёскай шмат нядоімкаў... Трэба іх у найкарацейшы тэрмін выплаціць, інакш будзе наложаны секвестр...

Людзі ўжо добра ведалі, што азначае панскае слова «секвестр». Калі ў каго няма грошай на падаткі, дык гэты сцягач забірае палатно, адзежу і наогул што хоча. Вядомае гэтае слова, хоць сяляне ніяк не могуць яго вымавіць. І з секвестра зрабілі «сальвестара». Тым больш што ў вёсцы быў селянін Сальвестр, які меў славу злодзея. Вельмі ўжо ўмеў красці — на полі, у агародзе і ў хатах. Так яно і павялося ўжо, што людзі палохалі адзін аднаго: «Вось сцягач напусціць на цябе Сальвестара, тады пазнаеш...»

А труба срыхонская гула сваё:

— Дзяржава не можа жыць без падаткаў... Заўсёды так было... Вы, напэўна, помніце старыя часы?.. Плацілі ж падаткі і жылі, не гінулі...

Жанчыны шапталіся: «І чаму ў яго такі голас, як быццам хто яму трубу ўставіў у горла? Можа, не выспаў-

ся?» — «П'янстваваў, мусіць...» — «А што ж ім... Грошы бяруць. Чаму ж не піць?»

— Падаткі-то падаткі,— азваўся Сцяпан Касцевіч,— лёгка іх браць, але цяжка зарабляць.

— Вы думаеце, што толькі вы робіце,— загула труба,— я вось таксама раблю, зарабляю на кавалак хлеба, сяджу, начэй не дасынаю... Хоць і маю гемарой...

І зноў нейкае слова незразумелае, чорт яго ведае, што яно азначае, ці дабро, ці ліха...

Пасля гэтага слова Андрэя распірала ад смеху. Стоячы на парозе, ён трымаўся за вушак, каб не зваліцца. Дзям'ян Гарагляд агляпуўся і шэптам спытаў, што гэта за слова. Калі ж даведаўся, узмахнуў рукамі і затуліў рот, каб не засмяяцца. Вочы заморгалі па-шальмоўску. І Дзям'ян выпаліў як з куста:

— А нам напляваць на ваш гумарэй!

Выбух смеху пакрыў словы Дзям'яна. Сцягач толькі паморшчыўся і схіліў нос над паперамі.

Дзям'ян працягваў:

— Вось жыта патанела ўжо, хаты развальваюцца, скаціна не прыбывае, а ўбывае. А вы — гумарэй. Нашы людзі без дактароў лечацца, бо за адзін дзень у бальніцы бяруць пяць злотых.

— Ну, даволі, даволі,— спыняла труба,— разышоўся...

— Тут, пане, у нас шаптуха ёсць, дык, можа, яна вам пастудзіць на ваш гумарэй...— не ўнімаўся Дзям'ян.

Смех перакочваўся хвалямі з кутка ў куток, што аж сцягач вымушаны быў устаць.

Стукаючы алоўкам па стале, трубіў:

— Паўтараю... дзяржава не пагодзіцца з тым, што вы не хочаце плаціць падаткаў. Яна сваё возьме... І тады будзе горш.

— А нашто нам гэтая дзяржава? Яна — ваша, дык і давайце ёй! — гукнула з другога кутка Тацяна Ціханчук.

Сцягач узняў вочы ў тым напрамку і адказаў, расцягваючы словы:

— Гэта не твайго, баба, розуму справа. Глядзі, каб не пацягнулі за язык.

А бабы напераборй:

— Усё роўна паны грошы прап'юць! Што нам ад таго, што плоцім падаткі? Нехта карыстае...

— Зноў кажу,— прагуў сцягач,— не вашай, бабскай, галавы справа.

— Як-то не нашай? — адказалі бабы.— З нас бяруць, і не наша справа. Вось гэта дзіва...

Сцягач змоўк, пачаў разбіраць паперы. Чагосьці шукаў, праводзячы алоўкам зверху ўніз па аркушы.

— Мікіта Лазун,— сказаў урэшце,— за вамі невялічкая пядоімка...

— Я ведаю... я ведаю... заплачу. Як жа? Колькі там? — замітусіўся Мікіта і засунуў руку ў кішэню.

Сцягач прыняў ад Мікіты грошы і пачаў пісаць квітанцыю.

— Хто яшчэ будзе плаціць? — спытаўся далей секвестратар і пачаў выклікаць па прозвішчах.

Заплацілі яшчэ чатыры гаспадары. А ўся большасць пачала па адным, па два чалавекі выходзіць з хаты. Пакуль секвестратар прыняў грошы ад чатырох, хата апусцела.

На вуліцы чуліся такія галасы:

— А дзе я яму вазьму тых падаткаў? Няхай ідзе бярэ апошняе... Адзін канец...

## НА СКРЫЖАВАННІ ДАРОГ

Белы палац маячыць на гары, а навокал да нізін спускаецца лес, у якім ад палаца ва ўсе бакі бягуць дагледжаныя, чыстыя дарогі-алеі. Абапал іх цягнуцца адна пры адной маладыя востраверхія елкі, быццам у зялёных шлемах. Пра палац яшчэ і цяпер ходзяць легенды: гара, на якой ён узвышаецца, кажуць, не натуральная, а насыпаная. З глыбіні часоў, праз вякі, праз многія пакаленні дайшла гэтая праўда да сягоняшняга дня і будзе ісці далей. Яе забыць нельга, бо гара, а на ёй грузны, як цытадэль, палац пабудаваны на касцях рабоў. Летапіс гаворыць аб даўнім яго паходжанні, бо называе XIII стагоддзе. Далёка ўглядаецца шматпавярховы палац — шасцікутны, адяжэлы, з тупымі зубамі на вежах. Шэсць вуглоў палаца не вострыя — іх майстры як быццам счасалі на плаз, каб потым у вышыні на кожным сцятым вугле выдаўбці, як долатам, рыцарскія крыжы. Такія палацы апісваў у сваіх творах Вальтэр Скот. Шмат гаспадароў за свой век меў гэты палац — князёў, графаў, прынцаў. Цар Мікалай II перадаў гэты палац прынцу Альдэнбургскаму, якога спудзіла адгэтуль рэвалюцыя.

Пілсудчына ў гэтым палацы размясціла староства.

Андрэй сядзіць у агульнай канцылярыі і чакае. Побач, на суседняй лаўцы, сядзяць дзве сялянкі-маладзіцы. Ціха ў канцылярыі, нават чуваць, як за перагародкай-бар'ерам скрыпяць пёры пісцоў над шамацецне паперы. Там вялікія два акны глядзяць на парк, на лес. Густая зеляніна ценямі кладзецца на сцены, на твары. За вокнамі дрэмле амшэлая сажалка-азярцо ў непралазных зарасніках лазнякоў. Над азярцом схіліліся асілкі-вербы, якія, напэўна, аднагодкі палаца. Нічога не відаць на азярцы — няма на ім ні лодкі, ні прыступак, якія б маляўніча спускаліся на беразе да вады, няма і той каштоўнай прыкрасы панскіх ставаў, садовых азёраў — не бялеюць лебедзі. Зялёная вада застыла, як мёртвая, акаймавала сябе густа ля берагоў пялёстачкамі бросні. Твань валакністая сцелецца пад вадой і на вадзе. Азярцо памірае... А некалі ж было тут усё, усё. Маршалак двара ўзначальваў цэлыя атрады слуг — кашталянаў, аканомаў, цівуноў, адмысловых заморскіх кухараў, лоўчых, капэлы музыкантаў. Былі тут табуны вызначных коней з пазалочанай збруяй, карэты, сані, шаблі, пісталеты... і такая асалода панскага самадурства — гончыя псы — харты... Усё гэта служыла яму — пану, уладару палаца і сотняў навакольных вёсак, дзе хлопы жылі сем'ямі, як у норах, разам са скацінай, у сваіх саламяных халупках. Бізун кожнага з панскіх слуг вісеў над спіною хлопа і хлопкі... На тое ж і слугі. На тое ж і паны, каб мяняць хлопаў на сабак...

Замшэў, замёр разгул раскошы і бізуна, і ўжо яго якніяк не вярнуць. Дарма там, за азярцом, бялеецца ў зялёным лісці статуя нейкай Венеры ці Дыяны. Стаіць яна самотная, абраслая зеленаватай плесняй, і ніхто не пакланоціцца, каб яе дагледзець, падмаладзіць. Пастаўленая перад палацам, па загаду пана старосты, мармуровая матка боская ўсё роўна не можа дапамагчы здзяйсненню панскіх жаданняў, хоць пад яе нагамі і напісана: «Пад тваю абарону ўцякаем». Не вярнуць панам разгулу раскошы і бізуна, хоць яны гэтага прагна жадаюць. Скамянелая веліч палаца хавае паноў у сваіх сценах ад хлопскіх бунтаў, ад бальшавіцкай навалы, як яны любяць гаварыць пра гэта з пенаю на вуснах.

Пасля глушэцкай дэманстрацыі ўпраўленне павятовай паліцыі ўцякло з Глушца і схавалася ў палацы. Ведае сялянская моладзь, ведаюць усе, што ў падвальным паверсе працуе дэфензіва. Там ёсць многа ўсякіх пакояў — для допытаў, для катаванняў. У апошнім на сценах вісяць гу-

мавыя палкі, нагайкі, кайданы розных намераў, замкі, жалезныя рукавіцы, гіры, адмысловыя помпы для пампавання ахвярам у нос вады, змешанай з газай. Ніхто тут не пачуе крыкаў, стогнаў катаваных. Навокал лес, а да Глушца — два кіламетры. Толькі глухая ноч, павіслая над зубцамі палаца,— нямы сведка чалавечых пакут. Хоць матка боская і стаіць блізка ў мармуровай сукенцы з дэкальтэ, але яна панская, гэтая матка, і свайго голасу заступніцтва, пратэсту не ўзніме.

Але ўсё ж такі паліцыя ўцякла з Глушца,— вось што галоўнае. А значыць, не тыя ўжо часы. Расце другі ўладар на гэтых прасторах, грозны ўладар — народ. Не дапаможа панам і той надпіс на п'едэстале, пад нагамі маткі боскай: «Пад тваю абарону ўцякаем».

Сядзіць Андрэй у панскай канцылярыі і думае. Думкі, як звенні ланцуга, цягнуцца то ў мінулае свайго краю, то ў будучыню. Сцены ў канцылярыі змрочна-шэрыя, як быццам аблеплены пластам закіпеўшай і раптам астыўшай зямной лавы. Атрымалася шэрань, на якой зрэдку паўтыканы шкляныя рубіны чырвонага колеру. Яны гараць, нібы хто іх раскідаў па зямлі цёмнай ноччу. І зеленаватыя цені ад вокнаў, асеўшыя на сценах, здаюцца Андрэю змрокамі мінулага. Яны яшчэ хочуць кагосьці страшыць. З партрэта, з гэтай рубінавай сцяны колеру падземнага грота, адным вокам глядзіць у акно прэзідэнт Масціцкі, якога камуністы празвалі палітычнай лялькай. Сядзіць сабе ў чорнай блішчастай рамцы сівы ягомасць з выразам стомленага скнары — не то ад сонечнай гарачыні, не то ад якой сямейнай сваркі. Так і здаецца, што пот льецца па яго паголеных, нейкіх змрочных, доўгіх шчоках, па невялікіх, нават залётна падкручаных, пасівелых вусах. Вось зараз прэзідэнт скажа: «Я пайду крыху прылягу адпачыць». Але... другое вока прэзідэнта глядзіць насупраць, глядзіць насцярожана і нават азадачана. На супрацьлеглай сцяне на ўвесь рост стаіць Пілсудскі, апёршыся на шаблю, і з-пад нахмураных броваў пазірае на пана прэзідэнта. Нібы штосьці ён гаворыць, а прэзідэнт слухае.

«Не час на адпачынак,— гаворыць Пілсудскі,— пан прэзідэнт павінен аб'ехаць Рэч Паспалітую... для выканання спраў вялікай важнасці. Перш-наперш паедзеш, пан, у Вільню, наведаеш універсітэт... Інстытут усходніх зямель. Рэктарам ва універсітэце па традыцыі езуіта Скаргі павінен быць ксёндз-канонік... Вільня — для Рыма, а не для Масквы... З беларусамі трэба зрабіць парадак. Там

гімназія ў іх ёсць. Час ужо скончыць з гэтым дрэньствам беларускім, якое дае спажыву камуністам. У гімназіі ёсць людзі, на якіх можна аперціся,— Астроўскі, Луцкевіч і іншыя... Яны зробяць усё, каб камуністычную заразу вытруціць з гімназіі... Гэта — хлопы гнуткія... Гімназію давядзецца ліквідаваць, аддаць пад крыло польскай гімназіі імя Славацкага. Трэба паабяцаць гэтым хлопам, што звольнім іхніх грамадаўскіх наслоў з турмы... Дапаможа ва ўсім ваявода Кіртыкліс. Ён у курсе спраў...»

Гаворыць, гаворыць Пілсудскі, словы, здаецца, плывуць не з вуснаў, а з-пад нахмураных броваў. Масціцкі часам аж вочы самкне і нібы дрэмле. Але потым зноў адно вока глядзіць туды, адкуль плывуць шляхецка-ганарыстыя фантазіі,— дакончыць тое, чаго за вякі не змаглі дакончыць каралі,— дабіць Беларусь і Украіну. Вока Масціцкага глядзіць, а Пілсудскі гаворыць:

«...Потым пан адведае Навагрудак — традыцыйнае гняздо мясцовай шляхты, якая была апорай Рэчы Паспалітай. Трэба яе трымаць на прывязі, як даўней, каб і цяпер была нашай апорай...

Пан сустрэнецца з асаднікамі... Гэта — наша новая шляхта... Адтуль пан паедзе ў другое шляхецкае гняздо — у Пінск. Для нас там найлягчэйшыя перспектывы для каланізацыі. Там узмоцнім элемент каталіцкі... Пан пагаворыць з епіскапам курыі Пінскай — Лазінскім, гэтым задавакам, эндэкам [1], які ўбіраецца ў пер'е Скаргі. Трэба яго пераканаць у слушнасці нашай палітыкі саюзніцтва з Нямеччынай.

Пан скажа, што час ужо вярнуць мошчы езуіта Баболі з Пецярбурга ў Пінск, дзе ён пацярпеў, як мучанік, за веру нашу...

Ці адобрыць епіскап Лазінскі наш план перасялення яўрэяў з усёй Польшчы на Палессе... Пан жа ведае, што хутка Заходняя Беларусь перастане існаваць, як геаграфічная назва... Будзе ўнесены на сейм праект аб ліквідацыі гэтай назвы. Горад Брэст-Літоўскі пераменім на Брэст над Бугам... У Гродна пашлём экспедыцыю археолагаў для раскопак... Нам трэба давесці Еўропе адвечную польскасць гэтых зямель... Тое самае і ў Давыд-Гарадку... Калі мы гэтага не зробім, нас загубіць мясцовы сепаратызм, які не раз нямала рабіў клопатаў кароне польскай у мінулым...»

[1] Эндэцыя — «народова дэмакратыя» — партыя польскіх абшарнікаў, юнкераў.

Дрэмле амшэлая ідылія за акном у зелені сталетніх вербаў... Дрэмле Масціцкі пад скрып пёраў пісцоў... Дзве сялянкі-маладзіцы сядзяць і баязліва глядзяць па сцены, дзівяцца з чырвоных цацак, што рассеяны па шорсткай паверхні, як агеньчыкі... Ціха, ціха слізгае зялёны цень па твары прэзідэнта.

«...А з Пінска пан паедзе ў Львоў... Ну, там цяжэй... Уся дапамога — архіепіскап Шаптыцкі... Гэта — архіепіскап у шпорах — жулік несусветны — імепна тое, што нам трэба... Там ёсць украінскія паны, згуртаваныя навокал газеты «Діло». Іх трэба з'яднаць для Рэчы Паспалітай у інтарэсах антысавецкіх, як і паноў беларускіх.

Усюды пан павінен адведаць кафедральныя касцёлы і выслухаць святыя імшы, каб гэтым умацаваць аўтарытэт нашага духавенства, з'яднаць яго для нашай палітыкі... Так было заўсёды... Так рабілі нашы каралі... Зразумеў, пан? А пра сваю хімію няхай пан забудзе... Хопіць хімікаў без пана... Зразумеў, пан?..»

Ці вецер ускалыхнуў замшэлую ідылію за акном, ці то вочы прэзідэнта на партрэце там заморгалі, як быццам птушка затрапятала крыламі. Бо Пілсудскі па астатак нешта такое вымавіў з-пад вусоў, нешта — не то «няздара», не то «дурань», што Масціцкаму стала не па сабе. Але гэта між іншым... Заўсёдныя забаўкі маршалка...

Андрэй сядзіць і, пазіраючы на такую арыстакратычную абстаноўку, паволі набывае душэўную сабранасць, з якою жыве кожны дзень, кожную гадзіну.

Няхай не страшаць тыя змрочныя цені мінулага, што дыхаюць з акна. Гэта толькі цені.

Перадумвае Андрэй весткі з нядаўняй прэсы — рэха сесіі сейма, выступленні Пілсудскага, разгул дэмагагічнай траскатні і разам з тым боязь крызісу, які ўжо стукаецца ў дзверы. Каб падрыхтаваць грунт для кансалідацыі буржуазіі нацыянальных меншасцей, урад хоча адправіць прэзідэнта Масціцкага ў падарожжа па Польшчы. А потым расказы гімназіста Віктара Кухты пра тыя чуткі, што хочуць зрабіць паны з беларускай гімназіяй у Вільні... Усё гэта прыйшло імепна на памяць чамусьці тут, у чаканні, калі яго выклічуць да старосты. Маладая пані, што піша за адным са сталоў за бар'ерам, сказала Андрэю пачакаць. І вось ён чакае. Нешта доўга не выклікаюць. Чаму?

Праходзяць чыноўнікі і мімаходзь так паглядаюць на Андрэя, як быццам яны нешта ведаюць. Кожны, праходзячы, нібы падмаргне, усміхнецца. Гэта заўважае Андрэй і

памагаецца адгадаць, навіто яго сюды выклікалі. Закрадаецца ў душу і тое, другое, але ўрэшце ліха іх ведае, чаго яны хочуць.

Маладая пані ўстала, падышла да акна і застыла летуценным позіркам на замшэлым азярцы. Можна так глядзець бясконца і чакаць рыцарскіх прывідаў... А што думаюць сялянкі-маладзіцы? Яны дома пакінулі дзяцей, многа недаконченых работ, шэрую бядоту ў хаце і заўсёдную трывогу аб кавалку хлеба. Яны прыйшлі сюды скардзіцца на сцягача падаткаў, што замнога ўзяў, што пакрыўдзіў. І трымаюць у кулаках завязаныя вузялочкам у хустачках крыўдныя квітанцыі. А маладая пані ўсё стаіць з вачыма, заплыўшымі імглою.

Не зразумець ёй вартасці жыцця. Яго нясуць на сабе вось гэтыя, якія пакінулі дома дзяцей...

Высокія, панурыя дзверы цяжка скрыпнулі, і ў канцылярыю ўвайшоў чалавек у светла-карычневым мундзіры з чырвонымі кантамі. У два рады блішчалі пазалочаныя гузікі. На канцах адкладнога каўняра — бляшаныя жоўценькія аролчыкі, якія народ празваў пеўнічкамі. Ільснілі гладка прычасаныя валасы, твар бялявы, дагледжаны. Гэта і ёсць ён — начальнік агульнай канцылярыі. Адразу з-за бар'ера спытаўся ў сялянак па-беларуску:

— Вы абедзве па адной справе ці не?

Сялянкі глянулі адна на адну і так цікава ўсміхнуліся, як быццам хто абдарыў іх прыемнай неспадзяванасцю. Ну, як гэта можа быць, каб такі блішчасты пан звяртаўся да іх па-беларуску? Гэта ж мова мужыцкая, ёю гавораць толькі мужыкі ў вёсках. Праўда, у вёсцы моладзь... аднекуль выпісвае беларускія кніжачкі, газеты, чытае іх, але ж гэта кніжачкі і газеты свае. Так што нічога дзіўнага. А тут вось пан — і гаворыць па-беларуску. Гэтага ж ніколі не было.

Сялянкі ад такога звароту аж не спахапіліся адразу, што адказаць. А начальнік канцылярыі пазіраў на Андрэя, нібы правяраў, якое ўражанне зрабіла на яго такая навіна. Нешта тут ёсць.

Увайшоў крыху лысаваты высокі мужчына ў сінім касцюме, злёгку пакланіўся Андрэю і запрасіў:

— Прошэ... да пана старосты...

Андрэй захваляваўся. Так раптам не захацелася ісці, што, калі б можна было плюнуць на ўсялякія такты і вытрымапасць, зараз жа адвярнуўся б ад гэтага лысаватага пана і знік бы за дзвярыма.

Андрэй ішоў праз адзін пакой, праз другі. Усё — каміны і каміны пры сценах. А потым барэльефы — лук, стрэлы, ласіныя рогі. Чучала чорнага палескага арла растапырылася крыламі на сцяне, на адмысловай прыступачцы, паляўнічы закручасты рог вісеў, як якое табу... Відаць, гэта паляўнічы зал...

«Душылі вы нас у палацах вякамі, душыце яшчэ і цяпер... — думае Андрэй, ідучы за высокім панам.— Калі ж гэта скончыцца? Як жа не хочацца ісці...»

Высокі пан адчыніў дзверы і стаў, як швейцар, у позе пашаны, прапускаючы Андрэя ў пакой, заліты сонцам. Андрэю кінуўся ў вочы белы арол на чырвоным фоне ў чорнай рамцы. Пад ім у крэсле з высокай спінкай сядзеў чарнявы мужчына, які ўстаў на прывітанне Андрэя.

— Прошэ... сядайце... — паказаў на крэсла мужчына, пранікліва агледаючы Андрэя. Потым ён лёгенька кіўнуў высокаму пану, што прывёў Андрэя, і той выйшаў. Пан староста (гэта быў ён, другі пасля Наўроцкага) неяк неспакойна ўсаджваўся ў крэсла,— то прыўставаў, то зноў садзіўся. Урэшце супакоіўся і паклаў рукі на стол. Тут жа ляжаў нож для разрэзвання паперы — нож са сланавай касці з аздобленай узорамі залацістай ручкай. Ім і авалодаў пан староста і пачаў пакручваць яго ў пальцах. Нож круціўся хутка, як ветраны млынок.

— Гм... Гм... Справа такая, пане Касцевіч... Ваша прозвішча Касцевіч?

— Так,— адказаў Андрэй.

— Мы вырашылі пагаварыць з вамі аб такой справе. Гм... Гм... Справа датычыць беларускай інтэлігенцыі...

Андрэй насцярожыўся і на момант глянуў у вочы старосту.

— Мы вымушаны былі ліквідаваць Грамаду, бо ёю авалодалі камуністы і павялі яе на антыдзяржаўныя выступленні, каб парушыць цэласць нашай дзяржавы — адарваць Заходнюю Беларусь і далучыць яе да Усходняй, савецкай... Грамада, як бачыце, прывяла да разбітага карыта і нічога беларускаму народу не дала, апрача кар, ахвяраў і турмаў. Вось і вы пацярпелі таксама... Нашто гэта? Хіба ж нельга працаваць для дзяржавы і есці спакойна кавалак хлеба?..

«Вунь куды гне»,— падумаў Андрэй, сочачы за выказваннямі старосты.

Староста закурыў папяросу і працягваў:

— Мы ведаем грамадскія балячкі. Але не ўсё адразу...

Я сам — інжынер па прафесіі... І мне на сэрцы ляжыць, што ў павеце няма дарог. Думаем пабудаваць у Глушцы народны дом... Шмат чаго ёсць у планах. Але мы хочам, каб нам дапамагла мясцовая інтэлігенцыя.

— У чым жа павінна выяўляцца гэтая дапамога? — спытаўся Андрэй.

— Па-першае, у лаяльнасці да нашай дзяржавы.

Староста даўжэй пратрымаў свой позірк на Андрэю.

— Так... у лаяльнасці. А пасад у нас многа. Можна, напрыклад, працаваць у гміне ў якасці зборшчыка падаткаў. Вы будзеце мець добрую аплату і працэнты ад падаткаў. Вы будзеце добра забяспечаны. Я скажу кіраўніку следчай паліцыі, каб да вас не чапляліся... Ды вы і самі пагаворыце з ім...

«Які ўсё ж такі дурны гэты староста,— прамільгнула ў думках Андрэя.— Хочуць нашымі ж рукамі рабаваць народ, затушаваць голую, нічым не прыкрытую акупацыю. Не, не ўдасца! Не пасварыце нас з народам».

— Нават пры маім найлепшым стаўленні да дзяржавы я не згадзіўся б на такую пасаду,— адказаў Андрэй.

Староста крыху замяшаўся.

— Я... я... гэта для прыкладу гавару... для прыкладу. Мы ж думаем адкрыць пры старостве беларускі аддзел. Працы будзе многа. Нам трэба адольваць камунізм...

— А пры чым тут камунізм? — запытаўся Андрэй.— Трэба народу даць зямлю, даць асвету, свабоднае карыстанне роднай мовай, удзел ва ўпраўленні, доступ моладзі да вышэйшай асветы, свабоду слова, друку... Гэта якраз камунізм і дае народу... І зразумела, што народ цягнецца да камунізма.

— Вы, як відаць, заядлы камуніст,— сказаў, усміхнуўшыся, староста.— Вы так складна выкладаеце камуністычную праграму...

— Пане староста,— непрыкметна для сябе павысіў голас Андрэй,— возьмем польскую канстытуцыю... Хіба там няма гэтых пунктаў, аб якіх я казаў? Няма толькі аднаго пункта — гэта аб надзеле сялян памешчыцкай зямлёю без выкупу, а так ёсць усе пункты. Так што з вашага сцвярджэння можна зрабіць вывад, што цяперашняя польская канстытуцыя таксама камуністычная...

Староста нават крыху ўтуліў галаву ў плечы, зірнуў неяк агніста на Андрэя сваімі цёмнымі вачыма і насупіўся. З момант маўчаў, як быццам раздумваў. «Вось дзе я цябе злавіў,— падумаў Андрэй,— паспрабуй адкажы».

У кутку кабінета, у вялікім дубовым кіёце, змешчаны пачатак тэксту канстытуцыі, напісаны чырвонымі гатычнымі літарамі. Андрэй нават глянуў у гэты куток. Зірнуў мімалётна з-пад брывей на яго і пан староста. Ён кашлянуў і закурыў папяросу. Урэшце адказаў:

— Што датычыць канстытуцыі, яе выканання, то гэта справа тых, хто кіруе дзяржавай, а не ваша, пане Касцевіч. Урад ведае, што робіць. Дарэчы... Пасля вашага арышту ў вас на кватэры, у час вобыску, былі знойдзены гістарычныя запісы... пра Беларусь. Запісы яўна памылковыя, накіраваныя супроць Польшчы ў разрэзе гістарычным. Адкуль у вас такая нелюбоў да Польшчы?

Андрэй усміхнуўся, зноў падумаўшы: «Дурны ўсё ж такі гэты староста».

— Я люблю прагрэсіўную Польшчу, не люблю рэакцыйнай, бо прагрэсіўная Польшча не хоча крыўдзіць ні ў чым не толькі беларускі народ, але і ўсякі іншы...

— Каго ж вы лічыце прагрэсіўным? — перахапіў староста.

«Прыпірае мяне да сцяны чорт... асцярожна! Гэты староста не толькі староста, але і шпік. Не трэба забываць... Але, паколькі пачалося, адкажу»,— падумаў Андрэй і пачаў здалёк:

— Вось, напрыклад... Станіслаў Сташыц, які яшчэ ў далёкіх змроках паншчыны пісаў аб нядолі хлопа і дамагаўся скасавання паншчыны. Далей,— героі польскіх паўстанняў — Тадэвуш Касцюшка, прагрэсіўныя праекты якога шляхта ў сейме секла шаблямі. Потым падабаецца мне і гісторык Лелевель, паэт Адам Міцкевіч... Героі паўстання — Яраслаў Дамброўскі, Урублеўскі, наш беларус — Каліноўскі... А ў пазнейшыя часы — Мархлеўскі, з якім працаваў і Дзяржынскі,— асцярожна дадаў Андрэй.

— Досыць, досыць,— замахаў рукою староста,— апошнія — гэта ўжо камуністы.

Андрэй усміхнуўся і апусціў галаву.

У старосты выступіў пот на лбе. Ён выняў хустачку, неяк ярасна пачаў выціраць твар і загладжваць валасы, праводзячы рукою ад ілба аж да патыліцы.

— Трэба сказаць, погляды ў пана радыкальныя... радыкальныя. Вы — малады, а паспелі так многа начытацца. Гэта — небяспечна, скажу вам... Прызнавайце погляды, перакананні, якія хочаце,— гэта ваша справа. Толькі не дзейнічайце, не дурыце галоў хлопам. І лепш будзе для вас, калі вы прымеце маю прапанову... А што знайшлі ў



Школа ў сяле Максімаўка,
былой Самарскай губерні,
дзе ў 1915—1916 гг. вучыўся П. Пестрак.



Пiлiп Пестрак у Косаўскай дэфензiве.
*1927 г.*

вас пры вобыску творы Пляханава,— ну... гэта ў нас легалізавана. Нічога не зробіш... Ну, вось вам і свабода друку... А вы?..

Старосту хацелася засмяяцца, але ён устрымаўся. Ён дадаў яшчэ скорагаворкай пару паклёпаў на Савецкі Саюз і націснуў на беленькую кнопку званка на стале.

Увайшоў той лысаваты, высокі пан, які прывёў Андрэя ў кабінет старосты.

— Вось, пане рэферэнце,— звярнуўся да яго староста, паказваючы рукою на Андрэя,— у асобе Касцевіча маем эрудыта, але хворага на радыкальныя погляды. Праўда, гэта заўсёды спалучаецца з маладосцю.

Староста пачаў выкідваць рукамі наперад, як быццам адпіхваў што ад сябе, і працягваў паблажлівым, іранізуючым тонам:

— Свет ашчасліваць!.. Бо, бачыце, маем пэндзы многа! Беднасць! Нядоля! Эксплуатацыя! Гераізм! Самаахвярнасць! Усё гэта мыльныя пузыры маладосці,— з позай паківаў галавою староста, як быццам спагадваючы камусьці,— так што варта плюнуць на гэтыя бапальнасці і жыць лаяльна, у згодзе з дзяржавай, і ўсё будзе добра... Пане рэферэнце, трэба нам вылечыць мясцовую інтэлігенцыю ад камунізма...

Рэферэнт сядзеў у начцівай позе, заклаўшы нагу за нагу, і ўвесь час не спускаў вачэй з Андрэя.

— Вось у вашых запісках, забраных у час вобыску,— загаварыў рэферэнт,— ёсць выпісы з твораў Льва Талстога — з яго педагагічных думак. Як вы думаеце, Талстой — камуніст ці не?

Такое пытанне здалося Андрэю недарэчным, і ён адказаў:

— Не, Талстой не камуніст...

Староста і рэферэнт пераглянуліся.

— То хто ж, па-вашаму, Талстой? — спытаўся рэферэнт.

— Хто? Талстой — геніяльны пісьменнік, вялікі гуманіст.

— А яго ідэі, выказаныя ў «Анне Карэнінай», што скажаце? Хіба ж гэта не камунізм? — наступаў рэферэнт.

Андрэй адчуваў, што гаворыць з людзьмі, якія або невукі, або па-правакатарску хітрыя. Здаецца, ёсць і тое і другое. Адказаў, як настаўнік вучням:

— Талстоўскі камунізм — гэта не камунізм рабочага класа. Рабочага класа ён не прызнае, лічыць грамадскай

балячкай. У «Анне Карэнінай» Талстой кліча да патрыярхальнасці, да зямлі... А гэта — рух не наперад, а назад.

Староста з рэферэнтам неяк здзівіліся і расчараваліся. Паўза была доўгая.

Рэферэнт заварушыўся і пераклаў нагу на нагу, ціха крэкнуў:

— Калі прызнаваць камунізм, то ўжо лепш прызнаваць камунізм талстоўскі, самы бяскрыўдны, а значыць — святы...

«Вось да чаго плялася ўся гутарка,— сцяміў Андрэй,— у рэчышча непраціўленства хочуць нас накіраваць. Вядома, Талстой — імя прывабнае».

— Толькі не бальшавіцкі камунізм... — дадаў рэферэнт.

Андрэй маўчаў, апусціўшы галаву. Гаварыць яму ўжо не было чаго ды і не патрэбна. «Забралі запісы, пагрэбліся кіпцюрамі ў душы... Езуіты».

— Пане староста, я прашу вярнуць мне мае нататкі,— сказаў Андрэй.

— Вы іх атрымаеце,— падхапіў рэферэнт.

— Ну што ж, пакуль што скончым,— сказаў староста.— Няхай пан падумае над нашай прапановай. Мы хочам наблізіць да сябе беларускую інтэлігенцыю, каб супольнымі сіламі ўмацоўваць дзяржаву.

Андрэй маўчаў.

— У іншым выпадку можа быць і будзе дрэнна,— дадаў староста.

Андрэй маўчаў.

У галаве плылі свае думкі. Эге, каб прачытаў іх староста... «Іменна толькі бальшавіцкі камунізм, а не што іншае, здольны зламаць вас, ахвосце крывавай феадальшчыны».

— Можна ісці? — запытаўся Андрэй.

— Так... Да пабачэння,— холадна схіліўшыся, адказаў староста.

Андрэй злёгку пакланіўся і накіраваўся да дзвярэй. За ім зараз жа пайшоў рэферэнт.

Мястэчка Глушэц драмала пад сонцам над гнілою тарфянаю рэчкай. Хацелася б Андрэю абысці яго іменна цяпер, бо сачыць будуць абавязкова. Але бацька прасіў купіць селядцоў. Сушка сена. Будзе ўборка. Зноў прыйдуць памагаць суседзі-сябры. Патрэбен пачастунак.

Андрэй ішоў павольна, як пасля цяжкай працы, якую

ён скончыў. Свабодна і чыста на душы. Ён пабыў у нечым накшталт арыстакратычнай дэфензівы... Так, арыстакратычнай, у якой, апрача фіміямаў, дыміўся і смуродлівы яд. Ці кожны яго заўважыць? Вось бяда... Пілсудчыкаўская рэакцыя, якую для ашуканства народа назвалі «санацыя» [1], навісла над Польшчай, і цень ад яе чорнага крыла распасціраецца ўсё больш і больш над Заходняй Беларуссю.

Можа, таму і дрэмле мястэчка Глушэц. Яно заснавалася яшчэ ў той час, калі на штучнай гары вырас шасцікутны палац з тупымі, як капыты коней, зубцамі на вежах, вырас з мэтай развіцця рамёстваў, гандлю. Нягледзячы на такі доўгі час, мястэчка расло і жыло, як расце і жыве карлік. Шмат такіх карлікаў на Беларусі — гэтых прыбудовак да магнацкіх маёнткаў. Ёсць карлікі радзівілаўскія, карлікі Патоцкага, Вішнявецкага, Сапегі і іншых.

Плятуцца да Глушца вясковыя дарогі з травяністымі абочынамі, віюцца праз жыты і пералескі, як забытыя. А шлях, толькі адзін, пабег у камяністыя палі — раз'езджаны, расплёсканы, з ямамі-вырвамі, са зламанымі масткамі, дрымотны шлях, як забыццё, нікому, здаецца, не патрэбны.

Пан староста знойдзе сабе памочнікаў у Глушцы. Ён іх тут меў, ён іх мае і будзе мець.

Амшэлым драўляным крыжам адзначаны ўваход у Глушэц. На ўскраіне стаіць хата — ужо на полі. У ёй жыве былы семінарыст настаўніцкай семінарыі Ігнат Вярэня. Ён ачумеў ад тэрору і страху, што праляцеў над краінай, ад абыякавасці, амаль цынічнай абыякавасці суседзяў, і ходзіць, як лунацік. Зарослы валасамі, якія леглі аж на каўнер, непрычэсаныя, недагледжаныя, ён глядзіць чорнымі гарачымі вачыма з хваравітым бляскам. Нешта стогне ў ім, нешта баліць. І твар белы, зямлісты, як у пакутніка. Ён мог бы пайсці ў купальскую ноч шукаць кветкі папараці, стаяць прывідам на роснай лясной паляне ў зеленаватых плямах месяца і шаптаць закляванні. Паўтара года, як і Андрэй, адбыў у турме Ігнат Вярэня, вярнуўся і вось цяпер ходзіць, як цень. Ценем і стаяў ён пад крыжам ля сваёй хаты, калі падышоў Андрэй.

— А-а... Касцевіч... Прывітанне... — сказаў ціхім, хворым голасам.— Адкуль ідзеш?

І ўзяўся ў бокі, нібы для саліднасці, для апоры, але рукі мякчэлі, саслізгваліся з бёдраў, не хацелі трымацца.

[1] Санацыя — аздараўленне (*лац.*).

— Быў на споведзі ў старосты,— адказаў Андрэй.

— І ты?.. А я думаў... — спахапіўся Вярэня, і вочы бліснулі жывым агеньчыкам.

— Што, можа, і ты быў? — перапыніў Андрэй.

— Учора... пасля абеду...

— Ну і што?

— Што... — усміхнуўся Ігнат,— вабяць беларускім аддзелам... Ці ён сапраўды будзе?

— Хоць бы ён і быў, Ігнат, па-мойму, трэба да гэтага паставіцца вельмі крытычна.

— Так, так... Я... не... Вядома, што так... не... не...

І твар перакрывіўся грымасай, як быццам што ўнутры яго кальнула.

«Эх! Табе б іконку на грудзі,— падумаў Андрэй,— і ты пайшоў бы ад вёскі да вёскі збіраць на храм... на які? Неабавязкова божы... а толькі, каб на храм беларускі... Перад арыштам ты казаў не раз, што на гэты храм ніхто не збіраў».

А ўголас сказаў сурова:

— Марксістаў чытай больш, Ігнат, працвярозееш. Надта жахацца ад даўняй і цяперашняй нядолі народа, значыць страціць здольнасць да дзейнасці, адранцвець. З такімі пачуццямі толькі ў манастыр.

Стаіць Ігнат перад Андрэем млявы, расслаблены, хоць стараецца быць выпрастаным, бадзёрым. І паўтарае: «Я... не... Вядома, што так... не... не...»

«А хто цябе ведае,— думае Андрэй,— так ці не... Ты ў свой час захапляўся рамантыкай падпольнай работы, быў дысцыплінаваны аж да педантызму... А цяпер? Лепш бы ты не пачынаў...»

— Ці то праўда, Ігнат, што ты, будучы ў турме, пісаў пісьмо да Луцкевіча ў Вільню?

Ігнат усміхнуўся і крыху апусціў вочы.

— Адкуль ты чуў?

— Чуў... Прыехалі хлопцы з вашай турмы ў нашу і казалі.

Ігнат уздыхнуў і зноў узяўся ў бокі.

— Ат... — сказаў абыякава,— кніжак не было ў нас... Вось я і надумаўся напісаць яму, каб прыслаў.

— Ну і што — прыслаў?

— Так... прыслаў кніжак і пісьмо...

— Што ён пісаў?

— Пісаў, ці не абрыдла займацца палітыкай. Трэба кінуць палітыку і жыць для роднага краю...

— Ха-ха-ха! — засмяяўся Андрэй.— Крывадушныя зярняткі на стантаныя душы... Значыць, дапамагаць акупантам? Так, Ігнат?

І Андрэю стала зразумела тое, што дагэтуль толькі адчувалася, закрадалася ў свядомасць,— змова пілсудчыны з луцкевічамі, астроўскімі, якія называюць сябе праваdyрамі беларускага нацыянальнага адраджэння. Палітыка змовы праводзіцца, значыць, на ўсёй лініі.

Ігнат стаяў, апусціўшы галаву, і балючая складка, нейкая змрочная, застыла паміж броваў.

Андрэй паляпаў яго па плячы, нават тузануў, каб абудзіць, і сказаў з перасцярогай:

— Глядзі, каб не страціў грунт пад нагамі, не адарваўся ад народа. Трэба Кампартыі трымацца. Так робяць усе сумленныя інтэлігенты, якія любяць народ...

Ігнат з адценнем уцехі лыпнуў на Андрэя і зноў апусціў вочы, як на момант усцешаны хворы.

— Ты чытаў Леніна «Дзяржава і рэвалюцыя»?

Ігнат моўчкі закруціў галавою.

— Там Ленін піша, як буржуазія адпіхае рабочы клас, сялянства ад палітыкі. Вось і Луцкевіч хоча, каб ты не займаўся палітыкай. Паны баяцца актыўнасці мас. Бачыш, хутарызацыю хочуць праводзіць, каб узмацніць кулака і рассеяць масы па полі, каб жылі ў адзіночку па закону: «Чалавек чалавеку воўк». Эх, Ігнат, ці не пасеяў у табе сумненняў староста з Луцкевічам?

— Ну, не... не, не... Я ім не даваў ніякіх абяцанняў.

— Каб яны не зрабілі цябе медыумам для сваіх езуіцкіх махлярстваў.

— Зойдзем у хату, паядзім бульбы з мукою,— сказаў Ігнат. Так па-дзівацку называў ён звычайны бульбяны суп, з мучною падкалоткай.

— Ці варта, Ігнат? Дзякую. Трэба спяшацца дахаты.

Андрэй ведаў, што ў хаце Вярэні няма хлеба, сям'я перабіваецца іменна на гэтай «бульбе з мукою». Маці ў Ігната няма, даўно памерла, і стары бацька, аглохлы ад работы, не толькі арэ і сее, але і паліць у печы, варыць. Так было ўчора, пазаўчора, кожны дзень. Бацька слабавольны, і ў сям'і — кожны сам па сабе. І трэба было яшчэ гэтаму прыбітаму Ігнату ажаніцца ў час Грамады, калі хадзілі па вёскі ладзіць спектаклі і ружовыя дзяўчаты выступалі на сцэне. Вось адну такую дзяўчыну і ўзяў сабе за жонку Ігнат. «Не хачу мяшчанкі, сялянка лепш...» — казаў Ігнат.

— Не, Ігнат, не хачу. Забаўлюся. А дахаты — далёка. Бывай здароў і скінь з сябе гэтую спячку. Ідзі хоць у поле, ды рабі што-небудзь...

Так развітаўся Андрэй з Ігнатам, пакінуўшы яго ля крыжа ў расхрыстанай чорнай кашулі.

Ён, можа, і пойдзе ў поле, але для таго, каб легчы ў жыце і... спаць. Ён бы цяпер бясконца спаў. Або залезе на гарышча. Там праз акенца ў шчыце льецца цьмянае святло. Сярод рознага друзу перакулена скрыня набок, а побач, у куфэрчыку — кнігі, папера, чарніліца, пяро... Там праседжвае часам Ігнат. Чытае або перапісвае беларускія народныя песні, сабраныя па вёсках. Ён іх хоча адаслаць у Вільню, каб дзе-небудзь падрукавалі. Але ўсё адкладае і адкладае, ніяк не збярэцца. Эх, трэба было б, Ігнат, не так з табой абысціся. Больш рашуча. Можа, гэта цябе і прывяло б да нормы. Ты марыш удячы за мяжу, просіш дапамагчы... І мне хочацца за мяжу — у Мінск, у Маскву. Я там пайшоў бы на штурм павукі. Эх, я там бы!.. Ды што гаварыць? Але гэта значыць — пакінуць фронт... Не пахваліць такога ўчынку Савецкая Радзіма. І гэтым мы не наблізім яе да сябе.

Чаравікі неяк гулка бохаюць па дашчатым тратуарчыку, хоць сонечны поўдзень вісіць над мястэчкам. Андрэй зайшоў у краму, купіў бацьку селядцоў і пры выхадзе на парозе сустрэўся з Міронам Вадалеем.

— А-а... — вырвалася ў Андрэя.

— Здароў,— працягнуў руку Вадалей. Выйшлі на ганачак крамы. Прыпёрты да сцяны стаяў веласіпед Вадалея.

— Ну, як жывём? — спытаўся Андрэй.

— Дрэнна, вельмі дрэнна,— адказаў Мірон.

Андрэй чуў ужо, што Вадалей ушыўся быў не так даўно ў нейкую зладзейскую шайку і прымаў удзел у абкраданні аднаго «амерыканца», чалавека, які вярнуўся з Амерыкі. Пацягнула на долары. І людзі даведаліся потым, што ўся шайка знайшла ў скрыні «амерыканца» толькі чатыры долары.

«Далёка пайшоў Вадалей»,— падумаў Андрэй, гледзячы на яго чамусьці пачырванелы твар. А Вадалей сыпаў словамі, як гарохам, чысціў хустачкай нос, здаецца, без патрэбы.

— Няма, брат... усё застыла. Няма работы. Сувязі, разумееш, парваны. Кожны зашыўся ў сваё гняздо і ні мур-мур... Многа ўцякае ў Савецкі Саюз... Можа, ты ўжо звязаўся з кім-небудзь з цэнтра?

«Так я табе і скажу»,— думае Андрэй, слухаючы балбатню Вадалея.

— Не, не маю ніякіх сувязей,— адказаў Андрэй.

— Паліцыя ўсё ведае, разумееш... Час ад часу то таго, то гэтага арыштоўвае. Я не ведаю, як я ўтрымаўся... Становішча ў мяне цяжкае. Жонка хворая. Пакінуў дома і не ведаю, як там... Выклікалі ў старостава...

Словы разам са слінай вылятаЛі з вуснаў Вадалея, наскоквалі адно на другое. А ён час ад часу выціраў твар і хаваў хустачку ў кішэню. Андрэй глядзеў на яго крыху спадылба.

— Калі ты быў у старостве? — кінуў Андрэй.

— Учора рана... Староста пытаўся пра маё становішча.

— Ну і што?

— Загадаў выдаць шэсцьдзесят злотых на лячэнне жонкі.

— Ну і што? Ты ўзяў?

Вадалей пацiснуў плячыма і пачаў заікацца:

— Што ж рабіць! Узяў... узяў, брат. Прашу цябе, Андрэй, дапамажы, калі можаш, каб мяне перакінулі за мяжу. Я сам, на сваю адказнасць не хачу ісці. Мне тут больш знаходзіцца нельга... Іначай я не ведаю, што зраблю...

«Ты ўжо зрабіў»,— падумаў Андрэй. І пачаў глядзець на Вадалея ва ўпор, глядзеў доўга, не зморгнуўшы. Разглядаў яго доўгія, чырвоныя, мясістыя шчокі, доўгі і тоўсты нос, шапку з тонкім казырком, які стрэшкаю звісаў над змакрэлым ілбом. Глядзеў спакойна Андрэй з лёгенькай зняважлівай усмешкай і ўрэшце спыніў позірк на вачах Вадалея. Глядзеў не зморгнуўшы... А вочы — віль-віль, сюды-туды, скокнулі, як злоўленыя мышкі, і сталі, сціхлі... Жвавасць іх раставала, блекла, курчылася... Вадалей збялеў і пачаў хіліцца, хіліцца...

— Добра... Адправім цябе за мяжу. Чакай... — зацята вымавіў Андрэй і тут жа саскочыў з ганачка. Вадалей павіс бокам на сваім веласіпедзе, угнуўшы галаву...

Яшчэ трэба заскочыць на пошту, можа, ёсць лісты, газеты,— і дахаты. Да Рунды заходзіць не трэба. Безумоўна ж, за Андрэем сочаць. На пошце ён атрымаў ліст. І тут нейкі суб'ект у кепцы на стаўбунаватай галаве правяраў свой гадзіннік, зірнуў вачыма ў твар Андрэя. Андрэй адразу зразумеў, што гэта шпік. Зараз жа выйшаў і, не спыняючыся, накіраваўся на шлях. Чыесьці боты бохалі ззаду ў аддаленні.

Андрэй, выціраючы твар ад поту, злёгку азірнуўся.

Стаўбупаватая галава стаяла ўжо ля плота і глядзела ў агародчык. Потым крокі бохалі зноў і так правялі Андрэя аж да шляху. «Так, так, пане староста, ты ўсё ж такі дурны...» — з усмешкаю пераможцы сказаў сам сабе Андрэй.

* * *

На скрыжаванні дарог у Беларусі часта маячаць старыя, а дзе ўжо спарахнелыя, аброслыя мохам крыжы. Яны дадаюць яшчэ большага смутку пясчаным каменістым узгоркам, ціхім закінутым далінам, бязлюдным палявым дарогам. Хто ўстанавіў такі звычай, невядома. Бытуе ён, відаць, даўно, зрабіўся традыцыяй, прывычкай, бо даволі якому-небудзь крыжу пахіліцца або ўпасці ад старасці, як сяляне ставяць новы крыж. Але, як бы яно там ні было, ходзіць здаўна ў народзе легенда, што на скрыжаванні дарог, звычайна апоўначы, спыняюцца чэрці, каб лавіць чалавечыя душы. Злавіўшы такую душу, чорт прымушае заключаць з ім умову на шкодныя справы для людзей. Гэтую ўмову чалавечая душа павінна падпісаць уласнай крывёю і аддаць чорту. І тады душа робіцца слугою чорта — нікуды ўжо не дзенешся. Але людзі пачалі ратавацца ад яго крыжам. Гэта і зразумела. Ад чорта, як вучыла рэлігія, можна і трэба ратавацца толькі богам. Ліхое месца — скрыжаванне дарог: тут сустракаюцца розныя людзі з чатырох канцоў свету, тут разбойнікі рабілі і робяць свае засады, каб напасці на абозы з дабром, на падарожных, тут для якога-небудзь падарожніка і месца сумненняў, развагі,— куды ісці? Ісці проста ці збочыць направа або налева. Для аднаго ўсё будзе залежаць ад таго, якою дарогай лягчэй дасягнуць канчатковай мэты, хоць бы і давялося загінуць, а для другога — якая дарога найменш небяспечная для яго жыцця. Ліхое месца — скрыжаванне дарог. І богабаязны, запалоханы жыццём селянін, калі нават і няма крыжа на такім месцы, усё роўна, ідучы, на ўсякі выпадак перахрысціцца, каб яго тут часам не спаткала ліха. Ніхто не пойдзе ўначы на скрыжаванне дарог. Толькі адзін крыж стаіць панурым ценем, як маяк роспачы. Часам яшчэ засталася дзе-небудзь на такім скрыжаванні старая, замшэлая, з праваленай страхою карчма, аброслая легендамі, казкамі, песнямі.

Усе яны страшныя. То шайка зладзеяў тут спынялася, уцякаючы ад пагоні, то пара закаханых, што пакінулі для ўласнага шчасця бацькоўскі прытулак, то атрады воінаў,

пачынаючы аж ад рыцараў у латах, а потым атрады паўстанцаў, а за імі казакі Мураўёва-вешацеля... З такой вось карчмы ўцёк праз акно ў далёкія, сівыя часы і пушкінскі Грышка Атрэп'еў.

Сядзеў у такой карчме вечны яе вартавы — карчмар, яўрэй, якому трэба было дагадзіць усім — дагадзіць сваёй бояззю, каму хітрасцю, каму ласкай, каб галава засталася цэлай на плячах. Мала ўжо сустракаецца такіх корчмаў, і легенды пра іх патухаюць і, можна сказаць, патухлі ўжо. Часам які-небудзь дзед ці бабка раскажуць былі даўнія, і ўсе яны так ці інакш звязаны з карчмою пры гасцінцы.

Андрэй не раз у сваіх вандроўках любіў спыняцца на скрыжаванні дарог, сам не ведаючы чаму. Спыняўся без мэты, нібы па якому ўнутранаму наказу. Люба глянуць павокал — чатыры дарогі памкнуліся ў чатыры бакі і панеслі з сабою дарожны пыл у прывабныя невядомыя далі. Цішыня палёў, адзіноцтва крыжа, на якім, як на жывой істоце, леглі адзнакі часу. І смуткам жаданняў напаўняецца душа, яна тут, нарэшце, адчувае пройдзеныя вёрсты, адзначае іх у сваёй глыбіні,— вёрсты, якія хочацца назваць вёрстамі жыцця і якіх ужо не вярнуць, не вярнуць назад.

З якой жа дарогі завітаеш да мяне, дарагая? Дзе ўбачу, пазнаю тваю постаць, тваю хаду? Ты мільгаеш мне ў вачах — статная, прыгожая, гордая і пяшчотная, свая, свая — дарагая... Нашы думкі спляліся ў адзін квяцісты вянок, якога не ў сілах разарваць ніякі вораг. Мы носім у сабе нявызнанае хараство, несцім яго, як птушачку на далоні. У нас на сэрцах ляжаць раны народа, і цяжка, цяжка, калі яны адкрываюцца, крывавяць, калі ў іх запускае свае кіпцюры вораг.

Вабяць, клічуць дарогі сваімі блакітнымі далямі, і тым больш хочацца не ісці, а стаяць на скрыжаванні, чакаць прыветнай сустрэчы. Нешта мільганула ў вачах,— там, ля ўзгорка... Не, гэта бярозка хіліцца долу сваёй вострай верхавінкай... І зялёнае жыта на гарбатых загонах усё адплывае і адплывае хвалямі ўдаль, аж да цёмнай паласы зубчастага бору, закінутага за палі, за дарогі, пад блакітныя небасхілы.

Андрэй скончыў чытаць ліст Надзі Харашэвіч, якую ў думках сваіх называў яшчэ Вольгай, і, задуменны, насуплены, углядаўся ў далёкае наваколле, седзячы на камені ля крыжа. Ад задумы часам імгліла ў вачах, і тады ён бачыў яе, рухавую, упэўненую, з вачыма,— гэтым люстрам

душы,— якія зазіраюць яму ў твар. Адчуў, як галінка вішні ў белых пахучых пялёстках дакранулася да яго шчакі. Гэта недзе было — ці ў снах, ці ў марах маладосці, якая жыве, якая адыходзіць — уцякае і зноў вяртаецца — моцная, кіпучая, усёперамагаючая. Яна распраствае крылы ў дыханні вясны і гарыць нязгасным агнём у залатых бляcках восені. Маладосць не памірае.

Яна прыляцела на крылах да задуманага Андрэя на скрыжаванне дарог, каб праспяваць песеньку аб той птушачцы на далоні — аб харастве, якое топчацца капытамі ўзброеных панскіх слуг на гэтых вось шляхах.

Надзя-Вольга піша аб перніку і бізуну, якія цяпер увайшлі ў практыку. Тое самае, што Андрэй назваў фіміямам і ядам. А ў канцы паведамляе, што яна атрымала... шэсць год турмы... І дадае:

«Вітай мяне з такой узнагародай... Не забывай...»

Андрэй сядзеў, як прыкаваны. Папяроса дымілася і пагасала і зноў дымілася. Праехаў селянін на маленькай кабылцы з абвіслым жыватом. Нямазанае кола воза назойліва паскрыпвала, а селянін усё паганяў сваю сціплую кабылку, якая дробна перабірала тонкімі нагамі. Селянін, аброслы барадою, валасаты, у белай запыленай сарочцы, звесіў ногі ў лапцях і разглядаў наваколле. Паважліва зірнуў на Андрэя і дакрануўся рукою да брыля — прывітаўся... Бо як жа не прывітацца, калі тут, на скрыжаванні дарог, сядзіць толькі адна жывая душа, загубленая ў палях. Скрып нямазанага кола яшчэ доўга аддаваўся ў вушах, аж пакуль зусім сціх.

І цішыня, аглушальная цішыня зноў навалілася на душу. «Ты рвалася да Вільні... Маеш цяпер Вільню, але... за кратамі,— снаваў сваё Андрэй.— А мне будзе сніцца галінка вішні ў белых пахучых пялёстках. Без яе я цябе не ўяўляю. Ведаю, цвітуць кветкі ў тваёй душы, колеры іх пераліваюцца ў тваіх вачах. І мне хочацца аддаць маладосць сваю гэтым кветкам, прытуліцца да тваіх даверлівых, ласкавых грудзей. Мне хочацца расказаць табе, любімая, чаго нікому не расказваў,— пра цяжкую, часам не па сілах цяжкую маладосць, маладосць у штодзённых баях...

Ты будзеш слухаць і маўчаць, і кропля жалю апячэ тваё гордае і пяшчотнае сэрца, будзеш думаць аб тых незлічоных камсамольцах, якія пайшлі на бітву, з адданымі вачыма — поўнымі чысціні і бляску ранняй сонечнай расы.

Імі запоўніліся турмы. І цішыня гняце мяне навалай вось тут, на скрыжаванні дарог. Новыя атрады павінны іх замяніць. І яны заменяць... Але вораг пасеяў сярод нашых людзей нямала сумненняў... Таму вось цяжка мне, дарагая... Трэба дамагчыся павароту ў нашай барацьбе. Няхай сабе ён будзе жорсткі, бязлітасны. І я настою, каб ён быў, хоць бы давялося загінуць... Што значыць загінуць? Нам трэба быць гатовымі да таго, каб умець загінуць... Без такой гатоўнасці няма гарту душы. Ён нарастае ў дзесятках і сотнях нашых людзей, ён расце ва мне, маладым, які туліць да сябе тваю прыгожую, мудрую галаву з расквечанымі думкамі...»

Вольна плыве ветрык на скрыжаванні дарог, мяккай хваляй ахалоджвае галаву і сэрца. Ідзе вось босенькі хлопчык з кіёчкам у руцэ, а шапка... аж вушы схаваліся ў ёй. Відаць, старая бацькоўская шапка, нават прапацелы кружок ад цемені, як блінок. З-пад доўгага казырка глянулі на Андрэя пакрыўджаныя, сумныя вачаняты.

— Адкуль, хлопчык, ідзеш? — спытаўся Андрэй.

— З Глушца...— ахвотна адказаў хлопчык.— Я там наймітам пасвіў кароў у аднаго гаспадара...

— І што, цяпер ідзеш дахаты?

Апусціў вочы хлопчык і амаль праз плач прамовіў:

— Гаспадар прагнаў мяне... Я рог збіў карове каменем...— І зараз жа дадаў: — Я ж незнарок...

— Тата, мама ёсць у цябе?

— Няма... толькі дзядзька...

— Ах, вось няшчасце, хлопчык. Ідзі дахаты, не бойся. Што зробіш?

— Баюся... Дзядзька будзе біць...

— Не бойся, за што біць? Дзядзька пагаворыць з гаспадаром, і ты зноў вернешся...

Хлопчык паглядзеў з момант на Андрэя, як быццам і яму хацелася тут пасядзець, але... трэба ісці. І абочынай шляху паплялося хлапчаня з пакрыўджанымі сумнымі вачыма, пакідаючы на пяску слядкі сваіх парэпаных ног.

«Сіротка пайшоў...— неяк з уздыхам вырвалася ў Андрэя.— І я цяпер, як тая сірата, не ведаю, з чаго пачаць...»

Прайшла маладзіца з дзіцем на руках. Дзіця спала тым прыгожым пявінным сном, калі, па расказах бабак, у такі час лятаюць над дзецьмі анёлы. Так і застаўся ў вачах Андрэя маленькі твар дзіцяці ў арэоле карункавай шапачкі, якое заснула на руках маці. А маладзіца ішла роўнаю хадою, і ў яе ціхіх вачах, на прыемным сцін-

лым твары разлілося задаво得 ад такой дарагой ношы. І хочацца сказаць ёй услед: ідзі, нясі да канца... Перадай свайму маламу колеры палёў, бляскі сонца, шчэбет птушак на развесістых бярозах, што праводзяць цябе ветлівымі ўсмешкамі, перадай сваю тугу па шчасці і навучы змагацца...

Не паспеў Андрэй развітацца з гэтым вобразам, што ціха праплыў міма яго, як з-за недалёкага ўзгорачка пачуўся тупат, і густы пыл клубкамі пакаціўся па шляху. Чорныя ездакі вырваліся на роўнядзь. Андрэй хутка развязаў шнурок на чаравіку і зняў яго. Вытрасаючы пясок з чаравіка, спадылба лічыў. Дваццаць коннікаў... Усё па форме: цёмна-сінія мундзіры, белыя гузікі, кукарды на шапках, акаваныя казыркі, вінтоўкі за плячыма... Рэвальверы ў кабурах... Скрып сёдлаў... Спешная рысь... Пасачкі над барадамі, значыць, штосьці сур'ёзнае, паны паліцыянты. Куды вы памчаліся? Вядома, на бітву з народам.

Андрэй доўга глядзеў услед паліцэйскаму атраду. Атрад усё змяншаўся і змяншаўся ў вачах і ўрэшце знік далёка за пералескам. Андрэй усё думаў: куды ж гэта яны? Недзе нешта адбылося. Як жа не хочацца ўставаць. Пыл ужо лёг на шлях, і прасторы зноў сталі чыстымі і яснымі. Трэба падумаць... падумаць... Бо думкі плывуць, як гарачая плынь, пераганяюць адна адну, і патрэбны сілы, каб прымусіць іх астояцца, паплыць мерна, устойліваю плынню. З лёгкім ветрыкам нехта шэпча ў вуха: «А што было б, каб ты пайшоў да паноў і там працаваў для нашай справы, для ўзрыву... Напісаў жа ў свой час Міцкевіч «Канрада Валянрода»... Чаму ж бы і табе не адыграць ролю такога Канрада? Бо пачынаецца паласа барацьбы тонкай, гнуткай, вераломнай... І немала пойдзе супроць нас сваіх...»

Перастала ківацца бярозка ў аддаленні — ветрык стаіўся ў жытах, прыціхла скрыжаванне дарог. І голас, знаёмы голас з далёкай далі, як з глыбінь, ускрыкнуў: «Не так, сынок!»

«Дзе гэта я чуў такі выкрык? — мільганула ў галаве.— А-а, чуў, чуў... Гэта Дзям'ян Гарагляд крычыць на свайго сынка, вучыць яго, як раскідаць ліха на папоў, раскідаць лістоўкі. «Не так, сынок!»

«Ты б мог пад выглядам лаяльнасці авалодаць апаратам староства, надарваць яго знутры,— шэпча другі голас,— дэзарганізоўваць яго, ашукваць...»

Падаюць, як камені, словы другога голасу: «Валенрадызм — гэта зброя роспачлівых, зброя слабых, якія страцілі апору ў народзе... Яны не маюць гістарычнай перспектывы. Разумееш? Нас жа чакаюць перамогі, бо мы з народам... Бо мы самі народ... Чуеш, Андрэй? Ідзі з народам!..»

Чый гэта поступ, упэўнены, спакойны, набліжаецца? Паддубны, крыху ссутулены Паддубны бынцам засланіў бярозку. Ён ідзе па шляху, апіраючыся на кій, з клуначкам за плячыма, абходзіць свае райкомы, абдорвае ўвагай, ласкай адданасць, гераізм і выкрывае, кляйміць здраду. Час абвясціць бязлітасную барацьбу здрадзе... Здрада пачынае ўжо лапушыцца, атрутай плыве з Вільні, з Варшавы...

«Ідзі з народам!» — дайшло яшчэ мацней. Затрапяталася бярозка — вецер дзьмухнуў, шугануў па прасторах скрыжавання дарог і па жытніх хвалях панёс аж да лясных небасхілаў: «Ідзі з народам!»

І тут дзве постаці выплылі на шлях. Заўнылы голас паплыў, як звон лірнай струны. Ішоў сівы, сляпы дзед, абвешаны торбамі, а з ім хлопчык — павадыр. Ідуць яны павольна, ступаюць босымі нагамі — адзін вялікімі, сукаватымі, а другі дзіцячымі, загарэлымі. Дзед глядзіць бялкамі сляпых вачэй удаль і цягне сваё бясконечнае літанне:

Наша маленне
Прымі, божа,
Людцам на збаўленне
Прымі, божа,
Нашыя пакуты
Прымі, божа...

Так і пайшлі, мінаючы бярозы. Так і будуць ісці праз увесь шырокі край, будзячы ў людзях задуму і жаль...

Бабкі, цёткі абступяць іх у вёсках, будуць слухаць, шкадаваць, абдорваць хлебам, яечкамі, будуць прасіць, каб памаліліся за ўсіх жывых і памёршых. Адыходзячы, уздыхнуць, пашкадуюць усіх на свеце, хто ў нядолі і няшчасці...

Андрэй устаў, скінуў шапку. Ветрык развяваў яго валасы, а ён іх прыгладжваў рукою. З захапленнем, прыклаўшы руку да сэрца, азіраў неабсяжныя блакітныя прасторы, на якіх скрыжаваліся шляхі. Як бы стукнуўшы кулаком сабе ў грудзі, паўтарыў: «Ідзі з народам!.. Чуеце, таварышы! Толькі з народам!»

Раздзел чацвёрты

## НА ПРЫЦЭЛЕ

У адзін з нядзельных дзён, калі пачынала наліваць жыта, Андрэй паслаў Макара Краўчука да Мірона Вадалея выкапаць рашэнне раённага камітэта — «адправіць» яго за мяжу. На пасяджэнні тройкі былі сабраны ўсе грахі Вадалея. Разблытаўся і вузел з Казючком, якога Вадалей сапраўды пасылаў з лістоўкамі ў пастарунак. Шлях Вадалея стаў шляхам правакатара-двурушніка.

Бяссонніца мучыць Вадалея па начах. Як толькі ён стуліць вочы, усё нейкія пачвары акружаюць яго — калматыя, слізкія. Яны то ператвараюцца раптам у паліцыянтаў, то зноў робяцца пачварамі. Нехта крыкне, як быццам у акно:

— Мірон, што ты нарабіў?

Мірон расплюшчыць вочы, задыханы, увесь спацелы. «А што я нарабіў?.. Ах, няўжо? Хто гэта так крыкнуў — нехта невядомы? Людзі кажуць, што так ліха крычыць... Ну што, калі я ачысціў раён ад камсамольцаў і маладых партыйцаў. Хіба гэта так важна? Я ж старых не чапаю».

— На потым пакідаеш? — зноў крыкнуў нехта проста ў вуха.

«Хто гэта такі?» — азіраецца па хаце Вадалей, потым устае і ста起 старанна аглядае вокны. «Каго тут панясе цяпер? Усе спяць. Але што там... Нехта пайшоў па вуліцы... І так раптам, як быццам стаяў ля акна...»

Вадалей падыходзіць да вядра і прагна п'е ваду. Напіўшыся, уздыхае і, абыякава махнуўшы рукою, гаворыць сам сабе: «Не асіліць ім мяне... Маладыя... Толькі вось гэтая маці Казючка прыходзіла. Няўжо яна аб чым даведалася? Прыйшла і проста з парога накінулася:

— Ты майго сына звёў са свету?

Ледзь адчапіўся, няхай яе чорт...»

«Ліха» толькі намякнула. А калі б вяло гутарку далей, то магло б сказаць Вадалею:

— Ты пасылаў Казючка з лістоўкамі ў пастарунак, га? Пасылаў.

— Ты п'янстваваў з паліцыянтамі? Так, п'янстваваў.

— Ашукваў хлопцаў, членаў ячэйкі, гаворачы ім, што так трэба? Ашукваў.

— Навошта ты гэта рабіў, Вадалей? Сказаць табе ча-

му? Таму, што ты баязлівец і шкурнік. Табе няма ніякай справы да цярпення народа. Хочаш добра пражыць. Атрымліваеш ад паліцыі сярэбранікі, як Юда.

— Колькі ж ты чалавек выдаў ворагу, Вадалей? Шмат выдаў. Пасля глушэцкай дэманстрацыі ты выдаў усіх, каго толькі ведаў — у сваёй вёсцы і ў іншых вёсках. Так што ўжо не было каму ўзяць цябе на прыцэл. Увесь актыў арыштавалі. А ты, Мірон, жыў прыпяваючы і нават пачаў адкрыта піць з паліцыянтамі...

«Ліха» магло б яшчэ сказаць, што ў раённым камітэце партыі, дзе сакратарствуе гэты «маладзы» Андрэй, ужо вынеслі прысуд, за Вадалеем сочаць хлопцы на чале з Макарам Краўчуком. Але «ліха» не скажа пра гэта Вадалею, не.

Апошнія дні Мірона не пакідае страх. Удзень яшчэ сяк-так... Павалачэцца ў воласць або ў Глушэц. Нядаўна запрасіў яго камендант валаснога пастарунка ў карчму. Там ужо сядзелі і войт і солтыс з вёскі Вадалея. Гутарка ішла аб тым, як лягчэй правесці хутарызацыю. Камендант і войт падкрэслівалі, што яны спадзяюцца на дапамогу Мірона і што ён атрымае за гэта добрую плату. Войт казаў, што мужыкі не хочуць хутароў і што трэба іх угаворваць, а пра бунтаўшчыкоў даносіць паліцыі. На ўсё згодзен быў Вадалей. Але ў п'яным чадзе нікому і ў галаву не прыйшло, што свае вяскоўцы Вадалею ўжо не вераць.

Добра гэта ведае сам Мірон. Таму і не дае спакою паліцыі — просіць перакінуць яго ў Савецкі Саюз. Там жа... краіна велізарная, можна схавацца, ашукаць савецкіх таварышаў, нагаварыць ім пра сваё бясстрашша ў барацьбе з панамі і пра тое, што яму ўжо нельга было заставацца ў Польшчы, бо пагражала шыбеніца.

Камендант пастарунка, дакладваючы ў павятовай паліцыі пра становішча на сваім участку, сказаў пра Вадалея аб яго жаданні дапамагчы ў справе хутароў. Павятовы камендант нават прыкрыкнуў на пастарункавага каменданта:

— Хіба ж вы не разумееце, што Вадалей ужо непрыгодны? Дзе вашы галовы? Вадалей жа злодзей, пся крэў! Сваёю дапамогаю ён будзе толькі шкодзіць нам. Сяляне скажуць — паліцыя дружыць са зладзеямі...

— Што ж нам з ім рабіць, пане камендант?

— Яго трэба перакінуць у другі павет.

— Ён, пане каменданце, просіцца ў Савецкі Саюз.

— У Савецкі Саюз? Гэта цікава. Трэба падумаць. Прыйдзеце да мяне дні праз тры, атрымаеце адказ.

І Вадалею быў сфабрыкаваны савецкі пашпарт і ўручан самім камендантам павятовай паліцыі.

Але як ні стараўся Вадалей схавацца ад суседзяў са сваімі зборамі ў дарогу, нічога з гэтага не выйшла. Ужо адно тое, што прадаў каня, збрую і калёсы, усіх насцеражыла. Як гэта — раптам у рабочую пару прадаваць каня? На пытанні пра гэта ён адказваў, што і зямлю будзе прадаваць, што збіраецца адкрыць у Глушцы бакалейную краму. Людзі верылі і не верылі.

І вось надышоў дзень, ці, дакладней, ноч, калі Вадалей пакінуў вёску. Жонцы ён загадаў, каб нікому не гаварыла, куды ён пайшоў і каб па ім не гаравала. Ён, усемагутны Вадалей, забярэ яе адгэтуль, як толькі астацюецца ў Савецкім Саюзе, вядома, у гэтым цудоўным Крыме.

Людзі не так хутка даведаліся б пра гэта, каб не адзін выпадак...

Трэба ж было яму, Вадалею, наткнуцца, ідучы па дарозе, на сваіх вяскоўцаў на начлезе. Сяляне спалі ля гаснучага агню. Толькі двое сядзелі і курылі. Яны вось і акліквулі Вадалея:

— Куды ідзеш?

Вадалей адказаў абыякавым тонам: «Долі шукаць», закурыў і пайшоў далей. А начлежнікі з сумненнем паківалі галовамі. У вёсцы ж старому і малому было вядома, што Вадалей ужо даўно хоча перабрацца за кардон, каб жыць там так, як жыў калісьці,— займаць дзесяць пасад адначасова і не ведаць ніякіх турбот. Ну, вядома, ён туды і пайшоў.

— Ну і няхай. Можа, не так часта паліцыя будзе прыходзіць у вёску,— казалі людзі.

У тую ж раніцу аб адыходзе Вадалея дазнаўся Андрэй. І Макар Краўчук адразу сабраўся ў дарогу.

...На паўстанку ў чакальні Макар убачыў толькі двух чалавек. Няма часу цяпер ездзіць людзям — пара сенакосу, набліжаецца жніво — усе заняты работай. Няўжо Макар памыліўся, і мярзотнік прабіраецца другім шляхам? Не можа быць! Але ў душу ўсё-такі закралася трывога. Закурыў і пачаў чакаць, калі адчыняць касу. У чакальні было так ціха, што два пасажыры гаварылі між сабою амаль шэптам. І таму так гучна аддалося ў вушах рыпенне вакзальных дзвярэй. Ну, усё ў парадку —

увайшоў ён, Вадалей. Шчасце Макара, што Мірон яго не ведаў. А Макар, наадварот, бачыў Мірона ўжо некалькі разоў.

...Поезд імчаў на ўсход. Сярод усіх пасажыраў было двое, з якіх адзін назіраў за другім. «Не дапусціць нягодніка туды, дзе вызвалены народ,— у краіну свабоды».

Праз два дні Макар паведаміў Андрэю, што заданне выканана — Вадалей Савецкага Саюза не ўбачыць...

## У ХАЦЕ ПЕТРУСЯ

Часта задуманы сядзіць на парозе сваёй хаты Пятрусь Хадыка. Гэта бывае заўсёды вечарамі, калі захад сонца ў ружовых бляcках дагарае далёка за жытам. На крок ад парога шуміць, здаецца, ніколі не сціхае кучаравая елка, на якой пасяліліся вераб'і, а крыху воддаль, ля крывога гуменца, пакалыхваецца высокая бяроза, якую ў свой час хацеў зрэзаць Мікіта Лазун.

Заміраюць далі ў апошніх бляcках сонца, і мерна, паволі сціхае вясковы дзённы гул. Прайшлі з пашы каровы, ужо і пыл асеў, ад яго засталася толькі смуга, якая пахне сырадоем, а Пятрусь сядзіць на парозе, і на душу зыходзіць незразумелая туга.

Ці заміраючыя далі яе наводзяць, ці гэты бледны месяц, які пачынае прабірацца праз ваўняныя хмаркі, ці што іншае? Толькі Пятрусь пасядзіць-пасядзіць, устане, пойдзе ў хату і выйдзе на парог са скрыпкай. Нешта ўсё часцей і часцей бярэцца Пятрусь за скрыпку так, як бывала браўся найбольш за гармонік. Відаць, так тонка не перадасць настрой душы цяпер гармонік. На душу легла многае, набалелае, быццам чалавек страціў нешта дарагое... Шмат, шмат страт усякіх... І часам цяжка дыхаць пад гэтым прыгожым небам. Правядзе Пятрусь смыком па струнах, і дрыжачыя звонкія гукі пераклікнуцца ў глушы вёскі з канца ў канец, адаб'юцца ў сэрцы кожнага. Будзіць цішыню Пятрусь, пачынае выводзіць нейкую адмысловую мелодыю. Што гэта за мелодыя? Гэта і не полька, і не вальс, не песня. Гэта нейкая дума. Яна не ўзята ні з якіх нот, ні з чужых перапеваў, яна нарадзілася ў душы Петруся неяк сама сабою. Людзі, слухаючы, пытаюцца: «Што гэта такое іграе Пятрусь?» І ўсё роўна слухаюць. Нешта як быццам незразумелае, але знаёмае. Далёка ляцяць гукі скрыпкі Петруся, ля-

цяць, як быццам прамяністыя, над заціхлымі жытамі да дарог, да шляхоў, каб данесці на шырокія прасторы сваю тугу па тым, чаго няма. Не адна іскрынка загараецца ў сэрцах людзей, не адна ўцешная, салодкая думка-мара. Рассейваецца глуш, якая ціснe душу, як камень, і нараджае змрочныя думы, якія падшэптваюць, што ўжо і выхаду няма з жыццёвых тупікоў. Гукі яго скрыпкі даляцелі і да вушэй паліцыі, і яна выклікала Петруся ў пастарунак. Пратрымаўшы двое сутак, сказала, каб больш не іграў, пагражала карай.

Няёмка саджаць чалавека за краты за тое, што іграе на скрыпцы, і таму некаторыя са звычайных паліцыянтаў з пэўнай нават пашанай глядзелі на Петруся, аднавокага чалавека, чалавека-мастака, які іграе нават часам над магілай Ткачука і Рамановіча, якія загінулі за свабоду свайго краю.

Пятрусь іграе на парозе сваёй хаты, будзіць навакольную глуш. А яна — гэтая глуш — ахутвае вёску заўсёды, даволі толькі вёсцы прыціхнуць. Былі часы далёкія, даўнія, калі жыла, панавала толькі глуш над бяздоллем людзей, калі вёскі туліліся ў непраходных пушчах, калі мядзведзі выходзілі са сваіх недасягальных сховаў на ўскраіну, бліжэй да вёскі, і рыкам-рэхам агалошвалі сваё прыбыццё. Нездарма тыя часы так і завуцца — глухімі. Тады не было па вёсцы скрыпачоў, тады жыла толькі жалейка, якая вылівала свой жаль. І выдумалі ж тады людзі сродак супроць глушы і яе страхаў. Гэтым сродкам была доўгая драўляная труба, змацаваная абручыкамі,— шырокая ў адным канцы, вузкая ў другім. Такая труба ляжала ў пракапанай канаўцы, каб не рассохлася,— ляжала ў той «жыле», якая і цяпер перасякае вёску. Труба клалася на крыжакі.

Калі над вёскай навісала разам з хмарамі невыносная глуш, асабліва ў асенняе змярканне, і пад сэрцамі ў людзей пачынала смактаць назойлівая туга, трубачы-мастакі ішлі да трубы.

Тады ў замшэлае, лясістае наваколле плылі працяглыя гукі, глухім рэхам аддаваліся ў асенніх прасторах і, спудзіўшы глуш, заміралі далёка, далёка...

— Ту-ту-ту-у-у... Ту-ту-у-у...— залівалася труба.

Заміралa рэха, заміралі і сэрцы ў людзей з усмешкай уцехі, нават захаплення. Рабілася не так беспрытульна, не так адзінока.

— Як хораша трубяць,— казалі людзі.

Труба залівалася на розныя тоны, якія надавалі ёй, спаборнічаючы, трубачы. Яна выігрывала то нешта падобнае на салдацкую «зару», то працяглым басам нагадвала рык мядзведзя або тонкімі пералівамі перадавала цягучыя крыкі балотнай птушкі кнігаўкі, то пераходзіла на тоны жніўнай песні, загубленай у палях... Труба іграла, разганяла глуш. Труба надавала свой голас ад закінутых вёсак у далёкі, нязнаны свет, голас жальбы і пагрозы.

Так было калісьці...

Нешта падобнае насоўваецца часам і цяпер, калі ўжо няма безвыходнай глушы, калі па свеце прайшлі вялікія буры і з наседжаных гнёздаў спудзілі, а па прасторах былой царскай Расіі і выгналі паноў. Насоўваецца і напамінае старое, гаротнае. Напамінаючы, выклікае звонкія гукі з-пад струн скрыпкі Петруся Хадыкі.

Асабліває жыццё ў Петруся — халасцяцкае, як быццам дачаснае, але затое таварыскае. Жыве з ім Макар Краўчук і падгаворвае свайго гаспадара як-небудзь купіць каня сумеснымі сіламі... Не хоча Пятрусь, баіцца клопату, цяжкасцей, а можа, баіцца і таго, што хапіцца за скрыпку не будзе ўжо не толькі часу, але і такой ахвоты, як цяпер. Вараць сабе самі халасцякі, латаюць адзежу, падмятаюць хату... Часам прыйдзе Дзям'янава Люба — памыць, паскрэбці ім стол, лавы, памыць вокны, забярэ бялізну абодвух з сабою... Дакарае іх за непарадкі ў пасудзе і, выгарнуўшы заляжалы попел з печы, запаліць у ёй.Варыць ім, грэе ваду, каб рашчыніць хлеб бабылям і заўтра прыйсці спячы яго. Такія свае прыходы найчасцей рабіла яна ў суботу, як кажуць, пад нядзелю. Наперабой Любе дапамагалі Макар і Пятрусь — падавалі патрэбныя рэчы, прыносілі ваду, дровы, увіхаліся, слухаліся, як малыя. А Люба — статная, узмажнелая, запнецца фартухом, перавяжа галаву хусткай, як каронай, каб не звешваліся валасы, мільгае па хаце то там, то там. І святлейшымі рабіліся змрочныя сцэны хаты Петруся.

— Жаніўся б,— часам скажуць Петрусю бабы,— а то ў сукі парасцеш...

— Не... не хачу... Чырвонай зорачкі дачакаюся, тады... Панам смачна было б глядзець на маё вяселле. Сказалі б — ажаніўся, значыць, і скрыпку закіне,— адказвае Пятрусь.

Адчуваюць паны, якую шкоду робіць ім Петрусёва скрыпка, і рады былі б яе пазбыцца.

Люба, парабіўшы ўсе работы, паварыўшы есці бабылям, павячэрае разам з імі. Пасля вячэры Пятрусь бярэ скрыпку і ідзе на вуліцу. На гук скрыпкі прыходзіць з бубнам Лявон. Злятаецца моладзь, і пачынаюцца полькі, вальсы. Застаюцца ў хаце Макар і Люба — сядзяць, гутараць упаўголаса. Усё больш і больш туліцца Макар да Любы...

Але вось новы жыхар завітаў у хату Петруся. Ужо некалькі начэй начуе тут Кузьма, сын Мікіты Лазуна. Што за прычына прывяла яго сюды? Загадаў Мікіту граф Ельскі знайсці вялікі камень на полі на помнік здохламу сабаку-ганчаку, які за сваю гнуткасць быў празваны Вуж. На графскіх палях каменняў няма — іх даўно пазбіралі парабкі да аднаго, да самага дробнага. Камені пайшлі на пабудову склепаў, на вадзяны млын, што стаіць воддаль за садам пры лесе, на грэблю, што ідзе праз альшанік да млына, на замошчванне падворкаў. А што засталося, граф прадаў на шашу і ў Глушэц. Так што няма каменняў на палях графа Ельскага. А на сялянскіх... зірні навокал — усё валуны і валуны бялеюць, як рассыпаныя галовы пасля якога бою. На межах тарчаць з зямлі вялікія камяні, пасівелыя, як глыбы горных скал, закінутых сюды невядома кім. Вось такі камень і патрэбен графу Ельскаму, каб паставіць помнік свайму любімцу Вужу. Яго павінен даставіць Мікіта Лазун. Што ж, гэта можна... Графская воля ўсемагутная. Што захоча, тое і зробіць з людзьмі. Графская ласка вышэй за ўсё. Бачыце, нават сабаку помнік ставіць. І Мікіта, усцешаны такою ўвагай пана графа, загадвае Кузьме ісці на поле выкопваць камень, каб потым, узваліўшы яго на воз, адвезці ў маёнтак. Нават ласкава загадваў Мікіта Кузьме — што то значыць быць з графам у дружбе... Ого... Такое шчасце не ўсякаму прыходзіць.

— Вось паснедаеш і пойдзеш...— гаварыў Мікіта, як быццам прыдобрываючыся. Загадаў нявестцы Ульяне прынесці сала да бліноў. Пыхкала люлька, моргала бяльматае вока. Мікіта соп у нос, пляваў на падлогу і паогул быў як у святочным настроі. Помнік панскаму сабаку — ці ж гэта не хаўтуры?

Кузьма пачырванеў. Галава як апусцілася, так і не ўзнімалася. Па руках прайшлі дрыжыкі, і далоні самі сціснуліся ў кулакі. Ведаў, што будзе бура, калі адмовіцца. Але ісці выкопваць камень на помнік для саба-

кі... не... І нага не скранецца з месца... Горшага ўніжэння не можа мець чалавек...

— Не, бацька, я не пайду выкопваць камень...— хоць цераз сілу, але наадрэз адмовіўся Кузьма,— помнікі ставяць толькі людзям.

Мікіта набіваў люльку, павольна таптаў пальцам табаку і гаварыў:

— Ну, хлопча, мусіць, з табою прыйдзецца гаварыць іначай. Сядай снедаць, я табе кажу!

— Я не хачу...— адпекваўся Кузьма.

— Як не хочаш снедаць, то бяры лапату і лом і ідзі адкопваць камень... Трэба сёння за дзень яго адкапаць і вывернуць з ямы наверх.

— Я адкопваць камень не пайду!.. Каб гэта помнік чалавеку, а то сабаку... Людзі сабакаром празавуць.

Гнеў, які дагэтуль стрымліваў Мікіта, прарваўся.

— Як не хочаш, то вон з хаты, каб я цябе не бачыў! Вон! — крычаў Мікіта і шукаў навокал, каб што схапіць у руку.

Кузьма, бачачы, што можа атрымаць па спіне, схапіў куртку і шапку са сцяны і, прыгнуўшыся, шмыгнуў за парог. А Мікіта ўжо з кіем бег за Кузьмою, бледны, узлахмачаны, і крычаў:

— І не вяртайся дахаты! Чуеш? Ні на парог! Набраўся розуму ад басоты — няхай яна цябе корміць! — Нешта пачварна-жудаснае было ў постаці Мікіты. Валасы ўздыбіліся, бяльматае вока заплыло цемнаватай павалаччу, нос чмыхаў і соп, а кій усё стук і стук... усё стук і стук аб зямлю. Нагрудны крыжык на чырвонай жычцы вылез з напаўрасхрыстанай сарочкі.

А Кузьма пабег за агароды... Пырснулі слёзы з вачэй. Ён іх выцер і прыбавіў кроку. Сцежка павілася праз кошаныя лугі ў альшанік, да рэчкі...

Кузьма пачуў, што нешта затупацела ззаду, але не азірнуўся. Упарта не хацеў аглядацца на вёску, дзе ў сваёй хаце з яго здзекаваліся, лічылі яго за апошняга, за тую апучу, якою вымаюць гаршкі з печы і выціраюць лаву ад памыяў. Тупаценне наблізілася, і раптам чорны вяртлявы Мурза з жоўтымі бровамі скочыў Кузьме на грудзі і паспеў лізнуць нос.

— Адыдзі, Мурза, мне не да цябе,— лагодна адсунуў рукою Кузьма сабаку і паспяшыў далей.

Мурза пісцнуў нешта, апусціў галаву, як быццам зразумеў, што трэба маўчаць, і бег побач з Кузьмою.

А Кузьма нічога не бачыў перад сабою, ды і не глядзеў. Апусціў змакрэлыя вочы ў сцежку, якая ўрэшце вывела ў сенажатныя прасторы, сярод якіх хавалася рэчка. Любіў Кузьма заўсёды глядзець на гэтыя прасторы — на прамяністыя росы, на навакольны лес, любіў лазіць па рэчцы, лавіць ракаў падсакай, а то проста рукамі. А цяпер — нішто няміла. Хутчэй бы да рэчкі. А там...

Вось і яна, ціхая, духмяная, у жоўтых гладышачках лілій на гладкай празрыстай паверхні. Сеў Кузьма на бераг, заглядзеўся ў ваду, а там рыбкі маленькія гуляюць, усё плывуць і плывуць, мігцяць серабрыстаю лускою... Белае воблачка застыла на сярэдзіне рэчкі, як цукровае, а навокал яго сінь, сінь...

І здаецца Кузьме, што гэта дно рэчкі такое бяскрайна-глыбокае, блакітнае, што можна апусціцца туды і намацаць рукамі кучаравае воблачка, прайсціся па блакітнаму дну і загубіцца ў сіняве.

Там няма ні бацькі, ні графа Ельскага, ні сабакі Вужа, якому Кузьма, на смех людскі, павінен рыхтаваць камень на помнік. Там чысціня блакітная, неабдымная... І затрэсліся плечы Кузьмы ад плачу...

Мурза сядзеў побач, соп, тупаў белымі лапамі. А то скавытне, адбяжыцца і зноў вяртаецца, гляне блішчастымі вачыма на Кузьму, пісне неспакойна і дыхае, як у спякоту. Заімгліліся вочы Кузьмы ад слёз. Ён бачыць толькі сінь бяздонную і ляціць, ляціць у яе...

Чыясьці рука тузанула за плячо, і раптам грозны голас:

— А ты куды?

Кузьма толькі адзін раз прыўзняў галаву і тут жа закрыў твар рукамі. Над ім стаялі ўстрывожаныя Сцяпан Касцевіч з граблямі і Пятрусь Хадыка з вудаю.

— Што з табою, Кузьма, чаго ты плачаш? — спытаўся Сцяпан.

Кузьма маўчаў, выціраючы вочы, хацеў супакоіцца. Сцяпан і Пятрусь селі побач і дапытліва глядзелі на Кузьму.

Кузьма, крыху супакоіўшыся, расказаў сваю бяду. Па меры таго, як ён гаварыў, твары ў слухачоў паважнелі, непрыкметна для сябе, хмурыліся.

— От жываедл...— вырвалася ў Петруся.

— Нелюд...— дадаў Сцяпан.— Хто цяпер пойдзе рабіць помнік панскаму сабаку? Не тыя часы...

— І што ж ты цяпер тапіцца ўздумаў? — сурова, да-

корлівым тонам спытаўся Пятрусь.— Гэта, брат, не работа...

Кузьма маўчаў.

— Добра было б, каб ты аддзяліўся ад бацькі,— сказаў стары Касцевіч,— узяў бы жонку і жыў бы...

— Ого... Аддзеліць ён... Якраз... Ён сам думае жаніцца...— адказаў Кузьма.

— Ужо чэрці ў пекле яго ажэняць... А табе, хлопча, як відаць, жыцця не будзе ў хаце. Шукай іншага спосабу. Пайдзі ў прымы да якой маладзіцы, удавы. Такія ёсць цяпер... А там будзе відаць... І ідзі дахаты, не сядзі тут. Здумаў, ліха ведае што,— ужо сварыўся на Кузьму Касцевіч.

— Дзе там — дахаты? Сказаў, каб ні па парог... Дахаты я не пайду. Хай ён задушыцца там.

Сцяпан з Петрусём пераглянуліся, як быццам хацелі дамовіцца — што ж рабіць з гэтым хлопцам?

Задача сапраўды была нялёгкая.

— Снедаў ты ці не? — спытаўся Сцяпан.

Кузьма моўчкі закруціў галавою.

Усе некалькі хвілін маўчалі, глядзелі на рэчку, якая плыла між тарфяных берагоў у свежай ранняй цішыні. Толькі часам спалохае цішыню плёск рыбкі, ды яшчэ далёкія ледзь чутныя бомы даносяцца невядома адкуль — недзе з палёў, з лесу, з дарог...

— Т-а-а-к,— працягнуў Пятрусь,— палажэнне тваё нікавае, брат. Зладзюга твой бацька, хоць ён і твой бацька... Хадзем, брат, ка мне. Паснедаем... Хоць жыццё маё пралетарскае, але нічога, ты не набрыдзішся.

— Чаго брыдзіцца? Што ты, Пятрусь? — запратэставаў Кузьма.

— Ну і добра... Толькі па дарозе траўкі нарвём трусам... Уставай, хадзем... А там нешта вырашым. Прыйдзе Макар з работы... Не журыся!

Так і застаўся жыць Кузьма ў Петруся Хадыкі. Удзень браў матыку і па-за гумнамі, каб ніхто не бачыў, ішоў на поле акучваць сваю бульбу. Там заставала яго Ульяна, прыносіла ежу і пакідала яму, каб узяў з сабою. Гаварыла, што да бацькі і даступіцца нельга. Маўчыць і толькі часам роўкае, як бык. І раіла: «Не ідзі, Кузьма, пакуль што дахаты, бо ён можа цябе абязвечыць. Пачакай...»

Увечары Кузьма прыходзіў з поля да Петруся. Вяртаўся з работы Макар, а аднаго разу прыйшоў з ім і Пілiп Гайдук. Гэта быў малады хлопец з носам, як люлечка,

з блакітнымі, адкрыта наіўнымі вачыма, якія, здаецца, цвілі. Дзяды і прадзеды Піліпа былі парабкамі. Цяпер жыве яшчэ стары бацька, худы, спрацаваны, як высмактаны, і заўсёды, заўсёды маўклівы. Яшчэ чатыры гады засталося папрацаваць бацьку,— гэта значыць, што яму споўніцца шэсцьдзесят год, і тады, па закону, ён павінен будзе, як кажуць, жыць на ласкавым панскім хлебе — атрымліваць аж да смерці ўстаноўленую норму жыта, бульбы, якуюсьці долю грашыма. Бо дваццаць пяць год ужо адробіць у графа Ельскага бацька Піліпа і мае права на такую вось пажыццёвую пенсію. Мае права... Але ў паноў гэтае права на вадзе віламі напісана.

Піліп Гайдук, адзіны сын у бацькоў,— старэйшыя дзеці памерлі ў час вайны,— як быццам пераняў ад бацькі тую насцярожанасць, боязь, каб якая неспадзяваная крыўда не звалілася на плечы. З гэтым заўсёды жылі ў маёнтку. Таму Піліп сярод яшчэ незнаёмых хлопцаў вёскі Запалянкі быў нясмелым, часта без прычыны азіраўся, як беспрытульны, пакрыўджаны. Але адно здарэнне азарыла душу Піліпа Гайдука. Пару год таму назад ён ішоў з Глушца па шляху і знайшоў беларускую газету. Ці хто яе кінуў знарок, ці згубіў выпадкова,— невядома, але газета ляжала на схіле травяной канаўкі, і яе падняў Гайдук. Газета называлася «Наперад». Гайдук сеў пад сасною і пачаў чытаць. Так захапіўся чытаннем, што і не заўважыў, як пачало ўжо вечарэць. Чаго там толькі не было ў гэтай газеце! І пра Пілсудскага і пра Вільню, а найбольш усё пра вёску, пра сялян, усё супроць паноў. Як жа іх не шкадавалі! Клялі, высмейвалі, бічавалі на ўсе лады. Уцехай напоўнілася сэрца Піліпа Гайдука, і, усхваляваны да глыбіні душы, ён прыйшоў дахаты, несучы ў кішэні газету, як невядома які скарб. Аказваецца, пішуць у газеце тое, што самому думаецца па адзіноце.

І як гэта яны ўмеюць — гэтыя пісары — падслухоўваць нашы думкі? Мудра гэта, дзіўна і цудоўна.

Ніколі не завітвала беларуская газета ў маёнтак графа Ельскага.

Калі не было беларускай газеты, то гэта не значыць, што сярод парабкаў не мела ходу ніякая літаратура. Мела! Сам граф Ельскі на свае ўласныя грошы выпісваў, напрыклад, для сваіх рабоў рэлігійна-цемрашальскі часопіс на польскай мове «Рыцэж непокалянэй» [1], дзе куль-

[1] Рыцар прачыстай.

тываваліся ўсялякія забабоны і гразёю абліваўся Савецкі Саюз. Выпісвалася газета «Унія», самая брудная з усіх бульварных газет Польшчы, хоць і рэдагавалася ксяндзамі, пад знакам крыжа і Хрыста. Святыя айцы цемры ігралі на інстынктах цёмных мас, як толькі хацелі. Панская ахмістрыня, што азначала — падхалімка і шпіёнка, хадзіла па чвараках [1] у нядзелю і чытала парабкам аб цудатворнай сіле рымскага папы і аб тым, напрыклад, што ў Савецкім Саюзе ходзяць па стэпах цэлыя арміі здзічэлых людзей, што дачка цара Мікалая II Ксенія блукае па сібірскай тайзе і з'яўляецца людзям у сонечным вянку. Або чытае разважанні аб тым, курыў Хрыстос ці не, а калі курыў, то што — папяросу ці люльку? Або яшчэ — якой вышыні быў той асёл, на якім Хрыстос уязджаў у Ерусалім.

Вось такой «духоўнай стравай» карміў сваіх рабоў граф Ельскі.

І таму незвычайным здарэннем было, калі маладому парабку Піліпу Гайдуку так нечакана трапіла ў рукі беларуская газета «Наперад».

Гайдук прынёс яе дахаты і прачытаў бацькам. Яны слухалі і палохаліся. «Ой, гэта ж тое самае, што мы думаем пра паноў па адзіноце і нікому не кажам».

— Кінь, не чытай,— сказаў бацька,— а то і сцены маюць вушы.

Але сын не кінуў. За ноч надумаўся напісаць у рэдакцыю, каб высылалі яму гэтую цудоўную газету. Напісаў так: «Дарагая рэдакцыя! Нейкі чалавек згубіў газету «Наперад», а я знайшоў яе, прачытаў і вельмі палюбіў. І прашу выслаць мне вашу газету бясплатна, бо я парабак,— не маю чым плаціць».

Рэдакцыя выслала Піліпу Гайдуку толькі тры нумары, а потым адказала, што высылаць бясплатна не мае больш магчымасці. Але пасля знаёмства з беларускімі вершыкамі ў газеце Піліпа Гайдука самога пацягнула напісаць нешта падобнае. Так і зрабіўся парабак графа Ельскага паэтам. Калі прыйшоў на працу ў маёнтак Макар, тады яшчэ больш расшырыліся і загарэліся думкі Гайдука. І вось ён ужо нават прыходзіць у Запалянку, у хату Петруся Хадыкі.

Там збіраецца шмат хлопцаў, якім і чытае свае вершы Гайдук. Аднаго разу Пеця Ціханчук паклікаў і Андрэя, каб паслухаў.

---

[1] Чваракі — жыллё парабкаў.

— Добра піша хлопец,— казаў ён,— нават хвацка. Піліп чытаў:

Не век пасіць ваду збан,
Бо на ўсё ёсць смерці час,—
Не век будзе ліхі пан
У балота таптаць нас.

Андрэй, праслухаўшы, павёў бровамі і замкнуў у губах набеглую ўсмешку. Слухаў далей. А Пятрусь Хадыка папрасіў:

— Пра сабаку... пра сабаку прачытай...

Піліп Гайдук чытаў:

Пан, сабака здох,
А пан Ельскі — вох!
Толькі не хапала,
Каб сам Ельскі здох.

Хлопцы рагаталі. Смяяўся і Кузьма.

Андрэй надзяліў паэта творамі Купалы, Коласа, а з рускіх паэтаў даў тры кніжачкі: Някрасава, Кальцова і Нікіціна. Абдораны такою ўвагай, Гайдук прамянеў, усё пацягваў паветра ў свой растапыраны кірпаты носік.

Але далёка яшчэ было да таго, каб Піліпа Гайдука зрабіць камсамольцам. Андрэй так і сказаў Пецю:

— Не спяшайцеся. Няхай асвоіцца з намі. Вельмі ён забіты і запалоханы...

## СЦЯГ НА САСНЕ

Эканамічны крызіс ахапіў усю Польшчу неяк раптам, быццам знянацку, і ўсё больш і больш набіраў сваёй падрыўной сілы. Сяляне забілі трывогу, што патанела збожжа, асабліва жыта, патанелі свінні, каровы, коні, нават масла і яйкі... Падаражэла жалеза, цвікі, падаражэла адзежа, тканіна, табака, падаражэлі запалкі, соль, гарэлка... Скончылася мядовая для паноў «санацыя» пасля майскага фашысцкага перавароту. Цяпер гавораць, пішуць аб бюджэтных дэфіцытах, аб пагрозе зніжэння курса стабілізаванага злотага. Зніжаецца заработная плата рабочых на заводах, фабрыках, на шахтах. Выбухаюць забастоўкі. Пачынаецца ўздым рэвалюцыйнай хвалі ва ўмовах крызісу. Да ўлады прыйшоў генерал Славой-Складкоўскі — польскі Трэпаў.

Так празвалі яго камуністы. Калі Славой прыходзіць да ўлады, трэба чакаць расстрэлаў дэманстрацый, узмацнен-

ня паліцыі, пагоршання рэжыму ў турмах... трэба чакаць тэрору ўсюды, ва ўсіх відах і формах.

І тэрор прыйшоў. Ён прыйшоў не толькі ў гарады да рабочых, не толькі ў мястэчкі да богабаязных мяшчан, але і ў вёскі, у самыя глухія куткі не толькі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, але і самой Польшчы. Паліцэйска-адміністрацыйныя загады паплылі адзін за другім. Паліцыя павінна сябе апраўдаць, бо няма бюджэту на павелічэнне паліцыі, а павялічваць трэба.

І вось у кожнай падводзе павінен пад дугою вісець званочак.

Гэта нядаўняя новая выдумка генерала Славой-Складкоўскага — кожны селянін павінен мець званочак пад сваёй дугою. Спачатку ўсе думалі, што гэта так сабе, насмешка нейкая, але як пасыпаліся штрафы за невыкананне загаду, сяляне пачалі здабываць гэтыя праклятыя званочкі. Кожны званочак каштаваў пяць злотых, на што трэба было прадаць каля пяці пудоў жыта. Ну і выдумляюць паны неспадзяванкі, а ўсё для таго, каб апошні грош вырваць з рук. Але можна было бачыць, што не ва ўсіх былі сапраўдныя званочкі. Многія сяляне, каб не купляць званочкаў, рабілі свае, з бляшанак з-пад кансерваў. Унутры прывязваўся на дроце кавалак тоўстага цвіка або якая жалязяка — усё роўна звініць, абы толькі паліцыя не чаплялася, няхай ёй вочы павылазяць. Званочкі віселі пад самаробнымі дугамі, а ў каго была бляшанка завялікая, то прывязвалася да гужа, матлялася, як гладыш. Чорт яго бяры, абы быў, не да прыгажосці тут, калі трэба па званочак прадаваць пяць пудоў жыта. Паны, мусіць, хочуць ведаць, дзе паварочваецца наш брат удзень і ўначы,— набраліся страху па крэсах, што гатовы кожнаму кусту пры дарозе прывязаць званочак. Нездарма польскі Трэпаў — Славой-Складкоўскі сказаў у сейме, што паліцыя павінна зарабіць на сябе, павінна сябе апраўдаць. Вось яна і апраўдвае сябе па нашай скуры. Эх ты, нядоля, калі табе будзе канец? Званочкі... а тут яшчэ трэба прыбіваць дошчачкі да вазоў, каб было вядома, чый воз стаіць на рынку. А ну ж у возе знойдуцца лістоўкі ці бомбы, а гаспадара не будзе — можна без цяжкасцей і завочна пісаць пратакол. «Мудрасці» Складкоўскага распаўсюдзіліся і на іншае — пры ўездзе ў мястэчка ў рынкавы дзень паліцыя бярэ грошы за ўезд, што і называецца па-польску — «в'яздовэ», або «рогатковэ». Як толькі селянін стане, займе месца на рынку, зараз жа падыходзіць паліцыянт і патра-

буе платы за месяц. Скопу па вас няма, папочкі! А тут яшчэ загадана па вёсках рабіць прыбіральні, бяліць звонку пахіленыя хаты, платы. І ўсяму спадарожнічаюць штрафы, штрафы, штрафы...

Польскі народ там, у цэнтральнай Польшчы, у насмешку назваў прыбіральні Складкоўскага яго імем: «Славойкі».

Рогат разлягаўся па ўсёй працоўнай Польшчы над «рэформамі» Славоя. Нават прамысловая буржуазія пускала сатыру за сатырай у сваёй прэсе па адрасу цыніка-жандара, легіянерскага эскулапа, які ўжо і сваю кніжку выдаў пад салдафонскай назвай «Клізмай і шабляй». Вось глядзіце, чым ён ваяваў у легіёнах — клізмай і шабляй — гэты рыцар прыбіральняў, які нямала праліў і яшчэ пралье рабоча-сялянскай крыві. У Польшчы пачынаюцца ўжо «рагатковыя» бунты, сяляне не хочуць плаціць рагатковага збору, прарываюць паліцэйскія кардоны пры ўездзе ў горад, і паліцыю, якая ўцякае пад іх націскам, даганяе, даганяе рогат народа...

* * *

Людзі не толькі ўсміхаюцца, але і смяюцца з паноў, гледзячы на высокую сасну пры дарозе. Хто ідзе ці едзе на кірмаш у Глушэц, абавязкова падымае галаву ўверх, як толькі наблізіцца да сасны. На самай яе верхавіне развяваецца пад нябеснай сінню чырвоны сцяг. Ён быццам плыве ўдаль насустрач ранняму сонцу. Людзі дзівяцца, як мог нехта забрацца на такую вышыню — гэта ж да першага сучка сасны каля трыццаці метраў гладкага ствала.

Не адзін сцяг развяваўся ў гэты дзень па прыдарожных соснах і бярозах. І па кожным заклікі: «Далоў фашысцкую дыктатуру Пілсудскага!», «Прэч крывавыя рукі ад СССР!», заклікі змагацца супроць хутарызацыі, не плаціць падаткаў, штрафаў, дапамагаць палітзняволеным у турмах, выкрываць і знішчаць правакатараў, дамагацца адкрыцця беларускіх школ...

Пасля разгрому Грамады пара прыгнечанасці і горычы прайшла па ўсіх вёсках Заходняй Беларусі. Паднялі галаву і пачалі муціць ваду кулакі.

Мікіта Лазун амаль кожную нядзелю склікаў гасцей. Зачасціў да яго і солтыс Барсук, які па-сапраўднаму пасябраваў з Мікітам.

Але і людзі не спяць...

У хаце Дзям'яна Гарагляда як быццам ціха. Так паводзіў сябе Дзям'ян, быццам яго ў вёсцы і няма. Зразумеў, цяпер не тое, што было пры Грамадзе.

Але гэта толькі здаецца, што Дзям'ян прыціх. Не, ён, як толькі сцямнее, збірае верных людзей і разам з імі едзе на начлег у такое месца, куды б не заглядала чужое вока. Параіў гэта Дзям'яну Андрэй. Ён і сам не раз ездзіў на начлег. Там абмяркоўвалі, як далей змагацца з панамі, якія сталі не толькі зласнейшымі, але і хітрэйшымі.

Мікіта Лазун нават неяк загаварыў з Андрэем, чаго раней ніколі не было. Здарылася гэта ў млыне Ельскага, куды Андрэй прывёз змалоць адзін-адненькі пуд жыта. І Мікіта прыехаў паглядзець, як спраўляецца яго Кузьма, які паслухаўся ўпрошванняў Ульяны і вярнуўся ў бацькоўскі дом.

Андрэй, чакаючы чаргі, стаяў ля свайго воза і любаваўся гэтым цудоўным кутком, дзе на адным беразе рэчкі раскінуліся лугі, а на другім навісаў бор. Мікіта падышоў, прывітаўся, памацаў на возе мяшок з жытам і спачувальна запытаўся:

— Чаму так мала?

— Больш няма,— суха адказаў Андрэй.

— Вядома, у турме не заробіш... А ў бацькі на ўсё сіл не хопіць.

— Бацька на мяне не крыўдзіцца...

— Мала што... Мусіць, хлопча, у турме было не соладка? Ды нашто яна табе? Толькі здароўе траціць... Чалавек ты граматны. Мог бы лёгка хлеб есці. А ты звязаўся з гэтымі свістунамі... гультаямі...

«Пасмяяцца з яго, напалохаць, ці што?» — падумаў Андрэй і загадкавым тонам прагаварыў:

— Ніхто не ведае, што будзе заўтра...

— А што? Можа, што чуваць?

— Усяго не перакажаш. Хіба вы не ведаеце, што да графа Ельскага ноччу прыходзілі нейкія людзі і сказалі, што ён хутка страціць свае землі?

— Не можа быць. Гэта брахня! — Голас Мікіты задрыжаў.— Бог не дапусціць да гэтага. Я і табе раіў бы зайсці ў царкву, памаліцца богу, каб ён добрае палажыў на душу.

— Вы ўжо маліцеся за нас. А нам, грэшнікам, што рабіць з малітвамі?

— Ох, божа, божа...— паківаў галавою Мікіта,— вось якія сталі людзі. А я табе хацеў параіць схадзіць да графа, папрасіць яго, каб ён за цябе слова сказаў у старосты.

— Калі я пайду да Ельскага, дзядзька, ведаеце, што будзе?

— Што?

— Сонца стане ўсходзіць там, дзе яно заходзіць, а заходзіць — дзе ўсходзіць. І Ельскі не будзе спаць.

— Не гавары так! Грэх! — стукнуў кіем аб зямлю Мікіта.

— Дык вось таму мне лепш і не хадзіць. Праўда? Няхай сонца ўсходзіць па-ранейшаму.

— Глядзі, хлопча, зноў пападзешся. Нагайка па табе сумуе...

— Па кім нагайка, а па кім — палка, мужыцкая дубінка,— адказаў Андрэй з усмешкай.

— Ну, мялі, мялі свой пудзік, наясіся,— са злосцю прамовіў Мікіта і пайшоў.

Па ўсім было відаць, што багацеі ў Запалянцы да нечага рыхтуюцца. Пагаворваюць, што рыхтуюцца да падзелу зямлі на хутары. Нездарма прыязджаў зямельны начальнік і спыняўся ў Мікіты.

Уважліва сачылі за Мікітам Дзям'ян Гарагляд, Пятрусь Хадыка і Пеця Ціханчук. Так ім загадаў Андрэй, якому даволі часта даводзілася адыходзіць з дому — то ў раёны, то ў Глушэц. Вядома, такія частыя адыходы былі небяспечнымі, аб іх маглі данесці паліцыі. Але... трэба.

Андрэю ўдалося ўрэшце праз Захара Зубца звязацца з акруговым камітэтам, і яго «па ланцужку» запрасілі на параду і каапталі ў члены камітэта. Даручылі заняцца арганізацыяй беларускага спажывецкага кааператыва ў Глушцы, каб мець хоць якую-небудзь легальную базу. І Андрэй стаў на чале аргкамітэта, а намеснікам Максім Рунда. Трэба было дапамагаць Максіму і ў стварэнні прафсаюза рамеснікаў у мястэчку. Ды і другіх спраў было нямала.

Так заглохлая пасля разгрому Грамады праца разыходзілася ўсё большымі кругамі. А ў цэнтры ўсяго была падрыхтоўка да кірмашу ў так званую пятроўку.

Рыхтаваліся заўчасна і з такой канспірацыяй, што паліцыя нічога не заўважала. У апошнюю ноч перад кірмашом пайшлі камуністы і камсамольцы з лістоўкамі і флагамі па дарогу, скрыжаванні, шляхі.

Вось так і ўзвіўся на высокай сасне над дарогай у Глушэц чырвоны сцяг. Ён вісеў цэлыя два дні — больш, чым усе сцягі, якія вывешваліся калі-небудзь у акрузе.

Паліцыянты прыйшлі да гэтай «злыбяды» — сасны

толькі пасля абеду. Убачылі — пад сасною спіць чалавек. Пачалі штурхаць яго нагамі. Чалавек пачухаў патыліцу, насунуў падраную кепку на галаву і зноў лёг. Тады старшы паліцыянт падышоў да яго бліжэй і крыкнуў яму ў вуха:

— Уставай!

Чалавек прыўзняў галаву, глянуў вакол і адразу сеў.

— Чаго вы, паночкі, хочаце ад мяне?— запытаўся ён плаксівым голасам.

— Хто ты?

— Я? Я — Рыгор Малахай з Запалянкі. Ішоў з Глушца, ногі забалелі, паночкі. Вось і лёг трошкі адпачыць.

— Не дуры нам галавы, стары чорт! Вывесіў сцяг на сасне і лёг сабе адпачываць.

— Сцяг? Які сцяг? Дзе? Божа міленькі, збавіцель высокі... Я не ведаю ніякага сцяга,— пачаў хрысціцца Рыгор. І ўстаў на ногі.

Паліцыянт паказаў на сцяг. Малахай глянуў з-пад далоні ўверх.

— Ага... вісіць... вісіць, паночкі. Дальбог вісіць. І трэба ж то камусьці ўзабрацца на такую вышыню...

— Ты вось што, стары чорт... пойдзеш зараз у Глушэц, у пастарунак вось з гэтым панам,— сказаў старшы і паказаў на аднаго з паліцыянтаў.

— Я? У пастарунак? Чаго?

— Там табе скажуць...

Як ні прасіў Рыгор, як ні маліў, нічога не памагло.

Паліцыянт з Рыгорам пайшлі, а астатнія пачалі думаць, як жа быць з гэтым сцягам? А ён, як і раней, развяваўся пад сіняю нябёс, наганяючы на паліцыянтаў злосць і трывогу. Блізкі локаць, ды не ўкусіш...

Тым часам па шляху паказаліся фурманкі — людзі вярталіся з кірмашу. Усіх мужчын паліцыянты затрымлівалі, загадвалі лезці на сасну. Спачатку людзі адмаўляліся, а потым, падагнаныя нагайкамі, лезлі. Але падняцца па голым ствале вышэй дзесяці метраў ніхто не змог. Злосць душыла паліцыянтаў. Падумаць толькі, больш пяцідзесяці чалавек прабавала лезці і...

Пакінуўшы двух паліцыянтаў пільнаваць сасну, старшы з астатнімі паехаў у Глушэц.

Назаўтра ранкам прыбыў камендант павятовага ўпраўлення паліцыі са світаю чалавек дваццаць — афіцэраў і радавых,— усе верхам на конях. Камендант паглядзеў на сасну, на сцяг і, прамармытаўшы «пся крэў», сказаў сваім падначаленым:

— На такія справы здольны толькі камуністы... Толькі і астасецца адно — спілаваць сасну.

Так і зрабілі. Звалілі сасну два батракі з маёнтка Ельскага, які адпеўся недалёка.

А праз тры ці чатыры дні пасля гэтага здарэння паліцыя арганізавала паход на вёскі па ўсім павеце.

Адной з першых трапіла пад удар Запалянка. Відаць, пабалбатаў у пастарунку Малахай,— паліцыя паводзіла сябе тут асабліва злосна. А калі б яна ведала яшчэ, што сцяг на сасне павесіў ціхі і непрыкметны Пеця Ціханчук!

Паліцыя наклала за адзін дзень больш дваццаці штрафаў: то за комін, то за сметнік, то за сабаку, то за дзіравы плот, то за тое, што няма дошчачкі на сцяне хаты з прозвішчам гаспадара, то за тое, што нехта адпачываў у хаце на лаве. Значыць, не хоча працаваць. Аднаго аштрафавалі нават за тое, што ў гутарцы слова «трава» вымавіў «тшáва». Хацеў дзядзька ўжо вельмі залагодзіць паліцыю, каб не чаплялася, намагаўся гаварыць па-польску і думаў, што якраз найлепш па-панску будзе, калі скажа не трава, а «тшáва».

Паліцыянт ішоў па падворку з блакнотам у адной руцэ, з алоўкам у другой і прыглядаўся, дзе і да чаго прычапіцца. Урэшце тыцнуў алоўкам на студню і грозна пракрычаў:

— Чаму ля студні крапіва расце? Быдла! Дзікусы!

Дзядзька кашлянуў, каб перабіць страх, і развёў рукамі:

— Бог ужо так зрабіў, што яна тут вырасла... Ды колькі яе тут... дзе-нідзе... а то ўсё тшáва, пане... А тшàва, пане, рэч карысная і патрэбная... Ды крапіву падчас варым, ямо...

Дзядзька разахвоціўся ў гутарцы і дадаў:

— Эге... часам бывае так, што крапіва ў нас першая ежа... А тшáва, пане, яе і конік з'есць... і кароўка...

Паліцыянт слухаў, слухаў, твар хмурыўся, і ўрэшце вочы наліліся злосцю.

— Ты што, пся крэў, стары д'ябал, пасміхацца задумаў з мовы польскай? Якая табе тшáва! Трàва, дзікусе, а не тшáва... Заплоціш штраф...

І аловак запрацаваў па блакноце.

— Давай, плаці пяць злотых,— прамовіў паліцыянт, працягваючы дзядзьку квітанцыю.

— Ой, пане, за што ж гэта? Няхай сабе будзе трáва... Яно ж па-нашаму і ёсць — трáва...



Піліп Пестрак і Антон Сушко —
члены Косаўскага павятовага камітэта
Беларускай сялянска-работніцкай грамады.
*1927 г.*



Станіслаў Зарэмбскі, Піліп Пестрак, Янка Брыль
і Пятрусь Броўка знаёмяцца з г. Торунь.
*1955 г.*

— Я табе дам — «па-нашаму»,— плаці штраф!

— Я не маю, паночку... Ды за што ж тут плаціць?

— А-а... не хочаш? Два дні арышту, калі не хочаш плаціць... Атрымаеш позву з гміны,— сказаў паліцыянт і пайшоў на вуліцу.

Дзядзька спяшаўся за ім і ўсё казаў: «Пане... пане...», а потым папярхнуўся, закашляўся і змоўк. Пачухаў патыліцу, безнадзейна махнуў рукою і падаўся ў хату, нешта мармычучы сабе пад нос.

Сцяпана Касцевіча аштрафавалі на дваццаць пяць злотых за трэскі ля дрывотні. Усё гэтыя вуллі. Абчэсваў дошкі і зарабіў аж дваццаць пяць злотых. Грошай, вядома, няма. Прыйдзецца адседжваць.

Да Дзям'яна Гарагляда ніяк не маглі прычапіцца. Падворак падмецены, комін цэлы, сабакі няма. Два паліцыянты заглянулі і ў хлявы. Ну, што там возьмеш? Хлеў і ёсць хлеў — гной, салома.

Уздумалі яны зайсці ў сенцы. І там як быццам усё ў парадку. «Ну ж,— думае Дзям'ян,— мусіць, абыдзецца... хоць раз...» І вось няшчасце. Прыйшло яно адтуль, адкуль ніколі б і не падумаў. Угары, на жэрдачцы пад страхою, сядзелі галубок з галубкаю — Міцілы прыгожыя птушачкі. А адтуль на цёмны круг паліцыянтавай шапкі капнуў шэранькі мокры чарвячок. Дзям'ян заўважыў гэтае «няшчасце», стрымліваў смех і чакаў, што будзе. Але паліцыянт спакойна разглядаўся па кутках сенцаў. І шэранькі чарвячок таксама спакойна красаваўся на шапцы. «Ну ж,— думаў Дзям'ян,— няхай пройдзецца па вуліцы з гэтай кветкай...» Але... заўважыў чарвячок другі паліцыянт. Усё прапала.

— Ты дзе трымаеш галубоў, пся крэў! — крыкнуў збянтэжаны, пачырванелы паліцыянт, трымаючы шапку ў руцэ.— Ты, мусіць, на тое іх і пасадзіў там, каб людзям гадзілі на галовы? Га?

— Ну, што ты зробіш з дурною птушкаю? Ёй жа не загадаеш,— адказаў Дзям'ян, паціснуўшы плячыма.

— Не загадаеш... Не загадаеш...— перадражніў Дзям'яна паліцыянт.— Кацапе, пся крэў!

І аловак яраспа пачаў нешта выпісваць на блакноце.

— Плаці дваццаць пяць злотых! — крыкнуў паліцыянт.

— Плаціць не буду, бо няма за што, ды і грошай няма.

— Адседзіш пяць сутак, то будзеш ведаць — за што...

Навалілася паліцыя і на Петруся Хадыку. Аштрафавала за тое, што яго драўляная нага якраз ляжала на ста-

ле. Нешта рамантаваў у ёй Пятрусь у гэты час і, каб зручней было гэтую «нагу» пераварочваць ды да таго ж бліжэй да акна,— паклаў на стол.

Як зайшлі ў хату фараоны, дык адразу ж без доўгіх гутарак і ўсмалілі штраф дзесяць злотых.

— Людзі хлеб кладуць на стол, а ён...— упікалі паліцыянты Петруся.

— Мой стол, мая нага, мой хлеб,— што хачу, тое раблю. Дзесяць злотых я вам не дам. Іх у мяне няма. А каб меў, таксама не даў бы, бо няма за што даваць.

— Прыпішы яму яшчэ пяць злотых за такі адказ,— прамовіў адзін з пісакаў.

— Пішыце, пішыце,— вы больш нічога і рабіць не ўмееце. Пішыце... наша спіна ўсё вытрымае...

— Маўчы, д'ябал аднавокі, бо яшчэ дадамо!

Тацяна Ціханчук так сварылася з паліцыянтамі, што хацелі ўжо яе арыштаваць. Але неяк абышлося.

Так праз некалькі дзён усе запаляньцы пайшлі ў Глушэц адседжваць штрафы ў валасным астрозе.

Андрэй сказаў бацьку:

— Пайду адседжу я... Мне ўжо не прывыкаць.

* * *

Валасны астрог з чырвонай цэглы поўны сялян з навакольных вёсак. Пахне прэлымі анучамі, потам, табачным дымам.

Адзінае акенца ў кратах амаль пад самай столлю, прыкрытае ад вуліцы бляшаным казырком, ледзь прапускае палоску святла на нары. І каб разгледзець куткі, трэба прывыкнуць да паўзмроку. У аддаленым кутку, за печкай, чарнее ў падлозе чатырохкутная яма. Гэта прыбіральня. Усё прапікае гэты смурод — удушлівы, цяжкі. Але сяляне ўсё роўна спяць — на нарах, на падлозе, задраўшы бароды, храпуць на ўсе лады, чухаюцца праз сон, уздыхаюць. А раніцой вымаюць з-пад галоваў свае торбачкі і снедаюць: хто есць хлеб з салам, хто з цыбуляй, а хто адзін толькі хлеб з вадою.

Увагу Андрэя ды і ўсіх прыцягнуў чалавек у новай світцы з белага саматканага сукна. Паголеныя белыя, гладкія шчокі рэзка адцяняюць чорную «купецкую» бародку. Валасы блішчаць ад масла, падстрыжаныя «пад гаршчок». Проста — іканапісны бог... І нос прамы з лёгкай гарбінкай. Андрэй ледзь не прызнаў у ім карчмара

Антона Шчыгельчыка. Вельмі ж такі падобны. Але ў Антона грубейшыя рысы твару, а выраз ласкавейшы.

Сядзіць гэты іканапісны «бог» у кутку каля печкі, і такая крыўда і абурэнне адбіты на яго твары, што ён амаль увесь час стогне. Рукі яго, скаваныя жалезным ланцужком і замкнёныя на замочак, ляжаць на каленях. Але дзіўна, нягледзячы на яго такі журботны выгляд, гэты чалавек не выклікае ў людзей спачування. Нешта ханжаскае праглядае ў яго вачах. Адкуль жа гэты тып у такой добрай сялянскай світцы, з такімі гладкімі, пухлымі шчокамі?

Аказваецца, яго прывезлі сюды з глыбокага Палесся. Гэта арыстакрат пушчы — кулак. На вяселлі ў вёсцы паміж родзічамі ўзнікла спрэчка за зямлю. Гэты кулак быў злосны на аднаго суседа і падгаварыў людзей супроць яго. Узнікла два лагеры. П'яныя людзі выскачылі ў сенцы і схапіліся за лапаты, за сякеры. Вынік усяго — двое забітых. Усіх паліцыянты прывезлі ў Глушэц і кінулі ў астрог, а разам з імі і выкрытага яго хаўруснікамі нагаворшчыка.

Так ён і сядзіць, гэты «бог», стогне, вохкае, не спускаючы вачэй са сваіх жалезных паручнікаў.

Скончыліся крывавыя інтрыгі адкормленага драпежніка. Сяляне спачатку цікавіліся яго лёсам, але потым пасля доўгіх распытванняў адчулі, што тут нешта не так, як расказвае гэты чалавек у белай світцы. Па адным усе адварочваліся ад яго, а потым як быццам і зусім забыліся.

Андрэй з цікавасцю глядзеў на гэты экземпляр, як ён назваў арыстакрата палескай пушчы, і нават крыху пагаварыў з ім. «Арыстакрат» расказваў такім жаласлівым голасам, як быццам яго распялі на крыжы, і, ківаючы носам, як дзюбаю, усё паўтараў:

— Вось да чаго дажыўса...

Гутарка «арыстакрата» выяўляла ў ім сакупа.

На другі дзень гэтага кулака і ўсю групу выклікалі ў пастарунак на допыт. Вярнуліся з допыту толькі трое. Адзін з іх, касматы селянін, як толькі зачыніліся дзверы астрога, зняў шапку і з усёй сілы кінуў яе сабе пад ногі. Падняў рукі, сціснутыя ў кулакі, і крыкнуў:

— Людзі добрыя! Дзе ж праўда на свеце?! Мяне зрабілі вінаватым за ўсё!

Схапіўся за галаву рукамі, запусціўшы пальцы ў валасы, быццам хацеў вырваць іх, і так некалькі хвілін стаяў, аслупянеўшы, з нерухомым позіркам, як у вар'ята.

Потым кінууся на нары, забарабаніў кулакамі па дошках, застагнаў:

— У мяне ж сямёра дзяцей... Хто іх будзе карміць? А гэты крывапівец пайшоў на волю... Яму нічога, бо ён багаты... А-а-а-х...

Бразнулі ключы ў дзвярах. Увайшоў паліцыянт і звярнуўся да гэтага селяніна, вымаючы з кішэні жалезныя наручнікі з замком:

— Дык гэта ты такі бандыт? Ого-го! Цяпер, брат, давай свае лапы...

— Не дам! — крыкнуў селянін.— Я не вінаваты... Я нікога не забіў... Забіў той, каго выпусцілі... багацей...

— Я нічога не знаю. Давай лапы...

— Не дам!

— Цо-о-о? — нахмурыўся паліцыянт.

І ўдар спрытна выгнутым кулаком пад грудзі сагнуў селяніна ў крук. Але гэта толькі на хвіліну. Трымаючыся за жывот, селянін раптам скочыў на нары, стаў у кутку.

— Не дамся! — закрычаў ён звар'яцелым голасам.

Быў выкліканы на дапамогу другі паліцыянт. Яны ўдвух ламалі селяніну рукі, паваліўшы на нары. Нешта хрыпела, стагнала, храпло — да крыві, да знямогі...

Дзверы загрукаталі і зачыніліся. Арыштаваныя, стоўпленыя ў кутку, кінуліся да скаванага селяніна. Нехта крыкнуў:

— Вады!.. Вады на твар!..

...Пасля абеду дзяжурны паліцыянт упусціў у астрог новага чалавека з мяшочкам у руцэ. Андрэй глянуў на яго і ўсміхнуўся. Арцём Світка! А той Арцём так узрадаваўся сустрэчы з Андрэем, што яго скуласты твар нават пачырванеў ад хвалявання.

— Ну што, брат, церпім за свабоду! — са схаванай насмешкай кінуў ён і сеў побач.— Даўно не бачыліся...

— За што цябе? — запытаўся Андрэй.

— Эх-х... За сабаку і за ружжо... Пачаў я хадзіць на паляванне і вось — напаляваўся... Сабаку застрэлілі, ружжо забралі і дваццаць пяць злотых штрафу налажылі... Вось і прыйшоў... Душа з іх вон!..

Андрэй разглядаў Арцёма, таго Арцёма, які на дэманстрацыі «з'ездзіў» на пераносіцы камендапта пастарунка і падняў з зямлі яго, Андрэя. Нейкім асавелым выглядаў ён цяпер. І Андрэй запытаўся:

— А наогул... як жыццё... у вашых Дубах?

— Што — жыццё? Падаткі грабуць, штрафамі му-

чаць... Невясёла, брат...— І, памаўчаўшы, дадаў: — Палессе наша мераюць... Панаехалі нейкія паны... Асушваць будуць... Кажуць, для асаднікаў... Мала, брат, радасці...

— Можа, што чуў пра Апанаса Хмеля?

— Чуў... Прыслаў жонцы пісьмо... Піша, каб не чакала. Засуджан на дзесяць год турмы... Аляксей Верас атрымаў сем год... Нядаўна іх судзілі... А той, што быў сакратаром у камітэце Грамады, у нашай воласці падаткі збірае...

— Ведаю,— сказаў Андрэй,— Кананец...

— Ведаеш? Гвазданупь бы яго... га? Такі гад... З паліцыяй ездзіць, як пан... Папяросай дыміць... Партфель пад пахаю. На людзей, брат, не глядзіць. Такое мурло...

Андрэй ціха прамовіў:

— Асцярожна з гэтым... Усяму прыйдзе свой канец...

— А Мірона Вадалея няма, брат,— гаварыў далей Арцём.— Недзе прапаў. Уродзе таго, што за гранічку шмыгнуў. Эх!.. Выпусцілі птушку. Але я думаю, там разбяруцца. Дадуць яму, што заслужыў.

Андрэй прамаўчаў.

І адразу неяк атрымалася так, што Арцём стаў у астрозе свайго роду старастам. Увечары, калі клаліся спаць, ён усім дзяліў месцы на нарах і на падлозе, каб не было мітусні, спрэчак. Браў у рукі агрызак мятлы, асаджанай на палку, і, тыцкаючы ёю на нары, прыгаворваў:

— Ты кладзіся тут... А ты тут... Што, не хочаш?.. У нас, брат, свая дысцыпліна... Вось яна...

І тыцкаў якому-небудзь дзядзьку мятлою пад нос. Дзядзька, агледзеўшы высокую постаць скуластага чалавека, паслухмяна клаўся на паказанае яму месца.

А калі ўсе ўкладваліся і рабілася ціха, Арцём садзіўся, падкручваў кнот у лямпе. Закураная, з дзіравым шклом, заклееным паперай, з пранжаўленым кругам, яна чадзіла, разліваючы, як факел, цьмянае, змрочнае святло над шэрым зборышчам людзей. Садзіўся Арцём і загадваў:

— А ну, расказвайце што-небудзь.

...Мінула яшчэ два дні. Андрэй адбыў свой тэрмін. На развітанне ён сказаў Арцёму:

— Бывай здароў, Арцём. Я цвёрда перакананы ў тым, што ты хутка прыйдзеш да нас у партыю і будзеш добрым камуністам.

— Бывай здароў і ты, брат. Не знаю, ці буду я ў партыі, але пра мяне ты пачуеш...

# ГАРА НАРАДЗІЛА МЫШ

Новага ксяндза Абнорскага Андрэю давялося ўбачыць толькі раз і то мімаходзь.

У Глушцы насустрач ішоў — ступаў энергічным крокам малады канонік. У яго быў зямлістага колеру паголены твар з крыху выстаўленай наперад ніжняй сківаіцай.

Пад сіне-жаўтаватымі вачыма цёмныя падцёкі. Вочы, здаецца, урэзваліся ў наваколле. Яны кальнулі і Андрэя, які, абмінаючыся, таксама глянуў яму ў вочы і адчуў пах парфумы ад чорнай, аздобленай каптуром на плячах сутаны, якая шумна шуршала ў такт крокам. Андрэй нават азірнуўся. «Якая імклівасць у хадзе,— падумаў ён.— А з вачэй глядзіць проста захопніцтва. Хто гэта?» Пасля даведаўся, што гэта новы ксёндз. Няма чаго казаць — езуіт вытрэніраваны, ці сказаць інакш — разбойнік у сутане. Ён і пакінуў такое ўражанне ў Андрэя. Гэты ксёндз пасля прыбыцця ў Глушэц адкрыў пры касцёле кузню, і можна было бачыць не раз, як ён сам гваздаў молатам па гарачым жалезе, акружаны мяшчанамі і сялянамі. Потым ксёндз адкрыў касу Стэфчыка — гэты польскі рабаўніцкі кааператыў, дзе сам быў старшынёю. Дзяўчаты ў вёсках пачулі, што ксёндз фатаграфуе задарма, і пачалі хадзіць да яго фатаграфавацца. Пры гэтым казалі, што ксёндз вясёлы і дазваляе сабе непрыстойнасці ў адносінах да дзяўчат.

Так ксёндз Абнорскі ўкараняўся ў масы. Усюды паспяваў ён — на ўсякія ўрачыстасці, ці, як кажуць паны, «імпрэзы». Не так даўно на базарнай плошчы ў Глушцы асаднікі зрабілі свой адмысловы сход пад кіраўніцтвам аднаго з буйнейшых асаднікаў павета войта Буякоўскага. Дзень быў святочны. На плошчы стаялі сталы ў некалькі радоў, а каля іх крэслы і лаўкі. У канцы стала сярэдняга раду сядзеў, як капна сена, войт Буякоўскі ў мундзіры капітана пяхоты. Абскубленая сівая галоўка войта тарчала з каўняра, як гулька. Абапал сядзелі члены камісіі і сярод іх, ля левага бока войта, з саладжавай мінай ксёндз Абнорскі. Адкуль такая незвычайная нарада? Аказваецца, гара нарадзіла мыш. І з прычыны такіх мышыных народзін можна і пакрасавацца,— адкрыць нараду такога «перадавога» грамадства, ды яшчэ на базарнай плошчы. Міністэрства земляробства і меліярацыі асушыла сто гектараў Палесся, пракапала некалькі канаў, наладзіла старую дарогу да Тэлехан. Было многа слоў, балбатні, позы вялі-

кіх дзяржаўнікаў. І вось гэтыя дзяржаўнікі сабраліся адкрыць таргі на асушаную зямлю. З другога боку, такою нарадай трэба было развеяць змрочныя настроі, народжаныя крызісам. Ажыўленне, расшырэнне ўнутранага рынку — адзін з першых спосабаў барацьбы з крызісам. Так і гаварыў войт Буякоўскі, адкрываючы нараду. Гаварыў, што «асушка гэтай плошчы — выдатны пачатак геніяльных планаў пашага маршала Пілсудскага ў мэтах насаджэння культуры, дабрабыту, замацавання польскасці на ўсходніх крэсах Рэчы Паспалітай. Бог нам у гэтым дапамога». Войт гаварыў усхвалявана, з кароткімі перапынкамі, часта выціраў хустачкай свой патрыятычны пот па раскіслым твары і заклікаў не пашкадаваць ні сіл, ні сродкаў, каб асушаную зямлю належным чынам асвоіць.

Уся нарада на базары, дзе ў свой час ад паліцэйскіх куль загінулі людзі ў барацьбе за незалежнасць сваёй краіны, была не чым іншым, як адкрытай, нахабнай правакацыяй каланізатараў у адносінах да беларускага сялянства. Гэтая нахабнасць асабліва выявілася ў ваяўнічай прамове вялебнага пробашча Глушэцкай парафіі, як назваў яго войт, даючы слова ксяндзу Абнорскаму. Ксёндз казаў, што «тут, на ўсходніх рубяжах Рэчы Паспалітай, заўсёды была пакрыўджанай святая вера каталіцкая, што святы айцец, намеснік Хрыста на зямлі, рымскі папа чуе, як і чуем мы, як сцены не адной царквы плачуць, каб вярнуцца на лона касцёла, што бальшавікі хочуць адарваць гэтыя землі, адваяваныя нашымі продкамі, ад нашай Рэчы Паспалітай. Што трэба пастаяць за каталіцкую веру, бо вера — гэта апора дзяржавы. Укараняючы польскасць сярод тутэйшага люду, трэба прыступіць да выканання патрыятычнага пачыну маршала Пілсудскага — да збірання сродкаў на пабудову ста польскіх школ для крэсаў усходніх. Наша святая курыя дасць свой належны ўклад — адкрыюцца зборы і па касцёлах у час набажэнстваў. Наш паважаны войт, герой «чыну легіянерскага», пан капітан Буякоўскі не пашкадуе сіл, каб арганізаваць зборы па ўсёй гміне. Вы, панове, яму ў гэтым дапамога. Дык няхай благаславіць бог і яго найсвентшая матка нашыя патрыятычныя пачынанні для славы айчызны...»

Пасля выступленняў іншых асаднікаў, якія ўжо мелі больш тэхнічны характар, зашамацелі паперы, зарыпелі пёры, заляскалі лічыльнікі. Пачаліся подпісы кантрактаў на арэнду асушанай зямлі. Усё было добра, усё ішло да пераможнага канца. Заставалася ўжо толькі ўстаць і пай-

сці маршам да касцёла, каб паслухаць святую імшу з выпадку таго, як гара нарадзіла мыш, калі ў ідылію калапізатараў уварваўся крык: «Ратуйце! Матка боска... ратуйце! Ратуйце! Забіе! Забіе!» Галовы ўсіх павярнуліся туды, адкуль пачуўся дзікі, роспачлівы крык. Да сталоў падбег задыханы, збялелы, мокры ад поту п'яны асаднік. Казырок аблезлай рагатай шапкі звісаў не над ілбом, а над скроняю, надношаны мундзірчык васпнага крою ад каўняра да пахі быў падраны, твар цямнеў сінякамі на шчоках. Асаднік бездапаможна дрыжаў і, дыхаючы, толькі выгукваў: «Ох... ох...» У вялікім жа страху пабыў недзе гэты асаднік, бо аж слова вымавіць не можа перад сваімі калегамі.

— Цо з панам, пане Стэцкі? — звярнуўся да яго войт.

— Ох... Ох... адзін хлоп хацеў мяне забіць у карчме...— нейкім здзяцінелым тонам адказаў пан Стэцкі.

— А чаго, пан, лазіш па корчмах? Не далучаешся да патрыятычнага чыну?.. Нягожа...

— Я толькі на хвілінку... на сдэп кілішэчэк... А тут гэты хам...— плаксіва апраўдваўся патузаны ваяка, ужо скінуўшы шапку.

— Добры кілішэчэк... Пан ледзьве стаіш на нагах. Дзе твая фура?

— Ля карчмы... на дварэ...— лямантаваў асаднік, а ногі яго ўсё яшчэ дрыжалі і дрыжалі.

— Разбяромся ў звёнзку... Зараз пан пойдзе з паліцыянтам да сваёй фуры... А то, пан, выглядаеш, як тое пудзіла ў агародзе...

— Куды? Зноў да карчмы? — ускрыкнуў Стэцкі і задрыжаў.— Няхай мяне бог бароніць... Не пайду!.. Заб'е мяне хлоп.

Усе прысутныя асаднікі, азадачаныя, засаромленыя, паглядалі спадылба на свайго абшарпанага калегу і панупурвалі галовы ў стол. Хутчэй бы скончылася гэтая паскудная камедыя! А то людзей прыбывае ўсё больш і больш, хоць перад гэтым неяк і цікавасці ні ў каго не было. Людзі падыходзілі і тут жа адыходзілі. У асаднікаў свае справы, а ў нас — свае,— можна было прачытаць на тварах кожнага.

Ксёндз Абпорскі пераводзіў вочы то на Стэцкага, то на войта і ўсё казаў:

— То нічога... То нічога...

А потым дадаў, звяртаючыся да Стэцкага:

— Не шануеш, пан, бога і сам сябе... Уся Рэч Паспалітая глядзіць на цябе...

Асаднік Стэцкі, які паміж асаднікамі выглядаў, як асаднічак, пачаў хрысціцца, ды так хутка, што далонь віляла перад носам, як ветраны млынок. Пачуліся словы падмагільнай малітвы «Здровась, Мар'я...».

Усе пераглянуліся паміж сабой і затаілі ўсмешкі.

— Звар'яцеў, пся крэў...— прамовіў пехта.

Не ведалі асаднікі, што такога страху іх калегу Стэцкаму нагнаў не хто іншы, як Дзям'ян Гарагляд. Ён прадаў цялушку, заплаціў паліцыянту штраф за тое, што не было імяннной дошчачкі пры возе, і са сваім пакупцом зайшоў у карчму выпіць барыш. У карчме было цесна за сталамі, і Дзям'ян папрасіў чалавека ў рагатай шапцы крыху адсунуцца — даць месца.

— Каму адсунуцца?! — крыкнула рагатая шапка.

— Я прашу трошкі... Мы тут доўга не будзем,— прасіў Дзям'ян.

— Няма тут вам месца... хамам...

— Ты сам хам,— адказаў Дзям'ян,— цябе просяць, як чалавека, а ты...

Рагатая шапка ўсхапілася з месца, нават стукнула кулаком па стале.

— Ты знаеш, хто я? Я — легіянер, асаднік Стэцкі, а ты хам, бальшавік! Выносся адгэтуль!

І Стэцкі штурхануў Дзям'яна ў плячо.

Тут яму Дзям'ян і даў здачы — як пачаў адкладаць аплявухі ў правую і левую шчаку, так што галава Стэцкага клалася то на адно плячо, то на другое.

— Ты за што пхаешся, сабакар?! — крычаў Дзям'ян.— Прыйшоў на нашу зямлю і яшчэ будзеш пхацца...

І раз'ятраны Дзям'ян схапіў Стэцкага за каўнер мундзіра. Мундзір затрашчаў, і дзверы карчмы адчыніў лоб Стэцкага. Дзям'ян выкінуў ваяку Пілсудскага на ганак. Стэцкі пабег па тратуарчыку, абхапіўшы галаву рукамі, з дзікім піскдявым крыкам: «Ратуйце! Забіе! Паліцыя! Паліцыя!»

А Дзям'ян, адпачыўшы, ужо сядзеў у карчомным гомане за сталом і, трымаючы чарку ў руцэ, прыгаворваў да свайго пакупца:

— Не бойся, чалавеча, цялушачка мая добрая. Харошай пароды. Будзеш мець з яе дастатак і ўцеху... Будзь здароў!

# А ТЫ ЧАГО ТУТ?

Мерна шуміць лясок сярод жытняга поля. Сасёнкі, змяшаўшыся з бярозкамі, туляцца верхавінамі адны да другіх. А навокал каласамі шапаціць жыта.

Сюды, у гэты лясок, хутка прыйдуць людзі на сваю першую масоўку пасля разгрому Грамады. Яны прыйдуць, каб разам вырашыць, якой платы дамагацца ад паноў за жніво і што рабіць, калі паны на такую плату не згодзяцца. А тут яшчэ прапеслася чутка, што паны задумалі царкву ў Буславічах перарабіць на касцёл і што поп Іван Шпак ім у гэтым першы памочнік.

А потым — восень. Наваляцца паны рэзаць зямлю на хутары. Нельга і да гэтага дапусціцца. І трэба зрабіць так, каб паліцыя не пранюхала пра сходку ў лесе, каб не прабраліся сюды шпікі або кулацкія прыхлябаі. Андрэй строга наказаў сакратарам ячэек раёна падбіраць на масоўку людзей правераных, не больш пятнаццаці чалавек ад кожнай вёскі. Выступіць на масоўцы павінны тры чалавекі — Піліп Гайдук, Дзям'ян Гарагляд і Андрэй.

Шуміць лясок, шапаціць калоссе на неабсяжным полі. Людзі ідуць групкамі і то хаваюцца з галавою ў жытняе мора, то зноў выплываюць. Увішны Пеця Ціханчук сягоння накшталт развадзяшчага — усюды стаяць яго пасты, сустракаюць і праводзяць гасцей да месца збору.

Андрэй з Дзям'янам Гараглядам ляжаць на ўскраіне лесу, у самым жыце, і гавораць пра царкву ў Буславічах, пра панскага прыхвасня папа Івана Шпака.

Народ настроены ваяўніча: «Лепш спалім, а не аддамо царквы панам!» Дзям'ян усміхаецца. Любіць ён, калі бунтуюць.

— Прыйдзецца, відаць, табе, дзядзька Дзям'ян, узяць на сябе каманду, калі дойдзе да справы...

Пахмурыўся Гарагляд. Відаць, не цікавіць царква яго, усё ж у знак згоды кіўнуў галавой. Разумее, што справа не ў царкве, а ў панскім гвалце, ды і таму папу, што прыходзіў тады з паліцыянтамі ў лес яснавяльможнага графа, дасадзіць прыемна. Хоць і многа мінула з таго дня, а помніць Дзям'ян, як яго і суседзяў збівалі паліцыянты на вачах у гэтага папа.

...Людзі стаялі сціснутым кругам і крыкамі адабрэння перапынялі прамову Піліпа Гайдука.

— Калі паны будуць не згодны з нашымі дамаганя-

мі, будзем баставаць і нікога не дапусцім на жніво. Няхай загіне панскі хлеб, калі так...

Малады батрак расказаў і аб сяброўстве пана з ксяндзом Абнорскім, пра іх сустрэчы ў графскім садзе.

Падумаць толькі, нейкі год назад з Піліпа цяжка было слова выцягнуць, а цяпер гаворыць ужо не менш чвэрці гадзіны і ні разу нават вачэй не апусціў. «А хіба мала такіх хлопцаў? — думае Андрэй і любоўным позіркам абводзіць круг.— А заўтра будзе яшчэ больш...»

Няхай шуміць лясок, няхай шапацяць каласы. Яны не перашкаджаюць людзям слухаць праўду пра сваё жыццё, пра жыццё братоў за рубяжом. Расказвае Андрэй, і перад вачыма слухачоў паўстаюць велізарныя заводы на Волзе, на Урале, электрастанцыі на Дняпры і неабсяжныя палі, не парэзаныя на палоскі...

А каласы ўсё шапацяць і шапацяць...

І раптам у гэтае размеранае, ласкавае шапаценне, у размераны шум лясочка ўварваўся голас:

— А ты чаго тут?

Усе павярнуліся. Селянін сярэдніх год цягнуў за каўнер шэрай кашулі хлопца са збялелым тварам.

— Суседзі! Я магу прысягнуць — гэта прадажнік! Я жыву ў самай крайняй хаце і два разы бачыў, як гэты сукін сын развітваўся з паліцыянтам. А ўчора яго нібы арыштавалі... Але, бачу, увечары прыйшоў дахаты.

Ад хвалявання селянін забыўся, што трэба мацней трымаць злоўленага. Той, каго ён назваў прадажнікам, выбраў момант, вырваўся і шмыгнуў у кусты. Некалькі хлопцаў пабеглі за ім. Але прадажнік паспеў схавацца ў жыце.

...Ішлі глухою дарогаю, не спяшаючыся.

— Гэта Лайко, сын хутараніна,— гаварыў Андрэй пра таго, што ўцёк.— Быў некалі актывістам. І вось куды скаціўся. Кулачок. Такіх цяпер няма. Трэба што б там ні было адшукаць яго. Інакш можна чакаць арыштаў. Вось якая штука! І як ён пралез? Не, не навучыліся мы яшчэ канспірацыі.

У голасе Андрэя адчувалася горыч.

— Я вазьмуся за гэтую справу,— сказаў Захар.— У мяне ў той вёсцы ёсць знаёмыя хлопцы.

— Калі не паспее схавацца...— заўважыў Максім Рунда і загаварыў пра гандляра салам Карнікевіча: — Спакою няма ад яго. Убачыць мяне на вуліцы і крычыць: «Камуніст! Калі Саветы сюды прывядзеш?» Напі-

ваецца гэты хам і разбівае са сваімі сабутыльнікамі вечарынкі...

Захар жа зноў загаварыў пра падаткі. Расказаў, як забралі зборшчыкі палатно, хусткі, бацінкі...

— Але ўсё ўдалося адабраць назад. І ведаеце хто памог? Дзеці. Расхапалі з вазоў і пабеглі. Праўда, дасталося хлопчыкам па спінах ад паліцыянтаў. А на другі дзень,— уздыхнуў Захар,— паляцелі, каб ім пуста было...

— Многа?

— Чалавек дваццаць конных, калі не больш... Усіх, хто трапляў пад руку, білі гумавымі палкамі. Застрэлілі больш дзесятка сабак. Штрафаў наложылі без ліку. І паскакалі ў другія вёскі рабіць тое самае. Ой, людзі... А тут яшчэ гэтая царква. І да яе дабраліся... Вось ненаедныя...

Развітваючыся з Захарам, Андрэй усміхнуўся і спытаў:

— Ну як, Захар, дацягнем да восені? Добра было б дацягнуць.

— Дацягнем, Андрэй. Гэтага гада мы абавязкова зловім, гэтага Лайко, як ты кажаш. Што да канспірацыі, ты праў. Увесь час у нас бываюць правалы. Маладых многа, толькі пачынаюць. Ну, бывайце, браточкі, мне тут звяртаць.

Андрэй пайшоў з Максімам.

Усё рашэнні і рашэнні. І ўсё аб адшчапенцах, аб ворагах. Вырашылі і аб Кананцы — падкінуць яму запіску, прыгразіць, каб перастаў рабаваць народ.

Пачалася цяжкая паласа барацьбы. Фашызм падбіраецца да мас.

— Ты кажаш, Максім, што лопнуў наш кааператыў?

— Ага. Толькі ўчора атрымалі паперку з акруговага суда, што не лічаць магчымым цяпер зацвердзіць адкрыццё кааператыва. І ўсё.

Дарога плыла лесам, праўда, не вельмі густым, але ўсё ж неба не здавалася такім шырокім і бясконцым, як там у полі.

Ішлі моўчкі. Андрэй з цікавасцю разглядаў Максіма — пасля звароту з турмы ён бачыў яго толькі тры разы і то сярод людзей. Успомнілася першае знаёмства з Максімам у Грышы. Тады была і Вольга...

Максім Рунда ні ў чым, здаецца, не змяніўся. Той жа хітраваты позірк жывых шэрых вачэй, таксама заікаўся, калі трэба было сказаць аб чым-небудзь. Кепка заўсёды ссунутая на патыліцу так, што здавалася, нібы ён збіраецца шуснуць у жыта або толькі што вынырнуў дзе з

кустоў. Неўгамонны Максім і няўлоўны. Многа яму дапамагае ў гэтым яго прафесія. Калі заўважае, што ў мястэчку згушчваюцца паліцэйскія хмары, ён набірае з сабою лістовак і ідзе тады на вёску рабіць каму-небудзь печ. Ужо было некалькі вобыскаў у Максіма, часам у яго адсутнасць, але нічога не знойдзена «крамольнага».

Удалая схаванка ў Максіма для літаратуры. Ох, каб ведаў аб ёй карчмар Шчыгельчык!.. Максім Рунда добрай думкі пра Якава, сына каваля Міхала, але не церпіць Цукермана. Гэты Цукерман, якога так і звалі, як ахрысціў яго ў свой час Андрэй,— чык-чык, аказаўся «тэарэтыкам» не па жарты. У дыскусіі з Якавам і Рундам, плюючы сабе па бараду, ён гаварыў, што да ўсіх краін Еўропы крызіс даходзіць, а вось да Амерыкі — не. Адсюль гэты трыбухацелькі Ісэр Цукерман рабіў вывад, што манапалізаваны капіталізм можа мірным спосабам перайсці ў сацыялізм. А значыць, не патрэбна рэвалюцыя. Усё прыйдзе само сабою.

— Каб яго халера ўзяла! — ускрыкнуў Андрэй.— Вось табе купчык і вылез з мяшка, як тое шыла,— ха-ха-ха...

І далей сцвярджаў гэты Цукерман, што ў капіталістычных краінах пачаўся пераход членаў з кампартый у сацыял-дэмакратычныя партыі...

— Ну і шантрапа! — абурäўся Андрэй.— Як ад яго пазбавіцца?

Усё ведае Цукерман, што трэба яму ведаць. А ўсё гэта балбоча бундаўская газета «Фолксцайтунг». Не расстаюцца з ёю Цукерман і аптэкар Бурштэйн. Апошні ходзіць у прыўзнятым настроі, неяк незвычайна задраўшы галаву, як пераможца. Пры вітанні з кім-небудзь яшчэ ніжэй схіляецца, чым заўсёды. Бурштэйн думае, што Фэйга, дачка старога яўрэя, гаспадара маленькай чайной, цяпер ужо згодзіцца выйсці за яго замуж.

— Але нешта ўсё не ўдаецца,— кажа Максім. Заўсёды вылятае ён ад гэтай Фэйгі пачырванелы, збянтэжаны і, ідучы, вельмі ўжо гулка бохае камашамі па тратуарчыку. Бо якая ж тут можа быць удача, калі Фэйга, адна з прыгажэйшых яўрэйскіх дзяўчат мястэчка, да таго яшчэ спявачка, атрымала ўжо два лісты ад Грышы Плоткі. Фэйга стараецца сустрэць Максіма. Калі сустрэне, пакліча да сябе і пакажа гэтую вестку аб любімым хлопцу, вестку невядома адкуль. На паштовай пячатцы, на канверце, адзін раз было напісана «Варшава», а другі раз — «Беласток». Вось і шукай ветру ў полі — хочацца адка-

заць хлопцу, ды няма як. Наіўная Фэйга думае, што Максім ведае ўсе шляхі-дарогі, і просіць пераслаць ад яе ліст Грышу. Максім толькі фукне ў губы і засмяецца.

— Не-е... так нельга... нельга... Што ты? Не бядуй, хутка ўбачышся са сваім Грышам...

Фэйга не верыць да канца Максіму. Ей пачынае здавацца, што Грыша недзе тут блізка, можа, нават і ў Глушцы, але гэты лаідак Максім не хоча ёй сказаць.

Атрымалі два лісты ад Грышы і яго бацькі. Абрам супакоіўся, прымірыўся з цяжкім, трывожным лёсам сына. Але старая Рахіль не забылася папрокаў мужа і часам дражніла яго.

— Грыша жывы, ён робіць нешта вялікае, харошае для ўсіх... Хлопец мае галаву. Ты такой галавы ніколі не меў...

Абрам у душы хоць і радуецца за сына, аднак робіць выгляд, быццам не звяртае ўвагі на словы жонкі. Але потым усё ж не вытрымлівае:

— Ух... Ты ўжо нагаворыш. Ого, ты... Ты ж у нас вялікі філосаф... вялі-і-кі філосаф!

— Не такая вар'ятка, як ты!..

— Ай, ай... Ідзі гаршкі мыць. Філосаф...— хмурыцца Абрам.

Пасля такой «мілай» гутаркі з жонкай Абрам бярэцца за работу і зноў успамінае свайго Грышу, які... пайшоў далёка... далёка пайшоў... і, відаць, калі бог паможа, будзе вялікім чалавекам. А тое, што жонка дражніць яго, на тое яна жонка. Нездарма адна з яўрэйскіх малітваў пачынаецца словамі: «Дзякую табе, божа, што ты не стварыў мяне жанчынай».

— А як трымаецца Ігнат Вярэня? — спытаўся Андрэй.

— Ох! — махнуў безнадзейна рукою Максім.— У царкву пачаў хадзіць.

— У царкву? — паўтарыў Андрэй.— Гм... хоць... гэтага можна было чакаць...

— Выстойвае гадзінамі ў царкве.

— Чыста, як прававерны мешчанін...— падхапіў Андрэй.

— Мы аднаго разу падпільнавалі яго за царкоўнай агарожай і прапанавалі яму грошай на свечкі. Але ён прайшоў міма нас моўчкі,— іранізаваў Максім.

— Загіне,— пацвердзіў Андрэй,— калі не пераможа гэтага крызісу.

— Надзеі на яго няма,— з перакананнем прамовіў

Максім. У гэтых простых словах Максіма, сказаных непасрэдна, Андрэй адчуў праўду. «Няма надзеі на Ігната»,— паўтарыў ён сам сабе. Памрэ Ігнат ад інтэлігентшчыны. Паміраючы, усё роўна будзе будаваць паветраныя палацы. І Пісараў яму не дапамог сваімі выказваннямі аб мары і рэчаіснасці.

Выкінуць бы Ігната з гэтай абстаноўкі, поўнай мяшчанскай абыякавасці. Трэба, каб ён дасягнуў хоць адной перамогі сваімі ўласнымі сіламі. Можа, тады ўтрымаўся б на нагах? Але сапраўды ён блытаецца ля ног, гэты Ігнат. Трэба ж ісці далей, час не чакае.

## НАБАТ

Час у вёсцы па традыцыі яшчэ вылічаўся ад аднаго прастольнага свята да другога.

І вось надышоў так званы святы спас. «Святы спас — яблыкаў прыпас»,— гавораць людзі, бо ў гэты дзень свенцяць садавіну. Людзі нясуць яблыкі, грушы ў царкву, дзе поп іх кропіць вадою, якая чамусьці называецца святой. Але калі спас прыпасае яблыкаў, дык поп Іван Шпак прыпас сваім прыхаджанам нешта іншае...

Камуністы гаварылі сялянам пасля невялікай нарады ў хаце Сцяпана Касцевіча, што трэба не дацца ксяндзам. Пілсудскі ў змове з езуітамі разумеў добра, што рэлігія ёсць бадай самы лёгкі сродак для таго, каб правесці паланізацыю і фашызацыю беларускай вёскі, а тым самым расчысціць дарогу для поўнага заняволення, пакласці канец імкненням да ўз'яднання са сваімі ўсходнімі братамі. Бо лабавой атакай народ ужо не возьмеш. І таму спроба аблытаць розумы пачынаецца ўжо на грунце рэлігійным. Урад Славоя-Складкоўскага афіцыяльна ператварыў духавенства ўсіх хрысціянскіх культаў у сваіх чыноўнікаў — вызначыў яму месячную зарплату. Гэта каб зрабіць яго залежным ад дзяржавы і незалежным ад сваіх прыходаў. Ну што ж, некалі так упершыню зрабіў Напалеон. Чаму ж не можа зрабіць гэтага Пілсудскі? Нездарма ж яго ўжо малююць у беларускім сатырычным часопісе «Маланка» так, што на галаве, на рагатай шапцы, узвышаецца другім паверхам напалеонаўскі капялюш, а трэцім — мусалінаўская камілаўка. «Салому еш, а форсу не трać»,— гаворыць польская прымаўка. Поза часам выратоўвала ашуканцаў перад зрокам народнай праўды.

Але ці выратуе яна цяпер, пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі?

Так гаварыў Андрэй на нарадзе ў свасй хаце.

— І так наш поп Іван Шпак будзе ўжо атрымліваць заработак ад паноў...— заканчваў Андрэй.

— Ён яго і раней атрымліваў, халера яго не брала, калі памкнуўся тады ісці ў лес з крыжам ратаваць графа.

— Чаго ўжо тут у нас не робіцца — і хутары хочуць зрабіць, і рэчы за падаткі бяруць, і штрафамі мучаюць, школы не даюць... А вось яшчэ і веру сваю ў людзей адабраць хочуць,— абураўся Сцяпан Касцевіч.— Хоць я там...— паскроб ён за вухам,— і не такі веруючы, але... калі такое дзеецца, дык я за народ. Не цярплю аблуды. Трэба свайго трымацца.

— А ражна яму ў бок, а не веру... Нічога не дацы! Як народ не захоча, то яны нічога не зробяць! — крычала Тацяна Ціханчук.

Так і паплыла трывога, як бывае, калі вецер, прыпаўшы да зямлі, імчыць перад сабою сухое лісце і дарожны пыл.

У дзень спаса па новаму стылю ніхто з усёй ваколіцы ў царкву не пайшоў. З вёскі Запалянкі адзін толькі Мікіта Лазун са сваім сынам-лесніком аказаліся паслухмянымі выканаўцамі волі папа Івана Шпака і графа Ельскага.

У той час, калі людзі выязджалі з плугамі, баронамі на поле, Мікіта з сынам дэманстратыўна крочылі па самай сярэдзіне вуліцы. Мікіта — у новай шэрай куртцы, расшпіленай наперадзе, відаць, для таго, каб людзі бачылі, як у яго на белай сарочцы матляецца крыжык на чырвонай стужачцы. Сын — у леснікоўскай зялёнай рагатай шапцы і ў мундзіры. Абодва неслі ў хустках яблыкі.

Людзі праводзілі іх насмешлівымі позіркамі.

Потым ужо пад вечар усе гаварылі, што ў царкве было пяць нейкіх бабак, Мікіта з сынам, пу і сам поп Іван з дзяком. Харысты — дзяўчаты і хлопцы — на клірас не прыйшлі: усю абедню спяваў адзін дзяк.

Але праз трынаццаць дзён надышоў праваслаўны спас. Абозамі ехалі падводы рознымі дарогамі пад царкву ў сяло Буславічы.

Пад буславіцкую царкву таксама павінна прыбыць паліцыя. Як жа ёй не прыбыць? Людзей сабралася вельмі шмат. Ужо на некаторых падводах пачаўся нават гандаль яблыкамі, грушамі. Сярод вазоў узвышаецца стракаты

папугаї па катрынцы, якая цілікае ўсё, што хоча, а найбольш «Разлуку», «Златыя горы». Стары яўрэй-катрыншчык, апрануты ў запыленае выветранае паліто, умела заклікае людзей купіць білецік, даведацца пра свой лёс. Хлопцы ігнаруюць гэтыя «лёсы», падыходзяць толькі падзівіцца на заморскую птушку з закручастай дзюбай, якая, відаць, задаволеная сваім становішчам, з цікаўнасцю разглядае шумлівы збор. Затое ідуць да катрыншчыка дзяўчаты, просяць білецік, і паслухмяны навучаны папугай выцягвае ім пад гукі катрынкі канвярцік за канвярцікам.

Сонца найбольш, здаецца, свеціць ля царквы, дзе на мяккай зялёнай траве размясціліся жанчыны. Тут маладзіцы з дзецьмі і без дзяцей, і старыя бабкі з загарэлымі тварамі, і дзяўчаты са смехам на ружовых вуснах. Сонца прасвечвае, харошыць твары ўсіх, і зіхацяць у праменнях каляровыя хусткі, якія чакалі прастольнага дня. Ёсць сінія з жоўтымі кветкамі, ружовыя — з белымі, зялёныя — з чорнымі і іншыя, і іншыя.

Павольны святочны гул плыве навокал царквы... Вырываюцца словы скаргі і словы для смеху, і задумнае гараванне, і дзіцячы шчэбет, калі малыя ручаняты абдымаюць шыі матак. Усё, чым жыве селянін дома, перанесена гутаркамі сюды, за каменную агарожу, над якою апусцілі свае галіны бярозы, клёны, таполі. У шматгалосы гул увесь час урываецца набожнае завыванне старца-жабрака. Так і далятае адно і тое ж: «Божа, успом-ні... Божа, успом-ні...» Ля агарожы стаяць мужчыны, кураць — хто люльку, хто цыгарку, гутараць паміж сабою з ясным тварамі. Моладзь трымаецца асобна — хлопцы прыйшлі сюды не для малітвы, а для сустрэч са знаёмымі, з сябрамі. Ды наогул тут месца выгоднае для абмеркавання ўсякіх спраў. Ужо недзе воддаль, сярод вазоў, прывабна зайграў гармонік. Будуць тут і смех і танцы на травяністым майдане. Няхай сабе крывяцца старыя на такую зняважу багоў, бо вось, бачыце, царква адчынена насцеж, і адтуль у сутонні паблісквацць пазалотай іконы святых. Спеў хору на клірасе разам з пахам воску і кадзільнага дыму плыве хвалямі з царквы і асядае сярод незлічонага людскога зборышча. Няхай сабе крывяцца старыя — маладосць бярэ сваё.

Сярод натоўпу пахаджвае малады попік Чадзюк, выхаванец Віленскай духоўнай семінарыі, раўніцель веры праваслаўнай. Ён ідзе ў новай расе з залацістым новым крыжам на грудзях, трымаючы капялюш у левай руцэ, а

правай апіраючыся на палку. Русавалосую галаву трымае прыўзнята, неяк нават горда. У свой час, будучы яшчэ студэнтам, Чадзюк прапанаваў сваю ахвяру на МОПР.

Попік Чадзюк любіць гаварыць пра мудрасці св. Аўгусціна, тэарэтыка, ідэолага хрысціянскай царквы наогул, і гаворыць, што ад гэтых аспоў мала што засталося на практыцы. Андрэй у адказ гаворыць аб шляхах філасофскай мыслі. Выказвае думку, што царква перастала ўжо быць сродкам арганізацыі мас для вялікіх спраў. Паміж інтарэсамі народа і царкоўнай іерархіяй легла бяздонне, бо царква стала служкаю пануючых, прыгнятаючых класаў.

— Як вам падабаюцца паводзіны вось нашага айца Івана Шпака? — часта пытаюцца ў Чадзюка.

— Зусім не падабаюцца,— адказвае попік Чадзюк,— я з ім заўсёды спрачаўся. Ён запрасіў мяне сёння да сябе ў госці. Я прыбыў, памаліўся, але ў гасцях быць адмовіўся. Не магу двурушнічаць... Не, не...

Звон ударыў на «Верую», ударыў некалькі разоў, расплыўся дрыжаннем па наваколлі і патануў у людскім шуме.

Попік перахрысціўся.

Перахрысціліся жанчыны і далей працягвалі свае бясконцыя расказы пра жыццё-быццё. Пераліваюцца, скачуць галасы, перабіваюць адзін другога, зліваюцца ў адзін гул. Прыслухацца: ці то ручаіна цурчыць, ці ценькаюць недзе цымбалы.

— А лянок, лянок харошы...

— Не, не выжыла, здохла наша кабылка...

— Вось ужо будуем пяты год хату і ніяк не скончым...

— Забралі жывадзёры апошняга сына ў турму...

— Ой, як быццам хто адабраў яе ў мяне... Учора захварэла, а сёння памерла мая дачушка...

І бліскаюць слёзы на сонцы, застываюць твары ў задуме, мільгаюць ціхія ўсмешкі. А з воддалі ўсё далятае адно і тое самае — жабрачае: «Божа, успом-мні... Божа, успом-мні...»

Недзе ценькаюць цымбалы, ценькаюць... Ці на шляху пад бярозай сярод палёў, ці на дарозе ў бары ў шуме соснаў. Ценькаюць, усё ценькаюць цымбалы...

Ужо набліжаецца канец абедні. Гэта адчулі ўсе. Жанчыны з шумам пачалі надымацца з месц, як тыя пералёт-

пыя птушкі са сваіх стаянак-прыпынкаў. Людзі групамі выходзілі з царквы.

Ужо апусцела царква. Доўгім провадам пайшлі людзі на шлях. Некаторыя гаспадары пачалі ўжо запрагаць коней.

Аж вось яны... Адкуль узяліся — невядома. На некалькіх падводах паліцыянты пад'ехалі амаль да брамы з наежанымі бліскучымі штыкамі, з пасачкамі шапак пад падбародкамі. Адным словам, у поўнай баявой гатоўнасці. Сышлі з падвод і натоўпам чалавек у пяцьдзесят спыніліся ля агарожы. З асобага вазка вылез ксёндз Абнорскі з крыжам на грудзях і ў шапцы з бамболкамі. Усе, на чале з ксяндзом, накіраваліся ў царкву. Адтуль ішоў насустрач поп Іван Шпак. Аказваецца, у царкве засталася прыемная для папа кампанія — так чалавек дваццаць. Сярод іх і Мікіта Лазун з сынам-лесніком. У прысутнасці гэтых «прадстаўнікоў грамадства» поп Іван Шпак павінен перадаць пад апеку ксяндзу цудатворную ікону божай маці жыравіцкай, каб пазбавіць царкву сілы і ўплыву. Вось зараз пасля абрадавага рытуалу два «прадстаўнікі грамадства» вынесуць яе на воз, і паедзе гэтая маці божая аж у Глушэц, у касцёл. Вернецца тады, калі царква стане паслухмянай рымскаму папе, стане уніяцкай. А народу скажуць поп і ксёндз, што сама маці божая пажадала такога «абнаўлення».

«Хутчэй на званіцу!» — крыкнуў нехта. І хлопцы — туп-туп — пабеглі ў цёмную адтуліну, а там — па каменных сходках вітай лесвіцы. А маці божую ўжо нясуць... Ужо нясуць, прыбраную ў вуалі, у барвінкавыя вянкі, у вышываныя ручнікі.

Першы ўдар звона, а потым — бом-бом-бом-бом-бом-бом-бом-бом...

«Няйначай загарэлася царква ці што іншае...» — падумалі людзі, якія адыходзілі і ад'язджалі дахаты. І шумна — бягом, бягом — павярнулі назад. Вось ужо блізка, вось натоўпам плывуць... плывуць, як лавінай. А насустрач паліцыя з наежанымі штыкамі, а за імі пасоўваецца прыбраная маці божая жыравіцкая ў суправаджэнні ксяндза Абнорскага і папа Шпака. Адкуль узяўся попік Чадзюк, які праціскаецца між вазоў? Узняў рукі, сціснутыя ў кулакі, і крыкнуў:

— Браццяі! Цудатворную ікону божай маці жыравіцкай забіраюць ксяндзы-езуіты! Пастаяць за веру праваслаўную!

Гэтага было даволі. Жапочы патоўп ірвануўся з крыкам, дзікім крыкам, сціснуўшы з бакоў кардон паліцыі. І ўсе ўбачылі, як ікона шуганула ўгару ў жаночых руках, а тыя, што неслі, паляцелі ў бакі.

А звон усё гудзеў: бом-бом-бом-бом-бом...

Дзесяткі жаночых рук схапіліся за ікону, сашчаміўшы зубы і губы на бледных, скамянелых тварах. Неслі ікону назад у царкву. Паліцыя націскала, штурхала навокал прыкладамі, дабіралася да іконы. Але жанчыны апусцілі яе нізка, нагнуліся і закрылі сабою. Паліцыя пусціла ў ход нагайкі, гумавыя палкі. І пачалі яны свістаць — эх, па хустках шаўковых, па вышываных, па кофтах квяцістых, па галовах, па спінах.

А жанчыны не адгіналіся, усё ішлі і ішлі — упарта, крок за крокам набліжаліся да царквы. Тады ўжо ў атаку рынулі мужчыны, калі ўбачылі рассечаныя кофты на спінах жанчын. Адным напорам сапхнулі паліцыю ўбок з крыкамі: «Прэч, каты!» Поп Шпак хрысціць крыжам усіх і просіць: «уступіце, брація, бо царкву святую закрыюць!» А яму насупраць скамечаны, з напружаным чырвоным тварам, з раскіданымі валасамі крычыць Чадзюк: «Не ўступайце, брація ва Хрысце. Маці божая, памажы ім!» Але гэтая маці божая, мусіць, не змагла дапамагчы, бо паліцыя адбіла напор мужчын, пачала ціснуць іх да вазоў, а гумавыя палкі, як завіруха, узвіваліся над галовамі і падалі ўдарамі па спінах, па плячах. Паліцыянты акружылі ікону, пачалі адцягваць жанчын, але разам з імі цягнулася і ікона.

Андрэй, Захар, Максім і Віктар Кухта стаялі на царкоўнай агарожы пад галіністым клёнам і назіралі за ўсім, што адбывалася на плошчы. Яны вырашылі не ўмешвацца ў бойку з паліцыяй, калі яна пачнецца,— неяк не да твару камуністам біцца за ікону, за царкву.

Калі ж у бойку кінуліся мужчыны, Андрэй глянуў на сваіх сяброў і сказаў:

— Народ б'ецца, а мы... у баку... Неяк няёмка...

— Хадзем, чаго стаяць? — сказаў Захар.— Не за царкву ж будзем біцца, а супраць згубіцеляў нашых. Хадзем... Не аднаму чорту морду расквасім...

Ва ўсіх адлягло ад сэрца. Саскочылі з агарожы, тут жа набралі камення і пачалі прабірацца наперад. Захар ужо крычаў:

— Далоў чорную саранчу!..

І камені градам паляцелі ў паліцыянтаў.

А звон гудзеў ўсё гучней і трывожней — бом-бом-бом-бом-бом! Клікаў усіх на ратунак з бліжэйшых вёсак. І людзі беглі дарогамі праз палі, далучаліся да натоўпу.

А тым часам паліцыянты адарвалі Тацяну Ціханчук ад іконы і тузаюцца з ёю. А яна, спацелая, з рассечанай нагайкай шчакою, у падранай кофце, раз'ятраная, як тыгрыца, выкручваецца ад іх, плюе на іх і крычыць:

— Вам бога нашага захацелася! Маеце свайго — маліцеся, хай вы скапайце!

Крутнулася адным нарывам, вырвалася і тады... зрабіла сялянскі непрыстойны рух. Адвярнулася да паліцыянтаў спіною і нагнулася.

— Наце! Вось вам... а не матку боскую!

Натоўп мужчын грымнуў смехам, і аглоблі замаячылі ў руках, як пікі.

А паліцыянты попіка Чадзюка прывязалі ўжо да плота далёка ад натоўпу, дзе ён крычаў, пратэставаў, стагнаў, клікаў на дапамогу матку боскую, але голас яго ўжо губіўся ў шуме, не даходзіў.

Ксёндз Абнорскі стаяў збоку, склаўшы рукі на жываце, і гаварыў:

— Божа, даруй ім, бо яны не ведаюць, што робяць...

Да каго адносіліся гэтыя словы? Вядома, не да паліцыянтаў. Бо яны ўжо кінуліся на мужчын не з гумавымі палкамі, а з прыкладамі. Але ў адказ засвісталі аглоблі ў руках, паліцыя адкацілася. Яшчэ адзін папор, і грозныя ваякі пачалі ўцякаць. Аднекуль паляцелі камені. Адзін трапіў у спіну ксяндзу Абнорскаму. Ён агляну́ўся і паспяшыў да свайго вазка. Паліцыянты ў бяссільнай злосці пачалі страляць з рэвальвераў па званіцы — туды, адкуль гудзеў і гудзеў набат. Яшчэ відзён у сціску людзей Іван Шпак. Натоўп хлынуў да брамы і пацягнуў з сабою барадача. Рука Дзям'яна Гарагляда пракралася і пацягнула папа за каўнер.

Крыж выпаў з рук, і поп Шпак асунуўся ў людскі вір. Ніхто не бараніў папа. Ён упаў у сціску, у мітусні, і людзі імклівым натоўпам прайшлі па ім — наступалі яму на ногі, на грудзі, на твар... Жанчыны высока, амаль бягом, неслі выратаваную ікону ў шырока адчыненыя дзверы царквы.

З гоманам адыходзілі і ад'язджалі людзі. Царкоўны вартаўнік замыкаў царкву. Звон... заціх. Толькі яго хвалі яшчэ гудзелі і раставалі ў прасторы.

Нехта пабег адвязваць ад плота попіка Чадзюка, бо ён быў забыты ўсімі.

Усё сціхла ля царквы. На плошчы ляжаў поп-здраднік Іван Шпак, раскінуўшы рукі. Да яго, абыякава пазіраючы, з ключамі ў руцэ набліжаўся вартаўнік.

Раздзел пяты

## ЗНОЎ ТУРМА

Перадапошняе было — гэта ліст ад Паддубнага. Прасіў Андрэя наведаць Ганну Каравай, бо даўно ўжо не атрымліваў ад яе лістоў. Пісаў, што ён яшчэ ўсё пад следствам, ніяк не можа закончыцца яго справа, хоць выклікалі на допыт ужо некалькі разоў. І Андрэй, не адкладаючы, паехаў у вёску Навасады. Там ледзь не трапіў у рукі паліцыі. Можа, гадзіна, не больш, як яна выйшла ад Ганны, і тады зайшоў Андрэй. У сенцах яго сустрэла Ганна, сумная, заплаканая. Хата была адчынена насцеж, і там Андрэй убачыў кучу дошак, з якіх тарчалі заржавелыя цвікі. Аказваецца, паліцыянты ўзарвалі падлогу ў хаце, усё шукалі, усё шукалі невядома чаго. Андрэй зразумеў, чаму так доўга цягнецца следства Паддубнага. Паны не маюць дастатковага матэрыялу для абвінавачвання.

Ганна і ўзрадавалася Андрэю і спалохалася. Бо прыйшоў ён якраз пасля паліцыі — як тут думаць, хто яго ведае? Зайшлі ў хату, Андрэй развеяў яе сумненні, паказаўшы ліст ад Паддубнага. Ганна ж казала, што піша часта да яго. Значыць, пракуратура затрымлівае лісты.

У калысцы спала малое, Андрэй спытаўся:

— А гэта што?

Ганна ўсміхнулася і адказала:

— Як хто? Гэта малы Паддубны...

Таіўся стары са сваім раманам. Ніколі нават і не заікнуўся пра гэта ў турме. Вось канспіратар...

Ганна павесялела. Сагнала муху з тварыка дзіцяці і пачала расказваць жудасную гісторыю пра з'яўленне на свет сына Івана Паддубнага, якога яна назвала таксама Іванам.

На восьмым месяцы пасля арышту Паддубнага прыйшла паліцыя з вобыскам і арыштавала Ганну. І яна, моц-

ная, рослая, ішла ва ўсёй красе мацярынскай пад канвоем. А пад сэрцам стукала, варушылася яно...

Трымалі ў пастарунку цэлы тыдзень у халодным падвале, на голай цэментаванай падлозе — ні лаўкі не далі, ні табурэткі. Прыязджаў нейкі шпік з павета, з дэфензівы, і вадзілі Ганну на допыт па некалькі разоў у дзень. Усё пыталі, чым займаўся Паддубны, а яна ўсё адказвала: «Не ведаю...» Перасыхала ў горле, і не давалі ёй напіцца вады. Ганна, вярнуўшыся ў падвал, нават дакраналася языком да мокрых, слізкіх сцен. Потым садзілася ў куток, стуліўшыся хуталася ў хустку.

Калі ж на чацвёрты дзень адабралі хустку, Ганна ўдзень і ўначы да знямогі хадзіла па камеры, снавала з кутка ў куток, каб сагрэцца. Жоўтыя кругі плавалі перад вачыма, галава вяла ўбок,— Ганна апускалася на падлогу і тут жа засынала. Будзіў яе паліцыянт ударам бота ў бок і зноў вёў на допыт. На пяты дзень пачалі біць гумавымі палкамі. Ганна нахілялася, як магла, каб толькі не трапілі ў жывот, каб толькі не ў жывот. На шосты дзень білі гумаю і штурхалі ботамі, але траплялі ў тугія грудзі нахіленай Ганны, загнанай пабоямі ў куток. Толькі адзін спрытны ўдар бота зрабіў сваё. Ганна ўскрыкнула ад болю, збялела і асунулася на падлогу самлелая. Каты спалохаліся, баяліся, каб не памерла, пырскалі, аблівалі вадою. Калі Ганна апамяталася і, уся расслабленая, ледзь узнялася на ногі, каты адвялі яе назад у падвал, вярнулі ёй хустку, паставілі вядро з вадою. Ганна ўсю ноч піла ваду і сядзела прыціхлая ў кутку, прыхінуўшыся да мокрай сцяны.

На сёмы дзень выпусцілі Ганну дахаты.

Восень цвіла бабіным летам. Тонкая шэрань лягла на павуцінне, разасланае на скошаных сенажацях, на пашах. Папылы небасхіл павіс далёка-далёка над лазнякамі. На дарозе няма нікога. Толькі ідзе адна Ганна. Ідзе яна павольна, пераступаючы з нагі на нагу, і час ад часу хапаецца за жывот. Прыстане, бледная, сціснуўшы зубы, а потым пасоўваецца далей. Ці то шуміць навакольная асенняя цішыня ў лагодных бляcках сонца, ці гарачка ў галаве? А можа, гэта лес пакалыхваецца непрыкметна, хаваючы сонечныя бляскі пад сабою? Як жа хочацца легчы, заснуць, заснуць... Вось тут, на траве, пад арэхавым кустом, які чамусьці мае чырвона-жоўтыя лісці. Ой, ой... І сашчаміліся зубы, пасінелі вусны...

Ганна апускаецца на калені... паўзе... паўзе за куст —

бледна-сіняя, страшная ад болю. Вось тут, вось тут... нават все халадочак. Ой, як добра... І Ганна сціхла, як нежывая, заплюшчыла вочы... Толькі пасохлыя губы варушацца... А потым кальнула — раз, другі, запыла нясцерпна. Ганна скурчылася, падагнула ногі пад жывот і стогне, стогне, але не крычыць... Хоць бы крыкнуць, хоць бы крыкнуць... Але крык зассў пад сэрцам глыбока-глыбока — там, дзе боль. І не вырвацца яму, ніяк не вырвацца... Курчыцца Ганна, поўзае ля куста. А навокал — цішыня лагодная, мяккая, застыўшая. Яна павісла над Ганнай — рослай, моцнай жанчынай. Яшчэ адзін уздых, яшчэ адзін... і канец... канец усяму... Бывай, Іван, не прыйдзеш больш, не пастукаеш у акно ў асеннюю цёмную ноч да мяне, адзінокай. Толькі адзін уздых, яшчэ адзін. Ах... вось яно... крыкнула тонепька, прапізліва... І разарвалася застыглая цішыня... Вось яно — куга, куга! Як жа доўга прасілася на свет... Рукі інстынктыўна мацаюць, шукаюць... Ах, дзе ж яно? Ганна намагаецца ўстаць, апёрлася на локаць, і бліснула першая найхарашэйшая ўсмешка. Дзе хустка? Хутчэй хустку... кволае, маленькае... загарнуць. Загарнула, седзячы, паклала бліжэй да куста... А самую зноў пацягнула легчы... Лягла на бок і не спускала вачэй з прыціхлага маленькага стварэння...

А яно паварушыла галоўкай і закрычала зноў. Недалёка пачуліся крокі, і над Ганнай стаў мужчына з клуначкам за спіной. Гэта быў Антон Данілюк, які вяртаўся са сваёй Валыні да Мар'яны ў Дзяды.

— Што з табою, жінко? — спытаўся ён.

— Вось што... радзіны...— сказала кволым голасам Ганна і вачыма паказала на дзіця, сарамліва ўсміхнуўшыся.

— О, гэта так прычына! Я зараз скочу на вёску і прывяду падводу і бабку...

Так Данілюк і завёз Ганну дахаты.

— Вось як было, даражэнькі таварыш,— канчала свой расказ Ганна.

Дзіця заварушылася ў калысцы, лыпнула вачыма і прачнулася. Ганна падыйшла і паклікала Андрэя:

— Паглядзіце, які камунісцік...

Андрэй вярнуўся ад Ганны і напісаў ліст Паддубнаму, ліст алегарычны — усё роўна, як зашыфраваны. Ганна ў сваю чаргу абяцала выслаць яму пасылку.

Але, калі Андрэй вярнуўся дахаты, яго сустрэла новая горкая нечаканасць. Выбыў са строю Пеця Ціханчук.

Заўсёды дысцыплінаваны як удзень, так і ўначы, пільны вартавы моладзі, ён пад крылом Андрэя вырас у свядомага, адукаванага камсамольца. Даўно сачыла за ім паліцыя, вастрыла зубы, каб адпомсціць яму і яго маці Таццяне. Удала правялі кампанію па вывешванню сцягоў у гонар антываеннага дня, усё было ў парадку. Але трэба было паспрачацца з хлопцамі на вуліцы, ля таго самага асірацелага, замкнутага клуба.

У спрэчках Пеця выказаў думку, што каб яго ўзялі ў дэфензіву, то ён трупам упаў бы, а шпікі ад яго нічога б не даведаліся.

Падтрымліваў яго камсамолец з другой недалёкай вёскі Саша Грынявіцкі, хлопец з птушыным тварам, такі яшчэ малады, што мог бы быць піянерам. Ён бліскаў вачыма і ўсё казаў: «Правільна! І я так кажу!» Хлопцы або згаджаліся, або маўчалі, а двое пярэчылі. Хто мог перадаць гэтую спрэчку паліцыі? Хіба жабрак Рыгор Малахай, які сядзеў на прызбе ля сцяны крыху воддаль, апершыся на кій, так што на яго ніхто не звяртаў увагі. Бо з моладзі ніхто не пойдзе на такую агіднасць. Назаўтра прыехалі паліцыянты і забралі Пецю. А праз два дні ішла Люба Гаргляд рана з Глушца і пры шляху, у жытняй разоры, убачыла чалавека. Гэта быў Пеця. Яна пазнала яго па вопратцы, бо па твары адразу пазнаць нельга было. Гэта быў не твар, а нешта скрамсанае — у ранах, у сіняках з запеклай крывёю. Вочы заплюшчаны, запухлыя. Пеця ляжаў у разоры нерухома. Ён паміраў. Люба парабіла крыку: «Пеця! Пеця!», прыклала вуха да грудзей і не пачула біцця сэрца. Прыгаршчамі хапіла расы з травы і пачала мачыць яму лоб, павекі, вусны. А з вачэй яе, як тыя расінкі, падалі слёзы. Затым яна ў роспачы выбегла на шлях — з-пад рукі глядзела, глядзела ўдаль: можа, хто едзе. Нават падбегла на ўзгорак. Нехта пляцецца на падводзе, але вельмі павольна. Вярнулася назад. Здалося ёй, што Пеця ўздыхнуў. Але — не... Ляжыць нерухома. Яна, ломячы рукі, пабегла насустрач падводзе. Падбегла і ўзрадавалася — ехаў дзядзька Анупрэй Чарняк. Той, даведаўшыся, у чым справа, пагнаў каня.

— Ой, божа мой, што зрабілі з хлопца?! Пецечка! Пецечка! — крычаў Анупрэй. І сказаў Любе: — Ён жывы... цёплы... Пачакай...— І выняў з торбы бутэльку гарэлкі.

Адкаркаваў, даў панюхаць. Грымаска прабегла па скрамсаным твары і замёрла. Тады Люба прыўзняла Пецю, і Анупрэй уліў крыху гарэлкі ў рот.

Губы заварушыліся, зварухнуліся павекі.

— Зямля яго выратавала,— сказаў Анупрэй,— яна адцягнула боль... Каб ляжаў у хаце, памёр бы...

Не памёр Пеця. Пасля фельчарскага агляду ляжыць у сваёй хаце з забінтаваным тварам, з кампрэсам на грудзях. А пры ім сядзіць маці Таццяна і ціха роніць слязінку за слязінкай. Стрымаў свае слова сын — не выдаў.

* * *

А жыццё зноў патрабавала ўвагі да новых спраў.

Надышло яно — апошняе. За гарою, у полі, ляжалі ланцугом сяляне з каламі ў руках. Ужо была памятай жытняя пожня, выпаласканая дажджамі, высушаная сонцам і ветрам. Жураўлі садзіліся на яе адпачыць па дарозе ў вырай. Асеннія небасхілы ўсё ніжэй і ніжэй апускаліся на зямлю. На сэрца сыходзіла зацішша і трывога перад зімой.

Сяляне ляжаць ланцугом за гарою, як салдаты. Зараз павінна прыйсці сюды камісія з каморнікамі, пачаць абмер зямлі. На чале камісіі — Мікіта Лазун. Хутары насоўваюцца, хутары, як асеннія хмары. Чуваць гоман... Вось яны ўжо ідуць. Каморнікі расстаўляюць свае прылады. Мікіта такуе, як глушэц:

— Адгэтуль... адгэтуль можна бачыць усю мясцовасць...

У камісіі і солтыс Барсук і — на смех людскі — жабрак Рыгор Малахай. Значыць, павінны быць людзі не толькі ад заможных, але і ад бедных. Спрытна, а для людзей смешна. Для дапамогі, апрача зямельнага камісара, прыбыло дзесяць паліцыянтаў. Ну, гэта раз плюнуць.

Пасярэдзіне ланцуга, крыху высунуўшы галаву наперад, ляжаў Дзям'ян Гарагляд. Ніхто з камісіі не заўважае людзей, падрыхтаваных да наступу.

Людзі пад гарой пахаваліся ў альховыя кусты, толькі галовы дзе-нідзе тарчаць з зялёнага лісця. А ззаду — рудчаіна. Нешта вымахвае рукою бяльматы, злавесны Мікіта з гары, паказваючы абсяг зямлі. Каморнікі глядзяць у свае прылады, як у біноклі. Паліцыянты стаяць з вінтоўкамі ў руках і кураць. Ці доўга трэба чакаць? Дзям'ян свіснуў. І ўсе рванулiся з кустоў з крыкам «ура», як на вайне. Паліцыянты не паспелі апомніцца — сяляне-ваякі былі ўжо на гары. Першае, што было чуваць, гэта як трашчалі землямерныя прылады ад udараў калоў, а потым —

нейкія чамаданы. Мікіта, убачыўшы Нічыпара Байдака з калом, заморгаў вокам і крыкнуў:

— Нічыпар! І ты?

— Не пайду з табою! Пайду з людзьмі, з народам! — адказаў Нічыпар і бахнуў калом па блішчастым чамадане.

— Вон адгэтуль! — крычалі сяляне Мікіту, і калы ўзняліся над яго галавою. Мікіта прыгнуўся, баронячыся, і пабег услед за солтысам. Паліцыя з каморнікамі стаялі, крыху адбегшыся. Перачакаўшы, пайшлі ў атаку з настаўленымі вінтоўкамі. Адзін стрэл прагучаў угару.

Сяляне не адступалі. Калі паліцыянты пачалі біць сялян прыкладамі па плячах, сяляне з крыкам пусцілі ў ход калы. Збілі з ног двух паліцыянтаў, прабеглі па іх і гналі далей.

Камсамолец Саша Грынявіцкі, сувязны, у расхрыстанай зрэбнай сарочцы, у каўняры якой і гузіка не было, прыбег, засопшыся, на хутар, дзе адбывалася нарада камуністаў, і паведаміў, што камісія прагнана з гары і паліцыя з каморнікамі ўцякла з вёскі на падводах.

Становішча рабілася напружаным. Трэба было чакаць, што паліцыя з большымі сіламі вернецца і пачне чыніць расправу. Ганцы паляцелі ва ўсе навакольныя вёскі папярэдзіць, каб усюды выставілі варту не толькі на ноч, але і на дзень. Удзельнікі нарады ўпершыню за ўвесь час сваёй працы пасля партызанства прыйшлі на збор з рэвальверамі. Ганцы данеслі, што за дзень адбыліся сутычкі з паліцыяй яшчэ ў пяці вёсках і ўсюды перамаглі сяляне. Але адзін ганец як пайшоў, так і не вярнуўся. Пачакалі і вырашылі паслаць Сашу Грынявіцкага. Чакалі доўга. Пачало ўжо цямнець, а Сашы ўсё не было. Трывога ахапіла ўдзельнікаў нарады. Захар Зубец прапанаваў пакінуць хутар. Застанецца адна Люба Гарагляд — яна накіруе ганцоў куды трэба. Так і хацелі зрабіць. Падняліся ўжо, каб выйсці, як раптам цёмнае акно затрашчала ад стуку. Усе ўбачылі на адзін момант птушыны твар Сашы і пачулі адзін крык: «Уцякайце!»

Саша крыкнуў і знік.

Усе спусціліся ў склеп, які меў асобны выхад на двор. У гэты самы час паліцыянты з сабакамі акружалі хату. Трэба дабегчы да ляска. Туды — чаго б гэта ні каштавала! Прыгнуўшыся, ішлі ў цемры адзін за адным і бачылі, як паліцыянты свяцілі ліхтарыкамі ў вокны цёмнай хаты. І трэба было камусьці наступіць на жардзіну, якая з

грукатам пакацілася з кучы і пацягнула за сабою іншыя. Сабакі забрахалі неяк раптоўна і заўзята. А потым кінуліся за ўцекачамі. Паліцыянты адкрылі густую страляніну. Значыць, іх было многа. Уцекачы разбегліся па адным у розныя бакі, але мэтай для ўсіх застаўся лясок, за якім балотнай далінай цягнуліся пералескі. Сабакі не сціхалі і, здавалася, вось-вось пасцігнуць. Паліцыя без парадку страляла пад цёмным глухім полем. Толькі б хутчэй у лес! Паліцыя зразумела намеры ўцекачоў і пайшла ў абход. Першымі дабеглі да лесу Андрэй, Захар і Люба... Цяпер задача — прарвацца да балотнай нізіны. Але задача гэтая была ўжо нялёгкай. Сабакі няспынна брахалі. Люба чамусьці адстала. Андрэй аглянуўся — няма. Што за прычына? Аказваецца, адарваўся каблук ад чаравіка і яна села, каб разуцца зусім і бегчы босай.

Але брэх сабакі прымусіў яе легчы. І яна легла пад кустом. Ляжала так ціха, не дыхаючы, як быццам урасла ў зямлю, як быццам памерла. Сабака вылецеў з кустоў і стаў над Любай. А яна ляжала.

Сабака не брахаў. Ён пастаяў ціха, панюхаў Любін каптан, ногі і падаўся ў кусты, угнуўшы галаву. Люба крыху пачакала, затым ціха-ціха прыўзняла галаву, паслухала. Брэх чуўся недзе ўжо на ўскраіне ляска. Люба накіравалася ў процілеглы бок і хутка выйшла на поле. За хмарамі сонна блукаў месяц. У глухім змроку танула зямля. Па брэху сабак Люба здагадалася, што недзе там яе сябры. Адышлася ад ляска далей у поле і пайшла абходамі да балотнай нізіны. А сябры набліжаліся да ручаіны.

Аднекуль вынырнуў Марцін Шапко і ледзь не спатknуўся на Андрэя і Захара.

— Хлопцы, вы? — ускрыкнуў шэптам і ўпаў на зямлю, папоўз.— Яны блізка, спускаюцца сюды.

— Дзе Віктар і Максім? — спытаўся Андрэй.

— Віктара бачыў тут, недалёка... Дзе Максім — не ведаю...

Падышлі да дрыгнявістага месца, да тарфянага куп'я. Андрэй сказаў:

— Пакуль не страляюць, пераскочым ручаіну, а там, калі што, можам нават адказаць стрэламі...

А сабакі вось тут недзе блізка сабраліся ўсе і ўжо не толькі брэшуць заядла, але і вурчаць. Напэўна, высачылі Віктара. Хлопцы толькі намерыліся перайсці ручаіну, як стрэлы адзін за другім вухнулі недалёка. Сковыт паплыў

і згубіўся ў брэху, які пачаў аддаляцца. Відаць, што страляў Віктар. Не зусім добра, што выявіў сябе, усіх. Бо ў адказ з-пад ляска сыпнулі стрэлы, як па камандзе. Захар Зубец злёгку войкнуў і апусціўся на зямлю.

— Мусіць, паранілі,— сказаў ён.

— Куды? — спыталіся ў адзін голас і Андрэй і Марцін.

— У нагу...

Сабакі зноў набліжаліся. Андрэй выняў з кішэні рэвальвер.

— Марцін, Захар,— адкажам, можа, адхлынуць! Падрыхтуйце рэвальверы!

З калена ўсе трое адкрылі пальбу. І тады да сяброў падбег Віктар. Трэці стрэл і апошні даў разам з усімі і ён. Штаніна на правай лытцы Захара змакрэла ад крыві.

— Марцін, вядзі Захара ўздоўж ручаіны. Мы пачакаем Максіма. Калі жывы, павінен падысці на нашы стрэлы. Недзе і Люба згубілася,— сказаў Андрэй і стаў зараджаць рэвальвер.

Пасля стрэлаў настала зацішша. Паліцыя не страляла. Прыціхлі і сабакі. Толькі час ад часу адзіночны брэх прарываўся ў цішыні, і то ўжо ў аддаленні.

Блізкі шолах кустоў насцярожыў хлопцаў. Пальцы ляглі на куркі рэвальвераў. Нехта вынырнуў з кустоў і ішоў так, што мог абмінуць Андрэя і Віктара. Сябры, прыгнуўшыся, прыгледзеліся, і Андрэй шапнуў: «Максім...» Цень спыніўся і не рухаўся з месца. «Максім»,— паўтарыў гучней Андрэй.

— Гэта вы стралялі? — спытаўся ён.

— Мы, Максім,— пазнаў па голасу Андрэй Максіма Рунду.

— Але здорава... Яны... Яны сюды не пойдуць... Пабаяцца...

— Мы падамося ўздоўж ручаіны. Ужо Марцін павёў туды параненага Захара,— сказаў Андрэй.

— Што? Захар паранены? — шэптам зжахнуўся Максім.

— Так... у нагу...

Пайшлі. Ідучы, пачулі, як здалёк глуха далятаў брэх сабакі. Можна было думаць, што паліцыя адышла.

— Але... дзе ж наша Люба? — зноў запытаўся Андрэй.

Урэшце дайшлі да Захара і Марціна. З імі была і Люба. Яна таксама, як і Максім, ішла на стрэлы і сустрэлася з Марцінам і Захарам.

Вырашылі выбрацца з кустоў бліжэй да поля, на сушэйшае месца. Трэба нешта рабіць з нагою Захара. Люба падрала ўжо сваю хустку. Адарвала кавалак кофты пад каптанам, намачыла ў ручаіне.

Селі на сухой мураве пад кустом пры ўскраіне нізіны. Сябры растапырылі крылы сваіх пінжакоў, атулілі навокал Захара. Віктар свяціў ліхтарыкам. Люба асцярожна выцірала рану, якая ўжо крыху прысохла. Куля прабіла лытку навылет. Пухліна разышлася па назе — прыйдзецца везці Захара на падводзе. Куды ж цябе пакуль што дзець? Эх ты, доля цярністая...

— Нічога, Захар будзе здароў... Тыдзень часу, і ўсё загоіцца,— сказаў Андрэй.

Ляжалі ціха, моўчкі адпачывалі. Навокал панавала ўжо глухая цішыня. Здалёк данеслася загубленае, беспрытульнае кігіканне кнігаўкі над балотам.

Неўзабаве пацягнула лёгкім ветрыкам, ад якога, здаецца, ускалыхнуўся змрок над палямі. Набліжалася світанне.

«Падвёў ганец. Але не схаваецца, знішчым правакатара, знішчым...» — думаў Андрэй, пазіраючы ў навіслае цёмнае неба без зор.

Тое самае думалі і яго сябры...

...Ляжы не ляжы, а трэба да світання ўправіцца з Захарам. Удзень будзе цяжэй. Аб старой канспіратыўнай хаце, у цёткі Любы, ужо няма гутаркі. Там, напэўна, сядзіць шпік. Што зрабіў Саша Грыняўіцкі? Ці паведаміў, каму трэба, што хата ўжо расканспіравана? Можна думаць, што нешта зрабіў. Але ўсё роўна трэба праверыць.

Андрэй устаў.

— Люба, хадзі сюды,— паклікаў ён.

Яны адышліся недалёка, каб ніхто не пачуў іх гутаркі. Люба стаяла перад Андрэем, абвітая змрокам, без хусткі, і твар бялеў у змроку няўлоўна.

Ветрык узварушваў яе крыху раскіданыя валасы.

Пачуццё гордасці кранула сэрца Андрэя, калі ён глядзеў на Любу.

— Люба,— пачаў Андрэй.— Захар ісці не зможа. Патрэбна падвода... І патрэбна яна ўжо зараз, бо хутка пачне світаць. Што можам зрабіць? Куды можна кінуцца найбліжэй?

— У вёску яго не павязеш. Трэба на хутар,— адказала Люба.

— З больш знаёмых людзей найбліжэй хто?

Люба памаўчала, шукаючы ў памяці знаёмага.

— Ды хто? Толькі дзядзька Апупрэй.

— Ці згодзіцца ён?

— Па-мойму, згодзіцца...

* * *

Саша Грыпявіцкі пасля таго, як крыкнуў у акно: «Уцякайце!», памкнуў у поле. Абы толькі далей ад паліцыі. Адбегся за ўзгорак і лёг у даліне. Сэрца яго стукала моцна. Ці вырвуцца хлопцы, ці паспеюць? Але, калі загучалі стрэлы, здагадаўся, што ўцяклі. Вось добра, вось добра. Як бы прабрацца да іх. Не, гэта цяжка. Трэба пайсці зараз у вёску і расказаць усім, што Міхась Жаўна правакатар. Яго ўзяла паліцыя ў вёсцы, і ён выдаў... Выдаў дарагіх таварышаў. Ці жывыя яны застануцца? Бачыце, колькі сабак за імі гоніцца і ругапы страляюць.

І Сашу часам хацелася плакаць. Не вытрымаў, устаў, выйшаў на ўзгорак. Далёка ўжо брэшуць сабакі. І такая трывога і разам з тым беспрытулле паўкола! Што робіцца ў вёсцы? Спяць людзі ці не? Пабягу ў вёску.

І Саша пабег. На хвілінку спыняўся, слухаў, а затым зноў бег. Вёска, можа, і не спала, але маўчала. Недзе схаваўся і вартавы. І сюды, хоць глуха, але далятаді брэх сабак і стрэлы. Саша прайшоў праз усю вёску і нікога не сустрэў. Тады з нейкай роспачы ці злосці стаў пасярэдзіне вуліцы і зацягнуў на ўвесь голас, як гэта рабіў у кампаніі хлопцаў:

Смело, товарищи, в ногу,
Духом окрепнем в борьбе,
В царство свободы дорогу
Грудью проложим себе!

Людзі ў хатах падымалі галовы са сваіх пасцеляў, падыходзілі да вокнаў. Прачнуўся Дзям'ян Гарагляд, глянуў у акно і з усмешкай падумаў: «Можа, ужо рэвалюцыя пачынаецца?»

А Саша, праспяваўшы дзве страфы, пабег з Запалянкі дамоў.

* * *

Развітаўшыся з сябрамі, Андрэй падаўся пералескамі ўздоўж ручаіны, каб дабрацца да хутара Апупрэя Чарняка.

Бялёсае, халоднае світанне без сонца рассцілалася на палях, адкрывала вачам узгоркі і даліны, разорыстыя, усыпаныя каменнем палеткі.

На брэх сабакі, прывязанага на ланцугу, выйшаў дзядзька Анупрэй. Узлазілі потым адзін за другім па драбіне на сена, высока, аж пад страху. Там ужо ляжаў Захар.

— Ну, як табе? — спытаўся ў яго Андрэй.

— Добра, Андрэй... добра...

Аказваецца, у дзядзькі Анупрэя знайшліся ёд і карболка. Сам дзядзька прамыў рану, абляжыў лісткамі трыпутніку, харашэнька забінтаваў. Ён цяпер з задаволеннем расказваў пра сваю лекарскую работу, ганарыўся ёю. Ён жа вядомы вясковы ветэрынар. Сякое-такое лякарства ў яго заўсёды знойдзецца.

— Зажыве хутка... рана невялікая. Але як гэта магло трапіць унач? — гаварыў ён.— Зараз Люба прынясе нам есці. Але... хлопчыкі... я думаю, нічога не будзе з вашага адпору — паб'юць зямлю на хутары ўсё роўна.

— Гэта ім не так лёгка дасца,— адказаў Андрэй,— патрацяць пораху нямала.

— Учора, Андрэй Сцяпанавіч (так дзядзька Анупрэй заўсёды зваў Андрэя), быў я ў вашага бацькі... Таксама лячыў яго.

— А што?

— Што? Атрымаў гасцінца прыкладам па лапатцы, і плячо адняло... Змазаў яму ёдам.

— Ну што ж,— наскроб за вухам Андрэй,— у бойцы трэба чакаць, што могуць ударыць. Ляжыць бацька ці ходзіць?

— І ляжыць і ходзіць. Маці ваша сварыцца... Што не трэба было выскакваць наперад і ўсё такое. Кляне паліцыянтаў на чым свет стаіць.

— Ну, маці заўсёды...— адмахнуўся рукою Андрэй.

— Але людзі думаюць, значыць, не паддацца... Мікіта Лазун — ха-ха-ха... прасядзеў недзе ў кустах на лугу цэлы дзень. Кузьма яго тут араў недалёка, дык расказваў. Кузьма хоча зусім уцячы з дому. Мікіта замыкае сала, а нявестка масла носіць у Глушэц прадаваць. Хлопец вернецца пад поўдзень з арання галодны, і няма чаго есці. Мікіта пойдзе або на поле, або ў маёнтак. Хлопцу пакінуць скібку хлеба і забеленую зацірку,— усё гаварыў Анупрэй, а потым вяртаўся да таго самага.— Эх, шкада вас, хлопчыкі, каб хоць што было з гэтага... Парэжуць зямлю, парэжуць...

— А потым прыйдзе час — іх параэкуць,— уставіў Захар.

«Аналітычны як быццам дзядзька Анупрэй,— падумаў Андрэй,— толькі душу мае таварыскую, і гэта яго трымае па паверхні».

— Андрэй Сцяпанавіч, зойдзем у хату, паснедаем,— запрашаў Анупрэй ужо па падворку.

Андрэй адмаўляўся, дзякаваў, спасылаўся на недахоп часу. Але дзядзька Анупрэй запрашаў урачыста, як на вяселле. Ён умеў запрашаць.

— Не, не, Андрэй Сцяпанавіч... Я не дапушчу, каб вы... Не, не... Хадземце... Няма часу? Ды сёння вам часаць няма чаго. Начасаліся за ноч, дзякуй богу... Го, го! Такія штурмы вытрымаць!

Андрэй ведаў, што без чаркі ў дзядзькі Анупрэя не абыдзецца, і таму не хацеў заходзіць, але бачыў, што Анупрэй здаволены тым, што вось Андрэй, сын Сцяпана Касцевіча, давярае яму ахову свайго таварыша. Ён гэтую функцыю выканае з гонарам. Не будзе другам Сцяпана, калі не выканае.

— А вашага таварыша мы ўхаваем, вылечым. Калі прыйдзе паліцыя, бутэльку ім на стол пастаўлю, мёду... Чорт іх бяры... Нажаруцца і пойдуць...

Затым паціснуў плячыма і дадаў:

— Што ты зробіш? Трэба ім чымсьці горла заткнуць.

Ну... у гэтым хіба і сіла Анупрэя. Паілі ўсё жыццё царскіх урадпікаў, стражнікаў, пісараў, нават станавых прыставаў. А цяпер тое самае паўтараецца з панскімі «ахоўцамі парадку».

Андрэй уступіў просьбе Анупрэя і пайшоў за ім у хату. Анупрэй вёў Андрэя, як невядома якога госця. Калі ўвайшлі ў пярэднюю, першае, што зрабіў Анупрэй,— гэта павыганяў дзяцей. Потым схапіў нейкую анучку і, узмахваючы ёю, пазмятаў лавы, затым праверыў, ці добра стаіць стол, ці не хістаецца. Стол якраз хістаўся. Дзядзька знайшоў трэсачку, падклаў пад ножку стала. І тады паляцеў у кухню. Там даў загад, каб усё было гатова і каб снеданне падавала на стол толькі Люба.

Яна і ўвайшла з дзядзькам, заслала стол абрусам, дзядзька паставіў бутэльку гарэлкі і паклаў пачаты бохан хлеба.

— Нож, Люба, захапі на кухні...— падганяў Анупрэй.

* * *

Як жа пакутліва-павольна ідзе час. Напружанне ў дэфензіве такое, як быццам хто зубамі грызе жалеза. А скрыгат, гэты нязмоўкны скрыгат уразаецца ў душу. Ці рыпнуць дзверы, ці зарыпяць боты шпікоў, паліцыянтаў, ці перасунулася дзе крэсла — усё скрыгатам аддаецца ў сэрцы. Усіх рассадзілі па адным — баяцца, каб не дамовіліся, як што гаварыць. І невядома, каго першага выклікалі на допыт. Тупаюць ногі па калідоры, бразгаюць ключы, замкі, бахаюць дзверы, часам пачуецца рык паліцыянта: «Холера!» І зноў стане ціха, злавесна, прыгнятаюча ціха.

Ходзіць Андрэй па сваёй камеры, заклаўшы рукі назад. Арыштавалі яго рана, у Глушцы, у Акруговай управе таварыства беларускай школы, дзе ён ужо вось паўгода выконваў па сумяшчэнню функцыі сакратара. Таварыства беларускай школы — культурна-асветная арганізацыя — апошняя легальная апора для працы, якая засталася яшчэ з часоў Грамады. Андрэй амаль усю ноч праседзеў над пратаколамі гурткоў, над рознымі данясеннямі. Змяншаецца лік бібліятэк у акрузе. Паны прышываюць бібліятэкам камуністычную прапаганду, забіраюць творы Максіма Горкага, Анры Барбюса. А цяпер пачынаюць закрываць бібліятэкі зусім, кніжкі канфіскуюць. Некаторымі акруговымі ўправамі, як, напрыклад, беластоцкай, фашысты хочуць авалодаць — накіраваць яе працу ў згодніцкае фашысцкае рэчышча. Да глушэцкай ніяк не могуць падкапацца.

Андрэй перагортвае пратаколы і адчувае, як за яго плячыма, за акном, нібы стогне асенняя слотная ноч. Ці то так вецер прабягае па дахах, ці хто далёка адгэтуль не зачыніў варот, і яны ўсё час ад часу бухаюць. Ля печкі сядзіць бабка, гаспадыня хаты, пра прысутнасць якой нават і забывае Андрэй. Бабка не то дрэмле, не то так заплюшчвае вочы. Потым пазяхае, нешта шэпча сама сабе. Яна чымсьці нездаволена, бо раптам з шэптаў вырываецца голасна:

«А хваробу табе, а не зямлі!..» І пачнецца такое насавое мармытанне, што Андрэй доўга снадылба глядзіць на бабку. «Хіба ты ў мяне сын?» — ужо мацней крыкне бабка і працягне: «Бадзя-яга...» Да свядомасці Андрэя даходзіць, што бабка не хоча выдзеліць зямлі сыну. А потым яна звяртаецца да Андрэя:

— Кладзіся спаць... Прычапіўся да гэтых папераў... Паперы пачакаюць. От, я вельмі мала сплю...

Старая пазяхае яшчэ раз, пачухаецца і ўрэшце пойдзе ў сваю палавіну на печ.

Андрэй выпрастаецца, пацягнецца ад стомленасці, закурыць і пройдзецца па пакоі.

Раз-два, раз-два — чуюцца крокі Андрэя. Вецер пазвоньвае бляшанымі дахамі, і недзе тыя вароты — усё бух і бух.

І вось цяпер Андрэй ходзіць па іншым «пакоі» — з акенцамі ў кратах і аблупленымі сценамі. Хваляванне сцішваецца, асядае недзе на «дно». Позірк спыняецца на ўсім павольней, хоча прыкмеціць усе падрабязнасці. Вось нехта надрапаў на сцяне, відаць, цвіком, галаву Пілсудскага з выскаленымі зубамі — наогул нешта падобнае на тыгра. Побач надпіс: «Не заб'еш — будзем жывы». Шмат чаго напісана на гэтых сценах. Можна сустрэць і лозунг, і лаянку, і трагічную лірыку. Адна фраза абрываецца на паўслове: «Кроў мая...» Відаць, не дапісаў скатаваны, нешта перашкодзіла. Так, разглядаючы, Андрэй заўважыў у адным месцы, дзе адпаў тынк, шчыліну паміж дошкамі і прыпаў да яе вокам. Разам з тым, як глядзеў, твар рабіўся змрочны. Адышоўся на момант і зноў прыпаў. У суседняй камеры на падлозе ляжаў Якаў Кушалевіч, сын каваля Міхала. Ён ляжаў, апёршыся на локаць, прытуліўся галавою да сцяны, і па шчоках цяклі, быццам самі сабою, ціхія пакутлівыя слёзы. Святло з акенца падала на яго кучаравыя мяккія валасы, на бронзавы твар у сіняках. Якаў слёз не выціраў — яны так цяклі і цяклі, не спыняючыся. «Значыць, Якаў быў на допыце... Значыць, прызнаўся...» — сказаў сам сабе Андрэй і хутка захадзіў па камеры. Якаў Кушалевіч заўсёды чытаў даклады на сходах ячэек Глушца аб міжнародным становішчы. Апрача гэтага, ён, член гарадскога камітэта, адказваў за МОПР. Уся сям'я каваля Міхала стала сям'ёй мопраўскай — адтуль ішлі і грошы, і пасылкі ў турмы. Дапамагалі ў гэтай працы браты, сама маці і нават Міхал. Усё адсылалася непасрэдна са станцыі, каб ашукаць пільнасць паліцыі. На тое ж ёсць балаголы ў мястэчку, каб давезлі.

І вось Якаў прызнаўся, ляжыць у камеры на падлозе і плача — плача, што не вытрымаў. Што скажуць хлопцы, што скажа брат Хаім і наогул уся сям'я? Як жа будуць смяяцца бундавец Бурштэйн і ўсе купчыкі. Яшчэ ж пядаўна ён сказаў Бурштэйну: «Ты — буржуазны хамут...» Як жа ён гляне ў вочы Андрэю, якому некалькі дзён таму назад расказваў старадаўнія казкі...

І новая хваля слёз залівае вочы Якава.

Андрэй глянуў яшчэ раз у шчыліну — плача Якаў, плача — і перастаў глядзець. Па калідоры праляцеў такі крык, як быццам недзе выбухнуў пажар, і клубок слоў пpарваўся, заклекатаў і сціх. Андрэй паспеў толькі схапіць: «Калі Касцевіч вінаваты, няхай адказвае... А я што? А я што?» Гэта — Цукерман. Безумоўна, ён будзе сыпаць. Гэты слюнявы местачковы дэмагогік апошні час быў незадаволены тым, што яго не дапускаюць (у прыватнасці Рунда) да арганізацыйных сакрэтаў. Вядома, як гэта можа быць, каб ён, сын купчыка, ды ў мястэчку не меў улады? Кіруюць тут нейкія мужыкі, балаголы, кавалі... А ён не... Ад яго толькі патрабуюць працы, хоць на самай справе апошні час яго ўжо абыходзілі зусім.

Бразнуў замок, і дзверы неяк павольна і цяжка адчыніліся.

— Касцевіч... да пана кіроўніка...— стрымана, як праз зубы, прамовіў паліцыянт.

«Пан кіроўнік» — гэта і быў кіраўнік дэфензівы... Маладзы, адно вока меншае і крывавае. Ягомасць з драпежнай першовасцю ў рухах.

— Пан мне адкажа на адно пытанне. Гэта пан кіраваў усёй падрыўной камуністычнай дзейнасцю ў акрузе пасля выхаду з турмы?

— Не... Нічога не ведаю... Працаваў дома па гаспадарцы...

— Раджу прызнавацца, лепш будзе.

— Я не маю ў чым прызнавацца...

Драпежная істота злёгку ўсміхнулася і націснула на кнопку званка на стале.

Увайшоў ягомасць у мундзіры зеленаватага колеру, з апухлымі шчокамі.

— Так пан да віны не прызнаецца? — паўтарыў кіраўнік.

— Я не маю ў чым прызнавацца...

Гэты кіраўнік катоўні кіўнуў носам на ягамосця з апухлымі шчокамі, што ўжо аглядаў Андрэя свінымі вочкамі, як калючкамі, і сказаў:

— Забраць яго... Аформіць пратакол.

«Афармленне» працягвалася двое сутак. І ўсё фазамі. Мінула першая фаза — мардабіцце, настала другая — нагабіцце, за ёй трэцяя — гумабіцце. А далей — вязанне ў крук з палкай пад каленямі і напампаванне вады ў нос, біццё па пятах гумай. А пратакол, гатовы да подпісу, як

ляжаў па стале, так і ляжыць. З другога боку, у пакутніка, здаецца, нічога не засталося, ні рук, ні ног — усё анямела. Толькі застаўся некранутым невялічкі вузялочак у галаве — ён чуе, як гарыць усё цела, ён яшчэ думае і не хоча не думаць... Гэты «вузялочак» чуе нават, як шуміць лес, як шапацяць каласы, чуе голас з далечыні: «Радзішчаў!» Так, так... люблю Радзішчава... люблю нейкай асаблівай любоўю сярод прыгожых беспрыкладных... Радзішчаў... у далёкім змроку прыгоннай, глухой, кайданнай Расіі першы кінуў выклік царскай пачвары. Сорак адзін дзень катаванняў вытрымаў Радзішчаў... Высакароднейшы з высакародных...

Думка прабіваецца, як праменьчык зорачкі праз імглу.

Андрэй, ачнуўшыся ад цяжкага забыцця, памацаў рукою навокал сябе. Падлога... Ледзь расплюшчыў заплыўшыя крывавай пухлінай вочы і ўбачыў святло на сцяне ўгары... Гэта, відаць, акенца ў кратах. Павёў вачыма па столі, па сцяне. Стомленая галава зноў прыпала да падлогі, і вока заўважыла лужынку ўласнай крыві. А губы тут жа адчулі яе смак. Нагамі нельга паварушыць... Як быццам да іх прывязаны калодкі. Глухі, цягучы боль... Адпачыць, адпачыць, адпачыць... «А ты, Оля... не... Надзя... Надзя... ты не плач... Хаваеш слёзы... Я ўсё бачу... Я табе многа, многа чаго раскажу. Жыццё пражыць трэба прыгожа... для народа... Інакш... мы не маем права на жыццё. Інакш... мы ператворымся ў нікчэмнасць... Ух... як я не люблю мяшчанства... Ты ведаеш гэта. Гэта нешта растлусцеўшае, хцівае, драпежнае, згубна зайздроснае... Чартапалох...»

На калідоры раптам пачуўся лямант: «Ой, паночкі, ой, што ж вы робіце!.. Ой, ой, ой!..» Дзверы грукнулі, бразнулі ключы... І крокі паліцэйскіх ботаў затупалі заўзята, грузна па калідоры. Лямант прымусіў Андрэя прыўзняцца, як па трывозе: «Хто гэта крычыць? А-а... Марцін Шапко... Мужыцкі філосаф... Ах, Марцін, Марцін... Яшчэ рабская ў цябе душа... Паночкі... Паночкі... Якія тут табе паночкі?!»

Андрэй злосна агрызнуўся, аж грудзі ўзняліся і кальнулі болем... Кашлянуў, плюнуў... кроў...

Ці гэта ўжо канец? Ці яшчэ будуць «фазы»? Цямнее ў камеры. Ужо вечар. Цямнее ў вачах. Бацька, напэўна, прыходзіў ужо даведацца. Ну, вядома, не дапусцілі...

Вось і цемра. Думкі сцішваюцца, заміраюць. А потым успыхваюць, як спалоханыя птушкі. І халаднее там, дзе

сэрца. Нельга дапаўзці да вядра з вадою. Боязна зварухнуцца.

Усё ж такі прыйшла яшчэ адна фаза. Перш на калідоры пстрыкнуў электрычны выключальнік. Лямпачка ля самай столі асвятліла камеру. Дзверы спаважна рыпнулі. Увайшлі два паліцыянты.

— Уставай.

Андрэй сеў, паспрабаваў падняцца на ногі, але тут жа асунуўся назад.

Паліцыянты падхапілі яго пад рукі, і ногі Андрэя пацягнуліся па падлозе.

Перад шпікам, прыхінуўшыся плячом да сцяны, стаяў Захар Зубец з апушчаным акрываўленым тварам. Кашуля на грудзях падраная. Яго загналі аж на трэці паверх: ён не даваўся біць. Схапіў крэсла і размахнуўся. Шпікі адступілі і доўга ніяк не маглі дабрацца да Захара, які ўмацаваўся ў кутку, узброены крэслам. Урэшце аднаму шпіку ўдалося сваёй кулясай зачапіць за крэсла, падскочылі на дапамогу другія, і Захар быў абяззброены.

Пачалася рукапашная барацьба. Шпік цягнуў Захара да адчыненага акна і хацеў выкінуць з трэцяга паверха. Добры выпадак, каб потым напісаць у газеце, што арыштаваны сам уцякаў праз акно і разбіўся. Але Захар схапіў шпіка за каўнер мундзіра пад горлам і сказаў:

— Упаду я, упадзеш і ты...

І як шпік ні намагаўся вырвацца з рук Захара, а затым скінуць яго — не ўдалося. Павісаў Захар палавінай спіны за акном, павісаў і шпік. Прыйшлося адмовіцца шпіку ад такога намеру. Тады тыя, што стаялі і сачылі за ходам барацьбы, баючыся прыкласці сваю руку да такой рызыкоўнай справы, накінуліся на Захара, як сабакі. І вось ён стаіць ля сцяны з акрываўленым тварам. Эх, Захар, Захар... натура твая... дадаў ты сабе лішніх пару год турмы, калі не што яшчэ горшае.

— Вы ведаеце гэтага чалавека? — спытаўся шпік у Андрэя, паказваючы на Захара.

Андрэй знарок доўга глядзеў на Захара і потым закруціў галавою: «Не... не ведаю...»

— А ты яго знаеш? — спытаўся шпік у Захара, паказваючы на Андрэя.

Захар павольна ўзняў свой збіты, знявечаны твар, глянуў на Андрэя, і ледзь прыкметныя іскрынкі радасці мільгнулі ў вачах.

— Бачу першы раз у жыцці...— адказаў Захар і дадаў: — Я толькі вас ведаю, доўга буду помніць...

— Ото, холера...— прамовіў шпік.

Прывялі Марціна Шапко, таксама пабітага. Ён трымаўся за жывот, крыху сагнуўшыся. На твары адбілася і цярпенне і маленне.

— Ведаеш Захара Зубца?

— Ведаю,— адказаў Марцін.

— Вы хадзілі па хутар разам?

— Ага... хадзілі... ці не... я нешта забыўся...

Напорысты позірк Захара не сходзіў з твару Марціна. Ён гэта адчуваў і пачынаў блытацца.

— Гавары выразней! — раўнуў шпік і ўзяў нагайку.— Літаратуру ён вам даваў — лістоўкі, брашуры?

— Гэта было... Чыталі разам... Што праўда, то праўда...

«Вясковая ты бочка,— думае Андрэй, слухаючы Марціна,— бухні ў цябе, ты і адгукаешся...»

— Каб цябе халера ўзяла,— паважна вымавіў Захар,— сабака!..

— А Касцевіча ведаеш? — не ўнімаўся шпік.

— Бачыў раз, яшчэ пры Грамадзе.

— Му-гу... пры Грамадзе...— злавесна мармытаў шпік,— а на хутары разам не былі?

— Штосьці не... Не помню... Не было такога...

Нагайка раптам перацягнула Марціна цераз галаву па спіне.

— Ой, за што ж вы, паночку, б'яцеся? Я не помню, можа, і быў...

Прывялі Максіма Рунду, бледнага, з апухлым пасінелым вокам.

Гэты адмаўляў усё і так лёгка, як быццам пераскакваў цераз што-небудзь.

...Назаўтра ў следчага паўтарылі свае непрызнанні тыя, хто не прызнаўся ў дэфензіве. Адмовіліся ад сваіх паказанняў і Марцін, і Якаў. Пацвердзіў амаль усё Ісэр Цукерман — глушэцкі «тэарэтык». Ён думаў, што яны вызваляць, але гэтага не адбылося.

Канвой. Кайданы. Станцыя. І турма. Дарога ўжо знаёмая...

## БАЦЬКА

Прыйшоў Сцяпан Касцевіч з касьбы з сынам Міколам. Мог бы касіць яшчэ, але трэба падрыхтавацца ў дарогу. Дарога недалёкая — усяго ў Глушэц, але непрывычная і таму цяжкая. Выклікае старога Сцяпана сам староста. Чаго? Нашто? Думалі, гадалі і ні да чаго выразнага прыйсці не маглі. Дзям'ян Гарагляд тарочыць, што не інакш, як на службу хочуць паставіць. Усё жыццё чалавек будаваў чыгункі, тэхнікам быў, а цяпер прыкладамі вінтовак на плячах яго б'юць і сілы няма плаціць падаткаў і штрафаў. Можа, хочуць паддобрыцца паны? Не хочацца ісці да гэтых злыдняў, што ўсё жыццё разбілі, але што ты зробіш? Няволя... Цяпер шарваркі пайшлі ў ход, гоняць людзей ладзіць дарогі, мусіць, вайну чуюць. Манеўрамі вось поле стапталі. Гэта ўсё на Савецкую Расію, аб якой народ сніць удзень і ўначы. Не выйдзе справа, паны, няхай толькі пачнецца. Мы ведаем, што рабіць. На Заходняй Украіне выбухнулі сялянскія паўстанні — сяляне паляць маёнткі, фальваркі, хутары асаднікаў. Славой-Складкоўскі — польскі Трэпаў — па загаду Пілсудскага паслаў ужо эскадроны войска, каб задушыць паўстанні. Пачалася гэтая работка ўжо і на Беларусі.

І вось клічуць... Клічуць старога Касцевіча, каб уцягнуць яго ў свае цянёты. Можа, наглядчыкам хочуць паставіць на шарварачных работах? Ёсць ужо такія наглядчыкі. Ходзяць з папкаю пад пахаю, як гусакі. Напрыклад, Барыс Капанец перастаў быць зборшчыкам падаткаў, спалохаўся папярэджання камуністаў, стаў наглядчыкам на шарварках. Не кіем, дык палкай.

Такім чынам, трэба ісці... І сеў стары Сцяпан паладзіць сабе боты. Не пойдзеш жа ў падраных. Трэба прышыць пару латак, падбіць кавалачкі скуры да падэшвы, якая пратапталася. Жонка Кацярына пайшла ў поле паглядзець лён. Павінна хутка прыйсці. І сядзіць Касцевіч адзін і пастуквае малатком.

А думкі самі сабою ўсё плывуць і плывуць.

Вось ужо трэці год, як сын Андрэй у турме. Ніколі ён не сыходзіць з памяці. Гляне стары Касцевіч на партрэт Радзішчава на покуце і заўсёды ўспомніць сына.

На чатыры гады турмы засудзілі сына. Ездзіў і ён — бацька — на суд, у Гродна. Ведае ён гэты горад, як і ўсе гарады на Беларусі, як і ва ўсёй Расіі. Нават прыемна было пабачыць яго, тут ён быў апошні раз у 1908 годзе.

Не тое цяпер, не тое... Тады ён ішоў у мундзіры тэхніка, працаваў на пракладцы чыгункі да Аўгустова, хадзіў на «изыскания» ў аўгустоўскія лясы, балоты. Эх, а цяпер... ішоў па тратуары з торбачкай у руцэ, а сын крочыў скаваны разам з другімі пасярод вуліцы пад канвоем. Потым сядзеў у зале суда прыціхлы, зрэдку пасярэбраны сівізною, і глядзеў, як праз імглу, на суддзяў, на ўсю цырымонію расправы. У перапынках падыходзіў да сына, выкладаў з торбачкі ежу, гаварыў пра жыта, пра авёс, пра тое, што зямлю парэзалі ўжо на хутары.

Пяцьдзесят чалавек конпай паліцыі ўварвалася ў вёску. Шмат людзей і яго самога пакавалі, папрывязвалі да платоў на вуліцы. Стаялі людзі, як пакутнікі, тварамі да плота, і аглянуцца нельга. Жанчын і дзяцей паласавалі нагайкамі. У многіх развярнулі печы, у тым ліку ў Дзям'яна Гарагляда, у Петруся Хадыкі... у Таццяны Ціханчук... Расказваў, што Макар Краўчук пайшоў на ваенную службу, прыслаў ліст да Любы. А Любу пабілі моцна нагайкамі. Паліцыянты прымушалі яе лезці на сваю ўласную страху і здзіраць яе. Яна адмовілася, усё ж такі не палезла. Ну, і накінуліся, як ваўкі. Дасталося і Маланні. Парабка Мікіты Лазуна — пастуха Сашу Грынявіцкага — таксама збілі, бо не захацеў бегчы ў другую вёску паклікаць солтыса... Гэта ў іх завецца пацыфікацыя...

Усё расказваў сыну стары Сцяпан, расказваў з дрыжаннем у сэрцы. Часам і сляза набягала на вока.

— Правільная ваша работа, сынку... Так жыць нельга, як жывецца... Але шкада маладосці вашай... Ой, шкада... Ну, як табе... не баліць нічога?

— Не... зарубцавалася ўсё... Вось гэтая маладосць, тата, яна і выратоўвае...

— Цяжка, сынку, цяжка... Солтыс Барсук сабакам стаў, даносіць на маладых паліцыі. І змяніць яго нельга... Цяпер раду выбралі нейкую ў вёсцы. Старшынёю Мікіта. Той клуб хочуць адпячатаць. Іхнія нейкія тэатры будуць прыязджаць. На ліха яны каму патрэбны... Бізуны... а потым тэатры... Новы поп у нас.

— Гэта я ведаў... Яшчэ ж тады... Як змясілі Шпака, то новы прыехаў. А вось у газетах нідзе ні гу-гу не пісалі пра бойку за царкву. Баяцца езуіты...

— У раду ўцягнулі і Рыгора Малахая. Нешта хлопцы кажуць, што і ён даносіць паліцыі. Лахудра гэтая... Бычка навучыў ездзіць... Запрагае ў каламажку на двух колах, з дугою, і ездзіць жабраваць. Падазраюць, што гэта

ён выдаў тады Пецю Ціханчука. Пеця ходзіць, але нічога рабіць не можа... Белы як палатно... Кашляе...

Слухаў сын і разумеў, бачыў выразна, што фашызм глыбока запускае кіпцюры на вёсцы. А бацька спяшаўся, імкнуўся выкласці ўсё, бо зараз скончыцца перапынак і зноў пачнецца расправа.

— Прывітанне табе ад дзядзькі Дзям'яна, ад Любы, ад дзядзькі Апупрэя, ад Нічыпара Байдака. Гэтыя дзядзькі цябе вельмі шкадуюць. Вось мёду слоічак — гэта Апупрэй даў... Ага... я і забыўся... Прыходзіў той малады поп Чадзюк. Пакінуў дваццаць злотых, каб табе перадаў... Я і браць не хацеў, але ён настояў. Відаць, чалавек нядрэнны. Пераглядаў твае кніжкі і доўга ўзіраўся на той партрэт.

— На Радзішчава? — падхапіў сын.

— Ага.

Усё, здаецца, расказаў стары... Але дзе там усё... Каб хоць збольшага. Ці варта казаць, як плакала маці, калі пачула пра арышт, як сумна, як цяжка было ў сям'і. Здавалася, што і ўвесь свет засмуціўся.

Усё ж такі Андрэй паспеў яшчэ спытацца, усміхнуўшыся:

— Ну, а як там, тата... шпакі жывуць?

Усміхнуўся і тата.

— Усё ж такі не забыўся... Жывуць, лятаюць. Зацягнуў старую барану на гумно, можа, буслы сядуць. Кажуць, шчасце ў дом...— гаварыў, праясцеўшы ад усмешкі, бацька...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Малаток — тук-тук аб падэшву. Стары Касцевіч накολвае яе шылам. Спыніцца над работай, аглядае свой зношаны бот і нічога не бачыць. Усё думкі засланяюць. Ну, вернецца сын з турмы... А далей што? Тое самае будзе. І кіне стары позірк на Радзішчава, які таксама глядзіць на яго, сочыць за яго рухамі і, здаецца, кажа:«Я не тое бачыў, грамадзянін... У вялікай неабдымнай Расіі — сялянскай, прыгоннай ужо няма «чудища»... Глядзі туды...» І стары, непрыкметна для сябе, пачынае ціха насвістваць нейкую песеньку, якая пераходзіць на голас:

То-о-о не ветер ве-е-тку клонит,
Не дубравушка шумит...

Рэдка-рэдка калі спявае стары Касцевіч адзін сам сабе.

А як засынае, то найчасцей вось гэтую — сваю любімую. Запала яна яму ў душу даўно-даўно і засталася назаўсёды. Прамяраў далёкія шляхі, жыў на поўдні і на поўначы, і заўсёды ў мінуты роздуму, адзінокай тугі прыходзіла на памяць вось яна — гэтая задушэўная песня. Тут і лучына ёсць, так, як дома, далёка ў глушы, у дзедаўскай хаце... І асеннія лісты...

Тук-тук-тук — малатком... Накол шылам... і песня...

— Эх!..— уздыхне сам сабе Сцяпан Касцевіч і наківае галавою. Вот ужо гатовы, трэба вымаць калодку, і рука палезла ў халяву. Нешта доўга няма Кацярыны з поля... А песня льецца далей...

Сыне, мой сыне... Каб хоць вы дачакалі чаго-небудзь... маладыя... А нам... мусіць, ужо... Эх...

Д-о-о-о-горай, моя-я лучи-и-ина,
Догорю-ю с тобо-о-о-ю я...

Нездарма спявае Сцяпан Касцевіч, нездарма...

* * *

Назаўтра рана Касцевіч пагаліўся, памыўся, расчасаў вусы, валасы. Паснедаўшы наспех, пачаў апранацца. Дастаў з скрынкі памятку мінулага — мундзір чыгуначнага тэхніка. Праўда, падношаны ён, ужо выцвілы, але ўсё ж такі мундзір. Рэдка калі надзяваў яго Сцяпан.

А цяпер, калі трэба ісці да начальства, хоць супроць волі, што ж адзець? Толькі гэта. Няхай паны ўбачаць, што і мы некалі штосьці значылі. Сцяпан апрануўся, і цьмяна-белыя металічныя гузікі бліснулі ў два рады эмблемамі — тапор-якар, тапор-якар накрыж... Рука нейк сама, як па прывычцы, пачала зашпільваць гузікі — хутка, без затрымкі. Пальцы прабеглі зверху ўніз, як па клавішах гармоніка. Нават выпрастаўся стары Касцевіч, стаў сабраным, паважным. Толькі шапку на галаву надзець з цёмным аксамітным аколышкам, з цёмна-блакітным верхам і кукардай — тапор-якар накрыж — і можна ісці на ўчастак, дзе чакаюць рабочыя распарадку дня. Але шапкі няма, ды і непатрэбна яна. Не на службу ж ідзе. Надзеў старую кепку, узяў кіёчак у рукі і сказаў Кацярыне:

— Ну, бывай... Не журыся...

— Не за свет жа ідзеш... Чаго мне журыцца? Даволі таго, што нажурылася за жыццё. Кожны год праводзіла

цябе вось у гэтых гузіках за свет. А сама адна ўсякае гора перажывала.

— Ну, ціха, ціха... Не мы з табой натварылі гэтага гора. Яму, бачыш, і канца няма. Ніяк мы яго не адолеем... Можа, чаго добрага, арыштуюць мяне, дык прыйдзі...

— Ой, каму ты патрэбен. Ім ёсць каго арыштоўваць без цябе.

— Ад паноў можна ўсяго чакаць. Ну, бывай... Не забудзь парасятам вікі нажаць.

І Сцяпан Касцевіч пайшоў.

Калі ішоў праз вёску, ішлося яшчэ так-сяк, а як апынуўся на глухім шляху, невясёлыя, тужлівыя думкі агарнулі старога. Куды ён ідзе? Да каго? Нашто? Да згубіцеляў сваіх.Ацяжэлі ногі, як быццам хто іх наліў волавам. Можа, вярнуцца? Што яны мне зробяць, старому? І Касцевіч прыпыняўся, скручваў цыгарку. Пры шляху — бярозавы лясок. Так і хочацца легчы тут і нікуды не ісці. Але пляцецца далей... з нагі на нагу... Супакоіўся крыху, калі думкі пабеглі ў мінулае. Убачыў сябе маладым — далёка, на быстрацечным бурлівым Днястры. Пачуў голас: «Касцевіч!» Нават азірнуўся — хто ж гэта кліча? Гэта ж голас інжынера Міхайлава, начальніка чыгуначнай дыстанцыі. Так, яго голас... І памяць уваскрасіла, як прымалі чыгуначны мост на Днястры. Сівы, суровы Міхайлаў ішоў наперадзе прыёмнай камісіі. Ён крочыў упэўнена і, здавалася, павольна, але інжынерыкі вымушаны былі ісці за ім подбегам, каб не адстаць. З камісіяй ішоў і ён, найлепшы тэхнік ва ўсёй дыстанцыі, Сцяпан Касцевіч. Інжынер Міхайлаў пільна ўглядаўся ўдаль, дзе ў іскрах ранняга сонца ільсніўся мост-прыгажун. І раптам, не даходзячы да моста, ён спыніўся і працягнуў руку так, як працягваюць палкаводцы на полі бою.

Інжынер Міхайлаў прамовіў:

— Той бок моста ніжэйшы... Праверыць...

Атарапелі інжынеры, аж дыханне ім заняло. Пераглянуліся паміж сабой. Аказалася, на занадачны карабок быў ніжэйшы адзін бок моста. Вось вам вока інжынера! Калі Сцяпан Касцевіч расказваў сваім сялянам гэтую інжынерную быль, тыя заціхалі, упадалі ў задуму і толькі ахалі: «Вось гэта дык... ах, ах...»

«Касцевіч! Куды ідзеш?» — зноў той самы голас. Сцяпан нават спыніўся і падумаў: «Ці не на ўчастку я?» Не... Маўклівы шлях. Направа цёмнае лес... Не. Ён чуў некалі гэты голас блізка, з вока на вока, калі прыязджаў на пра-

верку работ інжынер Міхайлаў. «Хто адказны за гэты ўчастак?» — пытаўся ён у інжынера. «Тэхнік Касцевіч»,— адказваў інжынер. «Узорны парадак... Адзначыць у загадзе па дыстанцыі...» — гаварыў Міхайлаў і ішоў далей. Эх, было, было... А цяпер... пляцецца прыбіты, загублены Касцевіч па шляху. Ідзе, як не сваімі нагамі. Вось ужо блізка і той палац, маячыць ён па-над лесам на гары, куды і трэба ісці.

Дрыжачаю рукою апёрся Сцяпан Касцевіч на парэнчу, каб падняцца на сходах на высокі ганак. «Іду, як на якую пакуту»,— падумаў ён сам сабе. Вось і вялікія масіўныя дзверы з рознай закручастай разьбою. Дзе здаралася бачыць такія дзверы? Не то ў Кіева-Пячорскай лаўры, не то ў Маскве. Сцяпан увайшоў у вялікую прыёмную з двума камінамі і трохручнымі залацістымі падсвечнікамі на сценах. Пісарчук за адзіным тут невялічкім столікам запісаў яго.

Калі паклікалі Касцевіча, ён жвава, як са сну, усхапіўся на ногі і, ідучы за нейкім панам, прыгладжваў рукою валасы. Так рабіў ён некалі, як уваходзіў у кабінет інжынера, каб далажыць аб ходзе работ на сваім участку. І тут, забыўшыся, што не туды ідзе, міжвольна хацеў прывесці сябе ў парадак.

У кабінеце старосты Касцевіч стаў ля парога і пакланіўся, нічога не кажучы. Сказаць «дзень добры» не пасмеў. Хто яго ведае, які тут вядзецца парадак? Можа, простаму мужыку і нельга першаму вітацца з панам?

Староста ўстаў і з момант не спускаў вачэй з мундзіра Сцяпана Касцевіча. Здавалася, што ён быў неяк і здзіўлены і азадачаны.

— Прашу бліжэй...— прамовіў ён, пераводзячы позірк з мундзіра на палатаныя боты. Глянуў на іх нібы мельком і хутка адвёў вочы. Асунуўся ў крэсла і запрасіў Касцевіча сесці.

— Т-а-а-к...— працягнуў староста,— гэта вы бацька Андрэя Касцевіча?

— Так, я...— адказаў Сцяпан.

— Як гэта магло стацца, каб сын такога паважнага чалавека, як вы, зрабіўся дзяржаўным злачынцам?

Сцяпан памаўчаў, заварушыўся ў крэсле, у якім яму рабілася не толькі цесна, але і душна, і прамовіў:

— Відаць, пане староста, не ён тут вінаваты ў гэтым. Я свайго сына заўсёды вучыў на добрае.

— А ён вось і выкалеіўся, пайшоў па дарозе злачынства, каб шкодзіць дзяржаве.

— Не, пане староста, мой сын людзям ліхога не думае. Ён думае, каб было лепш усім.

Староста заморгаў вачыма і на момант не ведаў, што казаць.

— Памыляецца ваш сын... Па блуднай дарозе пайшоў...

Касцевіч змоўчаў, пацісну ў плячыма.

— Дык вось што, пане Касцевіч, паклікалі мы вас... Хочам прыцягнуць вас да дзяржаўнай работы. Дзяржава карае, яна і мілуе... Ваша кваліфікацыя?

Сцяпан Касцевіч узняў вочы на старосту. Ён не разумеў гэтага закручастага слова «кваліфікацыя». Нешта не чуў ён яго за сваё жыццё.

Староста паўтарыў: «Ваша спецыяльнасць?»

Ну, гэта ўжо іншая справа, гэта зразумела.

— Чыгуначны тэхнік-будаўнік...— адказаў Сцяпан.

— Вы працавалі на пабудове чыгунак?

— Так...

— А шасейныя дарогі можаце будаваць?

— Магу...

— Масты?

— Таксама магу... І дамы магу...

Староста стукнуў па стале кулаком і ўсхапіўся з крэсла.

— І сын такога бацькі ў турме? Шкоднік дзяржавы! Гэта ганьба!

— Я ж яго, пане староста, у турму не саджаў... Ды ён і сам не прасіўся... Пасадзілі вось...— сказаў Касцевіч і развёў рукамі.

Староста закурыў і зноў сеў на крэсла.

— Ну, добра...— пачаў ён памяркоўным тонам,— усё гэта можна загладзіць, разумееце? Можна загладзіць... Вы згодзіцеся працаваць наглядчыкам на шарварачных работах па рамонту дарог? Будзеце мець добрую аплату...

— На шарварках...— адказаў адразу Сцяпан Касцевіч,— не... Не хачу... Гэта азначае нажыць сабе ворагаў сярод людзей. На гэтыя ж работы людзі выганяюцца, каб рабіць задарма.

Староста скрывіўся. Які ж нетактоўны гэты тэхнік. Няўжо ён наіўны?

— Што значыць выганяюцца? — буркнуў староста,— недарэчы гаворыце... Інтарэс дзяржавы гэтага патрабуе. Ну, але добра... Дык, можа, пойдзеце працаваць на пабудову шасейных дарог?

— Ну, гэта... можна падумаць..— крэкнуўшы, адказаў стары Касцевіч.

— Толькі адна ўмова, пане Касцевіч... Вы павінны будзеце набіраць такіх людзей, якія не замешаны ні ў якай антыдзяржаўнай рабоце... Што датычыць вашага сына, то мы пастараемся паўплываць на яго прысуд. Апеляцыйнага суда яшчэ не было?

— Не...

— Ну, вось... Колькі сыну засталося сядзець?

— Ды яшчэ... паўтара года...

— Я думаю, што на апеляцыі яму зменшаць прысуд. Ва ўсякім разе, не дададуць...

«Загаварыў мяне гэты пан... Што і не выкарабкацца»,— падумаў Касцевіч.

— Што да падбору людзей, тут я буду бяссільны...— пачаў гаварыць Касцевіч.— Як можна ведаць, хто што робіць, думае?

— У гэтым вам дапаможа кіраўнік следчай паліцыі... Трэба сачыць, трэба сачыць, бо ўсюды сягае камуністычная прапаганда... Вось нядаўна... Быў у нас на адной дарозе наглядчык за работамі. І што ж вы думалі? Хлопец і курсы дарожныя скончыў, ведае сваю справу... У торбе сваёй заўсёды, ездзячы на веласіпедзе, развозіў і раскідаў камуністычныя лістоўкі сярод рабочых. Аж пакуль яго не прылапалі... Вось я і... папярэджваю вас...

Касцевіч слухаў і, невядома як гэта здарылася, два разы закруціў галавою, а потым, калі староста скончыў, вырвалася ў яго, як быццам у душы адскочыла спружына:

— Мм... не... З паліцыяй я нічога супольнага мець не хачу,— катэгарычна заявіў ён.

— Ну...— сумеўся староста,— я з вас сышчыка рабіць не збіраюся. Ваш абавязак, калі што заўважылі, сказаць паліцыі. І толькі...

— А ці ж гэта не тое самае? — нават павысіў голас стары Касцевіч.

— Не... не...

Запала маўчанне. Староста закурваў, затым адчыняў шуфляды свайго стала, чагосьці шукаў. Усё гэта, відаць, рабілася для таго, каб падумацца, з якога боку яшчэ падысці да гэтага пасівелага тэхніка. Староста так нічога і не прыдумаў.

— Такі парадак. Такі парадак, пане Касцевіч. Як бачу, вам не шкада свайго сына,— вярнуўся да першага матыву староста.

— Маё шкадаванне бяссільнае, каб яго выратаваць з турмы.

— Мы ж вам хочам дапамагчы ў гэтым.

— Такою цаною?.. Не...— цяжка закруціў галавою Сцяпан, не вытрымаў, дадаў: — Сыны нашы ўжо разумнейшыя за нас... Яны ведаюць, дзе добрае, а дзе злое...

— Значыць, вы заадно са сваім сынам? — запытаўся староста і ўставіўся на Сцяпана.

— Супроць сына я не пайду, пане староста,— пакутліва-ўсхваляванa адказаў стары Касцевіч і апёрся на парэнчы крэсла, каб устаць.

— Ну што ж... гэта справа ваша... Будзеце шкадаваць аб сваёй памылцы,— штучна-абыякава сказаў староста.

Стары Касцевіч ужо стаяў перад сталом, апусціўшы рукі. Гузікі на падношаным мундзіры паблісквалі эмблемамі тапор-якар накрыж. Староста не мог на іх глядзець. Непрыдатнымі тут аказаліся гэтыя эмблемы, якія некалі гарэлі на сонцы ў стэпах украінскіх, у тайзе сібірскай, на шляхах Беларусі, Літвы і былі гонарам і славай. Як жа пайшло жыццё назад! Ссутулены ўжо стары Касцевіч, а тут перад сталом старосты выпрастаўся. «Глядзі, староста, на мяне, абвеянага розпымі вятрамі... Я прайшоў праз іх, каб апошнія гады свайго жыцця аддаць роднай мясціне... І тут аказаўся непрыдатным мой мундзір... Цераз вас, паны, цераз вас... Глядзіце на сваю нікчэмнасць...» — хацеў так сказаць Касцевіч гэтаму блішчастаму пану, але сказаў інакш:

— Замнога крыўды было і ёсць, пане староста, каб можна было дамовіцца... Трэба было пачынаць інакш з народам... Можа, што і было б... А так... не... Бывайце здаровы!

— Да пабачэння...— буркнуў староста сабе пад нос, перагортваючы паперы.

Ён нічога не мог адказаць. Ён не мог ужо знайсці сур'ёзных доказаў. Для яго засталіся зброяй толькі гвалт, прымус... Ішоў Касцевіч з староства ўжо злосны. Калі стрымліваўся, каб не выказаць злосці там, то цяпер на дарозе даў волю сваім пачуццям. «А хваробу вам, а не дарогі... Каб вам лягчэй было нашага брата лавіць... А хваробу...» Выціраў спацелы твар хустачкай і пляваўся. «Вы думаеце, людзі не ведаюць, нашто вы так узяліся за дарогі? Ведаюць, усё ведаюць... На Савецкую Расію зубы вострыце, крываніўцы... Патрушчыць яна вам косці... паспрабуйце...»

Ішоў стары Касцевіч у Глушэц. Ёсць справы — загадзя трэба іх упарадкаваць. Трэба зайсці да каваля Міхала, можа, плуг ужо гатовы? Заглянуць на пошту, можа, ёсць ліст ад Андрэя? Нешта даўнавата прысылаў. Як ён там... гэты няўрымслівы сын?

Пабываў стары ў Міхала, атрымаў і ліст ад Андрэя, і можна ўжо ісці дахаты. Не... яшчэ трэба зайсці ў валасць, даведацца, колькі ж плаціць за тое, што яму, як і ўсім, адмералі хутар. Мусіць, многа. Усё плаці і плаці. У валасці сустрэў ён знаёмых сялян з блізкіх і далёкіх вёсак. Ды і наогул Касцевіча ведалі ўсе. Расступіліся, вітаючыся, давалі яму дарогу. Адчувалася тут свая пашана да гэтага чалавека, які некалі «варочаў справамі». Кожнаму хацелася загаварыць з ім, перакінуцца словам, папрасіць парады ў чым-небудзь. Нават нехта сказануў у гутарцы: «Не свеціць цяпер твае гузікі, Касцевіч... Няма ім прастору...» А некалькі галасоў дадалі, як быццам уздыхаючы: «Ня-м-а-а...»

Скончыў свае справы Касцевіч. Развітаўся з сялянамі і выйшаў. Па дарозе недалёка ад валасці яго затрымаў паліцыянт.

— Прашу вас са мной у пастарунак...

— Чаго?

— Пан камендант мае справу да вас.

— Якую?

— Там даведаецеся... Я сам не ведаю...

Стары Касцевіч паціснуў плячыма і пайшоў за паліцыянтам. Далучыўся да іх шпік у цывільнай вопратцы, які звярнуўся да паліцыянта:

— Як ты яго вядзеш? Няхай ідзе наперадзе...

— Ну, навошта старога гнаць? Няхай ідзе так,— адказаў паліцыянт.

Стары зразумеў, што з ім будзе нешта дрэннае. Вунь і пастарунак. Доўгі падворак, абнесены цагляпай пабеленай сцяною. Белы дом са слупамі на ганку. Вось дзе жыве ўся каманда для катавання. Чаго ж яны мяне вядуць? І чаго мне было заходзіць у гэтую валасць?

Сеў стары ў пастарунку на лаўку і чакае. Чуе, як звіняць тэлефоны, як гавораць гарластыя галасы, тупаюць боты...

Усё нейкае нібы звярынае. Не ведаць лепш і не бачыць гэтага добрым людзям.

Як бура, вылецеў камендант, брухаты, з малою завостранай галавою, з вялікімі вушамі, з вочкамі навыкат.

«Ну чыста, як жаба на купіне...» — мільгапула ў Касцевіча.

— Дзе ён?! — крыкнуў камендант.— Ах, вось... То ты такі стары сабака? Га?

— Чаму ж гэта я сабака? — адказаў Касцевіч.— За што вы мяне так?..

— Бачыце? — зірнуў на паліцыянтаў камендант.— Умее, псяюха, гаварыць... Гм... Бачыце яго? І гузікі мае...

«Вось злыдні... божа, божа... Як вас зямля носіць?» — прыйшло на думку Касцевічу.

«Жаба па купіне» аглядала старога, мацала вачыма і пачмыхвала ў нос.

— Відаць, ты таксама марксіст, як і твой сын?..

— Не ведаю я гэтай граматы...— закруціў галавою Касцевіч.

— Не ведаеш?.. Гм... Пся крэў... Вось мы зараз даведаемся... Хадзі за мной... Пагаворым...

Пайшлі. Следам — некалькі паліцыянтаў. Прайшлі адзін пакой, другі, трэці. У чацвёртым камендант крутнуўся на адной назе тварам да Касцевіча і з размаху ўдарыў яго па шчацэ. Нехта штурхнуў пад бакі, нехта пад ногі. Стары ўпаў. І тут засвісталі нагайкі, гумы.

— Па гузіках яму, па гузіках...— камандавала жаба.

Пачуўшы такое, Касцевіч перакуліўся з боку на жывот — лёг на свае гузікі. І ўдары пасыпаліся па спіне.

— Даволі,— сказала ўрэшце жаба,— даволі старому. Падніміце яго... Га-га-га... не выратавалі цябе твае гузікі.

А потым з асалодай садыста пачаў гладзіць старога па шчацэ, прыгаворваючы:

— Ах, мой старычок... Пабілі цябе... Нічога, перастане... Даць яму вадзічкі напіцца... А то вось і кроў праліў за марксізм... Ах, мой божа... Што за няшчасце?

Стары Касцевіч сядзеў сагнуты, уставіўшы панурыя вочы ў падлогу. Валасы раскідаліся па лбе і звісалі серабрынкамі. Прынеслі вады, ён да яе не дакрануўся, нягледзячы на запрашэнні жабы.

— Абмыць яго! — загадала жаба. Паліцыянт, намачыўшы хустачку, выцер твар Касцевічу.

— А цяпер... выведзіце яго... Трэба ж дапамагчы старому...

Касцевіч устаў.

— Я пайду сам... Не турбуйцеся...— прамовіў ён стрымана, спакойна...

— Калі скажаш каму, што цябе білі, дастанеш больш,— сказала жаба.

Усе расступіліся і, як па камандзе, правялі старога Касцевіча вачыма. Следам за ім пайшоў аж на ганак толькі адзін паліцыянт.

...Нікуды не заходзіць, толькі нікуды не заходзіць... І ні з кім не сустракацца... Як-небудзь абысці галоўную вуліцу староною і — на шлях. «Ну што ж, адпомсціў пан за нязгоду... адпомсціў, сукін сын... Відаць, гэтага тут не мінеш... Але ганьба не мне, а табе, бліпчасты разбойнік у крэсле!» Так вымаўляў стары Касцевіч, прабіраючыся бакавою глухою вуліцай. Не хацеў нікуды заходзіць, аднак зайшоў. Якраз трапіла на вочы шыльдачка над дзвярыма зацішнага ў бэзах доміка з надпісам: «Піўная». «А!.. Зайду... лягчэй будзе...» І стары цяжкаю хадою ступіў на сходкі ганачка. У піўной, на шчасце, нікога не было з наведвальнікаў. Стары Касцевіч, стоячы, прагна выпіў вялікую чарку гарэлкі. Мілавідная гаспадыня паднесла, не пытаючыся, бутэрброд з кавалачкам каўбасы і ўсё запрашала сесці.

— Не маю часу, маладзічка,— адказаў Касцевіч, хоць самому і хацелася перакінуцца словам.

А гэтая маладзіца, як знарок, неяк асабліва ўзіралася ў старога Касцевіча, як быццам яна што сапраўды ведала. «Мусіць, мне толькі так здаецца,— падумаў Сцяпан.— Трэба ўцякаць...» Развітаўся з маладзіцай-гаспадыняй, якая быццам вось-вось хацела нешта запытацца, і выйшаў. На шляху ўжо стала вальней і лягчэй, хоць палявы вецер не раз змахваў з твару набягаўшую слязу. Узбіраўся стары на ўзгорак, знікаў за ім у даліне і зноў выплываў на роўнядзь — ішоў паволыгаю, ёмкаю ступою, несучы ў сабе праклянцці і жаль. Выняў з кішэні ліст сына і пачаў чытаць на хаду. Піша, што здаровы і вясёлы, што добра яму сярод таварышаў, што хутка будзе апеляцыйны суд. Просіць, каб тата і мама не сумавалі, каб шанавалі сваё здароўе. Эх... здароўе... Згарнуў ліст, глянуў навокал сябе... Чорная постаць крыжа кідае цень на скрыжаванне дарог. Спыніўся стары, кладучы ліст у кішэню. Глянуў навокал — пустынна і сумна. Скінуў шапку, і вольны вецер пачаў прыгладжваць яго пасярэбраныя валасы.

«Андрэй, сынок, адгукніся! Тут чатыры дарогі, адгукніся з якой-небудзь... Мне цяжка, сынок!» Стаіць Сцяпан Касцевіч і бачыць знаёмыя цёмныя вочы. Паміж бровамі раннюю маршчынку, якая нарадзілася над кнігамі ў асп-

нія і зімовыя ночы... А губы варушацца і кажуць: «Тата, ты ўжо ідзеш маёй дарогай... Іншай дарогі няма...» — «Сын мой, сын дарагі... Не паспець мне ўжо за вамі... Твая праўда, сынку, твая вялікая праўда!.. Жыццё наша распята, як вось гэты Хрыстос на крыжы... Трымайся ж, сынку, за свабоду... за свабоду!.. За Расію трымайся, сынку!..»

Гаручыя вочы глядзелі на Сцяпана, а губы вымаўлялі:

— На тое мы і ёсць!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Праз тыдзень захварэў стары Касцевіч.

* * *

Нудна, пакутліва ў хаце. Бзыкаюць мухі, б'юцца аб шыбы вокнаў. За вокнамі, на двары, шмат сонца, зеляніны, прысад і траў. А ў хаце пуста, адзінока. Усе ў полі на рабоце. Ляжыць адзін стары Касцевіч. І горача яму і млосна. На момант западае ў дрымоту. Але мухі не даюць заснуць. Вось і хвароба прыйшла. Толькі адзін раз у жыцці па-сапраўднаму хварэў Сцяпан. Гэта было яшчэ ў маладосці, калі ездзіў з бацькам красці альху зімою ў панскі лес і праваліўся пад лёд. Ледзь выратаваўся тады ад запалення лёгкіх. Але з таго часу ніколі ўжо не крапала яго хвароба. А цяпер... паклала... Паклала хвароба на запаленне мазгоў. Баліць галава і баліць. І гарачка. Каб хоць прыйшла хутчэй Кацярына. Людзі пачнуць зажынаць жыта. Лецечка пачынаецца. А ты вось ляжы...

Так і ляжыць Сцяпан днямі, калі адзін, а калі і Кацярына дома. Дапамагаюць у рабоце Малання і Люба. Ды і сам Дзям'ян Гарагляд. Выратавалі Дзям'яна на судзе адвакаты. Заблыталіся шпікі пад крыжавым агнём абароны. Шпік казаў, што Дзям'ян бег тады з дугою, а потым сцвярджаў, што з кіём. Выйшла так, што кій у вачах шпіка скруціўся тады чамусьці ў дугу... І ўвесь суд выбухнуў смехам. Так і вызваліўся Дзям'ян. Безумоўна, быў здаволены, рад. Прыйшоўшы да Сцяпана, сказаў:

— Яшчэ, брат, паноў можна ашукваць. Невядома, як далей... А пакуль што — бачыш... Папраўляйся хутчэй, папраўляйся. Яшчэ мы паваюем. Вернецца Андрэй... А аб рабоце не турбуйся. Зраблю, дружа, табе ўсё, як сам сабе. Ты дапамагаў мне... Заўсёды ішоў на выручку...

Усё гэта было так, але цяжка глядзець, калі ўсе працуюць, а ты — ляжы. Ластаўкі шыбаюць і шпакі... Буслы

заваліся на гумне, клякочуць. Усё жыве, радуецца жыццю...

Мучаюць прывіды — сны... успаміны... Галава гарыць, і кампрэсы не дапамагаюць. Што ж... жыццё пражыта немалое, ёсць чаму прыйсці на памяць. Западае ў паўсон Сцяпан... жыве як быццам папава, старым, пераЖытым. Часта з'яўляецца прад вачыма адно і тое самае. Шырокі ўкраінскі стэп, заліты сонцам. Удалечы сяло ў таполях... Белыя хаткі рассыпаліся над рэчкай. Цераз яе будуе мост Касцевіч. Рабочыя забіваюць палі пад «Дубінушку». Сцяпан, запісаўшы, на колькі паглыбілася паля, спяшаецца пад'есці. Есць свежыя памідоры, агуркі. Рассцілае газету на траве... Як гэта ўсё было смачна! Зараз павінна прыйсці з сяла чарнабровая маладзіца — удава Настуся. Яна яшчэ прынясе памідораў і кавуноў... Прасіў яе, каб высушыла насенне памідораў — трэба завесці дахаты, на Беларусь. Гэта ж такое дабро. А маладзіца Настуся прыходзіць часта, амаль кожны дзень. Гаворыць яна, як шчабеча, а рагоча так, што, здаецца, увесь стэп чуе. Рабочыя ажыўляюцца ў рабоце, усміхаюцца. І чуе цяпер, лежачы, стары Касцевіч з далёкай стэпавай далі песню ў гонар Настусі:

Эх ты, тетенька Настасья,
Загляни-ка к нам на счастье,—
Э-эх, дубинушка, ухнем!..

Нават забудзецца на момант стары пра боль у галаве, па вуснах прабяжыць усмешка. Заварушыць галавою — не... баліць...

А ў ціхі, цёплы вечар, пад нядзелю, усе рабочыя ідуць з гармонікам у сяло. Там многа дзяўчат, маладзіц, многа вішань, чарэшань, мальваў. Там і гарэлка ёсць, і сала, і белы хлеб пшанічны. Якое ж бяскрайнае блакітнае неба, і таполі, здаецца, купаюцца ў блакіце. Месяц-серпік — адкуль ён узяўся? — ужо глядзіць, ужо сочыць, як на вуліцы пад вішнямі адбіваюць гапака. Ці то вішні зашапацелі? Што за шум пранёсся па рабочых? Адзін пытаецца ў другога: «Што такое? Што такое?» — «Касцевіч пайшоў...» — «Хто?» — «Касцевіч... тэхнік...»

І ўсе глядзяць. Па кругу ўпрысядку плыве Касцевіч, аж шапка з кукардай з'ехала на патыліцу... Вось пайшоў Касцевіч, вось пайшоў... А насустрач сыпле яна, узяўшыся ў бокі, чырванашчокая, чарнабровая Настуся, адбівае гапака, аж зямля дрыжыць пад нагамі.

Запанібрата цяпер з рабочымі Касцевіч, хоць пасля-заўтра, пасля нядзелі, яны будуць спяваць яму:

Эх, мы техника уважим —
Горькой водочкой помажем...

А Касцевіч гамоніць, жартуе, шушукаецца з Настусяй, якая вядзе яго ў сваю хаціну...

Кашляне праз хворую дрымоту Сцяпан, і вырвецца глыбокі, працяглы ўздых. «Эх... няхай прабачыць мне Кацярына...»

Адно змяняецца другім. Імперыялістычная вайна. Па трывозе інжынерна-будаўнічая часць ідзе на дапамогу — на ахову артылерыі. Далёка-далёка чуваць глухія гарматныя раскаты. Беларуская вёска так прыціхла, нават павяла лісце на дрэвах. Строяцца, строяцца пехацінцы па вуліцы. Гарачыя шынялі ў скатку — на грудзях цераз плячо, лапаткі, кацялкі, драўляныя лыжкі за халявамі ботаў...

І штыкі вострыя, гранёныя — штыкі і штыкі... Малады паручык артылерыі па коні ўвесь час аб'язджае калону з крыкам: «Стройся! Стройся!» Урэшце падаў каманду аркестру: «Іграць «Разлуку»! І тады пад мелодыю ўскалыхнулася калона і пад каманду «А-а-арш!» рушыла, як адзін, усхваляванымі радамі.

Жанчыны, выціраючы фартухамі ручаіны слёз, праводзілі «салдацікаў-саколікаў», глядзелі, як пайшлі вусачы-земляробы — курскія, арлоўскія, смаленскія... палтаўскія, кіеўскія... гродзенскія, магілёўскія... Пайшлі ў завеі пясчанага пылу і ўжо спяваюць разам з аркестрам:

Разлука, ты, разлука,
Чужая сторона,—
Зачем нас разлучила
Немецкая война?..

Аднекуль коціцца, коціцца гарачая сляза на душу... Стане невымоўна цяжка, пакутліва, аж пакуль з глыбінь памяці зноў не выплыве вобраз якой-небудзь падзеі.

...Акопы пад Бабруйскам. Ціхі мяккі вечар цёплай восені. Абапал Слуцкай шашы баракі, палаткі, прадуктовыя пункты... Зборышчы салдат. Як стада сінякрылых птахаў, што асела ў дарозе, ляжаць і сядзяць пад канвоем ваеннапалонныя аўстрыйцы. А па шашы павольна, здаецца, ледзь прыкметна, пасоўваецца запрэжаная ў ваенныя калёсы пара сівых з мяккай поўсцю валоў. На калёсах сядзяць, пазвешваўшы ногі, восем салдат у пакамечаных шапках салдацкіх. Ва ўсіх характэрныя, апу-

шчаныя ўпіз, украінскія вусы. Магло б здацца на момант, што гэта едуць чумакі ў Крым па прывольным шляху. Не, гэта проста салдаты-ўкраінцы. Яны спяваюць... Спяваюць галасіста, звонка, на ўсе грудзі, без надрыву. Іх, здаецца, слухае ўсё — і людзі, і дрэвы, і палі, і блакітнае высокае неба... Эх жа, расспяваліся вусачы! І раты адкрыты, і вочы прыжмураны. А валы сівыя, як адзін, здаецца, знарок неяк разумна, ледзь нераступаюць з нагі на нагу, каб прадоўжыць надалей гэтае спеўнае шэсце мірных адвечных земляробаў, апранутых у ваенную вопратку, якія, убачыўшы валоў, пачулі сябе ў сваёй роднай стыхіі. І вось яны спяваюць, заліваюцца, і песня іх растае пад блакітнымі нябёсамі:

Ой, уроды, божэ, тай пшэны-чэ-э-ньку я-я-ру-у...
Н-а вдовины ді-і-і-ты ще й на лю-ю-ю-дскую сла-а-а-ву...

Усё прыціхла навокал, праводзячы сівых валоў са спевакамі. У кожнага заныла сэрца па сваёй радзіме. Заныла яно і ў Касцевіча, які стаяў пры шашы ў ваенным мундзіры тэхніка. Нават напісаў Кацярыне ў пісьме пра гэтых валоў і пра песню.

Ные сэрца цяпер, калі ён прыкаваны да пасцелі, і шкада, шкада чагосьці страчанага, дарагога...

— Кацярына...— азваўся Сцяпан.

— Чаго?

— Хадзі сюды... Сядзь ля мяне... Пасядзі трошкі...

Кацярына падышла, села, памацала галаву, абвязаную ручніком. Гарачая... Фельчар казаў прыкладваць лёд... А дзе ж ты яго возьмеш улетку? Зняла кампрэс, намачыла ў вадзе, прыклала...

— Нешта мне цяжэй сягоння, Кацярына... Усё сны нейкія адольваюць...

— Няўжо ты памрэш, Сцяпанка?.. Ты ж яшчэ і не такі стары. Няўжо я цябе перажыву? Яшчэ трэба жыць... З тваім стараннем, з тваёй цягавітасцю хіба можна паміраць?

— Ох, Кацярына... Што зробіш? Калі ўжо канец, дык канец...

— А хто ж будзе рана ўставаць? Хто будзе сеяць, араць? Хто ж зробіць лепш за цябе? Я ўсё жыццё пражыла на гэтай няшчаснай палосцы адна — без цябе гаравала, свету божага не бачыла... Было ж адзінаццаць душ у хаце, а я адна — жанчына... Абмый усіх, накармі, у поле пасней разам з людзьмі. Бывала, які грош ад цябе атрымаю, шчаджу яго. Тут і падаткі, і страхоўка, і напяць

трэба па жніво. Свёкар, твой бацька, просіць то па плуг, то на воз... Ох! Б'ешся, б'ешся як рыба аб лёд, і толку няма. Ды і купіць трэба было і сабе... Як у прорву ішлі гэтыя грошы... І знаку ніякага...

— Ох!..— уздыхнуў Касцевіч і слухаў далей.

— А цяпер,— працягвала Кацярына,— жывём ужо разам. Як яно ні ёсць, а ўсё ж такі разам. І мне лягчэй, зацішней... Не трэба паміраць, Сцяпанка. Можа, яшчэ дачакаем чаго лепшага. Не век жа будзе гэтая граніца душыць людзей... Адчыняцца дзверы ў Расію. Яшчэ папрацуеш... У цябе ж ёсць сынок Андрэй... У цябе ж рукі залатыя...

Так бедавала-прыгаворвала Кацярына над мужам, а ён ляжаў, заплюшчыўшы вочы, і прымаў яе словы, як гаючыя кроплі на раны.

Кацярына выцерла слёзы і сядзела моўчкі, углядалася ў твар мужа з заплюшчанымі вачыма, які неяк дзіўна прыціх, як быццам стаіўся. Кацярына спалохалася, можа, памёр ужо?

— Сцяпан...— спыталася яна,— ты спіш?

— Не...— сказаў Сцяпан,— мне стала лягчэй крыху... Можа, табе няма часу? Ідзі, рабі, што трэба... Я паляжу...

Кацярына памаўчала і, нешта прыпомніўшы, прамовіла:

— Спакою ўсё няма. Паліцыя ўжо трэці раз прыходзіць, шукае Петруся Хадыку. А ён прапаў недзе, як у ваду...

— Даўно няма? — спытаўся Сцяпан.

— Ды ўжо... нешта з тыдзень. Хата замкнёная...

— От... пайшоў недзе па людзях... іграе... Добры чалавек, верны... ды доля ліхая...

Кацярына пайшла. І зноў ляжыць Сцяпан адзін. І зноў мучаюць яго летуценні-прывіды.

Пад вечар пачаў трызніць Сцяпан. Ці праз сон, ці праз дрымоту ўскрыкнуў:

— Не, Рыгор Іванавіч!.. Не забуду!..

Кацярына падбегла, паглядзела ў твар Сцяпана. Ляжыць, дыхае няроўна. «Нешта здалося яму...— падумала яна,— не буду будзіць...» А сама ўсё роўна думала — хто ж такі Рыгор Іванавіч? І дадумалася. Гэта загадчык гаспадаркі камуны «Прамень» — там, на Паволжы, дзе Касцевіч, яе муж, год працаваў намеснікам Рыгора Іванавіча аж да голаду, да выезду дахаты.

Яшчэ тыдзень прамучыўся Сцяпан Касцевіч, яшчэ не адною з'явай са свайго жыцця трызніў ён. Але самай выключнай хіба была тая, калі стары ўбачыў сябе ў апошні год вайны на турэцкім фронце, калі ён ужо ў рангу прапаршчыка інжынерна-будаўнічых войск вёў абоз з Трапезунда ў Эрзерум цераз горны перавал. Начлег на вышынях над снегам... А потым тая горная дарожка над безданню... Злева — гара над хмары, а справа — бездань.

Касцевіч выняў ногі са страмёнаў і трымае на цуглях свайго маладога каня. А дарожка абледзянелая, пахілая да бяздоння. Конь храпе, пакоўзваецца падковамі... І вось пакаўзнуўся шырэй. І паляцеў... у прорву, а Касцевіч паспеў упасці на схіл гары... Але што за дзіва? Трызнячы аб гэтым у гарачцы, Касцевіч адчувае, што ляціць разам з канём... у прорву... у прорву... І вырвалася: «Ах!.. Кацярына... Дзеткі!..» Кацярына падбегла з крыкам: «Сцяпан, Сцяпанка, што з табою?» Схапіла за руку. А Сцяпан, набраўшы духу, яшчэ вымавіў: «Кацярына... галубка... жонка мая... Андрэй...» І пальцы ў руцэ жонкі сталі выпроствацца, халадзець. Рысы твару пачалі завострывацца.

— Сцяпан, саколік, не памірай! — крыкнула ў роспачы Кацярына і з рыданнем упала на халадзеючыя грудзі.

* * *

Ціхая ноч асцярожна сышла на вёску, і зоркі паціху пачалі запальвацца адна за другою. Застылі вастраверхія бярозы, стуліліся ў задуме. Пацямнелі вішнёвыя садкі. Бледны месяц прарэзаўся з сінявы, спыніўся і глядзіць на вёску, не хоча плысці ў сваё падарожжа. Сціхлі дзеці па хатах. Людзі хадзілі асцярожным крокам, задуманыя, некаторыя нават звесіўшы галаву. Не чуваць не толькі гучных гутарак, але нават і брэху сабак. А хто цэлы дзень не быў дома, а цяпер вярнуўся і пачынаў гаварыць па вуліцы на ўвесь голас, яго стрымлівалі: «Не крычы...» — «Чаму?» — «Памёр сам Касцевіч...» Чалавек зараз жа пераходзіў на паўшэпт, прасіў прабачэння: «Ну, я ж не ведаў... Ах, памёр...»

У вачах кожнага быў прыкметны той агульны для ўсіх смутак, што можна было б жыць яшчэ, а тут вось паміраць трэба... Хіба яму, Касцевічу, паміраць? Нават Мікіта Лазун позна пайшоў спаць — усё сядзеў на прызбе, курыў люльку за люлькай і думаў: «Смерць не ашчаджае нікога».

Дзям'ян Гарагляд, застаўшыся адзін у хаце (Маланля

з Любай найшлі дапамагчы Кацярыне ў яе турботах), не мог знайсці сабе месца. Пасядзіць, закурыць і пачне хадзіць узад і ўперад. І ўсё паўтарае: «Ах, Сцяпан, Сцяпан... Не час яшчэ было, не час... А думалася, што яшчэ дачакаем... адпомсцім і старостам і ўсім прахвостам... А тут? Але калі ўжо так сталася, не бойся, дружа. Твая сям'я — мая сям'я...» І не хацеў выходзіць на двор Дзям'ян, каб не чуць плачу з той хаты, дзе ляжыць, навекі заснуўшы, Сцяпан.

Пеця Ціханчук, выправіўшы маці да Касцевічаў, выйшаў, апіраючыся на кіёчак, бледны, худы, з тонкай шыяй, і сеў на прызбе. Да яго прыйшоў Саша Грынявіцкі.

Так сядзелі разам, гаворачы ўпаўголаса.. Сумавалі. Словы абрываліся, сябры змаўкалі ў смутку, пазіралі на дрыжачыя зоркі, што з нябеснага прастору навіслі над сумнай вёскаю.

Думалі, гадалі маладыя сябры, дзе ж падзеўся Пятрусь Хадыка? Няўжо дзе забілі паліцыянты? Не можа быць, каб забілі. Ён яшчэ з'явіцца, ён яшчэ пакажа сябе.

Доўга не клаліся людзі спаць. Дзям'ян Гарагляд, ужо крыху астыўшы ад суму, гаравання, пайшоў да Касцевічаў. Не сядзець жа адной Кацярыне пры старым — замарыцца бедная. Трэба яе змяніць, павартаваць апошні раз непрабудны сон сябра.

Праз некаторы час цяжкай, павольнай хадою прайшоў па вуліцы Нічыпар Байдак — падаўся таксама туды...

Прыйшоў бы і Анупрэй Чарняк, але позна вярнуўся з Глушца. Пачуўшы такую жалобную вестку, крыкнуў на ўсю хату: «Як? Памёр? Не можа быць!» І потым увесь час панура маўчаў.

...Вось і мінула цяжкая, маўклівая ноч. Толькі ў адной хаце мігцела праз вокны цьмянае пакутлівае святло. Там на лаве ляжаў галавою да партрэта Радзішчава будаўнік жыцця Сцяпан Касцевіч. Блішчаць пасярэбраныя валасы, прычэсаныя так, як і пры жыцці. Той самы зычлівы, лагодны выраз твару, толькі маршчынка паміж бровамі нахмурылася ў крыўдзе. Світанне бялёсай шэранню кладзецца на вокны, расплываецца па хаце неяк павольна, асцярожна — зганяе цені-змрокі са сцен, з рэчаў, з пабеленай печы. Недзе далёка, яшчэ за лясамі, выплывае агністае сонца... У хаце ціха, дрымотна. Кацярына стамілася ад плачу, заснула, стуліўшыся ля печы. Падрэмлівае Дзям'ян Гарагляд і іншыя прысутныя. Не дрэмле толькі Радзішчаў. Ён глядзіць з партрэта, не змаргнуўшы, задуменны і гнеў-

пы, як быццам перагортвае сваю кнігу, каб запісаць яшчэ адно «виденне» народнага жыцця. На акне, тут жа над Сцяпанам, ляжыць у белым канверце ліст. Калі пачалі прыбіраць Сцяпана, знайшлі за пазухай. Гэта апошні ліст ад Андрэя. Значыць, трымаў яго ўвесь час пры сабе. Кацярына сказала, што трэба будзе пакласці яго ў труну. Днее ўсё больш і больш... Пара б ужо ўставаць, Сцяпан. Лятаюць шпакі, ластаўкі шыбаюць, на гумне ў гамаздаватым гняздзе абудзіліся буслы. Недакончаны вулей стаіць пад павеццю. А там за гумнамі поле ў жытах і аўсах патрабуе твайго гаспадарскага вока. Клічуць цябе дарогі, клічуць сябры... Устань, раскажы пра архангельскія лясы і льды, пра камчацкія сопкі, пра стэпы Украіны... Не чуе ўжо нічога Сцяпан Касцевіч, ляжыць нерухома са скрыжаванымі рукамі на грудзях. Вось ужо і сонца пырснула ў вокны іскрамі вясёлкі, абмытае росамі. І чуваць, нібы праз сон, як зашумела жыццё над прасторамі. Буселдыгнач стаіць у гняздзе, пацягваецца крыламі, як чалавек рукамі, рыхтуецца да лёту.

Прыйшоў Анупрэй Чарняк і прынёс з сабою свежасць ранку, пах жытніх палёў. Стаў на адно калена, коратка памаліўся на покуць. Устаўшы, падышоў да Сцяпана. Нагнуўся над тварам і сказаў:

— Што ж ты, дарагі Сцяпан Паўлавіч, не захацеў жыць? Калі так, то і мы хутка пойдзем за табою... Ах, ах!..— Анупрэй паківаў галавою і сеў на лаве.

А потым хата стала запаўняцца людзьмі — пачалі прыходзіць не толькі са сваёй вёскі, але і з іншых — бліжэйшых і далейшых вёсак — мужчыны і жанчыны... Хто, увайшоўшы, маліўся, а хто проста аддаваў паклон.

Поўна людзей у хаце. Шумяць яны стрыманым гоманам на падворку і на вуліцы. Смерць Сцяпана Касцевіча зрабілася падзеяй для ўсёй ваколіцы.

Прыляцеў бусел і, узмахнуўшы крыламі, апусціўся на гняздо. Павёў дзюбаю вакол, потым стаў сваімі белымі грудзьмі да сонца і, ускінуўшы галаву ўверх — да неба, заклекатаў...

І неўзабаве людзі пачулі гукі скрыпкі. Хто гэта іграе і навошта, калі ў сяле нябожчык ляжыць на лаве?

Падбеглі дзеці і задыханыя перадалі:

— Пятрусь Хадыка з'явіўся... Іграе на страсе...

— Як на страсе? Чаму на страсе?

— Залез на страху хаты на самы грэбень, прыпёрся спіною да коміна і іграе...

Калі даведаліся, што гэта іграе Пятрусь, людзі пераселі здзіўляцца. Казалі: «Іграе нешта сваё... Але вось на страсе... гэтага яшчэ не было».

А Пятрусь сапраўды стаяў на страсе, сонечны, высокі, і струны скрыпкі звінелі над вёскай, зліваліся з клёкатам бусла ў адно. Гукі ліліся, як з крыніцы серабрыстая вада. Паплыў шум, як з вадаспаду. Хвалі мчаліся, даганялі адна адну, плылі над жытамі, прыпадалі да далін. Вырываліся на ўзгоркі, праляталі над вёскамі, танулі ў далёкім зубчастым бары, ірваліся да сонца... Гімн жыццю вялікаму іграе агністая скрыпка Петруся,— жыццю пражытаму, жыццю будучаму... Нездарма прыціхлі людзі і ўсё слухаюць і слухаюць, задуманыя. Прыціхлі дрэвы, прыціхлі птушкі... Усе ведаюць, чаму і для каго іграе Пятрусь!

# ЧАСТКА ПЯТАЯ

## Раздзел першы

## ДЗЕННІК АНДРЭЯ

*...ліпень 1932 г.*

Урэшце не церпіцца і мне... Хочацца пісаць дзённік. Гады адзіночкі робяць сваё. Чалавек пачынае ўсё больш і больш глядзець у сябе. Аналіз і самааналіз, упутранае, патайнае развітванне з юнацтвам, якога непамерна шкада. Ціхія крокі сталасці падкрадаюцца непрыкметна, але ўпэўнена... Разам з тым, як ні дзіўна, умацоўваецца перакананне, што маладосць не згасне ў душы... Не, без яе нельга... Без яе няма радасці жыцця.

Турэмная адзіночка як быццам стала мне домам. Кожная шчылінка ў дзвярах, кожная плямка на сцяне настолькі знаёмыя, што здаецца жывуць са мною разам — то калі весялеюць, то хмурнеюць.

Яшчэ ёсць кнігі, ёсць сшыткі... У трохпавярховым будынку семдзесят адзіночак. Толькі нешта ў пяці ці шасці адзіночках сядзяць крымінальныя, а так ва ўсіх — палітзняволеныя. Нягледзячы ні на што, усякая арганізацыйная, выхаваўчая работа вядзецца далей. Нават выдаецца часопіс «Голас палітзняволенага», хоць з вялікімі цяжкасцямі. Часта бываюць вобыскі... Нават па начах. «Маліны» нас выратоўваюць, «маліны»... Гэта так завуцца на турэмным жаргоне схованкі для нашых запісаў. Калі выкрываюцца адны, мы знаходзім другія.

...Не, штосьці не выходзіць у мяне з дзённікам. Лягчэй напісаць даклад да дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Усё раптам ціснецца, набягае пад пяро, і хочацца пісаць аб усім, з самага дня свайго нараджэння. Зайчыкам гуляе па сцяне прамень сонца — то заварушыцца, то заскача, то прытоіцца, сціхне. Гэта работа клёна вось тут недалёка за сцяной, на турэмным падворку. Я гляджу на яго раніцам, як толькі ўстаю, і ўвечары, калі сонца заходзіць за турэмныя дахі...

Бохаюць крокі па калідоры... Мусіць, ідуць па мяне

забіраць у карцэр. Учора я праглынуў пошту на вачах у наглядчыкаў — пошту з агульных камер ад хлопцаў. Заўважылі мярзотнікі, калі перадаў крыміналіст-падмятайла на прагулцы. Кінуліся адразу ўчатырох, схапілі за руку, хацелі адагнуць пальцы... Вырвалі б, каб я не ўкусіў «пшоловніка» за руку. І ў гэты момант кінуў у рот круглячок, зашыты ў беленькую палатнінку... Нічога... страўнік пераварыў...

Нешта прыціхлі крокі... Можа, сягоння не возьмуць? Але не... ідуць... Крокі па дошках — бох, бох, бох...

*...ліпень 1932 г.*

Кожную раніцу будзіць мяне кайданны звон за сцяной. Я пачынаю ўжо да яго прывыкаць. Гэта звоніць кайданамі Арцём Світка, які славуты тым, што зніштчыў Булак-Балаховіча. Яго трымаюць у адзіночцы ў кайданах і выпускаюць на прагулку перад снеданнем адпаго, найраней за ўсіх.

Вось ён і будзіць мяне сваімі кайданамі кожную раніцу. А я, як толькі пачую гэты звон, узлажу на табурэтку і гляджу ў акно, чакаю, пакуль Арцём не наблізіцца, каб прывітацца з ім.

Забіў Арцём Булак-Балаховіча, але не таго, якога трэба было. Самога ваякі якраз не было ў Белавежы, калі Арцём прыбыў туды, каб выканаць народны прысуд. Быў толькі ваякаў брат. Як пісаў у грыпсе да мяне Арцём? «Што ж мне было рабіць? Вяртацца ні з чым? Я падумаў: адзін чорт, адна зараза, што ён, што брат, усе з аднаго зладзейскага гнязда. Давай кокну яго, адным крывапіўцам менш будзе...»

Так і «кокнуў» Арцём брата рабаўніка, пагромшчыка Булак-Балаховіча. Уцячы не ўдалося, бо забіў ён яго ў людным месцы, недалёка ад лесапільні. Паліцыя гналася за Арцёмам на веласіпедах і дагнала. Судзіў яго надзвычайны суд — гэта значыць, судзіў на кару смерцю. Але адвакатам удалося збіць справу на звычайны суд. Арцём гаварыў на судзе, што ён забіў Булак-Балаховіча з палітычных перакананняў, помсцячы за тыя крыўды, якія ён панёс беларускаму народу. Арцём атрымаў пятнаццаць год катаржнай турмы. Пасля суда прыязджала да яго ў турму старая маці на пабачанне. Гледзячы праз драцяны бар'ер на сына, гаварыла з плачам: «Ой, сынок, што ж ты нарабіў? Загінеш у турме...» Арцём адказваў: «Нічога, мама... Не страшна... Кожны чалавек, які жыве на свеце, на-

вінен памерці...» О, Арцём, ты філосаф! Аптымізм твой сапраўды філасофскі.

Я помню твой адказ тады, калі я начаваў у цябе ў вёсцы Дубы, адказ на пытанне: «Ці ты член партыі?» Ты казаў: «Што мне ў партыі з паперкамі бавіцца? Мне б штурманупь што-небудзь».

Потым табе давялося «штурмануць» на дэманстрацыі камендапту пастарунка ў пераноссе. А потым паднянь мяне з зямлі... Я ўсё помню, Арцём, дзіўны ты хлопец! Вось дзе давялося сустрэцца, хоць на розных шляхах. Ты да свайго дабраўся, Арцём,— ты штурманўў цяпер не на жарты. Нехта паклікаў цябе на гэта. Ну што ж, ідзі шляхам герояў...

Сягоння на прагулцы я даведаўся ад Старога сякіятакія падрабязнасці пра Булак-Балаховіча. У час вераломнага паходу Антанты на маладую Савецкую рэспубліку гэты генерал ад разбою, назбіраўшы банду з дзянікінскіх і пятлюраўскіх галаварэзаў, разбойнічаў на беларускай зямлі — рабаваў, расстрэльваў, паліў вёскі, біў, гвалціў жанчын, чыніў яўрэйскія пагромы. Ва ўзнагароду за такую «выдатную» работу ўрад Пілсудскага падарыў гэтаму кату і рабаўніку дванаццаць тысяч дзесяцін лесу ў Белавежскай пушчы.

Так і ходзіць Арцём адзін на прагулцы, кружыць вакол клёна, паглядае на вокны адзіночак, вітаецца з хлопцамі. А кайданы на нагах усё бразгаюць і бразгаюць. Памагаем мы яму, як можам,— прадуктамі, нават адзежай. Нядаўна перадалі шкарпэткі і світэр. Не сумуе Арцём, не... Толькі шкадуе, што не забіў таго Булак-Балаховіча, якога трэба.

Пішу яму, каб чытаў кнігі, і называю якія. Пашлю яму «Ціхі Дон» Шолахава. Вось ён ляжыць у мяне на стале разам з кнігай Гладкова «Цэмент». Неўзабаве павязуць Арцёма ў Святы крыж, пад Кракаў. Там, у святакрыжскіх гарах, ёсць турма для вечнякоў... Не захацелі паны пасадзіць яго разам з палітычнымі. Лічаць яго крымінальным. Нічога, Арцём Світка ганарыцца сваім подзвігам. Карыстаецца любоўю, прыхільнасцю з боку палітзняволеных.

Арцём Світка — гэта баец, які жыве неўтаймаванай нянавісцю да паноў. Яму шэпча аб гэтым кожную ноч родная палеская пушча...

*...ліпень 1932 г.*

Вярнуўся з карцэра. Прабыў там чацвёра сутак. Палітычных саджаюць толькі ў цёмныя карцэры. Такі карцэр — гэта каменны мяшок у падвале даўжынёю два доўгія крокі, шырынёю адзін крок. Там абсалютная цемра. Сцены з вялікіх круглых каменняў, па якіх слізіць, сцякае вада. Калі дакранешся да іх, то адхопіш руку, як ад каравай, агіднай жывёліны. Відаць, гэта засталіся яшчэ манастырскія карцэры.

Карцэраў цэлы калідор. Ёсць і з вокнамі, і з падлогай, і без падлогі. Калі бывае масавае пакаранне, то тады запаўняюцца ўсе карцэры — і цёмныя, і з вокнамі. А гэта бывае найчасцей у час святкавання Першага мая і дня Кастрычніцкай рэвалюцыі. Частыя рэпрэсіі прымусілі спыніцца толькі на гэтых двух святах, бо раней святкавалі яшчэ дзень Парыжскай камуны, Жаночы дзень, Антываенны дзень. Усе гэтыя дні праводзяцца і цяпер, але толькі па камерах,— бываюць даклады і песні. Першы ж май і дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі святкуюцца дэманстрацыйна адкрыта. Тады бывае і біццё і масавае пакаранне карцэрамі.

...Хто сказаў, што чалавек слабая істота? Гэта няпраўда. Чалавек непамерна моцная істота. У цёмным карцэры — мяшку з каменнымі аслізлымі сценамі — цягнецца беспрасыпная ноч, ноч сырая, з пахам плесені, якогасьці сырога гнілля. Дзень у гэтай каменнай яме толькі адчуваецца. Чалавек убачыць на момант святло, калі адчыняцца дзверы і наглядчык падасць чатырыста грамаў турэмнага хлеба і кубак кавы.

А далей — няма ні абеду, ні вячэры. Застаецца толькі глухая падзямельная ноч, дзе пад скляпеннем такіх жа, як у сценах, каменняў сное чалавек у адзіноце. Думае, перадумвае аб усім прыгожым, што мінула, аб усім прыгожым, якое ёсць цяпер, і аб той прыгажосці, якая павінна прыйсці. Гэтая прыгажосць гаворыць: «Усё для чалавека!»

Моцная істота чалавек. Але тут напрошваецца пытанне — які чалавек? Нядаўна прывезлі ў турму і пасадзілі ў адзіночку мясцовага засцянковага шляхціца з доўгімі вусамі, з памятымі абвіслымі шчокамі. Яго выпусцілі ў прыбіральню разам з усімі. Быў яшчэ толькі ранак — пасля снедання. Гэты шляхціц мацаў галаву рукамі і вохкаў: «Ой, цось мі глова болі...» А потым пытаўся ў хлопцаў: «Панове, чы зараз обяд?..»

Хлопцы ўзарваліся смехам: «Што з вамі, пане? Які там обяд? Яшчэ ж толькі ранак...» Пасадзі такога шляхціца ў цёмны карцэр, ён там і адных сутак не вытрымае. А калі і вытрымае, то будзе запалоханы па ўсё жыццё. Шляхціц трапіў у турму за нейкія вэксальныя, банкаўскія аперацыі, і ўжо таму ён не моцная істота. Яшчэ да абеду пад'ехалі да варот турмы на шляхецкай калымазе яго сабутыльнікі і вызвалілі збянтэжанага шляхтунка, узяўшы яго на парукі. Ну што ж... чарговая аказія для п'янкі «за вызваленне прыяцеля». Будуць у рэстаране біць кулакамі па стале, выстаўляючы адзін перад другім свой гонар, а потым пальюцца слюнявыя чуласці і «святыя патрыятычныя слёзы». Мала гэтага, выйдуць з рэстарана шумнай чарадою і сядуць на калымагу — паедуць у фальварак. Там, каля нахіленых, амшэлых дзіравых платоў растуць грушы, яблыні, абгрызеныя козамі. І куры, куры... усюды палопчуцца куры. На ганак пахілы ганачак выйдзе пані гаспадыня ў белым карункавым каўнерчыку і, моргаючы стомленымі вачыма, будзе вітаць гасцей. А госці па чарзе будуць цалаваць ёй у брудную руку. Потым рассядуцца ў сталовай з нізкай, даўно не беленай столлю, пад партрэтам Касцюшкі, заседжаным мухамі. Касцюшка на партрэце падобны больш на анёла, чым на сапраўднага Касцюшку. Будуць піць, даядаць апошнія запасы прыяцеля і раіць яму, як падкупіць пракурора, суддзяў, каб выйграць справу. Трухлявы, праедзены моллю свет... Ад яго засталася толькі адна поза.

Так і не давялося шляхціцу дачакацца турэмнага абеду.

А ў карцэры зусім няма абеду. У карцэры нельга прылегчы, бо няма на чым, хоць і цягнецца без перапынку сырая, падзямельная ноч. Усё снуеш узад і ўперад, часам торкаючыся носам у слізкае, халоднае камення. Сядзеш у кутку на падлозе на мінут пяць, пакуль холад не дабярэцца да касцей, а потым зноў снуеш. Спіш у карцэры стоячы, прыхінуўшыся плячом да сцяны, або ходзіш з заплюшчанымі стомленымі вачыма, быццам плывеш дзе ў цемры невядомага свету. А ў вачах кружацца іскры... Выйдзеш з карцэра, хістаешся як п'яны, пакуль асвоішся з дзённым святлом, з наваколлем.

...А стары Паддубны мае ўжо многа сутак карцэра. Моцныя людзі камуністы, бо яны камуністы, бо яны павінны перамагчы стары свет. І яны пераможуць!

*...ліпень 1932 г.*

Канчаецца разгляд спраў сыпакоў. Гэтая работа звязана з вялікімі цяжкасцямі, бо народ збіраць немагчыма. Усё робіцца цераз перапіску, перастукванні, цераз выпадковыя сустрэчы ў прыбіральні, цераз скупыя гутаркі на прагулцы, дзе наглядчык не дае размаўляць.

Па-першае, трэба прачытваць пракурорскія акты абвінавачвання, каб ведаць ступень сыпацтва кожнага, па-другое, прачытаць самакрытыкі [1], а пасля гэтага ўжо вызначыць кару. А сыпакоў многа... Гэта ўсё ў большасці моладзь, якая не паспела загартавацца ў барацьбе. Вызваленчая барацьба мае сваю заканамернасць. Разам з узмацненнем тэрору яшчэ больш масавым робіцца рух. Заганяюцца ў турмы цэлыя атрады моладзі. Пачынаюць трапляць за краты ўжо і дзеці, нават маці з дзецьмі. Нядаўна пасадзілі ў адзіночку добрага русавалосага хлопчыка год васьмі. За што? Абвінавацілі яго ў тым, што ён, гэты вясёлы хлопчык, хацеў падпаліць пастарунак паліцыі ў сваім сяле. Прывялі ў турму і яго маці — маладзіцу, але яе пасадзілі асобна і не даюць пабачыцца з сынком. Калі наша крыло выпускаюць у прыбіральню, кожны з нас падыходзіць да дзвярэй адзіночкі хлопчыка, заглядае ў «ваўчок», каб пабачыць, што ж ён там робіць адзін? А ён не вельмі журыцца — то водзіць пальцам па сцяне, нешта «піша», то стаіць на стале і глядзіць у акно.

Аднойчы мы ўбачылі, як ён упёрся лбом у абабітыя бляхай дзверы і гудзе сабе і гудзе. Уяўляе, што барукаецца з кімсьці. Калі ж часам яго выпусцяць разам з намі (гэта залежыць ад таго, які наглядчык стаіць пры ключах), ён, босы, галопам бегае па калідоры другога паверха. Мы жартуем з ім, даём яму хлеба, масла, сала,— што ёсць у нас. Сказалі аднаму нашаму хлопцу, каб звязаў для яго панчохі са старых, мужчынскіх. Гладзім гэтага хлопчыка па падстрыжанай русай галоўцы, заглядаем у яго блакітныя чыстыя вочы. Нічога, дарагі хлопчык... Прыйдзе час — жалезныя дзверы адзіночкі будуць прабіты, і тады мы разам з табою адпомсцім праклятым буржуям, шляхце, праклятаму фашызму.

Учора прывялі яшчэ аднаго хлопца дванаццаці год, падпольнага піянера,— арыштавалі за распаўсюджванне лістовак.

---

[1] Гэтак называліся пісьмовыя прызнанні тых, хто пры допытах у дэфензіве выдаў якія-небудзь партыйныя тайны.

Ва ўсім нашым турэмным калектыве больш дваццаці чалавек старых — па пяцьдзесят, шэсцьдзесят год...

...Розныя самакрытыкі паступаюць ад сынакоў.

Ёсць халодныя, няшчырыя. Гэта ад ганарлівых, самалюбівых. Адкладаю ўбок. Ёсць слёзныя, дзе апісваюцца катаванні ў дэфензіве. Чалавек сам сабе не можа дараваць, што сыпнуў, і рве на сабе валасы. Клянецца выправіць свае слабасці ў будучым, хоць бы давялося памерці. Адзін, напрыклад, піша: «...Я стаяў адзін, акрываўлены, перад кáтамі... Хоць бы хто-небудзь са сваіх глянуў тады на мяне, і гэтага ўжо было б даволі, каб вытрымаць да канца...» Зразумела, таварыш... Адзіноцтва пакуты — самае цяжкае. У тваёй душы не хапіла адной кроплі, каб ісці да канца, можа, і да смерці. Верым табе, таварыш, што ты слабым больш не будзеш. У імя партыйнай, рэвалюцыйнай законнасці кáра для цябе будзе, але невялікая.

А вось самакрытыка Якава Кушалевіча — глушэцкага каваля, выкладчыка палітэканоміі ў турме.

Самакрытыка слёзная, інтэлігентна-нервовая, баязлівая, дрыжачая. Вельмі ж баіцца за сябе Якаў, вельмі баіцца... Што з табою рабіць, Якаў? Чалавек ты ў жыцці сумленны, тварыскі, але... слабінка ў душы адкрываецца, як клапан. Адкуль яна ў цябе, жылістага каваля? Я, можа, і адгадаю, калі скажу, што гэта ўсё ўплыў мяшчанскага асяроддзя, у акружэнні якога ты вырас. Зробім спробу, Якаў, але апошнюю — прапаную на парткоме выключыць цябе з партыі на адзін год, каб ты пазбыўся дрыжыкаў, мяшчанскай пустаты, якая табе не да твару. Ты не вытрымаў там, у глушэцкай дэфензіве, і ручаінамі слёз аплакаў сваё сыпацтва. Ты яшчэ не ведаеш, што я ўсё бачыў праз замшчылінку сцяны. І, нягледзячы на гэта, два пачуцці змагаліся тады ва мне — пачуццё злосці, абурэння і пачуццё... спачування. Чаму? Бо ты сумленны, Якаў. Местачковы быт, вядома, не мог даць табе гарту — мог даць і даў толькі бездапаможныя слёзы. Сілу ідэй ты ўзяў, Якаў, ад марксісцкай літаратуры, але яшчэ няма ў цябе той сілы, каб перакананні камуніста адстайваць у барацьбе, на практыцы, да канца. Я думаю, што партком згодзіцца з тым, каб на год выключыць цябе з партыі. За год ты павінен узняцца на вышэйшую ступень. Гэта будзе для цябе экзамен. А калі возьме верх у цябе мяшчанскае самалюбства, можаш страціць тое, што маеш,— можаш скаціцца ў балота.

Самакрытыка Ісэра Цукермана заслугоўвае асобнай увагі. Ён і ў турме стварыў сабе адменныя ўмовы. Ужо

трэці год сядзіць у турме і ўвесь час хворы... жыватом. Кожны дзень атрымлівае з турэмнага шпіталя булку і паўлітра малака. Гэтага яму, вядома, ніхто не шкадуе, але хлопцы ведаюць, што Цукерман вельмі сябе шкадуе, смяюцца, што ён ходзіць да фельчара падхалімнічаць, каб той і далей прыпісваў яму малако. Ёсць хлопцы сапраўды хворыя пасля катаванняў у дэфензіве і то гэтага не робяць... Ну, але Цукерман ёсць Цукерман, чорт з ім. Самакрытыка яго па намерах самая найбольшая. Ну і накруціў, накруціў. Самой самакрытыкі, па сутнасці, няма, а толькі фразы, фразы. Самакрытыку Цукерман пачаў чамусьці з дасягненняў Савецкага Саюза на шляху будаўніцтва сацыялізма. Потым пераскочыў да цытат Маркса, Жарэса, нават Каўцкага. Пасля высвятляецца, што ўсё гэта патрэбна было для таго, каб давесці, што не ўсе людзі аднолькавыя па сваёй фізічнай канструкцыі, па разуменню марксізма, якi, на яго думку, многія ператвараюць у бланкізм. Вось чаму ён, Ісэр Цукерман, не мог праявіць сябе на ўсю сілу ў Глушцы, бо яму перашкаджалі бланкісты. «Так, бланкісты»,— паўтарае Цукерман. І гэтае паўтарэнне гучыць, як стук кулачком па стале. Далей Цукерман кажа, што яго прызнанне ў дэфензіве нельга лічыць прызнаннем, бо паліцыя ўсё роўна і так усё ведала. Не, за даносчыкаў ён цярпець не хоча. Прэч з такой самакрытыкай! У партыі, Цукерман, ты не будзеш!

Наіўна-трагічныя самакрытыкі камсамольцаў. Яны пішуць малапісьменным почыркам, пішуць, як вінаватыя дзеці,— з болем, шчыра, хаатычна. Клянуцца адпомсціць катам-панам, просяць сабе кары. Ах ты, маладосць! Гартуйцеся, гартуйцеся, бо агню ў вас многа! Вось адзін піша: «Дарагія таварышы! Я вельмі люблю Леніна. І я вельмі вінават прад ім, бо прызнаўся ў дэфензіве пра два сцягі, хоць я іх вывешваў многа на гасцінцы, можа, больш дваццаці. Але сусед канфідэнт Краснапёрка данёс на мяне паліцыі, і мяне вельмі білі».

Зараз жа пераход да другога: «Я ніколі не хадзіў у царкву. Ведаю, што там ашуканства. Не падумайце, што я магу памірыцца з панамі».

Камсамолец заканчвае: «Дарагія таварышы! Прашу, мяне не шкадуйце, бо я вінаваты перад Леніным!»

...Свісток на абед. Стук у сцяну. Стукае Віктар Кухта. Прыкладаю вуха, слухаю. Морзе запрацавала: п-р-ы-е-х-а-ў т-р-а-н-с-п-а-р-т з В-і-л-ь-н-і, з Л-у-к-і-ш-а-к.

Выбіваю: многа?

— Д-в-а ч-а-л-а-в-е-к-і...
Ну і транспарт... Цікава...

*...ліпень 1932 г.*

Паддубны вярнуўся ўжо з другога суда. Судзілі аднаго. Атрымаў яшчэ дзесяць год. У гэтыя дзесяць уключылі і гады следства. Значыць, выйдзе з турмы недзе ў 1937 годзе, калі апеляцыйны суд не дадасць яшчэ. Але, напэўна, дадасць, бо пракурор падаў апеляцыю. Эх, Стары, хутка цябе вывезуць адгэтуль, раз ужо маеш прысуд.

Доўга ж валаводзіліся з табою, стары ты завадыяка,— падумаць — другі суд.

*...жнівень 1932 г.*

Выклікалі ў канцылярыю. Перадалі копію прысуду апеляцыйнага суда. Дадалі яшчэ год турмы. Гэтага трэба было чакаць. Ужо будзе пяць гадкоў. Выйду з турмы ўвосень 1934 года. Дадалі год Якаву — будзе мець чатыры. Віктару таксама год — будзе мець чатыры. Цукерману пацвердзілі ранейшы прысуд — гэты засліпены купчык хутка выйдзе. Невядома, як з Максімам Рундам, Захарам Зубцом, Марцінам Шапко. Гэтыя сядзяць у правінцыяльнай турме. Напэўна, першым двум дадалі, а Марціну... могуць пацвердзіць прысуд акруговага суда. Фашысты бяруць пад увагу і сыпку, і характар чалавека і, улічваючы гэта, робяць уступкі. У такіх выпадках ужо не лічацца з намерам «праступку» і што дыктуе артыкул кодэкса. Важна для іх падхапіць, так сказаць, на ляту хістанне чалавека і ўступкай абяззброіць яго зусім. Фашызм — гэта здрадліва-гнуткая тактыка. Фашызм шукае апоры ў псіхалогіі чалавека, падсцерагае ход яго думак і пачуццяў. На гэтым «участку» барацьба з фашызмам самая цяжкая. Яна патрабуе ад камуністаў не толькі пільнасці паогул, але шырокіх ведаў, эрудыцыі, каб здолець выкрыць прошукі фашызму ў любых абставінах, умовах.

З другога боку, калі «праступак» камуніста невялікі, але камуніст трымаецца стойка, з поўнай годнасцю змагара за вызваленне працоўных, фашысты не шкадуюць яму гадкоў турмы і могуць насыпаць столькі, што і не папясеш. Пакуль што абаронцы-адвакаты з дэмакратычнага лагера адстайваюць артыкулы кодэкса, хоць і ім гэта не заўсёды ўдаецца. Светлая асоба польскага дэмакрата-абаронцы палітзняволеных Тэадора Дурача знаёма кожнаму палітзняволенаму, як і ўсёй краіне. Дурач выратаваў Арцёма Світ-

ку ад шыбеніцы і многіх, многіх народных герояў. Захар Зубец, Іван Падаляка таксама абавязаны яму выратаваннем ад смерці яшчэ вунь калі — за лесапілку ў Залатой гары. Дурач бароніць толькі палітычных, спяшаецца ў кожны куток краіны, дзе над барацьбітамі навісла небяспека, і аб'ядноўвае навокал сябе адвакатаў дэмакратычных перакананняў. Кожны палітзняволены, якога бараніў Дурач, ганарыцца гэтым. Ганаруся і я, бо ён бараніў і мяне.

Але ўжо чуваць, што некаторыя суды знарок даюць вялікія прысуды тым, каго бароніць Дурач. Першыя пачаткі цкавання Дурача. Фашысты, безумоўна, будуць яго цкаваць.

На арэне юрыдычнай разгараецца барацьба двух лагераў — усё больш і больш адвакатаў-дэмакратаў гуртуецца навокал Дурача. У прэсе пішуць аб падрыхтоўцы новага карнага кодэкса, так званага кадыфікацыйнага, ужо адзінага для ўсёй Польшчы. Бо дагэтуль судзяць яшчэ па трох кодэксах. У той частцы Польшчы, што была пад Расіяй, судзяць па даўняму царскаму кодэксу, у былой нямецкай частцы — па нямецкаму кодэксу, а ў Галіцыі, што была пад Аўстрыяй,— па аўстрыйскаму. Новы кодэкс Польшчы будзе кодэксам фашысцкім. Роля абароны будзе зведзена ў ім, можна сказаць, на нішто. Трэба чакаць, што шмат хто з адвакатаў не міне турмы. Так развіваюцца падзеі. Фашысцкі тэрор усё больш уцягвае ў барацьбу ўсё новыя і новыя колы грамадства. На чале — камуністы.

Так... на чале — камуністы. Каго ж я сустрэў на калідоры турэмнай канцылярыі? Прыпёршыся да сцяны спіною, стаяў высокі чалавек з русай, ужо крыху пралыселай галавой. Блакітныя вочы, засяроджаны твар... Але твар... Што за твар? Худы, зморшчаны, як спечаны яблык. Васковы колер. Навокал вачэй маршчыны і маршчыны. Я прайшоў міма. Нешта зачапіла мяне ў позірку гэтага чалавека. Вяртаючыся з канцылярыі, я зноў прыгледзеўся да яго. Штосьці знаёмае на хвіліну дайшло да свядомасці і зноў знікла. Я хацеў ужо ісці, калі гэты чалавек, не спускаючы з мяне позірку, прамовіў: «Анатоль... Гэта ты?» і ўсміхнуўся.

— Няўжо? Няўжо гэта ты, таварыш Васіль?

— Як бачыш...

Мы ціснулі рукі адзін аднаму. Наплыло столькі пытанняў, што хацелася выказаць іх адразу.

— Як гэта? Адкуль? З Вільні?

— Так, з Вільні...

— Чаму ж ты такі худы, зморшчаны?

— Пасля дзевяцідзённай галадоўкі... Сяго-таго вывозяць.

— Як з галадоўкай? Выйгралі?

— Не...— неяк балюча закруціў галавою Васіль,— прайгралі... Здалі фронт барацьбы... А... мярзотнікі...

— І там ужо зраўнялі палітычных з крымінальнымі?

— Не... Утрымліваецца стан рэчаў такі, які быў перад галадоўкай,— кніжкі толькі з турэмнай бібліятэкі. Сшыткі, чарніла, газеты — індывідуальна — каму начальнік захоча, таму дасць, прагулка — адзін за другім, трыццаць хвілін у дзень, спатканні з раднёй — дзесяць. Здалі фронт... Можна было яшчэ трымацца...

Я слухаў, гледзячы на таварыша Васіля, у якім пачаў пазнаваць тую характэрную для яго ўсмешку, калі смяюцца толькі адны вочы.

Васіль працягваў:

— Ніякай медыцынскай дапамогі пасля галадоўкі. Нарылі фасолі... Знарок... Два таварышы памерлі ад завароту кішак... Фашызм азвярэў...

Я слухаў і маўчаў.

— Пачынаецца наступленне фашызму на правы палітзняволеных ва ўсіх турмах... Падрыхтоўка да ўвядзення фашысцкага турэмнага рэгламенту...

У Лодзінскай турме галадаюць ужо дзесяты дзень... Невядома, чым скончыцца. У Грудзёнцы галадоўку выйгралі... Начальнік Віленскай турмы награжае нашым некалькім таварышам, у тым ліку і мне, судом за арганізацыю галадоўкі і дапамогу з волі. Ля турэмных варот адбылося пяць дэманстрацый вільнян. У двух выбухнула бойка з паліцыяй. Дэманстранты сцягвалі паліцыянтаў з коней, закідвалі каменнем. Ёсць параненыя з абодвух бакоў...

— Вось яно як... У нас пакуль што рыхтуецца адміністрацыя... Мы таксама рыхтуемся,— адказаў я.

Выйшаў мой паглядчык, і мы гутарку спынілі, развіталіся. Васіля, безумоўна, пасадзяць у адзіночку... Усё ж такі ў канцы гутаркі Васіль паспеў спытацца:

— Ці тут сядзіць Соня Качаноўская?

*...жнівень 1932 г.*

Часам прыплывае ў душу безвыходная туга. Гэта асабліва бывае ў летнія месяцы, пасля вячэрняй паверкі, калі

ўжо на ўсю ноч замыкаюцца дзверы. А па свеце яшчэ гарыць сонца, недзе палі шумяць збажынаю, недзе пралеглі дарогі праз пералескі і лясы... Як гэта ўсё адышло далёка! Адышло — як па той бок быцця. Здаецца, нам ужо, вязням фашызму, неяк не да твару думаць, тужыць аб тых прыгажосцях, якія з'яўляюцца адзнакаю жыцця на волі. Але, дзякуючы таму, што ты вязень, яшчэ вастрэй перажываецца ў душы хараство прыроды — усплываюць вобразы і вобразы, і на дарозе сярод маляўнічых палёў прыветна бліскае насустрач яна — усмешка маладосці. Як гэта ўсё адышло далёка! У такія хвіліны снуеш па камеры, не ведаеш, дзе сябе дзець. Ляжаш грудзьмі на жалезны ложак, прыкаваны да сцяны, ляжыш, пакуль перабаліць, а потым, устаўшы, зноў снуеш. Тады сыходзіць на думку песня. Я ўсё часцей і часцей пачынаю задумвацца аб тым, чаму песня мае такую цудадзейную сілу? Мусіць, на свеце няма чалавека, які б не любіў песні, мала таго, які б так ці інакш не тварыў яе.

Усё часцей і часцей спяваецца, нават непрыкметна для сябе. Таму, відаць, непрыкметна і сыходзіць супакаенне. Гэта перажываю не толькі я,— гэта перажываюць усе зняволеныя. Нада мною, на трэцім паверсе, сядзіць Паддубны. Я ніколі не чуў, каб гэты чалавек спяваў. Глянуўшы на яго, нельга падумаць, што ён можа бавіцца песнямі. Аднак нават у апошні час часта чуваць зверху, як ён цягне мелодыю ў пасляпаверачныя гадзіны. І ўсё амаль адну і тую ж. Калі стане ля акна, можна разабраць і словы:

...Скрыла, скрыла храброго Чапая
Мутная волна-а-а...

Песня абуджае, песня радуецца, шкадуе, песня любіць, плача... Песня — вялікая сіла! Пазаўчора я аж усхапіўся з ложка, пачуўшы знаёмую мелодыю, якую чуў даўно-даўно, яшчэ ў маленстве, у сваёй Запаляпцы. Песня лілася з радыёрэпрадуктара, які турэмная адміністрацыя павесіла на клёне, каб у нядзелю зняволеныя слухалі касцельныя літаніі з пазнанскага кафедральнага касцёла. І раптам у гэтыя праклятыя дзікія літаніі ўварвалася песня:

Ой, у лесе, пры лужку,
На зялёным полі,
Пры знаёмым табуне
Конь гуляў на волі.

Я не верыў сваім вушам. Слухаў — так, яна. Усё дакладна. Я ўскочыў на табурэтку да акна, калі ўжо спявалася звонкім тэнарам страфа:

Стукні, грукні, сівы конь,
Ў дзверы капытцамі —
Ці ж не выйдзе дзяўчынанька
З чорнымі брыўцамі?

Што робіцца насупраць, у будынку агульных камер! Крымінальныя ўкрылі вокны, лезуць адзін на другога. І такая настала цішыня, якой гэтая турма, можа, даўно не перажывала. Усе слухалі песню. Віктар пастукаў мне ў сцяну і зараз жа крыкнуў у акно:

— Нехта дарваўся да радыё...

Такая цішыня звярнула ўвагу наглядчыкаў на вежах. Пачалі зганяць слухачоў з вокнаў. Але ніхто не скрануўся з месца, не паслухаўся. Паддубны зверху сказаў амаль на ўвесь голас:

— Добра... Ой, добра...

Аж шпаркім крокам, амаль подбегам, высунуўся з-за вугла Кручоны. Дакрануўся да рэпрадуктара, і песня змоўкла. Глянуў вакол і крыкнуў: «З вокнаў!» Адзін крыміналіст крыкнуў у адказ:

«Песню давайце! Нашто замкнулі?!» Кручоны памахаў пальцам на вокны крымінальных. Наглядчыкі з вежаў пачалі дзіка крычаць: «З вокнаў, пся крэў!»

Знайшоўся нейкі чалавек, рызыкнуў дапусціць беларускага спевака да мікрафона, а тут падышоў хам і ўсё спыніў. Песня прагучала, як рэха часоў — далёкіх, народных... І таму блізкіх. Віктар выступвае: «От с-в-о-л-а-ч...» Гэта аб Кручоным. Я прылёг на ложак і на момант забыўся аб усім — у грудзях гарэлі пачуцці, абуджаныя песняй. Думкі самі сабою ляцелі да шэрых, саламяных хат, да народнай пядолі. А крымінальныя тым часам пачалі песню сваю, нейкую шырокую, разбойна-лірычную.

Я ляжу, заглядзеўшыся ў столь. Ці то мярэжыць у вачах, ці ўжо вечар апускаецца на турму? Хораша ляжаць і слухаць, як песня то ўзвышаецца, то замірае на апошніх словах, каб выбухнуць нанова шматгалосым хорам. Цішыня на двары. Даходзяць словы песні:

Одиночка, моя лиходейка,
До чего ж ты меня довела?

І хор шугануў праз краты і сцены:

Молодецкую жи-и-изнь загубила,
Арестантом меня на-зва-ла-а-а...

Слова «пазвала» цягнецца доўга на лірычнай ноце, быццам растае пад небам. Удальствам і тугою па свабодзе поўна гэтая арыштанцкая песня, народжаная яшчэ, напэўна, у Аляксандраўскім цэнтрале.

Ужо цямнее. Наглядчык крычыць: «Перастаць спяваць!»

Песня ж не слухаецца. Яна разгулялася не на жарты — будзіць, калыша, як на хвалях. Вось зноў размахнулася. Як шквал, вухнула па кратах.

Прыйшоў Кручоны, прыгразіў карай, і песня сціхла. Кручоны доўга распякаў наглядчыкаў за паслабленне ў службе. А ў большасці наглядчыкі самі любяць слухаць песні і часам толькі для выгляду крычаць, пакуль не з'явіцца страж пекла Кручоны.

Ужо цёмна, а я ўсё хаджу і хаджу. Хутка павінна ўжо выйсці на волю Надзя-Вольга...

Выйшаў бы і я, але яшчэ годзік дадалі паны.

Куды панясе нас лёс потым? Той самы шлях, цярністы шлях, але слаўны, непрымірымы.

Нечага стукае Віктар, мусіць, засумаваў...

*...жнівень 1932 г.*

Свет не без добрых людзей — гаворыць прыказка. Наша сувязь яшчэ працуе. Атрымалі прывітальны ліст з Савецкай Беларусі, з Бабруйска, ад Мопраўскай арганізацыі, якая шэфствуе над нашай турмою. Мы не толькі чытаем гэты ліст, але і мацаем пальцамі. Гэта ж прыйшло адтуль, з Савецкай краіны. Сапраўднае свята ў нашых адзіночках. На прагулцы толькі і пытаюцца адзін у другога:

— Чытаў?

— Чытаў...

Прыўзняты, бадзёры гаманок плыве па пляцы. Маці-радзіма помніць аб нас...

*...жнівень 1932 г.*

Учора раздаўся па падворку крык: «Бачнасць!», за якім пачуўся крыклівы рапарт. Усё страпянулася пасля такой каманды і замёрла. Прыйшоў пракурор, з ім начальнік і ўся світа. Пайшлі ў агульныя камеры. Я глядзеў у акно. З другога паверха процілеглага будынка стаў у акне наш хлопец і пачаў сігналіць пальцамі. Лаўлю, прымаю. Разбіраюць нашу бібліятэку. Перадаю Паддубнаму, Віктару. Сцены загаварылі на мове Морзе. Вестка паляцела

ва ўсе адзіночкі. Рашэнне прынята па ляту — патрабаваць пракурора, пратэставаць супроць разбурэння нашай бібліятэкі. Рашэнне па Морзе аблятае ўсе адзіночкі. Званкі амаль адначасова зазванілі з адзіночак. Пачаў хадзіць наглядчык. Заглядаў у «ваўчкі», пытаўся, у чым справа. Адказвалі: «Патрабуем пракурора!» Пракурор прыйшоў. Кожны заявіў пратэст. Адказ пракурора быў такі: «Бібліятэкі ў турме не належана. Тут не універсітэт, а турма. Можна трымаць кніжкі індывідуальна — забірайце, кожны свае... Інакш будуць забраны ў турэмную бібліятэку, у дзяржаўны фонд».

Вырашылі пакуль што кнігі разабраць па адзіночках.

*...жнівень 1932 г.*

Прыехалі Захар Зубец, Марцін Шапко, Максім Рунда, Іван Падаляка. Усіх пасадзілі ў адзіночкі. Смешны інцыдэнт атрымаўся з Захарам. Ужо даўно ўведзена адміністрацыяй у парадку паступовага скасавання правоў палітзняволеных, што пры выхадзе на прагулку, як і пры вяртанні з прагулкі, наглядчык робіць вобыск у кожнага. З гэтай нядоляй, вядома, упершыню сустрэўся і Захар. Яго абшукваў наглядчык у адзіночцы перад прагулкай. Захар, насуплены, сачыў вачыма за кожным рухам наглядчыка, які яго абмацваў, глядзеў пад пахамі, у кішэнях. Скончыў наглядчык, Захар спытаўся: «Усё?» — «Усё»,— адказаў наглядчык. А Захар: «Як усё? Не, не ўсё... Яшчэ ў с... заглянь...» Наглядчык зазлаваў. Эх, Захар, што ты нарабіў?

Цяпер кожны раз гэты самы наглядчык прымушае нас скідаць сарочкі і расшпільваць штаны. Узмоцнена сочаць па начах, калі ў рух ідуць нашы «коні» [1], перавозяць прадукты, бо дзяліцца адкрыта ежай ужо не даюць. Калі заўважаць, канфіскуюць прадукты і караюць. Фашызм і ў турме баіцца калектыўнасці, фашызм ведае, што дзяліцца прадуктамі, адзежай — гэта ўжо бадай камуна.

Ах, Захар, Захар, ходзіш ты на прагулцы, як вінаваты, і ўсё дудзіш мне, ідучы ззаду: «Ну, я ж не ведаў... Гляджу, лезе ў кішэні... Што ты тут паклаў, што? Чаго ты лезеш! Ах, ах, што я нарабіў... Усякае глупства мае значэнне... От, фашысты...»

Пытаюся: «Як трымаўся Падаляка ў вашай турме?»

---

[1] «Конь» — шнурок для перасылкі ежы з камеры ў камеру праз вокны.

— А так... нічога... Як бог ён там пахаджваў, крыху вучыў хлопцаў.

— А Марцін?

— З гэтым у мяне была не адна сварка... Не магу я яму даравацць сынку ў дэфензіве. У турме шмат балбоча. Калі прыйдзе пракурор, дык ён з ім... аб розных правах, законах... Мы ўжо яму кажам: «Караней і мацней...» Не... ён як пачне разводзіць, нават да евангелля дойдзе. Дык мы апошнім часам выбралі другога хлопца для размоў з пракурорам і начальнікам.

— Палітычна як ён? Падвучыўся крыху?

— Падвучыўся, чаму не. Але... усё нейкай саладжавай вады многа ў яго гутарцы. Даручылі мы яму адзін раз зрабіць даклад у дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі. Нешта з гадзіны тры гаварыў, патаміў усіх... Гаварыў пра фабрыку-кухню ў Мінску. Кажа, што там, на гэтай кухні, людзі нічога не робяць. Усё робяць машыны: бульбу абіраюць, суп у міскі наліваюць, пасуду мыюць... Усё — машыны...

— Ну... гэта можа быць, Захар... Механізацыя ўводзіцца...

— Марцін казаў, што гэта электрычка нават усё адпраўляе... Накшталт таго, што нейкую кнопку націснуў, і электрычка павезла абед у дом, у які трэба.

Я засмяяўся і сказаў:

— Штукар Марцін... Ніякіх кнопак... Яму на прызбе мужыкам казкі расказваць.

— Я к таму кажу, Андрэй, што трэба расказваць так, як ёсць. Савецкі Саюз выдумак не патрабуе. Гэта нават і крыўдна для яго.

— Правільна, Захар, правільна...

— Хіба мы чужыя для Савецкага Саюза або якія дурні, каб нас пампаваць выдумкамі? — гаварыў Захар з абурэннем.

— Як хлопцы рэагавалі на гэтую кухню?

— Усё роўна бралі на крытыку Марціна.

— Бачыш, Захар, ад народа, як ні круці, а праўды не схаваеш...

— Ну, вядома, што так...

— А Рунда як трымаўся?

— О, гэты... гэта моцненькі хлапчык. Адабраў ад Падалякі порцыю сала.

— Як адабраў?

— А так... Хлопцы перад нашым прыездам ад сваёй

дабраты Падаляку, як свайму настаўніку, выдзялялі падвойную порцыю сала... А ён, гэты настаўнік, і паядаў.

— Фу, фу... паскудства гэта, Захар.

— Паскудства не паскудства, а так было. Рунда на нарадзе камеры запратэставаў супроць гэтага, як ён казаў, хабарніцтва... Нават і цяпер яшчэ злуецца Падаляка на Рунду.

— Няхай злуецца... Тут Падаляку хабараў не будзе.

*...жнівень 1932 г.*

Начныя перастукванні здаюцца голасам з-пад зямлі. Асабліва ў цёмную глухую ноч, калі ўся турма робіцца злавесна ціхай. Крокі наглядчыка за сцяною гучаць выразна і асцярожна, як быццам хто падкрадваецца. А з глыбіні, аднекуль здалёк, здалёк далятае: тук-тук-тук... тук-тук... Нехта нястомна, бесперапынна прабівае сабе дарогу на волю... на волю, да жаданай свабоды. Ляжыш і слухаеш — чый гэта голас? Хто не спіць у турэмнай цемры? Тук-тук-тук... тук-тук...

Наглядчык на калідоры, відаць, дрэмле.

Мы з Віктарам перастукваемся часта. Жартуем па Морзе, смяёмся, бачым праз сцяну выразы твараў адзін аднаго. Віктар... Харошы, здольны хлопец Віктар. Калі што даводзіць, дык адна асалода яго паслухаць. Ведае добра лацінскую, французскую мовы. Ведае на памяць «Яўгенія Анегіна» Пушкіна. Бо Віктар быў вучнем Віленскай беларускай гімназіі. Пры ўсім гэтым Віктар цудоўны танцор. Калі сядзелі разам яшчэ ў агульнай камеры, дык Віктар вечарамі такое выробляў, танцуючы «пад грабёнку». Віктар — ахвяра дырэктара гімназіі Радаслава Астроўскага. Не ўдалося тады глушэцкай паліцыі захапіць Віктара — паспеў уцячы ў Вільню. Тэлеграма дагнала яго там. Астроўскі выклікаў Віктара ў кабінет і сказаў:

— Кухта, дзве табе дарогі: пакідай камсамол... А як не хочаш, праганю з гімназіі.

Віктар камсамола не пакінуў, пайшоў разам з таварышамі. Цяпер у турме, ён ужо член партыі, хутка выйдзе на волю. Гімназія ў Вільні перастала існаваць, пераўтворана ў філіял польскай гімназіі імя Славацкага. Пад кіраўніцтвам слуг дэфензівы — Астроўскага і Луцкевіча — дабіваюцца да канца апошнія гурткі Таварыства беларускай школы — канфіскуюцца бібліятэкі, забіраюцца беларускія кнігі ў паасобных членаў, закрываюцца ўправы. Людзі пад канвоем усё плывуць і плывуць у турму. За

кошт закрытых гурткоў ТБШ узмацняецца беларуская хадэцыя — адзін з рэзерваў фашызму.

Астроўскі так скампраметаваў сябе ў Вільні, што ўцёк і жыве недзе ў Лодзі. А Луцкевіч закладае новую культурна-асветную арганізацыю пад назвай «Таварыства беларускай асветы» — ТБА — прафашысцкага напрамку, якую наша дэмакратычная прэса акрэсліла — «Таварыства беларускай атруты» — таксама ТБА.

Тук-тук-тук...— слухаю, Віктар. Пачуў наглядчык. Скрыганула крэсла. Крокі. Я лёг і закруціўся ў коўдру. Выключальнік пстрыкнуў. Я... вядома, сплю... Няхай сабе паглядзіць на мяне. Пайшоў да Віктара. Трэба асцерагацца. Учора ў пяці чалавек забралі кнігі, сшыткі, чарніла за перастукванні. Так яны забяруць і ва ўсіх — не за тое, дык за другое.

Доўга не сплю. Напэўна, ужо за поўнач. Ля стала наглядчыка пачулася гаворка. Адчыняюцца і зачыняюцца дзверы. Бах... Бах... Бах...

Што такое? Карыстаючыся шумам, стукаю Віктару. Мусіць, прывезлі новых.

Лёг зноў. Раптам знізу — тук-тук-тук... Слухаю, лежачы на ложку, прыклаўшы вуха да сцяны.

Выбівае Морзе адно слова: «Х-т-о?»

Адказваю. Пытаюся: «Вы хто?» Адказ: «Прывезлі дзесяць чалавек з Заходняй Украіны. Удзельнікі паходу галодных на Львоў... Расстрэлы, ахвяры... Заўтра напішу...»

Перапынак. Мітусяцца думкі... Польскі Трэпаў — Славой-Складкоўскі — дзейнічае.

Зноў — тук-тук-тук... Слухаю: «А сядзіць тут Андрэй Касцевіч?» Відаць, здзіўлены і напружаны быў у мяне твар. Пытаюся: «А ты хто?» Кароткае маўчанне.

Затым: «А-н-т-о-н Д-а-н-і-л-ю-к». Хто ж гэта такі Данілюк, які мяне ведае? Думаю, думаю, аж галава мая разрываецца, і ніяк не прыпомню. Урэшце адказваю яму, што я і ёсць Андрэй Касцевіч, і пытаюся: «Дзе мы сустракаліся?» Адказаў, што на лесапільні ў Залатой гары, і перадаў прывітанне ад Макара Краўчука. Ах, вось як... Помню, помню... Данілюк перадаў яшчэ, што Макар у Запалянцы.

Назаўтра рана, устаўшы, я, па звычцы, гляпуў у акно. Хадзіў Арцём Світка, як заўсёды А ў аддаленні гуськом яны — украінцы. Пазнаў Данілюка. Прывітаўся. Што тут

робіць так рана пракурор? Вось ён выйшаў з начальнікам і спыніўся, глядзіць на ўкраінцаў.

Тыя прайшлі раз, другі раз... Праходзяць трэці... Пракурор знакам рукі спыніў іх.

— А вы чаму не вітаецеся з пракурорам?

Пярэдні смуглявы хлопец, крыху аброслы барадою, адказаў без затрымкі:

— А що вы, панэ прокурор, біг, чы що, що мы будэмо вам шапкі скідаты?

Сказаўшы так, пакрочыў далей, а за ім усе.

Калі абышлі круг, пракурор дакрануўся да свайго казялка рукою і прамовіў: «Дзень добры!»

— Добры дзень,— адказалі мужныя ўкраінцы і мернай хадою паплылі адзін за другім. Правакацыя пракурора не ўдалася. Захапляліся нашы хлопцы паводзінамі братоў-украінцаў.

*...жнівень 1932 г.*

Маем ужо толькі дзве газеты на ўсе адзіночкі. Пятля фашызму заціскаецца ўсё цясней і цясней. Таварышы ўкраінцы расказалі, што шматтысячны галодны паход сялян на Львоў быў спынены эскадронам уланаў, высланых Славой-Складкоўскім. Сяляне ішлі з косамі, віламі, сякерамі. Спалілі шмат фальваркаў, маёнткаў, асадніцкіх хутароў. Некалькі разоў адбівалі атакі ўланаў. Урэшце паляцелі кулі. Забіта... восемдзесят чалавек, а можа, і больш...

Прыйшла газета. Апісваюцца, хоць коратка, крывавыя падзеі на Заходняй Украіне. Лік забітых называецца такі самы.

Дадаецца, што гэта яшчэ недакладна. Аб раненых гаворыцца толькі адным словам: «многа»... Ніжэй паведамляецца, што прэм'ер генерал Славой-Складкоўскі выехаў у Парыж на адпачынак. Баіцца звяруга крыку прэсы і завірухі на сесіі сейма.

Увечары я стаў на табурэтку, глядзеў у акно і спяваў на ўвесь голас:

Это идут коммунары
В семьдесят первом году.
В небо пылают пожары.
Всем богачам на беду —
на беду!

Пачулі хлопцы, і пайшла пераклічка... Адно другое даганяе... коммунары... пожары... богачам на беду...

*...жнівень 1932 г.*

Дзве падзеі за адзін дзень. Уцёк з турмы Антон Данілюк. Яго вадзілі ў канцылярыю. Наглядчык, які яго вёў, па дарозе спыніўся для гутаркі з іншым наглядчыкам. Вароты на вуліцу якраз былі адчынены — везлі матэрыялы для рамонту лодак (нядаўна адкрылася ў турме такая майстэрня). Данілюк скарыстаў такі момант і шмыгануў. У лёгкім каптане, без шапкі. Апрача ўдзелу ў паходзе галодных, яго абвінавачвалі ў забойстве двух правакатараў і аднаго канфідэнта (даносчыка). Пагражала вечная катарга.

Уцёк... Няхай табе шчасціць у дарозе, спеўная твая душа! Помню, помню твае песні ў змрочным бараку, там, у Залатой гары. Ляці, ляці ў Дзяды да Мар'яны. Яна цябе схавае ад ворагаў. Сядзе з табою ў човен цёмнай ноччу, і за азёрнымі берагамі прытуліць цябе лес магутны, як родны дом. Нарабіў ты турэмным стражнікам клопату. Наша разведка даведалася, што хутка будуць нас пераапранаць у крымінальную вопратку і прымушаць стрыгчы валасы. Значыць, будуць раўняць нас з крымінальнымі. Наглядчык, які цябе вёў, страціў службу, браце Данілюк.

Ляці, ляці, не давайся панам!

Другая падзея: украінскія нацыяналісты забілі ў Заходняй Украіне намесніка міністра ўнутраных спраў, начальніка дэпартамента нацыянальных меншасцей — Тадэуша Галуўко. Ну, будзе цяпер работы. Трымайся, хлопцы!

Паддубны кажа, што кліка Пілсудскага можа выкарыстаць гэты выпадак, каб усё вастрыё тэрору накіраваць супроць камуністаў...

*...жнівень 1932 г.*

Атрымаў ліст з дому. Памёр... мой бацька. Як гэта магло стацца, дарагі бацька? Не вытрымаў ты жыцця пад панамі. Добрае сэрца ты меў для людзей і трываласць нястомную, якая насіла цябе з аднаго краю зямлі ў другі. А вось тут цесна, душна стала тваёй душы, душна стала ў роднай хаце, да якой ты імкнуўся, каб аддаць ёй свае апошнія гады.

Асірацела змучаная жыццём маці без цябе і ўся рэшта сям'і. Асірацелі твае сябры. Асірацеў бы і я, дарагі мой, добры бацька, каб не было ў мяне сяброў-змагароў. Цяжка мне, мой сівы, задуманы голубе. Не пацешыў я

тваёй старасці. Завялікія абавязкі палажыла на нас жыццё, і мы шмат у чым адракліся ад сямейных спраў. Ты гэта зразумеў ужо тады, калі з дзядзькам Дзям'янам рабіў рамку для партрэта Радзішчава. Хоць раздвойваўся, але зразумеў.

Мае таварышы ўжо ведаюць, што цябе няма, дарагі бацька! Шлюць мне спачуванні. І таму я не кінуўся ў роспач. Хачу пранесці праз жыццё тваю трываласць, твой зычлівы, удумлівы позірк. Ты вучыў мяне быць сумленным, дарагі! Я табе паклянуся, што выканаю твой наказ, як ужо выконваю яго цяпер. У думках сваіх лячу да тваёй магілы і кланяюся ёй.

Няхай спіцца табе наша зямля з яе шумнымі лясамі, палямі, дарогамі — зямля, якую ты любіў...

*...жнівень 1932 г.*

Усё горш і горш з кожным днём. Толькі ў трох чалавек засталіся кнігі. Учора забралі і ў мяне. Забралі кнігі, сшыткі, чарніла — усё! Пішу свой дзённік ужо алоўкам і пішу так, як быццам сяджу на іголках. Больш прыслухоўваючыся да таго, што робіцца за дзвярыма, на калідоры, чым да сваіх думак, якія выкладаю на паперы. Пішу дробненька, каб менш заняць месца на паперы. Заўсёды хаваў дзённік, а цяпер тым больш. Колькі ні было вобыскаў, не знаходзілі. Добрая ў мяне «маліна». Не дапамагаюць нашы пратэсты, ні тое, што не выходзім на прагулку. Два разы не бралі вячэры. Усё роўна пракурор не прыходзіць. Рыхтуемся да цяжкай бітвы з панамі.

*...жнівень 1932 г.*

Вось яно і надышло. Пачалася галадоўка...

Мяне выбралі прадстаўніком ад усяго калектыву палітзняволеных для перагавораў з начальнікам турмы, з пракурорам. Я запісаўся на прыём да начальніка. Выклікалі. Начальнік, высокі, тоўсты, з партупеяй цераз плячо, ягомасць так год пад шэсцьдзесят, прыняў мяне знешне ветліва, нават запрасіў сесці. Я не сеў. Падаў яму выкладзеныя на паперы нашы патрабаванні — дзесяць пунктаў. Ён іх прыняў.

— Галадаеце, значыць? — спытаўся ён, нервова курачы папяросу.

— Так... Іншага выхаду для нас ужо няма. Мы пазбаўлены ўсіх правоў...

На здзіўленне, начальнік адказаў:

— Я ў гэтым не вінаваты... Гэта работа пракурора.

Ці гэта сапраўды так, ці манеўр?

Начальнік дадаў:

— Раіў бы вам не траціць здароўя, не галадаць. Бо нічога не будзе з вашай галадоўкі...

— Як будуць задаволены нашы патрабаванні, перастанем галадаць,— адказаў я.

— Я іх прадстаўлю пракурору... між іншым... можаце толькі прасіць, а не патрабаваць,— сказаў гэты ягомасць з голенай галавой і скоса, праз дым папяросы глянуў на мяне.

«Ну... гэта зразумела...» — падумаў я і пачаў яго «прасіць», каб былі ізаляваны ад галадаючых сухотнікі. Яны вызвалены намі ад галадоўкі. Я падаў яму спіс сухотнікаў. Ён прыняў яго, нічога не сказаў. Але, калі браў ад мяне гэты спіс, рука дробненька дрыжала...

*...жнівень 1932 г.*

Пяты дзень галадоўкі. У роце смак і пах балотнай твані. Самы цяжкі дзень галадоўкі — гэта трэці дзень. А цяпер ужо есці не хочацца. Стомленасць, нешта цягне і цягне з усіх жыл. Медыцына сказала б, што арганізм ужо корміцца за свой уласны кошт. Пракурор не прыходзіць, нягледзячы на нашы патрабаванні. Паўлу Шахновічу — гэта значыць таварышу Васілю — мы сказалі, каб ён далучыўся да галадоўкі на шосты дзень, бо ён нядаўна прыехаў з дзевяцідзённай галадоўкі, з Вільні. Васіль не паслухаўся. Галадае з першага дня. Вось які таварыш Васіль!

Не ізалявалі і сухотных — галадаюць разам. Мы іх просім, каб елі. Адмаўляюцца. Дзе там есці, калі ўсе ў камеры ляжаць покатам, галадаюць. Фашысты прабуюць, ці выявіцца слабае звяно, ідуць на тое, каб галадоўку сарваць. Пабачым... Трымаем палец на пульсе...

Дзіўная ноч была ў мяне сягоння. Я ў сне зусім забыўся, што знаходжуся ў турме, у адзіночцы. Ля майго ложка стала настаць у сонечным ззянні. І ледзь чутна даносілася песня, аднекуль здалёк-здалёк.

Гэта ж ты, Вера? Прыйшла з гадоў майго юнацтва... Стаіш і, апусціўшы вейкі на вочы, глядзіш на мяне... Не, я не паміраю і не памру... Цяпер часта прыходзіць да мяне Надзя, яна недзе таксама галадае... Схадзі да яе, яна

табе раскажа новыя сакрэты пра мяне, якіх ты яшчэ не ведаеш...

Стаіць Вера ўся ў белым — у сонечным ззянні, не спускае з мяне вачэй. Кажу ёй: «Ведаю, што і там, у вас, нялёгка. Фашысцкае акружэнне... Лезуць, пралазяць... Перадай прывітанне шырокай Волзе і гэтай песні, у якую я закаханы да слёз. Гэта значыць, прывітанне вялікаму народу рускаму... Не бойся, «лодочка» не загіне. Нездарма «паруса на ней белеют...».

— Я і прыйшла сказаць пра гэта, што не загіне...

Здань знікла. Толькі шум хваляў далятаў з цемры глухім рокатам. Я прачнуўся спацелы і доўга не мог здагадацца, дзе знаходжуся. Дугападобная столь адзіночкі здалася мне адразу векам труны. Тады толькі разабраўся, дзе я, калі заўважыў мутную пляму акна. На двары шумеў дождж...

*...жнівень 1932 г.*

Шосты дзень галадоўкі... Камеры абыходзіў турэмны ўрач, фельчар і яшчэ адзін урач з горада. Слабых кормяць гвалтам. Прывязваюць ногі да ножак крэсла, наглядчыкі трымаюць за рукі. Фельчар разнімае зубы, упіхвае гумавую кішку. Праз яе ўліваюць паўкубка кофе з малаком. Наглядчыкі чатырох чалавек панеслі з агульных камер на насілках, у шпіталь. Відаць, сухотных. Потым наглядчыкі павялі пад рукі ў шпіталь Івана Падаляку.

Вырашылі па Морзе галадаць яшчэ адзін дзень.

Гэтыя «насілкі» могуць адбіцца на настроі хлопцаў у агульных камерах. Сёй-той можа яшчэ выбыць са строю. Трэба захаваць «сваю армію».

Есці не хочацца зусім. Толькі слабасць кружыць галаву і цягне да ложка. Свет, калі глядзіш у акно, здаецца ціхім, сіняватым, як быццам толькі народжаны. Ярка-зялёныя лісці клёна ледзь варушацца ў сіняватай цішыні. Позірк мой прагна глядзіць па яго, адпачывае...

Ля варот турмы паліцыя разагнала адну дэманстрацыю рабочых горада. Прыбылі ў турму новыя арыштаваныя. Пасадзілі да крымінальных. Увечары памёр у турэмным шпіталі адзін наш таварыш (сухотнік).

*...жнівень 1932 г.*

Трэці дзень пасля галадоўкі. Хлопцы яшчэ ходзяць, як цені. Хістаюцца. Апухлі ногі. Трывога ў душы. Паддубнага, Шахновіча (Васіля) і яшчэ некалькіх таварышаў

з вялікімі тэрмінамі зняволення вывозяць у другую турму, на Заходнюю Украіну. Пільнуем праз вокны — зараз павязуць за вароты нашага памершага таварыша. Затарахцеў воз ад шпіталя, шчыльна напханы саломай. Не ашукаеце, паны. Ускрыкі пачуліся з вокнаў адначасова: «Чэсць памяці таварышу!.. Далоў фашысцкі тэрор!» І загучала: «Вы жертвою пали в борьбе роковой...» Адміністрацыя не перашкаджала спяваць. Мы сталі яшчэ мацнейшымі, чым былі. Наша галадоўка — гэта наша маральная перамога. Удалося «вытаргаваць» мне ў начальніка выпіску газет (толькі польскіх, на іншыя ён не згадзіўся) і права выпісваць кнігі на свой кошт. Я хадзіў па камерах аб'яўляць канец галадоўкі. Усё адбылося па нашаму плану. Калі зайшоў у адзіночку да Шахновіча (Васіля), ён ляжаў на ложку. Усміхнуўся. Працягнуў руку для прывітання.

— Правільна зрабілі, што спынілі галадоўку,— сказаў ён,— трэба захаваць сілы на другі, трэці, а можа, і на дзесяты раз...

— Як маешся? — спытаўся я, пазіраючы ў яго васковы твар.

— Нічога... Вельмі добра... Вывучыў сто нямецкіх слоў на памяць...

Ён паказаў на газету, што звісала са стала. Бульварная газета (толькі такую ўжо можна было мець) для заахвочвання падпісчыкаў друкавала польска-нямецкі слоўнік. Шахновіч і гэта скарыстаў.

— А ты няправільна зрабіў, што не пачаў галадаць з шостага дня. Трэба таксама сілы захоўваць...

— Ну, што ты? Што ты? Як гэта можна? Ды я добра адчуваю сябе.

...Цяпер іх, нашых перадавых таварышаў, вывозяць... Цяжка і сумна ў мяне на сэрцы.

Сачу праз акно. Павялі транспартную групу ў магазін вопраткі атрымаць свае рэчы. Зараз паедуць. Вось ужо ідуць назад.

Праз хвілін дваццаць пачуўся голас Паддубнага: «Да пабачэння, таварышы! Сустрэнемся на барыкадах!»

Гукнулі ўсе праз дзверы наперабой: «Сустрэнемся на барыкадах!»

Бывай, дарагі Іван Пятровіч! Невядома, куды панясе нас лёс, а на барыкадах-то мы сустрэнемся!

*...жнівень 1932 г.*

...Можа, гэта мой апошні запіс у дзённік. Выцягваю ніткі з сенніка, раблю дратву. Адрываю ад летняга туфля падэшву, закручваю свой дзённік у кавалак цыраты, кладу пад падэшву і зашываю. Дзённік будзе са мною.

Яшчэ неспадзяванасць. Прыбыў новы намеснік начальніка турмы ў ваенным мундзіры паручыка артылерыі. Я пазнаю ў ім былога падпаручыка Куцага, які некалі здзекаваўся з мяне на ваеннай службе. У турму прыбыў фашызм у вобразе хама-салдафона. Без ламання касцей, без садызму тут ужо не абыдзецца. Зграя Пілсудскага падбірае кадры... Апарат ваенны зрастаецца з турэмным ушчыльную.

*...верасень 1933 г.*

Два тыдні ляжаў у шпіталі. Нешта накшталт пачатку сухот. За гэты час вывезлі Захара Зубца, Марціна Шапко, Максіма Рунду. У адзіночках засталося не больш дзесяці чалавек палітычных. Павезлі і братоў-украінцаў. Разам з імі паехаў Арцём Світка. Відаць, у Святы крыж.

Вярнулі мяне са шпіталя ў адзіночку. Усю восень і зіму прабыў там. Была спроба перасадзіць усіх палітычных да крымінальных. Мы на гэта адказалі трохдзённай галадоўкай. Новы начальнік (той выбыў пасля нашай сямідзённай галадоўкі) загадаў забраць пасцелі, табурэткі, курткі, садраць з нас кашулі, пакінуць толькі сарочкі і каптаны. З ног пазрывалі шкарпэткі. У дадатак жалезныя, прыкаваныя да сцяны ложкі былі прыхілены да сцяны і замкнуты. Гэта было ў пачатку красавіка.

Некалькі здзіўляла — адкуль такія раптоўныя дзеянні ката-начальніка? Яму ж невядома, колькі мы будзем галадаць. Рызыкоўная справа — распрануць дагала, адабраць пасцелі. Нешта тут ёсць... Бо ніякі кат не мог бы так адразу зрабіць. Пачакаў бы адзін дзень, два, папярэдзіў бы. А тут такая ўпэўненасць у дзеянні.

Гэтая трохдзённая галадоўка была самай цяжкай з усіх галадовак. Холад не даваў спаць. Трое сутак спавалі хлопцы з кутка ў куток, не звёўшы вока.

Мая новая адзіночка з падрапанымі сценамі. Ёсць малюнкі, надпісы. Між іншым, нехта напісаў верш:

Мы не знаем отступленья,
Иль победа, иль конец —
На мир ведем мы наступленье
Огнем пылающих сердец —
Раз-два, раз-два...

Грэў мяне гэты верш усе трое сутак, калі напружанасць цярпення, здаецца, даходзіла да вар'яцтва. Холад праймаў да касцей. Ад бесперапыннай хады падкошваюцца ногі. Падаеш на падлогу і засынаеш. Будзіць холад. І зноў снуеш з кутка ў куток. На чацвёртыя суткі рана бяром снеданне — гарачую каву (я заявіў наглядчыку, што спыняем галадоўку). Наглядчык сказаў: «Мы ўжо ведалі, што вы спыніце...» і ўсміхнуўся. Я падумаў — няўжо хто выдаў начальніку наш план? Наглядчык, раздаўшы каву, прыйшоў да мяне ў адзіночку і сказаў: «Сачыце лепш за сваімі людзьмі...»

Я адразу спытаўся: «Хто выдаў тэрмін нашай галадоўкі? Скажыце, не бойцеся...» Наглядчык прычыніў дзверы і зашаптаў: «Па-да-ля-ка... Яго выклікалі ў канцылярыю... Нейкія там паперы... І там ён выдаў ваш план...»

— Дзякуем, пане Маткоўскі,— адказаў я. Наглядчык выйшаў.

Падаляка хутка выходзіць на волю. Трэба наспець выкрыць яго перад калектывам.

На прагулцы дапытвалі Падаляку, не выдаючы наглядчыка. Ён зжахнуўся і пачаў усё адмаўляць:

— Гэта — паклёп... Гэта — паклёп...

— Аднак з турэмнага камітэта ты павінен выбыць...

Падаляка не выходзіў на прагулку цэлы тыдзень. Аж счарнеў з твару. Тым часам набліжаўся Першы май. За тры дні да Першага мая Падаляка выйшаў на волю. Знойдуць яго патрыёты, не ўдасца яму спекуляваць на народнай крыві.

30 красавіка нас — групу ў дзесяць чалавек — перавялі ў агульную камеру ў цокальным паверсе.

Першага мая мы падзелі чырвоныя сцяжкі. Было рашэнне для ўсіх — калі адміністрацыя будзе зрываць, даваць пасіўны адпор — прыкрываць сцяжок рукою. Гэта для таго, каб не выклікаць катаванняў.

Наглядчыкі прыйшлі на чале з начальнікам, і ўсіх нас пагналі ў карцэры. Там, паставіўшы ў шарэнгу, начальнік дамагаўся, каб мы знялі сцяжкі. Ніхто не зняў. Тады начальнік даў каманду наглядчыкам:

— Сарваць!

Дзесяць чалавек прыкрылі свае сцяжкі, прадэманстравалі перад катам сваю салідарнасць.

Пачаўся вобыск. Мы стаялі на цэментаванай падлозе, як маці нарадзіла, а наглядчыкі ператрасалі нашу вопратку. Потым глядзелі нам у насы, у раты, у вушы, над пят-

кі... Нам пакінулі толькі споднюю бялізну, каптанчыкі, кашулі, світэры забралі і параскідалі нас па карцэрах. Цемра, слізь, холад... Перад абедам нас выпусцілі і пераадзелі ў крымінальную адзежу.

Вось які фінал святкавання Першага мая!

Адбыліся яшчэ падзеі, якія пакінулі незабыўнае ўражанне.

Пасля забойства ўкраінскімі нацыяналістамі Тадэуша Галуўко ў адказ па ўсёй Польшчы ўзняліся шыбеніцы. Фашысты абвясцілі барацьбу нібы са шпіянажам. Прыпісвалі шпіёнскія справы камуністычным дзеячам і вешалі іх.

У нашай турме, у вузкім закутку, пры касцельнай сцяне, была пабудавана шыбеніца. Памятаю цёмную ветраную ноч. Я доўга тады не спаў. І не толькі я. Хутка, калі засне турма, павядуць людзей вешаць. Мне здаецца, што вецер тады быў чорны, як судовая тога пракурора. Вецер крадком аблізваў вуглы турэмных будынкаў, быццам прыслухоўваючыся да чаго. А потым зрываўся віхрам, мёў, круціў сухі пясок на турэмным падворку і ціхім сковытам сціхаў у змрочных кутках. Грукат ботаў унізе абвясціў прыход адміністрацыі і, вядома, пракурора, і дзяржаўнага ката Маціеўскага. Я забегаў па сваёй адзіночцы і пачаў стукаць у сцены да суседзяў. Потым узлез на табурэтку да цёмнага акна.

Я не забуду белай здані, якую валаклі, пхалі наглядчыкі па падворку, і той прыглушаны ўсхліп — спазматычны плач.

Малады хлопец у белай сарочцы не хацеў ісці паміраць. А яго цягнулі, пхалі і ўгаворвалі з насмешкай: «Хіба ты сёння не абедаў, што ісці не можаш?» Так па адным правялі пяць чалавек, сыноў беларускага народа. Адзін лаяўся, ідучы казаў: «Усіх не перавешаеце...»

Іншыя ішлі моўчкі.

Орган ППС «Роботнік» хціва, з асалодай падлічваў кожны дзень, колькі і дзе павешана, цешыўся, што «падваліны дзяржавы» будуць умацаваны. Праклятыя лакеі! Колькі яны гора нясуць рабочаму класу! Прыемней глядзець на адкрытага ворага, што адстайвае свае прынцыпы, якія б гэтыя прынцыпы ні былі, чым на прадажную ППС, подласць якой заключаецца ў тым, што яна прыкрываецца чырвоным сцягам марксізма, а на практыцы служыць фашызму.

Яшчэ адна немалая падзея. У Германіі да ўлады прый-

шоў Гітлер. Цяжка ў Германіі. Сацыял-дэмакратыя, тое самае, што ў Польшчы ППС, расчысціла дарогу Гітлеру да ўлады. А ён, Гітлер, яе... капральскім ботам у задняе месца. Такая ўжо доля ўсіх лакеяў, двурушнікаў. Нямецкі фашызм, вярнуўшы на арэну сярэдневяковую катаўскую сякеру, тоіць у сабе небяспеку для народаў. Як жа цяжка будзе нямецкаму пралетарыяту! Як гэта магло стацца?

Відаць, у гонар прыходу Гітлера да ўлады турэмная адміністрацыя задумала змяшаць нас з крыміпальнікамі і пачала рабіць перасадку. Ужо некалькі камер перасадзіла. Мы па ранейшай дамоўленасці зараз жа абвясцілі галадоўку. І што атрымалася? У дапамогу нам да галадоўкі далучыліся крымінальныя. Адміністрацыя гэтага не чакала. Яна спалохалася і вярнула палітычных назад на свае месцы.

Што значыць салідарнасць!

## Раздзел другі

## ЖЫЦЦЁ ПЕРАМАГАЕ

Клуб дагараў. Тлелі апошнія бярвенні. Дзе-ні дзе агеньчыкамі яшчэ ўспыхвала полымя, але і яно хутка патухла. Пах едкага дыму візеў у паветры над вёскай.

Ноч таіла ў сабе нешта злавеснае. Нікога няма на вуліцы. Ніхто не цікавіцца, як дагараюць апошнія бярвенні клуба, які некалі быў з такім імпэтам пабудаваны, а цяпер спалены зноў-такі на ўцеху людзям. Вёска як замёрла,— не чуваць смеху моладзі, не спявае скрыпка Петруся Хадыкі. Нават сабакі і тыя прыціхлі. Хоць асеннія вечары доўгія і цёмныя, людзі кладуцца спаць рана. Няма чым паліць — газа дарагая, запалкі таксама. Людзі рознымі спосабамі знаходзяць выйсце: шчапаюць адну запалку на чатыры часткі, захоўваюць жар у печах у попеле да ранку. А дзе ў хаце ёсць курцы, там з'явіўся спрадвечны сродак здабычы агню — крэсіва з крэменем. Ды і не хочацца сядзець на вуліцы, бо няма весялосці. Вёску наведвае паліцыя і ўдзень і ўначы, калі ёй захочацца. Камендант Глушэцкага пастарунка Дарванскі — ён жа «жаба на купіне» — прыязджае заўсёды верхам на кані з атрадам конных паліцыянтаў не менш пятнаццаці чалавек. Кат Дарванскі баіцца ездзіць адзін.

Сяляне не маюць чым плаціць падаткаў, якія ўсё растуць і растуць. З'яўляюцца ўсё новыя іх віды, і адзін з іх мае нават назву — «крызісовы». Кат Дарванскі, патрасаючы кайданамі з замком, нагайкай і гумай, вымушае сялян выводзіць пад канвоем паліцыянтаў апошнія каровы прадаваць. І можна бачыць, як на пясчаным шляху дзядзькі са сваімі заплаканымі жонкамі вядуць чарадою кароўкі на кірмаш у Глушэц. Там у прысутнасці паліцыянта карова прадаецца, і грошы з рук гаспадара пераходзяць да секвестратара. Разгуляўся кат Дарванскі. Людзі знайшлі ўжо не адзін труп камуніста ў канаве пры шляху. І ўжо некалькі запісак падкінута пад вароты пастарунка з пагрозай забіць ката, калі не спыніцца тэрор. Вось чаму п'янюга Дарванскі баіцца ездзіць па вёсках адзін.

Клуб дагараў... Памкнуліся былі адзін раз хлопцы звярнуцца з заявай да старосты, каб адчынілі клуб для пастаноўкі спектакляў. Староста не адмаўляў, а выслаў пад аховай паліцыі архітэктара, каб той пацвердзіў, ці прыгодны клуб для пастановак. Архітэктар агледзеў запусцелы клуб і далажыў старосту, што ў ім спектакляў ставіць нельга. Чаму? Клуб мае толькі адны выходныя дзверы, і далёка студня, што небяспечна на выпадак пажару. Гэта не перашкодзіла таму самаму старосце праз год выслаць у Запалянку вандроўную польскую трупу пад назвай «Рэдута». Тэатрык прыехаў і разыграў п'еску пра Пілсудскага. Калі заслона апусцілася і артысты выйшлі, каб пачуць воплескі, замест іх раздаўся свіст, і на сцэну паляцелі тухлыя яйкі.

Тэатр пасля гэтага доўга не з'яўляўся. Ён прыехаў тады, калі ў Буславічах фашыстам удалося заснаваць сельскагаспадарчы гурток («Кулко рольнічэ»), а ў суседнім шляхецкім засценку — васпа-фашысцкую арганізацыю моладзі «Стралец». Цяпер тэатр паставіў антысавецкі пасквіль.

Пасля ад'езду артыстаў, у той жа вечар, клуб успыхнуў полымем. Ніхто не бег яго бараніць. Як ні крычаў солтыс Барсук, як ні крычаў Мікіта Лазун з сынам-лесніком, ніхто не выйшаў на ратунак клуба. Людзі крадком уцякалі ў агароды, у поле, каб не быць дома.

У вясковай начной цішыні дагараў клуб — гэты траянскі конь графа Ельскага.

Але памыліўся б той, хто сказаў бы, што ўсё сціхла ў вёсцы. Цішыня ў ёй толькі знешняя.

Пеця Ціханчук не памёр. Праўда, ён не мог яшчэ так

хутка хадзіць, як некалі, не мог так гучна смяяцца. Боль у грудзях яшчэ адчуваўся. Але Пеця не мог ужо і сядзець без работы. Заявіў аб гэтым Сашу Грынявіцкаму, цяпер галоўнаму важаку камсамольцаў.

Саша доўга не згаджаўся з яго просьбамі, але потым нават і дапамог яму.

— Ты ж барапы не занясеш... Хіба я дапамагу... Ідзі па капя...

Саша занёс барану на поле солтыса Барсука, які зрабіўся сапраўдным мiраедам, дакладным выкапаўцам паліцэйскіх загадаў. Яго даносы зрабілі тое, што патрэбен ужо дазвол ад староства на звычайную вечарынку моладзі. Колькі ні папярэджвалі Барсука, колькі ні пагражалі, ён адно сваё цвярдзіў людзям:

— Вы памагаеце камуністам... Паліцыя за гэта па галоўцы не пагладзіць...

Моладзь вырашыла прышчаміць яго.

Канфідэнтам па ўсёй краіне аб'яўлена бязлітасная барацьба. Асабліва гэта стала неабходна пасля заявы ў сейме новага міністра ўнутраных спраў фашыста Перацкага на пытанні дэпутатаў-людоўцаў.

Людоўцы пыталіся: «Нашто пан міністр разбудоўвае сетку канфідэнтаў па ўсёй краіне? Гэта ж правакуе сяляпства, стварае ўдушлівую атмасферу дыскрымінацыі...» Перацкі адказаў з цынічпай шчырасцю: «Для барацьбы з камунізмам... не шукаю рамантызму ў жорсткай рэчаіснасці...»

Клуба ўжо няма, не прыедуць больш здзекавацца з народа. Не сажпе свайго аўса нягоднік Барсук. Пеця прагульваецца па ім бараною,— повалакам, повалакам, каб ні аднаго каласка не засталося.

Саша Грынявіцкі не мае сталага месца жыхарства, ён хаваецца ад паліцыі. Паўгода давялося яму пабыць у турме. Выпусцілі, бо вытрымаў катаванні ў дэфензіве, не прызнаўся ні ў чым. Хацела паліцыя арыштаваць яго другі раз, а ён уцёк. Ходзіць з вёскі ў вёску, начуе дзе папала. Калі наблізіцца да сваіх палеткаў, абавязкова спыніцца ва ўрочышчы «Казакоўшчына», дзе ён некалі пасвіў кароў і ўпершыню раскідаў лістоўкі. Народнае паданне гаворыць, што тут некалі адбылася вялікая бітва казакоў з панамі, адкуль за гэтай мясцінай і ўтрымалася такая назва. Мясціна ўкрыта вялікімі надмагільнымі каменнямі. Крыху відаць яшчэ і ўзгорачкі магіл, на якіх кучаравіцца зялёны алешнік. Саша становіцца на адным «запаветным» камені

пры самай дарозе. Адгэтуль ён аглядаў пекалі свой каровін атрад, які налічваў пятнаццаць галоў, адгэтуль свістаў у адказ на шчабятанне ранніх птушак, і з гэтага месца ён збіў каменем рог карове Мікіты Лазуна, за што за ўсё лета не атрымаў платы. Бачыць сябе Саша пастушком, у расхрыстанай зрэбнай кашулі, калі ён любіў стаяць на запаветным камені. Гэта камень не абы-які — тут пахаваны казак дагары нагамі. Так кажуць дзяды і бабкі, толькі не гавораць, чаму такая доля напаткала казака.

Відаць, паны гэтак паздзекаваліся з яго. Дзяды і бабкі кажуць, што казак часам блукае па алешніку ўночы і свішча, мусіць, кагосьці шукае. Людзі лічаць Казакоўшчыну страшным месцам і стараюцца не хадзіць і не ездзіць гэтай дарогай уночы.

Стаіць, бывала, Саша на камені і адчувае блізкасць казака. Стане яму шкада храбрага ваякі, якога прыгнялі такою аграмаднай глыбай. Тады Саша звонкім голасам пастушка заводзіць песню, вядомую ўсёй ваколіцы, а можа, і далей:

Ой, забілі,
Ой, забілі маладога казака,
Ой, пахавалі,
Пахавалі пры шырокай даліне,

Ой, пакрылі,
Ой, пакрылі тонкім, белым палатном,
Ой, палажылі,
Палажылі у каморы пад акном...

I раптам пасля песні крычыць:

— А куды, Сівуха, каб ты здохла!

Гэта — на карову. Выме з-за пазухі два яечкі, якія знайшоў у крапіве, ля хаты Мікіты Лазуна, пастукае кожным аб казацкі камень і вып'е. Бо Саша заўсёды гоніць каро́вы на́шча. Пакуль тое снеданне, то жывот можа да спіны прырасці. А курэй у Мікіты многа, і гнёзды іх раскіданы па крапіве, па градах. Чорт яго не возьме, скнару гэтую, злыдня.

Калі бацька Сашы пасварыўся з Мікітам за тое, што Мікіта не заплаціў за карову са збітым рогам, Саша перастаў быць пастушком і некалькі год са сваім старэйшым братам хадзіў пілаваць дровы ў горад да фабрыкантаў, потым працаваў дома, на гаспадарцы.

Цяпер Саша ўжо юнак. Надакучыла яму бадзянне па вёсках, па хатах. Усё хавайся і хавайся.

Калі будзе канец гэтаму хаванню? Некаторыя хлопцы кажуць: «Ну, чым табе дапаможаш? За мяжу адправіць няма магчымасці, ды там могуць і не прыняць... Адна дарога — пайсці самому ў дэфу, вытрымаць катаванні і выйсці, жыць адкрыта...»

— Не... — кажа Саша,— трапіць у рукі Дарванскага, значыць загінуць. Закатуюць і кінуць па дарогу, у канаву, як гэта ўжо было з іншымі...

Усюды паспявае Саша. Паліцыя ніяк не можа трапіць на яго след. Праўда, быў адзін выпадак, калі Саша ледзь не апынуўся ў руках паліцыянта. Гэта было ў адной маладзіцы, якую хлопцы за яе пільнасць і дапамогу падпольшчыкам празвалі бальшавічкай. Саша ляжаў на хаце, на гарышчы, калі на падворак заехаў на веласіпедзе паліцыянт. Пачуўшы голас панскага служакі, Саша вырашыў уцячы. Глянуў з гарышча ўніз, у сенцы. Дзверы ў хату зачынены. Прыпёрты да сцяны, стаіць веласіпед. Саша ў момант па драбіне ўніз, уніз, схапіў веласіпед і на ім хутчэй за гумно. Доўга ехаў Саша палявой дарогай на панскім веласіпедзе, аж пакуль не пакінуў яго ў кустах прыдарожнага ляска. Не, мінулі ўжо тыя часы, калі ён хадзіў у польскую школу вучыцца і цярпеў папіканне ксяндза, чаму бацька не пераходзіць на каталіцкую веру і чаму сам Саша так дрэнна гаворыць па-польску. Не падабалася яшчэ ксяндзу і Сашава торба для кніжак — адменная, пашытая з аўстрыйскага шыняля, які бацька прынёс з вайны. Смяяліся сынкі багацеяў з гэтай торбы, не спачувалі таксама і таму, што ў Сашавай маці не было кавалачка сала, каб пакласці сыну ў гэтую торбу, каб ён весялейшы быў. Мінулі ўжо тыя часы. Саша носіць у душы гнеў на ўсіх багацеяў, набывае гарт падпольшчыка.

Спрытна зрабілі хлопцы з падпалам клуба.

Калі пачало вечарэць, уся моладзь Запалянкі пайшла да солтыса Барсука прасіць, каб дазволіў сабраць вечарынку.

— Дзядзечка, мі-і-л-енькі, дазволь... Сёння ж нядзелька святая... Няхай нам Пятрусь папілікае крыху, мы паскачам, і ўсё... Потым разыдземся па хатах...

Такія ўмільныя просьбы казыталі самалюбства Барсука, але ён знарок заставаўся пахмураным, непрыступным. Адказваў так, быццам адбрэхваўся. Усё для таго, каб яшчэ больш прасілі.

— Няма чаго, няма... Ідзіце спаць. Вы хочаце, каб і мяне ў турму разам з вамі...

— Дзядзечка... Паліцыя не будзе ведаць. Вы ж не скажаце ёй.

— Адкуль вы ведаеце, што не скажу? — зыркнуў Барсук.

— Вы ж у нас начальнік... Помніце, як вы чыталі нам на вечарынцы, стоячы на лаве, што вы начальнік над намі?

Хлопцы прыпомнілі, як у свой час Барсук прыйшоў на вечарынку п'яны, залез на лаву, там, дзе вісела лямпа, і, ківаючы носам, чытаў нейкую паперу, у якой нібы гаварылася, што ён начальнік вёскі, што ён можа зрабіць з кожным, што яму захочацца.

— Я ёсць начальнік! — ледзь не падаючы з лавы, крычаў Барсук.— Вечарынку закрываю! Палітыкі... Палітыкі... Вам хочацца. Я вам дам палітыку!..

Зусім з глузду з'ехаў Барсук і на людзей па-людску не глядзіць. Адукавалі паны.

Хлопцы цягнулі сваё: «Дзядзечка, дазволь...», але не прыпомнілі, чым тады скончылася чытанне начальніцкай паперы. Барсук злез з лавы. Калі спыніўся ў цёмных сенцах, нехта шворнам ад воза агрэў яго па спіне. Барсук нарабіў крыку і пагражаў прывесці паліцыю з Буславіцкага пастарунка. Тады хлопцы прывязалі яго да плота і працягвалі вечарынку. Паліцыянта прывёў сын.

— У чым тут справа? — спытаўся паліцыянт у Барсука, ужо адвязанага.

— Я, паночку, зайшоў у сенцы... Чую, у адным кутку пра палітыку гавораць. Я ў другі куток — і там пра палітыку гавораць. Я ў хату — і там...

Паліцыянт, нявыспаны, раззлаваны, што сцягнулі з пасцелі, сказаў:

— А ў тваім доўгім носе мухі таксама пра палітыку гавораць? Ты напіўся, пся крэў...

І ён памахаў пальцам перад носам Барсука.

А вечарынку ўсё ж такі разагнаў. Так было скончана з вечарынкамі.

— Можа, зноў хочаце прывязаць мяне да плота? Вось спіна яшчэ баліць ад таго шворна... Я-а-а... ве-е-даю, хто гэта такі пryткі...

Хлопцам хацелася смяяцца, але не дай бог, яшчэ раз'юшыцца Барсук і прагоніць з хаты.

— Ці варта ўспамінаць старое, дзядзечка? Ды мы гэтага не рабілі... Зрабіў нехта...

— Я ведаю, я ведаю хто.

З вуліцы пачуўся крык: «Пажар!» Саша зрабіў сваю справу. Хлопцы шуганулі з хаты, але па дарозе паразбягаліся па надворках і зніклі. Усё роўна Барсук не будзе мець ніякіх падстаў для абвінавачвання каго-небудзь з моладзі ў падпале.

Барсук спіць трывожна, ведае, што будуць допыты ў пастарунку, у гміне, а можа, і ў старостве. Будзе бараніцца і бараніць моладзь з-за боязі, каб самога не ўблыталі ў гэтую справу, прападзі яна пропадам. Да таго ж... ключ яму даручылі ад гэтага клуба. А тут — на́ табе, чорце, табакі. Можа, яно, з другога боку, і будзе спакайней. Вельмі ўжо іх, тых камуністаў, многа. Загады плывуць за загадамі выкрываць іх. Дзе ты чорта іх усіх выкрыеш? Дапамагае нядрэнна Рыгор Малахай — яму плоцяць ужо больш... Нешта дзесяць злотых у месяц. А Барсуку — ад галавы. Вось хутка вернецца з турмы Андрэй Касцевіч. На ім можна будзе зарабіць. «Запрашу яго да сябе на чарку. А можа, і яму надакучыла турма? Можа, перастаў быць камуністам? Ой, мусіць, не... Не такі... Але пабачым...»

Каб хто падслухаў думкі солтыса-канфідэнта, мог бы сказаць: «Ты снуеш сеткі на камуністаў, а яны снуюць па тваім аўсе бараною...»

Мала таго, у хаце Дзям'яна Гарагляда вучыцца па-беларуску дзесяць камсамольцаў. Вокны шчыльна завешаны. Стол пастаўлены на сярэдзіну хаты. Навокал услоны і табурэтка. На стале — газнічка сваёй работы. Праз горлачка невялікай бутэлькі працягнуты кноцік, які гарыць, як царкоўная свечка. Мала святла дае гэтая «лямпа». Але хлопцы і на яе робяць складчыну. Што зробіш, калі газа дарагая? Нічога, хлопцы рады і такому святлу, абы не хадзіць на польскія вячэрнія курсы ў Буславічы, дзе сын былога пана Івана Шпака больш здзекуецца з Савецкага Саюза, чым вучыць грамаце. Аб беларускай мове ўжо няма чаго гаварыць. На табурэтцы сядзіць «настаўнік» Пятрусь Хадыка. Спачатку настаўнічаў Пеця Ціханчук, але адчуваў сябе яшчэ слабым, і яго змяніў Пятрусь. Заняткі маглі б адбывацца ў яго хаце. Ён адзін, без сям'і. Спачатку так яно і было. Але патрэбна заўсёды варта на дварэ. Вартаваць, ды яшчэ кожны вечар, не было каму.

Тады Дзям'ян Гарагляд сказаў:

— Пераходзьце да мяне... Я павартую.

Сярод вучняў сын Дзям'яна Міця, ён ужо камсамолец. Сядзіць і сын Сцяпана Касцевіча Мікола.

Няхай сабе глуха дрэмле ноч над вёскай, няхай датля-

ваюць апошнія галавешкі клуба,— работа ідзе сваім парадкам. Пеця, папэўпа, ужо капчае «барапаваць», хлопцы вучацца, а Дзям'яп, утуліўшыся ў кажух, сядзіць па прызбе, вартуе. Калі пачуе, што замоцна гавораць у хаце, пастукае пальцам у шыбіпку. Хлопцы сціхаюць.

Ідзе якраз дыктоўка. Пры ёй гомапу менш. Пятрусь выбірае з «Беларускага правапісу» сказы, якія яму пайбольш падабаюцца.

— Напісалі? Усе? Слухайце далей: «Багачы і панства, пашы дабрадзеі, мы на суд вас клічам, каты вы, зладзеі...» Паўтары, Гарасім. І не шморгай посам, а то яшчэ мяне ўцягнеш або дзядзьку Дзям'яна з падворка. Усё шморг і шморг. Паўтары...

Хлопцы, падняўшы твары ад сшыткаў, глядзяць па Гарасіма з усмешкай — паўторыць ён ці не?

А Гарасім таксама расплыўся ва ўсмешку і кажа:

— Мм... што тут паўтараць? Мы ж гэты верш увесь на памяць ведаем...

— А чый верш?

— Якуба Коласа...

Дыктоўка пішацца па правіла, дзе трэба ставіць коску.

Прыйшоў Саша Грыпявіцкі, схуднелы, абветраны, і далучыўся да заняткаў. Яму Пятрусь падрыхтаваў сказ: «Песня мая не ўзышла сярод кветак».

— Як, Саша, паставіш ты тут коску ці не?

Саша глядзіць на сказ, думае.

— Не... здаецца, не... — адказвае ён пастаўніку.

А Дзям'ян Гарагляд усё вартуе, бо і Любы дома няма.

Выйшла яна за вёску, па гару, пад тыя магутныя сосны, што, як курганная кветка, маячаць над прасторамі. Туды павінен прыйсці Макар Краўчук. Гэта будзе ўжо яго апошні прыход. Прыйдзе ён не з маёнтка графа Ельскага, не. Прыйдзе здалёк, развітаўшыся надоўга са сваім сябрам Антонам Данілюком.

Дагараюць вогнішчы паўстання на Заходняй Украіне так, як дагараюць апошнія галавешкі клуба ў Запалянцы.

Паўстанне перанеслася з Заходняй Украіны на Беларускае Палессе. Чутка аб расстрэле ўланамі Славой-Складкоўскага шматтысячнага паходу галодных на Львоў далядцела да Беларусі, і паўстанцы пайшлі ў лясы. Група ўкраінцаў пад камандай Макара Краўчука прарвалася з Валыні на Беларусь, дайшла да Дзядоў. Папоўніўшы атрад мясцовымі хлопцамі і лесарубамі, яны падаліся далей у Палессе, у гушчыню асадніцкіх хутароў. Атрад падзяліўся на дзве

групы. Другую групу павёў Антон Данілюк. За адну ноч спалілі дзесяць асадніцкіх хутароў, расстралялі некалькі асаднікаў, якія не паспелі ўцячы, набралі кулямётаў, вінтовак, шабель. Перад світаннем прайшлі непраходнае балота і зрабілі прывал у лесе на востраве. Макар з Антонам пераапрануліся ў адзежу паліцыянтаў і пайшлі ў разведку ў бліжэйшыя вёскі. Вынікам разведкі было тое, што прывялі ў атрад уначы штосьці каля дзесяці канфідэнтаў і трох правакатараў, супрацоўнікаў дэфензівы. Тут жа зрабілі над імі суд па-рэвалюцыйнаму. Ранкам смела пайшлі ў адну з вёсак.

Прыстаў да атрада яшчэ ў ваколіцы Дзядоў адзін лесаруб, дзівосны балалаечнік Ваня Качаткоў. На прывале, на лясным востраве, калі паўстанцы распалілі вогнішча, ён сеў на пень, тромкнуў па струнах, і палілася разліўная «Рябинушка». Дзе яна ні спявалася! У салдацкіх эшалонах-таварняках, у франтавых акопах, у хатах на вяселлях, у корчмах разгульных... Ласкавая, задушэўная «Рябинушка», як руская дзяўчына, заплеценая ў стужкі. За песняй пайшлі прыпеўкі з часоў грамадзянскай вайны. Глядзяць хлопцы-паўстанцы на Ваню з захапленнем, а потым пытаюцца:

— Адкуль ты, Ваня?

Ваня не спяшаецца з адказам. Адкладае балалайку ўбок, скручвае цыгарку і адказвае працягла, нібы абыякавым голасам:

— Мы... Яраслаўскія...

Потым раскажа пра сябе падрабязна, як схапіў яго, бяздомнага хлопца, у 1920 годзе ксёндз у Мінску і завёз разам з сябрам Грышам аж у Чэнстахоў, у езуіцкі дзіцячы дом, адкуль яны і ўцяклі. Прыціхне Ваня, расказваючы, нават задумаецца. Памкнуліся яны ўцячы за мяжу, на радзіму. Захварэў у дарозе сябра Грыша на запаленне лёгкіх і памёр у адной палескай вёсцы.

— ...А мне так і не ўдалося перайсці мяжу. Туляўся па лесапілках, лясах... — заканчвае свой расказ Ваня.

Макар Краўчук з Данілюком вырашылі, каб Ваня, калі прыйдуць у вёску, іграў на балалайцы. Данілюк падышоў да Вані, паклаў яму руку на плячо і сказаў:

— Ось що, друже Ваня, будэш ты у нас агітпропом... Найбільшэ граї цю... «У Богородскому сэлі...». Гарна пісенка... Добра? Згода?

Ваня згадзіўся і пайшоў з хлопцамі ў вёску.

З радасцю і страхам глядзелі сяляне на паўстанцаў.

Можна было прачытаць на твары ў кожнага: «Як гэта яны адважыліся? Такі прыгнёт, такія катаванні чыняць паны над людзьмі, аблыталі канфідэнтамі, што і слова сказаць нельга, а яны? Загінуць, міленькія, загінуць...»

А міленькія паўстанцы жартуюць, смяюцца. Спыніліся ля хаты солтыса. Вывелі яго на вуліцу, пасадзілі на лаўку і сказалі, каб сядзеў, не варушыўся. Так і сказалі: «Як заварушышся, куля ў лоб...» Побач з солтысам сеў Ваня з балалайкай. Людзі натоўпам акружылі паўстанцаў, глядзяць і вачам сваім не вераць. Няўжо рэвалюцыя пачынаецца? Няўжо канец панскім катаванням?

З кароткаю прамовай выступіў Данілюк.

— Як выдно, то вам добрэнько жывэться з осаднықамы... Окружылы тут воны вас, як саранча... Поілы вашы зэмлі, поідають душу, а вы собі ручку під щочку і спітэ...

Данілюк для большай вобразнасці нахіліў галаву набок і прыклаў далонь да шчакі. У слухачоў, асабліва ў жанчын, вочы большалі, разбягаліся, напаўняліся смехам.

— Мусыть, вы і не чуетэ, як воны вас кусають, після заколыхвають — баю, баю... нэ плачтэ, Пілсудскі цукерэк прывэзэ, губы поможэ, хомуты поправыть, шоб нэ так муляли на вашых шыях...

У глыбіні натоўпу пачуўся смех, і зараз жа нехта сказаў:

— Чуем мы ўсё... бачым... але што ты зробіш, калі...

Солтыс, які ўвесь час сядзеў з апушчанай галавой, як звязаны, пры гэтых словах узняў вочы і паглядзеў на натоўп. А на яго паднятую галаву абрушыўся крыкам Макар:

— Ты чаго, атрута, узнімаеш галаву? Не падабаецца?.. Табе сказана — не варушыцца!

І нагайка Макара павісла над галавой солтыса.

Данілюк канчаў сваю квяцістую прамову:

— А тэпэр мы вам зайграемо... Тількі добрэ слухайтэ... Іграй, Ваня...

Песенька «В Богородском селе» была прыпевачнага характару, народжаная на рускіх прасторах, у час грамадзянскай вайны, якраз тады, калі ствараліся камітэты беднаты. Але ва ўмовах акупацыі на Беларусі яна перажыла некаторыя змены.

Ваня для ўступу па-заліхвацку затромкаў па струнах, і ўдалая песенька палілася:

В Богородском селе,
На завалинке,
Собрались мужички
Чинить валенки.

Пасля гэтай страфы ішоў перабор.

И давай рассуждать
О житье бедняков,
Как нам жить посреди
Кулаков и панков.

Как нам жить, беднякам,
Посреди богачей,
Терпеливо глядеть
На своих палачей.

Залівaецца балалайка пераборам. Людзі пазіраюць на Ваню, па балалайку, як на дзіва. Данілюк жа глядзіць паўзверх галоў натоўпу, бачыць, як ажыўляюцца твары. Наступае, што спявае Ваня, асабліва па душы слухачам:

Мы земельку возьмем,
Беднякам раздадим,
Всех панов обдерем,
А потом поглядим,
Проживут ли без нас
Мироеды-тузы,
Есть ли сила у вас,
Как твердили ксендзы.

— Добре слухайтэ... Цэ про вас... — устаўляе Данілюк.

К мужичкам ксендз идет,
Увивается,—
Комитет бедноты
Собирается...

Скончылася песня, і гаманок прашумеў па натоўпу. Антон працягваў:

— А тэпэр скажыть... е у вас у сэлі панска колка, чы ні? (Колка — па-беларуску азначае тое, што коле ў бок, а ў польскім гучанні — гурток якой-небудзь арганізацыі («кулко»). Усе гурткі, якія заспавалі фашысты на вёсках, сяляне для знявагі ахрысцілі — «колка»).

— Няхай солтыс скажа! — крыкнуў нехта з натоўпу.

— А-а-а... солтыс... нешта ён, як быццам, хворы ў вас,— азваўся Макар,— можа, даць яму панюхаць табакі? Слухай, солтыс, ёсць колка?..

— Так жа ж... Так жа ж... — заскрыгатаў солтыс,— усе ведаюць, што колка ёсць... Паляўнічая колка...

— Паляўнічая? Вунь што-о-о... — працягнуў Макар,— за зайцамі гоняцца. Гэта нездарма,— яны ведаюць, што будуць уцякаць адгэтуль, як зайцы.

— Так веды нас, солтыс, у тую колку... Мы не там помацаем...— сказаў Данілюк.

— Так жа яна... Так жа яна... вось тут недалёка... Самі знойдзеце...

— Гэ!.. то ты, брат, заіка, аказваецца,— сказаў Макар,— хочаш, каб мы цябе вылечылі ад заікання?

Прыйшлі ў прасторную кулацкую хату, яшчэ новую. Чырванашчокі гаспадар, падобны на шамана, з валасамі, якія леглі яму аж на каўнер, устаў з лавы.

Ён глядзеў на наўстанцаў спадылба, шчокі яго бялелі. На сцяне віселі два паляўнічыя плакаты. Данілюк пачаў іх разглядаць.

— Цэ що?.. Ты тут стріляеш? Сам сэбэ намалював, чы як? — спытаўся Данілюк.

Гаспадар маўчаў.

— Дарэмна твая работа, дзядзька... — І Данілюк так рвануў плакаты са сцяны, быццам хто стрэліў — гэтак залапатала тоўстая папера...

— Пропало... більшэ стріляты нэ будэш...

Крыху ў аддаленні ад ікон вісеў невялічкі партрэт Пілсудскага ў рамцы.

— А гэта хто? Твой сваяк? — пытаўся Макар.

Гаспадар моргаў брывастымі вачыма, не ведаў, што гаварыць.

— Ат... хлопцы павесілі...

— Якія хлопцы? Твае?

Макар павольна ламаў рамку перад вачыма гаспадара, а потым рваў партрэт на кавалачкі.

— Даў бы ему поцілуваты. А то так відразу і голову одорвав. Нэхай панюхав бы...— раіў Данілюк.

— Вінтоўку маеш? Кажы... Бо як знойдзем, пашкадуеш...

Гаспадар біў кулаком у грудзі, бажыўся:

— Далібог... от, каб мне з гэтага месца не сысці, што няма... Сыны маюць дубальтоўкі...

Хлопцы заглянулі ў шафку. Там ляжалі кнігі і канцылярскія паперы гуртка. Пачалі разглядаць. Апрача паляўнічых брашур, былі і палітычныя: «Няволя камунізма», «Шляхта засцянковая — апора польскасці на «крэсах» і іншыя.

— То ты вучоны, дзядзька,— гаварыў Данілюк,— а выглядаеш, як воўк. І воўчыя кнігі маеш.

— Як цябе зямля носіць? — наступаў Макар.

— А што я? А што я? — адпекваўся гаспадар.

Уся воўчая бібліятэка да апошняй кніжачкі і паперкі была знішчана.

Яшчэ засталося перапісаць членаў паляўнічага гуртка, што хлопцы і зрабілі. Па загаду гаспадар прынёс з сенцаў адну дубальтоўку і аддаў. Потым пайшлі адбіраць дубальтоўкі ў другіх. Але не ўсе члены былі дома — пайшлі на паляванне.

Пры адыходзе сказалі гаспадару:

— Твой сын старшыня гуртка? Так? Скажы яму, каб ён ім не быў... Бо прыйдзем і з дымам пусцім хату да бога.

...Паўстанцы, прабіраючыся да асадніцкіх хутароў, пад вечар паткнуліся на паліцэйска-асадніцкую засаду. Сілы былі амаль роўныя. Добра, што ўпару паспелі легчы і распаўзціся ланцугом, а то маглі б нямала страціць сваіх. Нясмела ляцелі стрэлы з боку засады. Паўстанцы доўга не адказвалі. Адпаўзлі да кустоў пад абстрэлам, там перабеглі, прыгнуўшыся, і ўдарылі засадзе ў бок. Гэта вырашыла ўсю справу — засада пачала ўцякаць.

Недалёка відаць былі злавесныя хутары з белымі чарапічнымі дахамі. Накіраваліся да іх. Не засталі там ні жывой душы. Падпалілі пяць хутароў і ланцугом, адзін за другім, падаліся ў лес.

Паўстанцы, стоячы ўначы на ўскраіне лесу, бачылі, як гараць не толькі тыя хутары, што яны падпалілі. У другім баку ўздымаліся асобныя зарывы. Нехта паліў яшчэ...

Калі праз дзень прыбыў атрад коннай паліцыі і коннай жандармерыі, паўстанцы падаліся назад у напрамку Дзядоў. Дачуліся па дарозе, што па чыгунцы едзе войска. Тады вырашылі схаваць зброю і часова разысціся па лясных работах. Падзяліліся на групы па дзесяць чалавек і пайшлі рознымі напрамкамі.

Група Антона Данілюка падышла да чыгуначнай будкі. Усім хацелася піць. Выцягнулі са студні поўнае вядро халоднай, празрыстай вады.

— Піце, хлопцы,— сказаў Данілюк,— ды хутчэй... — Неспадзявана з будкі выйшаў сяржант жандармерыі і з ім два салдаты.

Гутарка была кароткая. Не дапамаглі ні дакументы, ні апраўданні, ні просьбы. Усе былі затрыманы.

...Стаіць Люба на гары сярод глухой ночы і ўслухоўваецца ў шум соснаў. Можа, у ім пачуе знаёмыя крокі. Яны ціхія, нячутныя, але яна навучылася іх пазнаваць. Навучылася з таго часу, калі Макар адыходзіў на ваенную службу і ціха ўвайшоў да яе ў сенцы, выклікаў на вуліцу. Ноч была цёплая, духмяная. Праз празрыстыя бялявыя хмары прабіваўся серп месяца. І пайшлі яны тады, хаваю-

чыся ад людзей, загуменнем за вёску і дайшлі аж вось да гэтых соснаў. Кожны падарожны, асабліва ўначы, абавязкова спыняецца тут, сам нават не ўсведамляючы чаму. Мусіць, вабіць людзей іх ціхі супакойваючы шум, у якім чалавек забываецца на момант аб згрызотах жыцця.

Стаіць Люба, захутаная ў цёмную хустку, загубленая ў змроку сярод соснаў. Успамінае, як развітаўся з ёю Макар, адыходзячы ў салдаты, як абяцаў пісаць лісты, як туліўся да яе крамяных дзявочых грудзей, як цалаваў у бялявыя шчокі... Казаў:

— Як вярнуся са службы, ажэнімся, Люба... Чакай мяне... Два гады — час нядоўгі...

А Люба ў адказ спакойным рухам рукі, як сталая жанчына, якая шмат чаго перажыла, здымала кепку з галавы Макара, гладзіла па яго валасах і гаварыла:

— Ажэнімся,— батрачыць пойдзем, Макар. Задурыла нам у галовах...

І яшчэ мацней туліла да сябе галаву Макара, як сваю здабычу, якой ніхто ў яе не адбярэ.

— Глядзі, стрымай слова. Буду чакаць. А як не стрымаеш, выйду замуж за кулацкага сына, вунь таго, з Буславіч, Арсена... Прыязджаў жа раз у сваты. Кветка ў кішэньцы. Шапка на вуха. І чубік, зачэсаны на шапку... ды такі худзенькі чубік, як у курыцы. Але ўсё ж такі чуб... — пастрашыла Макара Люба.

Макар адвёў галаву ад грудзей Любы, доўга глядзеў ёй у твар сваімі адважнымі вачыма і, расцягваючы, сказаў:

— Т-ы-ы... за кулацкага сынка?.. Ды гэтыя сосны паломяцца ад бунту, калі так станецца. Не, Люба, ты гэта так сабе гаворыш.

А Люба працягвала:

— Гарачы ты, Макар, і шчыры. Будзеш служыць,— глядзі, з панамі не задзірайся, бо загінеш за нішто... Вернешся — тут знойдзеш сваё.

Макар адслужыў два гады, прыслаў не адзін ліст Любе.

Вяртаючыся са службы, Макар злез з поезда на станцыі Залатая гара і зайшоў у Дзяды адведаць сябра Антона Данілюка. Так і не даехаў да Любы: паклікалі яго з сябрам народныя буры на Валынь, у Заходнюю Украіну...

Прыходзіў Макар пядаўна ў Запалянку ўначы. Пасядзеў з Любай амаль да світання і пайшоў, сказаўшы: «Вярнуся праз дзень. На ўсякі выпадак сустрэнь мяне, Люба, на гары пад соснамі...» Макару карцела даведацца, ці

вярнуўся Данілюк. Гэта важна, гэта вельмі важна. Калі вярнуўся, прывядзі яго сюды, у Запаляпку, да Петруся Хадыкі. Няхай захопіць свае сталярскія прылады і пажыве тут з месяц у якасці вандруючага сталяра, пакуль асядзе паліцэйска-шпікоўская небяспека. Тады заручыцца дакументам у солтыса і вернецца назад, у Дзяды.

Калі ж арыштаваны, то трэба самому трымацца напагатове.

Стаіць Люба. Шум соснаў калыша яе думкі. Нішто не парушае цішыні ночы. Чуе яна душою, што павінен прыйсці Макар. І ён прыйшоў. Зашуршаў пясок на дарозе пад быстрымі крокамі. Макар спыніўся. Пастаяўшы, сышоў з дарогі ў сосны. Ціха клікнуў: «Люба!..» Цёмная постаць аддзялілася ад сасны і накіравалася да Макара.

— Ну, вось я і прыйшоў, Люба...

— Бачу, што прыйшоў. А мне здалося, што я столькі стаяла, колькі ты ішоў.

— Доўга? Нічога, больш ужо не пайду. Майго Данілюка арыштавалі жандары.

Яшчэ доўга гутарылі Макар з Любай і рушылі дахаты толькі тады, калі пачулі, што ў вёсцы нехта спявае. Хто б гэта мог быць?

— Ды хто? — кажа Люба,— дзядзька Анупрэй... Як заўсёды... Зачасціў нешта хадзіць да Антолі. Нелады ў яго дома з дачкою, з прымаком. Нават на табаку грошай яму не даюць. А ён жа што заробіць, аддае на гаспадарку. Крыўдзяць дзядзьку...

Па пустой, соннай вуліцы плёўся п'яны Анупрэй Чарняк. Амаль з самага ранку прабыў ён сёння ў Антолі — рабіў ёй цэбрык. Дзень быў хоць пахмурны, але цёплы, і Анупрэй размясціўся з работай на падворку. Выйшла з прасніцаю і Антоля, год за сорак жанчына, з маладжавымі шчокамі. Пачалі падыходзіць суседзі, якім, здаецца, не было чаго рабіць. Вось нядаўна два дзядзькі сядзелі ў хаце, курылі, плявалі сабе пад ногі, глядзелі ў акно і спрачаліся — не жарты — па тэму геалогіі.

З акна далёка відаць хутар у полі. Адзін дзядзька пачухаў патыліцу, пазяхнуў, глянуў у акно і сказаў:

— Мне здаецца, што зямля паніжэла...

— Чаму? — пытаецца другі.

— Бо той вунь хутар яшчэ больш схаваўся за горку. Бачыш? Паглядзі... Спярш больш было відаць, а цяпер ён страхою апёрся аб горку. Бачыш?

Другі дзядзька выцер нос і адказаў:

— То, можа, гара падпялася?

— А чорт яе ведае. Можа...

Дзядзькі доўга глядзяць у заседжанае мухамі акно, глядзяць на той далёкі хутар, які папыла губляецца сярод поля, і не ведаюць, на чым спыніцца — ці хутар асеў у зямлю, ці гара падпялася? Урэшце, пазяхнуўшы, выходзяць на вуліцу і заходзяць на падворак Антолі. Нешта Анупрэй раскажа.

Прыйшлі. Там ужо сядзеў Пятрусь Хадыка — «сват» Анупрэя. Ён угаворвае цётку Антолю згадзіцца, каб Анупрэй перайшоў да яе жыць.

— Ой, не да жыцця мне, не да любошчаў,— адказвае Антоля і, заружавеўшыся, залівaецца смехам.

— Го-го, любошчы... — кажа Анупрэй, спыніўшыся стругаць клёпку,— я вам раскажу пра любошчы...

Ён выцер пот з ілба, сеў на варштаце, пачаў набіваць люльку. Закурыць не прапанаваў нікому.

Мінулі тыя часы, калі пачаставаць махоркай было звычайнай справай. Цяпер прыйшоў страшны вораг — манаполь. Паспрабуй пасадзіць табаку — за адзін корань заплоціш штрафу сто дваццаць злотых, за якія можна купіць дзве каровы. Мусіш купляць толькі панскую табаку, плаціць за пачку махоркі пуд жыта. Няхай выбачаюць дзядзькі, можна даць раз пацягнуць з цыбука, а не больш...

Анупрэй раскурыў люльку і пачаў:

— Гэта было-о-о... яшчэ пры цары... Пазнаёміліся на кірмашы хлопец з дзяўчынай. Іх вазы якраз стаялі побач. Дзяўчына сядзела на возе. Бацькі, вядома, пайшлі па справах, а яна пільнавала воз. Тое самае рабіў і хлопец...

Анупрэй пачаў ужо добра ўваходзіць у ролю расказчыка, як раптам асеннюю цішыню пад пахмурным небам агаласіў крык на вуліцы. Адкуль што ўзялося? Ішла, засопшыся, Таццяна Ціханчук і несла паўмяшка травы на плячах, а за ёю дыбаў раз'юшаны Мікіта Лазун.

— Аддасі, паскудніца! — крычаў Мікіта і стараўся подбегам не адстаць ад Таццяны.

— А хваробу! — крычала Таццяна, агніста азіраючыся на Мікіту.

Анупрэй змоўк. Увагу ўсіх звярнула гэтая цікавая пара.

— Вось вам любошчы, — сказаў Хадыка.

Таццяна спынілася ля сваёй хаты, якая стаяла наўскос Антолінай. Калі яна адной рукой адчыняла веснічкі, а другой трымала мяшок, Мікіта рвануў ззаду, і мяшок вы-

слізнуў з рукі Тацяны. Яна, сагнуўшыся, схапіла за канец мяшка, пераскочыла на падворак і пацягнула мяшок паўзверх веснічак. Пачалася ўпартая цяганіна — Тацяна цягнула сабе, а Мікіта сабе. Лазун кректаў, цягнучы мяшок:

— А здохнеш — аддасі...

— Хутчэй ты здохнеш, а не вырвеш...

— Ну, гэта пачалося надоўга,— сказаў Хадыка,— працягвай, дзядзька.

Анупрэй крыху паглядзеў на цяганіну, сказаў: «Бач, бач, Тацяна перацягвае. Э-эх... каб крыху, то ўжо...» Потым махнуў рукою і працягваў далей:

— Так, значыць... Разгаварыліся яны. Хлопец з дзяўчынай. Так слова за слова...

— А трэснуць твае рукі! — хрыпеў Мікіта.

— А лопнеш ты! — сапла Тацяна.

Усе глянулі на хату Тацяны і слухалі далей.

— Спадабалася хлопцу дзяўчына... Як кажуць, у душу запала з першага разу. Ну што ж... дамаўляецца хлопец, каб прыйсці да яе. Дзяўчына кажа: «Прыходзь». Лёгка сказаць — «прыходзь»... Дзяўчына жыла за васемнаццаць вёрст ад хлопца... І што б вы думалі? Пачаў хлопец хадзіць да дзяўчыны. Схадзіў раз, і з таго разу кожны вечар... Як толькі прыйдзе з поля або з сенакосу, тое-сёе павячэрае — і да яе... васемнаццаць вёрст пехатою...

— Пусці, нягодніца! — крычаў Мікіта.

— Адыдзі, душагуб. А то вочы заплюю! — адказвала Тацяна. І мяшок пачынаў заўзята смыкацца зноў па веснічках — то ў бок Мікіты, то ў бок Тацяны.

— ...На світанні вяртаецца хлопец дахаты і ідзе з бацькам касіць. Калі бацька куды адвернецца, ён шусь у кусты галавою і спіць. Бацька гляне — няма сына... Крыкне... Сын устае з кустоў і зноў за работу. А надыдзе вечар — васемнаццаць вёрст бяжыць да яе...

— Ты пусціш ці не?! — крычаў Мікіта.

— Не дачакаешся ты! — адказвала Тацяна.

— Ой... мусіць, яны палопаюць з гэтым мяшком. Як не брыдка гэтаму Мікіту,— казала, не вытрымаўшы, Антоля.

— Што ты яму зробіш? Можа, надарвецца, халера,— прамовіў Пятрусь.— Ну і што далей, дзядзька?

— Што далей? Так хадзіў хлопец усё лета. Бацькі не ведалі, куды ён ходзіць. Надышла восень. Хлопец паехаў у сваты. ...Ну і, вядома, ажаніўся. Вось якія любошчы бы-

валі па свеце. Нешта цяпер пе чуваць такіх... — скончыў свой расказ дзядзька Апупрэй.

Потым глянуў на «мяшочнае адзінаборства» і крыкнуў:

— Трымайся, Тацяна! Схапі мяшок за рог! За рог!

— Не паддамся, Апупрэйка, не бойся! — адказвала Тацяна.

— А ты... глядзі... каб у цябе... каб у цябе... язык не высах! — хрыпла крыкнуў Мікіта ў бок Апупрэя.

— У мяпе-то так-сяк. А ў цябе ён ужо высах,— пе застаўся ў даўгу Апупрэй.

Невядома, як доўга працягвалася б барацьба, каб не прыйшоў сын Мікіты Кузьма.

Ён адразу накінуўся на бацьку:

— Як табе не брыдка? Людзей смяшыш... Бацька, кінь.

— Пайшоў вон! — крыкнуў Мікіта і захрыпеў на Тацяну: — Я з цябе кішкі выматаю.

— Лоппуць твае! Не хопіць сілы, жываед! Сабакар Ельскага!

Гэта дадало злосці Мікіту. Ён тузануў мяшок з усёй сілы. Можа б, і вырваў, але мяшок трэспуў і дзіркай зачапіўся за сук жэрдкі.

Кузьма не вытрымаў. Падышоў і знізу штурхануў мяшок так, што ён вырваўся з рук Мікіты і перакуліўся праз веснічкі да Тацяны. Тая кінула яго аж пад парог хаты і пачала дзякаваць Кузьме:

— Дзякую, Куземка, дзякую, саколік... Гэта ж не жарты... Сустрэў мяне на дарозе і адразу — аддавай мяшок, мая трава... Я сваёй атавы нажала вупь над рэчкай... Гэта ж падумаць, вярнуўся за мною аж сюды...

Мікіта адсопваўся і крычаў:

— Яшчэ ты ў мяне пападзешся! Яшчэ я з цябе скуру злуплю!

— Каб з цябе канавалы лупілі, за што ты будзеш мяне лупіць? — пе паддавалася Тацяна.

— Ідзі, бацька, дахаты. З бабай ваяваць — гэта смех.

У адказ Мікіта штурхнуў Кузьму ў грудзі. Кузьма схапіў бацьку за рукі і пачаў клікаць на дапамогу:

— Дзядзька Апупрэй, Пятрусь, хадзіце звяжам старога звера.

Мікіта вырваўся з рук Кузьмы і пайшоў па вуліцы.

— Жылавы яшчэ твой бацька,— сказаў Пятрусь.

...Усё ж такі дамовіўся «рыцар» Апупрэй са сваёй Дульцынеяй за цэлы дзень. Антоля ўрэшце сказала так, пяўзнак:

— Пераходзь... Няхай цябе... Прычапіўся... Толькі глядзі каня прывядзі з сабою.

— Гэ-гэ-гэ... — зарагатаў Анупрэй,— ды не толькі каня, а і калёсы, санкі маляваныя.

Зацягнулася бяседа за сталом. Гэта былі свайго роду запоіны. Анупрэй хацеў быў начаваць у Антолі, але яна не дазволіла.

— Ці мала і так языкамі трэплюць. Нашто, каб яшчэ больш... Ідзі дахаты.

Анупрэй паслухаўся і пайшоў па пустыннай вуліцы, як кажуць людзі, «курэй лавіць».

Ішоў, спатыкаўся, урэшце ўдарыўся аб плот, памацаў яго рукамі, запытаўся:

— Хто гэта? Гэта ты, вядзьмар Мікіта? Чаго маўчыш? А... заняло табе...

Анупрэй адрываўся ад плота і, блытаючыся нагамі, ішоў наўскасяк на другі бок вуліцы і зноў натыкаўся на плот.

— Што табе за халера? Зноў ты... цьфу! Бадай цябе чэрці ў лазе задушылі. Чортава бяльмо...

Урэшце, намацаўшы нейк гладкую сцежку нагамі, пайшоў, хістаючыся, проста. І тады заспяваў:

Дзям'ян за плотам «казлы дзярэ»,
А Мікіта носам арэ.
Ах, каб чэрці вас пабралі,
Як вы меру перабралі.

Тупнуўшы нагою, выкрыкваў:

Гоп трала! Гоп трала!
Чаму дома не была!

Так дайшоў Анупрэй да спаленага клуба.

Развугленыя галавешкі блішчалі ў цемры. Налёты ветрыку часам падхоплівалі і неслі іскры.

Анупрэй спыніўся над пажарышчам і загаварыў:

— А-а-а... Ва імя айца і сына... Барсукова крамка згарэла... Ха-ха-ха!.. Петрусю іграць і спяваць не дазволілі, га?! Не дазволілі?! Дык вось вам... вось вам...

Змоўк Анупрэй, сон посам, звесіўшы галаву. Потым усадзіў руку ў кішэню, пачаў шукаць люльку. Шукаў доўга, усё гробся на дну кішэні, нахіліўшыся набок, і мармытаў адно слова: няма... няма... не... ёсць... ёсць...

Выняўшы люльку, крыкнуў: «Сцяпан! Адгукніся!.. Няма... Няма... Толькі паны... Толькі паны... бізуны... Андрэй! Не паддавайся!»

І Анупрэй затрос кулаком над пажарышчам.

Люльку прыкурваў доўга, усё нагінаўся над попелам, каб узяць вугалёк. Прыкурыць яму ўсё ж такі не ўдалося. Анупрэй паклаў люльку ў кішэню, памахаў пальцам па пажарышча, ледзь не ўпаў, хіснуўшыся, і мармытнуў:

— Больш сюды не прыедзеце, тапканогія хлюндры...— Затым так пачаў пляваць, быццам хацеў запляваць усё вуголле.

— Цьфу! Цьфу! Цьфу!.. Вось вам!

І паплёўся па вуліцы.

Праз некаторы час пачулася ў канцы вёскі:

Ах, каб чэрці вас пабралі,
Як вы меру перабралі...

Ніхто не выйшаў далучыцца да горкай весялосці Анупрэя. Вёска спала цяжкім сном.

## НОВЫ ПАН

Надышла восень — такая ж цёмная, тужлівая, як тады, у той год, калі быў спалены клуб. Сонца прадзіралася праз хмары, як праз лясныя гушчары. Збажына ўжо знята з палёў. Ранкамі на зямлі, на траве, на дрэвах, на саламяных стрэхах ляжаў лёгкі налёт намаразі, прадвеснікі першых замаразкаў.

Панылыя, невясёлыя дымы віліся з комінаў хат. У агародах насвіліся коні. На вуліцы сям-там можна было бачыць, як жанчыны бралі ваду ў студнях. На полі засталася адна работа — капаць бульбу. З мужчын на вуліцы відаць толькі два чалавекі — адзін ходзіць з хаты ў хату, а другі ідзе пасярэдзіне вуліцы і плача. Першы — гэта Мікіта Лазун — наймае капальніц бульбы. Другі — Рыгор Малахай. Што за ліха? Ніхто не хоча ісці да Мікіты на работу. У кожнай хаце людзі панурыя, маўклівыя. Кожная жанчына адмаўляецца, гаворыць, што трэба капаць сваю. Увіхаецца ля хат Мікіта, цопаючы кіем па зямлі, і сам сабе мармыча: «Разбагацелі ўжо... Некалі, нябось, прасіліся...»

А Рыгор Малахай сціпае вялікімі босымі ступнямі, карáвай далонню выцірае слёзы і прыгаворвае: «Ах, прасвятая багародзіца, збавіцель высокі, нашто ж такое няшчасце?»

Якая-небудзь цётка спытаецца:

— Чаго ты плачаш, дзядзька?

— Ох, як жа ж мне, міленькая, не плакаць? Зайшоў у хлявец, а мой бычок нежывы... Нежывы, галубка, ляжыць, адкінуўшы ножкі. На чым я цяпер буду ездзіць? Няма майго кармільца... І што яму зрабілася? Сянца напач падкінуў, усё як мае быць... А тут — на́ табе...

А дзе хто з людзей скажа Рыгору:

— Чаго ты плачаш? Паліцыянты табе другога купяць.

Рыгор палахліва зіркне вачыма на чалавека і раптам зробіць такі выраз твару, як быццам ён гэтых слоў не чуў.

На самай справе Малахай ішоў у Глушэц, у пастарунак, расказаць аб сваім горы. Думаў, што цяпер будзе перцу гэтым свістунам, што яму, жабраку, усюды падстаўляюць ногі.

Ніхто не пайшоў капаць бульбу да Мікіты Лазупа.

Хацеў ён ужо запрэгчы каня і пад'ехаць у шляхецкі засценак — там заўсёды ахвотнікаў многа, не толькі дзяўчат, але і хлопцаў,— як верхам на капі прымчаўся сынляснік і паведаміў, што ў графа Ельскага ўдар паралiча, што граф вельмі слабы. Тры дні назад прыехаў сын графа Мечыслаў у форме падпалкоўніка блакітных уланаў, з жонкаю і сынам, нешта шасці год, які завецца Бропісь.

— Удар?! — крыкнуў Мікіта, спыніўшыся на хаду пасярэдзіне хаты. І бяльматае вока вострым позіркам застыла на сыне.— Удар, кажаш? Божа літасцівы... Нядаўна ж смяяўся, жартаваў са мною, абяцаў даць мне повага гатунку канюшыны... Ах, ах...

Сын працягваў:

— Газету прачытаў і...

— А-а-а... газету? Можа, там што было напісана такое?

— Пра Саветы нешта... Казала ахмістрыня... нейкую там чыгунку вялікую пабудавалі, недзе ў Сібіры ці дзе... Я добра не ведаю. Ці капал. Нешта тарочыла ахмістрыня. Я не дапытваўся...

Мікіта соп носам, намагаўся ўцяміць, што да чаго, і махнуўшы рукою, сказаў:

— Дабра не будзе на свеце...

— Нямеччына нешта пагражае Польшчы... Хоча горад адзін забраць, што на моры. Забыўся, як ён завецца... Хлеб, кажуць, яшчэ патанее...

Мікіта зыркнуў на сына і апусціў руку на стол.

— Можа, бог святы адверне ад нас. Я ж кажу... Я ж кажу — дабра не будзе на свеце. Калі нават свістуны ў вёсцы робяць што хочуць, дзе ты тут дачакаешся дабра?

— Зараз аканом павінен прыехаць, на бульбу наймаць... — сказаў сын.

— Я ўсе хаты абышоў,— ніхто не захацеў ісці. Што ім парабілася, халера іх ведае.

— Ахмістрыня прасіла, тата, каб ты прыйшоў. Можа, ты ведаеш, чым людзі лечаць параліч. У графа змярцвела нага... Ахмістрыня прасіла, каб аб гэтым ніхто не ведаў... Бо дахтары нічога не зробяць...

— Хто ж бы гэта тут у нас? — прамовіў Мікіта. Ён доўга думаў, думаў... — Можа, Зязюліха што знае? Яна ж пярэпалахі качае дзецям. Некалі ў мяне была скула села на локці, то яна параіла абкладаць валовым гноем... Трэба ісці... Можа, і пану графу прыдаўся б валовы гной?

Мікіта хутка апрануўся, узяў кій і пайшоў.

Прыехаў аканом верхам на кані, пачаў склікаць жанчын, каб яны ішлі капаць бульбу. Жанчыны сходзіліся і ўрэшце натоўпам акружылі аканома, закідваючы яго пытаннямі. Аканом круціўся ў сядле, падкручваў вус і крычаў:

— Больш аднаго злота не будзе... Усюды так плоцяць...

— А тры не дасі? — крычалі бабы.

— Я ж вам кажу дакладне... Маёнтак вам, пане, не бюро дапамогі... Чэго кшычыце, як вроны? — кінуў аканом апошнюю фразу па-польску.

Выступіла Люба Гарагляд і сказала:

— За адзін злоты не пойдзем капаць...

Аканом змоўк, падкруціў вус і прамовіў:

— Ідзіце ў маёнтак, там пагаворым...

Жанчыны з кошыкамі ў руках шумнай талакою рушылі за аканомам.

Люба, старшыня забастовачнага камітэта, ішла разам з усімі.

Насустрач пасоўвалася ля плота, трымаючы гліняны чарапок, жонка солтыса Барсука. Заходзіла ўжо нешта ў дзесятую хату, і ніхто не хоча пазычыць солі.

Усёю вёскай праводзіўся байкот канфідэнтаў, паліцэйскіх служкаў.

Нездарма злуецца, губляецца ў здагадках Мікіта Лазун, нездарма пайшоў у пастарунак Рыгор Малахай.

Нездарма солтыс Барсук нешта на год быў крыху прыціх з прычэпкамі да моладзі пасля таго, як ПецconfigЦіханчук здратаваў яго авёс. А цяпер зноў падняў галаву. Наваліўся быў на Макара Краўчука — чаго ён тут жыве? Проста ўжо крычаў :«Вон з вёскі, прыблуда!»

Хлопцы параілі, каб Макар сышоў куды-небудзь, пакуль надыдуць лепшыя часы. Макар падаўся на чыгунку, на рамонтныя работы. Дваццаць з лішнім кіламетраў аддзялялі яго ад вёскі Запаляпкі, а ён амаль кожную нядзелю прыходзіў да хлопцаў, да Любы.

Так прайшло больш года. Урэшце Дзям'ян Гарагляд даў згоду, каб Макар з Любай пажаніліся.

— Жаніцеся... Што зробіш? А то пастарэеце, тады не да жанячкі. Усяго таго і жыцця, пакуль маладыя, пакуль сілы носяць... Жаніцеся, неяк пражывём... А там, можа, што лепшае надыдзе. Не можа быць, каб не надышло...

Спяшаўся Мікіта Лазун у маёнтак да графа Ельскага. Аж крылы світкі развяваліся, як ён ішоў па алеі ў палац. Каб дайсці да ахмістрыні, трэба было прайсці крыху праз сад. Ідучы па дарожцы саду, Мікіта ўбачыў хлопчыка, які ехаў яму насустрач на дзіцячым веласіпедзіку.

Такі чысценькі, харошы хлопчык, такі беленькі, як анёлачак. Уміліўся Мікіта і падумаў: «Мусіць, гэта і ёсць сынок сына графа, што прыехаў з Варшавы». Азірнуўся Мікіта і ўбачыў: на балконе палаца стаіць афіцэр, а з ім нейкая пані, відаць, яго жонка. Ах, не ведае чалавек, дзе яго сустрэне няшчасце... У Мікіты аж сэрца пайшло ў пяткі ад рабскай адданасці, ён не вытрымаў, падышоў да хлопчыка і тры разы яго пацалаваў. Няхай бачаць панкі, што Мікіта верны графу чалавек, што на яго можна спадзявацца ва ўсякай прыгодзе. Ад гэтага і яму нешта прыбудзе. Не паспеў Мікіта адысці дзесяці крокаў, як пачуў, што нехта бяжыць за ім. Агледзеўся — той самы пан афіцэр з бліскучым кіёчкам, які вісіць у пана начэплены раменьчыкам на руку. Такі самы кіёчак і ў пані. «Мусіць, хочуць падзякаваць мне,— падумаў Мікіта,— вядома, бацькі». А ў гэты самы момант удары пасыпаліся на галаву Мікіты, ды такія пякучыя, як бізуны. Ой, божа ж мой, адкуль гэта? Што гэта?

А расчырванелая пані з пенай на вуснах як крыкне ў вушы Мікіту:

— Ты, хаме, як смееш цалаваць нашае дзіця?!

Тое самае паўтарыў і афіцэр.

Мікіта адняў рукі ад галавы, якімі прыкрываўся ад удараў, і збянтэжана, заікаючыся, выціснуў з сябе:

— Ой, божа ж ты... паночкі... міленькія... Ці ж я думаў...

Паны яму не далі скончыць.

— Яшчэ смееш гаварыць, хаме!.. Цыц! — прыкрыкнуў графскі сын Мечыслаў Ельскі.— Прэч адгэтуль!

Панскія кійкі зноў узняліся над галавою Мікіты. Тады ён зыркнуў на паноў бяльматым вокам з такою рабскай крыўдай-пакорай, што Ельскі з жонкай аж пераглянуліся паміж сабою. Астыўшы ад злосці, яны наглядзелі ўслед Мікіту, які аддаляўся па дарожцы. Ён усё дакранаўся да галавы, не то мацаючы, не то папраўляючы шапку.

Недалёка, за яблыняй, стаяў Пілін Гайдук і бачыў усё няшчасце Мікіты. А ля палаца чакаў маладога графа аканом. Смяяўся дзябёлы служака, гледзячы на ганьбу Лазуна. Толькі ён ведае панскія норавы і ўмее ім патураць. Калі трэба, то і скуру здыме з чалавека. А цяпер у яго аж плечы трасуцца ад смеху і хочацца яму нават крыкнуць: «Мацней яму! Мацней! Няхай ведае, як абыходзіцца з панамі!»

Аканом чакае графа — прыйшлі капальніцы, трэба дамовіцца аб плаце.

Малады Ельскі вярнуўся і запытаўся ў аканома:

— Цо то за хлоп?

Па дарозе да капальніц аканом нешта таямніча ўпаўголаса тлумачыў графу. Мечыслаў Ельскі галавы павярнуць не можа. На патыліцы чырванее вялікі шрам наўскасяк — падарунак храбрага камандзіра партызан Сцяпана Каваля. Калі трэба што сказаць ва ўпор каму-небудзь, Ельскі паварочваецца ўсім тулавам. Як звязаны, ідзе малады сын графа — няма ўжо тых рухаў, што некалі. Служыць ён у Варшаве, у кадэцкім корпусе, начальнікам інтэндэнтуры, да страявой службы лічыцца непрыгодным.

— Ого, колькі дзяўчат прыгожых прыйшло! — ускрыкнуў граф.— Ну што? На працу? Добра, добра...

— Не толькі дзяўчаты, але і старыя ёсць,— адказала член забастовачнага камітэта Таццяна Ціханчук,— толькі невядома, колькі вы нам заплоціце?

Ельскі стаяў, заклаўшы рукі назад, і не ведаў, што гаварыць. Павярнуўся тулавам да аканома з нямым пытаннем.

Аканом адразу ўзяўся за справу.

— Я вам казаў, адзін злоты...

— Не, не пойдзем! — гукнулі сялянкі.

— Цішэй, вароны! Закаркалі...

— Дасцё тры злотых, тады пойдзем,— сказала Таццяна Ціханчук.

— А дзесяць не хочаш? — дражніўся аканом.— Дык

вось што... Хто хоча ісці капаць за паўтара злотых, стапавіцеся вось тут — направа, а хто не хоча, заставайся на месцы.

Ніхто не скрануўся з месца. Усе стаялі і маўчалі.

Аканом свідраваў вачыма натоўп жанчын і панукваў: «ну... ну... ну...»

— За паўтара злотых не пойдзем,— прамовіла Таццяна Ціханчук,— толькі за тры...

— Хутчэй тры скулы табе вырасце!.. — крычаў аканом.

— Няхай расце, не баімося,— адказала Таццяна.

— Можа, камуністы вас падгаварылі?! — распінаўся аканом.

— Цо, цо, цо... — павярнуўся тулавам да аканома Ельскі,— камуністы? Тут ёсць камуністы?

— Ёсць, пане графе, а дзе іх няма?

Ельскі памахаў пальцам і прамовіў:

— Глядзіце, я на камуністаў маю лекі. Хто з вас тут камуністка?

— Вы нам дайце тры злотых у дзень і пойдзем капаць... Якія тут камуністы? — сказала зноў Таццяна.

— Хадзі сюды, баба,— ківаючы пальцам, паклікаў Ельскі.

— А чаго я пайду?

— Выходзь, калі пан граф кліча,— вызверыўся аканом.

— А што я танцаваць буду з панам графам?

— Вывесці яе,— загадаў граф.

Аканом падаўся да Таццяны, каб схапіць за руку, але Люба Гарагляд перагарадзіла яму дарогу, а за ёю і ўсе жанчыны.

Аканом спыніўся, збіты з тропу, і крыкнуў:

— То чаго вы хочаце?!

— Тры злотых у дзень,— адказала Люба...

— Не будзе вам тры злотых.

— Як не будзе, то пойдзем дахаты.

Жанчыны шумна адвярнуліся ад графа і аканома і пайшлі налявой дарогай на шлях.

— Яшчэ прыйдзеце, папросіцеся, але будзе позна.

— Прыйдзеш ты да нас! — гукнулі жанчыны.

На шляху сустрэлі вялікую групу жанчын, сярод якіх былі і хлопцы. Яны ішлі са свайго шляхецкага засценка да Ельскага капаць бульбу.

Люба Гарагляд спыніла іх, і на шляху пачаўся сапраўдны жаночы мітынг, у выніку якога і засцянкоўцы павярнулі дахаты.

Забастовачны рух ахапіў усе навакольныя вёскі і перадаваўся далей.

...Праз некалькі дзён у вёсцы Запалянцы адбыліся дзве падзеі: адна — прыйшоў з турмы Андрэй Касцевіч і другая — на бліжэйшую нядзелю было прызначана вяселле Макара Краўчука з Любай Гарагляд.

Змрочнай, а галоўнае, пустыннай здалася Андрэю свая хата. Вочы, па старой прывычцы, шукалі бацькі. Вось ён прыйшоў з надворка, запылены, стомлены, і сеў ля стала адпачыць, выкурыць цыгарку.

Няма,— пуста за сталом. На сцяне вісіць сталярская пілка, тарчаць долаты за бэлькай, даўно не кранутыя. Незвычайна ціха ў хаце. Толькі змрочныя цені рухаюцца, асядаюць па кутках. Асірацелыя цені. Радзішчаў, спавіты сутоннямі змроку, як пакінуты адзін на полі бою, застыў у глыбокай задуме. Напэўна, чуе, як за акном, седзячы на плоце, каркае варона, і думае:

«Ці не груганы злятаюцца над пабоішчам — на бясконцых шляхах народнага жыцця?» Там навіслі хмары і выюць начныя ветры.

Добры дзень, грамадзянін Радзішчаў! Сіла рэвалюцыі жыве ў нетрах прыгнечаных, там, дзе жыве народная праўда. Бачыш, высакародны грамадзянін, як сумна, цяжка ў хаце. І ніхто не прымае так блізка да душы гэтага суму, цяжкасці, як тыя, хто зразумеў рэвалюцыю, што яна — адзіны выхад, каб пакончыць з народнай нядоляй, хто зразумеў рэвалюцыю, як лакаматыў гісторыі. Народу не патрэбна пасіўнае шкадаванне, пасіўнае спачуванне яго нядолі. Такое шкадаванне вырастае ў ханжаства, у двурушніцтва. Народ патрабуе актыўнасці, рэвалюцыйнай практыкі.

Прыйшла маці з поля, абветраная, пастарэлая, і, відома, пасля прывітання заплакала. Плакала яна над усім жыццём, якое пражыта, якое яшчэ трэба пражыць. Яна — вартаўніца быту, і кожная болька яго адзначана ў яе на сэрцы. Яна надалей падтрымлівае гэтае вогнішча, каб не згасла. Прыйшлі хлопцы, дзяўчаты, прыйшлі старыя — суседзі, сябры бацькі. Усе віталіся з Андрэем, усе былі рады яго прыходу, але... неяк задумваліся, пасеўшы на лавах. Ідуць людцы, усё ідуць у турмы, вяртаюцца і зноў ідуць. Чым жа гэта ўсё скончыцца?

А паны ўсё больш і больш лютуюць. Нават людзі па адным ціха, асцярожна, выходзілі з хаты, быццам баяліся пакрыўдзіць госця сваім адыходам.

Уночы прыйшоў Саша Грыпявіцкі.

Доўга гутарыў з ім Андрэй, выслухаў расказ Сашы аб падпольнай рабоце, аб сваёй нядолі падпольшчыка.

— Не, Саша, у дэфу ісці не трэба,— заб'юць... Знойдзем спосаб... Падумаем...

Саша, урэшце, сказаў, што прынёс лістоўкі,— пакінуў іх у Пеці Ціханчука.

Назаўтра Андрэй зайшоў да Пеці, каб прачытаць іх. У лістоўках пісалася аб фашысцкім тэроры, аб яго ахвярах. За апошнія часы звар'яцела ад катаванняў у дэфензіве семнаццаць камуністаў, не адзін замучаны насмерць. Вылучалася такой работай асабліва дэфензіва брэсцкая, пінская, потым ішла беластоцкая, навагрудская. Гаварылася яшчэ аб з'яўленні на гарызонце новай палітычнай партыі пад назвай «нацыянал-сацыялістычная», якую ўзначальваў нейкі Акінчыц. Гэтая новая партыя кінула лозунг: «Смерць камуністам!», патрабавала фізічнага знішчэння камуністаў.

Андрэй паківаў галавою і сказаў сам сабе: «Гэта гітлерызм у беларускай вопратцы». Ці не ён, гэты прахвост Акінчыц, быў юрысконсультам у цэнтральным камітэце Грамады, бо часта ў газеце з'яўляліся яго юрыдычныя парады? Відаць, што той.

Вось яно — усё больш і больш выкрываецца асінае гняздо, якое падставіла пад удар фашызму народ.

Ці не з'явіцца «карычневая кніга» ў Польшчы, як яна з'явілася там, у Заходняй Еўропе, аб зверствах гітлерызму? Кніга пішацца ўжо...

Увечары Андрэй у хаце Дзям'яна Гарагляда склікаў сход камуністаў і камсамольцаў. Расказаў аб міжнародным становішчы, аб фашызме ў Германіі і Польшчы, аб дасягненнях у Савецкім Саюзе, аб тактыцы барацьбы супроць фашызму — аб стварэнні народнага фронту. Трэба разбіць фашысцкія гурткі ў вёсках... Трэба ўзмацніць барацьбу з канфідэнтамі... Трэба авалодаць вясковай радай... Усё трэба і трэба.

А маці просіць, каб больш пабыў дома, каб пажыў спакойна. Не, гэтага спакою ўжо не будзе да канца.

На нарадзе прысутнічаў Краўчук Макар, Піліп Гайдук з маёнтка Ельскага. Макар пасля нарады набраў лістовак і панёс іх аж у шляхецкі засценак, дзе была ваенна-фашысцкая арганізацыя моладзі «Стралец».

Піліп панёс у маёнтак. На нарадзе падзялілі насель-

ніцтва вёсак на ўчастκі. Кожны ўзяў сабе ўчастак для штодзённай работы з людзьмі, для пастаяннай агітацыі.

Жаночая забастоўка была выйграна. Дакладвала аб ёй Люба.

...Недзе ля Брэста паліцэйскія зграі праводзілі па вёсках крывавыя пацыфікацыі...

* * *

Андрэй вярнуўся з поля крыху раней, чым прыходзяць звычайна. З задаволеннем пакапаў бульбы на адкрытых палетках, застыўшых у ціхім марыве асенніх бляскаў сонца. Прывольна дыхаецца там. Адчуваецца, што людзям радасней, лягчэй робіцца на сэрцы, калі дакранаюцца матыкай да зямлі. А варта вярнуцца ў змрочныя хаты, дзе агаляецца перад вачыма ўся шэрая брудная беднасць, як усе клопаты і згрызоты калючкамі ўпіваюцца ў сэрца. Над гэтым змрочным жыццём павіснуў меч ката. Яго адчуваюць старыя і малыя, ад яго не спяць маці начамі, выціраюць маўклівыя слёзы, і дзяўчаты свае найлепшыя жаданні аддаюць тым маладым, што пайшлі скаваныя па шляху...

Андрэй падрыхтаваў дроў. Прыйдзе маці з поля — трэба ж варыць вячэру. Бачыў пад павеццю пяць гатовых вулляў, а шосты няскончаны. Не здзейснілася мара бацькі, калі перад ад'ездам з Расіі гаварыў маці: «Нічога, яшчэ зажывём... Завядзём пчол... сад...» Замест пчол, дарагі бацька, паны напладзілі нам вос... Яны лезуць ва ўсе шчыліны нашага жыцця, каб пакінуць сляды сваёй атруты.

Андрэй прыйшоў у хату, памыўся. Выцершыся, сеў за стол, каб падумаць аб такой справе, аб якой ніколі яшчэ не думаў. Заўтра вяселле Макара і Любы.

Будзе шмат людзей — будуць не толькі са сваёй вёскі, але і з іншых. Магчыма, прывалачэцца і паліцыя.

Трэба падказаць дзядзьку Дзям'яну, каб не клікаў на вяселле нікога з хеўры Лазуна і Барсука. Трэба падрыхтаваць хлопцаў да сякіх-такіх нават тостаў. Цяпер без палітыкі жыцця няма. Усё для палітыкі. Бо два лагеры сталі адзін супроць другога. І барацьба між імі не сціхае ні на адну хвіліну. Трэба будзе сачыць, каб не пракраўся які злыдзень і не зрабіў правакацыі. Вось, дзядзькі, да чаго мы дажыліся — усе сталі палітыкамі. Скажуць, даўней гэта было непатрэбна. Няпраўда, даўней таксама рабілася палітыка. Толькі верхаводзілі ў ёй багацеі — ім была ўступка, пачэснае месца, было прыдобрыванне, каб у ліхую

гадзіну можна было вымаліць у іх што-небудзь за свае мазалі. А цяпер багацеі ўжо адціснуты. Прыгнечаныя занялі свае пазіцыі і стаяць на іх моцна, спяваюць песні пра краіну, дзе сонца ўзышло,— пра Краіну Саветаў, якую называюць сваёю бацькаўшчынай. І таму палітыка цяпер пачынае ахопліваць нават жыццёвыя дробязі.

Так думаў, думаў Андрэй і хутчэй адчуў, чым заўважыў, як нехта пераступіў парог хаты, спакойна зачыніў дзверы і сказаў: «Добры дзень!» Потым запытаўся, ці тут жыве Касцевіч Андрэй. Чалавек быў у шэрым плашчы, у кепцы, з гальштукам. За плячыма невялічкі клуначак, кіёк у руцэ. Згары ты з гэтай цёмнай хатай — адразу і нельга разгледзець чалавека. Андрэй, быццам крадучыся, ціха падышоў да яго, потым неяк аж зжахнуўся, абхапіў прыбыўшага за плечы.

— Санкоўскі? Як гэта?

— От, браце Анджэю, неспадзяванка для цябе,— ведаю,— гаварыў Санкоўскі, скідаючы клуначак.

Андрэй дапамагаў яму распранацца.

— А ведаеш, Анджэю, я ішоў... Ішоў і ў вёсцы не пытаўся, дзе ты жывеш, а вось трапіў...

— То недзе пытаўся за вёскай... Мусіў пытацца...

— Так, за вёскай,— адказаў Санкоўскі.

— І табе сказалі пра шпакоўню?

— Во, во, пра шпакоўню...

— Гэта ўжо было не толькі з табою,— адказаў Андрэй. Санкоўскі сеў на лаву і адразу пачаў пытацца:

— Як у цябе тут, спакойна?

— Дзе ты цяпер знойдзеш спакой?

— Так... правільна. Усюды цяжка...— адказаў Санкоўскі,— да народнага фронту пераходзім... Фашызм лютуе...

Сябры дамовіліся, што Санкоўскі будзе выдаваць сябе за беспрацоўнага, сябра Макара Краўчука, тым больш што па краі ходзяць людзі ў пошуках работы.

— Стась таксама, як і я, працуе чатыры дні на тыдзень,— сказаў Санкоўскі, успомніўшы пра Барвіна,— прадукцыя завода не мае збыту. Праца на заводзе спынена на тыдзень. Рамантуецца рухавік.

Урэшце Санкоўскі пачаў гаварыць пра тое, чаго чакаў Андрэй. Нездарма ж завітаў Санкоўскі.

— Я прыехаў сюды на адзін дзень, а каб можна было, то на адну-дзве гадзіны,— сказаў Вацлаў Санкоўскі і раптам спытаўся: — А дзе твая сям'я?

— Яшчэ ў полі...

— Ага-а... Карэльчука ў вас не чуваць?

— Не-е...

— Нашы прадчуванні аказаліся правільнымі, Анджэю... Ой, якімі правільнымі. Карэльчук — правакатар вялікага маштабу. Зусім ужо зросся з дэфензівай. Наша арганізацыя прыняла рашэнне знішчыць яго. Колькі ні сачылі — не ўдалося. У апошні час некуды знік... Няма... Відаць, перакінулі ў другую акругу, дзе яго яшчэ не ведаюць. Наша турма напхана яго ахвярамі.

— Не, не чуваць яго тут,— сказаў Андрэй,— каб быў, то так ці інакш мы ведалі б.

— Паслалі мяне сюды — адно — у разведку, а другое — для папярэджання... Калі з'явіцца тут, старайцеся знішчыць абавязкова. Ёсць меркаванні, што ён або ў Навагрудскай акрузе, або ў Віленскай. Людзі паехалі і туды. Невядома, як ім удасца... Стась паехаў у Вільню... Наша работа ў акрузе паралізавана.

Сапкоўскі змоўк, круціў цыгарку, не спяшаўся з гутаркай, бо ў галаву набягала столькі, што адразу сказаць немагчыма.

— А Чарапіцкі? — спытаўся Андрэй.

— Працуе... Халера яго не брала. П'е кроў з нашага брата... Ён сваёю смерцю не памрэ, Анджэю. Што зрабіць? Фашызм гадуе сабе катаў... Ой, гадуе...

Прыйшоў Макар. Ён хацеў параіцца з Андрэем адносна вяселля. Пазнаў яго Сапкоўскі, называючы «музыкам». Вырашылі разам, што Сапкоўскі, як знаёмы Макара, пабудзе на яго вяселлі, пасля чаго Макар адвёў Сапкоўскага на сваю кватэру, да сапраўднага музыканта Петруся Хадыкі. Перад іх адыходам Андрэй сказаў Макару пашукаць Сашу Грынявіцкага, каб той прыйшоў.

Самае сапраўднае вяселле пачалося тады, калі маладыя вярнуліся з царквы. Вырашылі разам з дзядзькам Дзям'янам, што ў абстаноўцы паліцэйскага тэрору, усякіх шпікоў лепш будзе для ўсіх, калі маладыя паедуць у царкву. Бо спачатку як маладыя, так і сам Дзям'ян мелі намер справіць вяселле без царкоўнага шлюбу. Але потым згадзіліся. Шлюб у царкве можа некалькі прытупіць пільнасць паліцыі, што і патрэбна для захавання людзей, для ўмацавання працы. Тым больш, згарэў клуб, а паліцыя яшчэ не прыходзіла. Трэба думаць, што можа прыйсці. Хаваецца ж Саша Грынявіцкі, а яна яго шукае. Безумоў-

на, мае вока па Запалянку. Яна ведае, што вядзецца барацьба і супроць канфідэнтаў.

Такім чынам, маладыя на чале з новаспечаным сватам Анупрэем паехалі ў царкву.

Некалькі сталоў, ссунутых у адзін, былі пакрыты белымі саматканымі абрусамі. На іх стаяла розная страва. Быў тут застылы, як азерцы, студзень у гліняных місках. Халоднае парэзанае мяса ляжала больш у талерках. Смажанае сала з яйкамі жаўцела на патэльнях, а побач з ім бялела, як бручка, сырое сала.

Некалькі стосаў грэцкіх бліноў узвышалася паміж міскамі. Ляжалі драўляныя лыжкі рознай велічыні і колеру, пазычаныя ў суседзяў. Некаторыя з лыжак былі доўгія, як стрэльбы, а іншыя выглядалі, як апалонкі, абчэсаныя сякерай. «Не бяда, абы было што за губу ўкінуць,— кажуць часам сяляне,— калі разбагацеем, то тады захочацца і лепшай лыжкі». На пярэднім стале, які ўпіраўся ў покуць, красаваўся пасярэдзіне круглы на ўвесь стол бохан хлеба з запечанымі шышкамі, аздоблены галінкай зялёнай сасны. Гэта каравай.

На самым покуце, дзе месца бацькі маладой Дзям'яна і свата Анупрэя, шклянымі горлачкамі блішчаць бутэлькі з гарэлкай. За імі ў кутку стаіць зажынкавы сноп жыта. На стале пакуль што адна бутэлька, абвязаная чырвонай стужкай, якая бантам красуецца над коркам разам з жытнімі каласкамі. Гэта бутэлька свата. Так вялося здаўна. Так яшчэ не забыліся рабіць і цяпер. Першымі селі за стол маладыя з маладою, якіх прывітаў Дзям'ян абдымкам і пацалункам. Не расчульваўся Дзям'ян, як гэта бывае ў такіх выпадках. Наадварот, быў жартаўлівы, вясёлы, захаваў прастату, пачуццё меры ў адносінах да маладажонаў. Старым цёткам, якія бачылі на сваім жыцці многа вяселляў, гэта не зусім спадабалася. Ім бы хацелася, каб Дзям'ян заплакаў.

Не, цёткі, цяпер, відаць, і тут нешта новае ўварвалася.

Ля маладога сеў Анупрэй, ля Любы пасадзілі Вацлава Санкоўскага. А побач сеў Андрэй. Насупраць размясцілася дружына — дзяўчаты ў барвінкавых вянках з адмысловымі вясельнымі кветкамі, прышпіленымі на левым баку грудзей. Такія ж кветкі ў маладых адрозніваліся ад іншых колерам. Люба ў вуалі выглядала, як русалка, якая выйшла з падводнага палаца і стаіць на беразе ракі ў месячным ззянні. Макар падобны на бурлака, якому давялося на дарозе зрабіць прывал і добра памыцца, прыча-

саць чупрыну. Ён сядзіць свежы, малады, гатовы ў новае падарожжа. Маладыя паводзяць сябе незалежна — смяюцца, жартуюць... Люба нават дзе што папраўляе на стале — то міску пераставіць, то пераложыць лыжку. Старым цёткам таксама гэта не падабаецца. Яны б хацелі, каб маладыя сядзелі ціха, крыху сароmеліся, апускалі вочы і каб маладая пусціла слязу. Як сабе хочаце, цёткі, не тыя ўжо часы і не тыя маладыя.

Усе госці ўжо селі за сталы. Чакаюць Дзям'яна, яго каманды. А Дзям'ян са сваёй Маланняй пайшлі чагосьці ў камору, і іх яшчэ няма.

За самым апошнім сталом сядзяць музыкі — гарманіст Пятрусь Хадыка і ўся яго капэла — два скрыпачы, два цымбалісты і барабаншчык Лявон, які нават паголіўся, бо заўсёды сваю бараду выстрыгае нажнічкамі. Яму, відаць, хочацца есці, бо ён коўтае сліну і часта выцірае нос, разгладжвае свае зрэдку пасівелыя вусы. Такая ўжо доля музыкаў спрадвеку — сядзець на лаве там, дзе стаяць гаршкі, дзе памыйніца пад лавай, і чакаць, пакуль гаспадыня падпясе ім па чарцы і па кавалачку мяса. Але сягоння музыкі сядзяць за сталом. Хоць за апошнім, але ўсё ж такі за сталом.

На ўсю гэтую ўрачыстасць глядзіць са сцяны, з невялікага партрэта ў пафарбаванай рамцы засмучаны Янка Купала.

Дзе ж затрымаўся той Дзям'ян? Усё яшчэ няма. Гасцям нават робіцца ніякавата. Наўскос Андрэя сядзіць маладая жанчына з дзіцем на руках, чарнабровая, з крыху смуглявым тварам, такая рухавая, што ні хвілінкі не пасядзіць ціха. Яна стрыжэ навокал быстрымі вачыма, то хустку сваю паправіць, то з дзіцем гаворыць:

— Ціха, Зосечка, ціха... Зараз дам, дам цыцонкі-заяршонкі...

І пачынае карміць сваю Зосечку...

А Дзям'яна ўсё яшчэ няма. Нейкая ў яго няўпраўка. Чарнабровая, пазіраючы на ціхае застолле, не вытрымала і заспявала:

Чаму, госці, не п'яце,
Не закусваеце?
Ці мой хлеб не скушон,
Ці мой мілы не слушон?

Па тварах усіх гасцей прабегла ўсмешка. Вочы глядзелі на спявачку. А яна і не сціхла, а працягвала далей:

Як мой хлеб не скушоп,
То я выпалаю,
Як мой мілы не слушоп,
То я выкараю-ю-ю...

Жанчыны загаманілі наперабой:

— О! Хіба што так...

— Ты свайго і выкарала... Сядзіць, як высмактаны...

Ля боку чарнабровай сядзеў яе муж з упалымі шчокамі, ціхі, як святы, па выгляд шмат старэйшы за сваю быстравокую.

Спявачка скончыла, пасадзіла дзіця па калепі і топам, які не церпіць пярэчання, сказала свайму ціхаму:

— Падсунь, Тараска, мне тую місачку...

— Дзе? Якую? Гэту ці...

— Ой, цябе носам тыцкні, то тады хіба... Вось гэту...

— То пачакала б, пакуль...

— Я дзіцяці дам, нягода ты...

Вярнуўся Дзям'ян і замахаў рукамі:

— А... Няхай яго... Выбачайце, госцейкі, пачала нешта цячы кадушка з агуркамі... Дык вось затрымаўся...

У другі час пасыпаліся б парады, як залатаць кадушку, пыталіся б, дзе купіў ці рабіў сам... Цяпер жа ніхто аб ёй ні слова не сказаў, хоць кожны ў душы палічыў такую прычыну затрымкі Дзям'яна важнай. Вядома, важнай... Бо як жа дапусціць, каб цякла кадушка? Але важней, што Дзям'ян прыйшоў. Ён узяў ужо бохан хлеба з покуця і нарэзвае лусты, кастром кладзе перад сабою, просіць гасцей, каб перадавалі далей. Малапня прынесла агуркоў ужо некалькі місак і села побач з Дзям'янам. А ён ужо бутэльку за бутэлькай пасылае па сталах. Зараз пачнецца самае галоўнае. Анупрэй, чакаючы, не закурыць ужо другой люлькі, а барабаншчык Лявон перастане коўтаць сліпу.

Дзям'ян налівае чарку, налівае яе павольна, асцярожна, налівае з пашанай, у прытоенай цішыні застолля, як быццам тут адбываецца нешта таямнічае.

Падняў чарку Дзям'ян і азірнуў усіх добрымі вясёлымі вачыма.

Ім, гэтым вачам, здаецца, цяпер толькі надышоў час не злаваць, не тужыць, не моршчыцца ад згрызотаў, а паглядзець на людзей спакойна, зычліва і пажадаць усім дабра... толькі дабра...

— Дарагія госці...— пачаў Дзям'ян,— дарагія суседзі, сваякі, старыя і маладыя... і ты, Маланпя, жонка мая... Дазвольце благаславіць наш хлеб-соль на добрую бяседу,

каб нашы маладыя жылі дружна, цешыліся, як кажуць, адно адным у долі і ў нядолі на славу ўсім добрым людзям, на страх тым, хто не дае нам жыць. Беднаваты наш стол, дарагія госцейкі, але... не наша ў гэтым віна... што зробіш? Трэба спадзявацца, што дачакаем лепшага. Хоць бедны стол, але наш. Ні ў каго мы нічога не прасілі, нікому не кланяліся, ніякаму багачу, ніякаму пану. Свой мазоль — зарука ўсяму. Толькі на яго і трэба спадзявацца... Будзьце здаровы, госцейкі! Вып'ем за здароўе маладых!

Дзям'ян чокнуўся з Макарам і Любай, і ніхто не згледзеў, як ён перакуліў чарку. Не закусваючы, зараз жа наліў другую. Што хацеў ён казаць пад другую чарку, невядома, бо чарнабровая крыкнула: «За Маланню выпіць... яна ж маці, дачку гадавала...»

Дзям'ян зірнуў на чарнабровую і пачаў:

— Вып'ем, госцейкі, за маю жонку, за маці... Добрая жонка, дай бог кожнаму такую...

І чарка, крутнуўшыся ўверх дном, апусцела.

Дзям'ян не чакаў, пакуль там хто вып'е, налівае наступную чарку і прыгаворвае:

...У хаце і ў полі...

Чарка — хлоп — і апусцела.

...І з сярпом і з цапом...

Чарка — хлоп — і накрылася.

...Улетку і зімою...

...Пад дажджом і пад страхою...

...З песняй і слязою...

Кожная прымаўка падмацоўвалася чаркай. Невядома, колькі яшчэ было б прымавак, каб Малання не пачала спыняць Дзям'яна:

— Ой, даволі, а то ўп'ешся... Што ты робіш?

Дзям'ян усміхаецца, трымаючы ў руках чарку з бутэлькай, хоча наліваць яшчэ, але Маланля схапіла яго напалыселую ўжо галаву рукамі і пачала цалаваць у пасівелую скронь. Захапленням жанчын не было канца.

Дзям'ян сеў і пачаў закусваць.

Усё застолле ўжо гуло.

Неяк крыху забытым сядзіць разам з гасцямі Нічыпар Байдак. Праўда, ужо вясёлы ён, гутарыць, усміхаецца, але час ад часу ўсё пазірае на пярэдні кут. Дзям'ян пасля сваіх «тостаў», разглядзеўшыся па людзях, паклікаў яго і пасадзіў побач. Як жа не пасадзіць, адну ж палітыку вядуць, адно гора збываюць за другім. Здаецца, усё на-

прыстойнела, калі заблішчала вялікая лысіна ў канцы стала.

Вацлаў Санкоўскі, праслухаўшы слова Дзям'яна, а потым выпіўшы пару чарак, зусім адчуў сябе, як сярод сваіх. Гутарыць з Любай, сыпле жартамі. Заінтрыгаваны Санкоўскім, дзядзька Анупрэй нагінаецца да яго, кідае свае заўвагі. Макар нешта шапнуў яму, і Анупрэй павёў гутарку з Дзям'янам.

Дзям'ян устаў. Усе паволі прыціхлі.

— Ёсць у нас паважаны госць — друг зяця майго Макара, друг Андрэя, сына друга майго Сцяпана Паўлавіча — хай лёгкім будзе яму сон... Адна нядоля людзей яднае і робіць братамі. Таварыш з Польшчы ідзе, працы шукае, не мае дзе галавы сваёй прыхіліць, бо няма ў яго ні хаты, ні зямлі... Некалі яны разам грузілі шпалы ў Залатой гары. Вось адкуль знаёмства і брацтва. Прывітаем жа чаркай нашага паважанага госця. Няхай весялейшым будзе, няхай адчувае, што яго акружаюць свае людзі, верныя людзі...

На адказ падняўся Санкоўскі...

— Браты!..— пачаў ён па-польску,— дзякую гаспадару, гаспадыні і ўсяму дому, што аказалі мне чэсць пабыць на вяселлі друга нашага Макара, пасядзець за адным сталом з Андрэем вашым, як некалі ляжалі разам на нарах. Дзякую ўсім прысутным гасцям за ўвагу... Доля наша адна... Думкі нашы адны... І дай божа, каб яны збыліся...

— Збудуцца,— крыкнула чарнабровая, а з ёю і ўсе.

Устаў Андрэй і падняў тост за тых, хто за кратамі.

Шчокі ў чарнабровай расчырванеліся. Яна сядзела, як пава, харашылася, не ведала, па чым спыніць свае вочы. Штурхнула локцем свайго ціхага мужа, у якога ад выпітай гарэлкі заблішчалі шэранькія вочкі, і сказала:

— Вылезь, Тараска, з-за стала... Прынясеш з рук Зоську. Бачыш, пасля цыцонкі-завяршонкі заснула... Трэба пакласці ля печы...

Тарас дажаваў нешта, выцер далоняй адтапыраныя вусы і пачаў круціцца то ў адзін бок, то ў другі, аж пакуль не адважыўся ўстаць і падняць нагу, каб перакінуць яе цераз услон.

— Паварочвайся ты, як тоў нядошлы конь... Хутчэй...

— А куды ты спяшаешся? — мармытнуў Тарас.

— Пагавары, пагавары яшчэ трохі...

Падышла Малання, звярнулася да чарнабровай:

— Наталля...— А потым зашаптала ёй нешта на вуха. Наталля заківала галавой і сказала: «Добра, добра...»

Наталля — галоўная каравайніца. Паклаўшы дзіця, яна выйшла з Маланняй у сенцы і прынесла адтуль стос ручнікоў. Першы ручнік належыць свату. Наталля і павесіла яго на левае плячо дзядзьку Апупрэю, працягнула наўскос цераз грудзі, як генеральскую стужку, і зашпіліла шпількай ля правага боку. Так па парадку абдзяляла ручнікамі ўсіх мужчын, хто ўдзельнічаў у свіце маладога і маладой.

За апошнім сталом, насупраць барабаншчыка Лявона, сядзеў даўгашыі русавалосы мужчына сярэдніх год. Наталля павесіла ручнік і яму. Даўгашыі — радня жонкі Дзям'яна. Але слаўны ён тым, што быў камандзірам эскадрона башкірскай дывізіі ў час грамадзянскай вайны, ваяваў супроць белапалякаў. Першы са сваім эскадронам уварваўся ў Брэст. Яго ў вёсцы так і завуць — «Даўгашыі».

Ён ужо, як кажуць, пад градусам. Кудлаціць пяцярнёю свае валасы і прыстуквае кулаком па стале. Ківае Петрусю — пара іграць.

Пятрусь ужо і сам думае пачынаць. Падае каманду сваёй капэле. Музыканты выйшлі з-за стала, селі іменна там, дзе заўсёды,— на лаве, ля апошняга акна. Паставілі перад сабою ўслон. Гэта для цымбалістаў — бацькі з сынам. Пятрусь сеў пасярод скрыпачоў і расцягнуў гармонік.

Лявон, ужо не такі тужлівы і худы, якім быў спачатку бяседы, узброіўся бубнам.

Гармонік зайграў, смыкі скрыпачоў паплылі па струнах, заценькалі цымбалы... А бубен зашапацеў, задрабіў...

Танец быў, можна сказаць, незвычайны.

Даўгашыі ўстаў, крыкнуў: «Расступіся!» І зачасціў сваімі цяжкімі ботамі па ўтаптанай гліняпай падлозе. Нахіляўся з боку на бок, расправіўшы рукі.

Дзяўчатачкі хвалёныя,
Грачанікі пячоныя,
Дзяўчатачкі хвалёныя,
Грачанікі пячоныя...

І ўпрысяд —

Ух-ма — хвалёныя,
Ух-ма — пячоныя!..

І пайшоў... І пайшоў...

А насустрач — не вытрымала галоўная каравайніца. Узяўшыся ў бокі, тупнула нагою, ускінула галавой і паплыла па кругу.

Я й пі Тацяна,
Я й пі Маруся,
Я нікому не казала,
Я й пі баюся.

А камандзір сваё:

Ух-ма — хвалёныя,
Ух-ма — пячоныя!..

Гэта быў толькі ўступ.

Размашыста расцягваў гармонік Пятрусь, плылі смыкі па струнах скрыпак, звонка ценькалі цымбалы — усё зліваласяў стройную мелодыю народнага танца. А бубен шапацеў, драбіў, скакаў у руках Лявона. Сталы ў вачах гасцей захадзілі хадуном.

Пачаў праясняцца засмучаны твар Янкі Купалы. Андрэй устаў і крыкнуў:

— Дзверы шырэй! Усе на двор. Няхай пачуюць пашы... там... за мяжою!

Замалая хата, каб паказаць сябе. Госці з шумам усталі і павалілі на двор услед за музыкамі.

А там... а там адкрыўся прастор для Вацлава Санкоўскага. Ужо за сталом ён пакручваў вус, гарэлі яго вочы, раздзімаліся ноздры.

Ён нахіляўся да Любы і гаварыў... Не, не гаварыў, а быццам шчабятаў, кідаў ласкавыя слоўцы, ценькаючы польскія словы.

На двары музыкі зайгралі «Кракавяк».

Эх, затанцаваў жа Санкоўскі! Паплыў у першай пары з Любай. То нагою тупне, то лясне абцасамі ботаў, то да вуса дакранецца рукою і закружыць Любу лёгка, плынна, дакладна. А як возьмецца леваю рукою ў бок, крыху прыгнецца і загляне ў вочы Любе. Прыгожа танцуе Санкоўскі! Горда танцуе Санкоўскі! Гордасць народа польскага, які не схіляў галавы перад катамі, адчуваецца ў постаці Санкоўскага. Пары плывуць і плывуць у танцы. Санкоўскі толькі часам крыкне: «Жывей! Жывей!» Андрэй любуецца імі — гэтым вечна вандруючым рабочым, які так можа перайначыцца ў танцы, даволі толькі пачуць звон струны.

Андрэй нешта шэпча Петрусю Хадыку на вуха. Той усміхаецца і ківае галавою.

Музыкі сціхлі. Танец скончыўся. Санкоўскі, польскім звычаем, пацалаваў Любу ў руку, Дзям'ян Гарагляд, стоячы ля сцяны, мітусліва заморгаў вачыма і потым ласкавым

позіркам правёў сваю дачку, якая пайшла і села ля Макара.

Яшчэ адзін «цуд» давялося ўбачыць гасцям — гэта польскі народны танец «Обэрэк» у выкананні Санкоўскага. Людзі пыталіся адзін у другога,— мае гэты польскі таварыш косці ці не? Бо ў ім звіваецца, танцуе, здаецца, кожная жылка. «Обэрэк» — гэта разгульны танец-трасучка. Разгуляўся ж Санкоўскі ў ім! Кружыў дзяўчыну навокал сябе ва ўсе бакі, а сам ледзь датыкаўся нагамі зямлі. Прыпеўка вылятала за прыпеўкай у такт танца:

Не мув, Марыся,
Матцэ поводу,
Жэсь пошла вчорай
Аж до огроду —

Уха-ха! Уха-ха! Уха-ха! Уха-ха!

Пеця Ціханчук ціха падышоў да Андрэя і тузануў яго за рукаў.

— Што такое, Пеця?

— Ідзі на вуліцу, там чакае цябе адзін чалавек.

— Хто?

— Пазнаеш...

Андрэй выйшаў і ўбачыў ля сваёй хаты старога каваля Міхала. Ён стаяў ля плота з кіёчкам пад пахай і яшчэ здалёк усміхаўся Андрэю.

Пасля прывітання Міхал пачаў:

— Іду, Андрэйка, з Выжараў. У нас у Глушцы бяда за бядою. Наваліўся ксёндз Абпорскі, нагаворвае людзей, каб не ішлі да мяне з работай, каб нічога не неслі... Скажы, як мой Якаў там?

— Нічога, здароў. Яму застаўся яшчэ год. Хутка выйдзе.

— Што з таго, што выйдзе? Хадзіў я ў Выжары, там каваль хоча ад'язджаць некуды. Думаю, можа, перабрацца на яго месца.

Уздыхнуў стары Міхал і паківаў, бядуючы, галавою.

— А дом, а кузня? — спытаўся Андрэй.

— Што зробіш? Дом аддам каму-небудзь пад кватэру. Няма маіх сыноў, Андрэйка, усіх трох няма — пабралі. Няма ўжо ў мяне кавалёў. Вучыў, вучыў... Цяпер сам на старасці ўзяўся за молат. Што зробіш? Што зробіш? Вучу меншых...

— Няўжо так слухаюцца ксяндза, што ўжо і не ідуць да вас?

— У Глушцы з мяшчан ужо ніхто не прыходзіць. Мо-

жа, хто і прыйшоў бы, ды баіцца. Нясуць плугі ў кузню да ксяндза. І яшчэ адзін там ёсць каваль, нядаўна прыехаў. Дык і да яго. А да мяне і да іншых, такіх, як я, не... Хіба хто з вёскі... Цяжка, Андрэйка, ой, цяжка...

— Перабірайцеся ў Выжары, чорт з ім. У Выжарах возера ёсць, будзеце гадаваць гусей, качак. Агарод таксама... Людзі вам будуць рады,— сказаў Андрэй.

— Вось і я так надумаў, хоць вёска там усяго пяць хат. Трэба мне як-небудзь дайсці дахаты. Правядзі мяне, Андрэйка, за вёску. А то сабакі чапляюцца...

— Дзе сыны цяпер? — спытаўся Андрэй, ідучы побач з вышэйшым за яго Міхалам.

— Павезлі іх недзе аж пад Германію. Хаім прыслаў пісьмо з дарогі. Скажы, Андрэйка, што лепш пасылаць Якаву — пасылкі ці грошы?

— Лепш грошы. Бо з пасылкамі цяпер яны робяць, што хочуць. Калі пасылка больш паложанай вагі, забіраюць лішняе і аддаюць крымінальным. Лепш грошы, дзядзька Міхал.

— Як жа ты, Андрэйка, маешся? Здароўечка тваё? — ласкава пытаўся Міхал.

— Ды нічога...— Андрэй хацеў яшчэ нешта сказаць, але тупат ног за спіною звярнуў яго ўвагу. Ён агляну ўся. Гэта бег Дзям'ян, махаў рукою, прасіў пачакаць.

— Дзям'ян выдае дачку?

— Ага...

— Пачакайце! — крыкнуў, дабягаючы, Дзям'ян,— Міхал, зайдзі да мяне!.. Не мінай! Мы з табою заўсёды добра жылі...

— Дзякую, Дзям'ян.. Трэба дахаты... Пакуль я завалакуся. Дзякую. Хай будзе шчасце тваёй дачцэ...

— Не, не... Я не адступлю. Не бойся, ты ўжо стары, бабы цябе ў танец не зацягнуць.

— Адкуль ты ведаеш! — засмяяўся Міхал.— Не, Дзям'янка, пайду я дахаты...

Але тут пачаў прасіць і Андрэй. Міхал пацiснуў плячыма і жартаўліва сказаў:

— Што зробіш? Што робіць салдат, калі яго бяруць у палон? Бярэш ты мяне, Дзям'ян, у палон. Вядзі...

Дзям'ян схапіў Міхала пад руку, і ўсе пайшлі назад. Як толькі Міхал, высокі, з сівой шырокай барадой, у шапцы, як грыб, увайшоў на падворак, людзі з гоманам замахалі рукамі:

— Го! Міхал! Здароў, Міхал! — чулася з розных ба-

коў. Потым падбягалі па некалькі чалавек адразу, ціснулі руку Міхалу, расступаліся, давалі дарогу, віталі слаўнага каваля. А ў Міхала ўсмешка не сыходзіла з твару. Ён увесь час ківаў галавою, кожнаму хацеў адказаць на прывітанне. Усіх ведае Міхал, і ўсе ведаюць яго. Музыкі якраз ударылі «Яблычка».

Зноў камандзір эскадрона выйшаў на круг і пачаў пісаць упрысядкі:

Ой, яблычка,
І з цвяточкамі —
Ідзе бацька Будзённы
І з сыночкамі!

Тая ж самая чарнабровая каравайніца пусцілася ўслед:

Я на бочцы сяджу,
Паляцела пцічка,—
Мой муж бальшавік,
А я бальшавічка.

Міхал з усмешкай глядзеў на скокі і ўсё прыгаворваў:

— Бачыш... бачыш... Спрытна, спрытна...

Дзям'ян пацягнуў яго ў сенцы, а там — у камору.

— Толькі адну чарачку, Дзям'ян, толькі адну. А то ты мяне зваліш з ног,— прасіўся Міхал у каморы.— Ну, за тваіх маладых, каб здаровыя былі, каб жылі...

Спыніўся Міхал вачыма на Дзям'яне, трымаючы чарку, і ўпаўголаса дадаў:

— Каб яны... гэтым... гэтым,— усё паўтараў Міхал, а потым адважыўся даказаць: — Каб яны гэтым катам у рукі не траплялі! Будзь здароў, Дзям'ян.

Міхал выпіў, выцер далоняй вусы і прыняў ад Дзям'яна лустачку хлеба з халоднай цяляцінай.

Міхал не толькі слаўны каваль, Міхал свойскі, Міхал просты чалавек.

Дзям'ян сказаў:

— Паглядзіш на танцы яшчэ. Я скажу хлопцу — запражэ каня і падвязе цябе. Нашто табе, старому, тупаць такую далеч?

— О, гэта добра, Дзям'ян, гэта добра...— адказаў Міхал і пачаў весці гутарку пра сваю бяду.

У камору далятаў голас усё той жа неўгамоннай каравайніцы:

Паясочкі вытыкала,
На варотах вешала.
Дзесяць хлопцаў я кахала,—
Аднаго пацешыла.

Пачало вечарэць. Сосны з гары глядзелі на вёску — ціхія і магутныя, клікалі да сябе пад свой адвечны, заспакойваючы шум. Туды, да іх верхавін, ляцяць гукі цымбал, скрыпак, гармоніка і топуць у размераным шуме.

Андрэй прыйшоў да іх, каб перадаць ім свае думы і пачуцці. Няхай нясуць паўзверх лясоў у свет далёкі, праз межы, граніцы. Для думкі, для песні няма такіх перашкод, каб праз іх нельга было прайсці. Думкі, песні народаў сустракаюцца на сваім шляху, як даўнія, даўнія знаёмыя. Народнасць — крыніца мастацтва.

Андрэй прыйшоў да соснаў пасля двух танцаў, у якіх і ён прымаў удзел. Як жа плаўна плыла «Коробушка»! Яе размеранасць, яе народна-задушэўны рытм адчуваўся ўсімі, як свой, як даўно знаёмы друг-брат, які прыйшоў у госці з прыветнаю ўсмешкаю.

Спішна і натхнёна рабілася ў кожнага на душы. Пары плылі ў танцы як быццам сярод хвалюючага жыта, падстаўляючы свае твары прасторы палёў, насустрач лёгкаму ветрыку. Андрэй не вытрымаў, кінуў у ціхі вечар, што прасілася:

...Лен стлала до поздней ноченьки
По росистым по лугам!..

Гэта яна — «Катерherinушка». Яна ідзе па палях, па лугах у сонечным вянку народнай красы, і няма для яе ні межаў, ні граніц...

А потым прыйшла родная «Лявоніха». Здаецца, простая мелодыя «Лявоніхі». Не, гэта толькі так здаецца на першы погляд. А прыслухацца, тут вам чуецца крыўда, усмешка і іскрыстая весялосць.

Пасля «Лявоніхі» жанчыны ўзнялі Андрэя на «ўра». Весялуха-каравайніца крыкнула:

— Давайце, бабачкі, занясём яго аж у Маскву!

Ледзь вырваўся Андрэй з жаночых рук. Хацеў выйсці на вуліцу. Агледзеўся, а ўжо Санкоўскі падлятаў угару ў тых жа жаночых руках. Смяяўся Санкоўскі і ўсё крычаў:

— Досыць! Досыць! А то косці патрушчыце!

Падышоў Анупрэй, ажыўлены, рухавы. Нядаўна штосьці не відаць яго было на падворку, а тут раптам з'явіўся ды яшчэ ў новых лапціках, у беленькіх анучах. Што за прычына? Быў увесь час у ботах, і вось на табе — з'явіўся ў новенькіх да нагі лапціках. Нават яго Антоля падышла і гнеўна прыкрыкнула:

— Што? П'яны? Што гэта за выдумкі? Навошта гэтыя лапці? Людзей смяшыць?

— Пачакай, пачакай, пасмяешся і ты...

Анупрэй падбег да музыкаў і шапнуў нешта Петрусю. Той таямніча ўсміхнуўся і пачаў папраўляць пас гармоніка на плячы. Анупрэй тым часам шмыгнуў у хату і вынес адтуль доўгі, але вузкі, у адну дошку, услон. Музыкі ўдарылі польку. Што там значаць вашы «Грачанікі», «Кракавякі», «Лявоніхі»? Анупрэй хоча траханупь старыной, паказаць сваё.

Ён узлез на ўслон, азірнуў усіх пераможнымі вачыма, узяўшыся ў бокі. Пачакаўшы з момант, тупнуў нагою і падаўся па ўслоне, засемяніў белымі лапцікамі. Яны толькі мільгалі ў вачах, гэтыя лапцікі, дайшлі да канца ўслона і паплылі назад.

Анупрэй больш ужо не глядзеў сабе пад ногі, пазіраў удалечыню перад сабою. Самі ўжо лапцікі ведалі, дзе канчаецца ўслон, дзе трэба ісці наперад, а дзе назад. Так рабілі некалі свае танцоры-мастакі на вяселлях, на ігрышчах у корчмах. Чаму ж цяпер не паказаць гэты «цуд»? Вось Анупрэй яго і паказвае на дзіва і захапленне ўсім — Анупрэй танцуе польку «Вішню». Пазналі яе, пазналі ў першую чаргу жанчыны і час ад часу выкрыкваюць: «Жыве вішня!..», «Расце вішня!..», «Цвіце вішня!..» А дзядзька Анупрэй яшчэ шпарчэй перабірае нагамі, узмахвае рукамі, як крыламі, распраўляе грудзі і разгульна ўскрыквае: «У-ха!.. У-ха!»

А капэла пад бубен выгаворвае: бом-чы, бом-чы, бом-чы-чы-чы, бом-чы-чы-чы.

З натоўпу той-сёй скажа:

— Танцуе, як па кладцы цераз рэчку... Паспрабуй утрымацца, не ўпасці...

— Не, у ботах яе, гэтай полькі, не станцуеш... Толькі ў лапцях,— заўважыць другі.

— Вядома, што не... Бачыш, як гібле нагамі. Хіба ў ботах так можна? Ураз зваліцца з услона...

Траханўў старыной «рыцар» Анупрэй. Калі злез з услона, першы заапладзіраваў яму Санкоўскі, а за ім узнялася цэлая бура воплескаў. Жанчыны падхапілі Анупрэя і пачалі качаць з крыкам: «Жыве вішня!..», «Расце вішня!..», «Цвіце вішня!..»

Дзям'ян Гарагляд разам з Нічыпарам Байдаком падхапілі Анупрэя пад рукі і павялі ў камору на пачастунак.

...Шуміце, сосны, шуміце... Андрэй прытуліўся шчакою

да сасны і чуў, як мелодыі танцаў плылі па зямлі. Іх падхоплівалі сосны і самі звінелі, як струны. «Усё ж такі мне чагосьці сумнавата,— думае Андрэй,— як бы добра было, каб звон соснаў паслухала са мною яна...» Яна недзе ўжо на волі. «Як дайсці да цябе? Паслухаць твае словы — шчырыя і асцярожныя. Надзя, Надзя... Музыкі іграюць... Хутка апусціцца ноч на палі, выплыве месяц, загарацца нямыя, далёкія зоркі. Маладосць папросіць ласкі. А мне без цябе ніхто яе не дасць... Ніхто... Заўтра музыкі іграць не будуць. Заўтра я паеду ў разведку шукаць сляды здрады. Дзе падзеўся і што робіць Падаляка? А цяпер так хочацца, каб ты была са мною. Пайшлі б з табой дарогай у палявую цішыню, дзе я мог бы глянуць у твае вочы, як у азёрную глыб. Без тваіх вачэй адна струна ў вясельным ігрышчы іграе сумна. Я нікому, нікому аб гэтым не скажу...»

Музыкі перасталі іграць. Мусіць, госці хочуць вячэраць, канчаць вяселле Макара і Любы.

Вяселле — насуперак усяму. Няважна, што заўтра можа прыляцець са сваёй світай крывавы Дарванскі і налажыць ланцугі на маладыя трывалыя рукі. Так ужо сталася ў нас, што жыццё і барацьба, барацьба і жыццё неаддзялімы.

Любіць — значыць змагацца за лепшае заўтра. Нешта музыкі доўга маўчаць. Трэба ісці.

Андрэй вярнуўся на вяселле і ўбачыў на падворку незвычайную «падзею». Стаяў з кіем солтыс Барсук, п'яны, як ноч, пахістваўся і мармытаў:

— Я начальнік у вас? Не хочаце прызнаваць начальніка свайго? Разганю!.. Разганю!..

Побач стаяў Мікіта Лазун, пастукваў кіем у зямлю, таксама п'яны.

— Ёсць у вас Рада ў сяле ці не? — дапытваўся ён.— Хто старшыня? Га?

Солтыс тарочыў сваё:

— Прыблуду жэніце? Вы ўсе прыблуды! Камуністы! Дзе той прыблуда?

Усе прысутныя маўчалі. Дзям'ян здалёк кіўнуў пальцам, паклікаў да сябе Андрэя.

— Ты, палітык! Гэта твая работа?! — накінуўся на Андрэя Барсук.

— Ідзі спаць, дзядзька,— сказаў Андрэй.

— Спаць?!. Хутчэй вы... Мікіта, дай тую паперку... Хто ім дазволіў музыкі рабіць? Га?

Барсук памкнуўся крануцца з месца, ступіў крок і ўпаў. Нехта азваўся:

— От, начальства носам заарала...

Барсук намагаўся падняцца і з кожным разам падаў. А нехта з натоўпу прыгаворваў: «Вось табе... цюк... Вось табе... цюк...» Але Барсук усё ж такі падняўся.

— Пхаеце мяне? Пхаеце? Добра... Добра...

І Барсук намерыўся ўдарыць кіем Макара, які сядзеў з Любай на ўслоне. Адразу падбегла весялуха-каравайніца Наталля і пачала прасіць:

— Барсучок, мой галубок, давай я завяду цябе дахаты... Што ты выдумаў? Барсучок, Барсучок... Золатка...

А гэты Барсучок штурхнуў Наталлю ў грудзі, што тая ледзь не ўпала, і крыкнуў: «Прэч!»

Мікіта ўсё пастукваў кіем, паварочваўся то ў адзін бок, то ў другі і лыпаў бяльматым вокам:

— Раду выбралі? Выбралі...А што робіцца? Усё самі сабе, каб ваш верх быў...

Тым часам каравайніца Наталля, як на зло Мікіце і Барсуку, тупнула нагою і праспявала страфу з творчасці Піліпа Гайдука:

Вось прыйшоў наш Лазун,
Гэты панскі лізун,—
Дайце ў бокі Лазуну,
Як і трэба лізуну!

У сенцах адбывалася нарада аб тым, што рабіць з грозным начальствам. Не дачакаўся канца нарады «камандзір эскадрона». Ён аддзяліўся ад натоўпу і ўвесь збялелы, з уздыбленыміваласамі ішоў да Барсука. Падышоўшы, стаў і крыкнуў: «Смі-і-р-р-на!»

— Хто гэта крычыць? — пытаўся Барсук.— А-а... гэта ты, башкірскі камандзір! Сыдзі з дарогі, сыдзі... Сыдзі, табе кажуць! Ты знаеш, хто я?

Камандзір глядзеў ва ўпор на п'яны нос солтыса, сціснуўшы зубы, а потым раптам схапіў Барсука за грудзі і падняў. Паставіўшы на ногі, спытаўся:

— Хочаш жыць, паліцэйскі сабака?!

Мікіта крычаў:

— Не маеш права чапаць солтыса. На ім вісіць казённая бляха!..

Камандзір трос Барсука так, што ў таго аж зубы ляскалі, а потым бразнуў аб зямлю.

— Ты адкажаш, маладзец, ты адкажаш... У законе напісана...

— Адыдзі, бо і ты дастанеш...

Пакуль тое-сёе, два хлопцы прывезлі на падворак каламажку Рыгора Малахая, у якую ён запрагаў бычка. З хаты выйшлі чатыры хлопцы ў вывернутых кепках, у вывернутых каптанах, вымазаныя ў сажу. Двое падышлі ціха, схапілі ззаду Мікіту за рукі і скруцілі вяроўчынай. Ой, заскакаў Мікіта, азірнуўся бяльматым вокам.

— Вы што? Вы што? Мяне, старшыню Рады? Ды я... ды я... начальству...

Але старога бельмача паваліклі ўжо на каламажку.

З Барсуком было лягчэй, бо ён ляжаў на зямлі і войкаў: «Ой, ой, забілі... камуністы забілі...» Абудвух прывязалі да каламажкі, і працэсія рушыла. Толькі выйшла з падворка на вуліцу, прыбег Малахай і ўпаў на калені:

— Ой, людочкі,— заенчыў ён,— нашто ж вы мяне крыўдзіце? Мой возік прыйшлі забралі. Я ж на яго старaўся. Бог святы бачыць маю крыўду. Каб таму ручкі папухлі, каб яны яму паадпадалі... Матка найсвентша, збавіцель высокі... Змілуйся нада мною, грэшным. І бычочка майго... з'елі...

— А ты людзей ясі! — крыкнуў нехта з натоўпу.— Ідзі адгэтуль, бо зараз і цябе звяжуць!

— Хай яго чэрві з'ядуць, хто людзей есць...

— Цябе чэрві зараз і з'ядуць... Кайся перад людзьмі, хрыстапрадавец! — крыкнула некалькі галасоў.

Рыгор пакланіўся да зямлі і пачаў выціраць слёзы:

— Душачка мая змарнела, людочкі. Святыя анёлы не паклічуць яе да сябе. Я стараўся — кавалак да кавалачка... А тут бычочка майго... Ох... Ох... Божа літасцівы... А каму я што? Каму?

— Мне! — крыкнуў Пеця Ціханчук.

Рыгор Малахай раптам, як падстрэлены, усхапіўся з калена і пачаў хрысціцца, адступаючы назад:

— Божа, аджані ад мяне... Божа, аджані ад мяне...— зашаптаў ён не то прыкідваючыся, не то сапраўды адчуўшы нешта страшнае.

Так, адступаючы, выйшаў на вуліцу, падзеў шапку і пашлёпаў босымі нагамі так шпарка, як быццам хто яго даганяў.

...Першымі падзякавалі гаспадарам і развіталіся Андрэй і Сапкоўскі.

Яшчэ доўга яны гутарылі ў хаце Петруся Хадыкі. Сапкоўскі ўсё захапляўся вяселлем і казаў, што тут многаму можна павучыцца.

Прыйшоў Саша Грынявіцкі. Андрэй расказаў Санкоўскаму аб лёсе гэтага хлопца, што няма магчымасці дапамагчы яму. Санкоўскі думаў, думаў, а потым сказаў:

— А можа, паедзеш са мной? Там зможаш жыць свабодна. Знойдзем сякую-такую працу, увойдзеш у арганізацыю.

Так і вырашылі. Пайшлі на адпачынак у гумно. Яшчэ далёка да світання Андрэй правёў Санкоўскага і Сашу за вёску, на выган. Дарога да станцыі далёкая — сорак кіламетраў. Шчаслівай дарогі, браты! Хай схаваюць вас туманы ад варожага вока!

* * *

Падаляку Андрэй убачыў у мястэчку. Ён стаяў на плошчы ля вялікай афішы, на якой быў намаляваны паліцыянт. Панскі служака, аказваецца, гуманіст. Ён на афішы ратуе жанчыну, на якую вось-вось хоча наехаць аўтамабіль. У мястэчка ўпершыню заехала кіно, каб паказаць абрабаваным, забітым людзям, што паліцыя — адно дабрадзейства. Няважна, што паліцыя выбівае зубы, ламае рэбры. Гэта ж усё адно дабрадзейства.

Падаляка стаяў на сваіх доўгіх нагах, як хадулях, курыў, усміхаўся. А з ім, напалавіну меншы ростам, стаяў Барыс Кананец. Як хутка зразумелі адзін аднаго, хоць ад Глушца да валаснога мястэчка Падалякі больш за дваццаць кіламетраў. Відаць, ім падабаецца гэтая афіша.

Андрэй сустракаў знаёмых хлопцаў, якія нядаўна выйшлі з турмы. Ад іх даведаўся, што ў мястэчку ёсць фашысцкая арганізацыя «Обуз з'едночэня народовэго» («Лагер нацыянальнага аб'яднання»). Адпаведную ролю некалі ў царскай Расіі выконваў «Саюз рускага народа». Квітнее ўжо і польская зубатаўшчына.

Падаляка ўступіў у гэты збавенны саюз, хоць там няма ні аднаго рабочага, ні аднаго селяніна.

Ёсць толькі асаднікі, памешчыкі, кулакі, ксяндзы, войт, а за імі пацягнуліся беларускія кулакі, сальнікі, засцянковыя шляхтуны, прафесіянальныя зладзеі. Да іх далучыўся і Падаляка, стаіць ля паліцэйскай афішы, здаволены сам сабою. Падаляка заўсёды хацеў быць панам. Што ж? Дастукаўся? Ашуквае сялянскіх хлопцаў, кажучы, што ён уступіў у гэтую арганізацыю для таго, каб здабыць сабе там уплыў і разбіць яе. Падаляка хоча ад-

весці ад сябе ўдар, Падаляка ашуквае па-фашысцку, прыкрываючыся лозунгамі народнага фронту. Камуністам трэба ісці ў такія фашысцкія арганізацыі, дзе ёсць рабочыя і сяляне, каб узарваць знутры, адабраць ад фашыстаў ашуканых працоўных. А тут адны асаднікі, памешчыкі. З імі камуністам няма чаго рабіць, з імі няма і не можа быць ніякіх агульных пазіцый. А ў Падалякі, аказваецца, такія пазіцыі знайшліся. Мясцовыя камуністы катэгарычна патрабавалі, каб Падаляка пакінуў фашысцкі саюз, а ён, у сваю чаргу, катэгарычна адмовіўся і назваў хлопцаў людзьмі, якія не разбіраюцца ў палітычных справах.

Падаляку ахвотна прынялі фашысты. Ён сядзеў у турме, пацягне за сабою моладзь. Зробіць уплыў на спад рэвалюцыйных настрояў у стэрарызаваных вёсках.

Забыўся, Падаляка, як называюць цябе цяпер хлопцы, забыўся, як гэтыя хлопцы кармілі цябе ў турме, самі недаядаючы. Стаіш ты цяпер перад паліцэйскай афішай і ўхмыляешся. Свабоду няхай здабываюць сваёй крывёю дурні, разумнікі, як ты, спадзяюцца, што заўсёды здолеюць ашукаць наіўных, простых людзей, каб і далей карыстацца іх давер'ем.

Не, Падаляка, людзі кажуць: «Хітрасцю свет пяройдзеш, але назад не вернешся». Яны стаяць, узброеныя, гатовыя на заклік да апошняга бою, поўныя пільнасці, вернасці справе народнай. Яны пытаюцца ў Андрэя, што рабіць з Падалякам? І даволі б Андрэю сказаць: «знішчыць», яны адразу, без хістання гэта выканалі б. Але Андрэй прамовіў:

— Акружыце разведкай. Трэба набраць фактаў з яго фашысцкай дзейнасці і тады... арыштаваць... судзіць...

Хлопцы засмяяліся, ім спадабалася слова — «арыштаваць».

Напрамак дадзены. Яны ўсё выканаюць. Можна ісці спакойна. Яны потым прыйдуць, раскажуць. Моладзь загартавалася ў ненавісці да ворага!

Андрэй вярнуўся дахаты пад вечар. Яму перадалі, што рана прыязджаў з коннай світай у пятнаццаць паліцыянтаў камендант пастарунка Дарванскі. Сам заходзіў у хату, пытаўся ў маці:

— Дзе ж ваш марксіст?

А потым доўга, з нейкім таямнічым страхам прыглядаўся да партрэта Радзішчава. Мусіць, сустрэў там нешта такое калючае ў вачах рэвалюцыянера, бо хутка адскочыў і пачаў махаць нагайкай над галавою маці і гаварыць:

— Добрага сынка выгадавалі сабе на згубу! Скажыце яму, каб з'явіўся заўтра ў пастарунак! Чуеце?

Дарванскі паехаў, акружаны світай, не мінаючы ні адной хаты, каб не змераць яе калюча-палахлівым вокам, а пасля абеду прыйшоў нейкі хлопец і пакінуў запіску. Андрэй прачытаў:

«Заўтра прыходзь да мяне. Сустракаю ля моста на Шчары». І подпіс: «Крыніца».

Ах, дарагі ж ты мой рыцар казематаў Юрка! Турэмныя наглядчыкі разбілі табе сэрца. Я не забуду, калі ты прыйшоў з карцэра і сказаў мне: «На, прыкладзі вуха да грудзей, паслухай...» Я прыклаў і пачуў усплёскі вадаспаду... Аднак, нягледзячы на гэта, ты зноў пачаў выцягваць ніткі з сенніка і віць шнурок, ці, на нашай турэмнай мове, «каня», каб увечары пераслаць таварышу кавалачак хлеба. Цябе злавілі, пацягнулі ў карцэр ужо з разбітым сэрцам. А там зноў тое самае — катаванне... Ты яшчэ чатыры разы віў «каня» ўжо на вачах у наглядчыкаў і адбыў чатырнаццаць сутак карцэра запар. Прыйшоў ты з карцэра. Не паспеў наглядчык замкнуць дзверы адзіночкі, як ты зараз жа пачаў выцягваць ніткі з сенніка. Тады прыйшоў найгалоўнейшы кат — начальнік і пачаў ужо не пагражаць, не лаяцца брыдкімі словамі, а прасіць: «Пакінь... Я прашу... Пакінь...» І ты адказаў:

— Гэта ўжо іншая справа... Калі так, я пакіну. Але — перамога мая!

Я ўсім буду расказваць гэтую гераічную быль аб табе, аб камсамольцу — Юрку.

Ты знайшоў мяне, дружа, прамераўшы дзесяткі кіламетраў з хворым сэрцам.

Кліча мяне дарога, Юрка, вялікая дарога. Вёрсты і вёрсты... Яна кліча мяне, ужо кліча, і я распраўляю свае крылы да лёту! Ужо не ўбачыць мяне кат Дарванскі.

Іду да цябе!

Бывай, маці, згадзіся, гаротніца, урэшце з тым, што я ў хаце толькі госць.

Бывай, грамадзянін Радзішчаў, страж народнага жыцця, пажадай мне шчаслівай дарогі!

* * *

Нечаканасць на шляху бывае, як шчасце і як няшчасце. У дадзеным выпадку была шчасцем. Ужо размінуўся быў Андрэй з маладым бледным чалавекам у аку-

лярах. Нешта крапула падсвядома.

Андрэй азірнуўся. Азірнуўся і сустрэчны. Андрэй спыніў яго.

— Ці не знаёмы мы? — спытаўся ён.

Незнаёмы стомленымі вачыма паглядзеў праз акуляры на Андрэя і сказаў:

— Андрэй?

— А ты, можа, Грыша?

— Ён самы...

— Грыша Плотка? Ай-яй... Хадзем убок...

Яны сышлі са шляху ў глыб ляска і селі пад кустом.

— Прывітанне табе ад Олі,— сказаў Грыша.

— Дзе ты яе бачыў?

— Там, дзе яна ёсць...

— Ага...— зразумеў Андрэй.

Узмужнелым стаў Грыша, такім сталым, што Андрэй на момант адчуў сябе малым перад ім. Што значыць быць абвеяным шырокімі вятрамі.

— Я пасланы ў вашу акругу аднавіць разбітыя арганізацыі, праверыць, як ствараецца народны фронт... Як там у нас у Глушцы і павокал?

— Цяжка... фашысцкая рэакцыя... Тэрор... Будзь асцярожны. Вазьмі на прыцэл Івана Падаляку і Барыса Кананца. Апошняга ты ведаеш.

— Можа, ведаеш, як жывуць мае бацькі?

— Адзін раз заходзіў... Жывуць. Краўцам пакуль што лепш, як кавалям... Глушэцкі ксёндз Абнорскі вядзе чарнасоценную кампанію.

— Як адчуваеш сябе пасля турмы?

— Нішто сабе... Нармальна...

Набіў руку інструктар, набіў. Сыпле пытанні, як з рукава. А чорныя вочы стомлена, крыху сумна глядзяць з-пад акуляраў.

— Ты, мусіць, не выспаўся?

— Прызнацца — так... За ноч правёў тры нарады. Вось бы лёг тут і заснуў.

— Глядзі, не зрабі гэтага...

— Далёка яшчэ ісці да Глушца?

— Кіламетраў дваццаць. Так... Дойдзеш да маёй вёскі, я табе дам адрас. Там перапачуеш. Хлопцы схаваюць добра.

— Ну, Андрэй, дзякую за ўсё — за мінулае, за цяперашняе. Будзем трымацца...

— Будзем трымацца,— адказаў Андрэй. І яны развіталіся.

Яшчэ адно сказаў Грыша, падумаўшы:

— Убачыш Олю, скажы, дзе ты са мной сустрэўся... Пайду...

Вочы Андрэя застылі ў здзіўленні і здагадцы.

Увечары ён быў ужо над Шчарай у Юркі, сакратара акругкома, аддаваў яму мопраўскія грошы. Юрка прывёў дзяўчыну, ды такую красуню-камсамолку, як ранніюю зорку. Залацістыя валасы, ружовыя шчокі... Прынесла яна з сабою міску яечні з салам, бліноў, яшчэ гарачых, частавала Андрэя і Юрку, стаяла над імі, як вішня.

«Мусіць, гэта яго каханая?» — падумаў Андрэй, але нічога не пытаўся.

Сесці б з ёю ў човен і паплыць па Шчары, у блакітную казку.

Ах, дружа Юрка, ты з вадаспадам у сэрцы мераеш вёрсты падполля, каб потым глянуць у блакітныя вочы сваёй красуні.

Перад світаннем Андрэй развітаўся з Юркам, накіраваўся на станцыю, каб адтуль даехаць да Вільні.

І Юрка пры развітанні таксама сказаў:

— Убачыш Олю, перадай прывітанне.

Яе, Олю, ведаюць усе.

* * *

Праклятыя шпікі! Як жа іх шмат цяпер усюды. Сустракаюць на кожнай станцыі кожны поезд. Глядзяць кожнаму чалавеку ў вочы. Навучыліся пазнаваць нашага брата. І выходзіць так, што хітрасць, вынаходлівасць падпольшчыкаў павінна перакрыць намаганні шпікоў.

Андрэй заўважыў, што з кожнай станцыі, дзе спыняўся поезд, садзіўся таямнічы чорт з куляскай. Недзе, відаць, рыхтуюць вобыск, кагосьці хочуць узяць у крыжавы агонь.

Не вытрымаў Андрэй. На самым світанні, калі людзі ў вагоне памлелі ад дрымоты, выйшаў у канец вагона. Крануў за ручку дзверы. Яны якраз адчыніліся. Але поезд імчаў поўным ходам. Саскакваць небяспечна. Пачакаў, закурыў папяросу. Увесь свет, здаецца, спаў у перадсвітальным ранку. Так бы і пайшоў вунь той дарогай у палі, дзе яшчэ дзе-нідзе чарнелі адзінокія палосы грэчкі і лубіну з калючымі стручкамі. Прыдарожныя дрэвы ўсцілалі зямлю жаўталісцем. Поезд пачаў сцішаць ход. Відаць, хут-

ка станцыя або пад'ём. Андрэй шчыльна зашпільвае сваё асенняе паліто, мацней насоўвае кепку на галаву. За шыбай яшчэ ўсё прабягаюць палі, пералескі. Вунь далёка відаць вёска, якая як быццам асела па стрэхі ў зямлю. Станцыі ўсё няма. Відаць, пад'ём. Так, ён самы, бо абочыны чыгункі пачалі ўзвышацца. Трэба паспяшыць. Андрэй глянуў уперад па ходу поезда. Набліжаецца лес. Асцярожна адчыніў дзверы, сышоў на другую прыступку і дзверы за сабой акуратна зачыніў. Вецер востра сцебануў па твары. Агледзеў сам сябе, а дакладней, крылы свайго паліто і з ніжняй прыступкі паляцеў паўздагон за поездам. Стукнуўся аб зямлю плазам, здаецца, не датыкаўся яе нагамі. Дотык быў, але нязначны. Мацнейшы штуршок адчула левае плячо. А поезд, як знарок, прыбавіў ходу. Ці, можа, так здалося. Колы заўзята стукалі па стыках рэек, як быццам што ламалі пад сабою. Вокны, вагоны мільгалі ў імклівым шуме. Дым з паравознага коміна чорнаю хвалістаю грывай клаўся на хрыбты вагонаў, спаўзаў набок і расплываўся, прыпадаў да зямлі, прыкрываючы часам і Андрэя. Апошні вагон вухнуў ветрам у твар Андрэю і ўцёк паўздагон. Стала ціха і пуста. Перастукі колаў панеслі ў даль шэрага ранку нешта такое, чаго не шкада. «Дарогу мне, дарогу! — сказаў сам сабе Андрэй, азіраючыся навокал.— Толькі кія няма. Вось блізка лясок, мы яго тут і выражам, а потым пашукаем шляху на Вільню».

## У ВІЛЬНІ

Андрэй глядзіць у акно з трэцяга паверха, не можа адарвацца. Унізе павілася вулачка. Тры сходкі ўніз на тратуарчыку, потым пахілая роўнядзь, а затым зноў тры сходкі ўніз і так далей у гушчыню дамоў, у лабірынты вуліц. Па гэтай вулачцы Андрэй ішоў да жаданай кватэры, ішоў усё ўверх і ўверх. І ўрэшце дайшоў.

На стук адчыніла дзверы танклявая зграбная дзяўчына. Здзівілі Андрэя яе ціплыя вялікія вочы, якія глянулі на яго неяк ласкава, з асцярожнай турботай. І чубік белай хусткі, завязанай па-сялянску. «Недзе бачыў я такія вочы і такую ціплую ўсмешку... Але дзе? Ды недзе ў гушчах народа. Усё такое знаёмае...» Дзяўчына мае кватэру з аднаго пакоя і кухні. Яна жыве толькі з бацькам, які служыць дворнікам і больш часу праводзіць там, у сваёй старожцы. Падымаецца наверх толькі нассці, а часам бы-

вае так, што дачка Ганұся посіць яму ежу ўпіз. Ганұся вартуе канспіратыўную кватэру, за якую плоцяць падпольшчыкі. Ганұся мые ім сарочкі, гладзіць касцюмы, варыць есці. Апрача гэтага, Ганұся любіць, шкадуе іх. Ганұся ласкава гаворыць па-беларуску. У назначаныя гадзіны два разы ў дзень прыходзяць да яе свае людзі даведацца, прыбыў хто ці не. Гэта — сувязныя.

Андрэй прыбыў пад вечар і калі, пераначаваўшы, рана ўстаў, то ўбачыў, што касцюм яго выгладжаны, нават чаравікі наваксаваны, ля якіх даўно нават шчотка не хадзіла. Ганұся запыталася ў Андрэя, можа, ён хоча памыцца, то яна нагрэе вады, можа, бялізна брудная, то можа змяніць. Ціха, з агляднасцю ходзіць Ганұся. Можа, таму ціха, утульна робіцца на душы ў Андрэя.

Ён стаіць ля акна. Там, далёка над зборышчам розных дахаў, а найбольш чырвоных чарапічных, узвышаецца залацістая карона над касцёлам. Яна маячыць, як растапыра, бліпчыць на сонцы. Гэта касцёл, пабудаваны Казімірам Ягайлам, былым каралём Польшчы і Літвы, у пару бунту Літвы і Беларусі супроць уніі. За каронай відаць шырокі квадратны праваслаўны сабор з конусападобным купалам. Гэта адна з першых хрысціянскіх святынь у Вільні, пабудаваная літоўскім князем Альгердам, які, увайшоўшы ў саюз з князямі Усходняй Русі, прыняў праваслаўе. Лявей вылучаецца мініяцюра з чырвонай цэглы — цудоўная готыка — касцёл св. Ганны, каралеўская цацка нейкага там, здаецца, караля Зігмунта. Пра гэты касцёлік Напалеон, калі ішоў на Маскву, сказаў, што каб можна было забраць яго ў кішэню, то завёз бы ў Парыж. Тут жа на плошчы бялее кафедральны касцёл, пабудаваны ў стылі чысцейшай старажытна-грэчаскай класікі. Каб не было статуй святых на даху, сярэдні з якіх трымае крыж, ніколі не сказаў бы, што гэта храм. Сказаў бы адразу, што гэта тэатр. Касцёл глядзіць франтонам на вуліцу Міцкевіча, якая пачынаецца ад плошчы. За кафедральным касцёлам узвышаецца на гары вежа Гедыміна. Тут размешчаны стары горад, старая Вільня, адкуль яна і пачалася з Вострай брамай, з касцёламі, якія, здаецца, грамоздзяцца, лезуць адзін на другі, з манастырамі, са змрочнымі вулачкамі, са старымі закуранымі дамамі, якія прыліплі адзін да другога.

А навокал плошчы палацы былых магнатаў.

Фабрычныя коміны маячаць у аддаленні па ўскраінах. Там горад новы. А тут горад крыжоў. Усё крыжы і кры-

жы,— патоўпам аселі ў пізіне, па якой пачынае рассцілацца вячэрняя дымка. Найбольш касцёлаў. Геній чалавечы аддаў сябе тут для іх — стварыў прыгажосць форм, манументальнасць — усё для ўмацавання... рабства.

А людзі снуюць і снуюць, як у павуціппі.

Вільня ціхі горад. Тут толькі цокаюць капыты коней рамізнікаў.

...Пачало цямнець. Увайшла Гануся і запыталася, можа, трэба запаліць святло. Андрэй адказаў: «Не трэба...» Прайшоўся па пакої, утульна абсталяваным. На круглым століку ляжаць прачытаныя ўжо газеты — беларускія і польскія, сатырычна-гумарыстычны часопіс «Асва», які выйшаў пасля закрытай «Маланкі». «Беларуская газета» ў белых плямах, на якіх напісана толькі адно слова: «Канфіскавана». Гэта наша газета. Хадэцкая «Крыніца» словамі ксяндза Гадлеўскага цешыцца, што Гітлер у сваёй праграме «Drang nach Osten» успомніў і пра Беларусь. Орган Луцкевіча «Родны Край» верашчыць у тон Пілсудскаму. Гэта кваканне жабы ў балоце. «Ва ўсім віпаваты бальшавікі»,— кажа Пілсудскі. А за ім слова ў слова квакаюць тое самае санацыйныя жабы, высунуўшы морды з балота. Бальшавікі адабралі зямлю ад паноў і аддалі народу. Коміны новых фабрык і заводаў падпіраюць неба. Асушваюцца балоты, шумяць ураджаі. Цэлыя арміі моладзі выходзяць з універсітэтаў, інстытутаў. А жабы ўсё: ква... ква... Жабам, наадварот, падабаецца, што ўрад Пілсудскага асігнаваў новыя сродкі на пабудову турмаў і... касцёлаў.

«Гэта ўмацуе,— кажуць жабы,— нашы пазіцыі і дапаможа выйсці нам з жабінай млоснасці. Тады мы распрастаем спіны і прагонім бальшавікоў з Савецкай Беларусі,— аддамося пад апеку заходнееўрапейскіх дзяржаў. Вядома, пад апеку Гітлера, бо ён цяпер усё мацнее, расце, як на дражджах. З камуністамі расправіўся адным махам, вярнуўшы са змрокаў сярэдневякоўя катаўскую сякеру. І Тэльман, бачыце, сядзіць у турме. Гэта моц, гэта моц»,— шэпчуць жабы.

Польскія газеты скардзяцца, што замнога інтэлігенцыі ў краіне. Нават падлічылі. Чатырыста сорак тысяч служачых на трыццаць два мільёны насельніцтва. Лічаць, як на лічыльніку.

А рэдактар польска-фашысцкага «Кур'ера віленскага» просіць пана Луцкевіча «на кубачак чаю» для сумеснага абмеркавання спраў, якія цікавяць грамадства польскае

і беларускае. Далей жульніцкі рэдактар жульніцкай правакатарскай газеты просіць пана Луцкевіча напісаць артыкул аб беларускіх паслах — можна «пад псеўданімам, які застанецца між намі»,— дадае рэдактар.

— Усё на мяне, усё на мяне...— уздыхае пан Луцкевіч,— ах, ах... Трэба ісці, трэба рабіць... Хто ж зробіць?

Даў жа пракурору-езуіту Раузе слова на судовым працэсе, што не будзе змагацца за незалежнасць Беларусі, за што эрудзіраваны Раузе назваў Луцкевіча выразнікам душы беларускай. Выходзіць, што рабскай душы. Сядзі, не рухайся, дапамагай акупантам глуміць свой народ, нацкоўваць на Савецкі Саюз. Работка даволі-такі пачэсная! Няма на вас новага Дантэ, гандляры народнаю душой!

...Добра думаць у змроку аднаму. Але адчуваецца, што ты недзе быццам на востраве, а навокал шуміць мора. Яно непакоіць. Сувязная, якая прыйшла пасля абеду, сказала, што да мяне прыйдуць... Можа, яшчэ не час? А можа, адбыліся незвычайныя здарэнні? Усё можа быць. Тут ходзяць групкі чарнасоценцаў-студэнтаў з нажамі ў кішэнях. Ганьба! Эх... дзе ты, рускае студэнцтва, зачараваўшае свет сваёй ахвярнасцю для народа! Няма цяпер такога студэнцтва. Усё пажэрла рэакцыя, і «Gaudeamus igitur» [1] гучыць, як ханжаства. Крылы самаахвярнай маладосці падрэзаны... Аднак... нейкія крокі за дзвярыма. Пявучы голас Ганусі...

Дзверы лёгка скрыпнулі. Рука Ганусі ўпэўнена пашукала выключальнік. Ён пстрыкнуў, і раптоўнае святло на момант прымусіла Андрэя прыжмурыць вочы. Ля дзвярэй стаяла маладая жанчына ў чорным капялюшыку, у асеннім кароткім паліто. На руцэ вісеў рыдыкюльчык.

Андрэй стаяў, апёршыся рукою аб стол, не спускаючы вачэй з увайшоўшай жанчыны. Вочы... быццам яе... нос... А маладая жанчына ўсміхнулася і сказала:

— Што ж не падыходзіш да мяне? Не пазнаў?

Андрэй зрабіў два крокі і працягнуў рукі.

— Знаеш... Сапраўды цябе трэба разгледзець, каб упэўніцца... Але я ўсё роўна пазнаў, хоць яшчэ не верыў сабе...

Надзя прайшла да канапы і скінула капялюшык, расшпіліла паліто.

— Дазволь...— сказаў Андрэй і, прыняўшы ад яе па-

---

[1] «От жа весялімся, пакуль мы маладыя» — студэнцкая песня.

літо і капялюш, павесіў на вешалку. Вешаючы, думаў: «Нават прыпудрылася крыху і не саромеецца гэтага...» Вярнуўшыся, сеў побач і глянуў на яе валасы. Той самы колер, лёгкая хвалістасць, але здаецца, што валасоў стала менш. Узмужнелыя, пацвярдзелыя рысы твару. У вачах далёка схаваная задума. Гэта ўжо ад турмы. У цёмна-карычневым плацці была такая ж зграбная.

— Ну, пакажыся,— прамовіла яна, паварочваючыся тварам да Андрэя, і правяла рукою па яго валасах,— падрос, маршчынка паглыбела, і яшчэ не сышоў след турэмнай копаці па твары.

Андрэю хацелася прытуліць яе да сябе, але замест гэтага сказаў:

— Я цябе прывык бачыць у хустцы, завязанай па-сялянску...

— Ведаю... Тут горад. Інакш нельга. Добра, што туман павіс над горадам... Ішла спакойна.

— Ты чымсьці ўстрывожана, Оля...— сказаў Андрэй і ўзяў яе за рукі. Падумаў пры гэтым: «Які ж я няўмелы...» Надзя ўсміхнулася.

— Оля... Усё ў цябе засталося старое. Я цяпер не Оля, хоць мяне там у цябе ўсе ведаюць, як Олю. Гэтае імя выкрыта шпікамі. Усё зрабіў Буралом — Карэльчук. Будзеш зваць мяне Ірына. А цяпер заві Надзя... Помніш маё пісьмо табе ў турму? Ну, вось...

— Не, сапраўды ты чымсьці ўстрывожана,— паўтарыў Андрэй.

Вочы іх сустрэліся, зазірнулі адны ў другія. Андрэй асцярожна прыцягнуў Надзю да сябе. Адчуў на вуснах свежасць яе шчакі. Прыйшла даверлівасць, блізкасць.

— Кажаш, устрывожана,— пачала Надзя,— трывогі многа, дарагі. Трывожна, цяжка на свеце... Шмат правалаў у нашай рабоце. Тэрор дзікі. Правакатар Карэльчук ужо зросся з дэфензівай...

— Ён тут? — спытаўся Андрэй.

— Тут, сыпле на ўсіх судовых працэсах. Ёсць рашэнне яго знішчыць, але колькі ні прабавалі, не ўдалося. За ім ходзіць ахова са шпікоў. Цяпер недзе знік, не відаць.

— З Беластока хто прыязджаў сюды?

— Прыязджаў... Высокі, плячысты польскі рабочы.

— Гм... Здорава...

— А што? Ты яго знаеш? — спыталася Надзя.

— Некалі разам працавалі ў лесапільні ля Дзядоў. Я пасля першага выхаду з турмы наведаў яго ў Беласто-

ку. Перад маім ад'ездам сюды прыязджаў да мяне другі таварыш з Беластока папярэдзіць аб Карэльчуку.

— Вядома, ён не вырабіцца, але трэба было б хутчэй. Наробіць падлюга шкоды яшчэ больш...

— Што чуваць у лагеры беларускай санацыі? — спытаўся Андрэй.

— Пілсудчына, відаць, хоча выпусціць беларускіх паслоў з турмы. Прыязджаў жа прэзідэнт нядаўна. Дамовіліся, на чымсьці пагадзіліся. Пахне гэта нейкім манеўрам... Каб не было якой дыверсіі...

Надзя скончыла, і абое задумаліся. Ледзь чутны шум усё плыў і плыў за акном. Мільгалі бляскі святла ў густой імгле. Горад касцёлаў пачынаў здавацца балючаздрадлівым.

— А хадэцыя адкінула нашы прапановы аб стварэнні народнага фронту,— працягвала Надзя.

— Адкінула? А хіба няможна звярнуцца цераз галовы ксяндзоў да тых мас, якія гуртуе хадэцыя?

— Вядома, што так... Але ўсё ж такі іх адмова ўскладняе справу. Хадэцыя сваёй нязгодай выявіла сябе ўжо адкрыта перад народам, як рэзерв фашызму.

— Тым лепш,— адказаў Андрэй,— менш ілюзій, лягчэй будзе іх выкрываць.

— Правільна. Але ўсё гэта як-ніяк ускладняе работу.

І зноў змоўклі, задумаліся.

— Дык вось гэтыя валасы рвалі шпікі? — спытаўся Андрэй, праводзячы рукою па Надзіных валасах.

Надзя, схіліўшы галаву на плячо Андрэя, востра зірнула яму ў вочы і, пачакаўшы, сказала:

— Не ўспамінай... Будуць рваць яшчэ... Будзь да гэтага падрыхтаваны. Мужны будзь, Андрэй, ты ж любіш Радзімчава.

— Так... люблю... І цябе люблю...— сказаў Андрэй, стрымліваючы сваё хваляванне. «Дык вось яна якая, гэтая дарагая істота»,— думаў ён і мацней туліў яе да сябе.

Аднак Надзя зірнула на гадзіннік.

— Ведаеш,— сказала яна,— я зараз пашлю Гапусю, каб прывяла рамізніка, і мы паедзем з табою ў адно месца.

— Куды?

Надзя злёгку ўсміхнулася і адказала:

— У рэстаран...

— Чаго? Што ты? Хіба ж можна? — запратэставаў Андрэй.

— У рэстаране ёсць нашы людзі, не бойся. Там убачыш Віктара Кухту і яшчэ каго-небудзь...

— Віктара мне прыемна ўбачыць, але яшчэ каго-небудзь, то... не...

— Віктар вельмі прасіў, каб ты прыбыў туды.

— Ты нешта хаваеш, Надзя. Віктар мог бы прыйсці і сюды.

— Нельга яму сягоння... Зразумей...

Надзя вытрымала позірк Андрэя і ціха дадала:

— Можа, убачыш яго апошні раз.

І зараз жа ўстала.

Андрэй задумаўся і глыбока ўздыхнуў.

— Віктар вучыцца дзе? — спытаўся ён.

— Наведвае лекцыі ва універсітэце на юрыдычным як вольны слухач. Працуе ў рэдакцыі часопіса «Асва».

Устаў і Андрэй. Паскроб патыліцу і сказаў Надзі:

— Мяне будзеш называць Макс...

— Добра,— адказала Надзя і стала аглядаць паднашаны касцюм Андрэя.

— Не... трэба іншы... Зараз... пераапрануся і я...

І Надзя пайшла на кухню да Ганусі.

Праз паўгадзіны Андрэй у новым чорным касцюме і зеленаватым плашчы, у шэрым капелюшы і Надзя, прыбраная, як свецкая дама, у чорным капелюшы з вуаллю, спускаліся па сходах на вуліцу, каб сесці на рамізніка.

— Рэстаран «Бахус»,— сказала Надзя рамізніку, калі яны селі.

Андрэя заінтрыгавала такая назва, і ён глянуў у твар Надзі. Яна зразумела яго позірк і злёгку паціснула за руку, нібы гаворачы: «Нічога, супакойся...»

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У даволі вялікім асобным пакоі стаяла пры сценах пяць сталоў. Шосты круглы стол, які стаяў пасярэдзіне пакоя, быў упрыгожаны вазай з кветкамі. Над ім звісала са столі цьмяная пачарнелая люстра, у якой гарэлі дзве лямпачкі пад каўпачкамі.

Яны сяцілі найбольш на круглы стол, а па баках леглі лёгкія змрокі. Былі заняты толькі два сталы, калі ў пакой увайшлі Андрэй і Надзя. Праходзячы праз калідорчык, яны бачылі направа праз адчыненыя дзверы доўгі пакой, запоўнены гасцямі. Ля дзвярэй сядзеў пасівелы чалавек з доўгай раздвоенай барадой. Ён на каленях тры-

маў гармонік. На грудзях у яго вісеў адзін Георгіеўскі крыж і два такія ж медалі. Дзве мыліцы стаялі прыпёртыя да сцяны.

Андрэя зацікавіў гэты стары з натхнёным тварам у тонкіх маршчынках.

Рэстаран «Бахус» быў нейкага там трэцяга ці чацвёртага класа — для людзей сярэдняга дастатку — і знаходзіўся ў змрочнай вулачцы сярод лабірынта гэткіх жа.

Андрэй з Надзяй селі за стол у цёмным кутку. Насупраць наўскасяк сядзела пяць чалавек і побач з імі — чатыры. Усё больш людзі маладыя, асабліва за другім сталом.

Пажылы кельнер падышоў да Надзі і злёгку пакланіўся. Надзя перакінулася з ім парай сказаў, нават нешта шапнула яму на вуха.

Кельнер усё ківаў галавой і, урэшце, сказаў: «Добра». Праз хвіліну прынёс бутэльку піва і два бутэрброды з каўбасой.

За сталамі вялася шумная гутарка па-беларуску — госці былі ўжо вясёлыя. У першай групе пажылы мужчына з касцістым профілем, з носам, як сякера, па-п'янаму стукаў кулаком па стале і павышаў голас. Даляцела фраза:

— Што зрабілі мы тут і там, бальшавікам доўга не адрабіць назад...

Андрэй насцярожыўся і запытальным позіркам глянуў на Надзю. А яна, крыху нахіліўшыся да яго, шапнула:

— Гэта генеральны правакатар Грамады Шчурын. Прыглядзіся добра да гэтай пачвары. Гэта п'е палітычная багема... беларуская санацыя.

— А за другім сталом?

— Гэта студэнты... Члены карпарацыі «Скарынія», якую фашысты ператварылі ў сродак ідэалагічнага спусташэння моладзі. Там пастаянныя калектыўныя п'янкі, якія цераз Луцкевіча фінансуюцца ваяводам Кіртыклісам.

Надзя на хвіліну змоўкла і працягвала:

— Асабліва ловяць, уцягваюць у «Скарынію» самых таленавітых з студэнцкай і гімназісцкай моладзі... Ну і, вядома, калечаць... робяць з іх ворагаў камунізма, сапраўдных бандытаў...

— Пракляты фашызм!..— прашаптаў Андрэй.

Хуткаю хадою ўвайшоў Віктар, у чорнай кепцы, у расшпіленым чорным асеннім паліто, у ботах. На хвіліну спыніўся пры ўваходзе, глянуў павокал, выцер хустачкай нос. Па тым, як ён яго выціраў, Андрэй здагадаўся, што

гэта Віктар. Шумлівыя госці за сталамі не звярнулі на яго ўвагі. Віктар наблізіўся да Надзі і Андрэя.

Нсяк спехам прывітаўшыся, ён сеў спіною да шумлівай кампаніі.

Віктар пазіраў то на Андрэя, то на Надзю і яшчэ раз выняў хустачку і выцер нос.

— На Лукішках сёння пачалася галадоўка,— пачаў ён.— Паліцэйскія патрулі кружаць навокал турмы...

Гукі гармоніка ўварваліся працягла, асвяжаючы, а за імі густы барытон:

Плещут холодные волны-ы...
Бьются о берег морской...

Віктар працягваў:

— Прыехалі ў Вільню два японцы. Вярталіся з Берліна... Нейкія дыпламаты... Праз Кіртыкліса дабіваюцца сустрэчы з Луцкевічам. Радуйцеся, беларуская дзяржаўнасць жыве... Ха-ха-ха!..

— Так званы «Антыкамінтэрнаўскі пакт», — дадала Надзя і запыталася: — Што чуваць ва універсітэце?

— Рыхтуюць выключэнне студэнтаў-яўрэяў. Numerus clausus...[1] Ужо сёння эндэкі з хадэкамі сарвалі лекцыю — дамагаліся выключэння.

— Гэта праўда, што на Лукішках галадоўка? — спытаўся Андрэй.— Нядаўна ж у іх была...

— Праўда,— адказаў Віктар.

А барытон гуў:

...Бьется с неравною силой
Гордый красавец «Варяг»...

— Ах, так... яшчэ...— працягваў Віктар,— забаставалі рабочыя каналізацыйных работ.

Андрэй глядзеў на Віктара і думаў: «Які ён стаў незалежны, сабраны...»

А Віктар ціхенька час ад часу азіраўся на шумлівую кампанію, на ягамосця з касцістым профілем. Вядзецца гутарка пра Гітлера, пра тых жа японцаў, што прыехалі ашчаслівіць сваёй увагай беларускую санацыю... Заслужылі...

— Антысавецкі блок ужо гатовы,— прамовіў касцісты профіль, адкідаючыся на спінку крэсла, і ўзняў чарку з тостам: «За... блок...»

[1] Выключыць частку, аддзяліць.

Надзя, Віктар і Андрэй пераглянуліся і панура змоўклі.

...Борется стойко команда
С морем, врагом и огнем...—

канчаў гармонік, заміраючы на апошніх акордах.

Клубіліся пачуцці ў душы Андрэя. Хацелася выйсці, дарвацца да звона і ўдарыць у набат.

І гэтая песня плыла да сэрца, як далёкае рэха геразму сыноў народа ў шынялях... «Плещут холодные волны... плещут...»

— Андрэй,— сказаў Віктар,— я даведаўся, што ты тут, і хацеў пабачыцца вось у такой абстаноўцы, каб ты ведаў і бачыў усё... На нашу моладзь шмат сыплецца паклёпаў з боку ворагаў. Яны пранікаюць і ў народ. Дзе будзеш, барані нас ад паклёпніцтва з боку Астроўскіх і Луцкевічаў. Яны могуць пісаць, а наша прэса канфіскуецца, мы пазбаўлены легальнай трыбуны для самаабароны.

— Добра, Віктар, буду бараніць... Я ведаю, што зараза залезла глыбока, але ведаю і другое, што насуперак заразе расце геразм... Хто гэтага не разумее, той наогул не разумее логікі барацьбы. Ці няможна было б падарваць, выкрыць карпарацыю «Скарынію» стварэннем новай карпарацыі на здаровых, дэмакратычных асновах?

— Наша лявіца універсітэцкая думае аб гэтым...

Сябры і не пачулі, як наблізіўся да іх на мыліцах стары спявак і прамовіў густым барытонам:

— Падарыце герою Порт-Артура, ахвяры здрадніка Курапаткіна.

Усе падарылі інваліду-спеваку. Ён падышоў да шумлівай кампаніі і тры разы паўтарыў сваю фразу, але ніхто нават не адвярнуўся, ніхто не глянуў на старога, як быццам яго тут і не было. Стары паківаў галавою і падыбаў на мыліцах у калідор.

З боку шумлівай кампаніі пачуліся галасы: «Дахаты! Дахаты!»

Віктар сказаў Надзі і Андрэю:

— Пара развітацца... Ну, бывай, Андрэй, бывай, дарагі... Калі будзеш там, дома, зайдзі да маёй маці, скажы, што ты мяне бачыў.

Надзя з напружаным тварам сядзела, апусціўшы вочы, гатовая, здаецца, заплакаць.

— Помніш, Андрэй, хутар... Ноч тую... Ну, бывайце... Як добра, што вы прыйшлі.

Надзя прыхіліла да сябе галаву Віктара і ціха пацалавала, пасля чаго яна і Андрэй падняліся і выйшлі.

Сырая ноч дыхнула ім у твар. Людзі праходзілі, як цені, тулячыся да сцен цёмных маўклівых будынкаў.

Не паспелі Надзя з Андрэем адысціся крокаў дзесяць, як пачулі голас Віктара: «Смерць правакатару!» Пасля гэтага раздаўся стрэл. Надзя і Андрэй прыбавілі кроку. Насустрач ім беглі людзі, пыталіся, у чым справа. Надзя адказвала: «Забіты правакатар».

Вось пляцецца рамізнік. Селі. Надзя сказала толькі адно слова:

— Звярынец...

Рамізнік ляснуў бізуном па сваёй клячы, і фаэтон загойдаўся на рысорах.

Хутка пачуліся свісткі.

Надзя хустачкай выцірала вочы.

Андрэй сядзеў нахмураны і сціскаў кулакі. Гатоў быў існі адзін на ўсіх — столькі прыплыло гневу і адвагі.

Надзя, якая сядзела побач, на момант знікла з вачэй.

Сказала ўчора — «прыйду»... Увяла Андрэя ў вішнёвы садок, у якім туліўся стары драўляны домік, крыты гонтамі. Потым былі дзве прыступачкі ганачка і звычайныя драўляныя дзверы, як у сялянскай хаце. Надзя пакруціла два разы старасвецкі званок. Выйшла пасівелая жанчына, ужо бабка, спрасоння спыталася: «Гэта ты, Надзя?» Увайшлі ў цёплы невялікі пакой. У цемры свяціліся белізной фіранкі на вокнах. Надзя развіталася і пайшла.

...Вось ужо і ранак. Мутнаватае святло дня прасочваецца праз фіранкі. Чамусьці прыадчынены дзверы. Здалёк, можа з-за дзвюх перагародак, дзявочы голас спявае польскую песню пра паручыка Граеўскага, засуджанага надзвычайным судом да пакарання смерцю за злачынствы ў ваенных справах. Песня — гэта апошні ліст паручыка да пракурора. Паручык Граеўскі, як высвятляецца з песні, быў разведчыкам... Матыў песні сумны і трывожны. Дзявочы голас канчае песню такімі ж словамі, якімі яна і пачынаецца:

Porucznik Graewski pod sond doraźny
Za nadużycie wojskowych spraw [1].

---

[1] Паручык Граеўскі пад суд надзвычайны
За злоўжыванне ваеннымі справамі.

Андрэй ляжыць і чуе ўсе стукі, усе шорахі ў гэтым доміку, гутарку жанчын, відаць, па кухні і думае пра Віктара. Як скончылася? Дзе ён? Гэты стрэл яго — магутны ўдар па асіным гняздзе, па ўсёй рэакцыі.

У суседні пакой увайшлі дзве жанчыны і пачалі гаварыць па-беларуску прыцішанымі галасамі.

— Сёння ўначы?

— Ага... Расцягнуўся, кажуць, на парозе рэстарана... Носам лёг на тратуар, а нагамі на калідор...

— Ах, ах... Ад аднаго стрэлу?

— Ад аднаго...

— А таго, хто страляў, злавілі?

— Злавілі, папечка... злавілі... студэнт нейкі...

Голая да локця рука ў сініх жылах прычыніла дзверы...

Надзя прыйшла аж увечары. Прывітаўшыся, села на канапу побач з Андрэем:

— Надакучыла табе? — спыталася.

— Прызнацца, што — так...

— Нічога... Больш надакучаць адзіноцтва не будзе. Едзеш у Варшаву...

Андрэй маўчаў, пазіраючы на Надзю, не ведаў, што сказаць. Потым перапытаў:

— У Варшаву?

— Так, у ЦК. Адтуль атрымаеш прызначэнне ў акругу ў якасці інструктара. Па-мойму, цябе кінуць або ў Беласток, або ў Пінск. У Беластоку ўздым... Забастоўка тэкстыльшчыкаў. А ў Піншчыне наша работа паралізавана...

— Што ж... паедзем...— прамовіў Андрэй.

— Я таксама еду...— сказала Надзя.

Андрэй узняў на яе вочы.

— Брэстчына гарыць у агні пацыфікацый. Выбухнула паўстанне... Ты паедзеш...— Надзя глянула на гадзіннік,— ты паедзеш праз гадзіну, каб на вакзале быць не больш пяці мінут да адыходу поезда... Білет у мяне ёсць... І грошы на дарогу.

— То трэба ўжо збірацца,— сказаў Андрэй, потым спытаўся пра тое, пра што хацеў спытацца ў самым пачатку гутаркі.— Дзе Віктар?

— У Лукішках... А Шчурын там, дзе павінен быў быць.

— Нікога больш не арыштавалі?

— Не... Паліцыя разгублена... Відаць, не чакала...

...Андрэй ужо стаяў апрануты. Стаяла і Надзя.

— Ну... — сказала Надзя і доўга паглядзела Андрэю ў вочы, як быццам апошні раз, і дадала:

— Трымайся!

— Да перамогі...

— Шчаслівай дарогі!..— адказала Надзя і правяла Андрэя вачыма аж да дзвярэй.

## НА ШТУРМ!

Прыціхлі рахманыя вербы на шляхах, дарогах і ў вёсках раўніннай Брэстчыны. Толькі адзінокія дубы, што глядзяць у прасторы, чагосьці задуманыя. Брэстчына адным канцом пайшла на паўднёвы захад, на Валынь, дзе балотнымі лугамі і пералескамі дагарае доўгая Палеская нізіна. На поўдзень — непраходныя Камень-Кашырскія нетры, дзе толькі пушчы, карчы, балоты, бездарожжа і народ забіты, пануры і галодны. На ўсход — Піншчына тое самае, што і Камень-Кашырскія нетры, толькі крыху святлейшыя. Над гэтымі сховамі пушчаў, чаротавых балот і вёсак, якія нібы прывіды туляцца да зямлі, узвышаецца Пачаеўская лаўра, старадаўняя святыня палешукоў, месца вечных пілігрымак — заплаканых жанчын.

На стыку зямлі беларускай і брацкай зямлі ўкраінскай жыве гэты люд сярод суровай уладарнай прыроды і адвеку носіць у душы нянавісць да паноў. Напэўна, яшчэ і цяпер лірнікі, седзячы ля Пачаеўскай лаўры, апяваюць подзвігі герояў паўстанняў, спяваюць пра храбрага і хітрага Антона Нябабу, аднаго з атаманаў незлічоных атрадаў Багдана Хмяльніцкага, спяваюць пра валынскага, храбрэйшага з храбрых, багданаўскага палкоўніка Няхая. Ён са шмат меншымі сіламі пагалаву разбіў шляхецкае войска, а потым... А потым са сваімі казакамі хлябнуў на радасць, па ўсю душу сівухі, і ўся храбрая дружына заснула снон волатаў. А каварныя паны тут як тут. І звязалі Няхая... З жывога скуру здзіралі — з Няхая, храбрэйшага з храбрых, і соллю... соллю пасыпалі... Замучылі паны Няхая, так як і Нябабу задушылі ў балоце. Як жа не спяваць пра іх, герояў, кроў ад крыві, косць ад касці народа, як жа не аплакаць іх лірнаю слязой?

Стаяць дубы адзінокія, задуманыя. Можа, сняцца ім буры-навальніцы ці сінія далі, якія патанулі ў пушчах. Можа, слухаюць трывожны клёкат арла, які чуе здабычу?

Нездарма прыціхлі вербы і задумаліся дубы...

Гарачы подых плыве ад вёсак. Гэта не клёкат арла, гэта рокат гневу шуміць, клякочa. Сярод незлічоных вёсак, як вялікі край, белізной маячаць у садах панскія палацы. А землі іх, як аграмадныя павукі, распрасцерліся ўдаль і ўшыр і сваімі лапамі-шчупальцамі ўрэзаліся ў вузкія палоскі, абмытыя потам і слязою.

Там панская ласка свішча бізунамі. Ад гора, ад бяды, ад бясхлебіцы натоўпамі ідуць сяляне ў маёнткі — рабіць задарма, ідуць на здзек, на ўніжэнне. Ездзяць на конях паны ельскія, паны малачэўскія і іншыя і іншыя над людзьмі з сагнутымі спінамі на полі, ездзяць з бізунамі і толькі пакрыкваюць. А калі хто выпрастаецца, удар па спіне прыгінае яго зноў да зямлі. Па паўгода, а то і больш не плоцяць паны няшчасных пяцьдзесят грошаў у дзень, што завецца заробкам. Няма на паноў ні права, ні суда. Няўжо вярнулася паншчына?

Атрады паліцыі віхрам праносяцца па шляхах, па прасёлкавых дарогах, па абадраных вёсках і ўсё крычаць і б'юць людзей у зрэбных сарочках, у шэрых палатаных світках, людзей худых, засмучаных.

А чырвоныя ганцы ўсё ляцяць і ляцяць ва ўсе бакі з даручэннямі, з лістоўкамі, са сцягамі.

Клічуць лістоўкі, сцягі, клічуць збірацца ў магутны кулак на паноў, бо ўжо цярплівасць пераходзіць меру, выліваецца ў асобныя напады на паноў. Чыесьці рукі забіваюць панскіх вартавых на полі, паляць сцірты збожжа. Патрэбен магутны кулак. Трэба вялікімі калонамі ісці ў маёнткі, патрабаваць павышэння заработнай платы, патрабаваць, каб аддалі тое, што зароблена. Калі ж пан не выканае патрабаванняў, забраць яго дабро і падзяліць паміж сялянамі, а маёнткі спаліць.

Усё трапна ўкладалася, усё рыхтавалася так, як рыхтуе пралетарыят, арганізаваны ў прафсаюзы. Сяляне слухаюць на масоўках арганізатараў і думаюць: «Не, тут штосьці большае павінна быць і будзе, калі склікаецца ўвесь народ на дарогі і ў лясы. Агітатары не дагаворваюць да канца...» А ў саміх у душах кіпіць, вочы гараць. Вось надышоў час расправіцца з панамі.

Да таго ж весткі прыходзяць з усёй Польшчы — усё весткі баявыя, сацыяльныя, хоць і цяжкія.

Бастуюць шахцёры Дамброўскага басейна.

Ужо адбылося некалькі сутычак з паліцыяй, сутычак жорсткіх, баявых, наступальных.

Атакай конная паліцыя ўрэзалася ў масы шахцёраў-

дэманстрантаў і першага, перадавога, засекла шаблямі на смерць. Дэманстранты падхапілі баявую ахвяру, падцялі, як сцяг, і рынуліся на паліцыю Славой-Складкоўскага, змяшалі яе рады і адкінулі прэч.

Слухаюць сяляне, слухаюць, і сэрцы напаўняюцца гневам. Хутчэй, хутчэй на расправу з панамі!

Забаставалі лодзінскія ткачы, варшаўскія трамвайшчыкі. Падымаюцца ткачы Беластока.

Яшчэ не ўсё. Загаманіла па ўсю Польшчу кракаўскае сялянства, загаманіла так, што эскадроны ўланаў, пасланых Славой-Складкоўскім для расстрэлу, пачалі пераходзіць на бок паўстаўшых. Але не ўсе, але не ўсе яшчэ. Школа падхарунжых, выбранае шляхецкае войска, сыпнула кулямі. Сыпнула, але і само ўцякло.

Гэта выйшлі на бой за зямлю патомкі касцюшкаўскіх касінераў, удзелу якіх у паўстанні баялася самадурная, кічлівая шляхта і магнаты-касмапаліты. Некалі Януш Радзівіл сказаў: «Польшча — гэта палатно. Колькі я ўварву для сябе, тое будзе маё...» Рвуць Польшчу, крывавяць новыя магнаты ва ўгоду ракфелерам, крупам і сабе, выдумляюць новыя спосабы рабавання народа.

Слухаюць сяляне, слухаюць і кажуць: «Хутчэй, хутчэй на расправу з панамі!»

І яшчэ не ўсё — львоўскія сяляне паўсталі зноў... Хіба не блізка рэвалюцыя? Хіба не яна гэта ідзе?

Вядома, яна, як кіпучая лавіна, шукае сабе рэчышча.

Прыціхлі, панурыліся асаднікі, палахліва пaглядаюць на палі, на дарогі, а начамі прыводзяць у баявую гатоўнасць свае кулямёты, вінтоўкі, рэвальверы і нават шаблі. Новая шляхта працягвае культываваць норавы старой шляхты — без шабелькі ніяк не можа жыць.

Па вёсках нядошлыя настаўніцы — польскія заядлыя шавіністкі-фашысткі, пасланыя Пілсудскім на «крэсы» ўбіваць у галовы беларускіх дзяцей зняважу да свайго народа і яго мовы, плачуць, седзячы на ганачках, што Польшчу апаноўвае камунізм, што Польшча гіне.

Шумяць масоўкі-мітынгі, і гнеў пераліваецца цераз верх. Тысячнымі натоўпамі пайшлі і спыніліся там на той вялікай магістралі, якая злучае Брэст з Масквою. Шлях стралой перасякае палі, лясы, балоты, ляціць, уквечаны кучаравымі серабрыстымі вербамі, гудзіць тэлеграфнымі правадамі. Ён ляціць аж да Масквы, дзе над Крамлём высока развяваецца агністы Чырвоны сцяг. Яго бачаць усе бяздольныя, прыгнечаныя, яго бачаць паўстаўшыя.

А сцяг развяваецца, віхрыцца пад светам, то прыціхне, як быццам задумаецца ў вышыні, а потым зноў плыве і плыве, пераліваецца прамяністымі хвалямі.

Данясіце ж, бясконцыя правады, данясі ты, шлях стралісты, наш гоман аж да Масквы, раскажы, як тут нам жывецца, як здзіраюць з нас скуру паны ельскія, паны малачэўскія і іншыя і іншыя п'яўкі, як паліцэйскія бізуны свішчуць па нашых спінах і ўдзень і ўначы, як груганнём павіснуў страх над вёскамі. Прынясі нам, дарога, дарагую вестку,— калі ж будзе канец нашым пакутам? Мы сабраліся магутнай сілай, мы гатовы да бою — з дымам пажараў пусціць да неба ўсё панскае, усё шляхецкае, што вякамі высмоктвала нашу зямлю, сушыла наш народ. Зброя ў нас у руках. Камандзіра нам дайце, камандзіра, эх, ды такога, як Чапаеў, Качубей, як Шчорс... мы каменя на камені не пакінем, мы знішчым панскую няволю навекі!..

Правады гудуць, шлях у прыціхлых вербах шуміць гоманам.

Прыйшлі хлопцы-казакі, прыйшло іх тысячы. Сыплюцца пракляцці на паноў. Тут і гнеў, і сатыра, і гумар, і рогат нястрымны. Усё на паноў, усё на паноў. Плячо ў плячо стаяць — і вокам не акінеш — у куртках шэрых, у світках, у штанах палатаных, у лапцях, у ботах, а хто і босы.

Вось, вось усё гатова. Яшчэ прыйдзе больш, і тады пойдзем. Няхай пачуюць дамброўскія шахцёры, ткачы Лодзі і Беластока, варшаўскія трамвайшчыкі, кракаўскія і львоўскія сяляне, такія самыя гарапашнікі, як мы, няхай пачуюць наш голас заходнебеларускі, няхай пазнаюць нашу брацкую салідарнасць, няхай ведаюць, што і мы можам пастаяць самі за сябе. Раз столькі сілы выйшла, значыць, будзе канец панам.

І пайшлі тым стралістым шляхам з прыціхлымі вербамі, шляхам, што ляціць аж да Масквы. А з дарог прасёлкавых ідуць і ідуць і ўліваюцца ў магутны паток. Вось ужо і песня нараджаецца — слова к слову — узбагачаецца, мацнее, узвілася над тысячнымі радамі, песня, закіпаючая слязьмі, грозная, як набат:

Наперад, Брэстчына, працоўныя ўсе масы,
Нас гора ўсіх з'яднала ў барацьбе,
Нас завуць з магілаў брацці нашы,—
Наперад, Брэстчына, на бой, КПЗБ!

...А правакатары дзейнічалі...

Шпікі пераапрануліся ў жабракоў, хадзілі з торбамі па

вёсках, сядзелі на каменнях пры дарогах пад крыжамі і сачылі за рухам мас. Нават сам ваявода брэсцкі Костэк-Бярнацкі, дзікі самадур, крывавы садыст, пераапрануўся ў сялянскі кажух і пайшоў па вёсках. Відаць, дыхнула прыгодніцтвам, тым больш што правакатары дзейнічаюць. Костэк-Бярнацкі хоча быць падобны на Славой-Складкоўскага, хоча здзівіць кічлівую шляхту арыгінальнасцю правакатарскіх, шпікоўскіх ходаў і садызмам расправы над «казакамі». Паўстаўшых сялян Костэк-Бярнацкі называе казакамі, ну, а пра сябе думае, што ён нейкі там, ліхой памяці, Вішнявецкі або Патоцкі. Дыхнула Костэку-Бярнацкаму ў яго ваяводскі нос паходамі Багдана Хмяльніцкага, калі дрыжала шляхта і ўцякала з поля бою аж пад Варшаву. Адчуў гнуткі садыст, як быццам булава гетмана войска казацкага павісла над яго галавой. Тады ўспомніў старадаўнія прыёмы шпіёнства — апрануў сваіх шпікоў у жабрацкую вопратку і пусціў па вёсках і дарогах. Паліцэйскія атрады займаюць пазіцыі, займаюць іх на франтавы лад. Яны хочуць справакаваць узброеную бітву, хоць тыя, хто павёў калоны на стралісты шлях, маюць намер толькі патрабаваць ад памешчыкаў павышэння зарплаты, каб аддалі зробленае, запяць сваё месца ў ланцугу народнага фронту, што цэментуе рады рабочых і сялян усёй Польшчы.

Чуюць і ведаюць паліцыянты, стральцы, асаднікі, што армія збіраецца кіпучая, бурлівая, і хочуць не дапусціць да салідарнасці з Дамбровам, Львовам, Кракавам, Лоддзю, Варшавай.

Заклікалі камуністы сялян для магутнай дэманстрацыі, а яны, некаторыя, ужо і зброю ўзялі. І крыкі разлягаюцца:

— Што там тая заработная плата? Бі паноў па галовах, і ўсё!..

— Сабралі процьму народа... Няўжо гэта толькі для заработнай платы? Не, тут нешта іншае... Не можа быць... Толькі яны яшчэ гаварыць не хочуць... Але ад нас не схаваеш...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У цёмную ветраную ноч, калі таямніча хіліліся вербы і шапталіся сасьнякі на прыдарожных пясчаніках, Надзя паслала Сашу Грыняніцкага, члена баявой тройкі, які назваў сябе «Валодзя», конна за пятнаццаць кіламетраў у сяло Навасёлле папярэдзіць, каб не ўзброіваліся. Палі-

цэйскія сілы плывуць і плывуць, асядаюць у засадах, узмацняюць пастарункі, даносяць Костэку-Бярнацкаму аб руху «казакаў».

Стрымаць калоны, каб не ўзбройваліся, стрымаць, інакш... інакш правакацыя Костэка-Бярнацкага будзе здзейснена.

Саша, прыпаўшы да грывы каня, імчаўся па палявой дарозе, мінаючы ўзгоркі і даліны... І вось сыпнулі з ляска амаль што залпам. Конь упаў на калені, а потым на бок. Саша пакаціўся па балотнай траве і, аглушаны, не чуючы болю, ляжаў нерухома. Бачыў толькі цёмнае, насупленае неба і чуў ціхі шум ветрыка ў ляску. Мусіць, ужо прыйшоў канец? Конь храпеў, б'ючы нагамі, узнімаў галаву і зноў клаў на пясчаную дарожку. «Конь, відаць, сцячэ крывёю і скончыцца тут да світання. А я?» — думаў Саша. І хацелася рваць грудзі свае, прыпасці да зямлі і ў яе зарыцца. Саша прыўзняў галаву. З ляска ішлі цені. Ён пазнаў іх, убачыў у цемры белыя гузікі. Шапацеў недалёка рэдкі алешнічак па беднай нізінцы. Саша папоўз туды.

Пачуліся галасы. Замільгала святло.

— Конь паранены... А дзе ж яздок? — сказаў адзін.

Пачалі шнырыць па абочынах. Святло слізгалася па траве ўздоўж і ўпоперак. Няма... Няма ездака. Паглядзелі на алешнік доўга, раздумваючы, і ўсё ж такі ісці не адважыліся.

Саша, выбраўшыся з алешніка, пайшоў не назад, а наперад. «Можа, дайду да світання,— падумаў ён,— бо дайсці трэба...»

Саша дайшоў. Але якраз на світанні сто дваццаць хлопцаў-малойцаў сыпнулі... з вінтовак, абрэзаў, рэвальвераў па паліцэйскаму ланцугу, што акапаўся ў полі. Яны ўсю ноч крыжавым агнём штурмавалі пастарунак, хацелі прымусіць паліцыянтаў выйсці і здацца паўстанцам.

Эх, з асалодаю шпарылі ў вокны, у сцены непавіснага пастарунка. Паліцыянты сядзелі ў падвале, не выходзілі і не выйшлі, хоць адзін быў паранены. Непрыкметна падкралася світанне і асвяціла распаленыя твары штурмаўшчыкоў... Нехта сказаў: «Падпаліць!»

Добра, няхай будзе «падпаліць». Трэба дастаць газы. Аж раптам пачуўся шум машын. Шум машын набліжаўся да сяла, хоць тэлефонныя правады былі парваныя. Ехалі машыны Костэка-Бярнацкага з кулямётамі. Паліцыянты акапаліся ў полі.

Паўстанцы ўдарылі па іх. Ударылі раз, другі, трэці... дзесяты... Эх, так бы без канца!

З поля застракаталі кулямёты... На пярэдні край акопаў выехала танкетка.

Адбой... адбой... лес недалёка...

Разышліся і калоны, што ішлі да памешчыкаў патрабаваць павышэння зарплаты.

Да паўдня толькі ў самым раёне паўстання было ўжо арыштавана тры тысячы чалавек.

Па тры хаты ў кожнай вёсцы было занята пад катоўні.

Скатаваных — маладых, старых, мужчын і жанчын — каты выносілі з хат і кідалі на мураву балотнага лужка. Браліся за наступных. А потым за дзяцей... Стогн паплыў па палях і дарогах.

Паўстанне перакацілася ў Камень-Кашырскія нетры. Там з віламі, сякерамі і агнём паплылі паўстанцы па чаўнах да панскіх маёнткаў.

Саша з паўстанцамі адышоў у лес.

Ноччу яшчэ паспелі разбіць некалькі хутароў асаднікаў, забраць зброю і знішчыць скаціну...

Чыноўнікі ў Брэсце пакавалі чамаданы.

Кат Костэк-Бярнацкі абвясціў ва ўсёй Брэстчыне асаднае становішча. Потым загадаў будаваць шыбеніцы ў Кобрыне, дзе адкрыўся надзвычайны фашысцкі суд, каб засудзіць паўстанцаў на кару смерцю. У выніку гэтага паўстанне Брэстчыны і атрымала назву «Кобрынскае».

Але Костэку-Бярнацкаму і суду не давялося выканаць сваіх крывавых намераў. Па ўсёй краіне — ад Кракава, Варшавы да Беластока, ад Львова да Вільні — пракаціліся забастоўкі пратэсту ў абарону паўстанцаў. Зямля закалыхалася пад нагамі фашыстаў, і яны адступілі.

Паўстанцаў судзіў звычайны суд, караючы турмою ад шасці да пятнаццаці год.

ЦК КПП славаю вянчаў падзвіг паўстанцаў, выкрываў памылкі, аналізаваў... і прадракаў нарастанне рэвалюцыйнай сітуацыі.

А слава гэтая баявая паплыла далёка, аж за межы. Яна дайшла да Мінска, да Масквы, дайшла да Парыжа, Лондана, дакацілася за акіян аж у Амерыку і сабрала на вялікі сход эмігрантаў беларускіх і ўкраінскіх.

* * *

Надзя ўжо трэція суткі жыве ў лесе. Дзесяць узброеных хлопцаў сцерагуць яе, як вока. А найбольш неадступны Саша Грыпявіцкі. Хлопцы зрабілі для Надзі нават шалашык. Змяняючы адзін аднаго, вартуюць яго. Надзя ўсё нешта піша — стварае свайго роду летапіс аб яшчэ адной баявой старонцы ў жыцці народа,— падзеі, ад якой, здаецца, ужо рукой падаць да рэвалюцыі, да вызвалення.

І ў шуме соснаў, што гойдаюцца над шалашыкам, над галавою, Надзя, здаецца, чуе галасы. Гэтыя галасы, як хвалі, перакочваюцца з краю ў край няспынным рокатам. Народ ацэньвае тое, што адбылося:

— Ого, каб у нас была такая зброя, як у іх... Не так бы яны заспявалі...

— Было ж тысячы народу... Каб усе ўзброіліся, такі ж няпраўда, нешта было б...

— Вайна была б! Вось што! — крычаць другія.

— А каб не бралі зброі і пайшлі да памешчыкаў, то, нябось, прыбавілі б плату і аддалі б зароблепае... А так... цяпер зусім не аддадуць...

— То трэба было слухацца, як казалі камуністы, а то не... Выклікалі воўка з лесу... Столькі людзей скатавалі, столькі пасадзілі ў турмы... Магло б быць інакш...

— Без ахвяр барацьбы не бывае...

Прыціх лес, быццам задумаўся. Дзе ж тое «заўтра», калі ўсё будзе так, як магло б быць?

Пасля зноў зашумяць сосны пявучым карагодам. Недзе ў гушчах народных адшліфоўваецца ацэнка сваіх баявых спраў. І Надзя піша, піша, піша. Нарастанне актыўнасці народнага фронту па ўсёй краіне абяцае, што баявыя настроі Брэстчыны не ўлягуцца, нягледзячы на тэрор.

Саша Грыпявіцкі, член баявой тройкі, рассылае разведчыкаў і разам з усімі справамі наказвае, каб пыталіся, ці няма тут правакатара, заходнебеларускага Азефа — Карэльчука. Сашу паслала з Беластока група рабочых сюды, у самы далёкі куток Брэстчыны, для яго пошукаў. Саша прыехаў, знайшоў таварыша з цэнтра Максіма, пакуль што нідзе не намацаў Карэльчука. Але тут пачаліся такія падзеі, што было ўжо не да яго.

Аднак... Можа, ён выплыве тут? Прыехала Надзя, і Саша, як верны страж, неадступна стаіць пры ёй, выконвае ўсе яе загады.

Разведчыкі прыходзяць і дакладваюць, што робіць у вёсках паліцыя Костэка-Бярнацкага, гавораць, што Карэльчука не чуваць, што па вёсках ездзіць толькі варшаўскі шпік Клей, кіруе арыштамі, допытамі і катаваннямі. Шукаюць Надзю, шукаюць Сашу. Таварыш Максім арыштаваны. Эх, не ведае Саша, што глушэцкае староства ад імя павятовай камендатуры паліцыі абвясціла ўзнагароду пяць тысяч злотых таму, хто скажа, дзе знаходзіцца Саша Грыняўіцкі. Варшаўскі шпік Клей рассылае атрады паліцыі для прачосвання лесу. Шмат паўстанцаў ужо трапіла ў рукі.

Трэба аддаляцца ў лес. Трэба аддаляцца ў напрамку ўсходнім і ўсходнім. Туды падаліся па лесе разрозненыя групы паўстанцаў. Колькі іх дойдзе да мэты, невядома.

Зноў начлег у лесе. Костэк-Бярнацкі разам з паліцыяй паслаў сабак. Стала горш. Не спыняліся ўжо ні ўдзень ні ўначы.

Аднаго дня, калі былі ўжо далёка-далёка ад месца паўстання, неспадзяваны тут стрэл прымусіў сяброў легчы ў кустах. Пачулі трэск ляснога ламачча. Нехта бег. Бегла многа ног. Бачаць — бягуць паліцыянты, ды так бягуць — без аглядкі.

Адзін паліцыянт, засопшыся, прабег за два крокі ад Сашы, які зарыўся ў папараць, не спускаючы з вачэй Надзі, што ляжала недалёка.

Трэск сціх, застаўся толькі шум сосназ.

Паўстанцы пачалі ўзнімаць галовы, пазіраць навокал. Зноў пачуўся трэск, але не такі, як дагэтуль. Нехта прабіраўся павольна і асцярожна. Чакалі, прыпаўшы да зямлі. Урэшце выйшла з кустоў пяцёра з вінтоўкамі, пяцёра такіх жа, як тыя, што ляжалі ў траве. Саша праз папараць разглядзеў іх курткі саматканыя, кепкі. Здзівіў яго асабліва адзін, нярэдні, з вялікімі бялкамі, з носам, крыху звернутым набок. Пяцёра з вінтоўкамі спыніліся, павялі ціхую гутарку.

Адзін звярнуўся да таго, з вялікімі бялкамі, і кажа:

— Не, Данілюк, нам трэба падацца яшчэ далей ад чыгункі і ісці балотамі. А так можам зноў напаткаць.

— Мусіць, што так,— адказаў той, якога назвалі Данілюком.

— Ну і драпанулі,— сказаў трэці,— ад аднаго стрэлу.

— Яны ж мяне даўно, увесь час шукаюць,— адказаў той самы Данілюк,— шукаюць і цэню свайго баяцца.— Пачакаўшы, дадаў: — Не, хлопцы, паўстанне не павінна

пагаснуць, яно павінна разгарацца... Прыйдзем якраз упару.

— Ну, дык зараз і пойдзем адразу на поўдзень, а падыпоўшы, звернем на захад,— сказаў хтосьці з групы.

Саша ціхенька падняўся на ўвесь рост і апёрся на вінтоўку.

— Здарова, хлопцы! — сказаў ён.

Тыя анямелі. Данілюк паспеў ускінуць вінтоўку, але так і застыў у чаканні. Так і стаялі ўсе ў розных позах. У каго вінтоўка вісела на руцэ, ён яе толькі раптоўна прыціснуў да сябе і так застыў. Другі, трэці павярнулі галовы і спыніліся вачыма на Сашы.

Саша крыкнуў пярэдняму — Данілюку:

— Апусці вінтоўку! Свае...

Данілюк апусціў вінтоўку да нагі, і тады Саша пакрочыў да яго.

— Прабіраецеся на месца паўстання? Так?

— Так...— сказаў Данілюк.

— Дарма, хлопцы, позна ўжо... Мы ідзём адтуль...— сказаў Саша і ціха свіснуў.

З кустоў высыпалі таварышы. Пяцёра з вінтоўкамі ўзрадаваліся такой сустрэчы, але разам з тым і засмуціліся. Паўстання ўжо няма.

— Нас жа пайшло некалькі груп,— сказалі хлопцы,— каб хоць у парадку вярнуліся.

Новымі паўстанцамі занялася Надзя. Саша паклікаў Данілюка ўбок і спытаўся:

— Ты быў у Запалянцы калі-небудзь?

Данілюк паглядзеў з момант у лес, потым глянуў на Сашу і сказаў:

— Так... быў...

— Я цябе бачыў у Петруся Хадыкі, у музыканта, разам з Макарам...

— Так...— пацвердзіў Данілюк,— я тады якраз уцёк з турмы. Я прыпамінаю цяпер і цябе... З таго часу я хаваюся ў лесе. Колькі аблаў на мяне рабілі, і ўсё ніяк ім не ўдаецца мяне злавіць. Сягоння таксама была аблава на мяне. Бачылі, як яна ўцякала ад аднаго майго стрэлу. Ні разу не даводзілася мне спалохацца іх стрэлам... Толькі сягоння...

— Дык ты так і хаваешся? — запытаўся Саша.

— Так і хаваюся... Мусіць, прыйдзецца ўжо ў лесе і падохнуць. Вось, думалі, паўстанне. А тут на табе...— скончыў Данілюк.

— Нічога,— сказаў Саша,— мы параімся і, можа, перакінем цябе ў другое месца.

— Нічога не будзе. Толькі лес мяне можа ўкрыць. Нада мною вісіць калі не смерць, то вечная катарга. Пачакаем другога паўстання...

Надзя расказвала хлопцам аб ходзе паўстання, аб яго значэнні для рэвалюцыйнага руху, гаварыла аб народным фронце... Нейк чулліва ўглядалася яна ў гэтых абветраных, загарэлых хлопцаў, якія, апёршыся на вінтоўкі, слухалі яе не змаргнуўшы. Глядзелі так, як быццам па яе твары хацелі прачытаць,— калі ж, урэшце, будзе тая жаданая рэвалюцыя? А Надзя гаварыла так, што быццам яна ўжо і блізка.

Яна скончыла і толькі тады спыталася:

— Дзе ж мы зараз знаходзімся? У якой мясцовасці?

— У раёне Дзядоў,— адказалі хлопцы.

— Дзядоў? — перапытала Надзя і сціхла. Далёкае мінулае дыхнула ў душу і прыемнасцю і смуткам.

Саша гаварыў Данілюку:

— Мы ўцякаем ад пагоні... Праўда, брэсцкія паліцыянты сюды ўжо не дойдуць. Але вяртацца хлопцам назад ужо нельга. Ім трэба ісці толькі наперад. Хочаш, ідзі з імі.

Данілюк падумаў, падумаў і ўрэшце адказаў:

— Баюся, што не выйдзе справа. Быў я там, па самай мяжы, два разы, і кожны раз вяртаўся назад... Салдаты, сабакі... Не веру ўжо ў сваю ўдачу. Можа, ім пашчасціць, няхай...

...Надзя тую ноч начавала ў Дзядах, у Мар'яны, а Саша прабыў з Данілюком у лесе. Чатыры хлопцы разышліся па сваіх хатах, а тыя дзевяць пайшлі на ўсход і на ўсход.

...Размерана парыпвае драўляны крук на драўлянай жэрдцы ў такт пагойдванню калыскі. За вокнамі ходзяць цені ад вішань. Усплёскі возера ўрываюцца ў цягучы шум бору, які шуміць, здаецца, над хатай. А з вуліцы ўвесь час далятае трымценне балалайкі. Нехта ўсё іграе і іграе, то зухавата-ўдала, то плаўна-лірычна. Часам ударыць у вокны дзявочы смех.

— Волечка, ты спіш? — пытаецца Мар'яна, пакалыхваючы калыску. (Яна, як даўней, называе Надзю Вольгай.)

— Не, Мар'яна, не сплю,— адзываецца Надзя з лавы,



Піліп Пестрак
выступае перад рускімі пісьменнікамі.
*Ленінград, 1947 г.*



Піліп Пестрак.
*Адэса, 1952 г.*

з цёмнага кутка, і зараз жа пытаецца: — Хто гэта іграе на балалайцы, Мар'яна?

— А!.. Гэта Ваня Качаткоў... Жыве тут на кватэры ў адных. Працуе то ў лесе, то на лесапільні. Ён аднекуль з Расіі, Волечка. Харошы, удалы хлопец. Мусіць, ажэніцца хутка з адной нашай дзяўчынай.

— Відаць, хораша іграе...

— Хораша іграе,— адказвае Мар'яна,— і спявае... Усе яго тут палюбілі. Гэта мой Антон прывёў яго сюды з лесу.

— Як жа ты цяпер жывеш з Антонам? — пытаецца Надзя.

— Ой, Волечка, адзін страх і пакута... Забягае часам уначы дахаты на хвіліну. Возьме плуг на плячо, запясе на поле. Я каня выведу яму да лесу. Вось ён так па начах араў, нават сеяў, Волечка. А цяпер ужо і гэтага рабіць нельга. Урываецца часта сюды, як звер, глушэцкі камендант Дарвапскі, заходзіць у хату і пагражае арыштам, калі не скажу, дзе Данілюк. Падумаць, дзе Глушэц, а дзе Дзяды, а ён з цэлым атрадам... Лётае, зверына, па ўсяму павету. Людзей забірае, кароў, нагайкаю лупіць...

— Цяжка табе, Мар'яна. А ты ўсё роўна дзяцей родзіш, гадуеш. Непераможная ты, Мар'яна...

Мар'яна засмяялася.

— От... Якое б яно ні было жыццё, а яно жывецца, Волечка. Данілюк добры чалавек, добры муж... Як нарадзіўся гэты хлопчык, то паносіць яго на руках, а потым схопіць мяне, як дзіця... Ды што зробіш? Каб не паны, то можна было б зусім смутку не мець,— закончыла, уздыхнуўшы, Мар'яна.

— Прыйдзе канец па іх...— гаворыць Надзя,— ой, прыйдзе, неба загарыцца ад зямлі...

— А скажы, Волечка, там, у Савецкім Саюзе, праўда, што такая палёгка жанчынам? Водпускі перад родамі і пасля родаў? Яслі, дапамогі?

— Усё праўда, Мар'яна...

Надзя пачала расказваць падрабязна аб становішчы ў Савецкім Саюзе наогул і ў прыватнасці аб становішчы жанчыны.

— Каб гэта ў нас сталася, то чалавек на другі свет нарадзіўся б. Мусіць, нам ужо нічога не дачакаць...

— Нельга так гаварыць, Мар'яна. Увесь наш народ у барацьбе. Кожны дзень набліжае нас да перамогі. Савецкі Саюз думае пра нас. Кожны дзень рыхтуе нам дапамогу.

— А ты, Волечка, можа, замужняя ўжо? — спыталася Мар'яна.

— Не, Мар'яна... Цяжка гаварыць аб гэтым...

Крук усё парыпваў на жэрдцы, вішні туліліся да вокнаў. А балалайка ўсё яшчэ звінела і звінела па вуліцы.

— Кладзіся, Мар'яна,— сказала Надзя.

— Ага... Трэба, мусіць. Каб хоць ночка прайшла спакойна.

Мар'яна ўстала. Заглянула ў вокны. Кладучыся, уздыхала і прыгаворвала:

— Ходзіце, ездзіце вы, саколікі, па свеце... Усё за тою свабодай для ўсіх людзей... Эх, жыццё, жыццё... пякучае, як тая крапіва ля плота, горкае, як палын... Харошая ты, Волечка, табе б чалавека, ды такога найлепшага...

Надзя ціхенька засмяялася і ўздыхнула.

Назаўтра Надзя з Сашам Грыпявіцкім селі на поезд на станцыі Залатая гара, каб дабрацца да Вільні.

* * *

Андрэй выехаў з Варшавы неспадзявана. Над шумным горадам апаў мяккі змрок. Пачаў падаць вільготны снег. На вартавога паліцыянта, які цэлы дзень тарчаў за акном, упаў прамень вулічнага ліхтара, і відаць было праз акно, як пушыстыя сняжынкі спакойна клаліся на яго казырок. Андрэй сказаў гаспадару кватэры, старасвецкаму яўрэю-хасіду, што для асцярожнасці пара апусціць шторы на вокнах. Гаспадар з закладзенымі назад рукамі стаяў, па прывычцы прытуліўшыся спіною да кафлянай печкі. Ён махнуў рукою, як быццам хацеў сказаць Андрэю, што гэта не ўпершыню і што ён, Андрэй, тут не першы і, вядома, не апошні, падышоў да вокнаў і апусціў шторы.

— Як стала Польшча, то ён тут усё стаіць... Кожны дзень...— сказаў гаспадар, становячыся на сваё месца.

Андрэй чакаў сувязную з ЦК. Прыходзіла сягоння раніцай, абяцала прыйсці ўвечары, але вось нешта няма. На канапе ляжалі ў скрутках выразкі з савецкіх газет: «Правды», «Известий», «Комсомольской правды», «Звязды», апошняга нумара газеты «Чырвоны сцяг» — органа ЦК КПЗБ, тры экземпляры тэарэтычнага органа КПП «Новы пшэглёнд» («Новы агляд»), некалькі падрукаваных на машынцы цыркуляраў ЦК, інфармацыйі, пастаноў розных акруговых канферэнцый і інш. Усе гэтыя матэры-

ялы, пасля сустрэчы Андрэя з Грышам, былі прынесены сувязною сёння для азнаямлення. Андрэй накінуўся на гэтую літаратуру, як галодны на ежу, чытаў увесь дзень аж да змроку. У галаве адчувалася стомленасць. Хацелася пацягнуцца, выпрастацца, каб аж косці затрашчалі, і выйсці на паветра, прайсціся. Але гэтага зрабіць нельга. Усё яна — канспірацыя, пільнасць, як дабрадзейка, неадступна спадарожнічае з табою. Яна стала другою душою падпольшчыка-камуніста. Андрэй прайшоўся па цесным пакоі, залітым электрычным святлом, і выйшаў у кухню пакурыць.

На кухні гарэла пліта. Гаспадыня кватэры, маладая жанчына з ледзь прыкметным рабаціннем на твары, абірала бульбу, стоячы над плітою. Яна ўяўляла сабою поўны кантраст сваймy мужу,— была маладзейшая за яго год на пятнаццаць. Андрэй нават падумаў аб гэтым і хацеў пачаць гутарку пра жыццёвыя выпадкі, але гаспадыня яго апярэдзіла.

— Можа, пану даць чаю? Пан жа такі бледны, як быццам толькі ўчора выйшаў з турмы... Мой божа...— І чорнымі вачыма спачувальна глянула на Андрэя, нешта мяркуючы сабе пра жыццёвы лёс гэтага чалавека.— Зараз я пану чаю дам... Пан у нас паправіцца, адпачне...

Андрэй не захацеў піць чай у пакоі, кажучы, што на кухні весялей. Гаспадыня паведаміла ў гутарцы, што ў горадзе неспакойна, паліцыя ўся на нагах, бо сёння выбухнула забастоўка трамвайных рабочых, і, магчыма, праз два-тры дні спыніцца наогул увесь трамвайны рух у горадзе. Андрэй не падаў знаку, што гэтая вестка зрабіла на яго ўражанне. «Заўтра ж свята Кастрычніцкай рэвалюцыі»,— падумаў ён.

І вось тут увайшла сувязная. Яна прынесла з сабою свежасць вуліцы і сняжынкі на блакітным берэце, на якім з левага боку бліщчала залацістая брошка. Калі расшпіліла сваю куртку, абтрасаючы снег, Андрэй заўважыў на ёй аранжавы світэр, пад якім вырысоўваўся яе малады стройны стан. Андрэй усміхнуўся. Ён успомніў, як яна прымярала гэты світэр у цесным пакойчыку тэкстыльшчыцы Гандзі, куды, прыехаўшы, прыйшоў Андрэй на яўку. Яна пыталася тады, ці да твару ёй гэты світэр. І тады ж знянацку штурхнула яго таямніча ў руку, пытаючы адначасова: «Ты сядзеў у турме шэсць год?» Андрэй усміхнуўся, кіўнуў галавой, кажучы «так», хоць гэтая вяртлявая

дзяўчынка з быстрымі чорнымі вачыма не адгадала, прыбавіла адзін год. «Чула звон, але не ведае, дзе ён,— падумаў Андрэй,— няхай не ведае». І вось цяпер, мітуслівa размахваючы рыдыкюлем, паклікала Андрэя з кухні ў пярэдні пакой. Там, засопшыся, сказала:

— Ты зараз жа едзеш у Пінск.

Андрэй на хвіліну разгубіўся.

— Што? Як мне вядома, перспектывы былі іншыя...

— Нічога не значыць... Паступіў такі загад... Там у акрузе разбіты раёны, разумееш... Забіты правакатар... Адбыліся арышты... Выбухнула забастоўка лясных возчыкаў, разумееш... Няма кіраўніцтва ў акрузе... Канспіратыўная сувязь засталася толькі ў адной вёсцы... Я табе дам пароль, разумееш... Трэба аднаўляць раёны... Возьмеш курс на стварэнне акругкома, разумееш... Па лініі камсамольскай там працуе ўжо адна дзяўчына, ты яе знойдзеш... І ты, разумеецца, паедзеш...

Андрэй глядзеў у вочы дзяўчыны, на здаровую ружовасць яе шчок, на тое, як скакалі ў час гутаркі яе маладыя сакавітыя губы, і цвярдзіў сабе, смеючыся ўсім нутром: «Ох, гэтая мне прэтэнзія на сталасць!»

— Давай хоць сядзем,— прапанаваў ён.

Яны селі. Сувязістка ціхенька сказала Андрэю пароль. Пасля з ражка хустачкі выняла вузенькую, маленькую паперачку і падала Андрэю.

— Вось тут запісаны пароль... Схавай...

— Гэта мне не трэба. Спадзяюся на сваю памяць... Не ўпершыню,— адказаў Андрэй і вярнуў ёй назад тоненькую паперачку.

— Ох, які ты памятлівы,— вывела дзяўчына ігрывым галаском,— ну, як знаеш...— І яна працягнула Андрэю білет.

— Што? І білет гатовы? Як жа добра!

Ён пляснуў па сваіх каленях рукамі, паўхвіліны, зморшчыўшы бровы, глядзеў у падлогу сабе пад ногі, супакойваючыся, і тады перавёў вочы на сувязную. Штосьці хацелася сказаць, штосьці такое зрабіць, можа, прытуліць да грудзей вось гэтую даверлівую маладосць у блакітным берэце з залацістай брошкай. Як жа яна вяла яго тады ўначы ад трамвая да трамвая амаль праз увесь горад! Каб не гэтая брошка, страціў бы яе з вачэй. Брошка мігцела ўдалечыні ў святле ліхтароў, у бляcках магазінных вітрын, калі цяжка было праціскацца праз гарадскі натоўп, яна блішчала нават там, дзе было цёмна. Гэта ўсё

прамільгнула цяпер у галаве Андрэя. Нешта, мусіць, заўважыла камсамолка ў вачах Андрэя, бо схапіла яго за нос і патрасла.

«Разумніца...» — падумаў ён і энергічна ўстаў з канапы.

— Ну, каму ў дарогу, таму час,— прамовіў Андрэй і пачаў апранацца. Сувязная распраствала яму каўнер паліто, падзявала шапку, зашпільвала гузікі, абгладжвала, дала ў руку торбачку з сякімі-такімі рэчамі і сказала:

— Будзь асцярожны... Разумееш... Сягоння забастоўка трамвайшчыкаў... Паліцыя насцярожана... Я правяду цябе да трамвая...

Андрэй паглядзеў ёй у вочы доўгім позіркам і сказаў:

— Заўтра гадавіна Кастрычніка...

— Ведаю, ведаю... Гэта адчуваецца ў горадзе... Усё як быццам прыціхла, прытаілася. Патрэбна падвойная пільнасць...

Развітаўшыся з гаспадарамі, яны выйшлі пад вільготнае варшаўскае неба, пад якім на розныя лады ў грукаце магутна шумеў горад.

Да адыходу поезда заставалася паўгадзіны. Андрэй тупаў па зале Усходняга вакзала, шукаючы цемнаватага месца, дзе б прысесці. Па зале таксама пахаджваў паліцыянт. У падбародак уядаўся кароткі для яго пухлага твару пасак ад шапкі, які нагадваў павадок вуздзечкі. Павольна праходзілі патрулі жандармерыі, таксама з паскамі пад падбародкамі. Праходзячы міма гэтых стражаў, Андрэй адчуў на сабе позірк паліцыянта і, доўга не думаючы, падышоў да яго.

— Скажыце, калі ласка, які нумар трамвая ідзе да маста Панятоўскага?

Чакаючы адказу, Андрэй з мінай пакорлівасці глядзеў у вочы паліцыянта і зразумеў, што яму надакучыла стаяць,— на твары разлівалася стомленасць і адсутнасць цікавасці да ўсяго.

«Не так страшны чорт, як яго малююць»,— падумаў, адыходзячы, Андрэй.

Калі ён хацеў толькі прысесці на краечак лаўкі ў аддаленні, яго позірк прыкавала незвычайная для варшаўскага вакзала з'ява. Праз усю сярэдзіну залы нясмелымі крокамі ішоў селянін. У кароткай шэрага сукна свайго вырабу куртцы, апрапутай па кажушку, у такіх жа штанах, у шапцы з брылем, з-пад якой тарчалі пасі-

белыя валасы, ён скробаў цяжкімі ботамі па асфальтавай падлозе залы, бездапаможна азіраючыся. Адзін раз ён спыніўся, якраз на сярэдзіне залы, павёў наўкола сваімі шэрымі вачыма і, відавочна па прывычцы, выцер далонямі вусы. Стоячы так, ён выглядаў выпадкова занесеным сюды, чужым, адзінокім. Якраз праходзіў нейкі пан у капелюшы. Селянін звярнуўся да яго, паказваючы ў левай руцэ бутэлечку, робячы рух правай так, як быццам хацеў выкалупаць з бутэлечкі корак. Андрэй зразумеў, што дзядзьку патрэбен корачнік, каб адкаркаваць бутэлечку. А гэты пан у чорным капелюшы глядзеў на рухі рук дзядзькі, як на нейкія заклінанні, і, паціснуўшы плячыма, пайшоў усміхаючыся. Дзядзька абходзіў людзей, якія сядзелі на лаўках, як быццам дэманструючы гэтыя рухі над бутэлечкай. «У чым жа справа?» — думаў Андрэй, не спускаючы вачэй з дзядзькі. Той ужо вярнуўся на сваё месца на лаўцы. Там ляжала дзяўчына, над якою і схіліўся дзядзька. Андрэй не вытрымаў і непрыкметна падышоў да іх. Пачуў ціхія бацькоўскія словы: «Не знайшоў чым адкрыць лякарства, дачушка... І трэба ж было мне згубіць гэты ножык!..»

— Не трэба, тату, няхай... Мне ўжо лягчэй...— хворым голасам адказала дзяўчына.

На варшаўскім вакзале дыхнула Андрэю бытам беларускай хаты. У дзяўчыны быў бледны сцягнуты твар з дагараючым румянцам сухотніцы. Андрэю стала ўсё ясна: дзядзька прывозіў сваю дачушку да лекараў аж у Варшаву. Няйначай, кароўку прадаў для гэтага, растраціўся — трэба ж ратаваць дачушку. А колькі ж трэба яму яшчэ гэтых каровак? І дзе іх узяць?

Ужо седзячы ў вагоне, насунуўшы брыль кепкі на вочы, Андрэй у дрымоце, перабіраючы ўражанні дня, часта вяртаўся да гэтага вобраза бацькі і хворай дачушкі, загубленых у натоўпе варшаўскага вакзала. Гэты вобраз вырастаў у яго ўяўленні да велічыні сімвала. І кожны раз Андрэй, бачачы перад сабою гэты вобраз, паўтараў з уздыхам:

— Не вылечыць, дзядзька, тваёй дачушкі панская Варшава...

За акном вагона мільгае цёмная ноч, а насупраць на лаўцы два п'яныя купцы дзяруць горлы — такая іх гутарка. «Няхай крычаць, абы мяне не чапалі», — думае Андрэй і шчыльней туліцца галавою ў куток. Авалодвае

цяжкая дрымота, якая часам пераходзіць у сапраўдны сон.

— Чы я тобе пес, чы цо?! — выкрыкваў у п'яным экстазе адзін з купцоў. І Андрэй абуджаецца. «Акампанемент да сну не зусім прыемны»,— думае, праціраючы вочы. Пачуў у калідоры вагона нейкі рух і пасцярожыўся. У купэ зазірнуў ягамосць у кепцы з навушнікамі, з брыдастым, зямлістага колеру тварам. Прывычна рукі ўсаджаны ў падоўжныя кішэні кароткай ватнай шэрай курткі. Там, напэўна, у руцэ ён трымае рэвальвер. І гэтыя характэрныя штаны — брыдж. Свідруючы вачыма, ён павольна агледзеў купэ. Андрэй пачаў выціраць хустачкай нос, нагнуўшы галаву і адным вокам назіраючы на насок бота непрыемнага ягамосця. Насок бота зрабіў паварот улева і знік у калідоры.

— Панове, прошэ білеты! — увайшоў кандуктар з ліхтарыкам на грудзях.

Ён з дакладнасцю правяраў білеты, прашчыкваў іх шчыпцамі з мастацкай віртуознасцю. Праверыўшы, адсалютаваў і выйшаў.

«Значыць, пад'язджаем да Брэста»,— падумаў Андрэй.

Андрэй не памятае, калі яго агарнуў салодкі сон і колькі часу ён прабыў у гэтым стане. Калі прачнуўся, ужо быў дзень. Поезд стаяў. Андрэя ахапіла трывога. Спытаўся ў суседа, ці даўно стаіць поезд. Той адказаў, што хвілін пяць. Андрэй выйшаў у калідор і глянуў у акно. Насупраць яго быў Брэсцкі вакзал. Палатно чыгункі, як і перон, было прыцярушана свежым снегам. Падмятальшчыкі на ўвесь размах мятлы падмяталі перон. Тут пахла ўжо сапраўднай зімою. Ці то пасля сну так здавалася, ці таму, што яшчэ быў ранак,— Андрэя здзівіла цішыня. Брэст — баявы пункт шпікоў і баявы пункт падпольшчыкаў. Адгэтуль пачынаецца ўжо Беларусь. Тут трымай вуха востра — хто каго. Але ўсюды цішыня, амаль пустата — на пероне нікога. Няўжо абыдзецца без параду? А можа, ён ужо быў? І вось да вушэй Андрэя даляцеў тонкі, віскліву скрып вакзальных дзвярэй. З іх, як з тунеля, высыпала чалавек восем розных масцей. Усе ў кепках, некаторыя з кіямі, папяросамі ў зубах. Спыніліся на пероне і глядзяць на поезд. Парад грымас, галерэя прытонных тыпаў. Пакамечаныя твары, у некаторых абвіслыя шчокі, прапітыя крывавыя вочы.

«Нешта спазніліся сёння»,— падумаў Андрэй і, не чакаючы ні хвіліны, пайшоў у канец вагона. На шчасце,

дзверы былі адчынены, што не заўсёды бывае. Андрэй выйшаў па процілеглы бок поезда. Даведаўшыся ад кандуктара, што поезд пойдзе праз дзве гадзіны, вырашыў прайсціся ў горад.

Дзве гадзіны — доўгі час. Трэба адысціся далей ад вакзала, глыбей у горад. Паставіўшы каўнер паліто, Андрэй хуткай хадою ішоў па тратуары. Рэстараны і піўныя былі ўжо адчынены. Крамы і магазіны — не ўсе. Андрэй успомніў, што сёння нядзеля. На вуліцы найбольш сустракаўся просты рабочы люд. «Паны яшчэ спяць»,— падумаў Андрэй. Адышоўшыся ад вакзала больш як кіламетр, убачыў невялікую піўную з драўляным ганачкам, куды і накіраваўся. У піўной ужо сядзелі пяць чалавек наведвальнікаў і снедалі. Гаспадар піўной, пажылы яўрэй, тоўсты, нізкага росту стаяў за прылаўкам і выглядаў, як месяц. Ён перагортваў сваю прыхода-расходную кнігу. За вухам у яго тарчаў аловак. Час ад часу ён браў яго з-за вуха, штосьці запісваў і клаў назад. Глянуў паверх акуляраў на ўвайшоўшага Андрэя і кіўнуў галавою налева, запрашаючы сесці.

— Прошэ сядаць... Зараз пана абслужаць...— сказаў ён клапатліва і зноў уткнуўся ў сваю работу.

У піўной было холадна, і людзі сядзелі апрапутыя і ў шапках. Людзі пачалі напльваць усё больш і больш. Піўная паволі загула мешанай мовай — польскай і беларускай. Андрэй пачуў гутарку аб зарплаце, аб шпалах, бярвеннях і зразумеў, што гэта рабочыя лесапільні.

З аддаленага кутка піўной загучаў радыёпрыёмнік. Андрэй сядзеў і назіраў за публікай. «Непрыемных асоб» не знайшоў. Усе твары былі простыя, сумленныя, ад іх ішла таварыская ўсмешка. Здаецца, яны ведалі тут адзін аднаго, адчувалі сябе, як дома. У Андрэя стала цёпла, спакойна на сэрцы — ён сядзеў сярод рабочых. У тых, якія хапілі па пары стопак горкай, пачалі ўжо, як кажуць, дыміцца чупрыны, кепкі спаўзлі на патыліцы і валасы паблыталіся на лбах. Дым ад папярос тонкімі струменьчыкамі віўся ў столь. У піўной стала значна цяплей. Жаночы голас у радыёпрыёмніку спяваў мелодыю польскай кабарэтнай песенькі. Яе на ўвесь голас падхапіў адзін з прысутных і пачаў прытупваць нагою ў такт:

Цурусь, цурусь,
Чэго ж ты еншчэ хцэш? —
Патш, улан млоды

Пенкнэй уроды,—
Ідзь го сòбе вэзь [1].

Гаспадар з-за прылаўка толькі глянуў паверх акуляраў і ўсміхнуўся. Па ўсёй зале праплывала ад стала да стала зграбная дзяўчына ў белым фартуху. Яе чорныя пушыстыя валасы каронай узвышаліся над ілбом. Гэта была не іначай дачка гаспадара. Яна падышла да Андрэя і спыталася:

— Пан, мусіць, не тутэйшы?

Андрэй адказаў, што ён прыехаў з вёскі па судовай справе. Андрэю здавалася, што дзяўчына яму не паверыла. Ён даядаў сваё снеданне. Да адыходу поезда заставалася больш чым паўгадзіны. Андрэй хацеў ужо ісці. І тут сталася зусім нечаканае: Андрэй, не верачы сваім вушам, пачуў з радыёпрыёмніка мелодыю «Інтэрнацыянала». Андрэя пранізала, як электрычным токам: ён утуліў галаву ў плечы, звесіў яе на стол. Па зале піўной загрукаталі крэслы і адзін за другім пачалі ўставаць людзі, здымаць кепкі з галоў. У Андрэя забілася сэрца — што ж рабіць яму? Павёў вачыма па зале: пяць чалавек у аддаленым кутку ля дзвярэй сядзела. Значыць, гэта не рабочыя. А можа, якія рамеснікі ці хто іншы. Іменна, можа быць хто іншы, і ты, Андрэй, павінен сядзець. Страфа песні канчалася. Рабочыя з шумам садзіліся на свае месцы, і па зале ўпаўголаса пранеслася:

— Гэта не іначай, як з Масквы...

Гаспадар замітусіўся, як абуджаны ад спячкі, шчокі заружавеліся ад страху, ён забегаў за прылаўкам, пачаў крычаць:

— Хана! Выключыць, зараз выключыць... Я не хачу лішні клопат... Выключыць, выключыць!..

Хана выключыла радыё, і ў піўной стала раптам зусім ціха. Рабочыя не елі, а сядзелі, як быццам адпачываючы. У вачах дагаралі агеньчыкі, і з твараў сыходзіла тонкая бледнасць, ад якой яны былі ўсе пахарашэлі. Пачалі ўпотаї пазіраць у бок Андрэя. Пачуццё крыўды кранула за сэрца: могуць зразумець яго іначай. Хацелася крыкнуць:

— Родныя, блізкія, я з вамі, я ваш...

---

[1] Дачушка, дачушка.
Чаго ты яшчэ хочаш? —
Глянь, улан малады
Прыгожага выгляду,—
Ідзі яго сабе вазьмі.

«Што б ім такое пакінуць, каб яны мяне правільна зразумелі?» — падумаў Андрэй. Расплачваючыся з дзяўчынай, ён сказаў так, каб чулі ля суседняга стала:

— На вашым месцы я не паслухаў бы бацькі...

Дзяўчына нічога не адказала, толькі доўгім раздумлівым позіркам правяла Андрэя аж да дзвярэй. Агляну́ўшыся, Андрэй убачыў, што за тым суседнім сталом глядзелі яму ўслед твары, на якіх ззяла даверлівая радасная ўсмешка.

«Зразумелі»,— падумаў Андрэй і з пачуццём палёгкі выйшаў на вуліцу.

## Раздзел трэці

# ДЗВЕ ДАРОГІ

Ходзіць Ігнат Вярэня па беразе рэчкі, ходзіць... На плячы, на кійку, матляецца торбачка з хлебам. Міналі гады, а Ігнат так і не знайшоў сабе жыццёвага прыстанку. Узлезшы на гарышча сваёй хаты, усё пісаў заявы ў Вільню, каб прынялі на беларускія кааператыўна-гандлёвыя курсы. Але атрымаў адказ, што няма месцаў, што бясплатна нікога не прымаюць. Усё роўна Ігнат усё пісаў і пісаў, жывучы чаканнем адказаў. Малаціў цэпам жыта ў гумне па пятнаццаць снапоў у дзень, а потым спаў на саломе, выцягнуўшыся на спіне, спаў, як святы, і бацька з прадранымі рукавамі сарочкі на локцях ніяк не мог яго дабудзіцца. Найшла на Вярэню хвароба, здаецца, невылечная. А над наваколлем страх тэрору павіс, як чорная хмара, прыдушыў вёскі, палі. Прыдушыў і самае мястэчка Глушэц. Бачыць Ігнат, як сяляне вядуць каровы пад канвоем паліцыі, як ідуць скаваныя хлопцы. Усё бачыць Ігнат і яшчэ больш хварэе. Цёмным вечарам, калі пачынаюць гаснуць агні ў мяшчанскіх хатах, выйдзе Ігнат на вуліцу і сядзе на камені пад крыжам, ля сваёй самай крайняй хаты ў Глушцы, і сядзіць нерухома, як цёмны прывід. А над насупленымі, застылымі хмарамі пачыналі жахаць маланкі па ўсім небасхіле. Надыходзілі вераб'іныя ночы. Полымя ўспыхвала, трапяталася, агністай па-

ласой прабягала над зямлёю і ціха, ціха замірала апошнім дрыжаннем, каб потым нанава распачаць сваю вогненную дарогу і за кожным разам асвяціць чорныя, з хваравітым бляскам, вочы Ігната.

Не ведаў Ігнат, што ў такую самую ноч, загублены сярод неабдымных чаротаў Палесся, сядзеў пры дарозе Макар Краўчук. Ён прыходзіў да Ігната даведацца пра адрас кватэры ката Дарванскага і перадаў брашуру «Канстытуцыя СССР».

— На, вазьмі пачытай і перадай другім.

Ігнат прачытаў брашуру, седзячы на сваім гарышчы, і не адважыўся перадаць нікому. Паглядаў на вуліцу праз акенца шчыта, паглядаў праз шчыліны, думаў, думаў, што рабіць. Пакруціўся туды-сюды і схаваў брашуру пад дошку ля коміна. Але брашура яму ўжо не дала спаць. Брашура абудзіла ў Ігната жаданні. Клікаў Макар Ігната з сабою ў невядомую дарогу. Ігнат спытаўся:

— Можа, на ўсход?

— Не,— адказаў Макар,— наадварот, на захад.

— На захад я не пайду,— прамовіў Ігнат.

Палыхалі маланкі над ціхай, беспрытульнай глухаманню бясконцых чаротаў, дзе, здаецца, стаіліся ўсе страхі зямлі. Стаіўся і Макар. Ён, ідучы, пачуў бразгат путляў. Значыць, недзе пасвіцца конь. Макар сышоў з дарогі і сеў. З цемры высунулася постаць. Яна, здаецца, усё расла і расла ў вачах. Мільгануў рад белых гузікаў. Ага, і тут яны не спяць. Постаць стаяла на дарозе нерухома, таямніча, як зачараваная, то зліваласяса змрокам, то зноў вырысоўвалася.

Макару здалося, што постаць глядзіць проста на яго і думае, ступіць крок наперад ці не, азвацца, шапнуць, крыкнуць ці маўчаць.

Палыхнулі маланкі, прабеглі сполахам далёка-далёка на небасхіле і патанулі ў цемры. За маланкамі бліснула яшчэ адна ўспышка — успышка ад стрэлу, і тады стала цёмна, цёмна зусім. А гуку ад стрэлу як быццам і не было. Ён недзе патануў, як тоне ў вадзе жарынка.

Не прабіць глушы. Ніпто нідзе не страпянулася, не адклікнулася ніякае рэха. Ціўкнула нейкая загубленая птушачка, ціўкнула тоненька-тоненька, нібы падаючы з вышыні. І глухая цішыня яшчэ мацней зашумела ў вушах. Постаць з радам белых гузікаў на грудзях ужо не стаяла. Макар устаў і пайшоў далей. Ён спяшаўся да Данілюка, спяшаўся паспець далучыцца да паўстання Брэст-

чыны. За ім па адным ішлі яшчэ і яшчэ... А ўслед папыхалі маланкі...

Аб чым жа ты марыш, Ігнат, седзячы пад крыжам у вераб'іную ноч?

...Ходзіць Ігнат над рэчкай, ходзіць. Торбачка з хлебам на кійку матляецца за спіной. Глушэц застаўся ззаду, нават ужо далекавата. Спыніцца Ігнат, азірнецца — стракаты Глушэц папоўз зборышчам крамаў, дамоў, домікаў і хат на ўзгорак да плошчы, пад царкву.

Там невялічкі, бедны кірмаш, а на ім адкрыт мітынг у гонар фашысцкай канстытуцыі, рыхтуюцца выбары ў новы фашысцкі сейм. Змрочная канстытуцыя — кайданны абруч на душу народа, змрочны мітынг...

І прамоўца сам таксама змрочны. Гнедаваты, даўганосы твар. На лысіну зачэсаны чорныя валасы. Галасок гуллівы, тонкі, нават гнусавы, але заядлы, як у камара. Апрануты гэты прамоўца ў просты чорны касцюм па вышытай кашулі, а штаны засунуты ў халявы звычайных ботаў. Ён стаіць на возе і галёкае. Гэта дэпутат Рагуля стаіць на возе — стаіць беларускі буйны, рухавы кулак. Рагуля выступае ад імя кулацкай арганізацыі, рэзерву ўжо скампраметаваных сенатараў,— ад імя «Сялянскага саюза». Рагуля ведае псіхалогію сялянства і на ёй спрытна выязджае, сыпле народнымі прымаўкамі. І ўсё гэта для таго, каб разбіць саюз селяніна з рабочым, каб разбіць саюз працоўных Заходняй Беларусі з працоўнымі Польшчы, каб разбіць народны фронт.

Рагуля махровы фашыст. Рагуля шаманіць у сваіх артыкулах:

«Ад кавалка зямлі ў Заходняй Беларусі не адмовіцца ані польскі малазямельны ці беззямельны селянін, ані польскі інтэлігент, ані польскі рабочы. Яны сядуць на зямлю і забудуць лозунгі: «Мая бацькаўшчына — увесь свет», «Усе людзі — брацці», а запяюць з другой оперы: «Нам жыта горба, а вам вялікая торба». Гэтакія паны — асаднікі з польскіх рабочых і сялян, едучы ў наш край, могуць нават прывезці з сабой чырвоныя штандары на той выпадак, калі б зрабілася якая завіруха, каб выйсці з імі і замест слоў: «Мне жыта горба, а табе вялікая торба», крычаць — «Табе зямля, а мне зярня», «Табе праца катаржная, а мне прадсядацельства ў іспалкоме...»

Дзе ж гэта Рагуля ўбачыў асаднікаў у Заходняй Беларусі з польскіх рабочых і сялян? Ён добра ведае, што такіх няма. Але на тое Рагуля фашыст, вядзьмар, каб так

гаварыць, маючы перад сабою шэрую сялянскую масу, каб нацкаваць яе супроць польскіх рабочых і сялян.

Рагуля вядзьмарыць далей:

«Паглядзім на палітыку і лічбы ў Польшчы: прадстаўнікі рабочых, прамыслоўцы, гандляры, капіталісты праз галовы сялян падалі сабе рукі і коштам сялян адны робяць сабе дабрабыт, другія — гэта ёсць рабочыя — на гэта гледзячы маўчаць, за што ім даюць хоць напалову, але каб быць сытымі...» [1]

Рагуля рабочых паставіў першымі перад буржуазіяй, быццам назнарок падстаўляючы іх пад удар, паставіў на адну дошку, на адзін узровень. Спрытная бестыя! Як каршун, стаіць на возе і ўсё дзяўбе, дзяўбе.

Сальнік Карнікевіч, важак глушэцкай чорнай сотні, увесь час крычаў: «Правільна! Правільна!»

Калі ж Рагуля скончыў, нехта крыкнуў:

— А скажы нам, гадзіна, колькі табе дадзена?!

Рагуля пачаў хутчэй злазіць з воза.

Сальнік Карнікевіч сваім тулавам папхнуў, здаецца, увесь натоўп. Натоўп ускалыхнуўся, і рука Карнікевіча схапіла за каўнер высокага танклявага хлопца з носам, як люлечка. Гэта быў парабак графа Ельскага, паэт Піліп Гайдук. Ён бачыў Рагулю ў маёнтку за чаркай з маладым графам, бачыў яго потым з Мікітам Лазуном на лавачцы. Доўга гутарылі. Піліп Гайдук зрабіўся добрым камсамольцам, добрым разведчыкам панскіх прошукаў і баявым паэтам.

Калі Карнікевіч схапіў яго за каўнер, у натоўпе пачалася мітусня, а потым бойка. Некалькі чалавек кінуліся ратаваць Гайдука. Так ратавалі, што ледзь не разарвалі хлопца. Набрынялы крывёю Карнікевіч толькі тады выпусціў Гайдука, калі палкі пачалі свістаць па галаве гэтага азвярэлага сальніка. Паліцыянты засвісталі. Людзі пачалі разбягацца. Некаторыя пападалі ў мітусні. Ракам уставаў з зямлі, стогнучы, карчмар Антон Шчыгельчык і ўсё пляваўся: «Цьфу!.. Цьфу! Каб вас халера... Хуліганы... Хуліганы...»

Піліп Гайдук уцёк.

Ігнат Вярэня, можна сказаць, толькі прайшоў міма мітынгу. Праўда, спыніўся на хвілін пяць, паслухаў, адчуў, што няма чаго яму тут рабіць, і паплёўся дадому.

---

[1] З газеты «Сялянская ніва».

Пры ўскраіне, па скрыжаванні вуліц, асаднікі закладалі «дом людовы». Вярэня спыніўся і там. Стаяў накрыты стол. На ім, як чорная птушка, раскінуўшы крылы, стаяў крыж з распятым Хрыстом, а перад крыжам ляжала папера.

Той самы асаднік Буякоўскі, старшыня саюза асаднікаў, які ў свой час быў войтам, гаварыў нешта кволым голасам, гаварыў слязліва, пацеючы і ўздыхаючы. Побач азіраў асаднікаў, склаўшы рукі на жываце, ксёндз Абнорскі. Ён значна патаўсцеў. Сіняваты, бліщчасты твар расплыўся. Толькі вочы засталіся драпежнымі. Паліцыянты ля платоў акружылі невялікі сход асаднікаў. Буякоўскі гаварыў:

— Робім закладзіны людовага дому для ўмацавання польскасці ў тутэйшым людзе... Трэба, панове, ведаць, што за мяжою, недалёка, не спіць бальшавік. Ён імкнецца падарваць цэласць нашай дзяржавы, здабытай подзвігам легіянерскім...

Вярэня далей не слухаў. Усё тое самае. Будуць тут, у гэтым доме, паказвацца фільмы пра «подзвігі» паліцыянтаў, потым італьянскія фашысцкія фільмы і сексуальныя з амерыканскага Галівуда. Прыедуць брадзягі-артысты з паклёпам на Савецкі Саюз.

Ігнат на нешта адважыўся. Прыйшоўшы дахаты, паклаў кавалак хлеба ў торбачку, апрануў паднашаны шэры плашч, узяў кій у рукі і пайшоў. Пайшоў у абход да могілак, спусціўся да рэчкі і берагам, берагам падаўся ў лес.

Пройдзе Ігнат пару крокаў, стане, паглядзіць на ціхія хвалькі рэчкі і, гледзячы, нібы і сам задрэмле. А галава ўсё яшчэ баліць, і шум не сціхае ў вушах. Так бы і стаяў, не ішоў ні туды, ні сюды. Але трэба ісці, трэба адарвацца ад гэтага нуднага Глушца, дзе дробныя інтарэсы дня плывуць, як гэтыя хвалькі, але таму, хто ў іх апусціцца, яны падрыхтуюць неспадзяваную пастку.

Падышоў Ігнат да лесу і лёг, як у знямозе, прыклаў вуха да зямлі. Чуе Ігнат стукі, чуе шорахі і шумы, чуе гукі, ціхенькія ўсплёскі хвалек рэчкі. Зямля звініць самотным звонам, стогне, як жывая істота. «Усё гэта я недзе ўжо чуў, чуў... Няўжо ў такім стогне і я нарадзіўся?» — думае Ігнат. І думка яго цягучая, як гэты прыглушаны стогн зямлі. «Нічога не шкада, нічога, усё абрыдла... Няма ў жыцці ідыліі, яна толькі ў душы». Перад вачыма смяюцца дзеці, яны ловяць матылёў і стракоз. Добра з дзець-

мі. Хочацца ім крыкнуць: «Асцярожна, не забівайце матылёў!»

Паварушыцца Ігнат, яшчэ шчыльней прыляжа да зямлі, баіцца глянуць на наваколле, на Глушэц, які здаецца яму прытулкам скарпіёнаў. Сушыць душу Глушэц, сушыць. Толькі драпежнікі гуляюць з дубінкамі ўволю, выбіваюць вокны па начах, рабуюць крамы, а ўдзень заходзяць да крамнікаў, набіраюць сабе тавараў колькі хочуць і не плоцяць. Ёсць такое, накшталт чарнакніжнага, слова «мафія» — папаванне бандытаў.

Краінаю ўжо кіруе мафія. Яна ў пашане. І не відаць дзяцей, каб лавілі матылёў і стракоз. Дзеці глушэцкіх мяшчан пачынаюць захапляцца выбрыкамі мафіі. Нават у вёску мафія запускае свае кіпцюры.

Стогне Ігнат і ўсё туліцца да зямлі. Як ласкава шуміць лес, але і ў яго шуме адчуваюцца тоны крыўды. Усюды крыўда і крыўда. «Мне кажуць падставіць грудзі пад кулі, а я яшчэ нічога не зрабіў... А вось студэнт Касцевіч зрабіў і робіць. Слава! Ён прабачыць мне за маю любоў да ідыліі. Як жа яе не любіць, калі ўчора п'янаваты шпік зацягнуў мяне гвалтам у рэстаран, каб пагаварыць аб... камунізме. Мафія, праклятая мафія! Я сядзеў, увесь час закрыўшы губы далонню, і маўчаў. Глушчане, пэўна, падумалі, што і я ў палоне шпікоў. Быццам жаба мокрая пахадзіла па маёй душы. Бр-р-р...»

Ігнат устаў. Глянуў навокал, як глядзяць апошні раз, і сказаў: «Пайду шукаць ідыліі... Пайду да дзяцей, якія ловяць матылёў і стракоз...»

Так развітаўся Ігнат з Глушцом і пакрочыў у лес. Падышоўшы да шасэйнай дарогі, выняў з кішэні брашуру і насадзіў на сухую, вострую галінку сасны, як на цвік. Загаловак паказаўся вялікім і ўрачыстым. Чырвоныя літары вымаўлялі: «Канстытуцыя СССР».

«Няхай яна збірае тут свой мітынг!»

І пайшоў Ігнат з торбачкай за плячыма, пайшоў усё ў лес і ў лес, пайшоў на ўсход і на ўсход...

У маёнтку графа Ельскага адбыліся змены, можна сказаць, значныя. Няма ўжо старога графа. Хапіў яго яшчэ адзін удар паралiча і даканаў. Тры ксяндзы адпявалі графа. На хаўтуры сабраліся ўсе навакольныя памешчыкі, чыноўнікі староства. Праводзілі яго аж у Глушэц на каталіцкія могілкі, праводзілі, едучы ў сваіх карэтах за ацын-

кавапай вялікай трунаю. Ішла ўся маёнткавая служба, ішлі парабкі і парабчанкі. А спераду і ззаду ехалі паліцыянты верхам на конях. На самай пярэдняй карэце ехаў сын графа са сваёй жонкай. А ззаду ўсіх плёўся Мікіта Лазун з сынам-леснікам.

Такім чынам, гаспадарыць пачаў графскі сын, які пакінуў ваенную службу,— выйшаў у адстаўку. Ён кожны дзень абыходзіў усе падворкі маёнтка з неразлучнай нагайкай у руцэ. З людзьмі не гаварыў, а ўсё крычаў, наводзячы страх на ўсё жывое. Хацеў, каб яму парабкі адказвалі па-ваеннаму, стаўшы «смірна». Верхам на кані аб'язджаў палеткі, правяраў работы, асабліва сезонных рабочых. Калі яму здавалася, што хто-небудзь робіць паволі, адразу ж звальняў з работы і нічога не плаціў. Аж вось надышоў час, што ніхто не прыйшоў на работу. Пан граф выйшаў рана на ганак і... о, ліха! — на ганку свайго палаца ўбачыў раскіданыя паперкі. Падняў... Камуністычныя адозвы, якія заклікалі да штурму памешчыкаў. Пайшоў далей. Тое самае знайшоў на дарожцы саду, тое самае і ў альтанцы. Калі ж падышоў да жылля парабкаў, там не ўбачыў ні людзей, ні лістовак. Зараз жа выклікаў аканома і пачаў яго распякаць, тыцкаць яму ў нос лістоўкамі. Вусаты аканом дрыжаў, стоячы, як фельдфебель, маўчаў, а потым выняў з кішэні беларускую газету і працягнуў графу. Той разгарнуў яе, пачаў разглядаць, а аканом тыцнуў пальцам у невялічкі вершык з подпісам — «Пілін Гайдук».

Я люблю вас, палі і дубровы,
Але вы не мае, не мае,
Бо звіняць на іх путы-аковы,
Ўсё зняволена ў панскім ярме...

Пакуль Ельскі чытаў вершык Піліпа Гайдука, бровы яго ўсё сыходзіліся і сыходзіліся, і ўрэшце на лбе закіпела гнеўная маршчына. Ён, не могучы вымавіць слова ад злосці, парывіста скамячыў газету і кінуў. Аканом яе падняў. Першым словам графа было:

— Дзе ён?!

— На полі, пане графе,— адказаў аканом.

— Зараз жа паклікаць усю сям'ю і даць разлік. Няхай да вечара выбіраюцца да ста д'яблаў!

— Пане графе...— памкнуўся сказаць аканом,— старому засталося яшчэ чатыры гады адрабіць па кантракту. Можа, толькі маладога пакараць?

— Цо?! Я пляваў на ўсе кантракты! Для бальшавікоў

няма кантрактаў! Зараз жа зняць з работы і даць разлік! Я тут вытручу бальшавіцкую пошасць! У вас пад носам ходзяць і робяць, што хочуць, а вы і не бачыце!

Аканом патупаў, патупаў, звесіўшы галаву, і пайшоў. Сеў на асядланага каня і памчаў на поле.

Прывёў аканом да пана на расправу ўсю сям'ю Гайдукоў — старога бацьку, старую маці і самога Піліпа. Сталі ўсе трое перад панам, Піліп крыху ззаду, і чакалі яснавяльможных слоў. Ельскі агледзеў кожнага з галавы да ног. Ды і аглядаць было што — стары стаяў у зрэбнай сарочцы, запэцканай у зямлі, штаны свяцілі незлічонымі латкамі. Вочы, якія пахаваліся далёка ў зморшчаных арбітах, пазіралі насцярожана і пакутліва. Больш адважней глядзелі вочы старой; яна быццам адразу не толькі адчула, але і адгадала намеры грознага пана і ў душы рыхталася да ўсякай нечаканасці. Піліп стаяў, заклаўшы рукі назад, і пазіраў на пана спадылба. На яго і накінуўся граф:

— Чаго глядзіш, як забойца? Не падабаюся я табе! Цо?

І ўсім тулавам павярнуўся да аканома, спытаўся:

— Дзе газета? — хоць сам яе быў кінуў.

Аканом падаў пану скамечаную газету.

— То ты паэт, пся крэў, завугольны паэт? Хочаш ад пана зямлю адабраць?

Старая склала далоні, як для малітвы, хапілася з просьбай:

— Паночку... залаценькі... Мы ж...

— Цыц! — прыкрыкнуў пан.

Старая захлынулася словамі і змоўкла.

— Дык вось што...— звярнуўся граф да аканома,— даць ім разлік... зараз жа... Няхай пашукаюць сабе іншага пана, калі я не падабаюся.

Тут старыя абое кінуліся да пана:

— Паночку... За што ж гэта? Мы ж цэлы век свой у пана графа жылі, працавалі. Мне ж толькі чатыры гадкі засталося да ласкавага хлеба... Я ўжо стары... Куды я пайду? — гаварыў бацька стогнучым голасам.

— Дарэмныя вашы просьбы... Чуеце? — адказаў граф і кіўнуў аканому: — Разлічыць!

Старыя пападалі да ног. Старая абдымала запыленыя боты пана, і слёзы закапалі на іх.

— Паночку, злітуйся. Дзе ж мы дзенемся?

Ельскі нейкі час стаяў нерухома. Відаць, яму пры-

смна было глядзець зверху, як поўзаюць людзі ля яго ног. А потым брыкнуў адной нагой, другой і вызваліўся з абдымкаў людзей.

У Піліпа бліснулі слёзы ад жаласці і абурэння, і ён кінуўся падымаць сваіх бацькоў.

— Нашто так уніжацца? У гэтага ж пана замест сэрца пустата.

Ельскі скрывіўся агідліва:

— Ого! Які філосаф мне вырас тут!.. Забірайце свае рэчы і вымятайцеся з маёнтка!..

Піліп павёў сваіх прыгнечаных, заплаканых бацькоў дахаты. За імі з газетай у руцэ паплёўся аканом.

Піліп зараз жа пасля таго, як бацька атрымаў разлік, пайшоў у Запалянку да Петруся Хадыкі. У хаце нікога не застаў. Толькі на лаве спала дзяўчынка год шасці. Хвалістыя русыя валаскі раскінуліся па невялічкай падушачцы зялёнага колеру, вышытай чырвонымі і жоўтымі кветкамі. Хто б гэта мог быць? Пад лавай стаіць невялічкі чамаданчык. Адкуль гэта?

Увайшоў Пятрусь. Ён адразу замахаў рукой і прашаптаў:

— Ціха... Не пабудзі...

— Хто гэта ў цябе?

— Гэта — няшчасныя людзі. Маці яе доктар, прыйшла здалёк, аж з Польшчы... безработная. Зараз яна ў Дзям'яна Гарагляда. Люба хоча радзіць. Двух іх прыйшло — яна і другі — ветэрынар з жонкай і адным дзіцем. Жывуць у Пеці Ціханчука. А ветэрынар — от, хвацкі — ужо некалькі кароў вылечыў у сяле.

Піліп расказаў Петрусю пра сваю бяду. Пятрусь паціснуў плячыма.

— Што ты зробіш? Каб не яна, гэты доктар, можна было б... Прыехалі б і жылі. А так — ну, памяркуй сам... Выйдзем на двор, а то пабудзім дзяўчынку. Яна ў дарозе падбілася, захварэла крыху...

Яны выйшлі і селі на прызбу.

— Бачыш, Піліп, якое жыццё прыйшло. Па ўсіх дарогах хлынулі з Польшчы масы безработных. І ўсё інтэлігенты — дактары, аграномы, інжынеры. І яна, відаць, добры доктар. Ніякіх грошай яны не просяць за работу. Толькі што-небудзь паесці... Галодныя, худыя...

— Што ж мне рабіць, Пятрусь? — спытаўся Піліп.

— Усё-такі дабраўся да цябе малады граф. Вядома, гэты дабярэцца. Можа душу дастаць. Што рабіць? Ідзі да

Нічыпара Байдака, у яго сям'я невялікая. Калі ўжо нідзе не знойдзеш, ну, то ў гумне маім можна пажыць, пакуль знойдзецца што лепшае...

На тым і парашылі.

Праз тыдзень бацька Піліпа знайшоў працу ў шляхецкім засценку, у фальваршчыка пана Лахадэйды, уласніка васьмідзесяці гектараў зямлі. Піліп працаваць туды не пайшоў. Параіўся з Пецем Ціханчуком, Макарам і падаўся, як кажуць, у свет.

— Пайду туды, дзе Саша Грынявіцкі,— сказаў ён, адыходзячы.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Залатая восень сыпала лісцем на травяністую дарожку, калі Піліп Гайдук на пяты дзень свайго падарожжа ўвайшоў у вялікі лес.

Ён праходзіў праз вёскі з клункам за плячыма, апіраючыся на кій, выбіраў хаты на пагляд, дзе, здавалася яму, жывуць добрыя людзі, заходзіў прасіць есці. Начаваў толькі ў стагах сена на балотах. Умываўся ў рэчцы і крочыў далей. Сваім паўнаіўным тварам, з носам, як люлечка, ён выклікаў жарты ў дзяўчат, якія часам сустракаліся ў вёсцы, сядзелі пры хаце.

— Адкуль ты? — крычалі яны яму ўслед.

Піліп адчуваў гэтую дзявочую «правакацыю» і не заставаўся ў даўгу. Адказваў, ды яшчэ пад рыфму:

— З вёскі Пакуты!

Дзяўчаты рагаталі і пыталіся далей:

— А дзе тая вёска?

— Дзе ў полі бярозка! — адказваў Піліп.

Дзяўчаты змаўкалі, пераглядаліся паміж сабою, здзіўленыя.

— Што гэта за дзіва курносае пайшло? — гаварылі яны.— Усё ў склад гаворыць. Мусіць, нейкі недурны...

Так ідучы ад вёскі да вёскі, Піліп падышоў да вялікага лесу, дзе вёсак ужо не было.

Піліп Гайдук ідзе дарожкай лясной і разам з тым горнай. Нямее яго душа ад захаплення, калі ён узыдзе на гару, узвысіцца, здаецца, над усім лесам, які паплыў у даліну кучаравымі верхавінамі, паплыў у тую сінюю тонкую дымку, якая не гіне ніколі. А даліна сустрэлася з новым узгор'ем, і дрэвы адно за другім самкнутымі патоўпамі ўзбіраюцца ўсё вышэй і вышэй і застываюць на хрыбце зубчастаю градою.

Серабрыстай луской мігцяць у гушчары крынічныя

ручаіны. Яны сустракаюцца і па дарозе — з ціхім шолахам прабіраюцца праз карэнні, кусты, хмызнякі і імкнуць гуллівым струменем у невядомыя даліны. Пракідаюцца і вёсачкі, як быццам кінутыя кім на схілы ўзгор'яў, прыціхлыя, апямелыя вёсачкі. Яны не маюць студняў, поіць іх ручаіна, якая агібае агароды і садкі.

Піліп Гайдук ніколі яшчэ не бачыў такога хараства і не думаў, што яно можа дзесьці быць. А тут такая дарожка ціха віецца між соснаў, бяроз і дубоў. Залатое лісце падае пад ногі, падае на галаву, на плечы. Піліп усё крочыць і крочыць. Ён не памятае, як доўга ідзе лесам. Яму пачынае здавацца, што ён увесь час ішоў толькі лесам, ахутаны ўрачыстым шумам. Гайдук нават не заўважае, як і па чым ступаюць яго ногі. Не, яны не ступаюць. Піліп Гайдук плыве... плыве ў забыцці. Ах, вось і птушачкі ўзлятаюць, уюцца над галавой. Яны тут нічога не баяцца. Тут урачыстая глуш і цішыня.

Хараша ў прыродзе, але цяжка на сэрцы. Прысесці б дзе над крынічкай і размачыць сухар, бо і ногі прытаміліся ўжо. Гайдук пачынае разглядацца па баках, пачынае забаўляцца кіем, вымахваць ім, пачынае лавіць, падстаўляючы далонь, жоўтыя лісткі на ляту. І прарвалася, загучала нейкая свая мелодыя, якая стала абрастаць словамі:

Я нагнуся з крыніцы напіцца —
Эх, вадзіцы сцюдзёнай, жывой,—
Я не ведаю, дзе прытуліцца
Ў беларускай старонцы сваёй.

А дарожка ўсё плыла і плыла. У душы Піліпа Гайдука ўсё больш і больш рос паэт.

Ўсё туманы плывуць і туманы
Над зацiхлаю ноччу зямлёй,
Прыкрываюць збалелыя раны
Беларускай старонкі маёй.

Набірае размаху душа паэта. Слухаюць песні стромкія сосны, сярод якіх туляцца панжоўклыя бярозы, і дарожка вядзе Гайдука ўсё больш і больш да горных вышынь.

А лісце падае на дарожку, часам сыплецца ад павеву ветрыка і залацістым вірком закруціцца ў паветры, лісце ападае на галаву, на плечы Піліпа Гайдука:

Узляці, мая песня, высока,
Да нябеснай зірні сінявы,
Над лясамі памкніся, як сокал,
Даляці аж да самай Масквы,

Каб я мог тут ад шчасця папіцца,
Эх, вадзіцы спюдзёнай, жывой,
Каб я мог па ўвесь свет гапарыцца
Беларускай старонкай сваёй!

Віся, дарожка, віся! Спускайся ў даліну, падымайся па гару, мінай ціхазвонныя сосны, бярозы і дубы, развітвайся з серабрыстымі крыніцамі! Песня паэта ўжо не сціхне...

Вось ён і скончыўся — гэты чаруючы лес. Піліп Гайдук выйшаў на ўскраіну і стаў перад адкрытымі шырокімі палямі. Супясчаная зямля хвалямі паплыла далёка ва ўсе бакі да сініх небасхілаў. Вока схапіла ўдалечыні стужкі дымоў у блакіце. Іх шмат. Яны клічуць да сябе і страшаць сваёй невядомасцю. «Але я іх ужо ведаю, яны пасяліліся ва мне,— падумаў Піліп Гайдук,— там недзе б'ецца з панамі Саша Грынявіцкі. Я пайду да яго і знайду яго!»

## ДЛЯ ТУРМЫ

Цяжка стала пасылаць у турмы дапамогу палітзняволеным. Часта вяртаюцца пасылкі назад, бо, бачыце, пасылка аказалася вышэй дазволенай вагі. Сала можна пасылаць толькі адзін кілаграм, а калі ў пасылцы акажацца паўтара, пасылка вяртаецца. Вывучаюць хлопцы ў Западлянцы гэты фашысцкі загад, каб не вярталіся пасылкі.

Надыходзяць каляды. Мароз сціскае вёскі, прысыпаныя снегам палі. Нястача і бядота пануюць у вёсцы. Ашчаджаецца кожнае зерне, кожнае паленца дроў. Людзі думаюць, каб як хутчэй дажыць да вясны. Хоць цяплей было б.

Аднак да каляд рыхтуюцца. Хто заможнейшы, коле падсвінка, усе стараюцца змалоць пуд-другі жыта, каб да святаў спячы сапраўдны хлеб, а то ўжо абрыдлі гэтыя бульбянікі і посная капуста. Перад святамі ажыўленне ў вёсцы нават урачыстае. Свята прынясе нейкую долю задаволення. Запахне сенам па стале пад абрусам, запахне грыбным гарачым квасам, разломіцца свежы хлеб-жытнік, засквярчыць скварка на патэльні. Прыціхнуць дзеці, чакаючы пачастунку. Замест лучыны запаліцца лямпа. Гэта ж бывае адзін раз у год, калі і зоры зімовыя над вёскай замільгаюць весялей, калі схудалай скацінцы ў хляве падсцелецца свежая салома і падкінецца ўволю духмянага

сена. Так рабілі з веку ў век продкі — прадзеды, дзяды, так яшчэ і цяпер людзі пільнуюцца старога звычаю. Пільнуюцца яго старыя. Моладзь ужо нават падсміхаецца з гэтай святасці і ўпотай у сваіх хатах у свяцоную ваду, якую хаваюць маткі па паліцах у бутэльках ад леташняга Іардана, падліваюць звычайную ваду з вядра, каб потым выкрыць старасвецкія глупствы. Маткі пасвяцілі кароў у хляве, але што з гэтага, калі вада звычайная? Але як-ніяк каляды яшчэ ёсць каляды. Усё роўна зашуміць моладзь на снежнай вуліцы, не адзін разружавелы твар прыліпне да шыбіны акна, стукне і адбяжыцца са смехам.

Каляднікі сапраўды збіраюцца калядаваць, збіраюцца ісці са звяздою «славіць Хрыста». Шумна ў хаце Петруся Хадыкі. Там робяць звязду. Нават сам дзядзька Дзям'ян Гарагляд прымае ўдзел у гэтых падрыхтоўках. Падказвае хлопцам, як лепш яе рабіць, каб звязда была прыгажэйшая, каб уся была чырвоная. Успамінае дзядзька Дзям'ян свае маладыя гады, калі і ён з моладдзю бегаў з вёскі ў вёску вось з такой звяздою. А цяпер няма ахвоты да яе, але калі моладзь захацела, то трэба дапамагчы. У чым жа тут прычына, што моладзь кінулася да каляднай звязды?

Эх... няма ўжо магчымасці збіраць па МОПР, як некалі, амаль адкрыта. За кожным крокам сочаць чыесьці вочы, падслухоўваюць чыесьці вушы. І паліцыя спяшаецца з арыштамі. Трэба знайсці нешта такое, каб ашукаць паноў. Ну і знайшлі. Хапіліся за калядную звязду. Трэба са звяздою захапіць і канец каталіцкіх святаў. У праваслаўных — першы дзень каляд, а ў іх вадохрышча. Можна пайсці ў шляхецкі засценак, разварушыць «загонавую»[1] шляхту, пад'ехаць пад яе з каляднымі песнямі. Шляхта... перастае ўжо верыць Пілсудскаму, кажа, што «Пілсудскі ашукаў». Вось калі яно прыйшло да мазгоў! А гэтая шляхта яшчэ ўсё па-дурному ганарыцца, цураецца мужыкоў, гэта значыць праваслаўных, хоць сама пацее па такіх жа загонах, як і гэтыя «праваслаўныя» мужыкі. Што зробіш? Далі ім паны некалі свой укол пад скуру, дык яны і да гэтага часу яшчэ выдаюць з сябе паноў, хоць у загноеных ботах. Паліцэйскія штрафы сыплюцца ўжо і на іх, і мілая некалі паліцыя робіцца нямілай. Але ў засценку ёсць ксёндз і яго арганізацыя — ваенна-фашысцкі гурток «Стралец». Сярод шляхты рэвалюцыянізуюцца ста-

[1] Збяднелая шляхта не хутар мае, а поле ў загонах (палосках).

рыя, узнімаюць голас пратэсту, а вось моладзі падабаецца забаўляцца вінтоўкамі, іграць у парадны польскі шавіністычны патрыятызм, рыхтавацца да вайны на Савецкі Саюз. Усё ксёндз, гэта яго работа.

Дапамагала рабіць звязду таксама і беспрацоўны ўрач — польская маладзіца Яніна Квяткоўская. Яна нікуды далей не пайшла з Запалянкі, засталася жыць у Петруся, бо людзі тут здаліся ёй добрымі, знайшла сабе сяброўку ў асобе Любы Гарагляд. А Люба, ужо маці сына, таксама прымала жывы ўдзел у падрыхтоўцы да калядавання. Так абедзве жанчыны вырэзвалі стужкі з чырвонай паперы, клеілі іх.

Надышоў апошні вечар перад святамі, вечар так званай багатай каляды, калі людзі за вячэрай стукаюць пальцам у шыбінкі абмерзлага акна, клічуць, запрашаюць Новы год.

Пятрусь Хадыка апрануў зверху кажушка стары палатаны каптан і падперазаўся вяроўчынкай. На галаву надзеў завостраны каўпачок, з-пад якога звісаў той знаёмы касячок русых валасоў над патухлым вокам. У рукі ён узяў скрыпку, пацягнуў смыкам, паспрабаваў, як гэта будзе іграцца адзетаму. Ігралася добра. Пеця Ціханчук надзеў заечую шапку. Ды наогул уся група апранулася крыху адмыслова. Люба і польская маладзіца-ўрач агледзелі хлопцаў перад іх калядным падарожжам і правялі іх на вуліцу.

Пачынаў падаць ціхі цёплы снег. Мяккі змрок ахутваў палі. Хлопцы ішлі адразу проста ў шляхецкі засценак, цягнучы з сабой двое санак. І песню падрыхтавалі яны засцянковай шляхце, ды такую цікавую, што яна, напэўна, спадабаецца, усе яе прымуць за «Батлейку». Што будзе потым — невядома, а пакуль песня будзе спявацца ды яшчэ пад скрыпку, шляхта будзе сліну глытаць.

Вось ужо хутар ці сапраўдны фальварак пана Лахадэйды, чалавека, у якога ніжняя сківіца выстаўлена наперад і ніжняя губа ўзлазіць на верхнюю. Калі пан Лахадэйда жуе, то яго шчокі і сківіцы рухаюцца, як у каня. У пана Лахадэйды ёсць адзіны сын, пра якога людзі кажуць, што не пазнаць — чалавек гэта ці жывёліна. Тоўсты, як мяшок, напханы пяском, а па невыразным шыροкім твары вечная маўклівасць. Гэты адзіны сын робіць цэлыя дні, як вол,— то возіць, то носіць, то малоціць, то ваюе з гноем — звозіць яго ў адно месца, запрогшыся сам у аглоблі калёс. Потым гэты сын есць на кухні, перажоў-

вае дар божы паволыга, з прыцiскам, кавалкам хлеба падтрымлiвае лыжку, калi нясе да рота, каб не каппула страва на стол. I ўвесь час маўчыць i маўчыць.

Фальварак пана Лахадэйды на адселлi, крыху на ўзвышшы. Поле ад будынкаў спускаецца да рэчкi, схаванай у вольхах i кустах, за якою цямнее першая вёска засценка.

Усе будынкi ў пана Лахадэйды яшчэ старасвецкiя, крытыя саломай, ды салома так прыгладжана, як быццам адпрасаваная. Па ўсiм грэбенi сядлаюць хату крыжакi, каб вецер не ўздымаў салому. Здалёк здаецца, што гэта пад шнур уселiся птушкi.

Увесь двор пана Лахадэйды абнесены густым паркапам з яловага суччa. Зацiшна жыве пан Лахадэйда з жонкай i сынам, якога, вучачы гаспадарыць,ператварыў у рабочую жывёлiну. Сам пан Лахадэйда таксама працуе, працуе ўпарта, павольна i таксама больш маўчыць. Носiць ён польскую сялянскую шапку цёмна-сiняга колеру з блiшчастымi пасачкамi пад брылем i жытняга колеру вусы пад доўгiм, як быццам падрапаным, носам. Хоць пан Лахадэйда маўклiвы i пануры, аднак ён не нямы. Здалёк можна пачуць, як ён кашляне цi чмыхне, несучы на граблях дзве саломiнкi, каб кiнуць iх у стог. Не, пан Лахадэйда ўмее i крычаць, ды так, што свiннi, гусi i куры ўцякаюць ва ўсе бакi. Крычыць ён тады, калi расплачваецца з рабочымi за касьбу, за жнiво, за копку бульбы, за малацьбу, пасылаючы ўсiх «к чортавай матары».

Сабака ў пана Лахадэйды не бегае па дроце, бо дроту няма. Да гэтага пан Лахадэйда яшчэ не дадумаўся. Сабака бегае дзе хоча i часта скавыча пад акном. Калядпiкi пастукалi па веснiцах. Забрахаў пярэсты сабака, заскакаў ля веснiц. Рыпнулi дзверы пад навiслай саламянай шапкай ганачка, i выйшаў сам пан Лахадэйда. Глухiм непрыемным голасам спытаўся:

— Хто тут?

— Калядпiкi... Можна праславiць Хрыста?

Пан Лахадэйда нiчога не адказаў. Сышоў з ганачка ў адзiн прыступачак, i ногi яго ў рабочых ботах ужо цяжка тупалi да веснiц.

— А адкуль вы?

— З Запалянкi... i з iншых вёсак.

— З Запалянкi? — працягнуў сам сабе Лахадэйда, глянуў на звязду i сказаў прымiрэнча:

— Ну, iдзiце... праслаўце...

І адчыніў веснічкі.

Хлопцы ўваліліся з грукатам проста ў кухню, дзе міг- цела газнічка па парожку коміна, пабелкі якога амаль не відаць было ад прусакоў, застыўшых у здзіўленні, калі дыхнула з дзвярэй шумам і холадам.

З пярэдняй хаты выйшлі на парог тры пажылыя жан- чыны. Адна з іх — жонка пана Лахадэйды. Усе тры былі ў цёмных убраннях і, як належыць шляхцянкам, з белы- мі каўнерыкамі і хустачкамі ў руках. Выгляд ва ўсіх быў святочны. З-за іх плеч выглядала галава з узлахмачанымі валасамі — галава сына. Звязда гарэла густа-чырвоным святлом. Там у звяздзе малы Хрыстосік ляжаў на сене, а над ім схіліліся валхвы з высокімі кулясамі ў руках. За- раз пра іх і заспяваюць пану Лахадэйдзе калядніκі. Яны перш прывіталіся, павіншавалі з Новым годам, глянулі на іконы на сцяне, па якіх таксама поўзалі прусакі, і тады Пятрусь павёў смыкам па струнах, каб даць тон спевакам.

Яны і пачалі ўсе адразу па матыў каляднай польскай песні, так званай «Батлейкі», якая пачынаецца словамі: «Там, в Бэтлееме, буг сеи народзіл...» [1]

Матыў у хлопцаў загудзеў па-батлейску, а вось словы штосьці інакшыя:

Прайшоў стары, настаў новы год —
Чаго ж дачакаўся наш бедны народ?

І скрыпка Петруся пачала вымаўляць:

Дачакаліся мы мукі,
Будуць помніць нашы ўнукі
Да смерці паноў,
Да смерці паноў...

Ва ўсіх жанчын застылі ўсмешкі на тварах. Гэтак жа прыгожа заспявалі. Хочацца самім дапамагаць. Пан Лаха- дэйда сядзеў за сталом нерухома. Валасы, якія, здаецца, ніколі не прычэсваліся, звесіліся на лоб. Відаць, што і яму спадабаліся спевы, бо нешта прыемнае, ледзь улоўнае, мільганула па твары. А хлопцы працягвалі:

Яшчэ горшыя часы настаюць,
Што мужыкам валасы дыбам наўстаюць,
І на панскія падаткі і кароўкі і цялят кі
Нашы пабяруць,
Нашы пабяруць.

Словы «кароўкі і цяляткі» даляцелі, відаць, дакладна да вушэй пана Лахадэйды, бо ён заварушыўся, але слухаў далей.

[1] Там, у Віфліеме, нарадзіўся бог.

Глянь на Пілсудскага, ўзяць прыклад з яго,
Дзвесце злотых плоцяць за абед яго —
Пану грошай шмат патрэба, а не ўзяць жа іх ды з неба —
Трэба з мужыкоў,
Трэба з мужыкоў...

Старая падышла да Лахадэйды і пачала шаптаць яму нешта на вуха.

Хлопцы хутчэй спяшаліся з песняй:

Паны з ксяндзамі ў сейме ухвалілі,
Каб мужыкі грошы ім плацілі...

Скрыпка Петруся дакладненька вымаўляла:

Як пан дзярэ, то ксёндз строга:
«Бо то вшыстко ест от бога —
Церп, душэчко, церп,
Церп, душэчко, церп...»

Прыгожая песня скончылася. Хлопцы чакалі пачастунку. Пан Лахадэйда загаварыў:

— То гэта такое ў вас слаўленне Хрыстуса? Га?

— Усё ж такі яны спявалі,— сказала жонка,— дай ім што-небудзь і няхай ідуць. Не чапляйся.

— Гм...— чмыхнуў у нос пан Лахадэйда так, што аж полымя газнічкі замітусілася,— запалянцы заўсёды што-небудзь выкінуць... А што ж...

Лахадэйда спаткнуўся на паўслове і ўстаў.

— Маеце шчасце, што сёння свята,— сказаў ён, а потым выняў з-пад абруса на стале паўбуханкі хлеба і падаў.

— Ідзіце з богам і больш не грашыце...

Хлопцы выйшлі на дарогу і сказалі:

— Ну, калі ўжо Лахадэйда даў, то збор у нас будзе добры.

Так і пайшлі з хаты ў хату, з вёскі ў вёску.

Збор сапраўды атрымаўся добры. Бедныя людзі захапляліся песняй. Нямала гаспадароў праводзіла спевакоў з хаты аж на вуліцу і там пыталася: «Дзе вы выкапалі такую песню? Гэта ж лепшай і не выдумаеш. Усё ў ёй правільна...» І заходзіліся смехам ад захаплення. Дарылі хлебам, салам, каўбасамі, сырам і добрым словам. Жадалі поспеху, удачы.

Адзін дзядзька падказаў ціхенька: «Зайдзеце да ксяндза». Але хлопцы вырашылі да ксяндза не ісці. Ведалі, што калі пайсці да ксяндза і праспяваць яму гэтую «Батлейку», то ён у нядзелю ў касцёле будзе дзве гадзіны грымець з амвона і сыпаць праклянцці на бальшавікоў,

страшыць людзей богам, пеклам і рымскім папам. На чорта выклікаць воўка з лесу? Важна, каб народ ведаў гэтую песню. Хлопцы тут жа, ідучы па дарозе, вырашылі, што як вернуцца дахаты, наперапісваюць многа экземпляраў гэтай «Батлейкі» і распаўсюдзяць па ўсім шляхецкім засценку.

Арганізацыя дапамогі рэвалюцыянерам жыла, арганізацыя працавала. Пакаваліся пасылкі так, каб яны з турмаў не вярталіся. Пасылкі з напісанымі адрасамі адвозіліся ў Глушэц, да каваля Міхала Кушалевіча, які меў толькі яму вядомую дарогу адпраўкі іх на пошту. Дапамагала ў мопраўскай рабоце і ўрач Квяткоўская.

На адной пасылцы пісалася прозвішча — «Апанас Хмель» з адрасам на адну з турмаў у Заходняй Украіне.

## КАНЕЦ АПАНАСА ХМЕЛЯ

Апанас Хмель, калі быў перавезены ў турму ў Заходнюю Украіну, на нейкі час прыціх, уключыўся ў камерную работу, пачаў чытаць кнігі. На прагулцы хутка знайшоў сабе новых знаёмых, якія пры перавыбарах парткома прапанавалі і кандыдатуру Апанаса Хмеля.

Асцярожна азіраўся спачатку Апанас Хмель. Баяўся ён мясцовых аўтарытэтаў. Таму пачаў «плыць па цячэнню». Бо што ж можна было рабіць? Быць актыўным, так, як ён хацеў быць у той турме, яшчэ няма грунту. З Аляксеем Верасам кашы не зварыш. Гэта яго вораг і, на думку Апанаса, чалавек мала развіты палітычна. Але хутка знайшліся знаёмыя, сярод якіх найбольш блізкім сябрам Апанаса зрабіўся нейкі таварыш Фельдман. Гэты таварыш насіў вялікія акуляры на белым доўгім носе і заўсёды больш прыслухоўваўся да выказванняў іншых, чым выказваўся сам. З Апанасам жа ён вёў доўгія гутаркі.

У выніку выбараў у партком сакратаром партарганізацыі аднаго крыла турмы быў выбраны Хмель. Пры размеркаванні функцый Паддубны аказаўся намеснікам старшыні парткома.

У турме вяліся бясконцыя спрэчкі на тэму тактыкі ў адносінах да турэмнай адміністрацыі. Хваля галадовак, якая пракацілася па турмах, на некаторы час стрымала наступ фашызму, прымусіла яго манеўраваць. Адна частка палітзняволеных, да якой належаў і Апанас Хмель, вы-

казвалася за вострыя сродкі барацьбы, накшталт таго, як крыкі, галадоўкі, мінаючы ўсе папярэднія звенні тактыкі — пратэсты, выклік начальніка, пракурора, масавае пісанне заяў, пявыхад на прагулку. Адным словам, устаноўка на тое, каб выматаць адміністрацыю, даць ёй зразумець, што калектыў увесь час у стане баявой гатоўнасці.

Апанас Хмель, падаграваемы Фельдманам, называў такую тактыку апартуністычнай, гаварыў, што такая тактыка не ўзбройвае калектыў да барацьбы.

Пазіцыю Апанаса Хмеля ўзмацнілі дэманстрацыі працоўных горада ля турмы.

— Во, бачыце, ідуць насустрач вам ці нам? — пытаўся з задорам Апанас.

Радавыя члены калектыву змаўкалі і пачыналі думаць, што, можа, сапраўды кіраўніцтва ідзе па лініі калі не здрады, дык па лініі памылак. Хмель пасеяў сумненні ў калектыве. Трэба было бачыць, як ён ходырам хадзіў па прагулачным пляцы, спыняўся ля групак і «крыў апартуністаў». Фельдман усё пазіраў і здалёк усміхаўся. Добрага нажыў сабе памочніка. Калі Аляксей Верас падыходзіў да Апанаса з якой-небудзь справай, Апанас узмахам рукі быццам змятаў яго з дарогі, кажучы:

— Потым... Няма часу... Ідзі цалуйся са сваімі апартуністамі... Залезлі вы, брат, у балота...

І стрымгалоў уцякаў ад Аляксея.

Верас глядзеў яму ўслед, смяяўся, як смяюцца з блазнаў, і гаварыў: «Вар'ят!..»

Аляксандр Сучок трымаў сябе, як пасрэднік, суцяшаў Вераса:

— А ты не злуйся... Ведаеш, ён жа чалавек заняты... Цяпер ён варочае, можна сказаць, усёй турмой...

Іван Паддубны праходжваўся, заклаўшы рукі назад, з высокім плячыстым чалавекам з хворым тварам. Сур'ёзныя спакойныя вочы глядзелі перад сабою наперад і, здавалася, не заўважалі, што робіцца навокал. Але гэта толькі так здавалася. Таварыш Збароўскі, старшыня парткома, бачыў усё. Ён нядаўна, пасля хваробы, вярнуўся з турэмнага шпіталя. Старшыня і намеснік гаварылі аб тым, што трэба пачаць разгляд спраў сыпакоў, што падыход да людзей павінен быць строга індывідуальны.

Праз некалькі дзён былі адноўлены ў партыі некалькі чалавек. Ад гэтага загарэўся ўвесь сыр-бор. Апанасу і яго паплечнікам, у прыватнасці Фельдману, гэтага толькі і трэба было. Яны на пасяджэнні парткома патрабавалі

роўнасці — калі прымаць, дык усіх. Безумоўна, з такім патрабаваннем нельга было згадзіцца.

Турма зашумела.

— Вы контррэвалюцыянеры! Вы парушаеце рэвалюцыйныя прынцыпы роўнасці! — крычаў Апанас.

— Твае прынцыпы роўнасці — гэта прынцыпы эсэраў, калі не дэмагогія трацкісцкага парадку,— адказваў таварыш Збароўскі.

Фельдман, былы бундавец, увесь час трымаў правую руку за бартом касцюма і стрымліваў наплыў слоў пакашліваннем, а дакладней, крактаннем. Яго правае плячо ўвесь час у руху, то падымаецца, то апускаецца.

— Пытанне дэмакратыі вы звужаеце да аднаго метра! — заяўляў Фельдман.

— Мы кіруемся інтарэсамі чыстаты, сілы партыі, а вы са сваім разуменнем дэмакратыі адышлі на балота меншавізму. Нешта падобнае калісьці бараніў Мартаў на другім з'ездзе,— гаварыў Паддубны.

— А мы кіруемся інтарэсамі людзей, партыйнай масы, справай дэмакратыі...

— Якой? Эсэраўскай ці камуністычнай? — наступаў Паддубны.

— Ты яшчэ зялёны ў пытаннях тэорыі,— заяўляў Апанас,— ты чуеш, як шуміць маса? Яна дамагаецца справядлівасці...

Маса сапраўды шумела. Маса ўжо раскалолася на два лагеры.

Узяў слова Збароўскі.

— Вашы заявы трэба лічыць палітычнымі. Скажыце адкрыта, чаго вы хочаце?

Апазіцыянеры змоўклі, не ведаючы, як сфармуляваць свае тэзісы.

Тады Збароўскі сказаў:

— Заўтра з'явіцеся на партком з дакладнай фармулёўкай сваіх дамаганняў.

— На партком мы не пойдзем! — заявіў Фельдман.— У нас ёсць свой партком.

— Тады не разводзьце дэмагогіі... Сынакі будуць прымацца ў партыю са строгім індывідуальным адборам... Нічога не паможа,— сказаў Збароўскі і абвясціў пасяджэнне парткома закрытым.

Назаўтра апазіцыянеры выйшлі на прагулку з гатовым дэкларатыўным пісьмом. У ім крытыкавалася тактыка кіраўніцтва, якая называлася шаблоннай і мяккацелай, ні-

салася аб стварэнні новага парткома, новага турэмнага камітэта, аб выбранні новага старасты. Пісьмо нёс у руках былы бундавец Фельдман. Апазіцыянеры на партком ісці не збіраліся. Яны хацелі склікаць усю масу на прагулцы, прачытаць дэкларацыю і тут жа яе прагаласаваць.

Блішчалі Апанасавы вочы, раздзімаліся, як заўсёды ў такіх выпадках, ноздры. Цыгарка курылася на поўную зацяжку. Апанас адчуваў сябе так, што быццам ён стаіць на гары і зараз адтуль сыпне стрэламі, маланкамі. Усё ляжа ля яго ног.

Маса палітзняволеных збіралася павокал.

Апанас падахвочваў: «Цясней, цясней...»

Толькі Фельдман прамовіў першае слова — «таварышы», як рука Аляксея Вераса аднекуль ззаду высунулася з-пад рукі Фельдмана і вырвала дэкларацыю. Узнялася мітусня. Апанас крычаў:

— Аддай!

Некалькі хлопцаў кінуліся да Вераса, каб адабраць фельдманаўска-апанасаўскую дэкларацыю, але на дапамогу рушылі хлопцы з другога боку. Дэкларацыя паляцела над галовамі, і ўсе ўбачылі, як адзін камсамолец аддаў яе, скамечаную, у рукі Збароўскаму. Невядома, што было б далей, каб не працурчаў свісток наглядчыка, абвяшчаючы канец прагулкі.

Пачулася каманда наглядчыка: «Заходзіць!»

Фельдмана і Апанаса выклікаў да сябе ў кабінет начальнік турмы. Прыхільнікі парткома ацэньвалі выклік як спробу турэмнай адміністрацыі апёрціся на Фельдмана і Хмеля, каб увесь турэмны калектыў пайшоў у сваёй тактыцы па выгоднай ёй авантурыстычнай лініі. Праціўнікі парткома, прыхільнікі хмелеўшчыны, казалі: «Гэта азначае, што адміністрацыя больш не хоча і не будзе лічыцца са Збароўскім і Паддубным. Яна шукае трывалага кіраўніцтва палітзняволеных...»

У турме настала заціша. Уся справа была перададзена на волю, у ЦК КПЗУ.

Рашэнне ЦК прыйшло хутка. ЦК вырашыў выключыць з партыі і калектыву палітзняволеных Фельдмана, Апанаса Хмеля і цэлы рад іншых і прадаставіў права парткому ачысціць калектыў ад апазіцыянераў, ідучы на самыя радыкальныя меры.

ЦК ацэньваў апазіцыю як адну з праяў трацкізму і дамагаўся самых суровых захадаў у адносінах да яе.

Рашэннем парткома было выключана з калектыву па-

літзняволеных сорак чалавек, у тым ліку і Аляксандр Сучок. Турэмная адміністрацыя іх зараз жа перасадзіла ў асобныя камеры.

Апазіцыянеры не хацелі пакідаць калектыву, але спалохаліся яшчэ горшых вынікаў для сябе і выйшлі. ЦК КПЗУ зацвердзіў рашэнне парткома. Тады ў асяроддзі апазіцыі пачаліся хістанні. Дваццаць чалавек напісалі пакаяльныя лісты і вярнуліся ў калектыў, а іншыя дваццаць так і засталіся па-за калектывам.

Вярнуўся ў калектыў і Аляксандр Сучок, тым больш што яму ўжо мала засталося сядзець.

Астатнія напісалі пакаянні толькі праз год, і ім было дазволена вярнуцца ў калектыў. Яны былі пазбаўлены права голасу. Нічога не пісалі толькі былы бундавец Фельдман і «цар Палесся» Гуляйноч — Апанас Хмель. Яны засталіся па-за партыяй. Інакш і не магло быць — барацьба з трацкізмам праходзіла тады па ўсіх кампартыях Заходняй Еўропы.

...Паддубны ходзіць па камеры ўзад і ўперад. Выключэнне Хмеля з партыі — гэта ж завяршэнне цэлай паласы барацьбы ў яго жыцці. Яна пачалася яшчэ тады, у час партызанскай барацьбы. Заўсёды гэты Хмель блытаўся пад нагамі...

Так, ёсць рысы характару, якія непрыгодны для рэвалюцыянера. Гэта некалі сказаў Касцевіч, сказаў агніста. Думаў, відаць, што трэба ўрэшце пераканаць «старога дурня».

«Не, дарагі псіхолаг. Тут ты і прамахнуўся. Але я не крыўджуся на цябе, малады таварыш. Ты не мог інакш думаць... А я не меў права сказаць табе больш, чым сказаў. Вось мы і квіты... Дзе ты цяпер? Можа, мераеш сваімі крокамі адну з нашых дарог або таксама сядзіш за кратамі? Значыць, скончылася цэлая паласа... Не ўдалося табе, Хмель, на гэты раз выкруціцца. Твае абаронцы-апекуны, здаецца, таксама ўжо ў сеці... А можа, хто яшчэ і застаўся. Вельмі ўжо многа правалаў. Пра гэта з трывогай гаворыць Збароўскі. Але пажывём — пабачым. Галоўнае — дацягнуць да канца тэрміну. Пабачыць бы сына... І яе — Ганну. Ну, пачаліся ўжо чуласці... Не трэба гэтага...»

# АБ АДНЫМ ПОДЗВІГУ

Больш пяцідзесяці вёсак было ахоплена забастоўкай лясных возчыкаў. Дрыжалі марозныя далі ў барвовым заходзе сонца. Недалёка ад шляху прытаіўся заснежаны лес. Ён, здаецца, закрыў да сябе ўсе ўваходы, разаслаўся галінамі прысадзістых елак па дарожках і прасеках. Лес пусты і ціхі. Няма нікому доступу да яго. Там ляжаць, прысыпаныя снегам, кубаметры аблупленай елкі, так званай паперкі, пакрыжаваліся, упаўшы, таўшчэзныя сосны. Але ў лесе — нікога. Купцы даюць за кубаметр пяць злотых. Возчыкі патрабуюць восем. І лес маўчыць.

«Літаратар-псіхолаг» Андрэй Касцевіч прабіраўся ўжо лесам, мокры па калені. Ідучы балотам, трапіў на рачулку і, не шукаючы мяльчэйшага месца, пайшоў уброд і такім чынам крыху пакупаўся. Змерзліся штаны, чаравікі. З Андрэем ішоў побач хлопец з хворым сэрцам Юрка Крагельскі — сакратар забастовачнага камітэта. Ішлі яшчэ тры, сярод якіх Саша Грынявіцкі — цяпер сакратар акруговага камітэта камсамола і член забастовачнай тройкі. Два апошнія таксама камітэтчыкі. З іх вылучаўся высокі дзяцюк у чорнай куртцы. Асабліва чарнелі яго густыя бровы з-пад брыля кепкі. Ён увесь час маўчаў, як быццам быў вінаваты перад кім. Андрэй ведаў яго з турмы. Гэта таварыш Дарожка, ён некалі не вытрымаў катавання ў дэфензіве, але за шчырую самакрытыку і дастойныя паводзіны ў турме яму было многа даравана таварышамі, і партыйную кару ён атрымаў невялікую. Ён ішоў у кампаніі збоку, крайнім, і маўчаў. Андрэй думаў аб ім і разумеў яго маўчанне. Як толькі спыняліся закурыць, Дарожка зараз жа спяшаўся запаліць сярнічку і паднесці Андрэю першаму. Гляне яму ў вочы і засаромеецца. Высокі, плячысты дзяцюк, а такім здаецца наіўным, як дзіця. Шкада Дарожкі. Яшчэ мучаецца хлопец. Андрэй з ім загаварыў:

— Ну, як табе жывецца? Не чапаюць паны?

— Як не чапаюць? Ужо два разы бралі ў дэфензіву, але нічога не выбілі. Цяпер ім ужо не ўдасца выбіць. Я ў даўгу не застаюся. Ужо два паліцэйскія будуць мяне памятаць. Я ім веласіпеды паламаў...

— А ў вёсцы тваёй як народ?

— Вёска ўся бастуе... Канфідэнтаў мы ўсіх прыглушылі...

— Добра. Трэба трымацца... да канца...



Піліп Пестрак (другі злева) у Вязынцы.
*1957 г.*



На палях у Каржа Васіля Захаравіча.
*1972 г.*

Звярнулі з дарогі ў лес, каб папрасткі хутчэй дайсці да тоі вёскі, якую ўчора наведала няшчасце.

Месяц сярод белых клубкаватых хмар здаваўся сонным. Наперадзе ішоў таварыш Дарожка, быццам расчышчаў сцежку. Падымаліся па гару, апускаліся ў даліну і зноў адзін за другім падымаліся на ўзвышшы. Ішлі праз так званую «Слонімскую Швейцарыю». Месяц блукаў па верхавінах дрэў, рассцілаўся святлом па далінах, і, можа, таму зліпаліся вочы. Мроілася вёска, хата, утульнае цяпло. Але пра сон нельга думаць. Наперадзе работа ўсякая, каб толькі хутчэй дабрацца да тоі здратаванай вёскі. Андрэй спытаўся ў Сашы:

— Варта была пастаўлена?

— Мы вызначылі варту...

— Але ці стаяла яна?

— У тым вось і справа, што не стаяла ў тую ноч.

— Вечная бяда храбрацоў — пасля перамогі «спачываць на лаўрах». Дрэнна, хлопцы, дрэнна. Трэба забастовачны камітэт перанесці ў тую пабітую вёску. Здолелі разбіць штрэйкбрэхераў, трэба давесці барацьбу да перамогі.

Усе адчувалі сябе вінаватымі. Юрка Крагельскі чухаў патыліцу, тузаў за брыль кепкі і лаяўся сакавітай лаянкай.

— Дай толькі дайсці, я з гэтых вартавых скуру здыму!

Саша таксама гаварыў дзёрзкія словы, біў сябе ў грудзі і казаў:

— Ну чаму я не застаўся тады начаваць у гэтай вёсцы?

Саша быў арганізатарам бойкі са штрэйкбрэхерамі і, захапіўшыся бліскучай перамогай, прыйшоў радасны да Юркі.

Камітэт спяшаўся ў стэрарызаваную вёску. Ганец прынёс вестку, што мінулай ноччу там адбылася, як паны называюць, пацыфікацыя, а па-простаму, па-сапраўднаму, масавае збіванне людзей і руйнаванне хат.

Купцы-лесапрамыслоўцы пры дапамозе паліцыі падгаварылі гарадскіх мяшчан-возчыкаў сарваць забастоўку, даўшы ім за кубаметр шэсць злотых. Каб мяшчане ды не згадзіліся? Яны згодзяцца на ўсякае паскудства. Ад гэтага можа быць усякая выгода. Даць волю мужыкам, каб іх верх быў,— гэта недапушчальна, гэтага ніколі не было і не будзе.

І мяшчане выехалі доўгім абозам на сваіх сытых гнядых конях, хоць самі былі сухарлявыя, як скнары. У іх новыя гужы, новыя хамуты, ды і ехалі яны ў кажухах, у кепках, пацмоквалі па коней і загадзя зларадна ўсміхаліся.

Дарога праходзіла праз вёску з прыгожай назвай — Загор'е. І тут іх сустрэлі хлопцы з добрым пачастункам.

Як шалёны віхор, наляцелі яны з каламі па штрэйкбрэхераў. Нельга было разабрацца, куды ляцелі коні, а куды мяшчане. Усе гужы лопнулі пад нажамі, сані пад сякерамі. А мяшчане віліся ў снезе, як чэрві, пад ударамі калоў. «Мяшчане — скацінка ўедлівая, але баязлівая»,— казалі хлопцы. І сапраўды, ніхто з іх не крыкнуў, ніхто не стаў абараняцца. Яны толькі саплі, як вепрукі, уставалі з зямлі на калені і зноў падалі насамі ў снег, змешаны з пяском, губляючы свае кепкі.

Адзін нешта прастагнаў: «Матка боска...» А калы ўсё хадзілі па іхніх спінах, як цапы на таку. Коні разбегліся па вёсцы. Урэшце баявая дружына ўдарыла адбой...

А ўвечары... насоўвалася на вёску чорная хмара. Яна наўзла павольна, аж абхутала ўсё неба, прыкрыла вёску цемрай. Людзі леглі спаць, і ўсё навокал знямела.

Тады ўварваліся ў сонную вёску сто п'яных паліцыянтаў. Яны рассыпаліся злавеснымі ценямі па вуліцы і, як па камандзе, ударылі прыкладамі па вокнах. Не міналі ніводнай хаты, ніводнага акна.

Разбуджаныя нападам слуг Пілсудскага, людзі натоўпам высыпалі на вуліцу, і па іх — спалоханых, сонных — засвісталі нагайкі. Крыкам і стогнам напоўнілася паветра. Босыя дзеці туліліся да матак, пасінелых ад плачу. Грамілы ўрываліся ў хаты, і адтуль на руках выпаўзалі цераз парог пабітыя старыя ў белых сарочках. Грамілы разбівалі печы і ўсю пасуду. На вуліцы яны нагайкамі прымушалі сялян лезці на аснежаныя стрэхі сваіх хат і зрываць іх. Гэта ў паноў завецца па-лацінску «пацыфікацыя».

— Ах, ах,— казаў Андрэй,— можна ж было арганізаваць адпор бандытам! Ну... будзе навука на другі раз.

Лес пачынаў радзець. Юрка пачаў прасіць, каб перадыхнулі, і прыклаў руку да свайго сэрца. Усе заўважылі, што твар яго зрабіўся белы. Пад'ём на гару даў сябе адчуць. Дарожка тлумачыў, як трэба ісці далей. Ён казаў:

— Выйдзем на поле, доідзем да дарогі. Там ёсць раздарожжа... Пры раздарожжы, дзе і канчаецца лес, часта

бываюць паліцэйскія заставы, бо адна дарога адсюль ідзе ў горад. Трэба нам трымацца правей, пайсці ўздоўж Шчары.

— Пасля такой бойкі і пацыфікацыі заставы могуць быць,— сказаў Андрэй,— нам абавязкова трэба дайсці да Загор'я, узняць дух у народзе, арганізаваць дапамогу сярод навакольных вёсак. Калі мы гэтага не зробім, забастоўка спыніцца. Людзі палічаць нас баязліўцамі, калі не здраднікамі.

Андрэй змоўк. Хлопцы прамаўчалі. Потым Саша сказаў:

— Трэба аддаліцца ад раздарожжа і ісці полем.

Юрка адказаў:

— Было ўжо тут усякага і на полі... нават у жыце.

— Мяне першы раз арыштавалі вось тут у жыце... Была ў нас тады раённая канферэнцыя,— сказаў Дарожка.

Пасля нядоўгага роздуму Андрэй ціха спытаўся:

— Зброя ў каго ёсць?

Хлопцы пераглянуліся паміж сабой і не адказалі.

Урэшце скрануўся з месца, нібы хацеў падысці да Андрэя, Дарожка і амаль шэптам сказаў:

— Я маю пры сабе рэвальвер...

Дарожка стаяў перад Андрэем, як спалоханы, чакаў праборкі. Ён, як і ўсе, ведаў, што партыя забараняе хадзіць са зброяй.

— Хто яшчэ мае? — спытаўся Андрэй.

Кожны паасобку сказаў, што зброі няма.

— Што? Можа, схаваць рэвальвер тут у кустах? — запытаўся Дарожка.

Андрэй злёгку ўсміхнуўся.

— Наадварот,— адказаў ён,— цяпер якраз зброя і патрэбна. Нам што б там ні было трэба прабрацца ў Загор'е... Адзін пойдзе наперад на некаторай адлегласці, а астатнія за ім... Пойдзем не адзін за адным, а рассыпным ланцугом. Калі сустрэнецца паліцыя, яна можа адкрыць па нас агонь.

— Я пайду наперад,— прапанаваў Дарожка.

— Ідзі,— сказаў Андрэй.

Ішлі ўзараным полем. Святло месяца поўзала па змерзлых скібах. Лявей, далёка, расплывалася ў небе зарыва. Там за ўзгоркамі хаваўся горад. А наперадзе леглі змрокі, разбаўленыя месячным святлом. Дарожка ішоў хутка і з кожным крокам аддаляўся. Хацелася яму крыкнуць: «Не спяшайся!»

Стала прыкметнай удалечыні дарога, якая, быццам белая шырокая стужка, перасякала палі і слалася насустрач змрокам. Дарожка мігцеў цёмнай постацню ў аддаленні. Ён дайшоў да дарогі і спыніўся, чакаючы хлопцаў. Калі яны наблізіліся, ён сказаў:

— Здаецца, няма ніякага ліха. Можам шпарыць полем далей, аж да Шчары, а там ужо небяспекі няма.

Пайшлі ўсе разам, сабранай групай.

Вось яна і Шчара, замерзлая толькі пры берагах. Хутка будзе сцежка міма царквы, закінутай у полі. Сцежка давядзе да моста, за якім ужо рукой падаць да Загор'я.

Высокі стары мост замаячыў дугамі праслаў у месячным мутным святле. Да яго вяла грэбля ў старых сукаватых вербах. Чуваць было, як плёскалася вада пад мостам, абмываючы палі. Ногі ступалі па дошках асцярожна, баючыся выдаць сябе стукам. Зараз мост скончыцца, а там... будзе вальней.

Ад парэнчы аддзялілася цёмная постаць, і хлопцы заўважылі, як на момант блiснула сталь... Уцякаць назад было ўжо немагчыма. Усе ішлі, не спяшаючы кроку.

— Стой! — спыніў ягомасць з арлом на шапцы.— Куды ідзяце?

— У Стайкі,— адказаў Дарожка.

— Чаго?

— На вечарынку...

Паліцыянт азірнуў усіх і сказаў:

— Пакажыце дакументы.

Па адным пачалі вымаць пашпарты і працягваць паліцыянту. Ён праверыў у Дарожкі і вярнуў пашпарт, вярнуў і Юрку. Трэцім падаў свой пашпарт Андрэй. Паліцыянт чытаў яго доўга і адзін раз вымавіў: «Глушэцкі павет...» Апусціў свой ліхтарык і сказаў:

— Я мушу пана затрымаць... Пан адыдзе ўбок і стане тут.— Паліцыянт паказаў месца побач з сабою.

— За што вы мяне затрымліваеце? — спытаўся Андрэй.— У мяне ж пашпарт правільны...

— То не ваша справа! — крыкнуў паліцыянт.

Усе не зглядзелі, як гэта адбылося,— Дарожка рвануў пашпарт з рукі паліцыянта, штурхнуў яго з размаху ў грудзі і перадаў пашпарт Андрэю. Усе кінуліся ўцякаць. Найгорш было з Юркам, ён не мог доўга бегчы. Таму хлопцы прыцішылі бег і перайшлі на хуткую хаду.

Услед паляцеў стрэл — адзін, другі, трэці... З недалёкай вёсачкі выбегла наперарэз некалькі паліцыянтаў.

Хлопцы, падхапіўшы Юрку пад рукі, заспяшаліся подбегам. Не так ужо далёка цямнее купка лесу. Хутчэй, хутчэй туды!

Стрэлы прагучалі густа. Уцекачы ад такой раптоўнасці пападалі ў разоры, але тут жа ўслед за Андрэем усталі і, прыгнуўшыся, падаліся далей. Паліцыянты набліжаліся, наступалі. Відаць, што не будзе ратунку.

Гэта зразумеў Дарожка. Ён сказаў:

— Спяшайцеся, а я іх стрымаю...

Так сказаўшы, выняў рэвальвер. Першы стрэл, відаць, азадачыў паліцыянтаў. Яны на момант спыніліся. Дарожка ўжо бег за хлопцамі. Але гэта быў толькі момант. Стрэлы загучалі заўзята, і паліцыянты пабеглі. Увесь агонь яны накіравалі на Дарожку, які бег, азіраючыся, і час ад часу рабіў па аднаму стрэлу.

Хлопцы тым часам схаваліся ў змроку і дасягнулі ляска. Там спыніліся на ўскраіне. Юрка адразу лёг на зямлю, выцягнуўся, як струна, і сказаў:

— Калі дойдуць сюды, пяройдуць цераз мой труп... Не пушчу ў лес.

Хлопцам, нягледзячы ні на што, хацелася засмяяцца.

Дарожка набліжаўся недзе ў змроку і ўсё яшчэ адстрэльваўся. Урэшце пачуўся яго голас:

— Бывайце, хлопцы!

Што такое? Паліцэйскія стрэлы сціхлі. Юрка ўсхапіўся на ногі. Усе стаялі і слухалі пакуль што толькі адну цішыню. Саша Грыпявіцкі лёг грудзьмі на зямлю і ўглядаўся па няроўнай паверхні поля. Нешта цёмнае рухалася там, а потым злівалася са змрокам. Але раптам усе ўбачылі, як там бліснулі ліхтарыкі. Саша сказаў:

— Дарожка... забіты...

Тады леглі на зямлю ўсе. Некалькі ліхтарыкаў асвятлялі спіну Дарожкі, які ляжаў на ўзаранай зямлі, выцягнуўшы правую руку са сціснутым у далоні рэвальверам. Паліцыянты павярнулі Дарожку. Ён ні прастагнаў, ні крыкнуў. Дарожка быў забіты.

Першым падняўся з зямлі Андрэй, а за ім і астатнія.

— Нашага таварыша Дарожкі няма,— ціха сказаў Андрэй,— таварыш Дарожка загінуў смерцю героя...

Усе адзін за другім пачалі здымаць шапкі.

— Слава таварышу Дарожку! — яшчэ раз размерана, спакойна сказаў Андрэй, хоць у самога гнеў і жаль пякуча клубіліся ў грудзях.

— Слава! — адказалі ўсе з нейкім уздымам і пачалі павольна надзяваць шапкі.

Забраць з сабою таварыша Даро́жку было немагчыма. Напэўна, там пакінуты вартавы. Трэба заўтра паведаміць бацькам.

Хлопцы рушылі праз лес і дайшлі да вёскі Загор'е.

Жудасна глухою, бязлюднай здавалася гэтая вёска, калі яны ўвайшлі ў яе. Асабліва цяжкае ўражанне заставалася ад таго, як выглядалі стрэхі. Яны, абадраныя, без саломы, свяцілі кроквамі і латамі, як рэбрамі. З некаторых хат салома пазвісала са стрэх, што надавала адчуванне бяздомнасці. Кучы непрыбранай яшчэ саломы ляжалі і на падворках. Ёю, напханай у мяшкі, былі заткнуты паразбіваныя вокны ва ўсіх хатах вёскі.

Калі таварышы зайшлі да селяніна, на кватэру забастовачнага камітэта, то ўбачылі, што ўся сям'я гаспадара сядзела ля агню, як быццам дзе-небудзь у лесе ля вогнішча. Ад разбуранай паліцыянтамі печы засталіся толькі чэрап з прыпекам. Над ім звісаў абламаны комін, пад якім і быў раскладзены гэты самы агонь. Навокал яго грэлася сям'я. Дзве жанчыны пралі, а трое дзяцей глядзелі на полымя, але больш, відаць, на гаршчок, у якім варылася бульба. Сам гаспадар, высокі, яшчэ не стары, зрабіўшы з лавы нешта падобнае на сталярскі варштат, стругаў гэблікам дошку для аконнай рамы.

П'яныя паліцыянты ламалі не толькі печы, вокны, але прыкладамі вінтовак разбуралі і тынк сцен.

Па просьбе Сашы Грынявіцкага гаспадар сказаў жонцы, каб яна з усёй сям'ёй на час перайшла да суседа. Гаспадыня драўляным шпянём праткнула ў некалькіх месцах бульбу ў гаршку і, сказаўшы: «Ужо гатова», выняла гаршчок з агню. Адліла з яго ваду ў ражку і сказала дзецям і свякрусе:

— Пойдзем...

Ужо было далёка за поўнач, калі закончылася нарада раённага актыву. Кожны член атрымаў строга акрэсленае заданне. Два актывісты павінны падняць на ногі ўсе мопраўскія арганізацыі для збору кулявой саломы на латанне стрэх. Другія два павінны арганізаваць збор дошак для вокнаў. Трэція — збор прадуктаў, галоўным чынам жыта, бо паліцыянты ў час пацыфікацыі ўсё жыта ў кожнага гаспадара вёскі Загор'е высыпалі з мяшкоў і

кадушак на двор і аблілі газай. Яно ўжо непрыгодна для ежы чалавеку. Трэба было сабраць хоць трохі грошай, каб дапамагчы пацярпеўшым рамантаваць печы. Адчувалася, што на гэта сродкаў збярэцца ўсё роўна недастаткова. Сяляне будуць будаваць сабе печы гліпабітныя, што ўжо некаторыя і робяць.

Ведалі падпольшчыкі, што насельніцтва горача адклікнецца на іх заклік і што ўся цяжкасць у тым, каб пазбегнуць правакацый і рэпрэсій з боку паліцыі.

— Гэта цяпер вельмі і вельмі патрэбна,— сказаў Андрэй,— усю нашу пільнасць, асцярожнасць трэба паставіць на ногі, каб давесці справу да пераможнага канца. Памятайце аб подзвігу таварыша Дарожкі...

...Праз некалькі дзён сяляне з навакольных вёсак абозамі везлі кулявую салому ў Загор'е, каб загаранцы маглі накрыць свае абадраныя хаты. Салідарнасць узмацнялася. Забастоўка лясных возчыкаў перамагла.

Андрэй паспяшаў — дзе пехатою, а дзе поездам — да месца свайго другога прызначэння — у Пінск.

## Раздзел чацвёрты

# ВЕЦЕР НА ДАРОГАХ

У рабочага запалкавай фабрыкі Міхаіла Шахновіча Андрэй пераначаваў дзве ночы. Гэта былі адліжныя, ветраныя ночы. На падворку блішчалі ў змроку лужыны і бялелі лапіны снегу. Капала ўвесь час з гонтавага даху невялічкага доміка Шахновіча. Тут поўдзень Беларусі — старадаўні глухі гарадок Пінск. Марозаў няма.

Піншчына — краіна народнага бяздолля, дзе жыццё навучыла людзей вострай недаверлівасці і такой жа вострай і кіпучай нянавісці. Піншчына — месца даўняй польскай каланізацыі. Таму памешчыкаў тут без ліку — вялікіх і меншых. Усе лепшыя землі, неабсяжныя абшары сенажатных балот належаць ім. Сяляне адціснуты на пяскі і бясплодныя, мокрыя пізіны.

У дадатак наехала шмат асаднікаў. Як скулы, расселіся яны па пералесках пры аспоўных дарогах, павароты ад якіх на іхнія хутары адзначаны драўлянымі крыжамі. У Піншчыне, як за горным хрыбтом, дзе пачы-

наецца іншы свет, засталіся гнёзды законсерваванай засцянковай шляхты, яшчэ дагэтуль да канца не акаталічанай, нягледзячы на шматгадовы наступ каланізатараў, езуітаў. Па вёсках цвітуць забабоны, як тыя дзікія кветкі на імшарах. Людзі чакаюць цуда кожны дзень, спяваюць свае цягучыя песні пра валоў, пра сінія хвалі азёр. Свае мары аб харастве перадаюць у вышыўках на кашулях, фартухах, на ручніках, дзе геаметрычны арнамент зліваецца з раслінным. У асвечаных хлопцаў-камуністаў можна сустрэць у хатах на сценах партрэты двух паэтаў — Тараса Шаўчэнкі і Янкі Купалы.

Піншчына — месца сустрэчы культур двух братніх народаў — беларускага і ўкраінскага. Біліся некалі з панамі за Піншчыну атрады Багдана Хмяльніцкага. Рэха тых бітваў чуваць і дагэтуль у песнях вандроўных лірнікаў. Нездарма ў Пінску яшчэ засталіся рэшткі руін палаца крывавага польскага князя, езуіта Ярэмы Вішнявецкага.

Пад навалай пілсудчыны Піншчына зрабілася краем дзікага паліцэйскага разгулу, свавольства шпікоў, пачварных правакацый, краем скатаваных людзей.

Міхаіл Шахновіч, чалавек год пад сорак, стаіць ля стала, апрануты ў чорную куртку, і разглядае Андрэя. Прыўзняў брыль кепкі, і святло лямпы асвятліла шырокі лоб у маршчынах. Загаварыліся стоячы. Толькі дзве табурэткі стаяць ля стала. Шахновіч падсунуў адну Андрэю, перапрашаючы:

— Забыўся запрасіць сесці. Выбачайце... Прашу...

Андрэй азірнуўся па пакоі. Перагародка з белай прасціны павісла на шнурку. За ёю спіць жонка з двума дзецьмі. У пярэднім кутку, без ікон, паблісквае лапушыстымі лісцямі ў паўзмроку высокі фікус. Стол стаіць ля дзвярэй, супроць печы, нічым не пакрыты. На ім ляжыць свежая «Беларуская газета». Холадна ў пакоі і няўтульна, неяк трывожна, абяздолена. Нехта быццам стаіць за цёмным акном чужы, непрыемны і прымушае помніць аб сабе.

— Вось так і жывём,— працягвае Міхаіл Шахновіч,— працую на фабрыцы два дні ў тыдзень... Дырэкцыя сябруе з паліцыяй. Няма жыцця ад канфідэнтаў. Але мы іх умеем пазнаваць хутка.

— Якая барацьба вядзецца з імі? — пытаецца Андрэй.

— Па-ўсялякаму мы іх выкрываем, найбольш байко-

там, не гаворым, не вітаемся. На цэхавых сходах патрабуем выгнаць іх з фабрыкі.

— Якія вынікі з гэтага?

— Пакуль што малыя... Забілі тут нядаўна аднаго правакатара. Пасля гэтага адзін канфідэнт сам уцёк з фабрыкі.

Міхаіл Шахновіч гаворыць і ўвесь час стаіць. Андрэй звярнуў увагу на гэта.

— Нічога... Прывычка,— адказаў Шахновіч і працягваў сваё: — Беспрацоўе расце з кожным днём. Мы, старыя рабочыя, працуем яшчэ хоць два дні ў тыдзень, а новыя, свежыя ўжо даўно без работы.

— Што ж... будзем ваяваць за лепшае,— сказаў, усміхнуўшыся, Андрэй.

А Шахновіч прамовіў:

— Толькі цяпер я крыху стаў наногі, раблю, памагаю, пачынаю зноў выступаць на сходах, а так... два гады быў па-за строем.

— Чаму?

— Мяне так былі збілі ў дэфензіве. Гірамі разбілі мне грудзі. Думаў, што не выжыву. Білі не толькі за маю актыўнасць на фабрыцы, але і за брата. Брат мой у турме недзе з дваццаць сёмага года. Ого! Я пекалі шумеў...

Андрэй прыглядзеўся больш уважліва да твару Міхаіла Шахновіча і пазнаў у ім Шахновіча Паўла, пазнаў таварыша Васіля. Але, пазнаўшы, нічога не сказаў. Толькі заварушыўся на табурэтцы і апёрся на стол.

Субяседнікі змоўклі. Бeглі хвіліны, плылі думкі кудысьці, дзе нясцерпна цяжка. Капала з даху за сцяною, і вецер з ціхім завываннем абціраўся аб вокны.

— Мы загаварыліся. Вы, мусіць, есці хочаце, таварыш? — спытаўся Міхаіл.

— Не, не... Не трэба. Я не галодны,— заспяшаўся з адказам Андрэй.

— Вы мяне не ашукаеце. Я ведаю ваша становішча,— усміхнуўся Шахновіч і падышоў да прыпека.

Як ні прасіў Андрэй не турбавацца, ён паставіў перад ім талерку з кавалкам халоднага мяса. Відаць, апошні кавалачак хлеба ўзяў з шафкі пры сцяне.

Андрэй глянуў на тую белую прасціну, за якою нячутна адпачывала сям'я, і рукі ніяк не хацелі брацца за ежу.

— Таварыш...— глянуў у вочы рабочаму Андрэй,— не трэба. Я не галодны. Праспім да ранку.

— Не, не... Ешце. Я прашу вас. Не непакойцеся. Фашысты яшчэ ўсяго не забралі. Дарогі вашы суровыя, я ведаю. Нямала перабывала ў мяне такіх, як вы.

Андрэй сў і прызнаваўся сам сабе, што ён сапраўды галодны, што гэты кавалачак мяса з чэрствым хлебам, пакінутыя, відаць, на ранак, смачныя. «Заўтра, калі буду тут, трэба даць яму пяць злотых, каб купіў штонебудзь. У мяне застанецца пятнаццаць, хопіць па дарогу».

З членаў гаркома партыі ўцалеў толькі ён адзін, Міхаіл Шахновіч. Сам сакратар гаркома забіты як правакатар. Іншыя члены хто арыштаваны, а хто перастаў дзейнічаць. Трэба падшукаць да Шахновіча хоць двух надзейных, добрых рабочых і стварыць гарком. Трэба шукаць дарог да рабочых, якія знаходзяцца пад уплывам Бунда, ППС, асабліва Бунда. Трэба ўмацоўваць народны фронт.

Аб усім гэтым гаворыць Андрэй, а Міхаіл Шахновіч сцеле яму пасцель на падлозе і слухае, маўчыць. Скончыў слаць, выпрастаўся і сказаў:

— Намёткі ў нас ужо ёсць.

— Калі ёсць, заўтра зробім нараду. Колькі часу ўжо бастуюць лесапільшчыкі?

— Ды ўжо... больш тыдня.

— Добра было б, каб адзін з членаў забастовачнага камітэта ўвайшоў у склад гаркома. Знойдзецца такі?

Міхаіл падумаў, узяўшыся ў бокі, шукаў у сваёй галаве патрэбнага чалавека, і сказаў:

— Трэба падумаць... Камуністы на лесапілках ёсць... Я заўтра разведаю, хто ўваходзіць у забастовачны камітэт.

— На сходах, мітынгах, калі такія будуць, трэба выказаць салідарнасць з бастуючымі лясньмі возчыкамі ў павеце. Забастоўка ахапіла васемнаццаць вёсак. Трэба іх падтрымаць. Я прыйшоў адтуль...

— Як трымаюцца сяляне? — спытаўся Шахновіч.

— Трымаюцца-то трымаюцца. Але... тут і да штрэйкбрэхерства пядоўга. Вельмі няроўны ўзровень палітычнай свядомасці на вёсках — у адной вёсцы гатовы да гераізму, а ў другой не вераць у свае сілы. А ў трэцяй...— працягваў Андрэй і засмяяўся,— а ў трэцяй зайздросцяць гераічнай вёсцы, думаюць, што вынікі пе-

рамогі яна адна можа забраць сабе. Вось сярод такіх грунт для штрэйкбрэхерства. Трэба падаць голас з горада.

Шахновіч троссяад смеху і прыгаворваў:

— Ох, мужыкі, мужыкі... Якія ж нашы дзядзькі... Падумаць, заіздросцяць, ха-ха-ха!..

— Трэба будзе нам заўтра на нарадзе выпрацаваць тэкст адозвы да іх у духу народнага фронту. Лепш справа стаіць у сялян у сутычках з памешчыкамі і дзяржаўнымі леснікамі. Сяляне едуць у лясы па дровы абозамі, бяруць дровы, дзе хочуць, і не плоцяць. Гэта важна. Гэта крок наперад. Таксама трэба падтрымаць. Калі такія выступленні сялян разрастуцца да такога маштабу, што ахопяць усю краіну, будзем мець папросту нарастанне рэвалюцыйнай сітуацыі...

— Э-эх, як бы гэта ўсё можна было хутка зрабіць, каб сярод нас мацнела салідарнасць, вытрымка. Нічога б не зрабілі каты. А так... Канфідэнты, правакатары губяць усю справу.

— У гэтым жа заключаецца ўся цяжкасць барацьбы. Вораг не дрэмле. Ён узброены да зубоў усялякімі сродкамі. На зброю ворага мы павінны мець сваю, і мы яе, вядома, маем. Актыўнасць, вернасць справе вызвалення, непрымірымасць да здрады...

Рабочы Шахновіч старанна накрываў Андрэя яго ж паліто, сваёю курткай, пытаўся, ці добра. Потым дзьмухнуў на лямпу.

Праз некалькі хвілін адлічны капеж за акном і глухое завыванне ветру закалыхалі Андрэя. Засынаючы, думаў: «Дзе ж мне знайсці тую дзяўчыну, аб якой гаварылі мне ў Варшаве? На гарадской яўцы няма... Відаць, ходзіць недзе па вёсках...»

Як уздых, цяжкі і глыбокі, былі апошнія словы Міхаіла Шахновіча, калі ён праводзіў Андрэя са сваёй хаты, з вузкіх пакрыўленых завулачкаў на галоўную вуліцу.

— Калі ж мы дачакаемся свабоды?! — прамовіў Шахновіч, і разам з яго словамі скавытнуў вецер ля вуглоў.

— Ну, я пайду ўжо адзін,— сказаў Андрэй,— вяртайцеся дахаты. Адозвы вам будуць прысланы.

Шахновіч з момант глядзеў на Андрэя нямымі вачыма. Нешта быццам важнае і ласкавае хацеў ён ска-

заць, але, відаць, не адважыўся, бо толькі зірнуў на встрапае цёмнае неба, па якім некуды спяшаліся вільготныя, калматыя хмары.

— Але і ноч... Цёмная і мокрая. Цяжка вам будзе ісці,— сказаў Шахновіч, падаючы руку Андрэю.— Бывай, дарагі таварыш. Што мы сягоння намецілі, рашылі,— пастараемся выканаць. Шчаслівай дарогі! Але ж і вецер... вые, як воўк...

І Шахновіч, прытрымліваючы рукою каўнер курткі, пайшоў, неяк увесь схаваны ў самім сабе.

Андрэй пайшоў у процілеглы бок і панёс з сабою апошнія словы Шахновіча, сказаныя, як крык набалелай душы: «Калі ж мы дачакаемся свабоды?!»

Андрэю трэба было дабрацца да вёскі, якая была за дзесяць кіламетраў ад горада. Там ён прызначыў параду новых падабраных ім членаў АК. Усе былыя палітзняволеныя, усе прайшлі праз турмы, павінны быць хлопцы добрыя. «Дэфензіва разбівае, а мы аднаўляем. Хто — каго?»

Ліхтары зусім патанулі ў дажджлівай імгле. Навокал іх мігацелі халодныя, пяўтульныя зарыўкі. Дробны дожджык ляпіва імгліў, шапацеў па дахах цёмных, маўклівых дамоў і хат. Плюхала вада пад нагамі. Мокры, слізкі Пінск як быццам патануў у паводцы. Цяпер ніякі сабака не выгляне на вуліцу, як і шпік. А вуліца цягнецца без канца — цёмная, поўная вады. Вецер рве вуглы, аканіцы, аголеныя мокрыя дрэвы. І нідзе ні жывой душы.

Скончылася вуліца. Пінск, як цёмная навалач, пачаў аддаляцца, пачаў тануць і тануць у цемры, як у моры.

Вецер ужо гуляў па полі, як яму хацелася. Сыпаў, сек у твар, збіваў з ног, спыняў хаду, пасля палётаў прыціхаў на момант, каб потым зноў пачаць свой віхрысты танец. Бязлюдная, пяўтульная палеская ноч! Здаецца, цябе і разгадаць нельга. Цемра пераліваецца ў ветры, як марскія хвалі. Сіла дзікая шуміць, шуміць на прасторах. Ударыш ты некалі, ударыш, разальешся, як паводка вясною, змыеш усю накіпелую атруту, якою дыхаюць твае балоты. Гразкая палявая дарога аддзялілася ад шляха. Трэба ісці па ёй. Абапал яе размоклае ўзаранае поле.

Вобмацкам ідзе Андрэй. Стане, прыслухаецца да шумлівай цемры. Хлопцы казалі, што па палявых дарогах часам цягаецца паліцыя. Дзе ёй у такую ноч вылез-

ці на свет? Аднак не трэба забываць аб перасцярозе. Зараз будзе другая дарога, якая завядзе ў жаданую вёску, у хату, дзе Андрэй, разуўшыся, залезе на печ, і маладая гаспадыня, як заўсёды, ухутае яму ногі дзяругай. Але што гэта? Ці то здаецца, ці сапраўды святло? Так, святло... Два ліхтарыкі мутнымі праменнямі блукаюць наперадзе па размоклай дарозе. Вось табе сустрэча! Ліхтарыкі няўмольна набліжаюцца. Андрэй звярнуў на поле, чаравікі пагрузлі ў зямлю, як у кашу. Нічога не зробіш, трэба адысці ад дарогі. Вада ў разорах сцякла, нават дзе-нідзе ў іх крыху пасушэла. Але ўсё роўна зямля ліпне да ног, і трэба з сілай выцягваць іх, як з твані.

І Андрэй лёг у разору, прыліп да размяклай палескай зямлі. Злавесныя два агні праплылі, як у тумане, праплылі павольна, вобмацкам. Можна ўстаць і ісці далей.

Андрэй устаў, але на дарогу не вярнуўся, а пайшоў праз поле, як ішоў дагэтуль. Хутка павінен быць луг, бо шум вольхаў чуваць недалёка. Новая неспадзяванасць. Вялікі луг, які некалькі дзён назад блішчаў суцэльным лёдам, цяпер шумеў хвалямі вады. Андрэй ступіў пару крокаў па вадзе, адчуў пад нагамі лёд і пакрочыў далей. Ногі пагружаліся ўсё глыбей і глыбей. Андрэй спыніўся. Ісці далей нельга. Вецер з дзікім свістам нагінаў долу верхавіны вольхаў, пад якімі, здавалася, нават клекаталі змрочныя, страшныя, раскалыханыя хвалі. Яны адплывалі пад налётамі ветру ў цёмную далеч, як у бездань. Андрэй загледзеўся ў шумлівую стыхію, прыслухаўся да дзікага свісту вольхаў, які зліваўся ў адно з шумам хваляў, і толькі тады крануў яго страх перад невядомым. Павярнуў назад, да берага. Дарогі ў два разы больш, але, можа, да ранку паспее дайсці. «Няхай сабе шуміць бяздомная ноч над светам, над хвалямі палескіх вод,— падумаў Андрэй,— мы ўсё роўна ідзём наперад і наперад...»

Андрэй выбраўся на дарогу. Ведаў, што за шумлівым лугам павінна быць вёска. Але яна танула ў цемры, і нават абрысаў бліжэйшых хат нельга было прыкмеціць. Замест вёскі — скрыжаванне дарог і невялікая капліца на ім. Вецер рве, здаецца, з усіх чатырох бакоў і пранізліва свішча навокал капліцы, як быццам сюды зляцеліся ўсе чэрці на танец. Андрэй спыніўся перадыхнуць, прытуліўся спіною да капліцы. Вецер памагаўся

то адарваць яго ад сцяны, то, наадварот, біў, сцёбаў у твар, прыціскаў, як жывы чалавек рукамі.

Парывам ударылі, забарабанілі, як гарохам, кроплі дажджу па даху капліцы. Потым пачуўся такі гук, быццам у лужыну ўпала вялікая кропля. Яна ўпала другі раз, але яшчэ мацней. Не, гэта не кропля. Нехта ўсё ж такі ідзе па дарозе, і гэта чуваць шлёпанне крокаў. «Няхай ідзе, ён мяне ўсё роўна тут не заўважыць»,— падумаў Андрэй. Шлёпанне набліжалася. З ветранай цемры вынырнула постаць і ішла... ішла проста да капліцы. Андрэй ціхенька, абціраючыся аб сцяну, перайшоў за вугал да другой сцяны. Постаць прыйшла, пачала атрасацца ад дажджу. Нешта скінула з сябе — не то якую накідку, не то хустку — і трасянула ёю. Андрэй пачуў гук, як быццам хто пранікам ударыў па стосу мокрага палатна. «Няўжо жанчына?» — падумаў Андрэй і з-за вугла зірнуў адным вокам на постаць, якая варушылася, захутваючыся. Як ні ўглядаўся Андрэй, усё ж такі яшчэ не мог сказаць, жанчына гэта ці не.

Вецер не сціхаў. Чалавек ціха кашлянуў, а потым выцер нос хусцачкай. Андрэй перастаў пазіраць з-за вугла, падумаў: «Каго ж сюды нялёгкая загнала? Мусіць, гэта жанчына». Вецер дзьме Андрэю ў бок, а гэтай постаці проста ў твар. Шолах пачуўся ля сцяны. Відаць, падарожны хоча ісці далей. Андрэй і не заўважыў, як штосьці штурхнула яго ў локаць, і прагучаў раптоўны голас: «Хто тут?» Голас выразна жаночы... Постаць шукала месца, дзе б лепш схавацца ад ветру. І вось...

Андрэй адказаў:

— Чалавек... А вы хто?

Замест адказу прамень ліхтарыка на момант асляпіў Андрэю вочы. Ліхтарык патух, і гарачым шэптам прагучалі словы:

— Андрэй... гэта ты?

Голас яе, несумненна. Але бываюць жа галасы ў людзей падобныя.

— А ты?..— спытаўся Андрэй.— Можа, гэта ты?

Прасілася на вусны імя, але яно не вымавілася.

— Я... я... не бойся.

Андрэй ужо ціснуў руку Надзі. Потым правёў далоняй па яе мокрым твары, дакрануўся да валасоў над хусткай. Пазнаў абрысы яе лба, шчок. Наблізіў свой твар да яе твару і глядзеў туды, дзе цямнелі вочы. Там бліснулі іскаркі. Андрэй больш адчуў, чым убачыў, яе

ўсмешку. Тады прытуліў да сябе дарагі твар моцна-моцна...

— Куды ты ішла?

— Ішла шукаць цябе. Мне перадалі, што ты ў горадзе. Якая ж нечаканая сустрэча ў нас! Як знарок...

— Поїдзем назад са мною,— сказаў Андрэй,— я іду па нараду, каб стварыць новы АК. Ты павінна прысутнічаць.

— Добра, поїдзем. Я табе раскажу некаторыя падрабязнасці.

— Ты ішла ў горад. Ты ведала, што там іменна я?

— Не, не ведала. Але... крыху меркавала. Мне сказалі ў Варшаве, што ўслед за мною павінен прыбыць функцыянер, што я павінна яго знайсці. Вось я і пайшла. Я ўжо аб'ездзіла некалькі вёсак... Але хадзем. Вецер воўчы, хіліць да зямлі.

Яны вобмацкам выйшлі на дарогу.

— Ты магла б пачакаць у вёсцы,— гаварыў Андрэй.

А Надзя амаль крычала яму ў твар:

— Што-о-о? А! Пачакаць!.. Чакаць у нас нельга. Усякае можа здарыцца. Кожная мінута дарагая. Я, як толькі пачула, што ты...

Вецер не даваў гаварыць. Каб вымавіць слова, трэба было спыняцца. Пайшлі моўчкі. Андрэй час ад часу падтрымліваў Надзю пад локаць, хоць у душы хацелася ўзяць яе на рукі і несці. Ішлі, коўзаліся, трапляні ў лужыны, у каляіны, пачыналі праклінаць палескае неба. Не ішлі, а быццам паўзлі.

Спыніліся ўжо на грэблі пад вярбою. За грэбляй — вёска. Відаць, улетку тут прыгожа. А цяпер аголеныя галіны шалёна біліся адна аб адну і гнуліся да вады ў канаве.

— Вецер на дарогах звёў нас. Шалёны вецер. Няма нічога дрэннага без добрага,— сказаў Андрэй.

— Так. Вецер... на дарогах,— раздумліва паўтарыла Надзя.

Андрэй пажартаваў:

— Як у той песні: «У канцы грэблі шумяць вербы, што я насадзіла...»

А гэтыя вербы аж стагналі пад налётамі ветру.

— Важна тое, што мы існуем,— сказала Надзя.

— Та-а-ак. У памяці нашай, Надзя, аднолькава застануцца як тыя далёкія Дзяды, так і гэтыя мокрыя, віхрастыя вербы.

— Усё гэта зыходзіць з таго, што мы існуем, гэта значыць пераадольваем усё, што кладзецца перашкодай на нашым шляху.

— Аднак... у ногі табе, напэўна, холадна? — спытаўся Андрэй.

— Безумоўна. Так, як і табе,— адказала Надзя.— Пойдзем зараз у вёску, пад страху...

...Нехта ўвесь час шэпча на вуха, і так размерана, прыемна, што хочацца растаць, забыцца, знікнуць. Пад бокам цеплыня. Спачатку шапацеў дождж па страсе і спяваў вецер у коміне, а потым усё ператварылася ў ціхія, ласкавыя шэпты. Уліваліся і шэпты яе, выразныя, свае: «Ухутвай добра ногі...» Больш Андрэй ужо нічога не чуў. Салодкі сон самкнуў павекі. Вочы спяць і бачаць многа бульбы ў засеку ў склепе. На бульбе стаіць ліхтар «лятучая мыш», а навокал профілі людзей. Слухаюць усе, змакрэлыя, нашурпленыя, даклад Андрэя аб міжнародным становішчы, аб СССР, аб становішчы ў Польшчы, аб наспяванні рэвалюцыйнай сітуацыі... «Узяць курс на ачыстку акругі ад правакатараў, аднавіць разбітыя раёны, трымаць палец на пульсе забастоўкі як у горадзе, так і ў вёсцы...» Ах, як цёпла, прыемна. Чыясьці шчака прытулілася да яго шчакі, цёплая, далікатная. Ага... Гэта шчака яе, Надзі. Правільна, яе. Разам жа залезлі на печ і леглі. Андрэй інстынктыўна адсоўвае сваю шчаку, і нават рука палахліва спаўзае з таліі дарагой жанчыны, якую ён пачаў быў туліць да сябе. Не трэба, не трэба.

...Усё той жа самы бляск ліхтара і над ім нахіленыя твары. «Дэфензіва зрабіла спустошэнне...» Чый гэта голас?

Гэта голас яе, Надзі. «Як можна дапусціць да таго, каб адзін чалавек арганізаваў дзвесце ячэек, а калі трапіў у дэфензіву, усе выдаў? — ускіпае гневам Надзя. Устрасае галавой і працягвае: — Гэта — злосная правакацыя...»

— Усё роўна мясцовыя яго бароняць, і толькі таму, што ён мясцовы, свой. Вось які мясцовы патрыятызм,— устаўляе Андрэй,— правакатар у турме, а яго сям'і ўсё роўна дапамагаюць. Няма пачуцця адказнасці.

Заварушыўся мужчына, гаспадар склепа, які толькі тры месяцы як выйшаў з турмы.

— Барап тлумачыць тым сваё прызнанне,— пачаў ён,— што, кажа, я не хачу, каб маім карыстаўся хто другі. Што я зрабіў, тое і выдаў, бо гэта — маё. Што хачу, тое і раблю з ім.

Андрэй з Надзяй пераглянуліся і амаль у адзін голас сказалі:

— Гэта дзіка, таварышы, гэта дзіка... Працуем для народа, для вызвалення, а не для сваёй карысці. Мы ж — камуністы...

Шэпты льюцца ў вушы ціхай, ласкавай мелодыяй. Рука туліць да сябе дарагую жанчыну. І раптам Андрэй гаворыць сабе: «Не трэба, не трэба...» Як праз далёкі, цьмяны сон далятаюць словы: «Спі, адпачывай!» Адчуваецца толькі лёгкі дотык яе локця.

Зноў думкі ідуць чарадой: «Ітак, таварышы, за працу. Раёны між вамі падзелены. Праз тыдзень будзем слухаць справаздачу, што вы зрабілі. Узмоцнім раён забастоўкі. А наогул, ужо трэба рыхтавацца да галоднага паходу вясною. Зараз ужо трэба намеціць аб'екты — памешчыцкія маёнткі, куды накіраваць паход за збожжам. Арганізаваць падзел яго паміж сем'ямі галадаючых... Работы, работы па вушы...»

Закалыхаўся ліхтар і згас. Засталося толькі дробнае шапаценне, якое пераходзіць у закалыхваючы шэпт. Спавіў сон, моцны, салодкі сон, праз які яшчэ ледзь адчуваўся дотык яе ласкавага локця.

* * *

Многа пройдзена і праезджана вёрст па дарогах, найбольш ветраных. Надышлі марозы, а за імі снягі. Добры конь шпаркай рыссю імчыць Андрэя з Надзяй у лёгкіх санках. Трэба прабрацца праз пушчу, потым праз чароты на самую ўскраіну павета і аднавіць, ажывіць работу там. Пачалася завея, якая можа перайсці ў завіруху. Пахмурны вечар са снежнымі хмарамі апускаўся на палі, на хмызнякі. Калі ўехалі ў пушчу, стала зацішней і цямней. Вузкая дарога, здаецца, прадзіралася праз высокія сосны, вастраверхія елкі, урачыста абсыпаныя снегам.

Надзя адхіліла цёплую хустку з ілба, паказала навакольнаму лесу свой вясёлы твар, штурхнула локцем Андрэя і сказала:

— Заспявай яшчэ тую самую. Я хачу навучыцца.

Андрэй глянуў у яе пацямнелыя вочы з вейкамі, мокрымі ад сняжынак, потым зірнуў на лес, які глуха гуў недзе далёка ў глыбінях, і заспяваў песню рабочага Міхаіла Шахновіча.

Очэрэт мэні був за колыску,
В болотах я родывся і зріс,
Я люблю свою хату поліску,
Я люблю свій зажурэный ліс.

Надзя вучылася, старалася падцягваць. Хутка-хутка апускаліся змрокі на лес, на дарогу.

Що мні тропікі, пышні пампасы? —
Вы загляньтэ у пущу до нас,
Там вы знайдэтэ всэ, чым богатый
І Тыбэт, і Урал, і Кавказ.

— Ого! Махнуў паэт аж за гарызонты! — прамовіў Андрэй.— Ці не замнога?

— Бог з ім. Паэты любяць перабольшваць. Песенька харошая. Давай далей,— адказала Надзя.

Андрэй працягваў:

Тэ похмурнэ поліске болото,
Півполісся вода залыла.
Тількы дэ-ні-дэ хутар самотный,
Тількы дэ-ні-дэ хлаптык сэла...

Надзя змоўкла і ўздыхнула.

А вось і яны — чароты. Дыхнулі вострым сіверам, рванулі снежнай завірухай. Зямля і неба змяшаліся ў адну суцэльную снежную імглу. Над прасторамі аснежаных чаротаў гулялі віхуры. Андрэй з Надзяй нацягнулі дзяругу на галовы, зрабіў тое самае возчык-камсамолец у стажкаватай шапцы. Толькі добры конь, адданы на ласку і няласку хвалям ветру, бег, плюшчыў вочы і нагінаў галаву.

Цёмная ноч навісла над дзікімі прасторамі.

Бура выла на розныя тоны, і пачынала здавацца, што яна выла ўчора, пазаўчора, заўсёды і ніколі не сціхне. Санкі плылі, як быццам па бурлівых хвалях. Андрэй выглянуў з-пад дзяругі і нічога не ўбачыў — ні дрэва, ні куста. Толькі ноч цямнела ў завірусе, як непраглядныя нетры. Закрыўшыся дзяругай, зацягнуў тое самае:

Тэ похмурнэ поліске болото,
Півполісся вода залыла,—

плача паэт аб нядолі народнай. А яна, гэтая нядоля, шуміць, як шумяць бяскрайнія чароты, як шумяць вясеннія воды Палесся. Цяжка паэту, цяжка Андрэю і На-

дзі і таму камсамольцу з палескай хаты, што вязе «сваіх людзей», таварышаў, бо яны рыхтуюць рэвалюцыю, каб не было паноў.

Тількы дэ-ні-дэ хутыр самотный,
Тількы дэ-ні-дэ хлаптык сэла-а-а...

— Крыкні, чалавек, у гэтую бурную ноч, прабі яе крыкам, спыні завіруху, спыні воды Палесся, каб не тапулі галодныя вёскі! Вось што трэба ад чалавека, які назваў сябе камуністам.— Чуеш, Надзя, што я кажу?

— Чую, чую,— адказала Надзя і зацягнула сама:

Очэрэт мэні був за колыску...

— Но! — крыкнуў камсамолец і, павярнуўшыся да Андрэя і Надзі, сказаў:

— Ужо вёска.

Вецер мёў па вуліцы віхуры снегу. Хаты цёмныя, без агнёў, як вымершыя, туліліся адна да адной. Толькі ў адной хаце бліскалі вокны святлом. Падарожныя заўважылі, што там кружацца пары. З вуліцы здавалася, што яны кружацца без музыкі, бо яе не чуваць, кружацца быццам у соннай цішыні — спакойна, размерна. Моладзі мала. Відаць, зацягнулася нядзельная вечарынка.

Дарога з вёскі павілася полем. Пад дзяругай пачынала авалодваць дрымота. А ў вачах увесь час стаяць вокны ў святле, і ў цішыні кружацца і кружацца, здаецца, толькі дзве пары.

Андрэй лыпне вачыма — з'ява знікае. Даволі стуліць павекі, яна зноў стаіць перад вачыма, і пары кружацца ўжо недзе ў завеі над палямі.

— Надзя, ты не спіш?

— Драмлю... Нехта ўсё спявае пра гэты «очэрэт»...

Конь пайшоў ступою. Мусіць, на ўзгорак. Праз некалькі хвілін ён спыніўся, і хлопец сказаў:

— Прыехалі!

— Хутар,— прамовіў Андрэй, вылазячы з санак,— шумяць бярозы. Якая маленькая хатка. Глядзі, Надзя...

Камсамолец увайшоў у хату адзін, пакінуўшы таварышаў на двары. Быў там даўгавата.

Праз шыбінкі бліснуў цьмяны агеньчык. Цені захадзілі па хаце. Выйшаў сам гаспадар і запрасіў:

— Заходзьце. Хутчэй. Вы памерзлі. Такая ж нягода...

У маленькай хатцы тулілася сям'я — маладыя яшчэ гаспадар з гаспадыняй і двое малых дзяцей. Гаспадыня адразу пачала распрапаць Надзю, а потым запрасіла на

печ. Андрэй, распрануўшыся, сядзеў на лаве і курыў, гутарыў з гаспадаром, які аказаўся вясёлым, сімпатычным чалавекам. Надзя з гаспадыняй запрашалі на печ і Андрэя, але ён адмовіўся.

Калі надышоў час класціся спаць, гаспадар сказаў, што паколькі хата цесная, ён можа завесці аднаго па суседні хутар, да добрага суседа.

— Вядома, пайду я,— сказаў Андрэй.

Надзя кіўком пальца паклікала Андрэя да сябе і, калі ён падышоў, сказала:

— Можа, нам абоім лепш пайсці туды напач? Гэтая кватэра магчыма вядомая... знаеш, каму...

Андрэй зірпуў у вочы Надзі і апусціў галаву. Думаў. Нешта гарачае на момант замітусілася ў галаве. Узняў вочы на Надзю, якая чакала адказу, і сказаў:

— Калі будзе які налёт, то схопяць аднаго з нас — або мяне, або цябе, адзін усё ж такі застанецца і будзе весці справу далей. Калі ж пойдзем абое ў адно месца і трапім у пастку, не застанецца ніхто. Заставайся тут, а я пайду.

Надзя прыкрыла вусны хусткай, каб Андрэй не ўбачыў яе горкай усмешкі. Андрэй усё ж такі гэтую ўсмешку адчуў, пазнаў у пасцярожаным позірку яе вачэй. Надзя адказала:

— Добра... Ідзі...— Потым легла шчакою на свае рукі, спішылася, як быццам раненая...

* * *

Нарады змяняліся нарадамі. Запрацавала свая друкарня-шапірограф. Ганцы з лістоўкамі-адозвамі ляцелі да новага сакратара АК, да Міхаіла Шахновіча ў горад. Надзю палюбілі ўсе камсамольцы. Вазілі яе на нарады ў іншыя вёскі. Яна вярталася, паружавелая ад ветру і марозу, вясёлая і разам з тым крыху задуменная. Увайшоўшы ў хату, казала Андрэю:

— На, патры мне рукі, а то зпямелі...

Вечарамі сядзелі за сталом і падводзілі вынікі сваёй работы, ацэньвалі паасобных хлопцаў, смяяліся з наіўнасці, захапляліся іх адданасцю.

У ленінскія дні развяваліся сцягі на шляху, у мястэчку і ў некаторых вёсках. З таго часу пастарункавая дэфензіва пачала кожную ноч закрываць аканіцы на жалез-

ныя засовы, чаго не рабіла дагэтуль. Аднаго дня цягаліся два секвестратары па хутарах. Падпольшчыкі праседзелі ў сене ў гумне больш дзвюх гадзін. Чулі, як секвестратары апісвалі жыта гаспадара за падаткі. На адным хутары яны хацелі забраць куртку ў жанчыны. Тая паспела куртку апрануць і выбегчы з хаты. Секвестратары дагналі яе, павалілі ў снег і ўсё ж такі садралі куртку. Пры шляху ля вёскі асаднікі адкрылі малачарню. Сяляне носяць туды малако, каб там пакінуць смятанку, а дахаты дзецям прынесці сіненькую вадзічку. За смятанку фашысцкія малочнікі плоцяць нейкіх трыццаць грошай за літр і да таго ж яшчэ ашукваюць. Выплачваюць грошы адзін раз у месяц, і то спісы правяраюць секвестратары. Забіраюць гэты ліхі заробак селяніна з рук малочнікаў за падаткі.

Ведаюць сяляне, што гэтыя «модныя» малачарні з'яўляюцца адным з дадатковых сродкаў выцягваць апошнія жылы з іх, але малако ўсё роўна носяць, бо няма ніякага іншага ратунку. Сваіх кааператываў ствараць не даюць.

І гоман абурэння з кожным днём расце супроць малачарняў.

Андрэй запісвае ўсе факты, потым пераносіць іх у лістоўкі. Ведае, што толькі на канкрэтных фактах можна павучыць прыгнечаныя масы. Дае Надзі прачытаць, можа, якія заўвагі будуць.

Можна было б і больш часу прабыць тут у аддаленні ад павятовага цэнтра, за пушчай, за чаротамі, але клічуць ужо ветры на дарогах. Трэба спяшацца на нараду АК. Ужо шукае сакратар функцыянера па канспіратыўных хатах бліжэйшых да яго вёсак. Праз пушчу і чароты дабралася і запіска ад яго. Добра. Значыць, нешта робіцца. Надзя турбуецца аб горадзе.

...Сонны месяц у туманным небе, здавалася, застыў на месцы і клаў зеленаватыя цені на стужэлыя снягі, калі Андрэй з Надзяй рушылі ў дарогу. У сіняватых далях мяккімі цёмнымі плямамі маячылі хутары. Вёска спаўзала з узгорка ў даліну і застывала радамі чорных хат. Месяц часам ясней каўзанс па стрэхах, і тады на момант заіскрыцца снег. Праглядаюцца далі над палямі, а таксама і над чаротамі, ціхія, таямнічыя далі. У паветры прыкметна пацяплела. Добра было б ісці пехатою. Камсамолец цмокае на каня. Санкі плывуць роўна, і разам з іх плыннню закрадаюцца мары ў галаву. Позірк міжволі спыняецца на профілі Надзі. А Надзя ўсё нешта думае. Думае, відаць, аб сабе, аб ім, Андрэю, аб камсамолках горада, да

якіх ёй трэба ехаць. Як быццам падслухаўшы яе думкі, Андрэй сказаў сам сабе:

— Мм... так... Умовы нашы суровыя...

Надзя хутка павярнула твар да Андрэя і на момант змерала яго позіркам. Андрэй адчуў, як быццам вочы яе кальнулі. Яна кашлянула і начала гаварыць. Андрэй насцярожыўся.

— Бачыш, якая ціхая ноч,— казала Надзя,— можам мець непажаданую сустрэчу. Давай дамовімся, як тлумачыць. Хто будзеш ты, а хто я?

— Давай,— адказаў Андрэй і злёгку ўсміхнуўся.

Дамовіліся, што Андрэй шукае лекара-кастаправа, а Надзя хоча знайсці пасаду вясковай настаўніцы.

Уз'ехалі на ўзгорак. Удалечыні ўжо цямнела пушча. Андрэй агледзеўся і сказаў:

— Дарма ты гаворыш, што ціхая ноч. Глянь назад.

Далёка палыхала зарыва. Андрэй папрасіў камсамольца спыніць каня. Падпольшчыкі доўга пазіралі на зарыва, потым глянулі адзін аднаму ў вочы, і твары іх прасвятлелі радасцю і гордасцю.

Ведалі — гарэла асадніцкая малачарня.

— Паганяй! — крыкнуў Андрэй камсамольцу.

Конь рушыў вясёлай рыссю насустрач цёмнай пушчы.

* * *

Увечары на паўдарозе да месца нарады заначавалі ў канспіратыўнай хаце вялікай вёскі. Зноў дымілася на стале кучка маленькіх бульбін, кожная велічынёю са сліўку. Да іх міска квашанай капусты. «Гасцям» у дадатак гаспадыня паклала акрайчык хлеба, спечанага невядома з чаго. У ім можна было заўважыць кавалачкі расцёртай бульбы, грэцкую луску і яшчэ нешта, што рабіла хлеб чорным і мокрым. Хлеб прыліпаў да зубоў, з саладжава-прэсным смакам качаўся ў роце галушкай. Дзеці сядзелі ля печы і абіралі такія самыя бульбінкі на заўтра. Гаспадар скардзіўся, што няма сала, няма малака. Падсвінка прадалі на падаткі, а карова за зіму запусцілася, не доіцца. «Госці» вячэралі і думалі адну думу, пераглядваліся, разумелі адно аднаго.

Увайшоў сын гаспадара, камсамолец. Зачыніўшы за сабою дзверы, адразу... не сказаў, а ўскрыкнуў:

— Ерунда выйшла! Ерунда будзе!

Усе звярнуліся да яго з пытаннем: «Што такое?»

Камсамолец смяяўся і гаварыў:

— Толькі пяць чалавек выступіла супроць штрэйкбрэхераў, а ўсе астатнія ў кусты. Яны добрымі хочуць быць.

Надзя хутка зірнула на Андрэя, быццам гаворачы: «Слухай добра... Цябе датычыцца...»

Аказалася, што сярод арганізаванай групы, прызначанай разбіць штрэйкбрэхераў, знайшоўся адзін, які ў апошні час настрашыў хлопцаў паліцыяй, адгаварыў нападаць. Так штрэйкбрэхеры і паехалі ў лес. Засталося на дарозе толькі шэсць падвод, у якіх пяць дружыннікаў паспелі парэзаць гужы.

— Хіба за штрэйкбрэхерамі забастоўшчыкі не паехалі? — спытаўся Андрэй.

— Не,— адказаў камсамолец,— могуць паехаць заўтра.

Андрэй глянуў на Надзю і вылез з-за стала. Нічога не кажучы, пачаў апранацца. Апрануўшыся, спытаўся ў камсамольца:

— Адкуль той, што адгаворваў нападаць, і як яго прозвішча?

Атрымаўшы адказ, паклікаў Надзю і сказаў:

— Не трэба турбаваць людзей з падводай. Гэта доўгія зборы. Пятнаццаць кіламетраў — невялікая дарога. За дзве гадзіны дайду. Ты заставайся тут. Можаш нават адгэтуль паехаць у горад, а паслязаўтра прыйдзеш на месца парады.

Надзя глядзела на Андрэя вялікімі вачыма і адразу не магла рашыцца сказаць што-небудзь. Калі Андрэй працягнуў руку для развітання, яна быццам апомнілася.

— Пачакай...— сказала,— усё роўна мне бліжэй будзе да горада адтуль, пойдзем разам.

Гаспадар увесь час пазіраў на гасцей, а потым сказаў:

— Вы куды, таварышы? Не хочаце начаваць у нас?

— Трэба, дзядзька, трэба... Час не церпіць...— гаварыў Андрэй, дапамагаючы Надзі апранацца.

— Калі ўжо так,— пачухаў за вухам гаспадар і звярнуўся да сына: — Міша! Запражы каня!

— Не трэба, дзядзька, і так зачаста ездзім. Няхай конь адпачывае. Дойдзем пехатою.

Але ўгаворы не дапамаглі. Уся сям'я скранулася, памкнула ў сенцы. Хто нёс на падворак хамут, хто дзяругу, хто лейцы. Усе разумелі, што трэба спяшацца да чагосьці важнага.

Праз паўгадзіны конь дамчаў Андрэя і Надзю да дру-

гоў вёскі, бліжэйшай да горада. Не заязджалі ў хату, дзе ў тую ветраную, дажджлівую ноч адпачывалі на печы. Заехалі да маладога хлопца, які жыў адзін, як бабыль. Ён потым прывёў туды сакратара АК. Дамовіліся стварыць баявую дружыну з іншай вёскі, а не з той, якая так «спудлава». Калі ўсё ж такі забастоўшчыкі паедуць у лес, трэба ехаць усім камуністам і камсамольцам і там пабіць штрэйкбрэхераў. Сакратар у канцы размовы сказаў:

— Я паеду сам...

Назаўтра возчыкі з дваццаці вёсак рушылі ў лес. Лічылі, што забастоўка ўжо сарвана. Пры ўездзе ў лес, на асноўнай дарозе, стаялі два камсамольцы і не толькі раскідвалі, але тыцкалі людзям у рукі маленькія лістовачкі, у якіх былі адбіты на шапірографе толькі дзве фразы: «Забастоўка працягваецца! Выгнаць штрэйкбрэхераў з лесу!» Гэта зрабіла сваё. Некаторыя адразу павярнулі назад. Баявая дружына пяцёркамі рассыпалася сярод штрэйкбрэхераў, скідала з саней накладзеныя мятровыя kавалкі аблупленай елкі, пагражала парэзаць гужы. Да свядомасці штрэйкбрэхераў дайшла сур'ёзнасць становішча. Справа ідзе не на жарты. Яны хутчэй заварочвалі коней і ўцякалі з лесу.

Дружына зрабіла тое, што лес апусцеў ад падвод і не адбылося ніводнай бойкі.

Сакратар і член АК вызначалі месца для нарады забастовачнага камітэта.

Насустрач доўгаму абозу возчыкаў, якія пакідалі лес, на шырачэзных санях, на шасці падводах ехала трыццаць паліцыянтаў. Наперадзе ў лёгкіх санечках сядзелі два барадатыя купцы. Яны, як і паліцыянты, кожнага возчыка прабівалі вачыма, дзівіліся звароту людзей з лесу. А некаторыя з возчыкаў з-пад рукава паказвалі ім хвігі.

Аднак штрэйкбрэхеры ездзілі ў лес ноччу... Становішча ўскладнялася. На штрэйкбрэхераўскую вёску сыпнулі лістоўкамі з пагрозай, пасля чаго паехала ў лес толькі пяць падвод. Разам з гэтым патрулі паліцыі пачалі наведваць вёскі. Староства ў дапамогу купцам накіравала ў лес вайсковыя падводы з салдатамі. Да іх была кінута адозва на польскай мове з заклікам падтрымаць сваіх галодных братоў. Відаць, адозва дайшла да староства. Яно спалохалася агітацыі і зняло салдат. Гэта дадало сіл камуністам. Яны разам з камсамольцамі хадзілі з хаты ў хату начамі асвятляць становішча, усяляць надзею на перамогу.

І аднаго дня рана ў вёску, дзе знаходзіўся забастовач-

ны камітэт, да старосты завіталі купецкія агенты з двума паліцыянтамі.

Сакратар АК прыбег да Андрэя з пытаннем: «Што рабіць?» Купцы надбаўляюць адзін злоты.

— Перш-наперш трэба сабраць сход да старосты,— сказаў Андрэй,— трэба замаскіраваць забастовачны камітэт перад паліцыяй. Трэба, каб гэтых жа хлопцаў, што ў камітэце, выбралі сходам для заключэння ўмовы, для перагавораў. Верыць на слова нельга. Трэба, каб усё было напісана на паперы. Яны даюць ужо шэсць злотых за кубаметр. Спрабуйце дамагацца свайго — восем злотых.

— А як не дадуць, тады што? — перапытаў сакратар.

— Не трэба забываць, што штрэйкбрэхеры жывуць і паліцыя можа пайсці на тэрор. Нам важна, каб была наша перамога, хоць бы давялося згадзіцца на адзін злоты дабаўкі. Гэта будзе мець палітычны эфект не толькі на гэтую акругу, але і далей — на ўвесь край. Калі будуць моцна ўпірацца, тады, у крайнім выпадку, можна згадзіцца на адзін злоты. Таргуйцеся ўмела. Зрываць перагавораў ні ў якім разе не трэба, інакш мы не замацуем сваёй перамогі.

Сакратар пайшоў. Усё зрабілася па плану. Усе сяляне прыйшлі на сход у бадзёрым настроі. Але разам з настроем прынеслі яны з сабой і «адпушчэнне грахоў» купцам. Іх «захапляла», што купцы палічыліся з імі, прыслалі агентаў. Што-то значыць — мы! Трэба ж аддзякаваць купцам за такую ўвагу. Пачалі крычаць на сваіх перагаворшчыкаў:

— Канчайце хутчэй! Што там? Ды паедзем у лес!

Гэта дадавала ўстойлівасці агентам. І перагаворшчыкі згадзіліся на адзін злоты дабаўкі.

Шумна ішлі сяляне са сходу і ўжо наракалі на перагаворшчыкаў, на саміх сябе.

— Можна было б вытаргаваць яшчэ хоць адзін злоты, але што ты зробіш? Слабая ў нас яшчэ дружба...

— Дык нашто ж крычалі на перагаворшчыкаў? Гэта ж купецкаму козыру ў масць. Мала яшчэ вам гэтых хамутоў, што носім! — казалі другія.

Гоман плыў па вуліцы, як раскалыханая стыхія...

Назаўтра ўсе тры перагаворшчыкі, гэта значыць члены забастовачнага камітэта, былі арыштаваны.

Андрэй на змярканні, не кажучы нікому ні слова, пайшоў пехатою ў другую вёску. Трывожыўся, што няма Надзі, думаў, што яе, можа, арыштавалі таксама.

Выrашыў, прыйшоўшы на месца, паслаць ганца на яе кватэру.

А Надзя ў гэты час сядзела ў паўцёмным пакоі з камсамолкамі і гаварыла аб рабоце сярод рабочай моладзі. Святло прапікала праз адчыненыя дзверы з кухні, дзе гаспадыня мыла бялізну ў вялікай балеі. Яна памыла яе ўжо цэлую гару. Гэтым гаспадыня зарабляе на хлеб.

Надзя нядаўна вярнулася з лесапільнага завода, пабывала на мітынгу. Ля варот стаялі пікеты рабочых і прапускалі людзей па рабочых кніжках. Надзя прыйшла такса ма з кніжкай, якую аднекуль прынеслі ёй камсамольцы. Надзя схавалася ў натоўпе сярод жанчын. На плошчы, апрача пікетаў рабочых, снавалі паліцыянты, гатовыя ў кожную хвіліну закрыць мітынг. Блізка ля стала прэзідыума, прыўзняўшы каўнер курткі, стаяў Міхаіл Шахновіч. Гаварыў старшыня забастовачнага камітэта, член ППС. Гаварыў аб сацыяльным забеспячэнні для рабочых, аб страхаванні ад няшчасных выпадкаў, аб рабочай касе, аб дэлегацыі да старосты і раіў не займаць завода.

Рабочыя маўчалі. Выступіў пажылы рабочы і гаварыў адваротнае таму, што раіў старшыня,— заклікаў заняць завод, інакш штрэйкбрэхеры сарвуць забастоўку.

Паліцыянт коратка свіснуў, а потым заявіў:

— Эй ты!.. Злазь з трыбуны! Бальшавік, пся крэў!

Натоўп зашумеў, пачуліся галасы:

— Гавары, гавары далей!

Два паліцыянты памкнуліся прабіцца праз натоўп, каб дабрацца да стала, але гэтага зрабіць не ўдалося.

Прамоўца гаварыў:

— Толькі такім чынам мы даб'емся перамогі. Дэлегацыі да старосты нас не выратуюць. Староста — прыхільны да буржуяў, а не да нас, галодных рабочых.

Нехта падаў прапанову папрасіць паліцыю, каб выйшла з завода, што для ўтрымання парадку ёсць свае пікеты. Гэта быў голас Міхаіла Шахновіча.

— Правільна! — загуў натоўп.

Старшыня ўсхапіўся на ногі і пачаў супакойваць узмахамі рукі:

— Сціхніце! Вы пляміце гонар рабочага класа! — крычаў ён.— Трымаецеся сябе, як хлопскае быдла!

Жаночы голас з натоўпу перакрыў гул:

— Ты сам быдла! У хамут запрашаеш усіх!

— Стаў на галасаванне прапанову аб заняцці завода! — крычалі другія.

Старшыня вымушаны быў паставіць прапанову на галасаванне. За заняцце завода падняўся лес рук. Калі ж старшыня спытаўся, хто супроць, не аказалася ні аднаго. Натоўп заціх, як акамянеў. Хто і быў супроць заняцця завода, рукі падняць не адважыўся.

— На галасаванне стаў паліцыю! — пехта крыкнуў зноў.

І натоўп, як абуджаны ад акамянеласці, паўтарыў:

— На галасаванне!

Тады ўсе паліцыянты, колькі іх было, засвісталі працізліва, заўзята. А потым закрычалі: «Разыдзіцеся!»

З вуліцы беглі на дапамогу другія, у кукардах. Над натоўпам ужо ўвіхаліся гумавыя палкі. Старшыня, раздзіраючы горла, крычаў:

— Панове паліцыя! Панове паліцыя! Што вы робіце? Пакалечыце людзей!

А людзі імклівым вірам вывальваліся за вароты і рассейваліся па вуліцах. Кожны пайшоў з перакананнем, што завод заўтра будзе заняты.

Надзя прыйшла да Андрэя ўначы. Андрэй ужо лёг у халоднай каморы, каб заснуць, палескім звычаем, пад пярынай. Яна прыйшла і села побач на драўляны ложак. Пашукала рукою Андрэя, дакранулася да яго твару. А потым нахілілася і сказала ўпаўголаса:

— Мяне адклікаюць. Атрымала ліст. Заўтра я павінна выехаць.

Пачуццё боязі страты чагосьці зварухнула сэрца Андрэя. Ён маўчаў, змоўкла і Надзя. Цемра ў каморы здавалася яшчэ цямнейшай. За сцяной асцярожна шапацеў вецер.

— Мм... так,— працягнуў Андрэй,— нашы дарогі на ветры,—сустракацца і расставацца.— А потым прыўзняў галаву і апёрся на локаць.— Ты дзесьці далёка сядзіш ад мяне,— сказаў ён,— сядзь бліжэй. Раскажы, як там у горадзе, а я табе раскажу пра вёску. Як заедзеш, раскажаш там пра ўсё. Калі захочуць выслаць каго-небудзь мне на змену, няхай шлюць хлопца, палітычна надрыхтаванага. Паласа барацьбы такая, што можна нарабіць шмат памылак. Трэба ўмець разгадаць усе навароты ворага... Ну, сядзь бліжэй...

— Я ж сяджу пры табе.

Надзя направілася, крыху нібы прылегла, нахіліўшыся тварам над Андрэем.

— Ну, вось... Цяпер я цябе бачу,— засмяяўся Андрэй.

Пачалі расказваць пра забастоўкі як у горадзе, так і ў вёсцы.

Надзя сказала, што дэфензіва ўжо ведае пра яе знаходжанне ў акрузе. Аб гэтым расказала ёй адна камсамолка, член АК камсамола.

— Адкуль яна дачулася?

— Ад нейкай прыбіральшчыцы, якая ходзіць мыць падлогу ў дэфензіву.

— А гэтая камсамолка не выклікае ў цябе падазрэнняў?

— Быццам... не... Трэба час, каб разгадаць чалавека.

— Час часам, а свой погляд ужо трэба мець. Штосьці не падабаецца мне гэтая сувязь з прыбіральшчыцай.

— Мне яе прапанавалі ў камітэт,— сказала Надзя,— праверка робіцца.

— Ты не змерзла тут? Спаць пойдзеш у хату?

— Не... Я пайду назад, у горад. Мне ж заўтра трэба выязджаць...

— Што ў цябе на нагах, валёнкі?

— Не, чаравікі...

— Ффу!.. Вось табе! Хавай ногі пад пярыну. Нашто табе мерзнуць?

Надзя паслухалася. Андрэй падумаў: «Аддаліў я яе ад сябе. Можа стацца так, што і зусім страчу. Шкада... Ох, як шкада...»

А Надзя працягвала:

— Ты на некаторы час знайдзі сабе месца зацішнейшае, бо дэфа ўжо на нагах. Гэта адчуваецца нават на вуліцах у горадзе.

— А ты...— у сваю чаргу адказаў Андрэй,— не садзіся на поезд у Пінску. Вазьмі рамізніка і ад'едзь да бліжэйшай станцыі.

— За мяне не бойся. Знойдзем спосаб.

«Ох, навошта яна так горача дыхае ў твар? Хутчэй бы пайшла»,— падумаў Андрэй і ў той жа час пашукаў рукою яе твар.

— А калі трапіш у кіпцюры, Андруша, трымайся. Тут дэфа дзікая. Кіраўнік дэфы былы белагвардзейскі афіцэр, Дзем'янюк па прозвішчу. Гэта ён паразбіваў гірамі грудзі нашым людзям.

— Ведаю, дарагая,— уздыхнуў Андрэй,— мая сіла ў сумленнасці перад партыяй, народам, перад нашай будучыняй. Яна вытрымае. Калі загіну тут, у пушчах, ты пачуеш.

— Пачую,— ледзь чутна адказала Надзя і падоўга прытулілася да твару Андрэя.

— Што яшчэ скажаш? — спытаў Андрэй, адчуваючы, як ласка пачынае распіраць грудзі.

— А ты?..

Надзя ўжо стаяла на нагах.

На момант бліснула ў свядомасці — затрымаць яе, дарагую, яшчэ крыху, невядома навошта. Але замест гэтага Андрэй прамовіў:

— Дай паціску рукі. Што сказаць? Ды што? — Сустрэнемся на барыкадах!..

Надзя яшчэ раз правяла далоняй па твары Андрэя і нячутна пайшла, несучы ў сабе на дарогі, на вецер вокліч таварышаў, вокліч сябра: «Сустрэнемся на барыкадах!»

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Праз два тыдні на змену Андрэю прыехаў другі функцыянер, стрыманы ў гутарцы, дысцыплінаваны. Андрэй пазнаваў у ім палешука. Спадабаўся. Пры азнаямленні яго з раёнамі праніклі давер'ем адзін да другога і паспелі пасябраваць. Перадаўшы яму ўсе справы, Андрэй увечары сеў у сані. Добры конь, возчык камсамолец у стажкаватай шапцы і знаёмы вецер па дарогах імчалі Андрэя, як на крылах, да далёкай, глухой невялікай станцыі, каб паблытаць сцежкі белагвардзейцу Дзем'янюку. Іменна, як на крылах, бо прыехаўшы таварыш сказаў:

— Спяшайся хутчэй, ляці, як на крылах. Там цябе вельмі чакаюць. Усё паднята на ногі...

## НА ПОДСТУПАХ БАРЫКАД

Крызіс, нягледзячы на рознае яго лячэнне, усё мацней падрываў гаспадарку Польшчы. Дарэмныя былі натугі прэм'ер-міністраў і міністраў фінансаў палкоўніцкай групы ўрада знайсці якія-небудзь новыя «лекі». Краіна ляцела далей у прорву. Адзін з прэм'ераў — палкоўнік Прыстар — сказаў з трыбуны сейма, што ён ужо ўбачыў «дно крызісу». Але праходзілі дні, тыдні, месяцы, і пара б ужо падысці пад'ёму, а яго ўсё няма і няма. Прэса ўзняла крык: «Дзе ж тое дно?»

Потым нехта выказаў такую «дылему», што «дно» не стаіць на месцы, што яно рухомае — то падымаецца, то апускаецца. Але адкідаць «дно» зусім — гэта няправільна

і шкодна. Гэта развяжа языкі «камуністычным элементам».

Эндэкі — польскія юнкеры — абвінавачвалі кліку Пілсудскага, што яна не ўмее кіраваць дзяржавай, што вельмі мала душыць нацыянальныя меншасці, і самі пачалі браць прыклад з Гітлера, абвясцілі яго выбраннікам бога на зямлі, пачалі арганізоўваць яўрэйскія пагромы, распальваць расізм, чорны шавінізм.

У Белавежскай пушчы «палявалі» Рыбентроп, Герынг. Як кажуць, з лёгкай рукі «збавіцеля Польшчы» Пілсудскага пачаліся залёты польскіх пампадуршаў да гітлераўскіх босаў.

Як жа не залётнічаць, калі так хацелася іграць «гапаровую» ролю першага непрыяцеля Савецкай Расіі. Пампадуршы дакладвалі босам: турмы трашчаць ад зняволеных, выдзелены новыя сумы на будаўніцтва новых турмаў і... касцёлаў... Адно без другога жыць не можа. Ствараліся фалангі па прыкладу гітлераўскіх «СС».

Дзяржаўны апарат гніў, раскладаўся жывым. Усе кралі, пачынаючы ад бургамістра захудалага мястэчка і канчаючы самімі міністрамі. Кралі суддзі, пракуроры, ляснічыя... Усе газеты пухлі ад судова-крымінальнай хронікі.

Каб схаваць ад народа гэтых высокіх зладзеяў, было ўведзена замест такога простага і зразумелага слова «кража» лацінскае — «дэўфраудацыя». Язык зломіш, пакуль вымавіш.

Зразумела, пакуль простыя людзі разбяруцца, што азначае гэтае слова, шмат усякіх начальнікаў паспее апаражніць дзяржаўную касу, не шкадуючы нават міністэрскай. Ну як, напрыклад, на пракурора або на якога-небудзь іншага вялікага чыноўніка з міністэрства напісаць, што ён украў або што ён злодзей? Гэта ж няветліва, некультурна. Трэба ж захоўваць «кадры», яны яшчэ спатрэбяцца. Крадуць толькі хлопы і хамы. А паны — не. Яны толькі «дэўфраудуюць».

Але «хлопы» і «хамы» хутка разабраліся, што і да чаго. З'явіўся нават анекдот, твор народнай мудрасці:

Гутараць між сабою тры паліцыянты — англійскі, французскі і польскі. Англійскі паліцыянт гаворыць, што ён выкрые ўсякую кражу і зловіць злодзея праз месяц пасля злачынства. Французскі сцвярджае, што ён гэта зробіць хутчэй, праз два тыдні. «А я за два тыдні наперад узнаю, хто будзе красці»,— сказаў паліцыянт польскі.

У тыя гады людзі адчувалі сябе, як перад патопам. Вось зараз хлыне ён, патоп, і тады канец свету. Але за-

мест натопу хлынуў у Польшчу замежны капітал. Тапіць, душыць польскую экапоміку долару дапамагалі франкі, маркі...

А польскія фашысты са скуры лезлі, каб заслужыць пахвалу Гітлера за сваю — куды там! — проста матэматычную паслядоўнасць у справе «ўдаскапалення ўлады». Ужо рыхтавалася фашысцкая канстытуцыя. Прэзідэнт будзе адказны не перад сваім народам, а перад богам і гісторыяй, будзе асабіста распускаць сейм, сенат, прызначаць урад, вырашаць пытанне аб міры і вайне, кіраваць узброенымі сіламі і будзе нават абдораны такім нябачаным правам — сам назначаць сабе наступніка. Што ж... Толькі карону засталося надзець на галаву прэзідэнта. Гатовы кароль.

Але пакуль што сейм атрымлівае ад фашыстаў зубатычыны,— тое не гэтак, тое не так... І многія ўжо чакаюць: вось-вось які-небудзь палкоўнік з клікі Пілсудскага, як старажытнарымскі Калігула, увядзе ў сейм або сенат свайго каня і скажа дэпутатам, што яго конь разумнейшы за іх.

Але рабочы клас не драмаў, што азначала — не драмала камуністычная партыя. Яна з падполля назірала за рухам і гуртавала рады да вялікіх класавых баёў. Вельмі ўжо многа пакіпела ў народзе гневу, гневу, гневу...

Шумна паплыла Беласточчына. Паплыла яна не водамі, а людскімі патокамі. Забастоўкай ахоплена дзевяноста тры працэнты рабочага класа Беластока і яго ваколіц. Дэманстрацыі з эканамічных перарастаюць у палітычныя. На сцягах з'явіўся лозунг: «Няхай жыве рабоча-сялянскі ўрад!» Чырвоныя коміны тарчаць над горадам бяздымныя. Фабрыкі, заводы не працуюць. Вароты зачынены, іх ахоўваюць удзень і ўначы пікеты рабочых, каб не ўварваліся штрэйкбрэхеры з паліцыяй.

Рабочыя бастуюць за павышэнне заработнай платы, супроць фашысцкай рацыяналізацыі працы. Ціха па начах па вуліцах Беластока. Толькі паліцыя ў баявой гатоўнасці патруліруе на машынах.

* * *

У доміку рабочага ткача Яна Куркоўскага таксама ціха. Шчыльна завешаны вокны. На варце пры веснічках стаіць Станіслаў Барвіна, а навокал самога доміка ходзіць Павел, малады ткач, брат жонкі Станіслава Марылі. Аба-

вязак Барвіны прымаць пароль і ўпускаць людзей, якія прыйдуць. Тое ж самае робіць Павел, толькі ў дадатак адчыняе дзверы і паказвае, як прайсці. Там гасцей сустракае сам Ян у чорнай камізэльцы, апрапутай па белай кашулі. Ён выглядае таямніча-ўрачыстым. З пачуццём уласнай годнасці, як роўны з роўным, ён вітае прыйшоўшых і асвятляе свой суровы твар усмешкай, якую тут жа хавае пад вусамі. Стары Ян свежапаголены. Жорсткія валасы з рэдкай сівізной блішчаць, хоць прымусіць іх ляжаць прычэсанымі ніяк не ўдаецца. Пасмы раскідаюцца, спаўзаюць на лоб, аб чым стары Ян і не турбуецца. Жонку сваю выправіў да зяця Вацлава Санкоўскага. Як тая ні прасіла сказаць, чаму ён яе выпраўляе, Ян не сказаў. Захоўваючы сакрэт, прамовіў:

— Гэта мужчынскіх галоў справа. Ідзі, матка, ідзі, пакінь гаспадарыць мяне аднаго.

— Ты, стары лайдак, хіба без мяне хоць адзін дзень можаш пражыць?

— Дыскусіі на гэтую тэму я адкрываць не жадаю. Змілуйся, ідзі.

— Вучоным стаў на старасці. Добра, пабачым...

І старая пайшла.

Першым прыйшоў да Яна высокі цёмнавалосы чалавек, крыху смуглявы. Спярша павесіў на вешалку палку, а потым капялюш, паліто і застаўся ў цёмна-карычневым касцюме. Выняў з кішэнькі грэбень і два разы правёў ім па валасах.

— Як, бацька, яшчэ нікога няма? — звярнуўся ён да Яна.

— Не... Але... Хутка падыдуць. Праходзьце, таварыш, тут у мяне бяспечна.

Прайшлі ў другі пакой, за перагародку. Госць сеў на канапу за круглы столік і паклаў на яго свае вялікія, крыху валасатыя рукі. Над яго цёмнымі бровамі заварушыліся тры папяровыя маршчыны — госць азірнуў пакой. Потым неяк непасрэдна, з сімпатыяй, паглядзеў на старога Яна. На сцяне вісела ў рамцы вялікая рэпрадукцыя карціны — бітва рабочых з жандарамі на вуліцы Беластока ў 1905 годзе.

— Цяпер паліцыя не чапляецца да гэтага фота? — спытаўся госць.

— Адзін раз было. Але я сказаў: забераце фота, бярыце і мяне. Ад гэтай бітвы, што на ім, пачалося маё жыццё рабочага.

Незнаёмы, цікавы чалавек з выразам непасрэднасці на твары прапанаваў старому Яну закурыць са скуранога, паношанага партсігара.

Стары Ян курыў і праз дым разглядаў незнаёмага.

«Відаць, мудры хлопец, вучоны, хоць твар ніколькі не падобны на панскі. Значыць, свой,— думаў Ян,— гэта ўжо не маладзён. У мае мінулыя гады такім выглядаў Мархлеўскі».

— Ну як, пэпэсякі танцуюць на вуліцах? — спытаўся Ян.— Ого, ім вольна танцаваць. Няхай не думаюць, што ў нас няма свайго цэнтра. Ёсць. А калі што, дык і рэвальвер трымаць умеем.

— Ну, да гэтага не дойдзе,— сказаў, усміхнуўшыся, незнаёмы.

— Праклятыя бавэлкі! На арбітраж збіваюць. Мы ўжо ведаем гэты арбітраж. Наш такі арбітраж, які на карысць рабочага працуе.

— Арыштаваных сягоння не было? — спытаўся госць.

— Не, не дайшло да гэтага. Паліцыю не пусцілі ў натоўп. Нават Высакінскі, кіраўнік дэфы, вымушаны быў на сваёй машыне павярнуць назад. У паходзе ішло больш пяці тысяч. Сягоння апошнія фабрыкі далучыліся да забастоўкі. Проста ад станкоў уліваліся ў дэманстрацыю.

— Гэта ведаем,— адказаў госць.

Хутка пачалі ўваходзіць новыя госці.

Прыйшоў Вацлаў Сапкоўскі, а за ім яшчэ трое рабочых. Усіх сустракаў стары Ян і праводзіў у пакой да незнаёмага.

Андрэй у гэты час сядзеў у сутарэнні глухога падворка каля друкарскага станка і карэктаваў свой артыкул для органа ЦК КПЗБ «Чырвоны сцяг» на тэму выкрыцця беларускай санацыі, выкрыцця беларускіх хадэкаў, як рэзерва фашызму. У артыкуле адводзілася таксама месца для выкрыцця новай партыі, створанай Акінчыцам па гітлераўскі ўзор пад назвай «Беларуская нацыянал-сацыялістычная партыя», якая кінула людаедскі лозунг — «Смерць камуністам». Андрэй перачытваў свой артыкул і адчуваў, як хвалі народнага руху ўзнімаюцца, пераліваюцца па ўсёй краіне, як расце, узмацняецца салідарнасць працоўных, пачынаючы ад Сілезіі, Кракава, Познані, праходзячы праз Варшаву, Лодзь, захоплівае Львоўшчыну, Валынь, даходзіць да Пінска, Брэста, Гродна, Беластока і Вільні.

Андрэй, пакінуўшы Піншчыну, дабраўся да Варшавы

і адтуль атрымаў прызначэнне на працу ў рэдакцыю «Чырвонага сцяга».

Тут упершыню ён падумаў аб сваім месцы ў вялікай арміі барацьбітоў, імя якой — партыя. Яшчэ ў Варшаве ён паставіў гэтае пытанне. Сказаў:

— Я згодны папрацаваць у рэдакцыі, але баюся, каб не адарвацца ад народа.

Яго запэўнілі, што яны — сакратарыят — за гэтым сочаць, што час ад часу яго, Андрэя, будуць пасылаць у акругі.

Пасля палескіх дарог праца ў рэдакцыі здавалася шчаслівым зацішшам. Але ўжо праз тыдзень гэтае зацішша пачало надакучаць. Авалодвала трывога адрыву ад канкрэтнага жыцця мас, без чаго, як здавалася Андрэю, пачынае раставаць у душы гарт, набыты на перадавой лініі фронту.

Жывучы на кватэры ў маладога ткача Паўла, швагра Станіслава Барвіны, перачытаў многа літаратуры — палітычнай, мастацкай.

Не трэба адставаць, трэба запоўніць прабелы. Неўзабаве, апрача артыкулаў, пачаў пісаць вершы. Спачатку былі прыпеўкі на палітычныя надзённыя тэмы. Яны друкаваліся, як лістоўкі, і плылі па вёску. Потым... прыйшла лірыка. Андрэй пасля некалькіх вершаў схапіўся за галаву. Не дай бог заразіцца паэзіяй! Гэта ж неадчэпная напасць. Усё точыцца і точыцца недзе ў мазгах, пакутліва пракладае сабе дарожку, безупынна.

> Беспрацоўны... стаіць прад вітрынай,
> А па шыбе прамені слізяць...
> Мне б хацелася ў песні адзінай
> Вось аб гэтым табе расказаць.

Андрэй глядзіць на страфу і пытаецца: «Каму расказаць? Беспрацоўнаму ці каму другому? Для чытача будзе незразумела». Але затое зразумела для самога Андрэя. Расказаць пра беспрацоўнага, вядома, ёй. Вось куды вядзе рука пяром. Нешта не чуваць пра яе, пра Надзю. Андрэй не адважваецца спытацца ў каго-небудзь з варшавян. Няёмка ды і нетактоўна. Прачытваючы стосы газет, праводзячы вечары за пісаннем, Андрэй адчувае, як падземным струменьчыкам плыве; прасочваецца яна — паэзія, прасочваецца туга па ёй, пра якую не чуваць. І, пяглядзячы на аддалены гарадскі гул за сцяною, адзінота агортвае Андрэя.

Плывуць весткі з акруг — добрыя і дрэнныя. Асабліва

добрыя з Беластоцкай акругі. Размах забастоўкі ўзнімае сялян да салідарнасці. У ЦК КПП мацней нагаворваюць аб памылках, аб недастатковай дагэтуль увазе да нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, аб перажытках люксембургізму як спадчыне ад СДКПЛ[1]. Самі падзеі прывялі да гэтага. Для падтрымкі забастоўкі рабочых Беластока спатрэбілася дапамога сялян.

Андрэй бярэцца за чарговы артыкул аб разгроме Таварыства беларускай школы, аб тактыцы фашызму і аб тых інтэлігентах накшталт Аркадзя Дзенісевіча, які, па расказу Паўла, перайшоў на службу да пілсудчыкаў. «Дзенісевіч, бесхрыбетны філосаф, дасягнуў свайго Манблана. Ну і Манблан... Гэта ж гнілая купіна, ты, напханы тамамі, акулярысты Дзенісевіч!»

Скончыўшы артыкул аб разгроме ТБШ, Андрэй пачаў накідваць тэзісы супроць ППС.

А потым... канчаў верш.

Гэты верш быў па сутнасці лістом да яе, да Надзі. «І чаго ты чапляешся да мяне, паэзія? Хіба для таго, каб я страціў пачуццё ў ацэнцы ўсяго, што мяне акружае?» — думае Андрэй, але ўздыхнуў з палёгкай, калі верш быў закончаны. «Няхай паляжыць маё рыцарства — ха-ха-ха!.. Трэба схадзіць у друкарню».

Прыйшоў... Грыша Плотка і гаворыць Андрэю тое самае, што цвярдзіў пры сустрэчы ў Варшаве:

— Які гэта чорт тады накіраваў цябе ў Піншчыну? Я ўсё ніяк не дайду да толку.

— Прыйшла дзяўчына пасля цябе, сказала, я і паехаў,— адказвае Андрэй.

— Ты быў намечаны сюды для журналісцкай работы. Цябе знайшлі, як знаходку, бо... ведаеш, няма нацыянальных кадраў. І тут — бух у Піншчыну. Ведаеш... Я буду старацца, каб ЦК заняўся гэтым.

— А што? Думаеш, можа, гэта знарок?

— Знарок — не знарок, але парушана рашэнне. Праўда, была спрэчка тады, дзе цябе найлепш выкарыстаць. Адзін прапанаваў у Піншчыну паслаць, але ўсе другія і слухаць не хацелі. Толькі ў Беласток. Аднак бачыш...

Андрэй маўчаў. Грыша мацаў пальцамі свае акуляры і таксама змоўк.

— Піншчына — гэта бойня...— пачаў Грыша,— там столькі прапала нашых людзей. Едуць, едуць, як у яму.

---

[1] СДКПЛ — Сацыял-дэмакратычная партыя Польшчы і Літвы.

Вырашана пасылаць туды такіх, хто ўжо там працаваў і ведае людзей. А цябе, свежанькага, толькі што выпушчанага з турмы — бах туды... Не, не, тут нешта ёсць.

Андрэй слухаў, нешта схопліваў з падтэксту гутаркі Грышы, але перакапацца ў чым-небудзь было немагчыма.

— Час пакажа, Грыша,— сказаў Андрэй,— а Палессе наогул я ведаў і хутка сарыентаваўся ў становішчы. Бачыш, нават забастоўку ўдалося правесці, не толькі аднавіць разбітыя арганізацыі. Людзі там, праўда, крыху адменныя. Гэта я таксама ведаў.

— Ты проста мастак...

— Такі мастак, як і ты. Ты ж хадзіў па вёсках?

— Хадзіў. Але гэта не такія вёскі, як у Піншчыне. Слонімшчына, Беласточчына палітычна больш пісьменныя...

Андрэй сеў і глянуў у акуляры Грышы, нахіліўшыся да яго.

— Ты прыбыў нядаўна з акругі. Напішы інфармацыю аб падзеях там. Хочаш начаваць у мяне, начуй. Я пайду на хвіліну.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

На кватэры старога Яна ў голасе незнаёмага, якога называлі «таварыш Балеслаў», Андрэй пачуў голас ЦК.

— Мы перажываем вельмі важны момант,— гаварыў таварыш Балеслаў,— калі не назваць яго момантам крытычным. Уздым рэвалюцыйнай хвалі ва ўсёй Польшчы, Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі прыводзіць нас цяпер да рэвалюцыйнай сітуацыі. Наш уплыў у масах настолькі вялікі, што мы не паспяваем своечасова арганізацыйна ахопліваць рух мас. У гэтым наша вялікая бяда...

— Пілсудчыкаўская зграя ўсё больш і больш зрастаецца са смяротэльным ворагам народаў — з нямецкім фашызмам,— працягваў прамоўца,— яна гатова адкрыць Гітлеру вароты Польшчы, каб прапусціць яго фашысцкія орды на ўсход, супроць Савецкага Саюза — цвярдыні міру і незалежнасці ўсіх народаў. Ніці сусветнай рэакцыі канцэнтруюцца цяпер у Берліне...

Слухаюць усе голас таварыша Балеслава і разумеюць, што гэта ёсць голас ЦК. І кожны хоча запытацца: «Кажы хутчэй, што рабіць? Што рабіць, як рабіць, каб падарваць навалу фашызму і наблізіць дарагі час рэвалюцыі?»

Таварыш Балеслаў гаворыць далей аб дасягненнях

кампартыі ў стварэнні народнага фронта. Народны фронт — самае важнае. Усе сілы для народнага фронта! Спярша адзіны рабочы фронт, як аснова народнага фронта. Гэта значыць, трэба адарваць рабочых ад ППС, Бунда. Трэба іх сацыял-шавіністычнай дэмагогіі супрацьставіць нашы ідэі інтэрнацыяналізма, ідэі братэрства народаў...

Усё гэта правільна. Але ў кожнага карціць пытанне: што і як рабіць у самім Беластоку?

Прыйшоў адказ і на гэта — націск, гнуткая тактыка. У апошнім выпадку арбітраж прыняць, бо фашысты могуць пайсці на масавыя расстрэлы. Гэта паказалі падзеі ў Дамброўскай акрузе і на Заходняй Украіне.

— Калі нам удасца падвесці масы, як гаворыцца, да барыкад, тады мы зможам наступіць на горла фашызму, тады прадыктуем сваю волю...— гаворыць незнаёмы таварыш, у якога тры папярочныя маршчыны на лбе ўвесь час у руху.

Пры апошніх словах стары Ян заварушыўся і лёгка прыстукнуў кулаком па стале. У самым далёкім кутку сядзіць Station Станіслаў Барвіна, і вочы яго блішчаць, як вугольлі. Вацлаў Сапкоўскі, непрыкметна для сябе, накручвае вус — задуманы, прыціхлы. Работы для гаркома, ой, па вушы!

— Да паўмільёна рабочага класа ўдзельнічае ў стачках па ўсёй краіне,— працягвае далей таварыш, які пачынае здавацца староме Яну даўно знаёмым чалавекам, якога ён ужо недзе бачыў, чуў.

Грыша Плотка паблісквае акулярамі і часта іх мацае пальцамі, усё папраўляе. Ён засяроджана пакашлівае, пасля чаго застывае ў напружанні. Трое рабочых выглядаюць так, быццам яны ўсё ведаюць, нібы, па іх адчуванню і разуменню, да галоўнага дакладчык яшчэ не дайшоў. Тое, што гаворыцца,— гэта ўсё патрэбна і важна, інакш не можа быць, а вось галоўнае... відаць, у чымсьці іншым.

— Дзейнічаць трэба! Дзейнічаць! Дэманстрацыі рабочага класа Беластока паказалі высокі ўзровень салідарнасці,— гаварыў дакладчык далей,— трэба арганізацыйна ахапіць рух мас, павесці іх пад нашымі палітычнымі лозунгамі — за разрыў з гітлераўскай Германіяй, за саюз з Краінай Саветаў, за дэмакратызацыю краіны, за хлеб, за працу...

Тут прамоўца перайшоў з тону паўафіцыйнага, кніжнага на ціхі тон размовы, адсунуўся ад стала і нахіліўся

да слухачоў, жэстыкулюючы рукамі. Абводзіў усіх вачыма, на кожным спыняўся, хацеў, каб дайшло да душы.

— Помніце, што дэфа і паліцыя загнаны цяпер за вароты і адтуль выглядаюць на вуліцу праз шчылінкі. Паліцэйскі апарат, можна сказаць, паралізаваны. Трэба ўтрымаць такое становішча як мага даўжэй. Гэта дасць магчымасць рабочаму класу з'яднацца з сялянствам, расшырыць свае баявыя пазіцыі, узмацніць іх і пайсці на штурм фашызму... Што сялянства з акругі ўдзельнічае ў дэманстрацыях рабочых — гэта вельмі важны фактар і, можна сказаць, фактар рашаючы. Лозунгі нацыянальна-вызваленчай барацьбы беларускага і ўкраінскага народа паўстаюць перад намі ва ўсёй вастрыні...

Усім зразумела, што база фашызму ў Польшчы звужаецца. Паліцыя ўжо бяссільная, каб расправіцца з масамі гумавымі палкамі.

Барацьба абвастраецца.

— Якія будуць пытанні, прапановы?

Вацлаў Санкоўскі абудзіўся ад задумы.

— Пікеты не спраўляюцца. Мала дысцыпліны. Некаторыя пікеты, убачыўшы паліцыю, пакінулі пасты. Другое — разведка ў прафсаюзе не наладжана. Трэба ведаць павароты пэпээсаўскіх лідэраў... тое самае і ў Бундзе.

Санкоўскі прыцішыў голас і дадаў:

— Патрэбна ведаць і аб дэфе...

— Хто яшчэ?

Адзін з рабочых сказаў, што мала камуністаў у забастовачным камітэце. Пэпээсаўцы ўцягваюць у вялікія дыскусіі, каб дарма траціць час, расхалоджваць людзей.

Андрэй сказаў, што трэба больш актывізаваць сялянства для дапамогі бастуючым прадуктамі.

Таварыш Баляслаў кіўнуў галавой.

Грыша Плотка сказаў, што сувязі партыі з рабочымі, якія падпалі пад уплыў Бунда, моцныя. Можна гарантаваць іх удзел у дэманстрацыі. Патрэбна толькі больш падзённай літаратуры.

— Ад камсамола хто?

Усе маўчалі. Потым Санкоўскі сказаў:

— Няма... Чакалі, не прыбыў. Прычына невядомая.

— Шкада... Трэба працаваць з моладдзю, згуртаванай у фашысцкіх арганізацыях — «Стралец» і іншых. Фашызм рыхтуе з іх штрэйкбрэхераў, разгоншчыкаў дэманстрацый,— сказаў таварыш Баляслаў.— Сягоння вам трэба правесці нараду гаркома і нараду забастовачнага камітэта.

Выпрацаваць маршрут заўтрашніх паходаў. Асноўныя пункты — рабочыя кварталы, прыгарады, казармы, заводства. Узмацніць авангард калон — баявыя дружыны...

Шмат чаго гаварылася яшчэ да ўдакладнення спраў.

Горад патануў у змроку. Толькі зоры то запальваліся, то гаслі над домікам старога Яна. Ля сцяны стаяў, угледаючыся ў іх, Павел. Нават ужо халаднавата яму, але ён гатоў стаяць невядома колькі. Нарэшце і Павел адчуў сябе чалавекам, які чагосьці таксама варты. Ён прыйшоў у горад з вёскі і прынёс з сабою трываласць у працы, але, апрача гэтага, прынёс і нясмеласць, недаверлівасць чалавека, які вырас у крыўдзе, ва ўніжэнні. Ён рад, што з ім жыве Андрэй, які яму часта расказвае пра рабочы клас, аб розніцы паміж пралетарыятам і сялянствам і аб агульнасці іх інтарэсаў. Як жа ўсё дзіўна на свеце зроблена, і розуму ж колькі трэба, каб ва ўсім разабрацца, каб нарэшце скончыць з панамі. Для Паўла ўсе ворагі — паны, усё яшчэ паны, яшчэ не асвоіў ён новых для яго назваў — «буржуазія, фашызм». Як іх ні называй, усё роўна паны, ліхадзеі, уселіся яны ў душу народа ад вякоў.

Для таго і стаіць ля доміка старога Яна малады ткач Павел з сялянскім прозвішчам Касагор і сам душою яшчэ напалавіну селянін, стаіць, сочыць за зорамі, каб дапамагчы набліжэнню жаданай гадзіны свабоды.

* * *

Першая і асноўная калона рабочых вылілася, вырасла аднекуль з гарадскіх нетраў і ішла без шапак. Нават жанчыны апусцілі хусткі на шыі. Над натоўпам развяваліся тры сцягі. На першым сцягу, які неслі на двух дрэўках, амаль на ўсю шырыню калоны на чырвоным палотнішчы бялелі вялікія літары: «Прэч крывавыя рукі ад СССР! Сарваць прадажніцкі саюз з фашысцкай Германіяй!» На другім — «Свабоду вязню нямецкага фашызму таварышу Тэльману — правадыру нямецкага пралетарыяту! Патрабуем вызвалення палітзняволеных з турмаў! Далоў белы тэрор!» На трэцім — «Барацьба за павышэнне зарплаты — да перамогі! Прэч з фашысцкай рацыяналізацыяй працы, якая выціскае апошнія сокі з нашых жыл! Хлеба і працы беспрацоўным!» Пікеты выпускалі з варот новыя калоны, якія ўзмахамі шапак, рук, сціснутых у кулакі, віталі дэманстрантаў. «Няхай жыве забастоўка!», «Няхай жыве салідарнасць працоўных!» — і ўліваліся ў

магутную калону, навялічвалі яе, рабілі даўжэйшай і гусцейшай.

Калона расла ў даўжыню, калыхалася хвалямі, імкнула размеранай хадою, стрымана, магутна наперад і наперад. Чырвоныя павязкі ў пікетчыкаў мільгалі ўздоўж калон па баках. З аднаго двара выйшлі са сцягамі людзі ў шэрых куртках, выйшлі сяляне. Іх сустрэлі не толькі воклічамі, але і воплескамі. Сяляне неслі на сваіх сцягах: «Прэч разбойніцкія рукі ад СССР — бацькаўшчыны працоўных! Няхай жыве антыфашысцкі народны фронт! Прэч асаднікаў — каланізатараў з Заходняй Беларусі! Прэч з фашысцкай зямельнай камасацыяй [1]. Зямля сялянам без выкупу! Хлеба і працы!»

Паліцыянты, убачыўшы здалёк набліжэнне калоны, уцякалі на падворкі. Гандляры замыкалі свае магазіны і апускалі жалезныя аканіцы на вокны. Панічны стук дзвярэй, як пераклічка, паплыў па вуліцы — бах, бах, бах...

Вось ужо ўскраіна і ваенныя казармы. Вартавыя стаяць ля варот, на вуліцу выходзяць чалавек дваццаць салдат, пастроеных у чацвёркі. Рабочыя клічуць іх, асабліва жанчыны: «Хадзем з намі! Далучайцеся!» Вартавыя кінулі вінтоўкі і далучыліся да паходу. Тое самае зрабілі і тыя дваццаць, што выходзілі з казарменнага двара. Сярод рабочых нават пракацілася «ўра». У той жа момант чыесьці рукі замкнулі вароты казармы на замок. Але калона плыве і плыве міма варот, і лозунгі адзін за другім ляцяць за цагляную сцяну казармаў.

І адтуль, насустрач лозунгам, вылецелі шызакрылыя галубы, а ўслед за імі ўзвіліся чырвоныя стужкі з лозунгамі салідарнасці салдат з рабочым класам — стужкі, прывязаныя да птушыных лапак. Тады магутна загучала песня, традыцыйная песня польскага пралетарыяту. Яна лілася, як баявая пераклічка, з аднаго канца калоны ў далёкі яе другі канец, гучала, як баявы заклік-наказ:

Рыцары працы, рыцары духа,
Сёння да бою нам час настаў,—
На барыкады! Пабудкі слухай!
Пабудка грае: «Паўстань, паўстань!»

І пасля паплыла бясконцай хваляй, як неразвон пабудкі:

Молат ў далонь,
Бі, куй бронь,

[1] Хутарызацыяй.

Пырснё сталь
Чырвонай іскрай ўдаль!
Жар іскраў тых

Гарыць ў грудзях маіх —
Брат, паўстань,
Агнём палае рань!
Агнём палае рань,
Палае рань!

Ішлі, ужо падзеўшы шапкі, ішлі самкнутай калонай, чалавек ля чалавека. Не ішлі, а плылі адзінай магутнай плынню, узняўшы галовы — натхнёныя, суровыя, асветленыя чырвонню сцягоў.

Леніну слава! І Марксу слава!
Прэч буржуазію! Народу чэсць!
Хай да шарэнгаў кожны з нас стане,
Каб іх навуку ўсюды несць!
Молат ў далонь,
Бі, куй бронь...[1]

Калона, як шумны паток, павярнула налева, і тут, на павароце, нейкая жанчына, у цёплай вязанай хустцы і ў кажушку, вышытым на грудзях, штурхнула пад локаць Андрэя. Ён глянуў і хацеў нават спыніцца. Яна ці не яна? Той самы нос і цёмныя бровы над гарачымі вачыма. Але здзіўляе гэты сялянскі кажушок, вышыты на грудзях. Адкуль ён можа быць у яе ды яшчэ тут? Не, гэта не яна. Толькі так здалося. Вось яна хоча ўжо аддаліцца ў плыні людскога патоку. Андрэй імкнецца за ёю. Наблізіўся, зірнуў асцярожна ў твар. Відаць, асцярожнасць была задоўгая, бо жанчына бліснула ўсмешкай так раптоўна, нечаканна, што Андрэй, нічога не кажучы, падхапіў яе пад руку.

— Андрэй...— прашаптала яна.

А ён у адказ:

— Мы сапраўды сустрэліся на барыкадах.

Далучыліся да песні, ішлі зноў разам, крок у крок, нага ў нагу.

Зараз павінна ўліцца ў паток калона лесапільшчыкаў, а потым тут, на прасторы ўскраіны, адкрыецца мітынг. Вацлаў Сапкоўскі прабіраецца паўз край калоны назад. Правярае пікеты. Ён іх начальнік. Кожнаму нешта гаворыць і мчыць далей. А ў людской масе прапырліва ўвіхаюцца нейкія ягамосці і нашэптваюць:

— Настойвайце на арбітражы... Не завастраць...

---

[1] Песня «На барыкады!» — пераклад з польскага.

І мчацца далей. Ян Куркоўскі пазваў бы іх бавэлкамі. Гэта агенты ППС шнырацць паміж рабочымі, расхаладжаюць баявы запал.

Ян Куркоўскі ідзе дзесьці наперадзе пад першым сцягам, разам з пярэдняй баявой дружынай, на чале якой крочыць Станіслаў Барвіна, яе камандзір.

Калона лесапільшчыкаў ужо ішла насустрач з двума сцягамі. Але паперарэз абедзвюм калонам вынырнула машына, як быццам з-за гары. Адкуль яна ўзялася? Вось імчыць. Хто каму ўступіць дарогу? Машына параўнялася з калонай, прыцішыла ход і павярнула насустрач, каб праехаць уздоўж калоны. Станіслаў Барвіна пазнаў таго, хто ехаў у машыне, і крыкнуў: «Высакінскі!..» Крыкі ўзарваліся, як бура: «Кат! Кат!», і камяні градам паляцелі ў вокны. Яны трэснулі, зазвінелі, скрозь Высакінскага, кіраўніка дэфензівы, аблілася крывёй. Шафёр раптоўна крутнуў абаранку руля, і машына падалася ў завулачак. А па ёй забразгалі камяні. Заўважыў Барвіна і другога, хто сядзеў у машыне, побач з катам Высакінскім,— пана Чарапіцкага. Яго б у рукі цяпер. Але, можа, яшчэ настане тая хвіліна.

Тым часам надышла другая падзея. Схаваны за вуглом атрад коннай паліцыі з шаблямі нагола галопам паляцеў на галаву калоны, на баявую дружыну. Зрабілася маленькае замяшанне. Дружына на момант нібы прыселa, зараз жа выпрасталася. Людзі вырывалі камяні з бруку і кідалі ў паліцыю, якая хацела адарваць галаву калоны і ўжо ўрэзалася ў натоўп, б'ючы людзей плазамі клінкоў. Пачуўся голас Барвіны: «Паліцыю з коней!» Барвіна ўчапіўся за павадкі аброці афіцэрскага каня, камандзіра паліцэйскага атрада. Афіцэр намагаўся ўздыбіць каня, але гэта не ўдавалася. Конь падскакваў і тут жа апускаўся на капыты пад рукою Барвіны. Афіцэр ніяк не мог дастаць клінком сваёй шаблі вёрткага Барвіну. Дружыннікі ўжо сцягвалі некалькіх паліцыянтаў з коней, а ўся маса раўла і ўсё кідала камяні ў паліцэйскіх ваякаў.

— Адабраць сцягі! — верашчаў афіцэр, ніяк не могучы пагнаць свайго каня, якога трымаў Барвіна, як кляшчамі. Тым часам ззаду падбег да афіцэра малады, танклявы чалавек, вырваў нагу афіцэра з стрэмя і пацягнуў. Афіцэр крутнуўся назад, каб агледзецца, шарахнуў шабляй па галаве дэманстранта і разам з ім зваліўся на зямлю. Натоўп рушыў на коннікаў. Пачуліся стрэлы... у сцягі, але гэта было апошняе, што зрабілі паліцыянты. Конная

атака была адбіта. Паліцыянты, хто быў яшчэ на кані, памчаліся прэч, а за імі ўслед пабеглі пешыя, якія былі сцягнуты з коней.

Стары Ян Куркоўскі вырываў камепні з бруку, крычаў: «Шчыльней, шчыльней да атакі!» Калі ж паліцыя набегла, ён падышоў да маладога хлопца, які ляжаў, здаецца, нежывы з акрываўленай галавой. Разам з ім нахілілася яшчэ некалькі рабочых, у тым ліку і Ганорка, дачка Яна. Падпялі, убачылі, што ён быццам нетутэйшы. Саматканая шэрая куртка на ім, і на круглым схуднелым твары нос, як люлечка.

— Вясковы хлопец,— сказаў Ян,— Ганорка, нясіце яго да сябе,— а сам думаў: «Ну, усё роўна, як у 1905 годзе».

Вацлаў Санкоўскі лятаў, як шалёны, упарадкоўваў пікеты, крычаў, што паход будзе працягвацца. Побач з Станіславам Барвінам ішла Марыля і дамагалася, каб ён зняў куртку, бо яна на правым плячы была рассечана. Відаць, вастрыё клінка дакранулася да цела, бо кроў дробнымі кропелькамі капала з рукі. Урэшце Барвіна зняў куртку, перадаў на хаду Марылі, а потым разарваў рукаў. Рана была нязначная. Выходзіць з радоў не трэба. Пара стужак з сарочкі сціснулі рану, і Барвіна, апрануўшыся, пайшоў.

Андрэй з Надзяй дабраліся да пярэдняй калоны, таксама вырывалі каменні з бруку і кідалі. Хоць яны не мелі спецыяльных заданняў, але калі пачуліся стрэлы і сёй-той хацеў бегчы, супакойвалі, заклікалі застацца, не рабіць панікі. Кідаліся то да адных, то да другіх са словамі: «Таварышы, трымайцеся, нас многа!»

Лесапільшчыкі ўжо ўліліся ў агульныя калоны. Паліцэйскія коннікі, каб адпомсціць, атакавалі апошнюю калону, але там сустрэлі таксама адпор. Усё ж такі адарвалі чатырнаццаць чалавек і пагналі перад сабою.

Па пікетах, як па ланцугу, вестка дайшла аж да галоўнай калоны, да забастовачнага камітэта.

Тады адкрыўся мітынг. Пікеты павялі заднія калоны за сабою, каб усім былі чутны словы прамоўцаў.

На ўзгорку на скрыню ўзлез стары Ян Куркоўскі і скінуў кепку. Стаяў некаторы час як манумент на п'едэстале, пазіраў навокал, а потым пачаў:

— Наша дарога не ружамі ўслана, дарагія таварышы, дарагія працаўнікі станкоў! Хто так думае, той яшчэ рабочага поту добра не панюхаўся, у таго яшчэ малако на губах. Жыццё рабочага класа — гэта пастаянная барацьба за хлеб, за працу, за сацыялізм.

Сціхла людское мора. А стары Ян паварочваўся тварам то ў адзін бок, то ў другі, працягваў руку наперад.

— Гэтыя чорныя салдафоны ў гузіках, каб такіх маткі больш не нараджалі, хацелі сягоння ў крыві натапіць наш голас, хацелі выслужыцца перад сваімі дармаедамі. Дарма! Яны далей сваіх смаркатых насоў не бачаць. Хіба можна знішчыць рабочы клас?! Га?! Ім не падабаецца, што мы любім Савецкі Саюз і гатовы стаць у яго абарону сваімі грудзьмі. Бо там наш брат рабочы выкінуў да ста д'яблаў цароў, князёў, усю зграю капіталістаў і памешчыкаў, паразітаў, такіх, якія яшчэ ездзяць тут на нашых шыях. СягоннЯшняя бойка з паліцыяй напомніла мне тысяча дзевяцьсот пяты год, калі мы вось так царскіх жандараў сцягвалі з коней. Ганьба! Ганьба пілсудчыкаўскаму смуроду, які засмуродзіў Польшчу! Дарагія таварышы! — рваў на сабе грудзі стары Ян.— Яны ж, псяюхі, прадалі Польшчу з вантробамі нямецкаму кату рабочага класа Гітлеру! Ганьба! Ганьба!

— Ганьба!!! — крыкнуў натоўп.

Усе адчувалі, што голас старога Яна з'яўляецца галасам рэвалюцыйнага Беластока...

...На мітынгу выбралі дэлегацыю, каб яна зараз жа пайшла ў пастарунак і вызваліла арыштаваных. Дэлегацыя пайшла. Усе чакалі. Прамоўцы выступалі за прамоўцамі. Пэпээсаўцы некуды зніклі.

Дэлегацыя прывяла арыштаваных. І тады выбухнуў гром воплескаў.

Калоны з песняй «Чырвоны сцяг» рушылі далей.

Цяпер мэтай паходу было ваяводства — дайсці да яго і выслаць дэлегацыю з дамаганнямі рабочага класа Беластока.

Але па дарозе сустрэла іх новая перашкода — дваццаць пешых паліцыянтаў і столькі ж узброенай моладзі з ваенна-фашысцкай арганізацыі «Стралец». Надзя, убачыўшы іх, амаль крыкнула на вуха Андрэю:

— Глядзі! Гэта з Бельскага павета! Невядома, як яны сябе павядуць. Сярод іх былі нашы хлопцы...

Афіцэр паліцыі крыкнуў дэманстрантам, каб разышліся. Калоны ішлі. Тады афіцэр папярэдзіў, што будзе ўжыта зброя. Дэманстранты спыніліся. Наперад выйшлі тры маладыя рабочыя і звярнуліся з прамовай да стральцоў.

Афіцэр скамандаваў стральцам узяць вінтоўкі на прыцэл. Стральцы выканалі каманду. Надзя вялікімі вачыма

глядзела ў іх бок, глядзела на дэлегатаў, якіх яна сёння ноччу рыхтавала да такога выступлення.

Пачулася каманда: «Плі!» Грымнулі стрэлы, але... у паветра. Стральцы другой каманды не выканалі. Афіцэр з пенай на вуснах падляцеў да іх і, гатовы біць па тварах, тупаў нагамі, крычаў: «Што?! Не выконваць загаду?! Хто вас так навучыў?!»

Правафлангавы стралец зрабіў з шарэнгі крок наперад, як і трэба па статуту, і сказаў на ўвесь голас:

— Мы ў сваіх братоў і сёстраў страляць не будзем!

Афіцэр анямеў. Потым раптам падбег да паліцыянтаў і на ўвесь голас крыкнуў:

— Па стральцах-здрадніках — плі!

Грымнулі стрэлы. Восем чалавек стральцоў упала забітымі.

Дэманстранты атакавалі паліцыю...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ціха падае снег за акном. Кладзецца павольна, роўна. Адзінае акно завешана толькі да палавіны. І таму праз верхнюю шыбіну відаць, як ляцяць сняжынкі — белыя, пушыстыя. Некаторыя з іх кладуцца на раму свежанькім пушком.

Андрэй пасядзіць за сталом, хопіцца за пяро, а потым устане і заходзіць па пакоі. Сняжынкі здаюцца яму жалобнымі. Многа ж набраў матэрыялу для газеты «літаратар-псіхолаг». Матэрыял у грудзях змясціцца не можа.

Надзя, стомленая, прылягла на ложак Андрэя і заснула, апранутая і абутая, заснула з выразам заклапочанасці на твары і нават жалю.

Паказаў бы Андрэй ёй сняжынкі, але няхай адпачне. Яна тры ночы амаль не спала. Ездзіла па Бельскім павеце, а потым тут, у Беластоку,— трывожная ноч нарад з камсамольцамі. Калі з'явілася на канспіратыўную кватэру, ніхто не паведаміў ёй, каб прыйшла на нараду да старога Яна. А было ж наказана, каб перадалі. Цікава. «Недзе нехта блукае каля нас не свой, чужы, яшчэ не распазнаны...» — думае Андрэй. Блукаў ён і ля Андрэя там, у Варшаве, калі нечакана яго адправілі ў Піншчыну, мусіць, для згубы. А цяпер... тут ходзіць ён. Праў, напэўна, праў Грыша Плотка са сваімі меркаваннямі.

Надзя заварушылася, падагнула ногі, яшчэ глыбей уткнулася галавой у падушку. Мусіць, ёй стала холадна. Андрэй зняў сваё паліто з вешалкі і асцярожна накрыў

не. «Спі, заўтра паедзем у дарогу разам»,— падумаў Андрэй.

Соў пісаць. Што пісаць? Жалобны вечар сягоння — вечар некралогаў. Аб забітых маладых хлопцах-стральцах ужо напісана. А яшчэ трэба напісаць адзін некралог, і Андрэй не можа стрымаць хвалявання. Вось заснула яна, Надзя, якая прынесла гэтую цяжкую вестку. У Бельскай дэфензіве памёр ад катаванняў Юрка Крагельскі. Яго каты паспелі прывезці яшчэ жывым у турму. Баяліся, каб не скончыўся ў дэфе і каб часам не мець якіх клопатаў. Суседства пралетарскага Беластока так ці інакш трывожыць.

Пасля таго як Юрку прывезлі ў турму, ён у той жа дзень памёр у турэмным шпіталі. Усё ж такі паспеў вымавіць у апошнюю хвіліну: «Няхай жыве Камуністычная партыя!»

Не будзе больш шумець вадаспад у разбітым сэрцы. Вадаспад заціх. Вадаспад не паддаўся катам, нічога ім не аддаў. Усё пакінуў для партыі. «Дарагі Юрка! Як жа мне аб усім напісаць? Выйдзе балюча і тужліва. А тужыць нам трэба ў меру. Трэба несці сцяг партыі па шляху няўдач і перамог — да апошняй перамогі, трэба каваць вернасць у душы.

Увесь край даведаецца аб табе, Юрка, аб тваёй смерці змагара за камунізм. І там, над Шчараю, умыецца слязою твая красуня...»

Жалобны вечар. Сняжынкі ўсё падаюць і падаюць за акном. А на паперы кладуцца чорныя жалобныя словы.

* * *

Зноў знаёмы вецер на дарогах. Пацярушвае снежком, быццам пылам. Андрэй з Надзяй пабылі ўжо ў трох раёнах. Які штуршок дала забастоўка рабочых Беластока для ўсёй акругі! Паліцэйскае нахабства і тут аслабла. Ажыўленне сярод сялянства такое, што яно нагадвае Андрэю часы Грамады. Усюды Андрэя і Надзю прымалі з радасцю, з натхнёнымі тварамі, з бляскам у вачах. Углядаліся ў іх з прытоенай усмешкай. «Гэта тыя, якія ведаюць, калі будзе рэвалюцыя, яна ўжо блізка. Недарэмная іх работа»,— гаварылі іх позіркі, твары.

Андрэй з Надзяй не затрымліваліся доўга на адным месцы. Нідзе не сустракалі асаблівых цяжкасцей, перашкод у сваёй працы. І вынік яе быў, можна сказаць, цу-

доўны. Абозы з бульбай, збожжам, крупамі паплылі ў Беласток, каб умацоўваць адзіны народны фронт, дадаць сілы рабочым, бо яны аснова, яны перадавы атрад рэвалюцыі. «Няхай жа бастуюць, трымаюцца да перамогі, мы апошнім падзелімся, каб толькі панскае ліха скінуць з плеч»,— гаварылі старыя дзядзькі і цёткі. І кожны, хто меў, даваў і кавалак сала, мяса. Запрагалі падпольшчыкам — Андрэю і Надзі — найлепшага каня, і камсамолія з бадзёрым шумам праводзіла іх у далейшую дарогу. Ездзілі найбольш начамі і бачылі, як плылі абозы снежнымі дарогамі ў Беласток, чулі, як парыпвалі сані, як ціха покалі на коней падводчыкі. Коні беглі жвавай рыссю і, як здавалася Андрэю з Надзяй, радасна нафырквалі. Падпольшчыкі ехалі далей, ад вёскі да вёскі. Едучы, найбольш маўчалі. Толькі часам перакідваліся позіркамі і разумелі адзін аднаго.

— Стварaецца ўражанне,— сказаў Андрэй,— што нас перакідваюць з рук у рукі, што мы не едзем, а ляцім у паветры.

Надзя ўсміхнулася і кіўнула галавой.

Маўчанне было прыемнае, радаснае.

Потым думкі вярталіся да сумнага і горкага. Шлях падполля — шлях ахвяр.

Надзя глянула ў мутныя далі снягоў задуменна і сказала:

— Нашы поспехі не павінны нам збаламуціць галовы, закрыць гарызонты. Шлях наш суровы, аб гэтым не трэба забываць ні на хвіліну.

Андрэй міжволі ледзь усміхнуўся — успомніў, як ён гаварыў такія самыя словы ёй там, на дарогах Піншчыны.

— Ты згодна з тым, што нам надоўга трэба забыць аб асабістым жыцці? — сказаў Андрэй, каб прадоўжыць гутарку.

— Я так не думаю, Андрэй. Камуністы не павінны адгароджвацца ад жыцця, ад яго радасцей.

— Крытэрый усяму — вера камуніста ў свае сілы,— гэта значыць, ніколі не пачускацца дабром агульнага грамадскага на карысць асабістага,— працягваў Андрэй.

— Ты хочаш сказаць, што трэба ўмець спалучаць грамадскае з асабістым так, каб адно другому не перашкаджала?

— Відаць, што так... Імення так...

— Для гэтага трэба розум, сіла волі...

— Для гэтага трэба лічыць справу партыі як сваю

ўласную,— перапыніў Андрэй,— трэба любіць перакананні камуніста, адчуваць жыццё народа, ведаць яго, жыць з ім...

Снег пачынаў падаць гусцей і гусцей. Размінуліся з конным паліцыянтам, які нават і не глянуў на падарожных. Снег заляпіў яму шапку. Відаць, не было гэтаму паліцыянту ніякай ахвоты пытацца, хто едзе. Да таго ж, паліцыя наогул навучылася асцярожнасці. А раптам падарожныя падставяць яму пісталет пад нос. Такое ліха па-поў паліцыянтаў сустракае на дарогах Заходняй Беларусі.

— Ты мела адказ напагатове, калі б паліцыянт запытаў, хто мы, куды едзем? — спытаўся Андрэй у Надзі.

— Мела... А ты?

— Я таксама...

— Бачыш, якія мы з табою людзі, філасофстваваць умеем і адказы паліцыі гатовыя маем, ха-ха-ха! — смяялася Надзя.

Свабода! Якое багатае, прыгожае слова! Яно перамагае ўсе сумненні, расчышчае дарогу працы, любві...

Так, і любві... Але Андрэй забараніў сабе і думаць пра гэта. Нібы вярыгі сам на сябе надзеў і не можа зняць. Сказаць бы зараз Надзі, як ён тужыць па ёй, колькі лістоў-вершаў да яе назбіралася ў яго і яшчэ больш у душы. А ён... пусціўся ў меркаванні... Праўда, пачала яна, Надзя... Пачала ціха, нават з нейкай асцярожнасцю. Раптам загаварыла пра тое, што наперадзе яшчэ могуць быць паражэнні, што жыццё іх суровае. Гэта Надзя паўтарала словы Андрэя, якія ён сказаў ёй аднаго разу на Піншчыне. І яна, Надзя, усё гэта разумее не горш за іншых. Але трэба ўмець і радавацца, калі радасна. Цярпець не можа яна людзей, якія выхвальваюцца тым, што яны ў сабе заглушаюць усякую непасрэднасць...

Андрэй у адказ пачаў гаварыць, што ён таксама любіць непасрэднасць, але толькі стараецца прытрымаць яе ў сабе. У рэвалюцыйнай барацьбе патрэбен перш за ўсё цвярозы, халодны розум... А так званыя «асабістыя» пачуцці трэба пакінуць пры сабе да лепшага часу. Але дарма думае Надзя, што ўсё гэта лёгка даецца...

І, глянуўшы на Надзю, абарваў сябе. А ў Надзі вочы бліснулі ласкавай хітрынкай... «Што ж гэта я нарабіў?» Бо няма яму жыцця без яе...

Намерзліся за дарогу парадкам. Гэта адчулася, калі ўвайшлі ў хату і распрануліся. Адразу абое сталі ля цёплай печкі...

Сустрэча з раённым актывам была кароткай. Час не чакаў. Тут пачулі аб грандыёзнай дэманстрацыі ў Беластоку, калі хавалі восем забітых хлопцаў — «стральцоў». Паліцыя некалькі разоў намагалася перашкодзіць, але без поспеху. Ёсць параненыя з абодвух бакоў.

— Хутчэй, таварышы, арганізуйце народ,— няхай вязуць бульбу, другія вёскі павезлі ўжо,— гаварылі падпольшчыкі.

Актыў рассыпаўся па вёсцы, якая ўжо ведала аб падзеях у Беластоку.

Пасля вячэры Андрэй і Надзя былі пераведзены ў другую хату на начлег. Хата была старая, з невялічкай куханькай і такой жа невялічкай чыстай палавінаю. Жыла ў ёй старая бабка з сынам-камсамольцам, які паехаў з абозам у горад. Хатка глядзела вокнамі не на вуліцу, а на агароды. Беднасць глядзела адусюль — са сцен, з вузкіх прымітыўных лаваў, з невялічкага стала на крыжаках, з пакрыўленых двух акенцаў, з нізкай павіслай столі. У кутку стаяў не то ложак, не то скрыня з дошак. З-пад дзяругі тарчала салома. Добра, што хоць ёсць сякая-такая падлога і што ў гэтай хатцы цёпла. Бабка, крыху глухаватая, праводзіла ўвесь час на куханьцы, найбольш на печы. Аднак прыйшла ў чыстую палавіну і сказала:

— Ідзіце ў хлеў, прынясіце куль саломы, пасцелецеся на падлозе... Бачыце, няма нават на чым прылегчы людзям. Дзверы ў сенцах замкніце на засаўку.

Завохкала старая, застагнала і, суровая ў сваім смутку, падалася на кухню, а затым палезла на печ.

Андрэй прынёс куль саломы, і сябры зрабілі сабе нядрэнную пасцель. Патушылі газнічку і селі ля белага акенца, як цені. Слухалі нарыпванне саней, нокапні, пераклічку падводчыкаў. Маўчалі, стаіўшыся.

Урэшце ўсё сціхла. Сонна падаў снег за акном, ад чаго шыбінкі рабіліся яшчэ бялейшымі. Цеплыня маленькай хаткі навявала дрымоту. Надзя пачала разувацца. Зрабіў тое самае і Андрэй.

— Давай сюды шкарпэткі,— сказала Надзя,— тут вось нейкі шнурок працягнуты ля печкі. Павесім, няхай прасохнуць.

Потым Надзя выняла грэбень з валасоў. Андрэй пачуў кароткі стук, калі яна клала яго на стол. Нячутна ступаючы босымі нагамі, падышла да Андрэя і ціха правяла рукою па яго валасах, а потым прытуліла галаву сябра да сваіх грудзей.

Андрэй... невядома, як гэта сталася, адчуў у сваіх руках яе моцны, зграбны стан.

— Ты просты...— ціха сказала Надзя,— з розумам філосафа, а з сэрцам дзіцяці... Пойдзем на нашу княжацкую пасцель.

Андрэй падняў яе на рукі.

* * *

Забастоўка скончылася. Рабочыя па ўрадавай арбітражнай камісіі атрымалі жаданае павышэнне зарплаты.

Праз тыдзень пасля сканчэння забастоўкі пачаліся арышты камуністаў. Андрэй быў арыштаваны якраз тады, калі выходзіў з друкарні. Знарок нарабіў крыку на ўвесь падворак, каб у сутарэнні пачулі друкары. Не хацеў ісці, упіраўся, каб зацягнуць час. Друкары пачулі крык. Адзін схапіў набор газеты «Чырвоны сцяг», другі — друкарскі станок, і абодва ўцяклі праз запасны выхад на другі бок будынка. Тры шпікі, пакінуўшы Андрэя з трыма паліцыянтамі, пабеглі ў друкарню. Знайшлі толькі адну скамечаную лістоўку.

Калі Андрэя прывялі ў дэфензіву, там ужо былі Грыша Плотка і Станіслаў Барвіна. Хвілін праз дзесяць прывялі Надзю. Яна села побач з Андрэем.

Выйшаў Чарапіцкі, агледзеў усіх і спытаўся з іроніяй:

— Ну, як? Пазнаяце адзін аднаго?

Ніхто яму не адказваў.

Чарапіцкі наклікаў Грышу Плотку кіўком пальца і паставіў перад сабою. Агляпуўся і сказаў дзяжурнаму паліцыянту:

— Рассадзіць усіх па адным...

Першую павялі Надзю. Яна зірнула ў твар Андрэю. Позіркі сустрэліся на адзін, толькі на адзін момант. Было ў іх і развітанне і папярэджанне.

Зноў сырая гулкая камера. Думкі-здагадкі. Чаканне допыту. На другі дзень рана прывялі на вочную стаўку з Грышам. Грыша стаяў з сінякамі на твары, без акуляраў, бледны. Узлахмачаныя валасы звісалі на лоб. Позірк вачэй здаваўся калючым. Андрэй заўважыў, што гузікі ў кашулі вырваны і расхрыстаны каўнер агаляў грудзі.

Грыша неяк сурова глядзеў на Андрэя і ўсё гаварыў:

— Не, я не ведаю гэтага чалавека...

Пасля абеду была вочная стаўка з Надзяй. Яна стаяла нават свабодна, з прыўзнятай галавой, з распушчаны-

мі валасамі, прыгладжанымі назад, крыху збялелая. На яе твары Андрэй убачыў гордасць, а ў вачах — ласку. Яна закруціла павольна галавой і сказала:

— Не ведаю гэтага чалавека...

Барвіна цераз паліцыянта перадаў Андрэю кавалак хлеба з салам. Яго дапытваў Чарапіцкі, і Барвіна сварыўся з ім, як у сябе на падворку. Адзін раз нават стукнуў кулаком па стале і крыкнуў, закіпеўшы:

— Ты здраднік рабочага класа! Кат! Толькі зачапі мяне, я з цябе кішкі выматаю!

— Лягчэй, лягчэй, дамо рады,— адбрэхваўся Чарапіцкі і ўсё ж такі пабаяўся паслаць Барвіну на катаванне.

Пры сустрэчы з Андрэем Чарапіцкі з абвіслай, заплыўшай тлушчам мордай усміхнуўся.

— Здаецца, знаёмыя даўно? — сказаў ён з пасмешкай.— Пан пайшоў высока, да функцыянера ўзвысіўся... Мы ўсё ведаем, пане Касцевіч...

Недзе блукае правакатар, яшчэ не распазнаны. Ён адчуваўся дагэтуль. Але дзе? Такое назнарок адкрытае, цынічнае прызнанне ката Чарапіцкага недарэмнае. На трэці дзень пабітага Андрэя кінулі ў адну камеру да акрываўленага Грышы. Андрэй дапоўз на каленях да яго, скурчанага на падлозе, і толькі прашаптаў:

— Грыша... сябра...

І яны паціснулі адзін аднаму рукі.

Шпікаўскія ніці плылі сюды з усіх канцоў краіны — з Гродна, Вільні, Брэста, Пінска, з нелюбімага Глушца. Для Надзі яны ахоплівалі яшчэ больш гарадоў і вёсак. Плывуць яны, напэўна, і з Варшавы.

— Каты! Фашысты! — пачуўся голас у калідоры.

Гэта голас Надзі. Андрэй прыхінуў сваю шчаку да сцяны.

На чацвёрты дзень усіх зачыніла пад сваім скляпеннем турма. Пачынаўся новы этап эпапеі. Агляніся назад — верставыя слупы мільгаюць на пройдзеным шляху, як маякі...

...Грышу Плотку павезлі з турмы назад у дэфензіву, павезлі ноччу разам з пракурорам. Грышу Плотку павезлі вешаць — страшыць шыбеніцай. І Грыша Плотка, кравецкі сын, не пабаяўся. Яго паўмёртвага прывезлі назад у турму. Назаўтра фельчар памярцвелыя ад пабояў месцы на целе Грышы калоў іголкамі, і Грыша Плотка не чуў болю. Ён глядзеў на сваіх «апекуноў» крывавымі вачыма. Гэта былі яго крывавыя слёзы, нявылітыя, нікому не па-

казаныя там у самотнасці пакут. «Рот-фронт! Рот-фронт!» — вітаюць праз вокны таварышы Грышу Плотку, калі ён ідзе з турэмнага шпіталя, і прывітанне рэхам разносіцца па наваколлі, вянчае славаю мужнага сына бязлівага краўца з мястэчка Глушэц.

## NO PASARAN! [1]

Грымяць гарматы ў далёкай Іспаніі. Хоць далёка яна, але рэха бітваў разносіцца па ўсім свеце. Паўстала гераічная Іспанія, і франты адкрыліся ў баях з фашыстамі. Нязнанае дагэтуль імя далятае да самых глухіх куткоў, імя жанчыны, правадыра Камуністычнай партыі Іспаніі, імя несапраўднае, але гарачае «Пасіянарыя». Радасныя падзеі яднаюць прыгнечаныя народы з паўстаўшай гераічнай Іспаніяй. І крылатае слова «No pasaran!» ва ўсіх на вуснах. Усе зразумелі яго значэнне. Яно стала любімым лозунгам у барацьбе з фашызмам і на прасторах Польшчы.

Пілсудскага ўжо няма. Людзі кажуць — не памёр, а здох. Тры дні віселі ў Глушцы нахіленыя долу сцягі, перавязаныя чорнымі, жалобнымі стужкамі. Фашысцкая Польшча сумавала. Засталіся яшчэ пілсудчыкі.

Затым украінскія нацыяналісты забілі міністра ўнутраных спраў сталыпінскага тыпу Перацкага. Як заўсёды, фашысты выкарысталі гэтую тэрарыстычную падзею супроць кампартыі, супроць рэвалюцыянераў. У Картуз-Бярозе, на Брэстчыне, у пераймане Гітлеру, узнік канцэнтрацыйны лагер.

Асаднікі паставілі ў Глушцы помнік Пілсудскаму ў гародчыку ля гміны. Ён прастаяў толькі адны суткі. Ранкам людзі ўбачылі бюст з адламанай галавой, а на мармуровым п'едэстале, на прыклеенай паперы, былі напісаны вялікія літары, якія складаюць два словы — адно кароткае, а другое большае: «No pasaran!»

Усё было пастаўлена на ногі ў фашысцкіх логавах. Камендант валаснога пастарунка кат Дарванскі лётаў з узброенай світай па вёсках і збіваў да паўсмерці падазроных. Так быў збіты ў Запалянцы былы камандзір эскадрона часоў грамадзянскай вайны таварыш Грыб. Пасля катавання ён злёг у пасцель надоўга.

[1] Лозунг — кліч іспанскіх рэспубліканцаў у час вайны з фашыстамі ў 1936—1938 гг.— «Не пройдуць!»

Страціў і Нічыпар Байдак, вясковы палітык, апошнюю кароўку. Забралі за падаткі. Ён стаіць на сваім полі ля дарогі. Поўная сявенька жыта насыпана, настаўлена на мяшок. Конь з бараною адпачывае, угнуўшы галаву. На мураве сядзіць Ануфрэй Чарняк і папыхвае люлькай. Недалёка сее жыта Макар Краўчук, памагае яму Люба. Стоячы пры дарозе, яна глядзіць, як Макар пайшоў па загону, раскідаючы зярняты. Белая хустка мігціць на сонцы, і ветрык прытуляе плацце Любы да ног. А яна стаіць, быццам благаслаўляе кожны след свайго мужа-сейбіта.

Нічыпар скардзіцца Ануфрэю на свой лёс, гаворыць аб тым, як адабралі ад яго карову на рынку ў Глушцы, як потым ён ледзь не плакаў перад людзьмі і ўсё гаварыў тое самае — сваё: «Павінны ж яны такі ўцячы за Буг». Паліцыянт схапіў старога Нічыпара ззаду за каўнер з крыкам: «Ты што тут гаворыш, стары д'ябал?» І пагнаў у пастарунак.

— Як я ім скажу: «За Буг!», яны мне ў плечы — бух! І так набухалі мне, колькі ўлезла,— расказваў Нічыпар.

— На чорта табе было паўтараць гэтае «за Буг», сказаў раз, і даволі,— дакараў Нічыпара Ануфрэй.

— Узлавалі. Тут пайшло ўжо ў задор,— апраўдваўся Нічыпар і працягваў расказваць далей: — Перасталі яны мяне біць, устаў я ды і кажу ім тое самае: «Такі ж мусіце вы ўцячы за Буг!»

— І што? Зноў пачалі бухаць? — пытаўся Ануфрэй.

— Не. Толькі сказалі: «От, пся крэў, стары д'ябал! Ідзі прэч адгэтуль!» А мне толькі гэтага і трэба. Узяў я сваю шапку і пайшоў.

— Мм...— замармытаў Ануфрэй,— такі ж на сваім паставіў... Ха-ха-ха! — засмяяўся стары «рыцар» і закруціў галавою.

Нічыпар глянуў навокал па полі і сказаў, як праз нос:

— Невядома, як там будзе ў той Іспаніі...

Потым пачаў клікаць Макара:

— Го-го!.. Хадзі сюды!

Калі падышоў Макар, Нічыпар спытаўся:

— Скажы, Макар, у якім баку Іспанія?

Макар узмахам рукі паказаў напрамак. Нічыпар доўга глядзеў на паўднёвы захад. Хацеў, каб даляцелі да яго вушэй гарматныя кананады гераічных атак рэспубліканцаў — кананады свабоды.

Адарваўся вачыма ад небасхілу Нічыпар і сумна закруціў галавою:

— Далёка... Не пачуеш,— прамовіў ён, уздыхнуўшы, і ў сваёй прастацэ душэўнай дадаў: — Каб там перамаглі нашы, то, можа, нам тут палепшала б.

Затым заглядзеўся на ўсход.

— Ціха... Не чуваць, не ідуць... Усё роўна як замуравалі гэтую граніцу. Ні гуку адтуль, ні стуку. Няўжо-такі?.. Не, не можа быць... Прыйдзе Чырвоная Армія, прыйдзе... Не можа быць, каб не прыйшла!..

— Ого-о-о! — працягнуў Анупрэй,— каб тое свята прыйшло, заскакалі б лес і горы. Мы тады сваіму Барсучку рукі звязалі б...

Так сябры, гутарачы, рыхтавалі да прыходу вызвалення меркі справядлівасці для ворагаў. Раптам Нічыпар, глянуўшы ўздоўж дарогі, ускрыкнуў:

— Стой!.. Бачыце?

І паказаў на дарогу. З-за горкі на веласіпедзе мільганула паліцэйская шапка. Макар зараз жа падышоў да Любы, а Нічыпар з Анупрэем узяліся за сяўбу.

Нічыпар ішоў з сявенькай, а Анупрэй — за бараною. Азірнуліся — пазналі камендатнта Дарванскага.

У слонімскай дэфензіве закатавалі насмерць і выкінулі на дарогу ў полі камсамольца Мікалая Гуда. З гэтай прычыны камуністы вывесілі сцягі на шляху.

Паліцыя шукае цяпер «крамольнікаў». Солтыс Барсук паказаў, вядома, на Макара. Вось Дарванскі і прыехаў. Цяжкая табе доля будзе, Макар! Выкручваўся ты дагэтуль спрытна. Нават солтыса Барсука трымаў у жорсткіх руках. Солтыс баяўся Макара. Аднак, баючыся, рыхтаваў яму пастку. Дарванскі ўжо куе рукі Макару, а Люба крычыць і плача. Драпежны, ненаедны кат Дарванскі сам прыехаў скаваць Макара, ужо і паліцыянтам сваім не давярае.

— Будзеш бегчы за мной прывязаны да веласіпеда. Калі не захочаш, то застанешся тут на полі з куляю ў лбе. Зразумеў? Мы цябе, птушка, даўно знаем,— скончыў кат Дарванскі і сеў на веласіпед.

Усе, хто быў на полі, правялі іх сумнымі, цяжкімі позіркамі. Макар увесь час бег за веласіпедам, не нацягваючы кайданнага ланцуга.

Веласіпед знік за горкай, і на полі стала ціха і змрочна. У гэтай цішыні здавалася, што ўздыхала зямля. Людзі папляліся на поле працаваць.

...Стрэл — адзін... другі, трэці... спалахнулі цішыню над палямі.

Бегчы Макару з горкі не так ужо было цяжка. Але

йа гару запірала дух. Ланцужок пачынаў нацягвацца. Макар ужо залiваўся потам. Прыглядзеўся ён да тых спружын пад сядзеннем веласiпеда i надумаў: «Няўжо яны такiя моцныя?»

Веласiпед, пераваліўшы горку, лёгка пакацiўся ў далiну. Становiшча для Макара стала выгодным. Ён iрвануў ланцуг з усёй сiлы, i спружына лопнула, адламалася. Макар скаванымi рукамi, на якiх там, дзе б'ецца пульс, вiсеў кайданны замочак, адным махам зваліў Дарванскага на зямлю разам з веласiпедам. I тады пачаў уцякаць у напрамку ляска дзядзькi Анупрэя. Дарванскi, вылезшы з-пад веласiпеда, выпусцiў услед па Макару ўсю абойму са свайго рэвальвера. Але ў Макара не трапiла нi адна куля.

— Уцёк!.. Уцёк!..— крычаў Анупрэй Нiчыпару, iдучы за бараною, а потым крыкнуў тое самае i Любе, якая дасявала свае жыта.

Тры днi лазiла палiцыя з сабакамi па ляску Анупрэя, абмацала кожны корч, кожны куст, але Макара не знайшла. Тады абшукала пералескi ўздоўж глухога шляху, але i там не натрапiла на Макара. А ён, Макар, наадварот, хаваўся не ў лесе, а ў полi, хаваўся на ўзгорку, у ямах, зарослых палыном. Адтуль ён бачыў, што робiцца навокал.

Згаладнелы за тры днi, прыйшоў ён на чацвёртыя суткi ўначы да дзядзькi Анупрэя, якi i распiлаваў яму ланцуг напiльнiкам. Была выклiкана Люба. Макар узяў на дарогу хлеба, развiтаўся з Любай, дзядзькам Анупрэем, а ў думках i з усёй Запаляпкай i падаўся ў Дзяды шукаць свайго сябра Антона Данiлюка.

Уцёк Макар, пайшоў. А за iм дарогi зашумелi ўслед пералескамi, лясамi, вышумлiваючы адно i тое: «No pasaran!»

Мiкiта Лазун таксама дачуўся пра гэтыя цудадзейныя словы: «No pasaran!» Ён быў на адкрыццi помнiка Пiлсудскаму ў Глушцы. Усё там iшло як след, нават сам старостa выступаў. Iграў «Першую брыгаду» аркестр, дзе распiнаўся на кларнеце цырульнiк Ёшка. Потым нават выпiць далi. I раптам праз адну ноч галава адляцела ў помнiка, а на п'едэстале з'явiлiся таямнiчыя словы: «No pasaran!»

Мiкiта таямнiча пытаецца ў людзей, што гэта за словы. Можа, гэта чыё-небудзь прозвiшча цi заклiнанне? Калi ж, урэшце, даведаўся, адкуль яно прыляцела, то не толькi задумаўся, але нават спалохаўся.

— Аж адтуль яно прыляцела? Гэта ж, мусіць, далёка тая Іспанія? А бачыш...

Усё роўна Мікіта зразумеў словы «No pasaran!», як заклінанне. Ён сумны сядзіць з солтысам Барсуком на прызбе сваёй новай хаты. Абодва думаюць, гадаюць, ад чаго памёр жабрак Рыгор Малахай. Нядаўна знайшлі яго мёртвым пры дарозе, недалёка ад Глушца. Гэта зрабіў не інакш, як той самы «пасаран». Гэта, мусіць, такі чалавек ходзіць па свеце, чалавек, якога трэба баяцца. І абодва «начальнікі» сапраўды адчуваюць страх перад невядомым «пасаранам».

Мікіта гатоў прыпісаць яму і тое, што ў яго, Мікіты, у засеку жыта згніло: збіраў, збіраў — адзін год, другі, Кузьме на боты шкадаваў, і на́ табе — узяло і напрэла. Сушыць Мікіта цэлыя гурбы зярнят, а людзі кажуць, што з гэтага жыта хлеба не будзе. Хіба толькі коней можна карміць. Ну і пасаран, што ён нарабіў. Пасаран адным спрыяе, а другім не.

Ён наспрыяў Макару ўцячы з рук Дарванскага. Моцны гэты пасаран!

Асабліва баіцца Макара солтыс Барсук. Думаў, што пазбудзецца гэтага, як ён называў, прыблуды, а тут і не выйшла.

— Спаліць яшчэ... Што ты яму зробіш? — дадае страху Барсуку Мікіта. Барсук адказвае:

— А што думаеш? Яму нядоўга...

Мікіта пазірае на палі, потым пад страху сваёй хаты. Ён аддзяліў сына, лесніка, які застаўся жыць у старой хаце. Мікіта пабудаваў сабе новую на хутары, ажаніўся з крывабокай бабай, якой, як кажуць людзі, ён выдзяляе хлеб на кожны дзень. Кузьму аддзяліць не захацеў, не дазволіў жаніцца. Кузьма не вытрымаў бацькоўскага здзеку і паехаў у Латвію. Прыязджаў адтуль вярбоўшчык на работы да латышскіх памешчыкаў, і Кузьма падпісаў кантракт на адзін год.

Яшчэ ім абодвум — Мікіту і Барсуку — замінаюць некалькі чалавек у Запалянцы. Трэба пазбавіцца ад іх, і тады можна будзе мець дармавых парабкаў. Бо пакуль што Канцавому Міхасю, батраку, трэба плаціць, бо і ён, не баючыся Мікіты, адзін раз сказаў:

— Калі ўжо надыдзе тая леваруцыя?

— Бачыш, што яму ў галаве? — кажа Мікіта Барсуку.— Я яго хлебам кармлю, а ён табе ліха думае.

— Яшчэ каб гэтага інваліда... музыку...

— А Ціханчук? Гэтая гадзюка Тацяна ўсім бы вочы павыдзірала...

— А самога Дзям'яна чаму мінаеш? — пытаецца Барсук,— ад яго ўсё ліха, толькі ад яго...

— Нейкі партрэт вісіць у Кацярыны Касцевіч... Яшчэ сын павесіў. У мінулую нядзелю Дарвапскі з нейкім панам у цывільным гаварылі аб ім. Быццам гэта нейкі мяцежнік,— тарочыў Мікіта.

— Можа, гэта і ёсць той самы пасаран? — кідае здагадку Барсук і дадае:— Дарвапскі, калі арыштоўваў другога сына Кацярыны, сарваў партрэт і, кінуўшы, тантаў нагамі. Шпік, што рабіў вобыск, сказаў: «Радзішчаў, зняць яго!»

— Дзярышчаў,— кажаш?

— Ага... Так і сказаў: Дзярышчаў...

— З сабою яны яго не забралі?

— Не. Кацярына падхапіла з зямлі, пазбірала шкло. Мусіць, схавала...

«Начальнікі» задумаліся. Напэўна, нейкая сіла ёсць у тым партрэце, калі схавала яго Кацярына, маці «дзяржаўнага злачынцы» Андрэя.

— Я, калі буду ў пана графа ў маёнтку, спытаюся, ён павінен ведаць... Дзярышчаў, кажаш? Каб не забыцца... Каб ён нам тут чаго не надраў?..— трэба пільнавацца...

— А як ты думаеш,— спытаўся Барсук,— пра гэтую польскую лекарку Квяткоўскую? Уліпла да куртапогага і жыве.

— А куды ж ёй падзецца? Я ёй казаў, каб ішла жыць да мяне. Не хоча. Быццам з шахцёраў яна паходзіць. Вядома, на зямлі ёй працаваць не даводзілася.

— Трохі ж памагае Петрусю...

— А! Што там памагаць? Там кошка ўсё парабіла б. Прыкрываецца за ёю Хадыка,— вось што галоўнае. Паліцыя да яе не чапляецца. Палячка.

— Охо-хо...— уздыхнуў Барсук.

— Охо-хо...— уздыхнуў і Мікіта і пачаў гаварыць, што вечарамі вельмі чырвоны месяц узыходзіць.

— Не інакш, як на вайну...

— Вайна будзе,— таямніча кажа Мікіта,— пан граф казаў, што немец хоча знішчыць усіх бальшавікоў у Расіі.

«Начальнікі» перавялі гутарку на Глушэц. Ксёндз Абнорскі з амбона заклікае настаяць за польскасць, за хры-

сціян у гандлі. Польшча павінна быць для палякаў, бо яны за яе змагаліся ў легіёнах.

Мікіта і Барсук перайшлі на гаворку аб дарагоўлі.

— Падумаць... цвіка нельга купіць, кавалка жалеза. Усё здаражэла,— гаворыць Мікіта.

— А ўжо аб тканінах на якую кашулю і казаць няма чаго. Не дакупішся,— дадае Барсук.

— Усё яны, гандляры, лупяць з нас скуру, як хочуць...

У гэтым «начальнікі» не памыляліся. Сапраўды, усе прамысловыя тавары былі настолькі дарагія ў параўнанні з сельскагаспадарчымі, што нельга было думаць аб кашулі, аб новых плугах, баронах...

* * *

Выкарыстоўваючы крызіс, чорная сотня ў Глушцы рыхтавалася да чорнай справы.

Спачатку на парозе кожнай яўрэйскай крамы стаў п'яны наймiт і не пускаў пакупнікоў. Гэта азначала: ідзіце купляць у крамах польскіх.

Чорная хмара над Глушцом насоўвалася ўсё больш і больш. Яўрэйскія саматужнікі: шаўцы, балаголы, краўцы, рымары, кавалі, на ўсякі выпадак, рыхтавалі дружыну для адпору. Яўрэйскія пагромы, якія пракочваліся па ўсёй Польшчы, пачалі даходзіць і на «крэсы». Асабліва адзначалася пагромамі тая частка Польшчы, якая была ў свой час пад Германіяй,— Познань, Памеранія.

Ксёндз Абнорскі вырашыў, каб і Глушэц не адстаў. Кожны дзень прыносіў весткі аб непаладках ва універсітэтах у Кракаве, Познані, Варшаве, Вільні. Студэнты-яўрэі стоячы слухалі лекцыі, але пакідаць універсітэт не хацелі, як ні стараліся іх выгнаць польскія шавіністы.

Страшны дзень надышоў і для Глушца.

...Спярша ў канцы галоўнай вуліцы звінела нешта такое, як быццам хто каціў па бруку жалезны лом або трубу. А потым... потым трэск ад ламання дзвярэй, звон пабітага шкла. І мітуслівыя крыкі, у якіх можна было пачуць гарлахвацкі смех злараднай жывёлы. Адкрываліся зубастыя сківіцы — бандыты ржалі, як коні, калі ад аднаго ўдару ломам вылятала акно, а ад другога падаў сам гаспадар крамы. На вуліцу з крамаў ляцелі тавары: каробкі з гузікамі, ніткамі, флаконы з адэкалонам, духамі, рэкламныя каробачкі з пудрай, стосы паперы, лінейкі,

ґатавальні, чарніла. А потым пайшлі скруткі ткапіны, за імі вырабы з жалеза... Гандляры, узняўшы рукі, уцякалі ў напрамку сінагогі.

Дружына на чале з шаўцом Давыдам ударыла на пагромшчыкаў з завулачка, ударыла знянацку. І на момант усё было прыціхла. Пагромшчыкі не чакалі такога адпору. Давыд крыкнуў:

— Разыдзіцеся, а то ад вас тут застанецца мокрае месца.

Усе ведалі асілка Давыда. Пагромшчыкі спыніліся, пазіраючы на яго, у нерашучасці. Але сальнік Карнікевіч раскрыў сваю зяпу і раўнуў:

— Што-о-о? Бі іх! Чаго раты разявілі?!

Бойка пачалася заўзятая. Біліся каламі, хапаліся загрудкі. Найбольш храбрымі аказаліся балаголы. Каб не яны, дружына Давыда была б пабіта. А так — пагромшчыкі пачалі ўцякаць. Як ні крычаў Карнікевіч, пагромшчыкі пабаяліся. Тады на дапамогу, схаваныя за брамамі дамоў, выйшлі паліцыянты і пачалі гумавымі палкамі адціскаць дружыннікаў. Тым часам пагромшчыкі ўсім натоўпам прарваліся наперад. З наступнага квартала пагром пачаўся нанава. Дружыннікі вярнуліся ў завулачак, каб абысці квартал і ўдарыць па пагромшчыкаў зноў. Але імпэт пагрому да таго быў імклівы, што, здавалася, ідзе нейкая страшэнная машына і ўсё трушчыць пад сабою.

Пакуль дружыннікі дабеглі да галоўнай вуліцы, бандытаў спыніў толькі адзін чалавек. Ён, як асілак з гераічнай казкі, вырас на вуліцы з молатам у руцэ і ўсё рос і рос у вачах пагромшчыкаў.

Гэта быў каваль — стары Міхал.

Ён, высокі, з пасівелымі скронямі, у скураным рабочым фартуху, стаяў з узнятым вялікім молатам, гатовым у кожную хвіліну апусціцца на галовы бэстыяў.

— Ні з месца, кажу вам!.. Ні з месца, бадзягі!..— крычаў Міхал.— На маім трупе... на маім трупе пройдзеце... Чуеце, па маім...

Але тут падаспелі дружыннікі. Паліцыя ўжо не дала рады. Міхал усё стаяў на тым самым месцы і крычаў:

— Так іх! Вось так іх!

Пагромшчыкі адступілі, і паліцыя дала каманду разысціся.

Дружыннікі пайшлі ў канец вуліцы і завярнулі на яўрэйскія могілкі. Там іх павінен сустрэць Якаў, сын Міхала.

Ідучы праз могілкі, Давыд заўважыў ля аднаго магільнага помніка скурчанага на зямлі чалавечка ў шэранькім касцюмчыку.

— Го! Бачыце, які ваяка!

Дружыннікі ўбачылі Ісэра Цукермана і зарагаталі.

— Што, цябе ў турме навучылі так хавацца? Га? — наступаў Давыд.

— Што ты ад мяне хочаш? — агрызнуўся Цукерман, грызучы пазногці.

— Я хачу сказаць табе, што ты слізняк. Чаму не бараніў свайго магазіна, дзе ты кожны дзень абціраеш трыбухом прылавак? Ты ведаеш, што стала з тваім магазінам? Карнікевіч — у рот... і няма... Пустое месца засталося.

— Ты свіння! — крыкнуў Цукерман.— Ты мне не ўказ!

Давыд акінуў вачыма прыціхлых дружыннікаў і спытаўся:

— Што з ім зрабіць?

А потым ніхто і не прыкмеціў, як Цукерман закруціўся ў паветры, нібы млынок, і лёг трыбухом на шырокую далонь Давыда.

Давыд трымаў Цукермана на выцягнутай руцэ і гаварыў:

— Я табе не ўказ? Ты думаеш, што адкупішся ў Карнікевіча і цябе не зачэпяць? Дык мы цябе зачэпім.

Цукерман трапятаўся, а Давыд прыціскаў яго да сябе і адмерваў з размаху па мяккаму месцу ляпча за ляпчом пад нястрымны рогат дружыннікаў.

Нехта праз смех сказаў:

— Даволі...

Давыд спыніўся, глянуў на плот. Ён быў невысокі. Тады гушкануў Цукермана на руках раз і два...

Шэрая асоба купецкага сынка паляцела за плот.

* * *

Твар у Івана Падалякі пабрынялы, жаўтавата-бледны. У вачах дзікія агеньчыкі, агеньчыкі бяссілля. У пашарпанай салдацкай гімнасцёрцы два гузікі на каўняры расшпілены, і кадык выпучаны, як быццам там засела бульбіна. Па чорных валасах працягнуліся дзе-нідзе сівыя валасы, нібы пахаваліся белыя ніткі. Сярод жоўтых ад нікаціну зубоў з правага боку чарнее шчарбіна — няма ўжо аднаго зуба.

Затое ружовым выглядае Барыс Капапец. Гэтаму ўсё ідзе на здароўе. Працаваў зборшчыкам падаткаў, але спалохаўся камуністаў і кінуў. Потым быў прыняты на шасэйную дарогу наглядчыкам. Але там рабочыя яго пабілі за ашуканства пры запісе днёвак і за даносы на рабочых інжынеру. Некаторы час жыў у вёсцы, прыходзіў п'яны на вечарынкі і разыгрываў з сябе хвата-забіяку.

Аднаго разу ў карчме Шчыгельчыка ён пазнаёміўся з сальнікам Карнікевічам. Яны спадабаліся адзін аднаму. Гаварылі пра галоўнакамандуючага Мікалая Мікалаевіча, пра генералаў, купцоў і пра цэрквы. Карнікевіч лічыў Капанца ўсёзнайкам.

Часам да іх прысаджваўся былы станавы прыстаў Лаўскі, які ведаў не толькі «свод законов», але і сілу лекавых траў, пра якія любіў расказваць. Лаўскі ходзіць яшчэ ў старым прыстаўскім шынялі. І кепку носіць па-прыстаўску — набакір.

Ён ужо стары і не працуе. Служыў у гарадскім судзе, але звольнілі за п'янства. Нос Лаўскага, як аглобля, зеленавата-сіняватага колеру. Хоць Лаўскі і беспрацоўны, але сваёй прафесіі не кідае. Носіць з сабою на шнурку чарніліцу з чарнілам, паперу ў папцы, ручку з пяром і дзве кніжачкі. Адна — грамадзянскі кодэкс, другая — крымінальны. Ён праседжвае ў карчме Шчыгельчыка цэлыя дні, чакае, пакуль хто-небудзь з мужыкоў папросіць яго напісаць прашэнне ў суд або ў староства. Вось тады Лаўскі і паказвае, на што ён здольны,— дэманструе перад сялянамі ўсю магічную сілу бюракратычных штучак. Па-першае, трэба ўмець надзець акуляры на нос. Доўга ён дзьме на шкельцы, працірае іх хустачкай і зноў дзьме і чысціць. А сам спакваля абводзіць позіркам сялян, якія павіслі барадамі над сталом і з цікавасцю сочаць за кожным яго рухам. Лаўскі добра гаворыць па-беларуску.

— Запыліліся, халера на іх... Гэтым акулярам... Колькі ўжо?..

Лаўскі ўзнімае бровы, глядзіць у столь, каб прыпомніць, колькі ж год гэтым акулярам.

— Калі я служыў у Пінску прыставам першага стапу, вось тады... Гэта было ў дзевяцьсот дзесятым годзе. Трэба было б змяніць, але...

Лаўскі махае рукою і чапляе на нос акуляры.

Перад старымі сялянамі адразу вырастае «пан прыстаў» з характэрным жандарскім ілбом, крыху падобным на лоб цара Мікалая другога. Лаўскі раскладвае паперы,

вымае скамечапую пасавую хустачку і прачышчае нос з такім гукам, быццам хто ў карчме Шчыгельчыка стрэліў...

— Катар... Каб яго халера,— быццам няўзнак кідае Лаўскі і разгладжвае нажоўклыя знізу вусы.— Т-а-а-к... У цябе, Сідарчук, значыць, справа... Суд за дровы... ммм... ага...

Лаўскі доўга махае пяром над паперай. Сяляне пераглядваюцца паміж сабою. Калі ж будзе канец гэтаму маханню?

Першая літара пастаўлена каліграфічна, і да яе радком пачынаюць далучацца іншыя.

Селянін расказвае сваю справу. Лаўскі піша і мімаходзь устаўляе:

— Гэта па сто дзесятай стацці... Гм-м... Прашу пана суддзю... Так, так, па сто дзесятай. Хто напісаў пратакол?

— Ды хто ж? Ляснік... Апанас Хмель.

— Ага... Так і запішам.

Селянін гаворыць далей:

— Ездзіў у лес з дачкою. Яна і нагу параніла сякерай. А тут яшчэ і на суд...

— Нагу параніла? — пытаецца Лаўскі і адразу перастае пісаць. Акуляры ўзлятаюць на лоб.— Гэта пусцяк. Раз-два можна залячыць. На глушэцкім шляху растуць два бальзамінавыя дрэвы. Почкі з іх трэба настаяць на гарэлцы і настойкай памазаць рану. За два дні зажыве... Ого, бальзам...

Прытуліўшыся да печкі спіною, стаіць гаспадар карчмы Шчыгельчык. Ён слухае і захапляецца лекавай сілаї раслін:

— Ах, госпадзі, госпадзі... Гэткая ж сіла на свеце...

А Лаўскі вядзе сваё:

— Ведаеце, ля дарогі растуць калючыя шышачкі, круглыя. Ну, тыя, што чапляюцца за вопратку. Гэта ж такія расліны... Калі жанчыне трэба радзіць, даць ёй гарэлкі, настоенай на гэтых шышачках, і палягчэе. Чалавек з'явіцца на свет без каніцелі. Ф-і-і-ць!.. і гатова...

— Ах, госпадзі, госпадзі...— ківае галавою Шчыгельчык.

А сяляне, тоячы ў вусах усмешкі, ужо не вераць Лаўскаму. А Лаўскі разгаварыўся:

— Калі я служыў у Пінску прыставам першага стану, мая жонка раджала дзяцей лёгка... Вось гэтыя шышачкі намагалі. Раз-два... і гатова. Фі-і-ць!

Селянін просіць пісаць прашэнне далей.

— Ага... гм-м...— гугнявіць Лаўскі, схіляючыся над паперай.— Значыць... Ананас Хмель... Добра, запішам...

Акуляры спаўзаюць на кончык носа, і пяро скрыпіць па паперы.

Прашэнне напісана. Лаўскі паказвае селяніну, дзе распісацца, і складвае прашэнне акуратна — вугалок да вугалка.

— Колькі ж вам, пане Лаўскі?

— Колькі? Сам знаеш, колькі... Пяцёрку...

Пакуль селянін развязвае вузялок запошанай хустачкі, каб адтуль дастаць пяцёрку, Лаўскі паспявае нагаварыць пра падвор'е, пра дарагавізну, палаяць яўрэяў і стукнуць кулаком па стале:

— Эге! Пекалі яны дрыжалі перада мною...

Атрымаўшы пяцёрку, Лаўскі адразу ж крычыць Шчыгельчыку, як у тыя добрыя старыя часы:

— Антон! Налі стопачку!

Адным махам перакульвае стопачку, выцірае вусы, крэкае і пачынае збіраць паперы.

— Па сто дзесятай стацці цябе павінны апраўдаць,— тонам апекуна гаворыць ён, развітваючыся з селянінам.

...У карчме Шчыгельчыка шумна. Гэтага не бывала даўно. Падаляка і Кананец сядзяць за сталом, кураць, як быццам каго чакаюць. Пагром ужо скончаны. Чаго ж можна чакаць? На ганку пачуўся такі гук, нібы недзе далёка ішоў бык і роў. Дзверы адчыніліся з трэскам, і з перавязанай галавой увайшоў сальнік Карнікевіч.

— Што? Дасталася трохі? — спытаў Шчыгельчык.

— Табе не дастанецца. Стаў гарэлку на стол. Перамога наша.

Карнікевіч кінуў вокам па сталах.

— А-а! — знаёмыя...— і падаўся да Кананца і Падалякі.

— На мой рахунак сёння! Толькі на мой! — выгукнуў сальнік і сеў за стол.

П'е Падаляка, крывіцца, але п'е. Чокаецца з сальнікам і не бачыць, што паміж сталоў ідзе Захар Зубец. Ён дайшоў да прылаўка, нешта купіў сабе паесці і накіраваўся да выхада. Толькі тады Падаляка заўважыў Захара, але зараз жа адвёў вочы.

Як жа не піць Падаляку, калі сальнік Карнікевіч абяцае яму дапамагчы адкрыць сальную краму?

— Мы яшчэ паваюем! — крычыць Карнікевіч, пляскаючы Падаляку па плячы.— Афіцэры нам патрэбны!

І зараз жа звяртаецца да Капанца са словамі:

— І адвакаты таксама! З Дарванскім у мяне дружба. Усё зробім...

* * *

Захар Зубец, пабыўшы ў Якава Кушалевіча, вяртаўся дахаты з Глушца пехатою.

Цяжка ў Захара на сэрцы. Калі не апусцелі, дык парадзелі рады камуністаў. «Бачыш, што робіцца з людзьмі,— думае Захар пра Падаляку і Капанца,— чула маё сэрца яшчэ даўно, што так будзе. Падрыхтуем жа мы вам добры пачастунак. Будзе вам, здраднікі...»

Прыходзіў нядаўна да Захара Дзям'ян Гарагляд. Казаў: «Ратуйце, рабіце што-небудзь, а то загінем... Апусцела вёска ад добрых хлопцаў. Макар уцёк ад Дарванскага і невядома калі вернецца...» Вырашылі, каб Дзям'ян у вёсцы арганізаваў старых дзядзькоў і каб гэтыя дзядзькі сачылі за жыццём сваёй вёскі і выступалі на сходах за справядлівасць. З падаткамі секвестратары ашукваюць, бяруць, колькі ўдаецца. І не разбярэшся з імі, бо гэтых падаткаў незлічоная колькасць. Вось і трэба аб усім гаварыць на вясковай радзе.

Ішоў Захар хуткаю хадою. Нават крыху спацеў. Скінуў шапку, каб сонца абагрэла галаву. Хочацца спыніцца Захару, асабліва на ўзгорку. Ён і спыняецца. Ніколі гэтага не рабіў, а цяпер хочацца глянуць на свет, каб адпачыць грудзьмі. Калі спыніцца, так і застыне ў задуме, звесіўшы галаву. Так часам стаіць пры дарозе адзінокая плакучая бяроза, і яе апушчаныя долу галіны нагадваюць валасы на задуманай галаве селяніна. «Няўжо ўсё прапала ці прападзе? — думае Захар.— Не, не можа быць... трэба шукаць новыя сілы, трэба асцярожна іх шукаць. Адны загінулі, і, можа, вецер іх костачкі развеяў. Другія ў турмах. Андрэй, Паддубны, Кухта... Застаўся Марцін. Ды што ты з ім зробіш? Яго трэба цягнуць на паверку. Тэрор, пагромы. Не, Дарванскага мы ўсё-такі знішчым. Няма іншага выхаду. Ужо нямала нашых людзей ён адаслаў на той свет... Так і будзе адсылаць далей...»

Прыняўшы такое рашэнне, Захар нібы абудзіўся ад сну — надзеў шапку і бадзёра пакрочыў па дарозе. Праклінаючы Падаляку і Капанца, не ведаў Захар, што яны ў дадатак да ўсяго ў час выбараў у сейм у 1935 годзе пісалі ліст фашысту Акінчыцу ў Вільню: «Просім вас вы-

слаць грошы на выбары. Мы падрыхтавалі ўжо шмат людзей, каб галасавалі за санацыю. Прышліце хоць 500 злотых, бо як не прышлеце, то не атрымаеце паводнага голасу. Ведаеце, мае паночкі, трэба, каб і вясковая інтэлігенцыя зарабіла хоць у пяць гадкоў на боты. А то босаму даводзіцца прапаведаваць галодную ідэю...»

Невядома было яшчэ Захару, што кат Дарванскі пасля таго, як ад яго ўцёк Макар Краўчук, знік з Глушца — пераведзены ў Львоў.

* * *

Ходзіць з дубальтоўкай па лясных дарогах Апанас Хмель. Выйшаўшы з турмы, зрабіўся леснікам у дзяржаўным лесе. Некаторыя хлопцы-камуністы былі памкнуліся да яго. Думалі, можа, ён уключыцца ў работу, можа, ён за час свайго адшчапенства, апазіцыі ў турме адумаўся і вернецца на правільную дарогу. Апанас толькі буркнуў у адказ:

— Што мне тут з гэтай шантрапою рабіць? Я маю свае сувязі з ЦК.

Апанас Хмель застаўся тым самым Хмелем. Наняўся за лесніка, хоць хлопцы казалі, што нягожа камуністу быць дзяржаўным леснікам. Усіх леснікоў урад робіць канфідэнтамі. Пры агульным збядненні сялянства непазбежны ўзброеныя сутычкі з сялянамі ў лесе, бо яны не маюць чым плаціць за дровы і будуць ездзіць у лес, каб браць іх і не плаціць.

Апанас застаўся тым, чым быў — прыкрывае сябе імглой таямнічасці. Ён адзін толькі мае нейкі сакрэт, ад чаго залежыць лёс свету. Толькі вось розная «шантрапа» не дае яму магчымасці правесці свой сакрэт у жыццё. Але час для Апанаса прыйдзе, тады пабачаць, што такое Апанас.

Усё ж такі нядобра на душы ў Апанаса. У вачах панурыя агеньчыкі. Яму б хацелася цяпер помсціць усім за тое, што не паслухалі яго, помсціць за свае няўдачы. Але як адпомсціш, калі нельга ўжо так лёгка ствараць «сваю армію», збіраць «камсастаў»? І Апанас, на свой лад, знайшоў новую магчымасць, каб усе навакольныя вёскі адчувалі яго руку. Наняўся леснікам. Гэта ж усім вядомая, нявінная пасада. Сялянства ад веку адносіцца да леснікоў з пашанай і бояззю, бо ад іх залежыць многае. Служачы леснікам, можна пажывіцца ад сялян і падарваць каго хо-

чаш, можна ствараць свае каварныя змовы, плесці інтрыгі. Апанасу такое становішча падабаецца. Але як ні круці, як ні прыкідвайся «нявіннасцю пасады», Апанас Хмель пайшоў падпіраць сваім плячом падмытую ўжо дзяржаўнасць фашысцкай Польшчы.

Ходзіць Апанас з дубальтоўкай па лясных дарогах. І дзіўна — не цешыць яго асенняя задуменнасць лесу. А лес якраз такі маўклівы, што чуваць, як адзін лісток з шолахам прабіраецца ад самага верху праз галіны, каб упасці на зямлю.

Апанас баіцца кожнага шолаху, хапаецца за дубальтоўку. Падыходзіць ён да скрыжавання лясных дарог. Там стаіць слуп, на якім прыбіта бляха, а на блясе растапырыў крылы белы арол. Пад ім надпіс: дяржаўныя лясы. А далей называецца галоўнае лясніцтва і лясніцтва. Апанас кожны дзень прыходзіць да гэтага слупа, бо ён стаіць на мяжы дзяржаўнага лесу. Гляне на арла, прачытае надпісы і вяртаецца назад. Слуп акупанцкай дзяржаўнасці ў парадку — можна спакойна ісці дахаты.

А сёння Апанас штосьці доўга не адыходзіць, глядзіць на арла, пераводзіць позірк на фундамент слупа і чмыхае носам. Белага арла не пазнаць — ён зрабіўся дзіравым, як рэшата. Сам слуп нахілены набок. Хтосьці шротам расстраляў акупанцкага арла. Вось бяда. Але хто? Пад бляхай прыбіта дошчачка, а на ёй напісана: «Но пасаран!» Аж шарахнуўся Апанас ад слупа і нават агляпуўся. Ён ведаў, што значыць слова «но пасаран». Яно дыхнула яму з лесу і напомніла, што сілы ў народзе не спяць.

Апанас прыкінуўся сам перад сабою бязгрэшным «рабом божым», які ні перад кім ні ў чым не вінаваты. Пачаў наракаць на «нядобрых» людзей: «Нават дзе дадуць зарабіць кавалка хлеба. Усюды ворагі, не даюць жыць... Псуюць мне пагоду проста пад носам... Пачакайце, і я ўмею псаваць...»

Не чакаючы ні хвіліны, Апанас Хмель пайшоў у лясніцтва, каб заявіць аб усім ляснічаму, толькі самому ляснічаму. Апошняе ўжо разагравала Апанаса — надышоў момант паказаць сябе. Няхай ведае ляснічы, што Апанас Хмель не абы-што. «Я ўжо ведаю, хто зрабіў такую штуку. Гэта мне на злосць. Я яму пакажу палітыку...»

Назаўтра рана на падворак Аляксея Вераса завіталі Апанас Хмель з двума леснікамі і двума паліцыянтамі. Шукалі нібы крадзенага дрэва, а па сутнасці прыглядаліся, ці не тарчыць дзе пад страхою дубальтоўка.

Аляксей кінуўся з Апанасам у сварку, прагнаў з падворка. Аляксей ведаў натуру Апанаса, але такога спосабу помсты, як выдумаў яму Хмель, ён не чакаў. Аляксей сварыўся, а Апанас маўчаў і паказваў леснікам пальцам:

— Паглядзіце пад ламаччам. Можа, там ляжыць які кругляк?

— Вымятайся вон з майго падворка! — крычаў Верас.— Ты паклёпнік, сабака!

— Добранька пад ламаччам пашукайце,— тыцкаў пальцам Хмель, наводзячы леснікоў.

Паліцыянты тым часам рабілі вобыск у хаце.

Усім у вёсцы стала зразумела, што Аляксея Вераса могуць забраць у Картуз-Бярозу. Няважна, што не знайшлі нічога пры вобыску. Хопіць аднаго падазрэння.

Апанас Хмель умеў пісаць пратаколы, нават росчыркамі пяра на паперы наводзіў страх на сялян. Быў гэтым здаволены.

Вечарамі, калі ляжаў на лаве, падклаўшы рукі пад галаву, думаў аб сваіх далейшых планах. Блукала думка: «Народ... Што народ? Ён дзікі і цёмны. А калі так, ён павінен служыць мне...» Не спіцца ўсё ж такі Хмелю. Звычайная цемра за вокнамі здаецца цемрай, якая спłыла не з нябёс, а хлынула з бяздоннай ямы. Вось за прызбай, здаецца, яма. «Нешта няма ліста ад Аляксандра Сучка з-за мяжы... Ужо год, як пайшоў, і няма ніякага слыху. Вось і таварыш. Кожны думае аб сабе. Пляваў я на ўсё!..»

Неспакойна, усё ж такі неспакойна. Агата, жонка, усё маўчыць — ціхая, задуменная. Пра нешта ўсё думае жанчына. Учора расказала, што Аляксея Вераса ўжо другі дзень няма дома.

«Прыйдуць Падаляка, Капанец — параімся. Ёсць яны, але ёсць і мы...— трэба паслаць Падаляку ў Беласток да Дзенісевіча. Усюды ТБШ закрылі, а там не. Значыць, ёсць магчымасць падняцца...» — робіць заключэнне Апанас і паварочваецца на бок.

* * *

Два чалавекі ідуць праз палескую пушчу. Ідуць яны ўжо не адзін дзень і не адну ноч. Найбольш прабіраюцца дрыгвянымі месцамі — праз чароты, імшары, на якіх расце лес карлікавых соснаў. Начуюць у стагах пры ўскраіне лесу. Абодва з салдацкімі мяшкамі за плячыма. Апрануты звычайна — у цывільным, толькі на нагах гумавыя бо-

ты. Падарожныя абмінаюць вёскі, не падыходзяць нават да пастуховых агнёў, якія бачаць ідучы. Самі агнёў таксама не раскладаюць. Цікавыя падарожныя. Адзін высокі, плячысты, з сівымі скронямі і вусамі. Другі ніжэйшы, але таксама магутны мужчына. Толькі адно вока ў яго меншае і пад ім скалечана шчака.

Калі падарожныя прыйшлі ў адзін невялікі сасновы лес, які вылучаўся сярод непралазных чаротаў і асакі, вышэйшы сказаў:

— Вось тут была наша апошняя стаянка. Давай адпачнем, Сава. Адгэтуль ужо і да Дзядоў рукой падаць.

Сябры выбралі зручнае месца пад соснамі і скінулі мяшкі. Быў якраз поўдзень. Ціха прыгравала сонца. Навокал лесу прасціралася нёкаш — хіліліся чароты, зелянелі лазнякі, дзе-нідзе пабліскквала вада.

Падарожныя дасталі з кішэняў рэвальверы, праверылі іх і зноў схавалі.

— Давай, Сцяпан, перакусім,— сказаў той, якога вышэйшы назваў Савам.

— Давай, можам ужо не спяшацца. Нават можна было б і агонь раскласці. Але... пачакаем.

Гэта былі Сцяпан Каваль — ён жа Прайдзісвет — і Сава Супрун.

Перакусіўшы, задымілі цыгаркамі. Сцяпан Каваль пазіраў навокал, і ўсмешка часам блукала над вусамі. Вунь там сядзеў некалі Іван Паддубны і стагнаў. Каваль выказаў свае думкі Саву.

— Было ад чаго стагнаць,— гаварыў Сава,— ваявалі, ваявалі, і трэба збіраць манаткі...

— У турме недзе пакутуе Стары. Няхай пацерпіць. Разлічымся з фашыстамі ў Іспаніі, тады прыйдзем сюды. Вызваляць будзем.

— Няўжо нікога не засталося на волі — усе ў турме? — задаў пытанне Сава.

— Некага знойдзем... не можа быць. Можа, і таго віхраватага знойдзем?

— Каго?

— Хмеля... Апанаса Хмеля. Нешта нядобра з ім, чуваць было. Я казаў некалі: твая віхраватая галава табе бяды наробіць.

— Можа, пойдзе з намі?

— Пабачым. Усё праверым. Так, зняпацку, нельга.

Сябрам хацелася ісці, але сонца яшчэ было высока. Трэба заявіцца ў Дзяды ўжо ноччу.

Сцяпан Каваль пасля доўгага роздуму сказаў:

— Ведаеш што, Сава?

— Што?

— Ідзі ты зараз у свае Навасады. Пакуль зойдзеш, то і сцямнее. Абодвум паказвацца ў Дзяды не варта. Наробім шуму. Прыйдзеш на трэці дзень. Дома ўсё разведаеш, хто там добры, а хто дрэнны. І наогул, доўга тут затрымлівацца мы не маем права.

На гэтым і парашылі. Сава пайшоў, пакінуўшы Сцяпана Каваля ў лесе аднаго.

Пасядзеў Сцяпан у цішыні лесу, скурыў не адну цыгарку, адчуў, што быццам прыплыў да ціхай прыстані, дзе можна спакойна адпачыць. На выгляд не пастарэў Сцяпан, толькі валасы больш пасівелі. А з твару — наадварот. Калі б параўнаць Сцяпана Каваля, былога пяўлоўнага камандзіра партызан, з цяперашнім Сцяпанам, то можна было б сказаць, што цяперашні выглядае маладзейшым.

Далёкая дарога наперадзе ў Сцяпана — трэба шмат сіл, здароўя надоўга. І Сцяпан іх мае.

Не дужа чуллівы чалавек Сцяпан Каваль, але, прыйшоўшы ў родныя мясціны, неяк прыціх душою. Хочацца паглядзець знаёмыя дарогі, вёсачку Дзяды, закінутую ў магутным бары, зірнуць на лясное возера, а потым... потым наведаць магілу свайго галоўнага разведчыка Данілы Перагуда. Як жыве Мар'яна? Адна яна ці, можа, знайшла сабе чалавека?

«Эхе-хе... Сцежкі-дарожкі. Шмат іх сходжана тут, а яны, мусіць, травою зараслі. Работа наша, слава наша... Можа, яе ўжо і следу няма? Адновім...»

Сцяпан падняўся і ўздзеў мяшок на плечы. Хочацца яму паблукаць тут, агледзець кожнае дрэва, спыніцца паслухаць, як ледзь чутна перашэптваюцца верхавіны. У цішыні ляснойм асенняй, задуменнай, адчуў Сцяпан сваім суровым сэрцам вялікі жаль па нечым страчаным. Можа, па смеху маладым, можа, па залётным позірку якой-небудзь чарнабровай, што адплыла ў далі жыцця, як на хвалях мора, і адтуль яшчэ смяецца, яшчэ ўзмахвае рукою? Можа, па песнях цягучых, плынных, як шум бору, ці па тых днях, калі жыццё было не жыццё, а мора па калені?.. Ускінаючы грозным гневам, лавінай раскінуўся ў паходзе па прыволжскіх стэпах полк Сценькі Разіна, і няма яму такіх перашкод, якія б ён не зламаў сваім націскам. Сцяпан Каваль на чале сваёй роты ідзе красавіцкім вечарком,

калі падталы ўдзень лёд увечары застывае ў крышталі і хрумсціць пад нагамі. У паветры дыхае ўжо вясною. Рота бадзёрымі крокамі ломіць крыштальны лядок па шырокай вуліцы бясконцага сяла і быццам не ідзе, а танцуе пад песню:

Девки хлопнули в ладоши —
Щеголяй, брат, щеголяй!

Нічога не забылася, нічога. І тым ярчэй успамінаецца яно, мінулае, вясёлае, вось тут, дзе асенняя цішыня ляснал будзіць жаль у суровым сэрцы.

Скончылася багністая нізіна. Ускраіну абвілі непралазныя кусты арэшніку, перамешанага з алешнікам. Закручасты хмель, нікім не крануты, спелымі залацістымі шышачкамі звісае над травамі. За кустамі памкнуліся на ўзвышша, як навыперадкі, маладыя дубкі, старыя дубы, потым сосны, стромкія сосны, а сярод іх туляцца, губляюць лісце бярозы. Чуе Сцяпан — нешта ўсхліпвае ў цішыні, то мацней, то цішэй. Слухае Сцяпан і пазнае знаёмыя ўсплёскі азёрных хваль. Быў час — яны ўскіпалі і білі ў берагі. Быў час — яны нямелі, застывалі насцярожана, прытоена, і партызанскія чаўны плылі па іх нячутна. А цяпер усхліпваюць — то мацней, то цішэй.

Сцяпан выйшаў на абрывісты бераг, і позірк яго застыў на возеры. Яно яму адразу здалося забытым. Ніхто не праплывае на чаўне, не апускае сецяў. Не даносяцца, не далятаюць да вуха чалавечыя галасы. Адны сосны, а дзе ніжэй — лазнякі ўглядаюцца ў тоні, як раней, і зеляняць берагі. Толькі знаёмаму воку можна ўбачыць, як далёка, на процілеглым беразе, ледзь віднеюцца сярод соснаў, чарнеюць, нібы купіны на балоце, стрэхі Дзядоў. Сеў Сцяпан на навіслую над вадой сасну-вывараць і заглядзеўся ў тоні. Хвалькі набягаюць і ціхімі ўсплёскамі ліжуць пясчаны абрывісты бераг. Рыбкі маленькія ўюцца, мігцяць — бесклапотныя, гуллівыя. І, урэшце, Сцяпан нічога не бачыць. Чуе толькі ледзь чутны шум соснаў і ўсхліпы, усхліпы. «Дзе вы, мае хлопцы? Як закавала вас панская нядоля? Ці моцныя вы, як тады? Ведаю, нямала ўжо вас няма... Эх, зазвінелі кайданамі па шляхах пад канвоямі. Хіба тое гаварыла дума наша — шумная, як гэты бор?»

Сцяпан абуджаецца ад задумы, праціраве вочы. Але, глянуўшы навокал, зноў пачынае думаць: «Тут, на гэтым месцы, я пакляўся, адыходзячы... Я сказаў — Прайдзісвет

яшчэ пойдзе ў свет. Я вярнуўся, я прыйшоў, каб ісці... І мы пойдзем! Нездарма багатыя людзі, ворагі празвалі мяне Прайдзісветам. Яны хацелі зрабіць з гэтага смех. Не выйшла і не выйдзе».

Сцяпана Каваля клікалі прасторы грымучых кананад, прасторы геранчнай Іспаніі.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

— Ой, Сцяпанка, ой, саколік,— млела Мар'яна ад радасці, ад шчасця і тулілася да пляча Сцяпана.

Сцяпан бацькоўскім, ласкавым позіркам ускідваў на яе вочы і ўсё гаварыў:

— То ўжо даволі. Усяго таго, што паглядзіш. А заўтра — бывай. Данілюк, значыць, гэцьман цябе падчапіў? Мм... чорт бяльматы. Добра. Мар'яна, добра... Толькі скажы, дзе ён?

— Дальбог, не ведаю. Ужо больш тыдня, як не прыходзіў з лесу. Апошні раз, калі прыходзіў, казаў, што не хутка прыйдзе.

— Гм... Канспіратарамі парабіліся тут. Хоць зарэж, нічога не даведаешся,— казаў Сцяпан, наліваючы яшчэ па чарцы Мар'яне і сабе.

А Мар'яна зноў сваё:

— Ой, Сцяпанка, ці ж я сніла, ці ж я думала, што...

— Яшчэ не тое будзе,— казаў Сцяпан і пытаўся: — А вяселле з Данілюком гулялі?

— Дзе там вяселле? Крумкачы па нас увесь час вяселле ігралі. Ды вось яшчэ жывём. Бачыш, якога хлопца гадую,— сказала Мар'яна і паднесла фартух да вачэй.— Толькі яму, небараку, прытулку няма. Як лета, так зіма,— усё адно і тое.

— Не бядуй. Яшчэ згуляем тваё вяселле. А як тут паны вашы — жывы, здаровы?

— Халера іх не бярэ. Сцішэла крыху. Ката Дарванскага, каменданта, перавялі некуды. Баяцца.— Мар'яна сцішыла голас і дадала таямніча: — У Глушцы асаднікі былі помнік Пілсудскаму паставілі, а ўначы нехта адламаў яму галаву і напісаў на помніку — пасаран...

— А-а-а!..— аж задраў галаву Сцяпан і затросся ад смеху.— Малайцы... гэта па-мойму... малайцы... ха-ха-ха!.. Калі так, Мар'яна, значыць, жывём. Пшаніца будзе наша.

— Вось, можа, Макар падыдзе, ён табе больш чаго раскажа. Таксама хаваецца, як і мой Данілюк. Уцёк ад Дарванскага.

— Цвіркунок мой, значыць, цвіркае... Добра. Жывём. Толькі мне, Мар'яна, таксама прыйдзецца пажыць у лесе. Нічога не зробіш. Паноў мы яшчэ тут не дабілі. Па-дурному выйдзе, калі яны мяне асочаць тут.

— Сёння прасніш у гумне. Я табе пакажу месца Антона, дзе ён часта начуе. Я гумно замкну. Там зроблены запасны выхад.

— Ну, сёння то яшчэ можна... А заўтра ўжо не...

Макар Краўчук прыйшоў апоўначы. Сцяпан збіраўся якраз ісці ў гумно. Макар не менш за Мар'яну ўзрадаваўся Сцяпану. Забыўся нават паскардзіцца, як заўсёды, Мар'яне, што змерз у лесе. Ён расказаў Сцяпану ўсё. Расказаў і пра Данілюка, чаго не ведала Мар'яна. Данілюк паехаў у Львоў наўздагон за Дарванскім, каб з ім разлічыцца. Рваўся да гэтага Макар, але Антон сказаў:

— Мне зручней. Я на Заходняй Украіне лепш умею паварочвацца, чым ты. Я яго, ката, знайду і дакапаю... Я выканаю рашэнне, не бойся.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Данілюк, аброслы барадою, апрануў падраную сярмягу, начапіў на сябе дзве торбы, узяў кій і жабраком падаўся ў Львоў. Дабраўся ён туды таварным поездам. Хадзіў па базарах з шапкай у руках і жабраваў. А вачыма ўсё шукаў ягамосця, падобнага на жабу на купіне, шукаў ката Дарванскага. Доўга яму шукаць не давялося. У час адной паліцэйскай аблавы на базары ўбачыў Дарванскага на чале атрада паліцыі. Калі людзі паразбягаліся і базар апусцеў, Данілюк стаў ля варот базару і чакаў, каб паглядзець, куды накіруецца кат Дарванскі. І дачакаўся. Тады хуткім крокам пайшоў услед. Цяжка апіраўся на кій, сагнуўшыся, як сапраўдны жабрак. Так дайшоў Данілюк да нейкага пастарунка, куды нырнулі паліцыянты, і недалёка ад яго на скрыжаванні вуліц сеў, паклаўшы сваю шапку побач. Часам хрысціўся, нешта шаптаў. Думаў — нядобра сядзець моўчкі. Тады ўпаўголаса заводзіў песню «Ой, на горі тай жэнці жнуть», але спяваў ён яе на жабрацкі лад. Людзі праходзілі. Сёй-той кідаў яму грош. Жабракі — звычайная з'ява. Пачало вечарэць. І тады Данілюк убачыў ката Дарванскага. Ён ішоў, выставіўшы наперад бруха. Вусы, як у рака. На галаве шапка ссунута на патыліцу. Мінуў Данілюка, нават не глянуў на яго. Закалацілася сэрца ў Антона. Падняўся ён са свайго месца зірнуў навокал і дагнаў Дарванскага. Нож малан-

кай бліснуў у руцэ... Кат Дарванскі ўпаў на спіну. Нож у руцэ Данілюка бліснуў яшчэ два разы...

Ішла якраз нейкая жанчына, спынілася і, ускрыкнуўшы, пачала ўцякаць. Як у тумане ўцякаў і Данілюк, кінуўшы свае торбы і кій.

Данілюк уцёк. Усё было зроблена ціха, без стрэлу. Пакуль даведаліся на пастарунку аб смерці ката, прайшло нямала часу. Ніхто з цывільных не спяшаўся заяўляць, бо кожны баяўся, каб яго не абвінавацілі ў забойстве. Заявіў аб усім толькі квартальны паліцыянт.

А Данілюка ветры неслі па дарозе і прынеслі ў Дзяды, дзе яго сустрэлі не толькі Мар'яна з Макарам, але і Сцяпан Каваль.

Вестка аб гібелі ката Дарванскага хутка дайшла ад Львова да Глушэцкага павета і радасцю і ўдзячнасцю напоўніла сэрцы скатаваных.

— Пасаран дзейнічае,— гаварылі напалоханыя солтысы-канфідэнты і старшыні вясковых рад.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Апошнюю сустрэчу зрабілі ў лесе. Абышлі возера і там, дзе ў свой час Сцяпан Каваль даваў клятву, што ён, Прайдзісвет, яшчэ пойдзе ў свет, сабраліся на невялічкім узвышшы. Мар'яна пасцяліла абрус.

— Добра пачастуй нас, Мар'яна,— казаў Сцяпан,— бо, можа, не хутка вернемся. Тры галавы нам трэба будзе адсячы: галаву Франка, галаву Мусаліні і галаву Гітлера. Задача, праўду сказаць, нялёгкая, але па нашых сілах. Так, хлопцы?

Хлопцы ўсміхаліся, не зводзілі вачэй са Сцяпана, які стаяў перад імі, як пекалі,— волат волатам.

Сцяпан нават вус пакручваў, любоўна аглядаў хлопцаў, якіх сабралася нямала. Шмат прывёў Сава Супрун, а яшчэ больш Макар і Данілюк. Сярод іх былі Захар Зубец, Максім Рунда, Аляксей Верас, Якаў Кушалевіч. Быў яшчэ балалаечнік Ваня Качаткоў.

Сцяпан спыніўся позіркам на Захару Зубцу і сказаў:

— Ты не пойдзеш. Застанешся на насенне. Ты вытрымаеш да канца, сухарлявік. Павялічвай тут колькасць такіх, як сам. Івана ў турме падтрымлівай. І таго, што вас адукаваў,— маладога, якога мне Іван не даў у атрад. Трэба Апанасу зубы намацаць, на хвост наступіць. Так ён і не вылез з жульніцкай скуры і ўжо не вылезе. Атруты замнога ў душы. За афіцэрыкам сачыце.

Хлопцы слухалі не змаргнуўшы. Па вачах прабягалі ўсмешкі. А Сцяпан працягваў далей, звярнуўшыся ўжо да Максіма Рунды:

— Ты нядаўна вярнуўся з турмы і паспеў прыбыць сюды. Ты таксама застанешся. Праныра з цябе добры, косточкі маеш вострыя. Дэфензіўшчыкі кулакі свае пабілі аб іх. У мястэчку працаваць будзеш. Датрымайце да канца. Вернемся мы — усё будзе. Мар'яне дапамагайце, застаецца зноў адна. Гэцьмана мы зробім у Іспаніі разведчыкам, бо яго вочы і ўначы бачаць.

Сярод хлопцаў пранёсся лёгкі смех.

— Я ж кажу... Нам толькі гэтыя тры галоўкі адсячы, і тады — канец. Нас там ужо чакаюць. Там ёсць інтэрнацыянальная брыгада імя Яраслава Дамброўскага. Чулі пра такую?

— Чулі,— адказалі хлопцы.

— Ну, вось... туды.

— Сустрэча ў Празе. Я там буду вас чакаць.

Падышлі бліжэй да абруса.

Тут былі і чаркі, былі шклянкі і кубкі — усё, што здолела сабраць Мар'яна для такой вялікай кампаніі. У канцы рассцеленага абруса стаяў Сцяпан з чаркай і азіраў усіх. Да яго тулілася засмучаная Мар'яна.

Сцяпан прыўзняў чарку і кінуў тое крылатае, што страшыла паноў:

— Но пасаран!

Сосны ўздрыгнулі ад магутнага рэха.

— Но пасаран!!! — гукнулі ўсе і выпілі да дна.

Развітаўся Сцяпан Каваль з усімі і пайшоў.

Яшчэ доўга было чуваць, ужо ў змроку, як недзе ў лясных гушчарах то ўспыхвала, як полымя, то заціхала, каб успыхнуць зноў, песня Сцяпана Каваля:

Не кружыся, чорны воран,
Над маёю галавой,
Ты дабычы не даб'ешся —
Чорны воран, я не твой!

Так рознымі дарогамі з розных канцоў Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы прабіраліся добраахвотнікі да партоў Балтыкі, каб адплыць у далёкую Іспанію. Суправаджаў іх крылаты, агністы вокліч гераічных іспанскіх рэспубліканцаў:

— Но пасаран! Но пасаран!

# СУД НАД СУДОМ

Над Лукішкамі ўзвышаецца пазалочаны купал з пазалочаным крыжам.

Калі зняволенага ўводзяць у турму, гэты купал павісае над яго галавою, як вялізны капюшон, на вышыні пятага паверха. Тут свайго роду «чакальня». На белых і карычневых у шашачніцу плітках падлогі стаіць толькі адна лаўка для зняволеных і канваіраў. На ўсіх пяці паверхах уздоўж сцен — круглыя тэрасы з жалезнымі поручнямі. Апошняя тэраса пад самым купалам. Пры ўваходзе — дзверы ў турэмную канцылярыю, а на процілеглым баку — дзве жалезныя лесвіцы. На турэмным двары да падкупальнага круга прыбудаваны крыламі два чатырохпавярховыя будынкі адзіночак. Яны так і называюцца — правае крыло, левае крыло. У Лукішках амаль няма агульных камер. Цёмныя сходкі лесвіц вядуць уверх да адзіночак.

На тэрасе другога паверха за жалезнымі поручнямі вісіць на сцяне вялікі кіёт з вобразам Хрыста, перад якім увесь час, удзень і ўначы, цепліцца лампадка. А побач з Хрыстом — турэмная прадуктовая крама для зняволеных. Галава Хрыста ў цярновым вянку і галава крамніка ў белай бесказырцы выглядаюць на адным узроўні.

Крыміналісты кожны дзень усё чысцяць і чысцяць падлогу, сцены, парэнчы, вокны. Апрача гэтага, іх абавязкам з'яўляецца кожны ранак і вечар выходзіць на круг і спяваць малітвы. Турэмная адміністрацыя доўга прымушала і палітычных выконваць гэтыя літаніі, але дабілася толькі таго, што палітычныя па адзіночках павінны ў час спявання малітвы стаяць. Трэба было пайсці на такую ўступку цемрашалам, каб захаваць сваю арганізацыю, аслабленую пасля галадовак...

Андрэй атрымаў запіску ад Надзі, якая сядзела ў другой віленскай турме, так званай Стэфанаўскай, дзе знаходзіліся толькі адны жанчыны. Запіска была ўсё ж такі незвычайная, хоць весткі, аб якой пісала Надзя, Андрэй чакаў.

Надзя ў турэмным шпіталі нарадзіла сына.

Яна пісала аб выглядзе малога, аб сваім самаадчуванні. У дадатак гаварыла, што правакатар Карэльчук у Вільні і што ён увесь час сведчыць на судах, узводзіць паклёп на палітычных.

Назаўтра, на пятнаццацімінутнай прагулцы, таварышы не давалі Андрэю праходу з віншаваннямі. Андрэй за-

пісаўся да начальніка, каб дабіцца спаткання з Надзяй. Начальнік не дазволіў, паколькі яшчэ не было суда.

Неўзабаве пасля гэтага Андрэя выклікалі ў канцылярыю. Наглядчык у калідоры паведаміў, што мае быць вочная стаўка з Карэльчуком. Андрэй падрыхтаваўся. Калі яго ўпусцілі ў пакой, там пахаджваў з папяросай у зубах малады ягомасць з пamятым тварам, быццам нявымытым. Андрэя крапула пачуццё агіды. Схіліўшы крыху галаву набок, усунуўшы руку ў кішэню белавата-жоўтых галіфэ, Карэльчук нервова адмерваў крокі. «Дык гэта ты той правакатар, што аддаў у рукі сотні камсамольцаў і камуністаў з розных акруг краю? Выглядаеш ты, як смоўж, на якога толькі застаецца наступіць нагою»,— прабегла ў галаве Андрэя. Карэльчук змераў Андрэя з галавы да ног, і жульніцкая ўсмешка, усмешка пачвары, перакрывіла яго твар.

— Дзе ты і калі пазнаёміўся з Надзяй Харашэвіч? — спытаўся ён, спыніўшыся.

— Гэта справа мая,— адказаў Андрэй і дадаў: — Ты мяне не тыкай. Я з табою свіней не пасвіў і ў дэфензіве людзей не катаваў.

Карэльчук зірнуў на Андрэя, як чым азадачаны, і яго вочы зрабіліся белымі і драпежнымі.

Паліцыянт, ахоўнік Карэльчука, адчыніў дзверы і запытаўся: «Ну, як?»

— Яго я не ведаю,— адказаў замшэлы смоўж.

Стаўка скончылася. Гэта і было сігналам, што хутка будзе суд.

Чакаць давялося нядоўга. Хутка атрымалі акты абвінавачвання, пасля чаго прыйшлі ў турму для перагавораў адвакаты. Андрэй пачынаў цешыцца тым, што ўбачыцца з Надзяй. Звычайна кажуць пра бацькоўскае пачуццё пры з'яўленні на свет патомства — аб радасці, аб захапленні. Андрэй не вельмі адчуваў і тое і другое. Наадварот, яму зрабілася нават крыху сумна. Чаму сумна, ён і сам сабе не мог растлумачыць. Толькі часам прамільгнуць прад вачыма ў полі васількі і, як далёкі павеў ветрыка над нівамі, душу ахопіць радасць. Але гэта толькі момант, які потым змяняецца роздумам, сумам. Відаць, радасць загнана глыбока ў глыбіню душы. Цэнтрам увагі засталася ўсё ж такі яна, дарагая жанчына — Надзя. Яна пайшла на гэты крыж, кінула выклік прыгнёту, душыцелю жыцця — фашызму і перамагла. «Я з табою, Надзя, я з табою... Я збіраю кветкі, якія выраслі на тваіх слядах...»

Так думаў Андрэй, ходзячы ў змроку па сваёй адзіночцы.

У другім лісце Надзя пісала шыфрам, што сына перадала на волю, што яго пераправяць туды, у Краіну Саветаў.

Андрэй прыклаў руку да грудзей і слухаў біццё свайго сэрца. Шмат думак і пачуццяў апаноўвала ім... «Ці ўбачу я сына калі-небудзь, хоць бы дарослым? Ну, вядома, убачу... Усё роўна жыццё пераможа! У імя жыцця няхай жыве сын! Надзя... дай абдыму цябе!..»

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У судовай зале цішыня. Ля лавы падсудных, апёршыся на штык, стаіць паліцыянт. Публіка ўваходзіць ціха і непрыкметна займае месцы. Адвакаты ўжо даўно за сваім доўгім сталом, пакрытым цёмна-сінім суконным абрусам. Адвакат Дурач, нязменны абаронца і арганізатар абароны палітычных, праціpae шкельцы свайго пенснэ, а потым засяроджана надзяе яго на свой тонкі, крыху завостраны нос. Пачынае перагортваць невялічкую кніжачку — кодэкс карнага права. На другім канцы залы занялі месцы карэспандэнты. Сярод іх карэспандэнт ад ксяндзоўскай «Беларускай крыніцы».

Цішыня залы нагадвае Андрэю касцельную цішыню. Тым больш што на судовым стале стаіць жалезны крыж з распятым Хрыстом, як быццам напамінак аб тым, што кожнага, хто судзіцца ў гэтай зале, можа спаткаць доля Хрыста. Распінаюць фашысты людзей ад імя некалі распятага Хрыста.

Надзя сядзіць побач з Андрэем, апранутая ў тое самае плацце, у якім ён бачыў яе ў свой час у Вільні. Валасы лёгкімі хвалькамі леглі над прыгожым ілбом. Твар нібы памаладзелы. Сляды пакут адышлі, пахаваліся. Наступаў адпачынак душы пасля перажыванняў. Адчуваецца тая самая самастойнасць, поўная пільнасці. «Толькі ёй ружы не хапае ў валасах»,— лезуць думкі ў галаву Андрэя.

На лаве падсудных сядзіць і Станіслаў Барвіна. Ён сваім ростам узвышаецца над усімі. Яго прывезлі на суд з беластоцкай турмы. Барвіна расказаў Андрэю, што той вясковы хлопец з носам, як люлечка, таксама арыштаваны на кватэры Санкоўскага. Ва ўсім вінаваты машыніст рухавіка. Санкоўскі моцна пасварыўся з машыністам. Ледзь не дайшло да бойкі. Не дапусціла да гэтага Ганорка. Санкоўскі ўзяў у дырэкцыі разлік і перайшоў жыць

да цесця Яна Куркоўскага. Марыля, жонка Барвіны, выехала на вёску да сваёй радні. Невядома, які лёс Санкоўскага. Работы яшчэ не знайшоў. На кватэры Паўла Касагора, брата Марылі, дзе жыў Андрэй, паліцыя аж тры разы рабіла вобыск. Павел перасяліўся ў другое месца.

Так і сядзяць падсудныя, чакаюць суддзяў, перакідваюцца словамі. Ужо дамовіліся, хто што будзе гаварыць у апошнім слове.

Прагучаў званок. Услед за ім прагучаў голас афіцэра паліцыі: «Суд ідзе!»

— Зараз будзе наша вяселле,— сказаў, жартуючы, Надзі Андрэй.

У доўгіх, нядаўна ўведзеных, чорных тогах, у шапках накшталт ксяндзоўскіх, з бакавых дзвярэй выйшлі суддзі і пракурор. Старшыня суда сеў, паклаўшы перад сабою сваю шапку з бамболкамі, і паправіў масіўны ланцуг на шыі, на якім звісаў на бруха тоўсты медаль з арлом. «Вяселле» пачалося. Сакратар суда выклікаў усіх па прозвішчах. Грыша Плотка, бледны і нервовы пасля дэфензівы, з гарачымі вачыма пад акулярамі, меў другое прозвішча — Раманоўскі. Гэтае прозвішча запісана ў падпольным пашпарце. Сакратар суда так і прачытаў: «Рыгор Плотка, ён жа Раманоўскі».

З пракурорскіх сведкаў наехала шпікоў не толькі з Беластока, але і з Гродна, Пінска, Брэста, з Навагрудка, з Бельска, ужо не кажучы пра Вільню. Прыехаў адзін шпік з Глушца. Адным з першых сакратар прачытаў прозвішча Міхаіла Шчурына і сказаў суду, што ён не з'явіўся, бо выехаў у невядомым напрамку. На гэта зараз жа ўстаў адвакат Тэадор Дурач і сказаў:

— Прашу суд... Міхал Шчурын забіты. Я сам бараніў чалавека, які яго забіў. Забіў яго Віктар Кухта, студэнт Віленскага універсітэта. Ён атрымаў дзесяць год турмы.

У зале прабегла ўзрушэнне. Суддзі пачалі знарок перагортваць паперы, каб схаваць няёмкасць ад выкрытага ашуканства.

Пасля пераклічкі пачалося доўгае і нуднае чытанне актаў абвінавачвання.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

На трэці дзень пачаўся допыт пракурорскіх сведкаў. Не было ні аднаго шпіка, які б не стушаваўся, не стаў у тупік пад крыжавым агнём адвакатаў.

Але вось у залу ўвайшоў малады чалавек у плашчы

зеленаватага колеру. Андрэй локцем штурхнуў Надзю. Гэта — Саша Грыпявіцкі. Ён прайшоў крыху наперад па праходу між лавак і сеў у чацвёртым радзе. Глянуў на падсудных толькі адзін раз, але глянуў знаёмымі вачыма. Сядзеў, слухаў судовую працэдуру, як звычайны слухач з публікі.

Не глядзелі доўга на Сашу Андрэй з Надзяй, каб часам не кінулася ў вочы віленскім шпікам, якіх можна было пазнаць ля сцен, як яны ні хаваліся за публікай. Слухаючы выказванні сведкаў, асцярожна, але пільна паводзіў вачыма па зале сам старшыня суда — стары, са зморшчаным тварам. Відаць, з мясцовай шляхты. Андрэй думае, думае, слухаючы працэдуру, і тэзісы для апошняга слова ўкладваюцца самі. «Пад гэтым жа лозунгам змагаецца інтэрнацыянальная брыгада імя Яраслава Дамброўскага ў Іспаніі. Вось я ім аб гэтым і скажу. Я іх паб'ю гэтым лозунгам»,— з задаволеннем вырашае Андрэй. Старшыня суда ўжо развітаўся з дэмакратыяй. Ад яго патрабуюць, каб ён судзіў людзей, якія змагаюцца за сапраўдную дэмакратыю.

Усе падсудныя, апрача Барвіны, на пытанні старшыні адказваюць па-беларуску. Пракурор нервуецца, калі адказвае Грыша Плотка. Ён задае Грышу калючыя пытанні, гаворачы, што ён, Плотка, вырас на польскім хлебе, а мовы польскай цураецца. Грыша адказаў з гордасцю:

— Я вырас з маленства сярод беларускага народа, і мне яго мова, як свая.

Старшыня зыркнуў на Грышу і ўсміхнуўся. Сачыў за гэтым адвакат Чэрнік, яўрэй па нацыянальнасці, і ўстаў, папрасіў слова:

— Выступленне майго кліента Плоткі па-беларуску трэба лічыць натуральным. Каб я сядзеў на яго месцы, то таксама адказваў бы па-беларуску, бо і я з'яўляюся сынам гэтай зямлі.

Пракурор не мае аднаго вока і сваім вульгарным і нахабным тонам нагадвае не пракурора, а вышыбайлу. Гэта ўжо новыя кадры, з жывёльным цынізмам. Адвакаты, поўныя бляску эрудыцыі, поўныя вытрымкі і такту, не цярпяць пракурора, рыхтуюцца даць яму бой у сваіх апошніх выступленнях. Падсудныя потым даведаліся ад адвакатаў, што гэты аднавокі пракурор быў дзянікінскім афіцэрам, страціў вока ў грамадзянскай вайне.

Пачалі выступаць сведкі з сялян. Стаіць перад судом нізенькі худы селянін з нацямнелым тварам. На кажушку

палатаная шэрая куртка. Гумавыя лапці, зробленыя з накрышак аўтамабільнага кола, тарчаць наскамі ўверх, як чаўны. Бліпчастыя, невялічкія вочы схаваліся глыбока ў маршчынах і адтуль глядзяць на суддзяў, як праз сетку.

Вочы падсудных напоўніліся сумам і дакорам. Андрэй з Надзяй інстынктыўна пераглянуліся і зразумелі адно аднаго. «Да якога ж жабрацтва, забітасці даведзены наш народ»,— думае Андрэй і ў глыбіні душы ўздыхае. Селянін гаворыць пра Андрэя і Надзю. У яго хаце адбывалася нарада, калі Андрэй з Надзяй ездзілі па вёсках арганізоўваць сялян для дапамогі бастуючым рабочым Беластока. Сабраныя ў яго хаце людзі, найбольш моладзь, чакаючы прыбыцця падпольшчыкаў, спявалі рэвалюцыйныя песні. Аб гэтым і пытаецца ў селяніна старшыня суда, пытаецца па-беларуску.

— То якія там песні спявалі ў цябе ў хаце?

Селянін глядзіць на старшыню, нават пераступіў з нагі на нагу і ціха, перасохлым голасам адказаў:

— ...Хлеба, солі...

Па зале пракаціўся ціхі смех. Усміхнуліся адвакаты, усміхнуўся і старшыня суда, але зараз жа прыкрыў усмешку далонню і стаў назнарок сур'ёзным. Перакінуліся сумнымі ўсмешкамі і падсудныя. У зале запанавала нават доўгае маўчанне. Камусьці было цяжка, а камусьці на момант сорамна.

Моладзь у хаце гэтага селяніна, відаць, спявала вядомую песню. І з усяго, што там спявалася, селяніну запомніліся словы, якія надакучаюць яму кожны дзень, а іменна: «...хлеба, солі...»

Каб затушаваць такое «непатрэбнае» ўражанне, выклікапае адказам селяніна, пракурор раўкнуў:

— А дзе твой сын?

— Дзе? У турме...— адказаў селянін.

— Хто там у вас еў камуністычныя пракламацыі? — пытаецца па-польску пракурор.

Селянін не зразумеў пытання. Дапамог старшыня, які звярнуўся па-беларуску:

— Хто еў? Сын ці ты?

Селянін усміхнуўся і паціснуў плячыма. Пачаў сваё пракурор:

— Гэты хлоп выдае з сябе пакрыўджанага, а сам з сынам прынеслі ў хату мяшок пракламацый. Добра, што прыйшла паліцыя. Яны на вачах паліцыі пачалі іх есці. Вось вам антыдзяржаўнік, прыкрыты сярмягай.

Манеўр пракурора не выклікаў ні ў кога ніякага водгуку. Зала маўчала.

Там, за шыбай акна, за спінамі суддзяў, селі на падаконніку два вераб'і і пачалі грэбціся і цвыркаць. Позіркі ўсіх спыніліся на іх. У зале пехта засмяяўся. Глядзеў на вераб'ёў і Саша Грыпявіцкі. Усмешка як застыла на твары, так і не сыходзіла, усмешка былога пастушка.

Пракурор заўважыў перашэпты ў зале і таксама зірнуў у акно, пасля чаго кіўнуў сакратару.

Сакратар падняўся і прагнаў вераб'ёў з акна.

— Выклікаць Карэльчука! — сказаў старшыня.

Падсудныя заварушыліся. Твары напружыліся. Зараз выйдзе ненавісны Карэльчук, у якога пад кашуляй надзеты панцыр. Зараз выйдзе пачвара, шматгадовы правакатар, які не толькі зросся з дэфензівай наогул, але нават ужо сам катуе камуністаў і камсамольцаў пры допытах. Падпольшчыкі з ног збіліся, сочачы за ім, каб адпомсціць, а ён яшчэ жыве. Няўжо і будзе жыць? Няўжо не знойдзе партыя спосабу, каб пакончыць з ім? Не можа быць!

Ва ўсіх падсудных прабеглі такія думкі ў чаканні правакатара Карэльчука.

Вось ён выйшаў з бакавых дзвярэй. Хоча ісці адважна, але ўсё ж такі ногі крыху нібы валакуцца па падлозе. Стаў перад судовым сталом, зірнуў на падсудных, здаецца, заплюшчанымі вачыма.

— Каго вы ведаеце з падсудных? — пытаецца пракурор.

— Ведаю Надзю Харашэвіч з тысяча дзевяцьсот дваццаць сёмага года...

— Правакатар! — крыкнула Надзя.

За ёю другі раз крыкнулі ўсе:

— Правакатар!!! Прэч адгэтуль!!!

Збялелы Карэльчук утаропленa глядзеў на суддзяў, быццам там шукаў ратунку.

Паліцэйскі афіцэр крычаў: «Спокуй! Спокуй!»

Невядома, што было б далей, але тут адбылося нечаканае. Толькі адны падсудныя ўбачылі, як з чацвёртай лаўкі падняўся Саша Грыпявіцкі. Ён зрабіў толькі тры крокі наперад. Ніхто не ведаў, што будзе рабіць Саша.

— Смерць правакатару! — пачуўся яго голас.

Зала здрыганулася ад першага стрэлу. За першым было яшчэ тры — бах! бах! бах!

Саша трымаў рэвальвер, шчыльна прыставіўшы яго да галавы Карэльчука.

Praвакатар упаў. Усе суддзі пахавалі галовы пад стол. Схаваў сваю чорную галаву з адным вокам і пракурор. Публіка пачала ўцякаць з залы.

Адвакаты толькі прыўзнялі галовы, і іх раскрытыя раты застылі ў здзіўленні.

Саша шырокім размераным крокам накіраваўся да выхада. Паліцыя і шпікі атупелі ад разгубленасці і страху.

Саша выйшаў, і ўсе думалі, што ён уцячэ.

Суддзі з пракурорам вылезлі з-пад стала, збянтэжаныя, засаромленыя і злосныя.

Хутка прыгладжвалі свае раскудлачаныя валасы.

Паліцэйскі афіцэр крыкнуў: «Наўздагон!»

Толькі тады пабегла зграя шпікоў і мундзірнай паліцыі. І хутка, недзе паверхам ніжэй, загучалі панічныя стрэлы.

Падсудныя спадзяваліся, што Саша ўсё-такі ўцячэ.

Старшыня суда абвясціў перапынак судовай працэдуры да заўтрашняй раніцы.

Не ўцёк камсамолец Саша, не ўцёк пасланец ЦК камсамола, пасланец партыі. Яшчэ паверхам ніжэй трэба было яму спусціцца, каб выбегчы на вуліцу. Па другім паверсе Саша ішоў ужо з параненымі нагамі. Не ішоў, а бег. Вось ужо відаць выхад. Кулі свішчуць над галавою, свішчуць ля вушэй.

Не дайшоўшы чатыры прыступкі да дзвярэй, Саша, апіраючыся на парэнчу, апусціўся на сходкі. Праз плашч зеленаватага колеру прасачылася кроў. Куля прабіла жывот.

Няўжо загіне Саша? Няўжо не сходзіць яшчэ на той прыдарожны камень, каб пашкадаваць казака, якога паны пахавалі ўніз галавою? Хіба не прагучыць там голас Сашы насустрач узыходзячаму сонцу?

...Ой, накрылі,
Ой, накрылі
Тонкім, белым палатном,
Ой, палажылі,
Палажылі у каморы пад акном.

Не, Саша Грынявіцкі не загіне. Такія не гінуць.

...Сашу прывезлі ў шпіталь турмы Лукішкі. Урачы зрабілі аперацыю — зашылі ў жываце дзевятнаццаць ран. Пяць было ў нагах.

Саша вытрымаў. Ён ішоў на сваю баявую аперацыю пашча. І гэта яго выратавала.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Апошні дзень суда быў днём выступлення пракурора, абароны і апошняга слова падсудных.

Пракурор пачаў выгукваць, як з бочкі. Ён гаварыў, што на лаве падсудных сядзяць эмісары ЦК, што ім — гэтым антыдзяржаўным злачынцам — нічога не падабаецца ў Польшчы. Ім усё падабаецца, што ёсць у чужой краіне, за мяжой — у Савецкім Саюзе. Там для іх узвышаюцца фабрычныя коміны, будуюцца Турксібы, Беламорканалы.

«Што зрабіць? У нас гэтага няма, але мы радуемся таму, што ёсць. Хоць бедна, але сваё...»

Нос пад пенснэ адваката Дурача паступова згінаецца ад усмешкі над скамарошніцтвам пракурора. Другія адвакаты таксама суправаджаюць прамову пракурора, які прыкідваецца пакрыўджаным беднячком, шматзначнымі ўсмешкамі. Толькі наіўных людзей можна частаваць такой прамовай, якою частуе слухачоў пракурор.

Пракурор першага ўзяў пад абстрэл Барвіну:

— Як гэта можна, каб бальшавізмам заражаліся такія, як падсудны Барвіна? Легіянер... ранены на фронце... быў польскім жаўнерам. А цяпер што сталася з чалавекам? Вось на што здольна бальшавіцкая прапаганда! У час беластоцкіх дэманстрацый ён, паляк, кінуўся з кулакамі на польскага афіцэра, абаронцу ладу і парадку Рэчы Паспалітай. Высокі суд! Я... Я...— пачаў заікацца аднавокі пракурор,— я не магу згадзіцца ні на хвіліну, каб гэта мог зрабіць паляк. Барвіна — гэта адшчапенец, прадаў сваю душу бальшавікам.

Адвакаты ліхаманкава запісвалі нешта ў свае лісткі. Адвакат Дурач пакрэктваў і выціраў пенснэ.

Андрэя Касцевіча пракурор пазваў эрудыраваным камуністам, гнуткім і асцярожным канспіратарам.

— Высокі суд! — крычаў аднавокі граміла.— Гэта сіла інтэлектуальная, якая кожную мінуту шукае слабога месца ў ладзе Рэчы Паспалітай, каб па ім ударыць, а гэтым самым пасеяць недавер'е да польскіх улад. Гэта — антыдзяржаўная работа. Пры сваім інтэлектуалізме Касцевіч мог бы быць менш радыкальны...

«Вунь куды гне...— падумаў Андрэй,— пры ўсёй сваёй няўклюднасці хоча стаць гнуткім, як прахвост».

Пракурор дудзеў далей:

— ...Надзея Харашэвіч... шматгадовая, спрактыкаваная падпольшчыца. Няма таго кутка на ўсходніх крэсах, дзе б яна ні пабывала. Яны — Андрэй Касцевіч і Надзея

Харашэвіч — нават пайшлі на тое, каб ва ўмовах падполля нарадзіць дзіця... Усё можна пад небам Рэчы Паспалітай. Відаць, што яна не дракопская, як любяць распісваць эмісары ЦК. Нават дазваляе злачынцам мець дзяцей...

Адвакат Дурач сурова глянуў на пракурора.

— Высокі суд! — канчаў пракурор.— Я патрабую для гэтых злачынцаў найвышэйшай кары.

Для чатырох рабочых, тэхнікаў па развозу літаратуры, для двух друкароў «Чырвонага сцяга», для адной вільнянкі, што трымала канспіратыўную кватэру, пракурор патрабаваў меншай кары, як для людзей, ашуканых камуністамі.

Прыйшла чарга для выступлення адвакатаў.

Адвакат Дурач з усёй тонкасцю крок за крокам разбіваў нахабныя доказы пракурора.

— Нічога не зробіш, высокі суд! Сапраўды, у Савецкім Саюзе з кожным днём растуць новыя фабрычныя коміны, з кожным днём павышаецца жыццёвы ўзровень шматмільённых мас народа. Усяму свету вядома, што там няма беспрацоўных. Калі гаварыць аб росце культуры, то там уся моладзь навучаецца. У гэтай вялікай краіне, у якой пры царызме было семдзесят працэнтаў непісьменных, цяпер непісьменных ужо няма. Гэта ўсё агульнавядомыя факты. Гэтыя людзі, якія сядзяць на лаве падсудных, змагаліся за тое, каб такі самы стан рэчаў быў і тут, у Польшчы. Я лічу, што такая мэта для змагання высакародная. І гэта адно ўжо ставіць падсудных па-за карай.

Хваліцца сваёй беднасцю, як гэта робіць пан пракурор, не да твару народу, што меў Тадэуша Касцюшку, які змагаўся нават за свабоду другога народа — вунь аж за акіянам — народу, які меў Юзэфа Панятоўскага, Генрыха Дамброўскага, Адама Міцкевіча, Юлія Славацкага, які меў Урублеўскага, Яраслава Дамброўскага — герояў барыкад Парыжскай Камуны!..

Многа яшчэ гаварыў Дурач і патрабаваў вызвалення падсудных. Тое самае гаварылі на свой лад і іншыя адвакаты.

Пракурор, адчуваючы, што ён прыдушаны доказамі дэмакратычных адвакатаў, у заключным слове даў волю свайму нахабству:

— Калі пану Дурачу не падабаецца лад у Польшчы,— сказаў ён,— а падабаецца савецкі лад, то, калі ласка, пан Дурач можа вымятацца з Польшчы за мяжу і любавацца там фабрычнымі комінамі...

Усе адвакаты абурыліся.

Дурач устаў пачырванелы, усхваляваны.

— Польшча — мая айчына,— адказаў ён,— я ўсе свае сілы аддаю для лепшай будучыні Польшчы, і ніякім псеўдапракурорам не ўдасца пазбавіць мяне айчыны. Высокі суд! Такую рэпліку пракурора я лічу дыскрымінацыяй, не гаворачы ўжо аб парушэнні правіл юрыдычнай этыкі. Мае довады пабудаваны не на павуцінні, як кажа пан пракурор, а на бетонным жалезе, што не толькі ветры, але буры і громы не здолеюць іх разбурыць...

Папрыгажэлі падсудныя, папрыгажэлі адвакаты ад выступлення Дурача.

Першаму з падсудных было дадзена слова Станіславу Барвіне. Ён пачаў проста, без хвалявання:

— Вінаватым я сябе не лічу. Мой святы абавязак — бараніць інтарэсы рабочага класа, да якога я належу. Я выступлю не толькі супроць афіцэра, але і супроць кожнага генерала, які падыме шаблю над галовамі рабочых, каб іх рассячы. На каго ён падняў шаблю? На рабочых, якія яго апранаюць, кормяць, без якіх ён нуль. А тое, што буржуазія робіцца фашысцкай і ўжо стала фашысцкай, пан пракурор не сказаў. Няхай сабе пан пракурор бароніць буржуазію,— мы будзем бараніць рабочы клас, сялянства, усіх, хто прыгнечаны, галодны.

Аб маім легіянерстве прашу не турбавацца, я ім не ганаруся. Паход Пілсудскага на маладую рэспубліку Саветаў быў вялікім ашуканствам польскага народа. Сярод ашуканых быў і я. Вось за наша давер'е тады мы і цярпім цяпер, церпім удары паліцэйскіх шабляў, катаванні ў дэфензівах і турмах. Я хачу, каб гэтае фашысцкае хуліганства скончылася, я хачу ўлады рабочых і сялян!

Барвіна сеў і выцер спацелы лоб. Андрэй з удзячнасцю зірнуў на яго.

Старшыня суда крэкнуў, выцер нос хустачкай. Потым нагнуўся над паперай і выклікаў Андрэя Касцевіча.

— У польскага ўрада вырасла і расце вялікая нянавісць да польскіх дэмакратычных традыцый,— пачаў Андрэй.— Лозунг «За вольнасць вашу і нашу» апаганены, патаптаны. Буржуазія, якая стала фашысцкай, ужо ненавідзіць, не церпіць свабоды народаў. Лепшыя сыны польскага, беларускага, украінскага народаў панеслі гэты лозунг, як сцяг, аж у далёкую Іспанію і там б'юцца пад ім, пад гэтым сцягам, за свабоду народаў.

Вельмі недарэчныя разуменні пана пракурора аб ра-

дыкалізме. Няхай пап пракурор абвінаваціць у радыкалізме польскага дэмакрата Станіслава Сташыца, які яшчэ ў далёкія змрокі паншчыны пісаў аб нядолі селяніна, што жыў у халупе разам са скацінай. Сташыц тады яшчэ дамагаўся вызвалення сялян ад паншчыны, што нельга лічыць беспадстаўным. А няхай пан пракурор загляне ў хачыць беспадстаўным. А няхай пан пракурор загляне ў хату цяперашняга беларускага селяніна на Палессі. Ён там сустрэне тую самую карціну, якую апісваў Сташыц каля двухсот год таму назад.

Няхай пан пракурор абвінаваціць у радыкалізме Тадэуша Касцюшку, прагрэсіўныя праекты якога шляхта на сеймах секла шаблямі.

Усім вядома, што нядоля народа скончылася там, дзе перамагла Кастрычніцкая рэвалюцыя. У ідэях вялікага Леніна рабочыя, сяляне капіталістычных краін, сапраўдныя дэмакраты ўсяго свету знаходзяць свае найлепшыя жаданні...

Старшыня суда пачаў стукаць алоўкам па стале.

— Перастаць так гаварыць, а то пазбаўлю слова! — сказаў ён.

Андрэй не звяртаў увагі і гаварыў далей:

— Ноч фашызму павісла над Польшчай, Заходняй Беларуссю, Заходняй Украінай, дзе жывое слова народа пасечана нагайкамі, дзе нацыянальныя свабоды...

— Перастаць! — крыкнуў старшыня.

— Але... чым ноч цямней, тым ясней зоры! — крыкнуў Андрэй.— Паўстае народны фронт...

— Пазбаўляю слова! — крыкнуў старшыня.— Наступны — Харашэвіч.

Андрэй сеў, устала Надзя.

— Мы верым у наш народ, мы верым у свае сілы, мы верым у непазбежнасць рэвалюцыі, якая будзе працягам Кастрычніцкай рэвалюцыі,— загаварыла Надзя,— гэтая вера дадавала нам сілы, калі нас катавалі ў дэфензівах — збівалі да паўсмерці, вырывалі валасы, пампавалі ваду ў нос, таптаді нагамі...

— Перастаць! — крычаў старшыня.

А Надзя працягвала:

— Мы верым, што недалёка той час, калі ўз'яднаны беларускі народ разам з народам польскім і ўкраінскім спалучыцца ў адно з вялікім народам рускім на шляхах рэвалюцыі...

— Пазбаўляю слова! — гаркнуў старшыня і зараз жа выклікаў Грышу Плотку. Той пачаў, як з трыбуны:

— Імёны вялікіх барацьбітоў за волю народаў свецяць нам маякамі. З намі заўсёды бессмяротны Ленін...

— Перастаць! — закрычаў старшыня і стукнуў зноў алоўкам па стале. Грыша не змоўк.

— Каты хочуць разбіць нам сэрца. Яны не ведаюць, што ў нашых сэрцах многа любві да тых, хто прыгнечаны, загнаны.

Грыша спяшаўся гаварыць, баючыся, каб старшыня і ў яго не адабраў слова.

— Каты-фашысты хацелі вешаць мяне ў дэфензіве. Я ўспомніў пра ўсіх тых, каго ведаю, хто аддаў сваё жыццё за справу народа. Я ўспомніў таварышаў, якія разам са мною ляжалі акрываўленыя. І я быў гатовы памерці, а не здацца фашыстам. Сілы народнага фронта шумяць па ўсёй краіне...

— Пазбаўляю слова! — крыкнуў старшыня.

Грыша сеў, і ў зале запанавала доўгае маўчанне.

Усе іншыя падсудныя таксама не прызналі сябе вінаватымі.

Старшыня суда абвясціў перапынак на пятнаццаць мінут.

Бліснула святло. Яно здавалася ружова-цьмяным, як у касцёле.

Жалезны крыж на стале з распяццем Хрыста напамінаў, што зараз у гэтай стомленай цішыні пачнецца распінанне — апошні фінал расправы.

Званок парушыў цішыню. Адзін за адным увайшлі суддзі і пракурор. У доўгіх чорных тогах яны нагадвалі чарадзеяў-магаў з пякельнага царства. Суддзі занялі свае месцы, але не садзіліся. Старшыня прамовіў:

— Прашу ўстаць! Будзе прачытаны прысуд...

Затым ён надзеў сваю шапку алхіміка, а за ім надзелі яшчэ два суддзі і пракурор. Старшыня адкашляўся і пачаў:

— Імем Рэчы Паспалітай акруговы суд у Вільні, разгледзеўшы справы членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі...

«Усе гэтыя закручастыя фармулёўкі можна адкінуць прэч. Галоўнае, колькі ж вы нам, шляхецка-фашысцкія прыхвасні, наклалі ў мяшок па дарогу?» — думаў Андрэй ды і кожны з падсудных.

Тры разы лічба «восем» вылецела з вуснаў старшыні суда. Значыць, па васьмёрцы на брата — на Андрэя Касцевіча, на Надзю Харашэвіч, на Рыгора Плотку. Нешкі як панесці. Не прывыкаць ужо, бо не першы раз.

Станіслаў Барвіна атрымаў два гады. Адчуваецца тут мансўр фашызму. Барвіне застанецца дасядзець у турме месяцы. Астатнія падсудныя атрымалі па два, па адтры наму году.

Падсудныя выслухалі прысуд спакойна. Маглі б заспяваць, як гэта рабілася раней, але ёсць рашэнне турэмнага парткома — не спяваць, бо за гэта судзяць асобна.

Працэс скончаны. Трэба ісці ў турму.

Так ужо складаецца псіхічны стан людзей на кайданным шляху — усё здаецца натуральным і нармальным. Змяніць становішча можа толькі рэвалюцыя. Рэвалюцыянеры сняць аб рэвалюцыі, чуюць яе то далёкі, то блізкі подых. А ў сэрцы заўсёды носяць яе гімн.

Андрэй усміхаецца, стоячы насупраць Надзі, і гаворыць:

— Ну, што ж... Пойдзем далей. Мне здаецца, што мы з табою зараз вось зноў паедзем па снежных дарогах... Не тужы...

— Ну што ты? Чаго тужыць? Усё зразумела. Пішы часцей па Стэфанаўку.

— Мне здаецца, што мы сваіх прысудаў да канца не даседзім. Але прыгнёту пацерпімся. У правінцыяльных турмах ужо мяшаюць палітычных з крымінальнымі, прымушаюць цяжка працаваць. На чарзе турмы цэнтральныя. Тут барацьба пойдзе не на жыццё, а на смерць.

— Што ж... Мы змагацца ўмеем,— адказала Надзя.

— Нас могуць развезці ў розныя гарады. Калі мы з табою сустрэнемся, Надзя? Глянеш на шлях, і не відаць...

— Не толькі могуць, а напэўна развязуць. Буду пісаць.

— Пажадана, вядома, каб наша сустрэча адбылася на барыкадах, на тых барыкадах, з якіх бы мы пайшлі пераможцамі.

— Будзем верыць, што іменна так і сустрэнемся. Для такой веры ёсць многа падстаў.

— Восем год... Магчыма, апеляцыйны суд дадасць яшчэ. Але што я табе хачу сказаць? Гады для нас нічога не значаць. Мы назаўсёды застанемся маладымі. Дачакаемся, што яшчэ ўбачым нашае малое,— усміхнуўся Андрэй.

— Гэта зусім натуральна. Рэвалюцыянеры не старэюць,— адказала Надзя,— а малое будзе расці ў сваім, надзейным доме.

Можна было б весці такую мілую гутарку бясконца,

але канваіры з вінтоўкамі падганяюць ужо збірацца ў дарогу.

Андрэй прытуліў Надзю да сваіх грудзей.

Яна пайшла. Яшчэ раз агледзелася, яшчэ раз махнула рукой і знікла ў дзвярах. Андрэю здалося, што паляцела мара, якая заўсёды спадарожнічала яму. Ці вернецца назад, ці вернецца?

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Усе ў турме прагнуць пабачыць Сашу Грынявіцкага. Ён ужо выздаравеў пасля аперацыі. Толькі ходзіць яшчэ на мыліцах. Андрэй бачыў яго ўжо два разы праз акно сваёй адзіночкі. Саша ішоў, увесь час глядзеў на вокны турэмных паверхаў і ўсё адказваў на прывітанні ўзмахам рукі, сціснутай у кулак.

Але вось надышоў час суда над Сашам. Суд працягваўся толькі адзін дзень. Сашу прывезлі з суда ўжо на змярканні. У момант усе адзіночкі абляцела вестка — Сашу прысудзілі да пакарання смерцю...

А ўвечары Саша ў сваёй адзіночцы пісаў ліст да ўсіх палітзняволеных турмы Лукішкі:

«Дарагія таварышы! Фашысты прысудзілі мяне да пакарання смерцю. Я яшчэ малады, і мне хочацца жыць. Але я памру з радасцю ад той свядомасці, што мне ўдалося выканаць заданне партыі. Бывайце, дарагія таварышы. Змагайцеся да канца, да перамогі! Смерць фашызму! Няхай жыве Камуністычная партыя!

*Саша*»

Адвакаты падалі апеляцыю.

На прысуд адказалі аднадзённай забастоўкай Вільня, Беласток, Гродна, Пінск, Брэст, а потым Варшава, Лодзь, Кракаў, нават Познань, ну, вядома, і Львоў...

Хутка надышоў Першы май. У Вільні, як і ва ўсіх цэнтральных гарадах, адбылася магутная дэманстрацыя працоўных. Сярод сцягоў, што ўзнімаліся над калонамі, быў сцяг з надпісам: «Патрабуем вызвалення Аляксандра Грынявіцкага!»

А потым... А потым паляцелі лістоўкі па гарадах і вёсках з заклікам у абарону Сашы Грынявіцкага. Вёскі пачалі збіраць подпісы і адсылаць войтам сваіх валасцей. А потым гукі стрэлаў Сашы даляцелі на франты гераічных рэспубліканцаў Іспаніі, да брыгады імя Ярaслава Дамброўскага, і байцы пад камандай генерала Кароля Свярчэўскага ўзмацнілі атакі на фашыстаў. Хлопцы-малойцы

Сцяпана Каваля пайшлі ў тылы войск Франка і Мусаліні — пайшлі партызаніць.

Гукі стрэлаў Сашы пераляцелі акіян і дасягнулі Амерыкі, і там эмігранты рускія, беларусы, украінцы стварылі камітэт абароны Сашы Грынявіцкага.

Польскія фашысты спалохаліся, і апеляцыйны суд замяніў пакаранне смерцю вечнай катаргай.

Саша быў выратаваны.

Сумавала душа Андрэя ў змроку адзіночкі, калі ён атрымаў ад Сашы той развітальны ліст. Але і тады ў смутку і нянавісці жыла ў душы радасць і гордасць за Сашу, за таго пастушка-найміта ў зрэбнай сарочцы з расхрыстанымі грудзьмі, які вырас у цудоўнага камсамольца. Гордасць за Сашу была гордасцю за свой народ.

Прыслухайся, Саша, як далёка над Крамлём радасна хвалюецца Чырвоны сцяг.

## Раздзел пяты

## НЕ ТРЭБА НАМ ПАНСКАЙ МІЛАСЦІ

Такі ўжо стварыўся ўклад жыцця за драпежныя гады акупацыі, што нянавісць да паноў стала ўсеагульнай. Існуе свая заканамернасць у спалучэнні думак, пачуццяў мас людзей у адно адзінае. Яна, заканамернасць, прасочвалася, плыла падземнымі ручаінамі, шукала адзінай плыні, каб выліцца, урэшце, на паверхню.

Не засталося амаль ніводнай вёскі, куды б не наведваліся карныя атрады панскіх паймітаў. З турмаў вяртаюцца маладыя людзі, хворыя на сухоты, на парок сэрца, і хутка паміраюць, перасцерагаюць моладзь: «Будзьце асцярожны, а то загінеце...» Але моладзь пайшла напралом, яна не прывязана да сваёй хаты. Большасць яе расце і вучыцца ў турмах. А старым — што ж... Старыя найлепш адчуваюць патрэбы, усе беды сваіх вёсак. Ім суджана тут дажыць да канца сваіх дзён, лёс не суліць ім далёкіх дарог, незнаных краёў, куды б яны маглі паехаць на заробкі. Свой, выдзелены панамі, хутар — апошняе жыццёвае прыстанне.

Да свядомасці стыхійна дайшла тая думка, што амаль пагалоўна знішчаецца, калечыцца народ. У задуму ўпадаюць не толькі мацеры і наогул жанчыны, але і старыя

з мужчын. Панскі фашысцкі прыгнёт яднае думкі, і яны цягнуць у адзінае рэчышча. Не прыплывае прыбытак у хаты, а, наадварот, сяляне ўсё больш і больш вяртаюцца да натуральнай гаспадаркі. Стараюцца не купляць нічога жалезнага, бо яно дарагое, ужо не па сіле. Кавалачкі жалеза збіраюць, дзе толькі можна,— на сметніках у мястэчку, на дарогах і нават, калі ўдаецца, крадуць у кузнях. Шмат курцоў кідае курыць. Цэлыя раёны вёсак у Піншчыне дадумаліся да таго, каб абвясціць табачнай манаполіі забастоўку. Забастоўка працягвалася месяц, і нават самыя заядлыя курцы вытрымалі яе — не курылі. Бо нельга ж згадзіцца з тым, каб за адну пачку махоркі плаціць больш пуда жыта, якое з кожным годам ужо менш і менш родзіць.

Моладзь падхоплівае новыя ідэі, якія плывуць праз лістоўкі, і даносіць іх да мас. Моладзь узбройваецца старымі — сваімі бацькамі, дзядамі. Яны павінны вясковыя ра́ды, якіх нарабілі паны, зрабіць сваёй трыбунай.

І Захар Зубец дзейнічае ў гэтым напрамку. Няма такога становішча, з якога б не знайшлі выхад камуністы. Захар Зубец ходзіць пануры, нават крыху ссутулеў. Солтыс кожны вечар правярае, ці дома ён,— солтыс мае наказ пільнаваць Захара.

Марцін Шапко стаў пасіўным. Ужо Захар і рукою махнуў на яго.

— Усё за жывот трымаецца,— гаворыць Максіму Рунду Захар,— а гною па вілы бярэ больш, чым бацька. Пайшоў бы ў баптысты, але яшчэ ўсё ж такі саромеецца.

Максіму Рунду найцяжэй. Праколваюць яго вачыма местачковыя мяшчане. Здаецца, яны гавораць: «Ходзіць ён, як па вяроўцы. Чаму ж яго не бяруць? А то яшчэ бяду накліча на ўсіх...»

Асаднікі з паліцыяй узяліся за арганізацыю ў Глушцы зубатаўскіх саюзаў рамеснікаў. Створаны ўжо саюз муляроў, у які ўступіў і Максім Рунда. Навука, атрыманая ў турме, не прайшла дарма. Вядома, яго ў саюзе будуць цкаваць паліцэйскія стаўленікі, правакаваць на ўсякія лады. Максім ведае аб гэтым і гатовы пастаяць за рабочую праўду. Адно добра, што рабочы люд гуртуецца — будзе больш грунту для працы. Фашысцкія абяцанкі-цацанкі ўсё роўна не задаволяць рабочых, бо яны ніколі не споўняцца.

...Шмат злосці ў сялян на графа Ельскага. Нельга нагою ступіць у яго лес — на ягады, на грыбы трэба браць

білеты, трэба плаціць. Паны правялі хутарызацыю — скасавалі сервітут, і сялянская жывёла таўчэцца ўсё лета на голых выганах, на прырачным тарфяным куп'і. У дадатак, графскія палявыя вартаўнікі часта ловяць коней у шкодзе, калі яны забягаюць на панскую канюшыну. За кожную шкоду граф патрабуе найменш пяць злотых, а калі няма чым плаціць, то трэба адрабляць у маёнтку. Было ўжо нямала судоў за такія справы. Няма жыцця сялянам ад графа. Падумаць,— калі граф сустрэне селяніна на дарозе, узнімае нагайку і крычыць:

— Чаму не скідаеш шапкі?!

Сяляне кажуць:

— Стары граф нават гэтага не рабіў. А гэты... чорт, а не чалавек.

З дня ў дзень збіралася нянавісць у сэрцах людзей, і дастаткова было невялікай іскры, каб гэтая нянавісць успыхнула яркім полымем.

І такую іскру граф кінуў.

Нягледзячы ні на што, апруцянелы граф, як празвалі яго сяляне з пажаданнем, каб ён апруцянеў навекі, лезе са сваёй канавай па сялянскія палі.

Запалянка зашумела. Толькі і гутаркі — пра канаву і пра канаву. Шум перадаўся ў суседнія вёскі. На пасяджэннях вясковых рад выплылі, як невядома адкуль, прапановы: калі Запалянка палезе ў бойку з графам, пайсці дапамагчы ёй, але разам з гэтым выláжыць графу патрабаванні. Першае — вярнуць сервітут, другое — бясплатна збіраць ягады, збіраць грыбы, трэцяе — пры найме на работу павысіць заработную плату. Дзе гэта на свеце бачылі, каб працаваць за пяцьдзесят грошай у дзень?

Захар Зубец нездарма пайшоў у лес на работу. Там яго солтыс ужо не правярае.

Запалянцы напісалі прашэнне старосту, каб ён пасадзейнічаў сялянам і спыніў капанне канавы.

Атрымалі адказ, што канава павінна быць пракапана, бо для графа Ельскага няма іншага выхаду, што на асушанай зямлі граф зоймецца пасаджэннем тэхнічных культур, а гэта мае гаспадарчае значэнне для дзяржавы.

Мікіта Лазун прыўзняў галаву, павесялеў.

— Нічога не будзе з вашай гаворкі. Няхай граф капае, яго не спыніш. Толькі бяды нажывемся, калі пачнем спрачацца. Судзіцца з графам,— гэта ўсё роўна, што з казною. Нездарма прымаўка гаворыць: «Хочаш з казною судзіцца,

ідзі ў мора тапіцца»,— тарочыў Мікіта, стукаючы кіем у падлогу.

Сяляне ўпалі духам і пачалі ўжо думаць, што ўсё прапала. Аднак, калі на дапамогу графу прыбылі дзесяць паліцыянтаў і спыніліся ля канавы, з хат, як з вулля, вылецелі першымі жанчыны, пабеглі па поле і пацягнулі за сабою мужчын.

Паліцыянты разам з рабочымі пакінулі канаву ад аднаго жаночага крыку, праклёну. Канава зноў апусцела.

Вуліца Запаляпкі запоўнілася людзьмі — усё жывое, ад старога да малога, высыпала з хат.

Сярод натоўпу ходзіць Кузьма, сын Мікіты, і ўсё падгаварвае людзей, каб не паддаваліся графу. Яго ніхто не прасіў агітаваць, ён гэта робіць сам ад сябе, насуперак бацьку. Кузьма вярнуўся з Латвіі. Там крыху прыадзеўся. Але, вярнуўшыся, не можа нідзе знайсці прыпынку. Пажыве дзень-два ў старэйшага брата, потым у брата-лесніка і пасля ходзіць па вёсцы без прытулку. Памкнуўся раз пайсці да бацькі, але той сустрэў яго такімі словамі:

— Чаго ты прыйшоў! Ідзі туды, дзе быў. Ідзі сабакам сена касіць. Зямлі хочаш? Не дам. Ты ў мяне па гэта не зарабіў. Ты мой вораг. У бальшавікі запісаўся, то ідзі да іх.

Кузьма выслухаў бацьку, пазіраючы на жоўтыя наскі сваіх латышскіх чаравікаў, а потым узняў галаву. Па гэтым адным руху галавы можна было зразумець, што Кузьма скажа нешта рашучае. І ён сказаў:

— Я да цябе, бацька, больш не загляну. Але зямлю, якая мне належыць, я вазьму.

Кузьма адвярнуўся і пайшоў начаваць да Пеці Ціханчука, затаіўшы непрымірымую злосць на бацьку. За ноч Кузьма надумаўся пісаць у староства скаргу на бацьку.

Але хутка падзеі ў Запалянцы павярнуліся так, што гэта стала непатрэбным.

Сяляне ля канавы Ельскага паставілі сваю варту. Яна аднаго ранку і паведаміла ўсёй вёсцы, што Ельскі прывёў ужо не дзесяць паліцыянтаў, а семдзесят, з якіх дваццаць конных. Лічба рабочых была патроена. Стала магчымым давесці канаву да рэчкі за адзін дзень.

Жанчыны хацелі зараз жа бегчы да канавы, але іх стрымалі мужчыны. Па вуліцы вёскі прамчалася галопам дваццаць конных паліцыянтаў. На кожнага, хто пападаўся на вока, яны замахваліся нагайкамі і ляцелі далей, апырскваючы платы вулічнай граззю.

— От, ваякі з безабароннымі людзьмі,— крычалі ім услед людзі.

А ваякі памчаліся сеяць страх у суседнія вёскі.

Але памчаліся па вёсках не толькі яны. Памчаліся свае ганцы клікаць дапамогу.

Таццяна Ціханчук пастарэла ўжо. А як пачула, што даходзіць да бойкі з панамі, загаманіла па ўсю вуліцу. Народ выводзіць ужо на вулічныя баі ўсе свае рэзервы. Яны паспелі для гэтага.

У паход пайшлі вартаўніцы сямейных вогнішчаў — жанчыны, выслаўшы наперад сваю самую дарагую абарону — дзяцей.

Супроць фашысцкіх штыкоў першымі ідуць дзеці — ідуць, не баяцца, ідуць смела. І польскія фашысты яшчэ не адважваюцца чапаць дзяцей. Гэта, бачыце, не папулярна. Гэта можа падняць баявую актыўнасць мас на яшчэ вышэйшы ўзровень. Фашысцкія найміты намагаюцца адрэзаць дзяцей ад калоны, каб потым стаптаць бацькоў...

Так ужо робіцца ў гарняцкай Сілезіі, дзе бастуючыя гарнякі ўжо сёмы дзень не выходзяць са сваіх падзямелляў. Беручы прыклад з палітзняволеных у турмах, там, у змроку, сярод бліскучых глыбаў каменнага вугалю, яны абвясцілі галадоўку. А на паверхні зямлі дэманструюць іх жонкі, мацеры, сёстры, высылаючы наперад дзяцей.

Гераізм мас робіцца сцягам дня. Жандарска-паліцэйскія атакі захлынаюцца пад іх напорам. Усё больш і больш падае ахвяр ужо з абодвух бакоў. Фашызм курчыцца, ён супрацьстаўляе сябе ўжо ўсяму народу. Фашызм губіць свае бліскучыя бляшкі, якімі прыхарошваўся спачатку для ашуканства мас.

Гераічныя гарнякі Сілезіі не выходзяць з шахтаў, галадаюць, не хочуць паміраць паволынай смерцю са сваімі сем'ямі пры жабрацкай заработнай плаце.

Вось чаму плача Яніна Квяткоўская, беспрацоўны ўрач, у хаце Петруся Хадыкі. Вось чаму і яна ў гурт дзяцей паставіла сваю дзяўчынку, а сама далучылася да матак.

Вось чаму Люба Гарагляд узяла свайго сына на рукі і стала ў першым радзе, пакуль Малання не вырвала яго з рук з крыкам-дакорам:

— Ці ты здурнела? Яму ж толькі тры гадочкі...

Так і пайшлі. Не чулі зямлі пад нагамі. Толькі сцяга не хапала. Але ён у сэрцы кожнага.

Чула гоман і тупат ног ціхае асенняе неба. Прыўзны-

лыя палеткі разам з адзінокімі грушамі на іх застылі ў скупых сонечных бляскх.

Для паліцыі графа Ельскага такое відовішча, як гэтая калона з дзецьмі наперадзе, было нечаканасцю. Як? У такой закінутай Запалянцы, ды каб так?

Пры конным атрадзе паліцыянтаў відаць быў на кані і сам граф. Над канавай стаялі яго леснікі і Мікіта Лазун з сынам-леснікам.

Мікіта і пачаў прамову, калі калона спынілася ля канавы:

— Ідзіце дахаты! Пабойцеся бога!..

— Сабакар Ельскага! — крыкнулі галасы яму ў адказ.

Потым у напружанай, гарачай цішыні з натоўпу выйшаў інвалід Пятрусь Хадыка і падаў графу паперу, на якой былі напісаны патрабаванні сялян.

Граф прачытаў, парваў паперу на кавалачкі і кінуў.

— Гэтага ніколі не было і не будзе! Разыдзіся, каб я вас тут не бачыў ні аднаго!

Паліцэйскія чорныя шарэнгі застылі на месцы, як па камандзе «смірна». Конь афіцэра ўзмахнуў галавой, але нацягнутыя павадкі сцішылі яго.

— Разыдзіся! — крычаў граф.

Ніхто не крануўся. Вочы ўсіх прапізвалі графа і паліцыю нібы гарачымі праменнямі.

— Мы канавы капаць не дамо! — крыкнуў Дзям'ян Гарагляд.

Граф хацеў нешта сказаць, але так і застыў з разяўленым ротам. З альховага ляска выйшла другая калона.

Граф толькі прамовіў упаўголаса афіцэру:

— Камуністы папрацавалі...— і нацягнуў павадкі каня.

Голас афіцэра прагучаў тонка, прыглушана:

— Шаблі ў далонь! У атаку! Адрэзаць тую калону!

І тут пачалося. Коннікі апынуліся паміж дзвюх калон. Добра, што каменняў на полі хапае. Яны і паляцелі ў паліцыю градам. Траплялі метка, некаторыя нават ударыліся са звонам у клінкі шабляў.

Тацяна Ціханчук схапіла паліцыянта за нагу, і тады цэлая грамада жанчын кінулася рабіць тое самае.

Некалькі паліцыянтаў зляцела з коней. Жанчыны хапалі каменні, хапалі жменямі зямлю і кідалі, засыпаючы паліцэйскім вочы. Пад ударамі паліцыянтаў некалькі чалавек у шэрых світках упала на зямлю.

Рукапашная пачалася тады, калі ў рух пайшла пешая

паліцыя. А дзеці.... дзеці адбегліся і збіралі камепні, падавалі дарослым. Дзеці пасілі зброю.

Рука паліцыянта схапіла за горла Пецю Ціханчука, бледнага, пасінелага ад натугі. Пеця то гіне ў агульнай мітусні, як у хвалях, то пакажацца зноў, учапіўшыся за вінтоўку паліцыянта. Невядома, што было б далей, каб не падскочыў Нічыпар Байдак. Ён ударыў паліцыянта па руцэ калом, і паліцыянт выпусціў вінтоўку. Яна засталася ў руках знямоганага Пеці. Падхапіў Нічыпар Пецю разам з вінтоўкай і рвецца напралом, каб вынесці яго на поле. Адкуль ні ўзяўся Анупрэй Чарняк з крыкам:

— Давай яго, давай сюды!

Абяззброенага паліцыянта жанчыны збілі з ног і пайшлі па ім. Сяляне пачалі раззброіваць паліцыю.

Мікіта Лазун стаяў ля канавы, крычаў, бязлітасна моргаў бяльматым вокам. Убачыўшы свайго Кузьму, які вырваў вінтоўку з рук паліцыянта, кінуўся бегчы ў натоўп. Дабег да Кузьмы, ударыў яго кіем па галаве, але быў адпіхнуты назад.

Тады Мікіта крыкнуў сыну-лесніку:

— Страляй у яго! Страляй у адшчапенца! Ён зганьбіў увесь наш род! Няма яму месца на зямлі!

Граф Ельскі сядзеў на кані, бездапаможны, нерваваўся ў бяссільнай злосці і ўрэшце загадаў сваім леснікам страляць. Леснікі стрэлілі ўверх.

Граф падскочыў да іх і крыкнуў:

— Не ў неба! А туды, у хамаў!

Але стрэліў толькі адзін — сын Мікіты. У Кузьмы рука афарбавалася крывёю. Увесь натоўп рынуўся на леснікоў і, раззброіўшы, пачаў бязлітасна іх біць.

Пачуўся адзін стрэл, а потым другі. Хто страляе? Паліцыю трэба толькі раззброіць. А страляць? Не. Гэта яшчэ рана. Ад аднаго стрэлу ўпаў у канаву Мікіта Лазун, а ад другога зваліўся з каня граф Ельскі. Кузьму, аднаго Кузьму акружылі дзесяць чорных груганоў, б'юць гумавымі палкамі, не даюць яму падняцца. Афіцэр крычыць:

— Вязаць яго! Вязаць!

Пацягнулі Кузьму па зямлі, пацягнулі акрываўленага, без шапкі. І адбіць яго ўжо нельга. Паліцыя можа сыпнуць стрэламі. Але ўсё ж такі пайшлі. Загулі і пайшлі. Афіцэр падаў каманду — «агонь!». Некалькі чалавек упала. Але натоўп не адступіў. Ён крыкнуў адным крыкам. Паліцыянты не паспелі выкінуць гільзаў з вінтовак, як наступаючыя ўварваліся ў іх гушчу і ў адзін момант змялі.

Толькі відаць было, як чарнакрылыя постаці валіліся з ног, астатнія пачалі ўцякаць. Тады афіцэр выняў белую хустачку і замахаў ёю над галавой.

Сяляне спыніліся.

— Аддайце зброю! Ніхто вас больш не будзе чапаць!

Сяляне пачалі аддаваць вінтоўкі.

— Солтыс! — крыкнуў афіцэр.— Забраць вінтоўкі! Дзе солтыс?

З канавы высунулася галава Барсука.

Натоўп зарагатаў.

— То ты такі солтыс? Пся крэў! — крычаў афіцэр.

Не ўсе паліцыянты пайшлі за афіцэрам. Пяцьдзесят іх ляжала на полі параненых. З боку сялян пацярпела шэсцьдзесят чалавек.

К абеду староста прыслаў на месца бойкі санітарную групу з медыкаментамі.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Мёртвае зацішша настала ў вёсцы. Людзі, як пасля якой хваробы, хадзілі ціха. Пазіралі адзін на другога стомленымі вачыма. Нікому не хацелася брацца за работу.

Кузьма вылежваўся ў Пеці Ціханчука. Сама Таццяна, пабітая, ледзь соўгалася па хаце.

А потым надышла памятная ноч. Прыйшлі.

Прыйшлі крадком.

Солтыс Барсук паведаміў у Глушэц, што людзі ўжо вылечыліся. І тады яны прыйшлі. Першага скавалі Кузьму, каб ён мог далячыцца ў турме.

Затым забралі паўвёскі і пагналі ў недалёкую Картуз-Бярозу, у канцлагер. Пайшлі туды Пеця Ціханчук, Пятрусь Хадыка і Дзям'ян Гарагляд.

Яніна Квяткоўская, праводзячы Петруся, сказала:

— Не бойся, Пятрусь, усяму бывае канец. А я тваю хату дапільную.

— Я не з баязлівых, Яніна. Мы яшчэ вернемся,— адказаў Пятрусь,— сцеражы сябе.

* * *

1938 год...

У падвальнай камеры турмы надпёманскага горада сядзіць пятнаццаць чалавек, сярод якіх знаходзяцца Андрэй Касцевіч і Віктар Кухта. Усіх палітзняволеных сагналі ў самы аддалены куток турмы, сагналі нешта да чатырохсот

чалавек. У адзіночках ужо няма нікога з палітычных. Паддубны сядзіць на другім паверсе, Надзя — аж на трэцім. Здаецца, якое тут шчасце — убачыць часам з акна, як мільгне на паваротце яе постаць,— там, дзе за вуглом будынка відаць кавалачак прагулачнага пляца?

А ўсё ж — шчасце. Мільгне і ўсміхнецца.

З турэмнай бібліятэкі выключана ўся руская літаратура і прагрэсіўная польская. Засталіся шавіністычныя, антысеміцкія і бульварныя кнігі. Начальнік турмы з Галіцыі. Усё ў яго чорнае — валасы, вочы, твар. І душа ў яго таксама чорная. Правёў у турме новыя рэформы — замураваў вокны да палавіны, тэрмін прагулкі давёў да дзесяці хвілін, адабраў усе кніжкі. Пакінуў у камерах толькі шахматы. Пасля скаргі палітзняволеных пракурору дазволіў мець падручнікі па матэматыцы, фізіцы, хіміі. Але не даў падручнікаў логікі, псіхалогіі. На пратэсты зняволеных супроць гэтага адказаў:

— З сацыялогіяй вы развітайцеся назаўсёды. Вы антыдзяржаўныя злачынцы.

Гэты чорны начальнік любіць катаваць сам. Б'е зняволеных з размаху кулаком не толькі ў карцэравым калідоры, але і ў сябе ў кабінеце. Гэта ўжо салдафон. Ён узяў курс на фізічнае знішчэнне камуністаў. Наколькі ён тэрарызуе, настолькі і баіцца якіх-небудзь неспадзявана-раптоўных паваротаў з боку палітзняволеных. Да ўсіх ён звяртаецца на «ты», з асалодай топча годнасць чалавека. Калі ж гэты чалавек умела паставіцца ў абароне сябе, тады чорны начальнік раптам мяняе тон і называе «панам», каб потым зноў улавіць момант і ўдарыць чалавека з размаху ў зубы.

Два хлопцы з камеры, у якой сядзеў Андрэй, аднаго разу прыйшлі ад фельчара і прынеслі парашкі ад кашлю, закручаныя ў паперу з якойсьці кнігі. Калі ж прыгледзеліся да гэтай паперы, дык пазналі,— гэта старонкі з «Капітала» Маркса.

— Вось куды пайшла наша сацыялогія,— сказалі хлопцы. Прыхавалі лісткі да прыходу пракурора.

Пракурор, выслухаўшы, пачырванеў і пачаў ківаць на начальніка:

— Як гэта, пане начальнік?

Той паціскаў плячыма. Пракурор, каб выйсці з недарэчнага становішча, сказаў:

— Справа будзе расследавана...

Такі адказ гаварыў, што справа ніколі не будзе разбі-

рацца, што потым і атрымалася на самай справе. Але хлопцы гэтай сваёй скаргай, барацьбой за Маркса, вырвалі ў пракурора дазвол карыстацца рускай белетрыстыкай.

— Пане начальнік,— сказаў пракурор,— можа, вы аддасце ім расійскую белетрыстыку? Гэта ж не сацыялогія.

Праз некалькі дзён кат-начальнік пачаў праводзіць у жыццё самае галоўнае для фашызацыі турмы. Палітычных пачалі прымушаць працаваць. Кат загадаў, каб камуністы падмяталі свой калідор, ачышчалі прыбіральню і насілі катлы са стравай з кухні. Пачыналася, вядома, з малога, каб потым перайсці да большага — зраўняць палітычных з крымінальнымі, разбіць іх арганізацыю, ліквідаваць рэвалюцыйную школу выхавання.

Ужо два гады пасля прыезду з Вільні, з турмы Лукішкі, Андрэй выконваў абавязкі сакратара турэмнага камітэта палітзняволеных. Ужо ў змрочных, незвычайна цяжкіх умовах даводзілася ўтрымліваць арганізацыю, весці агітацыйна-прапагандысцкую работу, распрацоўваць пытанні тактыкі ў адносінах да турэмнай адміністрацыі. Арганізацыя палітзняволеных пайшла ў больш глыбокае падполле, чым было дагэтуль, бо вобыскі па новаму рэгламенту не давалі магчымасці хаваць матэрыялы звычайна, як бывала раней. Пры вобысках усе сеннікі распорваліся, салома вывальвалася на падлогу і старанна перашуквалася. Зняволеных прымушалі распранацца і мацалі ўсе рубцы ў каптанах і кашулях. А потым заглядалі кожнаму ў рот, у нос, у вушы, пад пахі і нават пад падэшвы ног.

І ўсё роўна матэрыялы, гэта значыць уся перапіска з камеры, даклады да Першамая, Кастрычніцкай рэвалюцыі, артыкулы аб міжнародным становішчы, тэзісы па нацыянальнаму пытанню, тэзісы па гісторыі КПЗБ, праграма Камінтэрна і іншыя — хаваліся.

Доўга панскія служакі не маглі выкрыць сакрэтаў схованак, хоць часта тупалі па іх нагамі.

Выкалупвалася лапінка разагрэтага асфальту з падлогі; рабілася ямка і потым закрывалася тым жа кавалачкам асфальту. Усё чыста, гладка — ні шчылінкі, ні дзірачкі.

Да наступу адміністрацыі палітзняволеныя былі падрыхтаваны. План быў даведзены да ведама ўсіх. Ён прайшоў абмеркаванні, атрымаў заўвагі, дадаткі, некаторыя змены. Прадстаўніком для перагавораў на выпадак атакі з боку ворага быў выбраны Віктар Кухта.

Арганізацыйная работа Андрэя праходзіць рана, да пабудкі, калі ўсе яшчэ спяць. Ён прачынаецца, нацягвае коўдру на галаву і прачытвае карэспандэнцыю з камер, атрыманую ноччу на «конях». Прачытаўшы, зараз жа піша адказы.

Некалькі маўклівым і нават панурым стаў Андрэй. Калі з'яўляецца ўсмешка, то яна на белым, удалікатнелым твары бліскае, як скупое сонца з-за хмар. Дзесяты год турмы лёг на плечы. Яе сырымі, заплясnелымі пахамі прасякнута ўсё — не толькі вопратка, але, здаецца, ты сам. Кожная хвіліна жыцця — гэта напружанне. Усё ў напружанні. Не толькі розум і сэрца, але і вочы, вушы, крокі. Часам падыходзіць стомленасць. Яна схіляе да дрымоты. Але ўсё роўна ў шахматы Андрэй гуляе мала: адзін раз, два на дзень. Карціць, што яшчэ нешта не зроблена. Узяўся паўтараць алгебру і геаметрыю. І паўтарыў. Добра, што ёсць грыфельныя дошкі. Рашыў усе задачы па задачніку Шапашнікава і Вальцава. Гэта супакойвае. Потым пакінуўся на хімію, да якой даўно меў ахвоту.

Андрэй адчувае, што сэрца яго б'ецца глуха — недзе глыбока, глыбока. Можа, гэта за курганамі шуміць лес і спявае незабытыя песні? Ці крынічная ручаінка ў забытай глушы прарываецца праз завалы, заторы на дне лясной лагчыны, туліцца між стромкіх узгор'яў? Невядома. Толькі здаецца, што асенняя слата начамі ападае на душу. Сніцца Андрэю невядомы скалісты акіянскі востраў, дзе несціхана штормам б'юць буруны. Складаецца песня аб прыкаваных да скалы, якія сняць аб свабодзе і спяваюць пра сэрца-компас. «Там на ўсходзе ёсць заветная краіна, усім прыкладам служыць яна...» У Нямеччыне на эшафот узыходзяць героі-камуністы. Тэльман у кайданах. Цяжка. Ілюзіі ружовай маладосці зніклі. Паміж турмой і воляй ужо няма розніцы. Каты — тут, каты — там. У турму прыходзяць, здаецца, апошнія людзі. Многія не вытрымліваюць. Тэрор і правакацыі лютуюць. Прыходзяць ужо масава, цэлымі групамі беларусы-каталікі. Вось калі яны скранулiся. Доўга ж трэба было чакаць, каб зараза пілсудчыны выветрылася з галавы. Ну і добра. Лепш пазней, чым ніколі. Здаецца, што сонца не ўзыходзіць, а ўвесь час вісіць над захадам і зараз, зараз зойдзе зусім.

Ад сціснутай навокал драпежнікамі Чэхаславакіі адабраны Цешын. Маршал Рыдз-Смiглы выступае з пустымі прамовамі, і сам ён неймаверна ідыятычна пусты. Робіцца наскок на Літву. Чытаючы газеты, хлопцы рагочуць з пам-

надурства польскіх палітычных дзеячаў. Часта мяняюцца кабінеты. Да ўлады прыйшоў нейкі Коц. І зараз жа нарадзілася сатыра. Коц па-польску значыць коўдра. Зграя польскіх рэакцыянераў-пілсудчыкаў і эндэкаў, абрабаваўшы народ, хоча прыкрыць свае зладзействы коцам, гэта значыць коўдрай. Грымі, дарагая Іспанія, грымі! Хлопцы ведаюць ужо дакладна тваю геаграфію — твае правінцыі, рэкі, горы. І ўсе адчуваюць, што там цяжка, цяжка. Але не здаецца гераічны Мадрыд.

Не здамося і мы...

Пасля снедання камерныя дзверы адчыніліся злосна. Уварваўся чорны начальнік з цэлым атрадам наглядчыкаў. Павёў вачыма па ўсіх і сам выбраў пяць чалавек. Сказаў:

— На калідор!

Пачалося... Так выбіраў з кожнай камеры.

На калідоры пачуліся ўдары, звярыны скрыгат, як жалеза аб жалеза. Прымушалі чысціць прыбіральню. Ніхто не згадзіўся. Пачалі біць. На крык пабітых застукалі пратэстуючыя кулакі ў дзверы камер. Тады больш сарака чалавек пагналі ў карцэры.

Пасля абеду Віктар Кухта запісаўся на прыём да начальніка, каб заявіць пратэст. Віктара выпусцілі з камеры і павялі ў карцэр. Там, на калідоры падзямелля, адбывалася масавая бойня. Кожнага клалі ніцма на падлогу. Адзін наглядчык садзіўся на галаву, другі на ногі, і ахвяра пад каманду чорнага начальніка атрымлівала дваццаць пяць удараў гумавай палкай. Пасля біцця чорны кат пытаўся ў кожнага:

— Пойдзеш працаваць?

Атрымліваў адказ:

— Не.

— У карцэр! — чулася каманда.

Так перабралі ўсіх. Больш шасцідзесяці чалавек на пытанне: «Будзеш працаваць?» адказалі: «Не!»

Віктара Кухту, прадстаўніка-парламенцёра, каталі асобна. Віктар атрымаў сто ўдараў і адказаў: «Не! Працаваць не пайду!»

Фашысты апусцілі рукі.

Яны пратрымалі ноч у карцэрах усіх шэсцьдзесят, а назаўтра рана выпусцілі, і чорны кат прыслаў «пшодовніка» для перагавораў з Віктарам.

Адна атака ворагаў захлынулася.

У выніку перагавораў згадзіліся, у мэтах аслаблення

напору фашыстаў, што кожная камера будзе падмятаць па чарзе толькі калідор. І на гэтым паставілі кропку.

Пасля такой няўдачы кат-начальнік быў пераведзены ў другую турму. На яго месца прыехаў другі, больш гнуткі і здрадлівы. Дазволіў выпісаць газету лявіцы ППС і пачаў тапцаваць ад другога. Пачаў рассаджваць палітзняволеных па нацыянальнасцях — беларусаў асобна, яўрэяў асобна, каб падарваць тое, што завецца інтэрнацыяналізмам...

Паддубны з другой камеры прыслаў пахвальны ліст. Хваліў тактыку кіраўніцтва палітзняволеных. Ён прыехаў нядаўна з Заходняй Украіны на апеляцыйны суд. Атрымаў яшчэ тры гады. Хацелі выбраць яго сакратаром парткома. Паддубны не згадзіўся. Сказаў:

— Вучыцеся вы. Вы ўжо ўмееце кіраваць. Навошта зрываць вас з працы, з якой вы дасканала асвоіліся?

Паддубны згадзіўся быць толькі членам парттройкі — прэзідыума, каб дапамагаць сваімі парадамі.

Так сакратаром парткома засталася Надзя, якая прыехала з Вільні на год пазней за Андрэя.

Паддубнага даводзіцца бачыць часта, але толькі здалёк. Больш за ўсё тады, калі іхняя камера ідзе на прагулку. Пасівелы, а галоўнае, худы зрабіўся Паддубны, твар стаў васковы. Толькі жвавасць засталася тая самая, і характэрная для яго паглыбленая цяпер маршчына, поўная напружання і клопату, цямнее над кірпатым пераноссем.

Усё больш рабілася ясна, што крывавы камедыянт Гітлер, заняволіўшы Аўстрыю, Чэхаславакію, нападзе на Польшчу, а потым на СССР. Набліжэнне вайны стала відавочным. Усе як быццам пачалі рыхтаваць сябе на фронт. На гэтым арыенціры будавалася ўжо і тактыка барацьбы з турэмнай адміністрацыяй. Надзённым стаў лозунг: «Не абвастраць становішча!» Трэба захаваць сябе да тых дзён, калі падзеі паклічуць да рашучых бітваў. Нягледзячы ні на што, партыя жыве і павінна жыць, бо жыве, квітнее СССР.

## ПЯЦЬ ПУНКТАЎ

Ноч у турме існуе не толькі для сну. Ноч у турме — гэта час для зносін і разведкі. А потым — для дыскусій, расказаў і песень. Ноччу ў рух ідзе Морзе, ездзяць «коні». Ездзяць яны зверху ўніз і ўбакі. Перавозяць прадукты

і пошту. Уся гэтая работа звязана з назіраннем за рухам двух наглядчыкаў — аднаго, што кружыць вакол будынка, другога, што сядзіць на калідоры. Даволі толькі заісці наглядчыку за вугал будынка, як па дадзенаму знаку «конь» ужо едзе.

У тую цёплую летнюю ноч «конь» прывёз ад Надзі незвычайна важную пошту. Жаночая камера мае сувязь з воляй. Хоць гэтая сувязь у апошнія часы стала вельмі цяжкай, але ўсё ж такі ёсць.

Андрэй, устаўшы на світанні, далёка да пабудкі, прачытаў невялічкую запіску ад Надзі, у якой папярэджвалася аб запісцы другой.

На адным лісточку курыцельнай паперкі было напісана пяць пунктаў. Андрэй прачытаў іх раз, прачытаў два, тры разы. Спыніўся ў задуме. А потым пачаў чытаць зноў спачатку. Зразумеў, нарэшце, уцяміў і нават запомніў змест паперкі. Глянуў на таварышаў, якія спалі салодкім сном, як наогул спіцца на світанні. Глянуў у нізкае акно ў кратах. Сонца яшчэ недзе купалася ў тумане.

Пяць панумараваных на маленькай паперцы пунктаў Камінтэрна гаварылі аб... роспуску КПП, а значыць і КПЗБ і КПЗУ.

Вестка такая, што яе нельга так хутка асвоіць. Андрэй па звычцы, як быццам механічна, перапісаў гэтыя гістарычныя пункты, каб адаслаць Паддубнаму. А сам цэлы дзень нікому не перадаваў незвычайнай навіны. Адклаў яе на вечар, калі ўлягуцца шумы, крыкі і нервы.

«Праклятая дыверсія! Яна то менш, то больш ясна адчувалася на шляхах, у ветрах на дарогах, у грымасах шпікаўскіх здзекаў. Яна, як злавесная птушка, то з'яўлялася часам перад вачыма, то знікала. Боль акрываўленых ахвяр напамінаў аб прытоеных, каварных кроках ворага. Дыверсія — тварэнне арганізатара правакацый разбойніка Пілсудскага і яго служак — паказала сваю зларадна-хцівую грымасу»,— думаў Андрэй, ідучы па прагулачным пляцы ўслед за таварышам.

Думка далей штурхала і гаварыла: дайце разабрацца. Роспуск партыі трэба лічыць своечасовым. Нельга ж зрабіць чыстку партыі ў нелегальных умовах. Адзін з пунктаў Камінтэрна гаворыць, што «ўсе сумленныя камуністы павінны ісці ў антыфашысцкі народны фронт і працаваць там для яго ўмацавання».

«Не, эпапея не скончана! Яна жыве! Рэвалюцыянеры-камуністы не пакінуць сніць аб апошнім барыкадным

баі. Роспуск партыі — гэта неабходнасць, якую трэба прыняць, як збаўленне для будучыні, як удар па ворагу...»

Колькі ж было той прагулкі? Напэўна, пяць мінут, хоць належыць пятнаццаць. Трэба ўжо заходзіць. З акна сваёй камеры паказаў галаву Паддубны. Гэта знак, што «пункты» ён ужо атрымаў.

Увесь дзень Андрэй гуляў у шахматы і маўчаў. Перасоўваючы тую ці іншую фігуру, часам кідаў фразу, хоць сам і не чуў яе: «Гордо реет буревестник...» Хоць гуляецца для самой гульні, але ўсё ж такі не хочацца паддацца партнёру. «Шах!» — і зноў, як між іншым: «Черной молнии подобный». Бровы хмурацца, сціскаюцца губы... Яшчэ раз — «шах!».

А дзень плыве недзе міма з мільёнамі клопатаў. Надзя быццам глядзіць у вочы, нешта хоча сказаць. Але тым знаёмым паваротам галавы адводзіць вочы ўбок, каб зараз жа глянуць зноў. Чамусьці твар у яе такі чысты, як святочны. Вось зараз яна пакладзе рукі на плечы і скажа: «Мы сумленна прайшлі свой шлях... Але адысці ў бок ад таго, што сталася, нам нельга... Трэба быць тым, чым былі,— выкрывальнікамі здрады».

«Усё роўна ветры на дарогах нашы»,— адкажа Андрэй.

«Так, нашы,— скажа яна,— але страты, дарагі мой, таксама нашы...»

— Ты доўга думаеш,— кажа партнёр,— хадзі...

— Што? Ага... правільна, я доўга думаю. Зробім ракіроўку.

Хіба зараз канец дня? Ён, гэты канец дня, застыў на месцы, ён увесь за сценамі ў горадзе. Там беспрацоўныя ў скверы дрэмлюць на лавачках, бо ім ноччу няма дзе спаць.

Задуменныя дымы плывуць з фабрычных комінаў і ападаюць долу, сцелюцца па зямлі. А па бліскучай, як люстра, галоўнай вуліцы бразгаюць шаблі, звіняць шпоры, шамаціць шоўк плаццяў. Усё гэта плыве ў адчынены касцёл. Вёскі далёка патанулі ў шызай дымцы. Там ліха стукае ў вокны.

Усё ж такі вечар надышоў. Пасля паверкі разлажылі пары, рассцялілі сеннікі, як кожны дзень, як заўсёды, і па просьбе Андрэя ўсе селі ў круг. Уступнае слова было свайго роду кароткім дакладам з гісторыі КПП і КПЗБ. Другая частка даклада прысвячалася выкрыццю арганіза-

тара правакацый і дыверсіі, палітычнага бандыта Пілсудскага. А потым... чыталіся пункты Камінтэрна аб роспуску партыі.

Андрэй растлумачыў, што роспуск часовы, што ў нелегальных умовах нельга зрабіць чыстку радоў партыі. Усё ж такі паведамленне зрабіла на ўсіх цяжкае ўражанне. Хто лёг, падклаўшы рукі пад галаву, хто пачаў хадзіць па камеры. Прахаджваўся і Андрэй. Чакаў выказванняў.

— Значыць, усё прапала? — казаў адзін.

— Чым жа ўсё скончыцца? — казаў другі.

— Народ без партыі не можа быць,— казаў трэці.

Андрэй, выслухаўшы некалькі выказванняў, поўных недаўмення і жалю, спыніўся ля стала і сказаў, быццам заскрыгатаў зубамі:

— Партыя створыцца на новых асновах.

Назаўтра Паддубны пісаў растлумачальнае пісьмо да ўсіх палітзняволеных турмы.

Дапушчэнні спраўдзіліся. Дэфензіва засцігнута знянацку.

У горадзе ад імя КПП, КПЗБ з'явіліся лістоўкі-фальшыўкі, якія заклікалі не выконваць рашэння Камінтэрна аб роспуску партыі. Усе адразу адгадалі, што гэта работа дэфензівы.

Хлопцам стала лягчэй на душы.

## ЛАСКА АРЛА

Кацярына, маці Андрэя, жыве адна ў хаце з самым меншым сынам, Васілём. У хаце пуста і змрочна. Ад Андрэя лісты прыходзяць рэдка-рэдка. Не ахвотнік ён да пісання лістоў. Калі возьмецца пісаць, дык не ведае пра што. Пісаць аб сваім здароўі не хочацца, бо ў гэтым, па яго думку, няма нічога важнага. Ведае аб усім Кацярына і нават крыху крыўдзіцца на Андрэя. Добра ж было б паслухаць аб паклонах «ад белага ліца да сырой зямлі», як пісалі сваім сем'ям некалі салдаты з фронту. Але не тыя ўжо часы і не да лістоў такіх цяпер. Усё змянілася. Змянілася і сама Кацярына. Яна па-свойму ўзбунтавалася супроць бога за ўсе нядолі і няшчасці ў жыцці. Кацярына ўжо трэці год не ходзіць у царкву і не моліцца перад іконай. Кожны дзень яна ўстае, як заўсёды, на світанні і моліцца ў акно, якое глядзіць на ўсход. Адтуль хутка

бліснe сонца. У сваім адзіноцтве ў словы малітвы, зместу якіх яна не разумее, уплятаюцца словы свае, звычайныя, шчырыя, словы, звернутыя да сонца, каб яно абагрэла змрочныя куткі жыцця. Прыпадае ніцма да земляной падлогі хаты і доўга не ўстае, быццам плача над дарагой магілай. Няма ўжо каму пажаліцца, няма каму выказаць думак, якія крывавымі згусткамі застываюць у душы. Вёска апусцела ад добрых, сваіх, прыхільных людзей. Толькі жабракі часта праходзяць праз вёску. З імі любіць гутарыць Кацярына Сямёнаўна. Яны расказваюць навіны, яны ўмеюць гараваць. А некаторыя і спяваюць. Праходзіў адзін дзед з ліраю, чаго даўно-даўно не было. Ён спяваў аб сонейку, што ўсім свеціць, аб шчасці, аб дастатку ў хаце. У той жа песні складна прасіў кавалачак хлеба, а можа, і сальца ў дадатак, прасіў палаценца на сарочку.

Слухала Кацярына, і балюча, а разам з тым і ўцешна рабілася на сэрцы. Абдарыла жабрака-лірніка хлебам і да хлеба, дала палатна на сарочку. А лірнік спяваў ужо другое — каб ветры не чапалі хаткі, каб груганы яе міналі, каб сонца не сыходзіла з вокнаў, каб у хляўцы рыкалі кароўкі, каб курачкі сакаталі. Многа ласкавага наспяваў лірнік. І калі ён пайшоў, Кацярына Сямёнаўна плакала — не то ад жалю, не то ад радасці.

Прыйшла вестка ў Запалянку, што Кузьма, сын Мікіты, засуджаны на дзесяць год катаргі. Прынесла гэтую вестку Ульяна, якая ездзіла на суд у якасці сведкі. Яна-то, можна сказаць, і выратавала Кузьму ад вечнай катаргі. Яна сведчыла ў абарону Кузьмы, абвінавачвала Мікіту, які прыгнятаў гэтага хлопца ўсё жыццё, як кат.

Здзівілася і анямела вёска, даведаўшыся, што казаў Кузьма на судзе. Калі старшыня суда запытаўся, ці шкадуе падсудны аб сваім учынку, Кузьма адказаў:

— Не. Каб бацька прачнуўся, ажыў, я забіў бы яго яшчэ раз.

Суд пераканаўся, як глыбока засела крыўда ў душы Кузьмы, і абмежаваў прысуд дзесяццю гадамі. Адвакаты гаварылі Кузьме, што такі, аднак, цяжкі прысуд дадзены больш за Ельскага, чым за бацьку.

Прыйшлі весткі і з канцлагера, з Картуз-Бярозы, што ўсе забраныя з вёскі маюць прабыць там шэсць месяцаў. А ці вернуцца жывымі, невядома, бо там збіваюць людзей да смерці.

Люба Гарагляд і Яніна Квяткоўская хочуць ехаць

у Картуз-Бярозу. Думаюць, што ўдасца перадаць ежу і дабіцца спаткання, хоць вядома, што да канцлагера і бліз-ка не падпускаюць нікога.

...Восень. Сумны час. Вясковая нуда, як кароста, прылiпае да сэрцаў людзей. Хутка прыедуць з воласці секвестратары браць за падаткі скаціну, адзежу. Забаронены ўсякія вечарынкі, зборышчы. Вёску часта па начах правярае паліцыя. Солтыс Барсук зноў ажыў і ходзіць па вёсцы, як чума.

Чапляецца да «камандзіра» Грыба, дамагаецца ад яго, каб той аддаў зброю — абрэз. Грыб выгнаў Барсука з падворка. Барсук, не тоячыся, прыгразіў, што прывядзе паліцыю.

Пасля гэтай сваркі, ноччу, перад світаннем, загарэлася хата Барсука. Заўважылі пажар толькі тады, калі тушыць ужо было нельга, бо полымя высока шугала над страхой.

Была выканана пастанова тых, хто ў турмах, у Картуз-Бярозе, у магіле,— пастанова аб апошнім сродку барацьбы са злоснымі канфідэнтамі.

Барсук дайграўся — з яго хаты ніхто жывы не выйшаў.

Ніхто не спачуваў Барсуку. Калі і былі такія, яны маўчалі.

Паліцыя вяла следства і нічога не даведалася. Людзі маўчалі, людзі ўпарта маўчалі.

Паліцыя адказала на пажар новай пацыфікацыяй, і тады і Грыб пайшоў у Картуз-Бярозу разам з іншымі.

* * *

Міналі дні, тыдні. Вёска Запалянка доўга свяціла пераплётамі стрэх, абадраных пры пацыфікацыі. Бо не было каму прыкрыць хат і не было чым. Трэба малаціць жыта, рыхтаваць кулі. Жанчыны плакалі кожны дзень. Люба Гарагляд і Яніна Квяткоўская разам з дзядзькамі — Апупрэем і Нічыпарам — нанялі малацьбітоў у іншых вёсках. Жанчыны складаліся — хто грашыма, хто збожжам, і малацьбіты прыйшлі...

Разам з імі апаўдня сышоў з гары, з-пад тых, цяпер задуменных, сосен, дзед-лірнік, тут яшчэ нікому невядомы. Ужо здалёк звінела струна яго ліры, і запусцелая вёска насцярожылася.

Людзі выходзілі з хат на вуліцу, спыняліся, чакалі лірніка. А ён ішоў, набліжаўся, высокі, сівы, абвешаны тор-

бамі, у старой дзіравай сярмязе. Натхнёны твар глядзеў белымі вачыма ўдалечыню.

Пасадзілі лірніка на камень пры плоце, ля хаты Андрэя Касцевіча, абступілі яго навокал і чакалі вешчых слоў. Лірнік намацаў струны пальцамі і пачаў спяваць нязнаную дагэтуль песню. Адкуль ён яе прынёс? Ад якіх меж і вятроў?

Задрыжалі струны, і задрыжаў голас лірніка:

На даліне, пры даро-зе-е-е...
На даліне пры дарозе,
Там ляжала два малайцы-ы-ы...

Задуменна расцягвае лірнік апошняе слова, і яно жалем-болем ліпне да сэрцаў слухачоў.

Два малайцы маладзенькі-і-і...

Узвышае голас лірнік, ударыўшы па струнах:

Два малайцы мала-а-дзенькі,
Йшчэ два браточкі родненькі-і-і...

Ужо бліснулі слёзы на вачах у жанчын ад ласкавых слоў лірніка, хоць канец песні яшчэ невядомы.

Адзін другога пытае-е-е...
Адзін другога пы-ы-ытае:
У каторага рана большa-а-а?..

Вось у чым сакрэт, вось чаму ляжаць браты-малойцы на даліне пры дарозе. Лірнік, перабіраючы струны, паясняе далей:

У каторага рана больша,
То ў таго і боль горша-а-а...

Што ж гэта за браты-малойцы ляжаць пры дарозе і вядуць гутарку аб сваіх ранах?

Можа, вязні выйшлі з-за крат і зняможаныя прылеглі пры дарозе? А можа, гэта песня пра Макара Краўчука і Антона Данілюка, якія, акрываўленыя, ляжаць недзе ля іспанскай дарогі? Ніхто не падыходзіць да братоў-малойцаў, нічый твар не схіліцца над імі з ласкай і дапамогай. І таму адзін брат гаворыць-пытаецца:

Хто ж нас будзе даглядаці-і-і?..
Хто ж нас будзе дагля-я-я-даці —
Нашы раны завіваці-і-і?..

Прыціхлі сосны на гары ў задуме, і недзе пакінуты адзінокі колас на мяжы пахіліўся долу. Над асеннімі палямі далёка крычаць жураўлі. Ці ж не прыйдзе маці да

параненых братоў? Маці, відаць, далёка, бо адазваўся нехта іншы.

Адазваўся сівы арол —
Я ж вас буду-у-у дагля-я-я-даці,—
Вашы раны выпіваці-і-і...

Плачуць мацеры і сёстры, трымаючы фартухі пры вачах.

— Хіба што так... Хіба арол дагледзіць іх?..— прамовілі дзядзькі Анупрэй і Нічыпар і, звесіўшы галовы, уздыхнулі.

Адны словы страшнейшыя за другія ліліся з вуснаў лірніка.

Вашы раны-ы-ы выпі-і-ваці,
Вашы вочкі выбіраці-і-і...

Здаецца, заміраюць струны пад рукою лірніка. Прыціхлі слухачы ў нямым болю. Хочацца прыпасці да зямлі, пашкадаваць усіх, заплакаць гарачымі слязьмі.

Вашы вочкі-і-і выбі-і-раці,
Вашы зубкі выбіваці-і-і...

Скончыў лірнік і звесіў сівую галаву над струнамі. І, здаецца, сціхла ўсё на свеце. Спыніліся ўсхліпы жанчын. Яны чакалі яшчэ чагосьці ад лірніка. Але лірнік маўчаў. Абдарыўшы ласкай слухачоў, ён чакаў ад іх таго ж самага. А пакуль што слухаў уздыхі і толькі прыўзняў галаву тады, калі ў натоўпе прарваўся плач. Гэта плакала Таццяна Ціханчук. Яе сын Пеця не хоча паміраць у Картуз-Бярозе...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Спяваюць начлежнікі... Не, гэта не начлежнікі спяваюць. Гэта цёмным вечарам у нядзелю выйшла ўся моладзь за вёску на луг, а лугам дайшла аж да лесу і расклала агонь на ўскраіне. Да агню прыйшлі хлопцы і дзяўчаты з іншых вёсак, а разам з імі прыйшлі і цымбалісты.

Нельга ўжо рабіць вечарынак у вёсках — у вёсках амаль асаднае становішча. Там цёмна, глуха і тужліва.

Шугае полымя... Яно асвятляе жвавыя твары маладых людзей, якія прыйшлі сюды. Кожны, хто прыходзіў, узнімаў руку, сціснутую ў кулак, і вітаўся лозунгам: «На акупанта!»

Увесь народ як быццам ідзе ў падполле.

Шугае полымя. Гучна пры агульнай цішыні раздаюцца словы хлопца-дэкламатара, словы з верша Янкі Купалы:

Гэй, гусляр, гусляр,
Ты удар, удар,
Першалы хмар
Выжый звонам струн —
Ты ад гумн да гумн
Запануй, гусляр!

А потым цымбалісты ўдарылі ў струны. То ўсхвалявана, бунтоўна, як узлёт увысь, то ціха, ласкава, быццам прыпадаючы да зямлі. І, урэшце, хор далучаецца да струн.

Плывуць гукі цымбал, плывуць у цёмную ноч, далятаюць туды, дзе зоры моргаюць — моргаюць неспакойна, трывожна.

Ды і самі гукі, як той залацісты прысак ад зораў, як іскры ад полымя.

Калі ж ужо разыходзіцца моладзь дахаты ў розныя бакі, пакідаючы расшуганае полымя, то чуецца той самы заклік, што і пры сустрэчы:

«На акупанта!»

## ЗАЛПЫ І КВЕТКІ

Першая гітлераўская бомба, кінутая на горад, упала на турэмны двор. Значыць, гітлераўцы праходзяць з вайной ужо ўсю Польшчу. Гэтага трэба было чакаць, мяркуючы па ходу падзей.

Учора турэмная адміністрацыя пры вячэрняй паверцы абвясціла, што ўначы будуць паветраныя манеўры, каб не палохаліся. А сёння рана выплыў з-пад хмар трохматорны самалёт з фашысцкай свастыкай, нізка спусціўся і кінуў бомбу на турэмны двор. Зразумела, ніхто не чакаў такіх «манеўраў». Затросся будынак. Некаторыя хлопцы ўпалі на падлогу. За акном узляцелі па-над дахам кавалкі бляхі і нейкай паперы. Хвалі раскалыханага паветра рванулiся праз краты і напоўнілі камеру смуродлівым дымам.

— Вось гэта дык манеўры! — ускрыкнуў Андрэй, усхапіўшыся з лаўкі.

Толькі пасля абеду даведаліся, што бомба забіла самага драпежнага ката «пшодовніка» Мазурыка, чатырох паглядчыкаў і двух крымінальных.

Яшчэ некалькі дзён назад той самы кат Мазурык, які ламаў рэбры нашым хлопцам у карцэры, сабраў усіх па-

літзняволеных на калідоры. Калі ўсе сталі ў дзве шарэнгі, ён пачаў гаварыць аб абароне Польшчы ад нашэсця немцаў і спытаўся:

— Хоць вы камуністы, але цэласць дзяржавы польскай і вам таксама ляжыць на сэрцы. Ці згодны вы бараніць Польшчу?

Сказаўшы так, глянуў на Андрэя.

Андрэй адразу адказаў:

— Згодны!

— Ну і добра.

— Дайце нам магчымасць выбраць камісію з трох чалавек для напісання дэкларацыі.

— Што ж... Раз так,— можна,— адказаў Мазурык.

Дэкларацыя была напісана.

Камісія абышла ўсе камеры, прачытала яе. Дэкларацыя была ўсімі прынята.

Вырашылі зрабіць збор у фонд абароны. Сабралі шмат каптаноў, шкарпэтак, кашуль і пяцьсот злотых грашыма. Уся гэтая маёмасць была перадана ў фонд дзяржаўнай абароны.

Усе пачалі жыць чаканнем, што вось зараз адчыняцца дзверы камер і хлопцам скажуць: «Выходзьце!» Усе палітзняволеныя рыхталіся ісці на фронт.

Удар па нямецкаму фашызму з'яўляецца ўдарам і па фашызму польскаму. Наша барацьба будзе барацьбой за дэмакратычную Польшчу.

Калідорныя наглядчыкі спачатку расказвалі аб поспехах польскіх войск. Нават перадалі газету «Дзеннік людовы» — орган лявіцы ППС, у якой Андрэй з цікавасцю прачытаў рэцэнзію на апошні зборнік вершаў Бранеўскага — «Муй погжэб» («Мае хаўтуры»). Сугучна часу гучалі яго вершы — вершы цяжкія, поўныя расчаравання ад пілсудчыкаўскай Польшчы.

Паэт шукаў сабе месца, дзе б яму найлепш памерці. І адказваў: вядома, што ў Польшчы. Яму тут знаёмыя таполі і вербы пры дарогах...

А гітлераўскія самалёты прыляталі кожны дзень і кідалі бомбы на горад.

Ужо наглядчыкі перасталі расказваць навіны аб поспехах польскіх войск. Не прыйшлі больш і газеты.

Палітзняволеныя кожны дзень на ранішняй і вячэрняй паверцы патрабавалі, каб іх выпусцілі з турмы на фронт.

Наглядчык кінуў у камеру віленскую газету «Кур'ер віленскі», з якой усе даведаліся, што паміж Савецкім Саю-

зам і Нямеччынай заключаны пакт аб ненападзе. Савецкі Саюз не можа адхіляць мірных прапаноў, ад каго б яны ні зыходзілі. Так вытлумачылі сабе гэты пакт палітзняволеныя.

— На фронт! Пусціце нас на фронт! — патрабавалі зняволеныя кожны дзень.

Турэмныя ўлады маўчалі, адцягвалі, не выконвалі свайго абяцання.

На патрабаванні не прыходзіў ні начальнік турмы, ні пракурор. Сярод наглядчыкаў адчуваўся ўпадак духу. Адзін з іх, па просьбе Андрэя, ціхенька сказаў, што «ўсё прапала, што немцы набліжаюцца да Беластока».

Патрабаванні — «На фронт!» былі ўзмоцнены.

— Вы што? Хочаце аддаць нас нямецкім фашыстам? — спытаў Андрэй на адной з вячэрніх паверак.

Старшы наглядчык, былы член ППС, адказаў:

— А што ж вы думалі?

Нахабнасць наглядчыка выклікала абурэнне. Тады ён спыніўся на парозе і прамовіў:

— Начальнік турмою ўжо не кіруе. Турма перайшла ў веданне магістрата горада.

— Давайце нам бургамістра! — крыкнуў Андрэй.

...Прасачылася вестка, што Чырвоная Армія рушыла ў паход, перайшла граніцу і набліжаецца. Радасць ударыла ў грудзі зняволеных, ускалыхнула іх і стрымалася... Ці не правакацыя гэта? Трэба быць асцярожным,— ой, як асцярожным!

Прывялі з адзіночкі Грышу Плотку і кінулі ў камеру Андрэя. Аказваецца, ён ужо месяц як прывезены з Вільні, з Лукішскай турмы, і за гэты час ніяк не змог дабіцца сувязі з агульнымі камерамі. Яго трымалі, як у ізаляцыі. Кат Мазурык наспеў катаваць яго два разы. Грыша зразумеў, што яго, адарванага ад таварышаў, хочуць знішчыць. Тады прыгразіў галадоўкай, патрабаваў пераводу ў агульную камеру, да сваіх. Катаванні спыніліся, але ад пераводу адміністрацыя ўстрымлівалася.

Гітлераўская бомба, якая ўпала на турэмны двор, і далейшыя падзеі адвярнулі ўвагу адміністрацыі ад Грышы. Наадварот, яна раптам палічыла, што ён, знаходзячыся ў адзіночцы, можа быць небяспечным для іх. І тады перавяла Грышу ў агульную камеру.

Грыша расказаў, што ў горадзе кожны дзень дэлегацыя рабочых ходзіць у магістрат з патрабаваннем вызваліць палітзняволеных з турмаў. Тады зноў ажылі надзеі

на вызваленне. Адносна таго, ці сапраўды ідзе Чырвоная Армія, Грыша адказаў:

— Чуў праз дзверы, як гаварылі паглядчыкі паміж сабою. Адзін казаў, што Чырвоная Армія ідзе, а другія аспрэчвалі, казалі, што няпраўда.

З гэтага ўсяго хлопцы зрабілі вывад, што трэба трымацца асцярожна, не паддавацца чуткам, пакуль не прыйдуць дакладныя, правераныя весткі.

Дзякуючы набліжэнню Чырвонай Арміі націск рабочых мас горада, відаць, быў настолькі моцны, што магістрат рашыўся ўрэшце выпусціць палітзняволеных.

* * *

Ціхі, сонечны вераснёўскі ранак. Тратуары запоўнены рабочымі масамі. А па вуліцы, пастроіўшыся ў стройныя шарэнгі, ішлі даўгалетнія вязні фашызму. Падымаючы лес рук, сціснутых у кулакі, яны выкрыквалі лозунгі, з якімі прайшлі ўвесь свой пакутны, баявы шлях у барацьбе за сацыялізм, за ўладу рабочых і сялян, за ўладу Саветаў.

«Рот-фронт! Рот-фронт!» — ляцелі словы, а ў адказ ім гучала з тратуараў тое самае: «Рот-фронт! Рот-фронт!»

«Няхай жыве Чырвоная Армія-вызваліцельніца! Няхай жыве Камуністычная партыя! Няхай жыве Савецкая Беларусь!»

Лозунгі гучалі за лозунгамі. На іх адказвалі працоўныя горада. Букеты кветак ляцелі на галовы ідучых.

Гэта ішлі камуністы-байцы вялікай арміі Леніна. І сонечнай гордасцю і радасцю яснелі іх твары.

Члены турэмнага камітэта ішлі разам. Як кіравалі барацьбой і жыццём зняволеных у турме, так не пакідалі мас і цяпер. Да туркома далучылася дэлегацыя рабочых горада — пажылыя людзі ў замазучаных кепках,— слесары, токары, шкладувы — радасныя, жвавыя, гутарлівыя. Яны расказалі камітэту, што Чырвоная Армія ўжо недалёка, што павінна ўжо была падысці, але чагосьці, відаць, затрымалася, бо яшчэ няма. Усе рабочыя горада падрыхтаваліся сустрэць Чырвоную Армію з кветкамі.

У горадзе адчуваецца цішыня і пустыннасць. У горадзе няма ніякай улады. Усё панства недзе пахавалася або ўцякло. Дайшлі да парку. Радыёрупар на клёне каля вуліцы яшчэ перадаваў весткі з фронту.

Рабочыя вялі цяпер былых палітзняволеных у паліцэйскі ўчастак. Паліцыя ўцякла, пакінула нават сваю зброю. Турэмны камітэт на хаду прымае рашэнне — усім узбро-

іцца, авалодаць горадам, выслаць атрад насустрач Чырвонай Арміі, разбіваючы па дарозе панска-фашысцкія гнёзды.

Надзя ішла з букетам кветак у руцэ паміж Андрэем і Паддубным і выглядала, як сонца.

У паліцэйскім участку сапраўды знайшлі кучы вінтовак, патронаў і рэвальвераў розных сістэм. Узброіліся ўсе, як мужчыны, так і жанчыны. Камандзірам выбралі Паддубнага, камісарам — Андрэя.

Паддубны падзяліў усіх на два атрады — больш як па сто пяцьдзесят чалавек у кожным.

Камандзірам другога атрада выбралі Віктара Кухту, камісарам — Грышу Плотку.

На двары былога паліцэйскага ўчастка адкрылі кароткі мітынг. Ад імя былых палітзняволеных выступіў Паддубны, ад рабочых горада — старшыня дэлегацыі. На мітынгу вырашылі, што атрад пад камандай Паддубнага пойдзе насустрач Чырвонай Арміі, а другі атрад пад камандай Кухты будзе дзейнічаць у горадзе, адначасова арганізуючы баявыя дружыны з рабочых.

Атрад Паддубнага рушыў ціхім завулачкам ля парку і непрыкметна дасягнуў ускраіны горада.

З атрадам жа Кухты здарылася ліхая бяда. Пакуль дзялілі атрад на групы і выбіралі камандзіраў, ганец-камсамолец прыбег з горада і далажыў, што зусім блізка, у былым «Доме жаўнера» сабраліся ўзброеныя фашысты. На вуліцы стаяць два кулямёты.

Калі член рабочай дэлегацыі, шавец, пакрочыў на чале атрада, каб вывесці яго на вуліцу, аднекуль пачуўся стрэл, і рабочы ўпаў забіты пры выхадзе з варот. Грыша Плотка сказаў:

— Мы, відаць, акружаны. Калі будзем выходзіць, нас усіх пераб'юць.

Рашэнне прынялі зараз жа: цераз цаглянную сцяну-агароджу выйсці ў горад.

Так і зрабілі. Але на вуліцы атакавалі іх узброеныя фашысцкія малойчыкі, якімі кіравалі пераапранутыя ў цывільную вопратку афіцэры.

Пачалася перастрэлка, якая ўсё больш і больш узмацнялася. У горадзе закіпеў заўзяты бой.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Відаць, прытоеныя фашысцкія сілы, скарыстаўшы тое, што Чырвоная Армія яшчэ не дасягнула горада, павыла-

зілі са сваіх нораў і пачалі дзейнічаць. Гэта — былыя паліцыянты, турэмныя паглядчыкі, гімназісты, члены маладзёжнай арганізацыі «Стралец», афіцэры рэзерва. Нялёгкую работу будзе мець атрад Кухты, каб расправіцца з імі.

Атрад жа Паддубнага стройнай выцягнутай калонай крочыў па шашы, мінаючы палі і пералескі. Патронаў у кожнага было дастаткова. Андрэй глянуў на свае патранташы і ўсміхнуўся. Тады, як прывязвала яму іх Надзя, ён нават не заўважыў, колькі гэтых патранташаў. І цяпер толькі адчуў іх цяжар.

Разведчыкі далёка пайшлі наперад.

Паддубны ідзе першы з правага фланга, як заўсёды крыху ссутулены, знясілены турмою. Так і відаць, як ходзяць косці лапатак пад курткай. Але Паддубны застаўся Паддубным. Той самы ўпарта наступальны позірк, які не церпіць няпраўды, тое самае ўнутранае гарэнне да работы, да дзейнасці. Цяжкую ношку працёс Паддубны на сваіх плячах за жыццё, поўнае напружання, пільнасці, поўнае любві да народа, да Краіны Саветаў, да Камуністычнай партыі. І цяпер ідзе ён бадзёра, размашыста, вясёлы, памаладзелы. Перад вачыма мільгне часам з памяці — далёка, далёка калчакоўскі фронт. Баявая маладосць... Тады ён быў батальённым камісарам. Цяпер ён ідзе, як камандзір, а камісарам яго выхаванец — «літаратар-псіхолаг» Андрэй, якога ён некалі ў сваіх Навасадах так груба «браў за віхры», каб накіраваць у народныя гушчы для высакароднай працы. Паддубны цяпер адносіцца да Андрэя па-бацькоўску, з ласкавым давер'ем.

Навокал, куды ні глянь, не відаць ніякага руху, не толькі ў полі, але і на самай шашы.

Ісці было лёгка, можна было б гутарыць, смяяцца ўволю. Турма за плячыма, а ў руках зброя.

Але навакольнае насцярожанае зацішша завастрыла пільнасць, і таму атрад крочыў амаль моўчкі.

Але хутка цішыню парушыў гул... Ён плыў здалёк, адтуль, дзе лес застыў у мяккай дымцы. Ён усё набліжаўся, і, урэшце, на фоне блакітнага неба ўдалечыні паказалася імклівая птушка. Нехта крыкнуў:

— Самалёт!

Спыніліся і чакалі. Самалёт ужо далятаў да шашы наперарэз атраду, і тады пачуўся крык некалькіх галасоў:

— Наш!.. Наш!.. Савецкі!

Сапраўды, перад вачыма замільгалі на крылах чырвоныя зорачкі.

Усе скінулі шапкі і ўзмахамі віталі доўгачаканага чырвонага разведчыка. Усе крычалі: «Ура! Ура! Ура!»

Самалёт нібы спыніўся над атрадам, які стаяў на шашы, і вочы кожнага прагна сачылі за тымі зорачкамі на крылах. Няўжо не пачуў лётчык гэтага «ўра»? Няўжо не пазнаў, што гэта ідуць узброеныя сыны Заходняй Беларусі, якія доўгія гады пакутавалі ў змроку панскіх турмаў і снілі аб чырвонай зорачцы з усходу? Лётчык! Пасланец Чырвонай Арміі! Спусціся на зямлю! Раскажы нам, дзе Чырвоная Армія? Мы ідзём насустрач ёй!

Лётчык не спусціўся. Лётчык павінен ляцець далей. Ён ляціць, як дарагая вестка, да ўсяго народа. Лётчык, відаць, заўважыў узмахі шапак і адказаў: сыпнуліся пёркі і, апускаючыся ўніз, закружыліся над атрадам. Лётчык быццам спыніўся ў лёце на хвіліну, а потым падаўся на Нёман да горада.

Андрэй услых чытаў усім лістоўку, у якой гаварылася аб паходзе Чырвонай Арміі на захад для вызвалення адзінакроўных братоў-беларусаў і ўкраінцаў. Ён чытаў як мага спакайней, хоць часам паветра не хапала. На адзін момант зірнуў на Надзю і толькі схапіў позіркам бліскучыя кропелькі, як расінкі, якія застылі ў яе вачах. Паддубны апёрся на вінтоўку рукамі і стаяў ціха. Калі Андрэй скончыў чытаць лістоўку, Паддубны сказаў палымянае слова пра Чырвоную Армію, пра нашу партыю. А потым падаў каманду так, як падаваў, можа, даўно-даўно — ён крыкнуў баявым, гордым голасам: «Стройся!»

Гэта была не толькі каманда, гэта быў і заклік.

Атрад бадзёра закрочыў па шашы.

Прайшоўшы трыццаць пяць кіламетраў, разведчыкі пры ўваходзе ў заціхлае, прытоенае мястэчка былі абстраляны паліцэйскімі групамі. Атрад спыніўся. На кароткай нарадзе вырашылі прыняць бой. Паддубны скамандаваў адысці ў малады, нядаўна пасаджаны парк і залегчы рассыпаным ланцугом. Так і зрабілі.

Доўгім ланцугом леглі былыя палітзняволеныя ў парку, ля самага плота. І тады лівень куль паліўся на іх галовы. Байцы Паддубнага не адказвалі, яны прыпалі галовамі да зямлі і чакалі каманды. Пасля невялічкай перадышкі пачуўся голас Паддубнага: «Агонь!» Аказваецца, панскія слугі адважыліся выйсці з-за вуглоў на вуліцу, відаць, хацелі атакаваць у лоб. Байцы Паддубнага ўдары-

лі ва ўпор, і некалькі паліцыянтаў упала. Залпы ляцелі адзін за другім, і паліцыянты ўцяклі на падворкі дамоў. Уцяклі і зніклі. Тады Паддубны загадаў палавіне сваіх байцоў пераісці на процілеглы бок парку, каб папярэдзіць прошукі ворага. Камандавацъ тоі палавінай пайшлі Андрэй і Надзя.

Меркаванні спраўдзіліся. Паліцэйскія хацелі зайсці ў тыл з другога боку парку, але тут сустрэлі ярасныя залпы і адкаціліся.

Пачынала цямнець. Паліцэйскія ўжо не ішлі, а паўзлі. Ужо тры чалавекі паддубнаўцаў ляжалі параненыя ў рукі. Надзя паўзла па ланцугу да іх і перавязвала раны, чым толькі можна было.

Навісла ноч, хоць зорная, але цёмная. Перастрэлка сціхла. Перавага паліцэйскіх была ў тым, што яны мелі ракеты. Вось ракеты час ад часу і ўзляталі, як рыжыя птушкі, над паркам. Тады грымелі залпы, а потым цемра пакрывала ўсё, і надыходзіла зацішша.

Андрэй, пакінуўшы замест сябе Надзю, прыпоўз да Паддубнага на нараду. Ён сказаў, што трэба выйсці з парку, бо паліцэйскія, якія акапаліся на агародах, могуць акружыць. Становішча рабілася нялёгкім. Урэшце вырашылі пакінуць у парку групу, каб перастрэлкай адцягнуць увагу паліцэйскіх, а ўсім выйсці праз вароты.

Вылазка прайшла ўдала.

Група, якая засталася ў парку, адцягвала ўвагу паліцэйскіх. Гэта дало магчымасць атраду прабрацца ў агароды і ўдарыць у тыл ворагу. Ракеты цяпер ужо дапамагалі байцам Паддубнага. З кожным бляскам можна было дакладна бачыць два доўгія ланцугі чорных шыпялёў, якія прыпалі да зямлі.

Удар па ворагу з тылу вырашыў лёс бою. Паліцэйскія адчулі сябе акружанымі і пачалі ў паніцы ўцякаць.

...Ракеты патухлі. Пранізлівы голас Паддубнага прарэзаў цішыню камандай: «Агонь!» Байцы беглі, стралялі на бягу. Паліцэйскія ўцякалі, пакідаючы раненых і забітых. Паддубнаўцы даганялі і ўжо білі прыкладамі, абяззбройвалі паліцэйскіх. А тыя беглі ўздоўж плота, але многіх нагапялі кулі. Хацелася прасіць у ночы, каб зоры пасвятлелі. Праследуючы рэшткі паліцэйскіх, паддубнаўцы выйшлі на вуліцу.

Ноч. Ускраіна мястэчка. Нейкае ціхае поле пад лёгкім туманам. Пад бокам — сырая зямля. Пры ўваходзе ў мястэчка стаяць ля першых хат чатыры вартавыя. Праз кож-

пую гадзіну мяняе іх Андрэй. Вяртаецца і кладзецца ў ланцуг ля Надзі. Далёка з поўначы далятае перастрэлка. Страляюць ужо з гармат. Мусіць, Чырвоная Армія дасягнула горада і б'ецца з рэшткамі груп. Лёгка цяпер стала Віктару Кухце са сваім атрадам.

Зоры пасвятлелі. Яны не мігцяць, як звычайна, а, здаецца, хвалююцца. Андрэй глянуў у твар Надзі, якая ляжала, апёршыся галавой на далонь, і ўбачыў адбітак зор у яе вачах.

Бялявыя палосы праясніліся на небасхіле. Праясніўся і лес за недалёкай шашою. Набліжалася світанне. Перастрэлка ў горадзе стала больш чутнай.

Задачай атрада стала цяпер зрабіць разведку ў мястэчка, ці не схаваліся дзе яшчэ недабіткі варожых груп. Разведчыкі прыйшлі і далажылі, што ў будынку гарадскога суда, у цэнтры, замкнулася адна група. Выбіць яе адтуль — было чарговай задачай.

Але гэтага рабіць не прыйшлося. Там, дзе павілася шаша ў далёкі лес, пачуўся грукат. Ён як пачаўся, так ужо і не сціхаў. Грукат набліжаўся — набліжаўся разам са світаннем. І калі нешта цёмнае, вялікае выплыла з лесу, усе ўсхапіліся на ногі і вачыма застылі на ім. Першыя іскры яшчэ нябачнага сонца асвяцілі сцяжок пярэдняй машыны.

— Танкі! — крыкнуў Паддубны.— Нашы ідуць! Стройся! Сустрэнем нашых!

У вялікай радасці не заўважылі, як з паўночнага боку, ад горада, адкуль чуліся гарматныя стрэлы, бегла праз поле з вінтоўкамі вялікая група, чалавек, можа, сто. Яны ўцякалі. Гэта былі паліцыянты і турэмныя паглядчыкі. Сярод іх можна было бачыць ягомасцяў і ў цывільнай вопратцы.

Паддубны крыкнуў:

— Атакаваць фашыстаў!

І сам пабег наперад.

Атакавалі ярасна і зладжана. Фашысцкія слугі памкнуліся ўбок, а потым з роспачы залеглі і адказалі стрэламі. Байцы Паддубнага пабеглі ў абход ворага і не заўважылі, як Паддубны схапіўся рукою за сэрца і тут жа апусціўся на зямлю.

Першай прыкмеціла гэта Надзя. Крыкнуўшы ў вуха Андрэю: «Паддубны ўпаў!», пабегла да яго і ўпала на калені. Паддубны ляжаў, і яго вочы з напорыстым сталёвым бляскам, вочы, якія ўмелі любіць і караць, нерухома гля-

дзелі ў блакітнае мяккае неба. Ужо не чуў ён, як Надзя прыкладала вуха да яго грудзей.

Вострая, балючая маршчынка застыла ў Надзі паміж бровамі. Яна змахнула з вока слязу, прыўстала на адно калена і зірнула навокал. Танкі Чырвонай Арміі павярнулі з шашы да мястэчка. Іх было пяць. За танкамі ехалі машыны з байцамі.

Надзя ўстала на ўвесь рост, сарвала чырвоную хустачку са сваёй шыі і пачала махаць ёю. А танкі грукаталі, набліжаліся, байцы ўжо адказвалі на прывітанне ўзмахамі рук і шапак.

Фашысцкая група, убачыўшы сталёвыя цуды, пачала ў паніцы ўцякаць у мястэчка. Многа з іх падала ад куль байцоў Паддубнага.

Надзя першая падбегла да першага танка.

* * *

Палкоўнік пагранвойск, камендант горада таварыш Вераб'ёў, не адымаючы тэлефоннай трубкі ад вуха, працягнуў руку Андрэю. Салідны, пасівелы палкоўнік рабіў прыемнае ўражанне.

Паклаўшы трубку, ён сеў і ветліва запрасіў сесці Андрэя. Спытаўся:

— Чым магу служыць?

— Дазвольце пахаваць аднаго нашага таварыша.

— Якога таварыша?

— Я прыйшоў ад імя палітзняволеных, вызваленых з тутэйшай турмы. У баі з фашысцкімі групамі, за трыццаць пяць кіламетраў ад горада, загінуў наш таварыш. Ён быў камандзірам нашага атрада. Прабыў у турме дванаццаць год.

Палкоўнік Вераб'ёў на момант зірнуў на Андрэя добрымі вачыма і паўтарыў:

— Дванаццаць год...— і задумаўся.

Андрэю здалося, што ён ціхенька ўздыхнуў.

Палкоўнік устаў.

— Ну што ж... Хавайце... Чэсць яго памяці...

— Таварыш палкоўнік,— пачаў Андрэй,— мы хочам правесці яго на могілкі масава, як належыць барацьбіту-рэвалюцыянеру. Гэтая справа ўжо ўзгоднена мною з начальнікам палітчасці дывізіі капітанам Палікарпавым.

— Ах, узгоднена... Добра,— схамянуўся палкоўнік і ўзяўся за тэлефонную трубку.

— Капітан Палікарпаў? Так? — гаварыў у трубку палкоўнік.— Гэта палкоўнік Вераб'ёў... Справа такая... Да мяне прыйшоў таварыш, былы палітзняволены...

Палкоўнік паклаў трубку і сказаў:

— Зразумела, трэба аказаць належную чэсць таварышу. Рабіце, як найлепш. Не дзівіцеся з маёй асцярожнасці. Яна зразумелая. Мы тут людзі яшчэ свежыя... Рад пазнаёміцца з вамі. Што вы зараз робіце, дзе жывяцё?

— З'яўляюся сакратаром рэўкома горада і членам камітэта рабочай міліцыі горада. Тое і другое стварылі мы — былыя палітзняволеныя. Ахова ўсіх устаноў горада ў нашых руках, пачынаючы ад вакзала, пошты і канчаючы шпіталем, бальніцамі.

— А жывяцё дзе?

— Пакуль што мы начуем у турме. Там наш штаб...

— У турме? — пацінуў плячыма палкоўнік і ўсміхнуўся.— Не надакучыла вам яна?..

— Гэта часова. Няма калі шукаць кватэр. Усе пад ружжом. Мы замкнулі пад ключ дваццаць турэмных наглядчыкаў, трох шпікоў з дэфензівы, двух польскіх палкоўнікаў. Адзін з іх кіраваў баямі ў горадзе. Арганізоўваў узброеныя групы супроць нашых войск. Мы выдалі загад па гораду аб здачы агнястрэльнай і халоднай зброі. Ужо зброю прыносяць... Палітчасць дывізіі ўхваліла нашу работу. Мы з ёю ў кантакце кожны дзень.

Палкоўнік слухаў і паўтараў:

— Добра... Добра... Адразу пазнаю работу рэвалюцыянераў. Вашы гады турмы не прайшлі дарма. Жадаю вам поспеху ў далейшым.

І палкоўнік працягнуў руку Андрэю на развітанне...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Чырвоная труна, упрыгожаная сцяжкамі, калыхалася над натоўпам і ў віры людскім усё плыла і плыла наперад. У труне ляжаў, апрануты ў новы касцюм пад гальштукам, Іван Паддубны, адзін з байцоў рэвалюцыі. Блішчалі яго валасы, гладка прычасаныя, так, як прычасала іх Надзя. Бант чырвонага колеру, колеру баявых сцягоў, прышыты над сэрцам. Далёка наперадзе наплылі вянкі. Іх многа. Гэта вянкі ад арганізацый рабочых розных заводаў і фабрык. Самы першы вянок ад былых палітзняволеных, ад таварышаў па зброі. За вянкамі ішоў у баявым парадку, узброены вінтоўкамі, атрад пад камандай Віктара Кухты. За ім крочылі сцяганосцы, высока ўзняў-

шы на дрэўках палотнішчы сцягоў з надпісамі рабочых арганізацый горада. Адзін сцяг быў ад палітчасці дывізіі чырвоных войск.

За сцягамі на плячах чатырох таварышаў плыла труна з заснуўшым назаўсёды Паддубным.

За труною ішлі члены рэўкома, разам з капітанам Палікарпавым, крочылі члены камітэта рабочай міліцыі на чале са старшынёй камітэта таварышам Васілём. Вырваўшыся з Сядлецкай турмы, ён з групай таварышаў прыйшоў сюды і застаўся. За камітэтам бясконцым патокам ішлі рабочыя і работніцы заводаў: фанернага, шклянога, скураных, кафельнага, цагельнага, лесапільнага, рабочыя і работніцы фабрык — табачнай, запалкавай, абутковай, швейнай і іншых і іншых.

Усе ішлі, каб правесці ў апошнюю дарогу аднаго з нязломных байцоў рэвалюцыі. У кожнага на грудзях прышыта чырвоная стужачка накрыж з чорнай — стужачкай жалобы.

У членаў рэўкома і камітэта чырвоныя павязкі на рукавах, абшытыя крэпам. Такая ж павязка і ў капітана Палікарпава — нацягнута на рукаў шыняля.

Рухаліся наперад, плылі пасівелыя галовы рабочых, потым маладзейшых — русых, чорнавалосых, з сур'ёзнымі, засяроджанымі тварамі. І так — бясконца...

Фотарэпарцёры — і адкуль іх столькі набралася — шчоўкалі сваімі фотаапаратамі, шчоўкалі з зямлі, з балконаў, а некаторыя ўзабраліся нават на дахі дамоў. На цэнтральнай плошчы, ля касцёла, стаяць дзве чырвонаармейскія гарматы з узнятымі ўгору ствала мі. Ля іх — байцы. Яны стаяць «смірна» і аддаюць чэсць — чэсць сцягам, чэсць таму, хто ўсё жыццё сваё прайшоў пад імі, чэсць народу.

Калона ішла без аркестра. Ды ён і не патрэбен быў. Колькі было тысяч у калоне, усе спявалі, спявалі размерана, магутна:

Вы жертвою пали в борьбе роковой
В любви беззаветной к народу...

Калыхалася калона ў маршы, калыхалася песня.

Враги-палачи изрекали порой:
«Пойдете, гремя кандалами...»

Так, «изрекали». Ой, як «изрекали»! Выцягвалі жылы, разбівалі грудзі, кідалі ў падземныя казематы. А па ўсёй краіне кожны трэці працоўны скатаваны. Не хутка ўсё

забудзецца. Забраныя ў гарадской дэфензіве кайданы, наручнікі, драцяныя нагайкі, клешчы, помпы, жалезныя пальчаткі, гіры і іншыя прылады катаванняў здадзены капітану Палікарпаву. Ён прыняў іх, расклаў на стале і ўсхваляваўся. Глядзеў і ўсё прыгаворваў, сціскаючы кулакі, прыгаворваў так, як быццам скрыгатаў зубамі:

— Праклятыя фашысты! Каты! Праклятыя паны! Вось чым кармілі народ! Не, гэтага забыць нельга!

Цяпер капітан Палікарпаў ідзе ў калоне таксама ўсхваляваны, поўны павагі і любві да ўсяго таго, што робіцца зараз навокал.

На могілках грамадзянскую паніхіду адкрыў вучань, друг і паплечнік Паддубнага Андрэй Касцевіч.

Узлезшы на пастамент чыйгосьці надмагільнага помніка, Андрэй гаварыў:

— Хаваем Івана Паддубнага, старэйшага рэвалюцыянера-камуніста, нязломнага барацьбіта на нашым баявым шляху, палымянага трыбуна, вернага сына партыі Леніна. З маладых год пачаў Паддубны свой рэвалюцыйны шлях... Не было таго дня і ночы ў краіне панскага варварства, каб Паддубны куды-небудзь не ехаў або не ішоў для арганізацыі народных сіл на штурм акупацыі і фашызму...

Адным духам, адным залпам сказаў сваю прамову Андрэй. Успомніў царскі Пецярбург, далёкую Сібір, калчакоўскі фронт, глухія палескія дарогі, змрочныя турэмныя казематы і апошнія баявыя дні са зброяй у руках.

— Радасць захлынула сэрца Паддубнага, радасць вызвалення,— гаварыў Андрэй,— з гэтай радасцю ён і памёр. Убачыў танкі Чырвонай Арміі-вызваліцельніцы, убачыў дарагіх байцоў, павёў нас у атаку на групу фашысцкага зброду і лёг на зямлю ад кулі варожай. Усё выканаў таварыш Паддубны, усё споўніў, давёў да канца, каб развітацца з намі назаўсёды. Але мы цябе не забудзем, таварыш Паддубны...

Ад імя камітэта рабочай міліцыі горада выступаў Павел Шахновіч. Ён расказаў эпізоды з сумеснай працы ў падполлі, гаварыў слухачам пра загартаваную душу Паддубнага.

Потым выступалі рабочыя. Яны пракліналі панскую ўладу, славілі Чырвоную Армію-вызваліцельніцу, славілі партыю Леніна і кляліся быць у барацьбе за савецкую ўладу такімі, якім быў таварыш Паддубны.

Апошнім выступіў капітан Палікарпаў. Узрушаны,

натхнёны, ён выказаў сваё захапленне мінулым камуністаў-падпольшчыкаў.

— Дарагія таварышы! — гаварыў ён.— Няма прыгажэйшага жыцця, як жыццё рэвалюцыянераў, бо яно ўсё да астатку аддаецца народу. Так аддаў сваё жыццё і таварыш Паддубны...

...Загрукалі камячкі пяску па веку труны. Яма запоўнілася, і на ёй яшчэ ўсё рос і рос насып, як курганчык. Дэлегацыі неслі вянкі і ўскладалі іх на свежую жоўтую зямлю, а Андрэй за кожным вянком гучна гаварыў, ад каго вянок.

Былыя палітзняволеныя, пастроеныя ў дзве шарэнгі, па камандзе Віктара Кухты ўзнялі дулы вінтовак уверх. Па ўзмаху яго рукі прагрымелі салют за салютам — тры разы ў гонар таварыша Івана Паддубнага, у гонар дваццацігадовай гераічнай эпапеі працоўных, якія набылі сваю айчыну.

* * *

У былым будынку магістрата шумна. Натоўпы людзей з рознымі справамі напіраюць на камітэт рабочай міліцыі. Намеснік старшыні камітэта Грыша Плотка з чырвонымі ад бяссонніцы вачыма толькі падпісваецца на паперках і прыкладае пячатку. У асобным пакоі адбываецца пасяджэнне камітэта — трэба падрыхтаваць роспуск атрада былых палітзняволеных, бо органы часовага ўпраўлення ўжо ствараюць грамадзянскую міліцыю.

Праз натоўп у пакамечанай шэрай кепцы з расшпіленым каўняром кашулі праціскаецца расчырванелы Саша Грынявіцкі. Ледзь дабраўшыся да стала Плоткі, пытаецца:

— Дзе тут можна знайсці Андрэя Касцевіча?

Плотка паказаў пакой, а потым, прыгледзеўшыся да Сашы, крыкнуў:

— Гэта ты Саша Грынявіцкі?

— Я... Прыбеглі мы — цэлая група — аж са Святога крыжа, з-пад Кракава.

Саша пайшоў у пакой.

Пазнаўшы Сашу, усе члены камітэта ўсталі. Мала таго што амаль не адарвалі яму рукі пры вітанні, але ўзялі ды падкялі аж тры разы «па ўра».

Таварыш Васіль — Павел Шахновіч ляпаў Сашу па

плячы, гладзіў па галаве, а Сашу вырывалі другія, каб прытуліць, абняць. Саша жывы, Саша вырваўся з катаржнай турмы вечнякоў, што закінута ў непраходных Святакрыжскіх гарах.

Увайшоў вартавы і далажыў, што на двор прыйшла больш чым рота польскіх салдат. Увесь камітэт спыніў пасяджэнне і выйшаў.

Пастроеныя доўгай калонай стаялі польскія салдаты з вінтоўкамі прыназе.

Збоку стаяў чалавек з шэрымі пасівелымі вусамі, таксама з вінтоўкай. На пагонах меў па тры лычкі. Калі камітэтчыкі спускаліся з ганка, ён падаваў каманду:

— Бачнасць!..— і наблізіўся да капітана Палікарпава на тры крокі. Адрапартаваў:

— Товажышу капітане! Жаўнеры восемдзесят трэцяга пяхотнага палка ў ліку трыста тры да вашай дыспазіцыі.

— Дзякую,— адказаў капітан Палікарпаў і пацiснуў руку камандзіру трохсот трох жаўнераў.

— А цяпер слухайце маю каманду! — сказаў капітан.— Вольна!

Усе жаўнеры сталі «вольна».

— Вайна скончылася, таварышы,— працягваў капітан,— прыйдзецца вам здаць зброю і ісці да мірнай працы. Зброю складайце вось тут...

І капітан паказаў на месца, збоку, парослае травой.

Кожная чацвёрка клала вінтоўку, патроны на зямлю і вярталася на сваё месца ў шарэнгу.

Андрэй прыгледзеўся да запыленага, са змучаным тварам камандзіра жаўнераў і падышоў да яго:

— Добры дзень, таварыш Вацлаў! Як ты сюды трапіў з такім войскам?

Вацлаў Санкоўскі заморгаў вачыма, працёр іх і толькі тады ўсміхнуўся:

— Анджэю! Як гэта добра... Я цяпер сапраўды свабодны... Бачыш, пайшоў я добраахвотнікам на фронт. Пабываў у розным пекле, бачыў ганьбу нашых панскіх кіраўнікоў і гора салдат. Быў аж у Памераніі, потым пад Варшавай. Калі ж Чырвоная Армія рушыла на захад, накіравалі наш полк у Беласток супроць Чырвонай Арміі. Ноччу мы ўзводам уцяклі з палка. Сустрэлі такіх жа ўцекачоў, аб'ядналіся і шукалі, дзе б сустрэць Чырвоную Армію, каб перайсці на яе бок. Так вось і прыйшлі сюды.

— Як вас не затрымалі на вуліцы ўзброеных?

— Першаму вартавому я сказаў, каб завёў нас да

ўлад, дзе б можна было здаць зброю. Ён завёў да свайго камандавання, якое накіравала нас у палітчасць.

Усе жаўнеры здалі зброю і сталі пастроенай калонай. Капітан Палікарпаў правёў з імі кароткую гутарку аб бяздарных польскіх кіраўніках, што давялі Польшчу да развалу, прадалі фашысту Гітлеру. Потым капітан звярнуўся да Андрэя, папрасіў сказаць гэта жаўнерам папольску, што Андрэй ахвотна зрабіў.

Калі гутарка скончылася, капітан Палікарпаў усміхнуўся, з момант паглядзеў на жаўнераў і скамандаваў:

— Разыдзіся! Вы — вольныя грамадзяне!

Андрэй расказваў капітану Палікарпаву пра Санкоўскага. Капітан слухаў, здзіўляўся, а потым падышоў да запыленага вусача і працягнуў руку:

— Давайце пазнаёмімся бліжэй. Прыходзьце сягоння з таварышамі да нас у палітчасць. Пагутарым.

Капітан пайшоў. Андрэй узяў пад руку Санкоўскага і павёў да таварышаў на другі паверх былога магістрата.

— Можа, ведаеш, які лёс Барвіны?

— Камендант рабочай міліцыі Беластока. Гэта я чуў па дарозе ад аднаго беластачаніна. Больш нічога не магу сказаць.

— Пойдзем да нас, на нашу кватэру,— гаварыў Андрэй.— Жывём мы пакуль што ў турме. Вось распусцім нашу гвардыю, тады пачнем шукаць кватэры. Там у нас памыешся. Нашы жанчыны знойдуць табе касцюм і ўсё, што трэба. Скончым пасяджэнне і тады...

Сашу Грынявіцкаму ўвесь час не цярпелася спытацца ў Андрэя, можа, ён ведае, як там дома, у Запалянцы. Нарэшце, выбраў момант і спытаўся.

— Не ведаю, Саша,— адказаў Андрэй.

* * *

Чырвоны сцяг высока развяваецца пад вёскай Запалянкай, пад усім наваколлем. Дрэўка для сцяга зрабіў дзядзька Анупрэй. У самы канец яго ён убіў выразаную з бляхі пафарбаваную зорку-пяцікутку.

З гэтым сцягам усе навакольныя вёскі хадзілі ў Глушэц сустракаць Чырвоную Армію. Гэта было ўвечары. Хто абрэз, хто вінтоўку ўзяў з сабою. Стварылася цэлая баявая дружына, каманду над якой узяў Дзям'ян Гарагляд.

Прыбыў у Глушэц Зубец Захар на чале цэлага натоў-

пу сялян, таксама ўзброеных. З ім прыйшоў і Марцін Шапко.

А Максім Рунда чакаў дапамогі, каб пачаць ачыстку Глушца ад ворагаў.

Максіму ўдалося схапіць двух шпікоў з дэфензівы, дзесяць паліцыянтаў, пераапранутых ужо ў цывільную вопратку, некалькіх чыноўнікаў староства. Удалося схапіць пана Буякоўскага і ксяндза Абнорскага. Людзі Максіма Рунды абшукалі будынак былой павятовай камендатуры паліцыі, пасля чаго там стварылі рэўком. Сакратаром рэўкома выбралі Захара Зубца.

А Чырвонай Арміі ўсё яшчэ не было. Толькі ўсю ноч прыбывалі атрады ўзброеных сялян з навакольных вёсак. Трэба выслаць атрад на шашу для сустрэчы Чырвонай Арміі. Каго выслаць?

Просіцца Марцін. Захар адказаў:

— Цябе? Куды цябе? Цябе хіба богу маліцца ў манастыр, гэта можна. Будзеш сядзець тут, як пастаянны дзяжурны. Сядзі і перапісвай усіх байцоў. Пішы... Пяць атрадаў накіравана для раззбраення і арышту асаднікаў.

Марцін сядзеў маўклівы, макаў пяро ў чарніліцу і пісаў. Нічога не зробіш, раз вінаваты — маўчы. Некалі адмаўляўся ад заданняў, усё скардзіўся на жывот. Што праўда, то праўда.

— Я зараз пайду з байцамі, трэба зрабіць вобыск на кватэры ксяндза. Прыйдзе Максім, няхай застаецца тут. Толькі глядзі, каб якая сюды птушка пераапранутая не заляцела. Дзе твой рэвальвер?

— Вось,— паказаў Марцін на кішэню.

— Пакладзі яго на стол, каб быў пад рукою. Не забывайся, што тут рэўком. І ноч на двары. Калі не справішся, дальбог, пасаджу ў халодную.

Толькі хацеў Захар пайсці, як у пакой увайшоў Нічыпар Байдак. Ён дома ляжаў на печы крыху хворы. Наогул, апошнімі часамі ён пачаў прыхворваць ад перажыванняў, ад таго, што паны яшчэ жывуць, не хочуць уцякаць за Буг. Калі ж яму сказалі, што ўсе пайшлі ў Глушэц сустракаць Чырвоную Армію, не вытрымаў — саскочыў з печы. Адкуль і сілы ўзяліся.

— Чаго хочаш, дзядзька? — спытаўся Захар.

— Усе пайшлі лушчыць паноў. Дайце мне людзей, і я пайду. Я — салдат Петразаводскага палка, меў медаль за стральбу.

Захар глядзеў на дзядзьку Нічыпара і ўсміхаўся:

— Ці здолееш, дзядзька?

— Здолею. Камандаваць умею! — дзёрзка адказаў дзядзька Нічыпар, стоячы па камандзе «смірна» перад Захарам і трымаючы шапку ў руцэ.

Захар кіўнуў Марціну:

— Дай яму з рэзерву дваццаць чалавек. Няхай ідуць абшукаюць глушэцкі маёнтак. Можа, каго знойдуць.

Дваццаць чалавек пастроіліся перад рэўкомам на вуліцы. Потым Захар з Марцінам чулі з пакоя гучную каманду Нічыпара:

— Правае плячо ўпярод! Шагам — а-а-рш!

Захар слухаў, апусціўшы галаву, і ўсміхаўся.

Праз пару гадзін тры байцы дзядзькі Нічыпара прывялі сальніка Карнікевіча, Падаляку і Канапца. Дапытваў іх сам Захар.

— А чаго гэта, Іванка, цябе занесла ў той маёнтак? Га? — звярнуўся Захар да Падалякі.— Можа, у Румынію збіраўся ўцячы з панамі? Га? Ты некалі казаў, што мы ў палітыцы зялёныя, калі мы настойвалі, каб ты пакінуў асадніцкі саюз. Вось бачыш... Усё ж такі мы не зялёныя. Мы — чырвоныя, Іван.

— Слухай, Захар, не дурыся, адпусці. Жарты надумаў строіць,— сказаў Іван Падаляка.

— Гэтым не возьмеш,— адказаў Захар,— папсаваў ты нам крыві нямала. Здраднік ты!

Захар павольна падняўся з месца, і гэтак жа павольна ўз'ярошыліся яго валасы, як у вожыка. Рэвальвер бліснуў у руцэ. Падаляка збялеў.

— Не бойся, чарнасоценец, страляць не буду. Падохнеш ты без гэтага. Марцін! Скавацъ яму рукі! Упусці другога.

Увайшоў Канапец з прыпухлым тварам.

— Добры дзень, таварыш Зубец! — пакланіўся Канапец.

Захар маўчаў. Панура глянуў на Канапца.

— Ну, што, адвакат, падаткаў многа пазбіраў для паноў? Чаму ж яны цябе з сабою не забралі? Туды, туды, у Румынію. Разам з рыдзамі і бекамі і ты пабекаў бы. Чаго вас занесла ў маёнтак?

— А проста так. Мы хацелі яблыкаў парваць.

— Яблыкаў? Які ж ты дурань! Ты мяне хочаш абдурыць? Марцін, давай сальніка!

Праціснуўся праз дзверы, як вяпрук, сальнік.

Захар агледзеў яго з галавы да ног.

— Ну, як там калы твае, ламы цэлыя? Э-э-х... скопчылася тваё свінное свята. У Румынію захацеў, га?

— Мала што яны гавораць,— скрыпучым голасам адказаў сальнік,— самі толькі і тарочылі аб гэтым. А тут на мяне...

Кананец глянуў на сальніка з дакорам.

Захар усміхнуўся.

— Добра, паедзеце ў Румынію, мы вас адпусцім. На чорта вы каму тут патрэбны, дармаеды,— сказаў Захар,— пойдзеце да сваіх панкоў. Марцін! Скавацъ і ў халодную!

Марцін каваў рукі арыштаваным і не мог глянуць ім у вочы. Толькі прамовіў:

— Раз сказана, трэба слухацца...

Час ад часу прыбывалі з раёна дружыннікі з арыштаванымі асаднікамі, афіцэрамі, солтысамі і іншымі панкамі. Захар Зубец усіх замыкаў, як ён казаў, у халодную.

Вярнуўся са сваімі дружыннікамі дзядзька Нічыпар. Увайшоў у пакой да Захара, бухнуў аб падлогу прыкладам вінтоўкі і далажыў:

— Знайшлі двух. Аднаго — палкоўніка, а другога — нейкую егіпецкую даму.

— Егіпецкую? — спытаўся Захар.

— Ага, кажа, што яна з Егіпта.

— Ну, гэта дзіва. Давай іх сюды. А сам, дзядзька, адпачні крыху... там...— Захар кіўнуў галавою на дзверы.

Уварваўся, як шалёны, камандзір Грыб і адразу сыпнуў словамі:

— Дзесяць асаднікаў арыштаваных. Куды іх?

— У халодную. Вернешся да мяне.

Пакуль вярнуўся Грыб, Захар дапытваў пажылую даму ў вялікім чорным капелюшы з пяром, якая сядзела ў аддаленні ад стала.

— То вы з Егіпта? — пытаўся Захар.

— Не, я толькі была ў Егіпце на банкеце ў караля.

— Ага, гэта значыць па выпіўцы.

Дама ўсё імкнулася перасесці на крэсла ля стала. Захар рухам рукі стрымліваў яе імкненні.

— Сядзіце, сядзіце там. Я вас і там добра бачу. Хто ж вы? Адкуль?

— Я? Я — графіня. У нас увесь род графы.

— Ма-а-а... — працягваў Захар.— Зразумела... У нас тут граф Ельскі быў. То, можа, вы...

— Ведаю, ведаю... Я ў іх бывала. А цяпер я прыехала

да паноў Вашчынскіх забраць свае рэчы. Я прыехала, а іх няма.

— То, можа, яны перасяліліся з палаца ў хатку? Ці, можа, у Румынію пабеглі, а вас пакінулі?

— У якую хатку? Румынію? Нічога не разумею.

— У нас тут ёсць такая цагляная хатка. Цяпер усе паны сюды перасяляюцца. А што да Румыніі, не прыкідвайцеся. Пабывалі ў егіпецкага караля, а цяпер да румынскага захацелі.

— Дзіўна... Што гэта за хатка? — назнарок дзівілася графіня.

— Вы туды не трапіце. Марцін! Адвесці гэтую пані ў асобны пакой!

— Гэта куды? — затараторыла дама.

— Нічога, нічога, вам там будзе добра.

— Я пратэстую, я пратэстую. Гэта гвалт. Я — графіня...

— Ніякіх гвалтаў. Усё спакойна. І для графінь месца знойдзецца.

Графіня выйшла, выціраючы хустачкай пачырванелы нос. Уляцеў Грыб.

— Слухай, Грыб, вазьмі трыццаць чалавек і ідзі на шашу. Спыняйце ўсе машыны, падводы і пешых. Паны ўцякаюць у Румынію. Зразумеў?

— Слухаю,— адказаў Грыб, крутнуўся на адной назе і знік за дзвярыма.

Перад світаннем веставы Грыба данёс у рэўком, што набліжаецца Чырвоная Армія. Захар загадаў адшукаць Антона Шчыгельчыка. Яго прывялі соннага і спалоханага.

— Не бойся. Арыштоўваць цябе не будзем, хоць ты і буржуй... Падрыхтуй добрыя пачастункі, каб хапіла хлеба і да хлеба. Разумееш?

— Разумею, разумею...— скваппа адказаў Шчыгельчык.

— На ранак спатрэбяцца... разумееш? — дадаў Захар.— Ну, вось і ўсё. Чым больш...

— Добра, добра...— адказаў супакоены Шчыгельчык.

Рана, з усходам сонца, уехалі ў Глушэц гарматы, уехалі на машынах байцы Чырвонай Арміі.

Ад імя насельніцтва Глушца і раёна армію віталі хлебам-соллю Дзям'ян Гарагляд і каваль Міхал Кушалевіч...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Высока развяваецца чырвоны сцяг над Запалянкай, развяваецца ён на той грушы, на якой стары Касцевіч зра-

біў шпакоўню. У хаце Касцевічаў сельсавет. На сцяне прыбіты другі чырвоны сцяг з лозунгам: «Няхай жыве Савецкі Саюз!» Гэта той сцяг, які Дзям'ян трымаў некалі на дэманстрацыі ў Глушцы. Начальнік палітчасці палка сказаў Дзям'яну захаваць сцяг, каб потым перадаць у музей. Заняў зноў сваё месца ўсім тут знаёмы Радзішчаў.

Сакратарыць у сельсавеце Люба, дачка Дзям'яна.

Прыходзяць сюды кожны дзень старыя сябры. Не хапае толькі Пеці Ціханчука. Ён памёр ад катаванняў у Картуз-Бярозе.

Яніна Квяткоўская, беспрацоўны ўрач, не можа вярнуцца на сваю радзіму, у Польшчу. Радзіма запалапёна, стогне пад ботам гітлераўцаў. Яніна прыжыла сабе сына з Петрусём Хадыкам.

Старшыня сельсавета Дзям'ян Гарагляд рыхтуе спісы сялян, якія павінны быць надзелены зямлёй. Ачуняўшы пасля Картуз-Бярозы, ён цяпер часта расказвае пра яе. Там было столькі ўсяго пякельнага, што хопіць расказваць на ўсё жыццё.

Прыходзіць часта сюды і Піліп Гайдук. Ён цяпер гаспадар у маёнтку.

Ён вырваўся з беластоцкай турмы, пераначаваў у Станіслава Барвіны і адразу падаўся з горада, каб дабрацца дахаты. Сустрэў на дарозе чырвонаармейскія танкі і ад радасці не ведаў, што рабіць. Стаў пры дарозе, скінуўшы шапку, і заплакаў. Выціраў слёзы, махаў шапкаю. А потым заспяваў «Інтэрнацыянал».

Ліліся слёзы з яго вачэй.

Піліп Гайдук спяваў страфу за страфою, а танкі з грукатам усё плылі і плылі... Насустрач ім палявымі дарогамі натоўпамі выходзілі вызваленыя людзі з хлебам-соллю і кветкамі.

Да Піліпа Гайдука прыйшоў жыць Кузьма — сын Мікіты. Усё ўгаворвае Піліпа паехаць у горад на работу. Не хоча тут жыць Кузьма — шмат цяжкага перажыта ў гэтых мясцінах, трэба пайсці ад іх далей. Кузьма вельмі рад вызваленню Заходняй Беларусі, а значыць, і свайму вызваленню з далёкай коранаўскай турмы, што стаіць у горадзе Коранава, каля самай нямецкай граніцы, адкуль і вырваліся зняволеныя, раззброіўшы варту, якая ўжо мала і ўпіралася. Пад налётам нямецкіх самалётаў прабіраўся Кузьма праз усю Польшчу дахаты разам з такімі, як сам.

Піліп жа не хоча ісці ў горад, ён хоча працаваць у саўгасе, аб чым часта гаворыць Кузьме.

— Тут, у гэтым маёнтку, будзе саўгас, Кузьма... Ты пакуль што сцеражы сад, каб ліхія людзі не паламалі яго, а мы вось выберам батрацкі камітэт і наладзім асеннія работы па полі.

Здаецца, усе браліся за перабудову грамадскага жыцця на новы лад. Па вёсках шумелі сходы, там гаварылі аб зямлі, аб школе, аб інвентары, аб савецкай газеце, аб кніжцы.

Але памылкай было б сказаць, што ўсе людзі да аднаго былі поўныя энтузіязму, радасці будучай працы для паляпшэння свайго народнага жыцця. Вось, напрыклад, Апанас Хмель сядзіць дома такой ашпаранай ціхоняй, як быццам яго наогул няма на свеце. Так прыціх, што нават і з жонкаю не сварыцца. Але, каб ісці насуперак усяму, Апанас прыдумаў свой спосаб дэманстрацыі. Раптам ні з таго ні з сяго стаў такім гаспадаром, што можна толькі здзіўляцца.

Апрануты ў рабочую куртку, надперазаны раменьчыкам, у лапцях, ён пастуквае сякерай на сваім падворку, дабудоўвае невялікі хлевушок для парасят. Гэты хлевушок пачаў будавацца пяць год назад, але гэта ж зусім няважна. Важна зараз для Апанаса пастукваць сякерай і не звяртаць увагі на тое, што робіцца на вуліцы і наогул у вёсцы. Што яму да таго, што ў вёсцы збіраецца сход, што групкамі з гоманам праходзяць мужчыны і жанчыны, а перад імі і ўслед ім з вясёлымі выкрыкамі падскакваюць дзеці.

Усяго гэтага Апанас заўважаць не хоча.

Ужо год, як ён не служыць лесніком. Пабаяўся.

Калі пачаліся масавыя выступленні сялян супроць леснікоў, калі сяляне бралі дровы ў дзяржаўным лесе і не хацелі за іх плаціць, Хмель спалохаўся, каб яго, чаго добрага, не забілі. Уцёк са службы. Думаў прабрацца ў Беласток, ды так і не сабраўся, хоць атрымаў ад Аркадзя Дзенісевіча два лісты з запрашэннем. Ва ўсякіх няўдачах у сваім жыцці ён і надалей вінаваціць сваю жонку.

А гэтая, ва ўсім «вінаватая» жонка падыдзе да Апанаса і скажа:

— Схадзіў бы ты хоць раз на сход. Нічога цябе ўжо не цікавіць. Там пра калгасы нешта гавораць.

Апанас толькі махне рукою і прамовіць неакрэслена: «А-а...» А потым гляне на неба і скажа:

— Абедаць пара, ужо есці хочацца.

Жонка вядзе сваё:

— Кажуць, што Аляксей Верас вярнуўся з Іспаніі, яшчэ недзе ў дарозе.

— А што? Мне з ім дзяцей хрысціць, ці што? Ідзі збірай абедаць.

Жонка пойдзе, а Апанас стаіць, узяўшыся ў бокі, і тупа глядзіць на абчэсанае бярвенца, як быццам у бяздонную яму. Апанас усё нешта думае, думае. А потым сам сабе прамармыча:

— Мы яшчэ сваё знойдзем. Адзіны шлях — або рахункаводам у калгас, або бухгалтарам у які-небудзь трэст нарыхтовак.

Але чыйсьці голас чуецца з воддалі, голас трывожны:

— Над бухгалтэрыяй, як і над усім, стаіць савецкае правасуддзе. Ад яго не схаваешся!

Апанас пацісне плячыма, нейк згорбіцца, нават баязліва гляне навокал і ў задуме папляцецца ў хату.

А Верас Аляксей сапраўды праз два дні прыбыў дахаты, у сваё Забалоцце.

Прыбыў ён непасрэдна з Дзядоў. Туды завёў іх сам сівы камандзір Сцяпан Каваль. Вяртаючыся з Іспаніі, малойцы Сцяпана не далічыліся аднаго сярод сваіх. Гэтым адным быў Сава Супрун. Ён нібы метэор праляцеў над роднымі лясамі ў цёмную зорную ноч. Праляцеў і пайшоў у Іспанію, каб там, на яе палях, злажыць галаву за свабоду народаў.

Быў цёплы вераснёвы ранак, калі «іспанцы» на чале са Сцяпанам Кавалём прыбылі на ваенных машынах у раён Залатой гары.

Прабіраючыся знаёмымі ляснымі сцежкамі, яны дайшлі да Дзядоў. Па-першае, зайшлі да Мар'яны. А тая, узрадаваная, з вачыма, поўнымі шчаслівых слёз, вітала гасцей аднымі і тымі ж словамі: «А, мае міленькія... а, мае саколікі...» А апошняга з гасцей абняла Мар'яна і заплакала, паклаўшы яму галаву на плячо. Апошняга абняла Мар'яна свайго Антона Данілюка ў салдацкай гімнасцёрцы, нават мала пастарэлага.

А потым праз пару гадзін адкрыўся шматлюдны мітынг ля магілы Данілы Перагуда. Прыйшлі людзі з бліжэйшых вёсак, сталі навокал магілы і слухалі, стаіўшы дыханне, як гаварыў Сцяпан Каваль. Сцяпан быў такі ж высокі і плячысты, як і раней, толькі больш пасівеў. Ён

стаяў на стале і з усмешкай аглядаў усіх, а з-пад насівелых вусоў вылятаілі словы:

— Раз панскае ліха разбіта і не вярнуцца яму назад, трэба перабудоўваць жыццё па-новаму. Жыццё па-новаму! — паўтараў на ўвесь голас Сцяпан, і ціхі прыветны бор глухім асенпім рэхам падхопліваў: «Па-новаму!..» Без гора, без слёз! — дадаваў Сцяпан.— Каб людзі жылі і радаваліся жыццю, як дзеці. Даволі стагнаць і сушыць душу, ідучы з плужком за худою трыбухатай кабылкай. Ідзе ён, дзядзька наш, і плужком — дрып-дрып... А кабылка тры крокі ступіць і стане,ісці не можа, бо і яна, бедная, бяссільная, як і яе гаспадар. Многа ты надрыпаеш такой кабылкай? Вось та-ак... Калектывы патрэбны, калгасы. Каб на нашай зямлі, пакрыўджанай панамі, пайшлі трактары, каб яна, зямля наша, закрасавала ўраджаямі. Вось за гэтую справу вы і бярыцеся. Дапамогі ад савецкай улады вам будзе дастаткова, толькі майце даволі ахвоты і старання.

Доўга яшчэ гаварыў Сцяпан, а бор па шляху ляснаму разносіў яго словы. А потым пачаліся расказы пра Іспанію — пра горы Барселоны, пра раку Эбро, пра гераічную абарону Мадрыда, пра смерць Савы Супруна, які загінуў у разведцы, пра гераічныя атакі брыгады імя Яраслава Дамброўскага.

— Яшчэ барацьба не скончана,— заключыў Сцяпан,— трэба порах трымаць сухім!

З вясёлым гоманам разыходзіліся людзі з мітынгу. Здаецца, разышліся ўсе, усіх схаваў на сваіх дарогах і сцежках магутны бор. І навокал стала ціха. Але не... Нейкая жанчына стаіць пасярод дарогі і белым фартухом выцірае вочы ад слёз. Побач з ёю — хлопчык год адзінаццаці. Ён трымае кепку ў руцэ. Цёмна-русыя валасы ў беспарадку звесіліся над чорнымі бровамі. Ён надзеў кепку і сказаў:

— Пойдзем, мама...

Гэта была Ганна Каравай са сваім сынам — Паддубным меншым. Яны пайшлі дарогай на Глушэц, каб дайсці да Андрэя Касцевіча, пайшлі з надзеяй сустрэць Івана Паддубнага. Усе, бачыце, вяртаюцца. Вось нават з Іспаніі вярнуліся, а яго ўсё няма і няма. Сэрца штосьці неспакойнае. Яшчэ не ведае яно, што давядзецца яму прытуліцца да дарагой магілы — там, у далёкім вызваленым ад паноў горадзе.

...Высока развяваецца чырвоны сцяг над Запалянкай. У хаце Андрэя Касцевіча сядзяць Люба Гарагляд і «іспа-

нец» Макар Краўчук, які прыйшоў з Дзядоў. Ім ёсць аб чым пагаварыць. Макара запрашаюць у Глушэц. Пачынаецца падрыхтоўка да выбараў у Народны Сход у Беласток. Макару прарочаць быць старшынёй гарсавета ў Глушцы.

## ЭПІЛОГ

Поезд бадзёра імчыць на ўсход і на ўсход. Ён імчыць пад ціхімі, радаснымі зорамі. Ужо застаўся ззаду Беласток, увесь у агнях, які ўсё больш і больш ахутваецца начной туманнаю смугой. Толькі яшчэ доўга відаць, як палыхае, гарыць над горадам чырвоная зорка.

У поездзе едуць члены паўнамоцнай камісіі Народнага Сходу Заходняй Беларусі. Сярод членаў старыя сябры — Андрэй, Надзя, ад рабочых Беластока — Вацлаў Санкоўскі, Станіслаў Барвіна. Едзе вясёлы Саша Грынявіцкі.

Ад Народнага Сходу засталіся ў вушах толькі адны воплескі і крыкі «ўра»... Безупынныя воплескі. Аж душа ўжо не магла іх стрымліваць. Там гаварыліся прамовы, прымаліся рашэнні аб нацыяналізацыі фабрык, заводаў, банкаў, зямлі, лясоў, рэк і азёр. Галоўнае, была радасць, было захапленне ад сустрэчы з усходнімі свабоднымі братамі. Усё гэта вылівалася аж за берагі. Хацелася толькі глядзець па іх, доўгачаканых, усміхацца і вітаць узрывамі радасці.

Кожны ў душы гаварыў: «Навошта тут афіцыйныя пастановы? І так усё даўно ясна. Усё зразумела само сабою». Але пастановы, безумоўна, патрэбны. Гісторыя народа ёсць вялікая кніга, якую трэба дапісаць, давесці да ведама ўсіх, пакінуць патомкам.

Надзя шаптала на вуха бледнаму як палатно ад бяссонніцы Андрэю. Ён быў у сваім горадзе старшынёю акруговай выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў у Народны Сход і стомлены пасля бяссонных начэй прыехаў на сход як дэпутат. Надзя шэпча яму на вуха:

— Глядзі, вунь сядзіць першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі.

— Дзе, дзе? — замітусіўся Андрэй.

— Вунь, у ложы, пасярэдзіне...

Андрэй прыгледзеўся да смуглявага чалавека з чорнымі вачыма і чорнымі бровамі, у ваеннай форме. Ён сядзеў

сярод ваенных, найбольш з ромбамі на пятліцах мундзіраў. Там быў і камандуючы Беларускім фронтам.

Поезд усё імчыць і імчыць на ўсход пад ціхімі радаснымі зорамі, імчыць ён у Мінск, а там далей — у Маскву на пятую пазачарговую сесію Вярхоўнага Савета.

Саша Грынявіцкі будзе чытаць там дэкларацыю Народнага Сходу Заходняй Беларусі. Саша выступаў на Народным Сходзе, акружаны ўвагай і пашанай усіх прысутных. Ды інакш і не магло быць. З пастушка, які некалі спяваў, стоячы на казацкім камені, ён вырас у народнага героя.

У Андрэя яшчэ ў вушах чуваць словы Сашы з трыбуны.

— Якая ж нам улада патрэбна? — пытаецца Саша і зараз жа сам адказвае:

— Ну, вядома,— савецкая...

Яго словы пакрывае гром воплескаў.

Прыпынак у Мінску. Начлег у вагонах. Шэры мяккі дзень на вуліцах Мінска. На дахах дамоў і дрэвах лёгкі сняжок.

Усе разбрыліся па горадзе, каб пахадзіць свабодна. Надзя водзіць Андрэя за сабою. Іменна — водзіць, бо ён паслухмяна ходзіць за ёю. Падышлі да Дома Урада, паглядзелі на помнік Леніну, Андрэй падрабязна разгледзеў усе барэльефы на пастаменце. Адразу кінулася ў вочы ансамблевая гармонія паміж Домам Урада і помнікам Леніну. Хацелася нешта сказаць перад помнікам, але яно, тое, што прасілася, толькі закіпела ў душы. Шмат прыйшлося б гаварыць.

Тады пайшлі па шматлюднай Савецкай вуліцы. Ішлі паволі, як адпачываючы.

Дайшлі да ўтульнай Ленінскай вуліцы, поўнай прыгожых магазінаў. Надзю пацягнула туды. Андрэй схапіў яе за руку.

— Другім разам. Карункі твае не ўцякуць. Пойдзем усміхнемся людзям, небу, як ты кажаш.

Так дайшлі да будынка ЦК.

Рыпнулі цяжкія дзверы, і прад вачыма паплылі ўверх шырокія сходы, засланыя дываном.

Узышлі наверх і пастукаліся ў дзверы прыёмнай першага сакратара ЦК. На калідоры рассцелены мяккі дыван, і не чуваць, як людзі ідуць па ім.

Дзяўчына ў прыёмнай сказала пачакаць. Сакратар ЦК зараз прыедзе. І зноў агарнула цішыня, цяпло. На

сцяне партрэт Леніна. Цікае гадзіннік. Насупраць — дзверы, абабітыя чорнай цыратай,— гэта ўваход у кабінет сакратара ЦК. Праз акно відаць, як за вуліцай насупраць будуецца дом.

На калідоры пачуліся ціхія крокі. У прыёмную ўвайшоў сакратар ЦК. Ён быў у чорным паліто, у чорнай звычайнай кепцы. Увайшоўшы, пазнаў Андрэя і Надзю, злёгку ўсміхнуўся і прамовіў:

— Добры дзень!

Андрэй з Надзяй усталі і адказалі на прывітанне.

— Вы да мяне?

— Так...

Сакратар ЦК выняў хустачку з кішэні і пачаў выціраць спацелы лоб пад казырком кепкі.

— Уфф... Пакуль узышоў — нагрэўся. Галава пухне ад вашай Заходняй Беларусі... Столькі работы прыбавілася...— сказаў ён тонам паўжарту і коратка засмяяўся.— Што ж... заходзьце...— дадаў ён і адчыніў дзверы ў кабінет.

Калі Андрэй з Надзяй, увайшоўшы, на запрашэнне селі, сакратар ЦК, ужо распрануты, у ваеннай кашулі, закурыў папяросу і пачаў прахаджвацца за сталом узад і ўперад. Памаўчаўшы, сказаў:

— Вось... у вашай асобе павязем вызваленую Заходнюю Беларусь у Маскву. Вы рыхтуйцеся да выступлення на сесіі.

— Незвычайным гэта будзе для нас,— сказаў Андрэй.

— Нічога... асвойтаецеся, дапаможам. Ну, а потым — за работу. Работы многа.

Сакратар ЦК расказаў некалькі смешных эпізодаў з вызваленчага паходу Чырвонай Арміі — аб тым, як паны траплялі ў пастку.

За акном пачаў падаць лёгкі сняжок.

Андрэй з Надзяй непрыкметна пераглянуліся. Трэба пачынаць сваю гутарку. Пачала Надзя:

— Таварыш сакратар!

Сакратар ЦК скінуў попел з папяросы ў попельнічку і спыніўся.

— Мы... вось я і ён,— мітусліва, заікаючыся, гаварыла Надзя,— працуючы ў падполлі, нажылі сабе сына...

— Ах, вось як...— весела адказаў сакратар,— вось вы якія. Нават і сына... Ну і што?

— Мы перадалі яго адтуль сюды... Просім вас дапамагчы нам знайсці яго.

— Ага-а... Гэта можна. Знойдзем. Раз ёсць, значыць знойдзем.

І, назіраючы добрымі вачыма на маладых бацькоў, сакратар зняў тэлефонную трубку і зноў паўтарыў сваё:

— Ох, і работы прыбавіла Заходняя Беларусь...

Гутарка з кімсьці па тэлефоне была кароткай.

— Словам, сын ваш ёсць,— сказаў сакратар.

— Ёсць? — спыталіся ў адзін голас Андрэй з Надзяй.

— Ёсць, ёсць,— прамовіў сакратар і сказаў установу, куды трэба зайсці.

Андрэй з Надзяй падзякавалі і выйшлі.

А ўвечары яны ўжо ведалі адрас дзіцячага дома ў Іванаве-Вазнясенску, дзе быў іх сын.

...Зноў поезд імчыць на ўсход, поезд кур'ерскі. На небе тыя самыя радасныя зоры. У салон-вагоне едзе ў поездзе і сам таварыш сакратар ЦК.

Андрэй з Надзяй прайшлі ў вагон-рэстаран. Там сядзелі ўжо ўсе члены паўнамоцнай камісіі. Станіслаў Барвіна расказваў, як ён гнаў перад сабою Чарапіцкага ў Беластоку. Штык вінтоўкі Барвіны ледзь не дакранаўся да спіны Чарапіцкага. Ён ішоў, як злоўлены вяпрук, выгнаны з бярлогі. Тлушч калыхаўся на ім — на абвіслых шчоках, на падбародку. А Барвіна ўсё гнаў і гнаў яго перад сабою. Чарапіцкі агляпецца, убачыць штык перад сабою і памкнецца ўцякаць. Натоўпы людзей расступаюцца, даюць яму дарогу і крычаць:

— Ага, злавілі ваўка!

Чарапіцкі зноў агляпецца і буркне:

— Я не вінен, я не вінен...

— Не аглядацца! Ты — лотр! — крыкне Барвіна і гоніць дэфензіўскага ката далей.

— Чокнемся за вызваленне! — сказаў Андрэй.

І чаркі чокаліся. У Надзі на твары шчасце. Шчасце разліваецца і на твары Андрэя.

А поезд, як віхор, імчаў пад радаснымі зорамі, імчаў шматпакутную, вызваленую Заходнюю Беларусь у Маскву... у Маскву.

Недзе перад Смаленскам загаварыла радыё, і палілася песня:

Летят утки и два гуся...

— Добры дзень, Русь! — смяецца ад шчасця Андрэй.— Даўно не бачыліся, Русь свабодная, шырокая, Русь народная... Твае сокі бродзяць і ва мне. Прымай сваіх сыноў.

Цяпер мы разам назаўсёды. Панская Польшча скапала. На шляхах рэвалюцыі сустрэнем новую Польшчу... Добры дзень, Русь! Я слухаю цябе... За Русь! — падняў чарку Андрэй.

Усе ўсталі з шумам са сваіх месцаў і задушэўна чокаліся за маці-айчыну, за Русь.

А песня вымаўляла:

Хороши твои приветы...

Поезд імчаў, як віхор, імчаў без прыпынкаў — на ўсход і на ўсход.

...Як жа радасна і цяжка было гаварыць Андрэю з перона Беларускага вакзала перад неабсяжным натоўпам масквічоў, якія прыйшлі сустрэць і прывітаць прадстаўнікоў вызваленай Заходняй Беларусі. Сэрца хацела выскачыць з грудзей, але словы ўсё роўна экспромтам вырываліся, ляцелі ў натоўп.

Побач стаяў сакратар ЦК Беларусі ў шынялі. Перад набліжэннем да Масквы ён выклікаў Андрэя да сябе, у свой вагон, і прасіў выступіць. Так і сталі абодва перад мікрафонам. Гукі аркестра, кветкі. Воплескі хвалямі перакочваюцца па натоўпу...

Прывітанне Маскве!

Гасцініца «Масква». Несціханы гул за акном, гул велізарнай Масквы, гул магутны, размераны, несціханы. Гэта б'ецца магутнае сэрца неабсяжнай Краіны Саветаў.

Андрэй з Надзяй толькі што вярнуліся з прагулкі па метро. Ніяк не хацеў пакідаць Андрэй станцыі «Плошча рэвалюцыі». Аглядаў кожную статую, у іх чытаў гісторыю рэвалюцыі, бачыў яе пафас, сусветны подзвіг народа — рабочых, сялян, салдат, матросаў. Вялікая любоў да жыцця адлюстравана ў статуях, любоў паўстаўшага з дзікай няволі народа — бацькоў і матак, сыноў і дочак.

— Хадзем,— цягнула Надзя,— а то позна ўжо.

— Пойдзем глянем яшчэ на маці з дзіцем і на маладзіцу, што корміць курэй з фартуха.

Вярнуліся. Прыйшлі. Прыемная стомленасць, задума. Над Крамлём у вышынях гараць рубінавыя зоры на вастраверхіх вежах. І агніста развяваецца, як у водбісках пажару, Чырвоны сцяг — усё плыве і плыве хвалямі, здаецца, у сусвет.

Агортвае сон. Гул і сон зліваюцца ў адно. І невядома, ці наяву гэта, ці ў сне так здаецца Андрэю. Усё стаяць і стаяць перад вачыма бляскі крамлёўскіх залаў. Трыбу-

на. Сцягі. Саша Грынявіцкі на трыбуне чытае дэкларацыю Народнага Сходу Заходняй Беларусі. Потым выступленні. Андрэй гаворыць пра Заходнюю Беларусь, кляйміць паноў, кляйміць ППС, Бунд, славіць Савецкую Канстытуцыю, славіць Камуністычную партыю, славіць таварыша Сталіна.

А гул за акном усё плыве.

Андрэй адчувае, як гарачыя слёзы закіпелі ў яго грудзях.

А Чырвоны сцяг над Крамлём усё плыве і плыве хвалямі ўдаль і ўдаль, плыве над гарадамі, вёскамі неабсяжнай Краіны Саветаў, у якую ўвайшлі, як роўныя з роўнымі, змучаныя, параненыя, цяпер поўныя ўрачыстасці і радасных надзей,— Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна.

Праз дзень адбылася дэманстрацыя працоўных Масквы перад Маўзалеем Леніна.

Стройнымі калонамі прайшлі войскі з вострымі, гранёнымі штыкамі. А потым... а потым хлынула патокам уся рабочая Масква. Калыхаліся сцягі, партрэты членаў Палітбюро. Мора людскіх мас у кіпенні праплывала перад вачыма. Вір за вірам — імклівы, магутны, бясконца,— удаль і ўдаль... Пазнаюць вызваленых братоў, і лес рук узнімаецца для прывітання. А там, на трыбуне Маўзалея, час ад часу падымаецца рука Сталіна, вітаючы плынь кіпучага патоку людскіх мас.

А шумныя хвалі ўсё плывуць і плывуць пад сцягамі, пад партрэтамі. Кепкі і кепкі перамяшаліся з рознакаляровымі хусткамі. Рабочая, пралетарская Масква! Ух, якая ж яна магутная! Лозунгі тонуць у шуме, у кіпенні, у тупаце тысяч ног і ўзрываюцца крыкамі «ўра» перад Маўзалеем, перад кіраўнікамі партыі і ўрада.

Не, гэтага патоку не спыняць ніякія сілы!

Андрэй з Надзяй не адчувалі, што яны стаяць на трыбуне. Яны не стаялі, а плылі і плылі разам з усімі, плылі ў кветках, у вянках пад чырванню сцягоў, плылі да сонца, да сонца...

Аркестр ужо іграў другое:

Кипучая, могучая,
Никем не победимая,
Москва моя, страна моя,
Ты самая любимая!

* * *

Парамі ішлі па Чырвонай плошчы. У апошняй пары — Андрэй і Надзя. Ціха ступалі па мармуровыя сходы і ўваходзілі ў адчыненыя дзверы, каб потым глянуць на твар бессмяротнага Леніна. Вялікі правадыр працоўных усяго свету, нястомны стратэг рэвалюцыі ляжыць у салдацкім фрэнчы з ордэнам баявога Чырвонага Сцяга на грудзях. Гэта ён — Уладзімір Ільіч Ленін — блізкі, просты, зразумелы, свой. Бяссмерце гарыць над ім і будзе гарэць у вяках!

Таксама ціха, задуменна выйшлі з Маўзалея. Апошнімі выходзілі Андрэй і Надзя.

Выйшаўшы, спыніліся ў задуме, а сэрцы гаварылі: «Благаслаці нас, Масква, на далейшую дарогу, на далейшую барацьбу!»

*1948—1952 гг.*

# КАМЕНТАРЫІ

У дадзены том уваходзіць другая кніга рамана «Сустрэнемся на барыкадах».

Друкуецца на тэксту апошняга прыжыццёвага выдання (Зб. тв. у 4-х тамах. Мінск, «Беларусь», 1970. Т. 3. Сустрэнемся на барыкадах. Раман. Кніга другая).

Пры ўстанаўленні аўтэнтычнага тэксту і напісанні каментарыяў выкарыстаны друкаваныя тэксты ўсіх прыжыццёвых выданняў рамана.

У тэкст унесены праўкі паводле першадруку («Полымя», 1952, № 9, 10, 11, 12)

С. 90, радкі 41—42: «У місцы з вадой моклі драўляныя лыжкі» *замест* «У місцы ў вадзе моклі лыжкі»

С. 237, радок 19: «прыгладжваў» *замест* «пагладжваў»

С. 372, радок 28: «беларускай» *замест* «Беларускай»

С. 467, радок 41: «дудзеў» *замест* «дудзіў» (паводле правапісу)

С. 507, радок 7: «Яма» *замест* «Яна»

С. 521, радок 30: «лотр!» *замест* «лотра!»

## Кніга другая

Упершыню апублікавана са скарачэннямі ў час. «Полымя», 1952, № 9, 10, 11, 12.

Урыўкі з другой кнігі надрукаваны: «Сустрэнемся на барыкадах» (Урывак з аповесці) — «Беларусь», 1948, № 2; «Попел» (Урывак з чацвёртай часткі рамана «Сустрэнемся на барыкадах») — «Беларусь», 1952, № 6; «На штурм!» (Урывак з рамана «Сустрэнемся на барыкадах») — «Зара», 1953, 27 лют. і 20 сак.; «Голас

рэвалюцыйнага Беластока» (Урывак з «Сустрэнемся на барыкадах») — «Ніва», 1958, 14 снеж.

Поўнасцю ў дзвюх кнігах з прадмовай аўтара «Далёкія здаюцца тыя часы» раман выйшаў у 1954 г. У 1961 г. перавыдадзены. Быў змешчаны ў 2-м і 3-м тамах прыжыццёвага выдання: Пілін Пестрак. Зб. тв. у 4-х тамах. Мн., «Беларусь», 1969—1971.

Быў дапрацаваны для першага выдання на рускай мове (М., Сов. писатель, 1955, пераклад Я. Мазалькова і А. Клёпава), перавыдадзены ў 1956 (Сов. писатель) і 1963 («Известия»). Выходзіў на рускай мове ў перакладзе П. Кабзарэўскага (Мн., Дзяржвыд БССР, 1956 і Мн., «Беларусь», 1967), на ўкраінскай у перакладзе Б. Чайкоўскага (Кіеў, Держ. видавництво мист. літ-ри, 1955).

Рукапіс рамана «Сустрэнемся на барыкадах» не захаваўся. У Рукапісным аддзеле Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР ёсць машынапіс рамана (Ф—«П.», воп. 1, № 326), які папярэднічаў часопіснай публікацыі. Некаторыя мясціны машынапісу, апушчаныя пры падрыхтоўцы рамана да першадруку, былі ўключаны ў першае кніжнае выданне твора 1954 г.

Вывучэнне тэксту паказвае, што асновай для далейшых выданняў рамана паслужыла пераважна першае выданне кнігі ў дзвюх частках (Мінск, Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1954).

Пры параўнанні першадруку з першым кніжным і апошнім прыжыццёвым выданнямі можна заўважыць паміж імі пэўныя адрозненні. Дапрацоўка ішла ў наступным кірунку: апускаліся некаторыя героі і падзеі, з'яўляліся новыя сцэны ці раздзелы, знікалі падрабязнасці і празмерная дэталізацыя, удасканальваліся мова і стыль.

У апошнім прыжыццёвым кніжным выданні адсутнічаюць асобныя раздзелы часопіснага варыянта. Гэта пераважна старонкі турэмнага жыцця і тыя мясціны, дзе раскрываліся вобразы Апанаса Хмеля, Аляксандра Сучка, Мірона Вадалея, Арцёма Світкі, Ігната Вярэні, Аркадзя Дзенісевіча. Няма думак Апанаса Хмеля («Полымя», № 9, с. 67) пра пераход у СССР і «разгортванне» там сваёй дзейнасці, адсутнічае апісанне мітынгу ў турме з выпадку забойства ў Варшаве савецкага пасла Войкава («Зноў Паддубны... ~ ...да здраднікаў!..», «Полымя», № 9, с. 92—93), скарочаны мясціны пра тое, як Хмель настройваў супраць турэмнага камітэта зняволеных жанчын («Хоць камера... ~ ...упрыгожваць сябе», «Полымя», № 10, с. 27—28; «Некаторыя інтэлігенты... ~ ...ад акна незадаволены», «Полымя», № 10, с. 29—30), няма апісання нарады камуністаў Андрэя Касцевіча, Максіма Рунды, Захара Зубца, Марціна Шапко, што адбылася ў лесе напярэдадні першай масоўкі пасля разгрому Грамады («Андрэй з Максімам... ~ ...аб іншых падобных», «Полымя», № 11, с. 60—61).

Апушчаны нададзеныя ў гумарыстычным плане вынікі палітычнай і эканамічнай вучобы для простых вясковых хлопцаў, якія ў лістах дамоў спалучалі высокі «вучоны» і натуральны, размоўны стыль («Бібліятэкар, смуглявы... ~ ...напісаў інакш», «Полымя», № 10, с. 31), каларытныя сцэны з валаснога астрога, дзе Леваш Гарасім чытае гумарыстычныя творы Кандрата Крапівы і дзе расказваецца пра балахоўскага палкоўніка Шувалава («На такі загад... ~ ...забіць Булак-Балаховіча», «Полымя», № 11, с. 50—54), старонкі пра дэмагога і авантурыста Мітрафана Пішчыка, вобраз якога шмат у чым пераклікаўся з вобразам Апанаса Хмеля («Маймут абурэнню... ~ ...у дэфензіве», «Полымя», № 11, с. 93—94; «Мі-

трафап Пішчык... ~ ...яспавяльможнага хама», «Полымя», № 11, с. 98—99), урывак пра сацыяльнае становішча парабкаў («Як ні намагаліся... ~ ...прыклад з пана», «Полымя», № 11, с. 44—45), пра інтэлігенцкую мяккацеласць Ігната Вярэні («Полымя», № 11, с. 57), некаторыя падрабязнасці размовы Андрэя з попікам Чадзюком («Полымя», № 11, с. 64).

У апошнім прыжыццёвым выданні (Піліп Пестрак. Зб. тв. у 4-х тамах, т. 3, с. 179—182) [1] па-іншаму, чым у машынапісе, першадруку і першым кніжным выданні 1954 г., паказана забойства Макарам Краўчуком правакатара Мірона Вадалея. У гэтым апісанні іншы сюжэтны ход, зняты падрабязнасці і дэталі, а проста паведамляецца, што Вадалей быў пакараны за здраду. У апошнім прыжыццёвым выданні шырэй пададзены думкі і перажыванні Вадалея. У выніку яго вобраз набыў большую псіхалагічную індывідуалізацыю.

Прыкметныя лексічныя адрозненні назіраюцца паміж машынапісам, першадрукам (у выданні 1954 г. няма) і апошнім прыжыццёвым выданнем у сцэне, дзе Апупрэй Чарняк расказвае касцам старую падняволыпую быль пра панскую сучку («Так і не даведаліся... ~ ...Анупрэя па спіне», с. 143—145) і ў апісанні жыцця валаснога астрога («Валасны астрог... ~ ...расказвайце што-небудзь», с. 200—203).

Пры чарговай дапрацоўцы значна ўзмацніўся вобраз Андрэя Касцевіча. Пісьменнік пазбягаў шматслоўнасці, апісальнасці. Быў зняты ўрывак з першадруку пра спрэчку Андрэя з Сучком, дзе ішла гаворка пра «Жалезны паток» Серафімовіча і «На заходнім фронце без перамен» Рэмарка («Але побач... ~ ...паплёўся Сучок», «Полымя», № 9, с. 82—83). У кніжных выданнях адсутнічае і расцягнуты дыялог Андрэя з філосафам Дзенісевічам («Полымя», № 9, с. 87), вынікі іх гаворкі пададзены выразным і пераканаўчым сказам: «Усе іншыя светапогляды, апрача марксізма-ленінізма, аджываюць свой век разам з класамі, якія іх спарадзілі» (с. 47). Апушчана размова Андрэя з Круцікам, маладым, інтэлігентным чалавекам, якому галоўны герой раіў чытаць для пачатку не «Капітал» Маркса, а творы Пляханава («Полымя», № 9, с. 88—89). Кожны з іх застаўся пры сваіх інтарэсах. Довады Андрэя ў гэтых спрэчках здаюцца нават крыху наіўнымі, рытарычнымі і непераканаўчымі. Таму пазней яны былі апушчаны. Зняты часопісны ўрывак, дзе Андрэй быў некалькі катэгарычным у меркаваннях пра тое, што Арцём Світка, якога прываблівала рамантыка рэвалюцыйнай барацьбы, захапляўся прыродазнаўчымі кнігамі, творамі Жуля Верна, Дзюма. Андрэй запісаў у сваім дзённіку: «Зразумела... Свой ухіл, свая рамантыка. Ёсць у гэтым нешта моцнае, прыгожае, але і небяспечнае» («Полымя», № 11, с. 92).

Не прыведзены ўрывак, у якім Андрэй думае пра кніжкі на паліцы ў Сапкоўскага («З гэтымі кніжкамі... ~ ці як...», «Полымя», № 10, с. 61). Гэтыя кнігі напісаны з прымірэнчаскіх пэпэсаўскіх пазіцый. А Сапкоўскі, як паказваецца далей, быў стойкім камуністам, аднадумцам Андрэя. Таму зусім апраўданы пропуск гэтага ўрыўка.

У апошнім прыжыццёвым выданні адсутнічае ўрывак пра маўклівых рабочых-друкароў. Праўда, ужо і ў першым кніжным выданні былі апушчаны некалькі заключных радкоў, дзе гаворыц-

[1] У далейшым старонкі гэтага выдання ў дужках.

ца пра захапленне гэтых рабочых Андрэем, які, «адыходзячы, пакідаў ім недакураную пачку папярос» («Полымя», № 12, с. 54). Пісьменнік, відаць, адчуў, што за кошт ідэалізаванага ўзвышэння галоўнага героя прыніжаюцца простыя людзі-працаўнікі, якія захапляюцца ім, таму апусціў гэта месца. Вобраз галоўнага героя ад гэтага толькі выйграў.

У адрозненне ад першадруку («Полымя», № 12, с. 59—61) пры дапрацоўцы пісьменнік значна скараціў дыялог Андрэя і Надзі пра спалучэнне асабістага і грамадскага і пра асаблівую адказнасць партыйнага работніка («— Ты згодна... ~ ...жыць з ім...», с. 444). У іх гутарцы было вылучана самае істотнае і важнае. У выніку расцягнуты дыялог набыў стройнасць і дынамізм. Урывак («— А ты не жартуй... ~ ...Аман», «Полымя», № 12, с. 61), дзе ішла гаворка пра тое, што для камуніста вялікім здабыткам з'яўляецца прастата, быў заменены новым («Свабода! Якое... ~ ...жыцця без яе», с. 445), у якім перададзены думкі Андрэя аб прызначэнні камуніста. Вобраз галоўнага героя засвяціўся новымі гранямі, стаў псіхалагічна дакладным і праўдзівым. У апошнім прыжыццёвым выданні адсутнічае размова Андрэя і Надзі ў перапынку паміж пасяджэннямі суда пра іх дзіця, якое перададзена ў СССР («Полымя», № 12, с. 78—79). Тут крыху агульна гучаць яго шматслоўныя разважанні пра сваю вялікую місію змагара. Пры дапрацоўцы апускаліся словы Андрэя, які гаварыў Надзі, каханай жанчыне: «Для нашай ідыліі ўмовы — ох, якія ж суровыя! Сэрца сцісні ў кулак!» («Полымя», № 12, с. 48).

П. Пестрак пазней лаканічна і дакладна перадаў тыя радкі, дзе гаварылася пра супрацоўніцтва Дзенісевіча з уладай, барацьбу камуністаў з ППС і іншымі згодніцкімі партыямі («Полымя», № 12, с. 53 і выданне 1970, с. 431), апусціў роздум Андрэя пра ўнутрыпартыйныя праблемы і пра пачатковую пазіцыю партыйнага кіраўніцтва ў ацэнцы перавароту Пілсудскага («Вярнуўшыся з друкарні... ~ ...глыбокай поўначчу», «Сустрэнемся на барыкадах», 1954, с. 436—437).

У параўнанні з першадрукам у апошнім прыжыццёвым выданні выразней акрэсліліся адносіны Паддубнага да Хмеля (с. 62—63 і «Полымя», № 9, с. 98—99).

П. Пестрак перапрацаваў тыя мясціны, дзе героі больш гаварылі, чым дзейнічалі ці думалі. Пазбягаў апісальнасці, празмернай дэталізацыі і канкрэтызацыі. Так, былі апушчаны звесткі пра тое, што Паддубны паказаў Андрэю свае вершы («Полымя», № 9, с. 99); у часопісным варыянце («Полымя», № 10, с. 29) Хмель выхапіў у Андрэя сшытак, у кніжным — не (с. 66).

Пры дапрацоўцы апускаліся часам і апісанні цікавых і незвычайных з'яў з тагачаснага жыцця, калі яны не працавалі на сюжэт. Напрыклад, паведамленне пра даўнія яўрэйскія сёлы на Піншчыне («Полымя», № 12, с. 49).

Разам з тым, у кніжных выданнях з'явіліся многія старонкі машынапісу, якія адсутнічаюць у першадруку. Там не было размовы ў турме Апанаса і Сучка пра Казючка (с. 42). Апанас падхапіў «ідэю» Мірона Вадалея, двурушніка-правакатара, пра стварэнне партызанскіх атрадаў насуперак рашэнню партыі ўстрымацца ад узброеных выступленняў. Казючок ведаў пра гэта і мог бы выдаць яго перад Паддубным. Таму канкрэтызацыя тут апраўдана. Дарэчы, адсутнічаюць у машынапісе, першадруку і апошнім прыжыццёвым выданні, але ёсць у выданні 1954 года ўрыўкі, дзе

аўтар адкрыта гаворыць пра здрадніцтва Вадалея («Вадалей ужо... ~ ...Толькі так...», «Сустрэнемся на барыкадах», 1954, с. 183), пра дружбу Апанаса Хмеля з ім («Не ведалі... ~ ...грымучыя фразы», «Сустрэнемся на барыкадах», 1954, с. 393—394), дзе аўтар непрымірыма асуджае авантурызм Хмеля.

У апошнім прыжыццёвым выданні шырэй, чым у першадруку, пададзены дзённік Андрэя Касцевіча, асабліва яго (у машынапісе яны ёсць) заключныя старонкі («Шосты дзень галадоўкі... ~ ...салідарнасць!», с. 283—288), з'явіліся глыбокае і змястоўнае апісанне вяселля Макара Краўчука і Любы Гарагляд («Самае сапраўднае вяселле... ~ ...варожага вока!», с. 319—335) і святкаванне каляд (с. 384—390), звесткі пра Сашу Грынявіцкага, як ён уцёк на веласіпедзе паліцэйскага, як не пераходзіў у каталіцкую веру, як смяяліся панічы з яго торбы-сумкі і як маці не магла даць яму сала на абед (с. 292—293).

Адсутнічаюць у першадруку назвы падраздзелаў з чацвёртага раздзела чацвёртай часткі «У хаце Петруся», «Сцяг на сасне», «Гара нарадзіла мыш», «А ты чаго тут?», з другога раздзела пятай часткі «У Вільні», з пятага раздзела пятай часткі «Пяць пунктаў», падраздзел з трэцяга раздзела пятай часткі «Аб адным подзвігу» (с. 395—402), урыўкі пра сцяг на сасне («Людзі не толькі... ~ ... непрыкметны Пеця Ціханчук», с. 194—198), пра першую пасля разгрому Грамады масоўку («Сюды, у гэты лясок... ~ ...была і Вольга», с. 208—211).

Апраўдана тое, што адзін з падраздзелаў чацвёртага раздзела чацвёртай часткі названы «Набат» (у першадруку «Набат гісторыі»). У гэтай назве заключаны вузейшы сэнс, размова ідзе пра абарону праваслаўнай веры. Выразнейшай стала і назва падраздзела з пятага раздзела чацвёртай часткі — «Зноў турма» замест «Апошняе». Адзін з падраздзелаў чацвёртага раздзела чацвёртай часткі стаў называцца «На прыцэле» замест «Ціхія героі».

Пры чарговых перавыданнях амаль без змяненняў заставаўся падраздзел «Бацька» з пятага раздзела чацвёртай часткі.

У кніжных выданнях з'явіліся ў дзённіку Андрэя радкі пра Арцёма Світку і звесткі пра Булак-Балаховіча (с. 262), пра ўцёкі з турмы Антона Данілюка (с. 280), пра напад групы Макара Краўчука і Антона Данілюка на хату вясковага старшыні гуртка фашысцкай арганізацыі «Стралец» (с. 300—301).

Адсутнічалі ў першадруку звесткі пра выезд Андрэя з Варшавы на Піншчыну, выпадак на вакзале з селянінам і яго хворай дачкой; пра «Інтэрнацыянал», які загучаў з радыёпрыёмніка ў брэсцкай піўной, старонкі пра Ігната Вярэню і мітынг з удзелам дэпутата сейма, кулака Рагулі і пра тое, як пан прагнаў з маёнтка сям'ю Піліпа Гайдука за яго верш (с. 365—382).

Пазней з'явіліся ўрыўкі пра кіраўніцтва камуністаў забастоўкай лясных возчыкаў (с. 418—423), пра крызіс і палітычную сітуацыю ў Польшчы (с. 425—427), пра выступленне прадстаўніка ЦК таварыша Баляслава аб неабходнасці стварэння Народнага фронту і кансалідацыі сіл (с. 432—435), пра тое, як успрымаў Мікіта Лазун кліч іспанскіх байцоў «No pasaran!» і яго размова з солтысам Барсуком (с. 452—455), звесткі пра далейшы лёс Івана Падалякі, гісторыя пра былога станавога прыстава Лаўскага (с. 458—461), пра ўмовы турэмнага жыцця пры чарговым зняволенні Андрэя (с. 496—498).

У першадруку адсутнічаюць і вясковыя сцэны, дзе сяляне ад-

маўляюцца за нізкую плату капаць панам бульбу (с. 308—314), няма страшных і прапікнёных радкоў пра цяжкія ўмовы жыцця ў заходнебеларускай вёсцы (с. 488—492), адсутнічае апісанне падзей у вёсцы Запалянка напярэдадні вызвалення (с. 504—508), няма ўрыўка пра ўсталяванне Савецкай улады ў Глушцы і яго ваколіцах (с. 524—533). У першадруку назву падраздзела з пятага раздзела пятай часткі «Ласка арла» меў падраздзел, які пазней стаў называцца «Не трэба нам панскай міласці». У першадруку адсутнічаюць многія раздзелы пераважна заключнай, пятай часткі рамана.

У выданні 1954 года ўрывак пра ўсталяванне Савецкай улады ў Запалянцы і Глушцы быў змешчаны ў «Эпілозе» (с. 531—539). Пазней ён увайшоў у падраздзел з пятага раздзела пятай часткі «Залпы і кветкі». У выніку «Эпілог» пачынаўся ад слоў «Поезд бадзёра імчыць на ўсход і на ўсход» (с. 534).

Даследаванне тэксту паказвае, што паміж машынапісам і першым кніжным выданнем не было прыкметных адрозненняў. Разам з тым, многія мясціны машынапісу адсутнічаюць як у першадруку, так і ў далейшых кніжных выданнях рамана. Гэта дыялог Андрэя, які прыехаў у Беласток, каб убачыць Санкоўскага, з жанчынай, у голасе якой ён адчуў беларускі акцэнт («— Вы тут жывяце?.. ~ ...месца супакаенню», машынапіс, с. 184—185), урывак, дзе Пятрусь Хадыка іграў на скрыпцы над магілай забітых паліцыяй Антона Ткачука і Іллі Рамановіча («Бачылі людзі... ~ ...аб чым грае Пятрусь», машынапіс, с. 286—287), апісанне думак Андрэя пра ўнутраны выгляд памяшкання акруговай управы Таварыства беларускай школы, дзе ён выконваў па сумяшчэнню функцыі сакратара («На сцяне вісіць... ~ ...групт для гэтага», «Нічога не выйдзе ~ ...згасла назаўсёды», машынапіс, с. 382—383), гутарка галоўнага героя з Нічыпарам Байдаком пра нацыянальнае пытанне («Андрэй у далейшым... ~ ...хітрадзейны сэнс», машынапіс, с. 473—474), спрэчка вязняў аб тым, ці будзе ў былой Заходняй Беларусі пасля яе вызвалення і ўз'яднання ў адзінай савецкай дзяржаве перыяд нэпа («У камерах успыхнула... ~ ...Дыскусія скончылася», машынапіс, с. 810—811), сон у «Эпілозе» Андрэя, у якім ён гутарыць са Сталінам («— Мы ўсе ведаем... ~ ...настаўніка Леніна», «Падымайце сваю Беларусь... ~ ...вам поспеху», машынапіс, с. 864—865) і інш.

Пры дапрацоўцы ў «Эпілозе» былі апушчаны думкі Андрэя ў цягніку пра далейшае жыццё ў былой Заходняй Беларусі і пра лёс членаў КПЗБ («Андрэй ужо... ~ ...Пакажа жыццё», «Полымя», № 12, с. 100), пра цікавасць Надзі пры наведванні Мінска да магазінаў з тканінамі і жаночымі ўборамі, а Андрэя — да кнігарні («Надзя ўсё... ~ ...да неба», «Полымя», № 12, с. 101). Андрэй пры гэтым гаварыў Надзі: «Партыя дамагаецца пільнасці і далей, патрабуе работы. Трэба гэта мець на першым плане».

У апошнім прыжыццёвым выданні раман набываў кампазіцыйную завершанасць і сюжэтную зладжанасць. Знікалі апісальнасць і празмерная дэталізацыя. Пісьменнік паказваў сваіх герояў у дзеянні і развіцці, глыбей пранікаў у іх унутраны свет.

* * *

С. 42. *Сельроб* — масавая дэмакратычная рабоча-сялянская арганізацыя ў Заходняй Украіне, тое ж, што Грамада ў Заходняй Беларусі.

С. 42. *ППХ* (Народова партыя хлопска) — масавая легальная польская дэмакратычная сялянская арганізацыя.

С. 45. *Ключэўскі Васіль Осіпавіч* (1841—1911) — рускі гісторык, адзін з буйнейшых прадстаўнікоў рускай буржуазна-ліберальнай гісторыяграфіі, прафесар Маскоўскага універсітэта, член партыі кадэтаў.

*Салаўёў Сяргей Міхайлавіч* (1820—1879) — буйны рускі буржуазны гісторык.

*Карэеў Мікалай Іванавіч* (1850—1931) — рускі гісторык.

С. 50. *ППС* — буржуазна-нацыяналістычная «Партыя польскіх сацыялістаў».

С. 70. *Секвестратар* — чыноўнік, які накладае секвестр, у дадзеным выпадку зборшчык падаткаў.

С. 109. *Люксембургізм* — праяўленне памылковых уяўленняў Розы Люксембург аб тэорыі стыхійнасці, недаацэнцы ролі партыі, рэвалюцыйных магчымасцей сялянства і г. д., якія бралі на ўзбраенне розныя згодніцкія ці апартуністычныя партыі і арганізацыі.

С. 129. *Сервітут* — тэрмін рымскага права, які абазначае частковы дазвол на карыстанне чужой уласнасцю. У дадзеным выпадку права сялян пасвіць жывёлу ў панскім лесе.

С. 143. *«Virtuti military», «Крыж харобрых»* — вышэйшыя ўрадавыя ўзнагароды ў Польшчы.

С. 150. *Секвестр* — забарона органамі ўлады карыстацца якой-небудзь маёмасцю; тут: рэквізіцыя маёмасці ў карысць дзяржавы за даўгі.

С. 160. *Лелевель Іаахім* (1786—1861) — выдатны польскі гісторык і прагрэсіўны грамадскі дзеяч.

*Міцкевіч Адам* (1798—1855) — вялікі польскі паэт, дзеяч вызваленчага руху. У сваёй творчасці выкарыстоўваў беларускі фальклор, звяртаўся да гісторыі Беларусі.

*Дамброўскі Яраслаў* (1836—1871) — выдатны польскі рэвалюцыянер-дэмакрат. У 1871 годзе галоўнакамандуючы ўзброенымі сіламі Парыжскай Камуны.

*Урублеўскі Валерый* (1836—1908) — выдатны польскі рэвалюцыянер. У час паўстання 1863—1864 гадоў камандаваў паўстанцкімі атрадамі ў Гродзенскай і Люблінскай губернях. У 1871 годзе — генерал Парыжскай Камуны. Дзеяч 1-га Інтэрнацыянала.

*Каліноўскі Канстанцін Сямёнавіч (Кастусь)* (1838—1864) — беларускі рэвалюцыянер-дэмакрат і мысліцель, кіраўнік паўстання 1863—1864 гадоў на Беларусі і Літве. Узначальваў «Чырвоны ўрад» паўстанцаў.

С. 163. *Санацыя (ад лац. sanatio* — лячэнне, аздараўленне) — назва рэжыму, які ўстанавіўся ў Польшчы з 1926 года ў выніку фашысцкага перавароту пілсудчыкаў. Рыхтуючы звяржэнне кіруючага ў той час кааліцыйнага ўрада, польскія фашысты на чале з Пілсудскім дэмагагічна патрабавалі «санацыі» палітычнага жыцця краіны.

С. 226. *ТБШ* («Таварыства беларускай школы») — масавая культурна-асветная арганізацыя працоўных Заходняй Беларусі (1921—1937). Праводзіла шырокую работу па арганізацыі працоўных на барацьбу за беларускую школу, стварала бібліятэкі, народныя клубы, наладжвала канцэрты, спектаклі, распаўсюджвала прагрэсіўныя газеты і г. д. Мела друкаваныя органы «Беларускі летапіс», «Бюлетэнь ТБШ», выдавала газету «Наш палетак».

С. 232. *Шарваркі* — працоўная дарожная павіннасць.

С. 233. *Пацыфікацыя* — крывавыя карныя экспедыцыі, якія душылі народны рух.

С. 260. *Канфідэнт* — чалавек, якому даверана тайна; у Польшчы так звалі даносчыкаў, асведаміцеляў дэфензівы.

С. 332. *Луцкевіч Антон Іванавіч* (1884—1946) — дзеяч беларускага буржуазна-дэмакратычнага руху, публіцыст, літаратурны крытык. У 20—30-я гады XX ст. старшыня навуковага таварыства, дырэктар музея імя І. Луцкевіча, выкладчык беларускай гімназіі ў Вільні. Адзін з лідэраў палітычнай групоўкі Цэнтральны саюз культурных і гаспадарчых арганізацый, якая імкнулася супрацоўнічаць з дыктатарскім рэжымам Пілсудскага, змагалася супраць КПЗБ, рэвалюцыйнага руху, выступала супраць СССР і БССР.

С. 349. *Азеф* — адзін з лідэраў баявой арганізацыі эсэраў, правакатар царскай ахранкі. Яго імя стала хадзячай назвай.

С. 484. *Сміглы Эдвард* (1886—1942) — адзін з лідэраў кіруючай з 1926 па 1939 год фашысцкай клікі; галоўнакамандуючы польскай арміі, у верасні 1939 года кінуў армію і ўцёк за мяжу.

*А. Л. Верабей*

# ЗМЕСТ

## Частка чацвёртая


*Раздзел першы*

Попел . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
Вёскі ў жалобе . . . . . . . . . . . . . . . 11
На мяжы небяспечнага . . . . . . . . . . 20
«У катле» . . . . . . . . . . . . . . . . 36

*Раздзел другі*

Знаёмыя дарогі . . . . . . . . . . . . . . 68
На грушы шпакі... . . . . . . . . . . . . . 87
Важнае даручэнне . . . . . . . . . . . . . 103

*Раздзел трэці*

Суседзі, сябры... . . . . . . . . . . . . . 127
На скрыжаванні дарог . . . . . . . . . . . 152

*Раздзел чацвёрты*

На прыцэле . . . . . . . . . . . . . . . 174
У хаце Петруся . . . . . . . . . . . . . 177
Сцяг на сасне . . . . . . . . . . . . . . 186
Гара нарадзіла мыш . . . . . . . . . . . 198
А ты чаго тут? . . . . . . . . . . . . . 202
Набат . . . . . . . . . . . . . . . . . 207

*Раздзел пяты*

Зноў турма . . . . . . . . . . . . . . . 214
Бацька . . . . . . . . . . . . . . . . . 232


## Частка пятая


*Раздзел першы*

Дзённік Андрэя . . . . . . . . . . . . . 253

*Раздзел другі*

Жыццё перамагае . . . . . . . . . . . . . 280
Новы пан . . . . . . . . . . . . . . . . 299
У Вільні . . . . . . . . . . . . . . . . 330
На штурм! . . . . . . . . . . . . . . . . 342

*Раздзел трэці*

Дзве дарогі . . . . . . . . . . . . . . . 362
Для турмы . . . . . . . . . . . . . . . . 373

Канец Апанаса Хмеля . . . . . . . . . . . . . . 379
Аб адным подзвігу . . . . . . . . . . . . . . . 384

*Раздзел чацвёрты*

Вецер на дарогах . . . . . . . . . . . . . . . 391
На подступах барыкад . . . . . . . . . . . . . 413
No pasaran! . . . . . . . . . . . . . . . . . 436
Суд над судом . . . . . . . . . . . . . . . . 459

*Раздзел пяты*

Не трэба нам панскай міласці . . . . . . . . . 474
Пяць пунктаў . . . . . . . . . . . . . . . . . 486
Ласка арла . . . . . . . . . . . . . . . . . . 489
Залпы і кветкі . . . . . . . . . . . . . . . . 494
Эпілог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 518

Каментарыі . . . . . . . . . . . . . . . . . 525

**Пестрак П.**

П 28 Збор твораў. У 5-ці т. Т. 3. Сустрэнемся на барыкадах. Раман. Кніга другая.— Мн.: Маст. літ., 1985.— 534 с., 4 л. іл.

У пер.: 2 р. 30 к.

Трэці том складае другая кніга рамана «Сустрэнемся на барыкадах».

П $\frac{4702120200-094}{М302(05)-85}$ падпіснае

ББК 84Бел7
Бел2

*Филипп Семенович Пестрак*

Собрание сочинений в пяти томах

ТОМ 3

ВСТРЕТИМСЯ

НА БАРРИКАДАХ

*Роман*

Книга вторая

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Рэдактар А. А. Слянцова*
*Мастак Г. Р. Малышаў*
*Мастацкі рэдактар Л. Я. Прагін*
*Тэхнічны рэдактар Т. М. Сокал*
*Карэктар Я. А. Бебель*

ІБ № 1919

Здадзена ў набор 27.08.84. Падп. да друку 04.05.85. АТ 06696. Фармат 84×108$^1/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Высокі друк. Ум. друк. арк. 28,14+0,42 укл. Ум. фарб.-адб. 28,56. Ул.-выд. арк. 31,35. Тыраж 10 000 экз. Зак. 683. Цана 2 р. 30 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.